ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНЫЯ ХРОНІКІ ГАРАДОЎ І РАЁНАЎ БЕЛАРУСІ

ШМАТТОМНАЕ ВЫДАННЕ СТВАРАЕЦЦА ПАВОДЛЕ РАШЭННЯ ЎРАДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ПАЛЯЦЬ

ПЕТРЫКАЎСКІ РАЁН

МІНСК «УРАДЖАЙ» 1995

ББК 63.3(4 Беи)
П 15
УДК 947.62

Рэдакцыйная калегія:

А. В. БІЧАН, А. Л. ПЕТРАШКЕВІЧ, Б. В. УЛЬЯНКА, В. Р. ФЕРАНЦ, У. І. ХІЛЯ

Раённая камісія па стварэнню гістарычна-дакументальнай хронікі:

М. А. ЮХНЕВІЧ (старшыня камісіі), А. І. БРАІМ, В. С. ВЯРГЕЙ, С. Л. ІЛЬЯНКОЎ, Г. М. КАРНЕЙЧЫК, М. К. СЕЛЕХ, А. В. СОЛАХАЎ, А. С. ФЯДОСІК, В. М. ЧАРНОБЫЛЕЦ, М. П. ШАМРЫЛА

Рэдактар-укладальнік В. Р. ФЕРАНЦ

Арганізацыйна-метадычны цэнтр па выданню гістарычна-дакументальных хронік Памяці Міністэрства культуры і друку Беларусі:

А. Л. Петрашкевіч (кіраўнік цэнтра), У. І. Лемяшонак (галоўны рэдактар), А. П. Ярохін (галоўны метадыст), М. З. Башлакоў (вядучы рэдактар), З. Л. Яцкевіч (рэдактар)

Распрацоўка мастацка-тэхнічнага афармлення серыі *В. А. Рагалевіча*

Мастак *Э. Э. Жакевіч*

Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Петрык. р-на / Рэд.-укл. П 15 В. Р. Феранц. — Мн.: Ураджай, 1995. — 639 с., [8] л. іл.
ISBN 985-04-145-1.

У гістарычна-дакументальнай хроніцы на аснове архіўных даных, матэрыялаў музеяў, успамінаў удзельнікаў падзей, што адбываліся на Петрыкаўшчыне, артыкулаў і мастацкіх твораў расказваецца аб гісторыі Петрыкава, яго мінулым і сучасным, аб вядомых людзях, якія вызначыліся на полі бітваў і ў мірнай працы. Асаблівая ўвага ўдзяляецца Вялікай Айчыннай вайне і партызанскаму руху, цяжкім крывапралітным баям на тэрыторыі раёна за яго вызваленне. Прыводзяцца спісы жыхароў, што бязвінна пацярпелі ў гады сталінскага беззаконня, землякоў, якія загінулі на франтах Айчыннай вайны і ў партызанскіх атрадах, воінаў, загінуўшых на тэрыторыі раёна, а таксама мірных жыхароў — ахвяр фашысцкага тэрору.

9470600000—039
П ———————— Без аб'яўл.— 95 **ББК 63.3(4 Беи)**
М 305(03) — 95

ISBN 985-04-145-1

© Выдавецтва «Ураджай», 1995

На высокім беразе Прыпяці ў Петрыкаве, адкуль адкрываюцца шырокія далягляды на зарэчныя прасторы, помнік воінам-вызваліцелям

35—10 тысяч гадоў да н. э. Эпоха верхняга палеаліту. Станаўленне чалавека сучаснага вобліку. Верагоднасць з'яўлення першага чалавека на Петрыкаўшчыне. Канец ледавіковага перыяду

9—5 тысячагоддзяў да н. э. Эпоха мезаліту. Пачатак сучаснага геалагічнага перыяду — галацэну. З'яўленне абарыгеннага насельніцтва — паселішчы Дарашэвічы, Макарычы, Ляскавічы, Майсеевічы, Навасёлкі (на Прыпяці)

5—3 тысячагоддзі да н. э. Эпоха неаліту—паселішчы днепра-данецкай культуры: Навасёлкі (на Прыпяці), Дарашэвічы, Галубіца, Шастовічы, Майсеевічы, Мардзвін, Снядзін, Вялаўск, Кабачок, Вышалаў, Петрыкаў

2 тысячагоддзі да н. э. Эпоха бронзы. Прадстаўлена культурамі: сярэднедняпроўскай — паселішчы Багрымавічы, Турок, Майсеевічы, Шастовічы, Капаткевічы, Петрыкаў (уроч. Беркава Гара, Белка), Снядзін;

Хаты тут няроўныя, як і людзі... Сядзіба дзеда Талаша ў Навасёлках

14—12 ст. да н. э.	усходнетшынецкай — паселішчы Навасёлкі (на Прыпяці), Слабодка Чалюшчавіцкая, Майсеевічы, Шастовічы, Востраў, Мардзвін;
11—9 ст. да н. э.	лебядоўскай (Багрымавічы). Месцазнаходжанні асобных рэчаў эпохі бронзы (каменных сякер, матык і інш.) выяўлены каля вв. Навасёлкі, Камаровічы, Фаставічы, Ст. Галоўчыцы, Філіпавічы, Лучыцы, Ванюжычы, Забродцзе, Клясаў, Галубіца
8—7 ст. да н. э.— 4 ст. н. э.	Эпоха жалеза. Прадстаўлена культурамі:
8—7 ст. да н. э.—3 ст. да н. э.	мілаградскай — гарадзішчы каля вв. Навасёлкі, Хвойня, Філіпавічы, Ванюжычы, Івашкавічы, Боркі, Снядзін, селішчы каля вв. Багрымавічы, Турок, Дарашэвічы, Кабачок, Лучыцы, Мардзвін, Майсеевічы, Снядзін, г. Петрыкаў;
2 ст. да н. э.—1 ст. н. э.	зарубінецкай — селішчы каля вв. Кабачок, Вышалаў, Дарашэвічы, Шастовічы, Снядзін, Навасёлкі

Мемарыяльны комплекс у памяць землякоў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, у Камаровічах

2—4 ст. н. э.	кіеўскай (месцазнаходжанні каля вв. Турок, Шастовічы, Вышалаў, Дарашэвічы)
5—7 ст. н. э.	Раннесярэднявечная славянская культура — селішчы Петрыкаў (уроч. Крутуха), Снядзін, Макарычы, Белін, Навасёлкі (на Прыпяці), Шастовічы і бескурганны могільнік каля в. Снядзін
8—10 ст. н. э.	Культура тыпу Лукі Райкавецкай (дрыгавіцкае княства) — селішчы каля Петрыкава (уроч. Перавоз, Старарэчча, Белка), Бяланавічы, Макарычы
10—13 ст. н. э.	Эпоха Тураўскага княства — г. Петрыкаў і селішчы каля вв. Макарычы, Шастовічы, Снядзін, Млынок, Майсеевічы, Слабодка Чалюшчавіцкая, курганныя могільнікі каля мястэчка Капаткевічы і вв. Брынёў, Ванюжычы, Камаровічы, Капцэвічы, Лучыцы, Мардзвін, Белін, Міцуры, Малыя Сялюцічы, Фаставічы, Беседы, Івашкавічы, Вялаўск, Колкі



Старажытная Пакроўская царква, перанесеная ў 1836 г. з Сотніч на петрыкаўскія гарадскія могілкі

10 ст.	Народнае паданне аб заснаванні Петрыкава легендарным яцвяжскім князем Пятром
1523 г.	у Петрыкаве «писанъ листъ короля Сигизмунда жителямъ места Городнянского. Горностай писаръ — подъ летъ Бож. нарож. 1 пятьсоть 23, 1 декабра». Першае ўпамінанне аб Петрыкаве ў «Актах Литовско-русского государства».
Першая палова 16 ст.	Землі Петрыкаўшчыны адышлі ў спадчыннае ўладанне слуцкіх князёў Алелькавічаў. Князь Юрый Сямёнавіч Алелька пабудаваў у Петрыкаве драўляную крэпасць
1535 г.	Міжусобная вайна вялікага маскоўскага князя Васілія IV з вялікім літоўскім князем Сігізмундам. Крэпасць Петрыкаў разбурана ваяводай Аўчынай
1595 г.	Захоп і разбурэнне Петрыкава паўстанцамі Севярына Налівайкі
1638 г.	Будаўніцтва Крыштафорам Хадкевічам Благавешчанскага касцёла ў Петрыкаве



Спакойна і павольна, як у зачараваным сне, утуліўшыся ў балоты, нясе Прыпяць сухадоламу Дняпру сваю багатую даніну...

Першая чвэрць 17 ст.	Будаўніцтва мазырскім старастай, віленскім каштэлянам Крыштафорам Хадкевічам уніяцкай царквы ў Петрыкаве, стварэнне ўніяцкай канфесіі
1642 г.	Пабудавана Успенская царква ў в. Кашэвічы
1655 г., ліпень	Авалоданне Петрыкавам рускімі войскамі і казакамі ў час паўстання Багдана Хмяльніцкага
1693 г.	Пераход Петрыкава ва ўладанне Пацаў
1737 г.	Антыфеадальнае выступленне сялян у Навасёлках
1761 г.	Рэлігійны канфлікт паміж праваслаўнымі і каталіцкімі вернікамі ў Петрыкаве
1839 г.	Пабудавана Мікалаеўская царква ў Петрыкаве
1844 г.	Нарадзіўся В. І. Талаш
1846 г.	Пабудавана Уваскрасенская царква ў Петрыкаве
1861 г., красавік	Сялянскія хваляванні ў Брынёве і Дарашэвічах

На выстаўцы вырабаў народнай творчасці ў Капаткевічах

1863 г.	Адкрыты першыя народныя вучылішчы ў Петрыкаве, Капаткевічах, Макарычах, Лучыцах
1884 г., 23 мая	Узброенае выступленне сялян в. Чалюшчавічы ў час размежавання зямель
1890 г.	Пабудавана Узнясенская царква ў Петрыкаве
1906 г., красавік	Узброенае выступленне сялян в. Церабаў і Беседкі
1911 г.	У Петрыкаве адкрыта прыватнае жаночае вучылішча
1912 г.	Адкрыты народныя вучылішчы ў Беседках, Багрымавічах, Дуброве, Пцічы, Глінцы, Касішчы
1915 г., чэрвень	Забастоўка рабочых на фанернай фабрыцы Кеневіча
1917 г., чэрвень	Забастоўка рабочых фанерна-лесапільнага завода Бермана на ст. Пціч
1917 г., снежань	Устанаўленне савецкай улады ў Петрыкаўскай і Капаткевіцкай валасцях

Мемарыяльны комплекс «Загінуўшым і жывым» у Навасёлках

Канец лютага 1918 г.	Петрыкаўшчына захоплена войскамі кайзераўскай Германіі і ўвайшла ў склад «Украінскай дзяржавы» гетмана П. Скарападскага
Снежань 1918 г.— студзень 1919 г.	Петрыкаўшчына вызвалена ад немцаў і гайдамакаў часцямі Чырвонай Арміі
Восень 1919 г.	Петрыкаўшчына захоплена польскімі войскамі
Другая палова ліпеня 1920 г.	Петрыкаўшчына вызвалена ад палякаў часцямі Чырвонай Арміі
Ліпень 1920 г.	Арганізацыя ў Петрыкаве, Капаткевічах, Ляскавічах, Камаровічах, Лучыцах, Грабаве валасных рэўкомаў
7 верасня 1920 г.	У в. Лучыцы арганізавана валасная камуністычная ячэйка, старшынёй якой выбраны Андрэй Содэль
9—11 лістапада 1920 г.	Петрыкаўшчына захоплена атрадамі Булак-Балаховіча

Бярозавы гай. Ваколіца в. Людзвіноў

17 жніўня 1941 г.	На тэрыторыі Церабаўскага сельсавета створаны першы партызанскі атрад з байцоў знішчальнага батальёна пад камандаваннем Х. І. Варгаўціка
18 жніўня	Арганізацыя Петрыкаўскага падпольнага райкома КП(б)Б (да 21 кастрычніка 1941 г.). Узноўлены ў красавіку 1943 г.
21 кастрычніка	Разгром петрыкаўскага партызанскага атрада. Гібель Х. І. Варгаўціка
Красавік 1942 г.	Арганізацыя камсамольска-маладзёжнай падпольнай групы ў Петрыкаве пад кіраўніцтвам Ф. В. Кляўцова (да студзеня 1943 г.)
1 кастрычніка	Узрыў чыгуначнага моста праз р. Пціч агульнымі сіламі атрадаў Палескай і Мінскай абласцей
8 кастрычніка	Арганізацыя Капаткевіцкага падпольнага райкома камсамола
1 студзеня 1943 г.	Арганізацыя Петрыкаўскага падпольнага райкома камсамола

Капліца Уазнясенскай царквы

Студзень 1943 г.	Створана 125-я Капаткевіцкая партызанская брыгада
21 студзеня	Л. М. Чарнобылец узарвала будынак гебітскамісарыята ў Петрыкаве
Сакавік	Створана 210-я Капаткевіцкая партызанская брыгада
Красавік	Арганізацыя Капаткевіцкага падпольнага райкома КП(б)Б
27 ліпеня	Створана 130-я Петрыкаўская партызанская брыгада
Снежань	Створана 150-я партызанская брыгада імя Ф. М. Языковіча
30 чэрвеня 1944 г.	Вызвалены г. Петрыкаў і г. п. Капаткевічы. Здзейсніў свой бессмяротны подзвіг Герой Савецкага Саюза М. П. Чалы
6 ліпеня	Поўнасцю вызвалены Петрыкаўскі і Капаткевіцкі раёны

На раённым фестывалі самадзейнай песні «Мой родны кут, як ты мне мілы» выступае фальклорна-этнаграфічны ансамбль в. Церабаў

Жнівень 1944 г.	Адкрыта педагагічнае вучылішча ў г. п. Капаткевічы
28 жніўня 1946 г.	Памёр В. І. Талаш
12 ліпеня 1953 г.	У Петрыкаве адкрыты помнік В. І. Талашу
25 снежня 1962 г.	Скасаваны Капаткевіцкі раён, яго тэрыторыя далучана да Петрыкаўскага
1964 г.	Адкрыты малаказавод у Петрыкаве
1978 г.	Адкрыты керамзітавы завод
7 лютага 1989 г.	Адкрыты музей В. І. Талаша
7 студзеня 1995 г.	Асвечана Свята-Узнясенская царква ў Навасёлках

Да чытача

Адным з найбольш самабытных і цікавых у геаграфічных, этнаграфічных, гістарычных адносінах куткоў Палесся з'яўляецца Петрыкаўшчына. Сціплы і непрыкметны знешне, гэты край паўстае надзвычай багатым і шчодрым уважлівым даследчыкам, кожнаму зацікаўленаму чалавеку, які не абыякавы да Беларусі, яе гісторыі, культуры, мовы.

Петрыкаў, заснаваны, па паданні, легендарным яцвяжскім князем Пятром на высокім беразе Прыпяці, мае багатую і мала даследаваную гісторыю. Папоўніць яе ў некаторай ступені дазволіць дакументальна-гістарычная хроніка Памяці, прысвечаная Петрыкаўскаму раёну. Кніга — даніна павагі і ўшанавання тых, хто змагаўся за родны край, вызваляў і аднаўляў яго, хто аддаў сваё жыццё на франтах грамадзянскай і Айчыннай войнаў, у партызанскіх атрадах і падполлі, бязвінна высланы, арыштаваны і расстраляны ў гады сталінскага беззаконня, спалены і расстраляны фашыстамі ў сваіх вёсках і пасёлках, хто адпакутаваў, выстаяў і перамог, узнавіў краіну з попелу.

Кніга стваралася вялікім калектывам гісторыкаў і краязнаўцаў, літаратараў і навукоўцаў на падставе дакументаў, успамінаў, навуковых даследаванняў і літаратурных твораў. У ёй выкарыстаны дакументы Нацыянальнага і Нацыянальнага гістарычнага архіваў Беларусі, Расійскага дзяржаўнага ваеннага архіва, Расійскага дзяржаўнага архіва ВМФ, Гомельскага абласнога і філіяла абласнога архіва ў Мазыры, школьных музеяў. Агульнымі намаганнямі грамадскасці на аснове дакументаў, успамінаў удзельнікаў вайны, мясцовых жыхароў устаноўлены імёны звыш 700 ахвяр сталінскага генацыду, каля 6200 землякоў, загінуўшых на франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскіх атрадах, 4600 мірных жыхароў — ахвяр фашысцкага тэрору, 3620 партызан і воінаў Чырвонай Арміі, якія склалі галаву пры абароне раёна ў 1941 г. і ў час яго вызвалення. На жаль, нельга сёння сказаць з упэўненасцю, што імёны ўсіх ахвяр, усіх загінуўшых землякоў устаноўлены і апублікаваны ў кнізе Памяці. Пошук герояў землякоў працягваецца, яны не павінны застацца ў невядомасці і так сысці ў нябыт...



Петрыкаўскі раён утвораны 17.7.1924 г. Плошча 2,8 тыс. кв. кіламетраў. Населеных пунктаў 126, у тым ліку г. Петрыкаў (з 3.7.1925 г.) і г. п. Капаткевічы (з 27.9.1938 г. да 1962 г.— цэнтр раёна). 16 сельскіх саветаў: Бабуніцкі, Галубіцкі, Грабаўскі, Камаровіцкі, Капцэвіцкі, Колкаўскі, Конкавіцкі, Лучыцкі, Ляскавіцкі, Муляраўскі, Мышанскі, Навасёлкаўскі, Петрыкаўскі, Пціцкі, Снядзінскі, Чалюшчавіцкі, Капцэвіцкі пасялковы савет. На 1.1.1995 г. у раёне пражывала 49,3 тыс. чал., у Петрыкаве — 12 970, у Капаткевічах — 4200 чал.

Тэрыторыя раёна размешчана ў межах Прыпяцкага Палесся на вышыні 136 м над узроўнем мора. Карысныя выкапні: Петрыкаўскае радовішча калійных і каменных соляў (больш 2 млрд. т), Брынёўскае радовішча бурага вугалю (38 млн. т), радовішчы торфу з агульнымі запасамі 46,1 млн. т, сем радовішчаў глін і суглінкаў (13 млн. м^3), тры радовішчы будаўнічага пяску (1,7 млн. м^3). Сярэдняя тэмпература студзеня — 6 °С, ліпеня — 18,6 °С. Ападкаў 554 мм за год.

Працякае найбольшая рака Палесся Прыпяць з прытокамі Бобрык, Пціч, Трэмля, Убарць. Возера Дзікае (69 га). Пад лесам занята 53 % тэрыторыі раёна. Сельгасугоддзі займаюць 90,1 тыс, га, у тым ліку ворыва — 47,5 тыс. га. Асноўныя землекарыстальнікі — 11 калгасаў і 12 саўгасаў. Суднабудаўнічы, для сушкі агародніны, керамзітавы, цагельны і іншыя заводы.

Выдаецца раённая газета «Петрыкаўскія навіны».

Край палескі, край бацькоўскі...

Петрыкаўшчына — самабытны, непаўторны край, падпяразаны Прыпяццю, спавіты блакітнымі ранішнімі туманамі, вышыты яркімі краскамі лета... Апісаны Якубам Коласам і Міколам Гамолкам, апеты Алесем Дударом і Сяргеем Дарожным — славутымі землякамі, гэты ціхі куток Беларусі цікавіць і вабіць усіх, хто любіць родны край, не абыякавы да сваёй радзімы, яе гісторыі, запаветных мясцін.

Петрыкаў... Адразу ўзгадваецца легендарны дзед Талаш, сімвал Беларускага Палесся, любімы народны герой, з добрымі — добры і памяркоўны, з вясёлымі — гарэзлівы і гаваркі, са сваімі — гасцінны, з ворагамі — непрымірымы, як і ўвесь наш народ. Колькі ворагаў пражыў ён, і ніхто не змог зламаць волю дрыгавічоў-беларусаў, іх адчайнасць і мужнасць у ліхую гадзіну — ні татарскія заваёўнікі, ні польскія захопнікі, ні нямецкія акупанты. Ніколі не цярпелі яны чужынцаў — ціхмяныя і дабрадушныя ў мірны час, гордыя і ваяўнічыя ў час варожай навалы. Такі тут спрадвеку жыве народ — працавіты і непакорны, і карані яго ідуць у глыбіню стагоддзяў, да блізкага адсюль сівога Турава. «Палешукі мы, а не чалавекі», — гаварылі тут калісьці, так даўно, што ўжо і не на памяці старажылаў, тых, хто і цяпер гаворыць, як у даўнія часы, не Петрыкаў, а Петрыкоў — з націскам на апошнім складзе. Так

На Прыпяці каля Петрыкава

Героі коласаўскай «Дрыгвы» — легендарны дзед Талаш з сынам Апанасам

называў сваё мястэчка і дзед Талаш. Але ж жывуць тут сапраўдныя людзі!..

Палессе, родная старонка... Нельга застацца абыякавым да яго крыніц, да рэк і азёр, да гоману бароў, да шырокай і вольнай Прыпяці, якой беларускі пясняр Якуб Колас прысвяціў шчырыя, пранікнёныя радкі: «Лагодна і ўтульна разляжацца яна ў мяккіх берагах, калі над Палессем рассыплецца сонца мільярдамі залатых крупак святла. Спакой і цішыня пануюць над зялёнымі аксамітамі балот і лясоў. Бліскучаю сталёваю стужкай ззяе Прыпяць, і толькі ў глыбозных чорных буктах яе плёскаюцца самы, узнімаючы срэбныя кругі-абручы». Хораша тут зімой, калі нерухома стаіць амярцвелы лес, шчыльна прытуліўшы верхавіны да верхавін, пераплёўшы галіны, укрыўшыся белымі шатамі крохкай, шапаткой шэрані, калі ні звер, ні чалавек, ні птушка не парушаць яго зімні спакой, і вясной, калі дрэвы апрануцца ў новую зялёную вопратку, і такую паважную, поўную свайго мудрага сэнсу гутарку вядзе дрэва з дрэвам, лісток з лістком, былінка з былінкай, а ў гэтых дрэвах, лістках і былінках пераклікаюцца птушкі, казуркі, і іх галасы зліваюцца ў адну сімфонію дзівоснай музыкі жыцця, і ўлетку, калі зямля дыхае на поўныя грудзі, дрыготка мроіцца расплаўленае паветра, і сонца ніяк не хоча хіліцца да небасхілу, не можа налюбавацца велічнасцю і прыгажосцю адноўленага жыцця...

Непазнавальна змяніўся край, яшчэ нядаўна край лясоў і балот... Але, як і стагоддзі назад, такое ж высокае, чыстае неба над ім, такія ж задуменныя, ціхія раніцы ў канцы лета, такія ж напоўненыя працоўным рытмам вясенія дні...

Можна доўга глядзець і ніяк не налюбавацца далёкімі зарэчнымі прасторамі з высокага берага Прыпяці ў Петрыкаве, дзе калісьці стаяла пабудаваная для абароны ад татарскіх набегаў драўляная крэпасць. Далёка бачыцца адсюль, лёгка думаецца, вольна дыхаецца... Гэта родная Беларусь, Палессе, Петрыкаўшчына, у блакітным небе якой уюцца, звіняць сярэбранымі званочкамі, славяць мір і спакой на Зямлі нябачныя жаўранкі...

Васіль Феранц

АД ЧАСОЎ ПЕРШАБЫТНЫХ

1917

ЗЯМЛЯ НАШЫХ ПРОДКАЎ

Сляды сівой даўніны

Каля 100 помнікаў розных археалагічных эпох ад мезаліту да позняга сярэднявечча зафіксавана на тэрыторыі сучаснага Петрыкаўскага раёна. Яны сталі вядомымі дзякуючы намаганням шэрагу пакаленняў археолагаў і краязнаўцаў. Першыя раскопкі на Петрыкаўшчыне правёў у 80-х гадах XIX ст. граф І. Тышкевіч, які даследаваў каля 35 курганоў з 50, размешчаных каля в. Шастовічы. На жаль, атрыманыя ім матэрыялы засталіся невядомымі.

Вялікая роля ў вывучэнні пахавальных помнікаў дрыгавічоў належыць прафесару Кіеўскай духоўнай акадэміі У. Завітневічу. Ён быў па паходжанні беларусам, сынам святара са Скрыгалава, таму з асаблівай павагай і сімпатыяй ставіўся да палешукоў, іх культурных і гістарычных традыцый. У 1889 г. У. Завітневіч праводзіў раскопкі курганных могільнікаў на тэрыторыі ад Мазыра да Турава. На Петрыкаўшчыне ён даследаваў курганы X — XII ст. каля вв. Шастовічы (у шэрагу навуковых прац гэты могільнік прывязваецца да в. Глініца), Вялаўск, Міцуры, Ванюжычы, Камаровічы, г. п. Капаткевічы. Усяго ім вывучана ў гэтых могільніках 87 насыпаў. Да сённяшняга дня раскопкі У. Завітневіча застаюцца буйнейшымі даследаваннямі дрыгавіцкіх старажытнасцей. У першапачатковым летапісе «Аповесці мінулых гадоў» адзначаецца, што дрыгавічы рассяляліся паміж Прыпяццю і Заходняй Дзвіной. У. Завітневіч паставіў мэту археалагічным шляхам удакладніць межы тэрыторыі летапіснага народа дрыгавічоў і ў значнай ступені гэта яму ўдалося. Ён прасачыў характэрныя рысы пахавальнага абраду, якія вылучалі дрыгавічоў сярод суседніх славянскіх плямён гэтага часу. Акрамя курганоў У. Завітневіч звярнуў увагу і на такую катэгорыю археалагічных помнікаў, як гарадзішчы. Ён пісаў, што гэтыя ўмацаванні маглі служыць для абароны жыцця і маёмасці жыхароў некалькіх размешчаных паблізу пасёлкаў. Даследчык адзначыў 7 гарадзішчаў у Камаровіцкай воласці і 9 у Лучыцкай.

У 1930 г. краязнаўца А. Рынейскі даследаваў ужо вядомыя і вёў пошук новых помнікаў па берегах р. Пціч. У ніжнім цячэнні ракі ён упершыню на тэрыторыі раёна выявіў стаянкі эпохі каменю і бронзы, грунтавы могільнік другой чвэрці I тысячагоддзя н. э. і селішчы XI — XIII ст. з ранне-кругавой керамікай каля вв. Івашкавічы (уроч. Шутава Гара, Карашова), Слабодка Чалюшчавіцкая (уроч. Дворышча, Дуброўка), адзначыў шэраг курганных могільнікаў у ваколіцах Капаткевіч, Івашкавіч, Бесед, Лучыц, Слабодкі Чалюшчавіцкай. Многія з іх развораны. Апісаў камень з высечаным на ім крыжам ва уроч. Раі каля Лучыц, сабраў ад мясцовых жыхароў звесткі аб наяўнасці балотных гарадзішчаў каля

вв. Філіпавічы, Хвойня і Лучыцы.

У 1932 г. на Палессі працавала археалагічная экспедыцыя секцыі археалогіі Акадэміі навук Беларусі ў складзе А. Ляўданскага і А. Кавалені, якая на Прыпяці ад Турава да Юравіч выявіла 10 паселішчаў розных эпох, а таксама зафіксавала адклады балотнай руды і сляды старажытных рудняў. На жаль, аб гэтых работах захавалася ў асноўным папярэдняя інфармацыя, таму што археолагі не паспелі як след прааналізаваць і апублікаваць атрыманы матэрыял у сувязі з іх беспадстаўным арыштам і расстрэлам у 1937 г.

На аснове разрозненых звестак і рэшткаў даваеннай археалагічнай калекцыі можна меркаваць, што ў ліпені 1932 г. А. Ляўданскі і А. Каваленя на тэрыторыі Петрыкаўшчыны адкрылі тры паселішчы з матэрыяламі эпохі каменю і жалезнага веку каля в. Лясковічы (на хут. Гарадзішча, каля Млына і ва ўроч. Кабачок), два паселішчы — каля в. Майсеевічы. Вельмі цікавыя даныя былі атрыманы таксама ў ваколіцах г. Петрыкава, дзе даследчыкі выявілі 4 паселішчы з матэрыяламі эпохі бронзы, другой паловы I тысячагоддзя н. э. і X — XIII ст. На селішчы ва ўроч. Крутуха на паўднёва-заходняй ускраіне горада праведзены раскопкі, выяўлены 3 паўзямлянкавыя жытлы 3-й чвэрці I тысячагоддзя н. э.

У 1957 г. тэрыторыю раёна вывучала маскоўскі археолаг В. Мельнікоўская, якая выявіла селішчы каля вв. Лучыцы і Вялікае Поле на правым беразе р. Пціч. У першай палове 60-х гадоў абследаванні па берагах Прыпяці і Пцічы правёў навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі АН Беларусі У. Ісаенка. Ён адкрыў новыя помнікі розных эпох каля вв. Лясковічы, Дарашэвічы, Вышалаў, Вялаўск, Галубіца, Турок, Макарычы, Навасёлкі (на Прыпяці), Шастовічы. У гэты ж час пошукавыя працы правялі даследчыкі з Інстытута археалогіі АН СССР Ю. У. Кухарэнка і В. В. Сядоў. Апошні ўпершыню апісаў два балотныя гарадзішчы каля в. Хвойня і адно на паўднёвы захад ад Філіпавіч. У 1976 г. у час падрыхтоўкі да выдання «Збору помнікаў гісторыі і культуры Беларусі» гарадзішчы каля вв. Навасёлкі і Хвойня, рэшткі печы па выпальванню драўнянага вугалю каля в. Фаставічы адкрыў В. Шадыра. У 80 — пачатку 90-х гадоў паверхневыя зборы на адкрытых помніках і пошук новых праводзілі навуковыя супрацоўнікі Інстытута гісторыі АН Беларусі М. Крывальцэвіч, В. Кудрашоў, В. Вяргей. Асабліва значныя калекцыі, якія налічвалі сотні артэфактаў з крэменю і гліны, сабраны на шматслойных паселішчах каля вв. Майсеевічы, Шастовічы і Навасёлкі (на Прыпяці). У 1992 г. дэталёвае абследаванне археалагічных помнікаў раёна правяла В. Вяргей, што дало магчымасць у шэрагу выпадкаў удакладніць іх месцазнаходжанне, культурную прыналежнасць, памеры, знешнія прыкметы, сучасны стан і выявіць новыя паселішчы розных эпох, асобныя курганы і курганныя могільнікі, печы па выпальванню драўнянага вугалю каля вв. Мардзвін, Снядзін, Белін, Бобрык, Івашкавічы, Макарычы.

Пэўны ўклад у вывучэнне археалагічных крыніц унеслі мясцовыя краязнаўцы. Яшчэ ў 1928 г. Тарановіч адзначыў наяўнасць слядоў селішча эпох жалеза і сярэднявечча ва ўроч. Старое Сяло ў 2 км на паўднёвы захад ад в. Лясковічы. Невялікія археалагічныя калекцыі захоўваюцца ў школах, напрыклад у вв. Навасёлкі, Лучыцы. Шэраг балотных гарадзішчаў каля вв. Навасёлкі, Філіпавічы, Боркі абследаваў у 80-х гадах настаўнік Навасёлкаўскай школы М. Селех. Пры значнай колькасці выяўленых і апісаных старажытных паселішчаў і могільнікаў іх характарыстыка абапіраецца пакуль што на вынікі паверхневых збораў.

Абапіраючыся на аналагі суседніх тэрыторый, існуе магчымасць у агульных рысах рэканструяваць старажытнейшы перыяд гісторыі Петрыкаўшчыны. Гэты перыяд не адлюстраваны ў

АРХЕАЛАГІЧНЫЯ ПОМНІКІ ПЕТРЫКАЎСКАГА РАЁНА



1—2 — Фаставічы

3 — Камаровічы 4—7 — Хвойня

8—10 — Лучыцы 11 — Капцэвічы(на Пцічы) 12 — Вялікае Поле

13—14 — Слабодка Чалюшчавіцкая 15 — Капаткевічы

■ — ГАРАДЗІШЧА *16—18 — Івашкавічы 19—20 — Млынок 21 — Багрымавічы*

● — СЕЛІШЧА *22—26 — Навасёлкі 27 — Філіпавічы 28—31 — Ванюжычы*

▲ — СТАЯНКА *32—35 — Бобрык 36 — Малыя Сялюцічы 37 — Капцэвічы*

— КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК *38 —40 — Брынёў 41—42 — Ляскавічы 43 — Кабачок*

— БЕСКУРГАННЫ МОГІЛЬНІК *44—46 — Дарашэвічы 47 — Славінск 48—49 — Галубіца*

— МЕСЦАЗНАХОДЖАННЕ *50 — Вышалаў 51—52 — Турок (Батрак) 53—55 — Снядзін*

— ПОМНІК ЗНІШЧАНЫ *56 — Белены 57—60 — Мардзвін 61—63 — Макарычы*

— ПЕЧ ПА ВЫПАЛЬВАННЮ ДРАЎЛЯНАГА ВУГАЛЮ *64—68 — Петрыкаў 69—72 — Майсеевічы 73—74 — Вялаўск*

75—79 — Шастовічы 80—81 — Бяланавічы

— КАЛОДЫ *82—85 — Навасёлкі (на Прыпяці) 86—87 — Міцуры*

— КАМЯНІ *88 — Востраў (Курыцічы)*

пісьмовых крыніцах, ён з'яўляецца ананімным, мы не ведаем назваў народаў і паселішчаў і абыходзімся адвольнымі абазначэннямі («мілаградцы», «зарубінцы» і інш.). Мы маем справу з пэўнымі грамадствамі, перш за ўсё радавымі абшчынамі, іх культурай, спосабамі гаспадарання, узаемаадносінамі з прыродай, аб якіх з глыбінь тысячагоддзяў дайшлі да нас матэрыяльныя сведчанні.

* * *

Абжыванне ўсходняга Палесся распачалося з паўднёвага ўсходу і ішло ўверх па цячэнні Прыпяці і Пцічы. Следам за статкамі дзікай жывёлы рухаліся старажытныя паляўнічыя і збіральнікі, яны асядалі на рачных берагах, абжывалі паселішчы. Такая стаянка выяўлена ў в. Юравічы Калінкавіцкага раёна. 26 тыс. гадоў назад прыйшлі сюды людзі, аблюбавалі мясціну, збудавалі свае няхітрыя жытлы. Чалавек быў сучаснага фізічнага тыпу, жыў ён ва ўмовах суровага арктычнага клімату. У тую эпоху, якую называюць верхнім палеалітам, магутны ледавік пакрываў значную частку Еўропы, у тым ліку і паўночную Беларусь. На поўдзень ад ледавіка працягнулася тундра, дзе панавала вечная мерзлата, за тундрай пачыналіся халодныя стэпы. Навокал блукалі маманты, статкі зуброў і дзікіх коней, вадзіліся шарсцістыя насарогі, мядзведзі, алені, ваўкі. Паляванне на дзікую жывёлу, асабліва на маманта, было галоўным заняткам тагачаснага чалавека. Сярод экспанатаў школьнага музея ў Навасёлках захоўваюцца асобныя фрагменты біўняў маманта, якія знайшлі мясцовыя жыхары ва ўроч. Жукаўшчына. Біўні, узнятыя на паверхню плугам, залягалі на мінеральным гарызонце, зверху перакрытым слоем торфу. Астатнія косткі не захаваліся. Не ўдалося выявіць і слядоў палеалітычнага чалавека, які быў сучаснікам маманта.

Вялікія змены ў жыцці чалавека каменнага веку звязаны з раставаннем ледавіка. Гэта адбылося пазней, у сярэднім каменным веку — мезаліце (IX — V тысячагоддзі да н. э.). Клімат стаў значна цяплейшым, буйна зазелянелі рачныя поймы, зашумелі лясы. Талыя воды запаўнялі нізіны, утварыўшы разлівы азёр. Паднялася вада ў Прыпяці і яе прытоках. Чалавек прыстасоўваўся да новых прыродных умоў. Старажытныя людзі сяліліся далей ад ракі ці на яе крутых берагах, засцерагаючыся паводак.

На захад ад в. Дарашэвічы, дзе верхняя надабалонная тэраса крута спадае да Прыпяці, археолагі выявілі паселішча чалавека, які жыў тут у мезаліце. Вузкай стужкай выцягнулася яно між пясчаных выспаў уздоўж дарогі на Ляскавічы. Рэшткі культурнага слоя тут апынуліся на паверхні. На чырванаватым пяску-артзандзе, месцамі перакрытым падзолістымі слаямі, былі падабраны шматлікія крамяні. Багатую калекцыю старажытных інструментаў пакінулі жыхары стаянкі. Яна складаецца з тронкавых лістападобных і пласцінкавых наканечнікаў стрэл, скрабкоў і разцоў рознай формы і памераў. Шмат тонкіх пласцінак з крэменю, адшчэпаў, нуклеусаў. Сустракаюцца маленькія крамяні-мікраліты трохвугольнай і трапецападобнай формы. Больш знаходак трапляецца каля попельных плямаў ад вогнішчаў. Тут жылі людзі ў VII — VI тысячагоддзях да н. э. З костак і дробных рэтушаваных крамянёў-укладышаў яны выраблялі прылады працы і зброю.

Жыхары мезалітычнай стаянкі каля Дарашэвіч выкарыстоўвалі лук і стрэлы. Зброя давала магчымасць паляваць на дзічыну, якая раней была недаступнай. Пераходзячы з месца на месца ў пошуках звера і рыбных угоддзяў, чалавек вёў рухомы спосаб жыцця. Гэта наклала адбітак на аблічча мезалітычных паселішчаў. Стаянкі сталі недаўгачаснымі і невялікімі, яны складаліся з некалькіх лёгкіх жытлаў, збудаваных з жэрдак, галля, трыснягу, уцепленых



травой і мохам. Магчыма, пры пераходзе на новае месца іх разбіралі і пераносілі. Для супольнага ладу жыцця па-ранейшаму была характэрна родавая арганізацыя. Родавыя абшчыны падтрымлівалі паміж сабой устойлівыя сувязі і аб'ядноўваліся ў плямёны. У мезаліце тэрыторыя Петрыкаўшчыны стала засяляцца аўтатхтонным насельніцтвам. Аб гэтым сведчаць мезалітычныя стаянкі каля вв. Макарычы, Ляскавічы, Майсеевічы, Навасёлкі.



Крамянёвы інвентар эпохі мезаліту са стаянкі Майсеевічы 1: *1—4* — наканечнікі стрэл; *5, 6* — вастрыі; *7, 8* — скробачы; *9—12* — разцы; *13—16* — скрабкі; *17* — праколкі; *18* — сякера; *19, 20* — трапецыі (укладышы)

Найбольш вялікая калекцыя мезалітычнай эпохі, якая складаецца з 7700 адзінак крамянёвых вырабаў, атрымана ў час працы Цэнтральна-палескага археалагічнага атрада Інстытута гісторыі АН Беларусі ў складзе В. Вяргей, М. Крывальцэвіча і В. Кудрашова на стаянцы каля в. Майсеевічы. Усе рэчы выраблены з крэменю светла-шэрых і цёмна-шэрых адценняў. Стадыя першаснага расшчаплення прадстаўлена нуклеусамі, сколамі афармлення і падпраўкі нуклеусаў, сколамі-нарыхтоўкамі (нуклеус — ядрышча крамянёвага жаўлака, якое застаецца пасля аббіўкі ад яго адшчэпаў і пласцінак). Пласцінкам і адшчэпам шляхам аджымнай рэтушы надавалі патрэбную форму, выраблялі прылады працы і зброю. Найбольш шматлікай катэгорыяй прылад на Майсеевіцкай стаянцы былі скрабкі для апрацоўкі скуры і дрэва. Знойдзены таксама свёрдлы-праколкі, разцы, якія прызначаліся для апрацоўкі цвёрдай паверхні, сякерападобныя прылады, рэтушаваныя пласціны-нажы. Асабліва паказальнымі ў вызначэнні характэрных рыс і храналогіі матэрыяльнай культуры з'яўляюцца мікраліты — састаўныя часткі паляўнічага рыштунку і наканечнікі стрэл.

У V тысячагоддзі да н. э. у паўднёвай Беларусі пачаўся новы каменны век — неаліт. Клімат быў значна цяплейшы, чым цяпер. Закончылася фарміраванне рэльефу, неабсяжныя шыракалістыя лясы, паплавы, вялізныя балоты нашага краю сталі прытулкам для розных відаў птушак, жывёлы. Азёры і рэкі кішэлі рыбай, многа вадзілася вадаплаваючай птушкі. Неалітычны чалавек найперш засяляў узбярэжжы праточных азёр, азёр-старыц, звязаных з ракою, берагі невялікіх рэчак-пратокаў паблізу вусцяў. Такія мясціны былі зручнымі месцамі для паселішчаў, надзейнымі сховішчамі, невычэрпнымі крыніцамі харчавання. Неалітычныя стаянкі на тэрыторыі сучаснага Петрыкаўскага раёна выцягнуліся ўздоўж Прыпяці і яе прытокаў. Яны выяўлены каля вв. Дарашэвічы, Галубіца, Шастовічы, Майсеевічы, Мардзвін, Вялаўск, Кабачок, Вышалаў, Навасёлкі (на Прыпяці). Пэўныя адзнакі такіх стаянак назіраюцца каля Петрыкава ва ўроч. Беркава Гара і на ўсходняй ускраіне вв. Белка і Бяланавічы. На р. Пціч адкрыты дзве стаянкі каля в. Івашкавічы.

Найбольш даследаваны ранненеалітычная стаянка Навасёлкі 2 ва ўроч. Ключыха (4500—3500 гг. да н. э.), сярэдненеалітычныя Вышалаў, Шастовічы 3, Дарашэвічы 2 (3500—2500 гг. да н. э.), позненеалітычныя стаянкі Вялаўск, Майсеевічы ва ўроч. Мардзвінскае Стойла (2500—1800 гг. да н. э.).

Большасць прылад, як і раней, выраблялася з крэменю, але ён апрацоўваўся больш дасканала. Разам з ранейшымі спосабамі апрацоўкі — аббіўкай, счэсваннем, сколваннем, рэтушаваннем — прымяняюцца новыя, пашыраецца асартымент прылад. Неалітычны комплекс характарызуецца двухбакова апрацаванымі трохвугольнымі і ромбападобнымі наканечнікамі стрэл і серпападобнымі ўкладышамі, разнастайнымі пласцінкавымі нажамі, канцавымі і бакавымі скрабкамі і скоблямі, трапецападобнай формы сякерамі і цясламі. Характэрная рыса крамянёвай вытворчасці — шліфаванне як спосаб апрацоўкі.

Сыравінай для вырабу прылад служылі мясцовыя залежы крэменю. Яго россыпы сустракаюцца на паверхні марэн каля вв. Міхедавічы і Грабаў, недалёка ад поймы Прыпяці. Тайнік з крамянёвымі жаўлакамі, нуклеусам і дыскападобным адбойнікам, які знойдзены на стаянцы Навасёлкі 2, сведчыць, што нашы далёкія продкі бераглі не толькі гатовыя прылады, але і матэрыял, сыравіну.

Дзякуючы выкарыстанню больш дасканалых прылад з крэменю, косці і рога пашыралася апрацоўка



Паселішча эпохі неаліту каля в. Шастовічы на левым беразе р. Скалодзінкі

дрэва. З яго рабілі, відавочна, посуд, рукаяткі прылад, дрэўкі коп'яў і стрэл, выдзёўбвалі чаўны. Памеры паселішчаў былі невялікія, некалькі памяшканняў туліліся адно да другога на невялікай адлегласці ўздоўж берага возера або ракі. Кожнае з такіх жытлаў давала прыстанішча 6—10 чалавекам. Будаваліся наземныя жытлы з аблегчаным перакрыццем або крыху заглыбляліся ў зямлю. Сустракаліся больш складаныя пабудовы на палях. Рэшткі адной з такіх пабудоў захаваліся ў тоўшчы тарфяніку па р. Бобрык каля в. Міхедавічы. Для абагрэву памяшкання і прыгатавання ежы служылі каменныя агмені (Дарашэвічы 2).

Неаліт адметны вынаходніцтвам ляпнога гліняпага посуду. Яго рабілі з гліняных стужак, надаючы адпаведную форму і пэўныя памеры. Грэбенем, палачкай ці драбназубчатым штампам на згладжаную паверхню сценак наносіліся складаныя геаметрычныя арнаменты. Завершаная рэч абпальвалася для трываласці на агні. Каб посуд не трэскаўся, у гліну дабаўлялі раслінныя дамешкі (Навасёлкі 2), пазней — зярністы пясок ці жарству (Вышалаў, Вялаўск, Дарашэвічы 2 і інш.). Адметнасць неалітычнага посуду — завостранае канічнае днішча. У вогнішчы паміж камянямі такія гаршкі былі больш устойлівымі. Людзі яшчэ не карысталіся сталамі, печамі з плоскай чарэнню. Вынаходніцтва гліняпага посуду дазволіла чалавеку харчавацца варанай стравай.

Асвоіўшы новыя прыдатныя для жыцця мясціны, яны палявалі на дзікага звера і птушку, вудамі з касцянымі кручкамі, прыстасаваннямі з гнуткіх пруткоў лавілі рыбу, палявалі на яе гарпунамі, збіралі птушыныя яйкі. Высушанае карэнне чароту, трыснягу, рагозу ператваралі ў муку. Усё, што патрэбна было для жыцця, даваў лес.

У канцы неаліту ўзнікла іншая гаспадарка — вытвараючая, якая ствараласа на аснове невядомых да гэтага земляробства і жывёлагадоўлі. У познім неаліце, калі ўстанавіўся кантакт мясцовага насельніцтва з трыпольскімі плямёнамі на Украіне, земляробства адолела межы Палесся. На адваяваных у лесу сякерай і агнём палях людзі сеялі ячмень, проса, пшаніцу, лён, гадавалі кароў, свіней, коз і авечак. Наглядаць пастуху за статкам дапамагаў сабака. Збажыну жалі крамянёвымі серпападобнымі нажамі, магчыма, сярпамі, зерне расціралі каменнымі зернящёркамі.

Пастаяннымі жыхарамі, што насялялі Петрыкаўшчыну ў неаліце, былі плямёны культуры грабенчата-накольчатай керамікі, якая склалася тут у V — IV тысячагоддзях да н. э. на аснове плямён мясцовых мезалітычных культур. Плямёны гэтай культуры засялілі Беларускае Палессе і тэрыторыю сучаснай Украіны да Данца і Прыазоўя, таму гэтую культуру інакш называюць днепра-данецкай.

Прадстаўнікі днепра-данецкіх плямёнаў належалі да аўтатхтоннага еўрапейскага насельніцтва. Апраналіся яны ў скураное адзенне, насілі каралі і падвескі з ракавін і клыкоў, шліфаваных пласцінак. Адзенне і галаўныя ўборы, абутак упрыгожвалі зубамі рыбы, аленя, дзіка, касцянымі пласцінкамі.

Пераход да вытвараючых форм гаспадарання, узрастанне прадукцыйнасці працы суправаджаліся

ростам насельніцтва. Яму ўжо не хапала жыццёвай прасторы для гаспадарчай дзейнасці на берагах Прыпяці. Частка родавых калектываў была вымушана пакідаць супляменнікаў і пераходзіць на неабжытыя месцы. Напэўна, гэтым тлумачылася прасоўванне абарыгенаў далей на поўнач уверх па цячэнні р. Бобрык і Пціч у забалочаныя масівы.

На рубяжы III — II тысячагоддзяў да н. э. пачаўся бронзавы век. З поўдня і захаду на тэрыторыі сучаснага Петрыкаўскага раёна пранікаюць плямёны жывёлаводаў і земляробаў. Яны валодалі таямніцамі старажытнай металургіі, умелі карыстацца металам. Рассяленне земляробча-жывёлагадоўчых плямён сярод мясцовага насельніцтва, узаемадзеянне позненеалітычнай культуры з культурай, прынесенай звонку, сталі галоўным напрамкам далейшага гістарычнага развіцця. Земляробства і жывёлагадоўля як асноўны занятак вытвараючай гаспадаркі набылі асаблівы сэнс. Яны забяспечвалі больш высокі ўзровень жыцця. Чалавека цікавіла жыццёвая прастора. Жывёлаводу і земляробу патрэбны выпасы для жывёлы, урадлівыя глебы, лясныя і рачныя ўгоддзі. Усё далей на поўнач пранікалі яны ўглыб забалочаных масіваў у пошуках прыдатных мясцін для жыцця. Стаянкі раскіданы амаль па ўсёй тэрыторыі сучаснага Петрыкаўскага раёна, пачынаючы ад р. Прыпяць да Арэсы на поўначы, ад Пцічы да вытокаў р. Бобрык на захадзе. Тут выяўлена каля 20 археалагічных помнікаў бронзавага веку. Раскопкі на іх не праводзіліся, але паверхневыя зборы далі багаты і разнастайны матэрыял, які стаў падставай для характарыстыкі гэтай эпохі. Сляды бронзавага веку выяўлены ў зоне асушаных тарфянікаў у ваколіцах вв. Навасёлкі, Камаровічы, Фаставічы, Старыя Галоўчыцы, Філіпавічы, Ванюжычы, Забродцзе, Клясаў. У бронзавым веку людзі навучыліся здабываць з руды медзь і волава, сплаўляць іх у бронзу. Чалавек атрымаў не толькі новы, але і больш якасны матэрыял. З бронзы і медзі выкоўвалі і адлівалі ўпрыгажэнні, прылады працы, зброю. На стаянках і могільніках бронзавага веку трапляюцца найбольш даўнія металічныя пярсцёнкі, падвескі, скроневыя кольцы, шпількі-запінкі, бранзалеты, знаходзяць таксама шылы, сякеры-кельты, кінжалы, наканечнікі коп'яў. Аднак з-за адсутнасці медных і алавяністых руд у Беларусі такіх знаходак мала, амаль усе яны прывазныя.

Два старажытныя бранзалеты захоўваюцца ў гісторыка-краязнаўчым музеі Навасёлкаўскай сярэдняй школы. Іх знайшоў ва ўроч. Жукаўшчына, што непадалёку ад вёскі, механізатар Аляксандр Загорац на свежаўзаранай раллі. Адзін з іх пашкоджаны, другі — цэлы. Ён завіты ў спіраль з бронзавай пласціны ў пяць з паловай абаротаў у выглядзе ўсечанага конуса з дыяметрамі 5,5 і 6,5 см. Даўжыня канічнай спіралі 10 см.

Вырабы і зліткі металу шляхам абмену паступалі з Каўказа і Прыкарпацця пры пасрэдніцтве плямёнаў Паўночнага Прычарнамор'я. Пераважная большасць прылад працы і ў бронзавы век на Петрыкаўшчыне выраблялася са звычайных пародкаменю альбо з крэменю. У саперніцтве з меддзю для некаторых вырабаў, напрыклад наканечнікаў стрэл, крэмень меў шэраг пераваг, таму на берагах Прыпяці насельніцтва паранейшаму карысталася крамянёвымі прыладамі. Ля в. Макарычы трапляюцца наканечнікі стрэл, на заходняй ускраіне Галубіцы, непадалёку ад прыстані, знайшлі крамянёвы серп з прамой пяткай.

Пераход да земляробства, які патрабаваў расчысткі лесу пад поле, вымагаў мець буйныя па сваіх памерах і ў вялікай колькасці каменныя сякеры. Мясцовая сыравіна была непрыдатнай. Каб вырабіць сякеру, старажытнаму майстру патрэбны былі даволі вялікія жаўлакі крэменю, які звычайна залягае ў пластах мелу на глыбіні. Такіх радовішчаў на Петрыкаўшчыне няма, таму

крамянёвую сыравіну ці гатовыя вырабы з яе так, як і бронзу, даводзілася выменьваць у суседніх плямён і хутчэй за ўсё яна паступала сюды пры ўдзеле насельніцтва заходняга Палесся. Сярод трох дзесяткаў вырабаў з каменю, знойдзеных на асушаных тарфяніках паблізу Навасёлак і навакольных вёсак,— тры сякеры-кліны, долата, канцавы скрабок, два нуклеусы, дзесятак ножападобных пласцінак. Некалькі прылад зроблены з дыярыту, якога таксама няма ў нашай мясцовасці. Для вырабу большасці прылад выкарыстоўваўся звычайны камень. Такія сякеры знойдзены каля Капаткевіч, Лучыц, Галубіцы, каменныя матыкі захоўваюцца ў музеях Камаровіцкай і Лучыцкай школ.



Матэрыялы эпохі неаліту: *1—10, 15, 17—19* — крэмень; *11—14, 16, 20—22* — кераміка.

У бронзавым веку апрацоўка каменю дасягнула найвышэйшага росквіту. Вастрыню наканечнікам коп'яў і стрэл, лязам нажоў, сярпоў надавалі пры дапамозе струменьчатай рэтушы. Не забыта была пільчатая (зубчатая) рэтуш. Ёю карысталіся пры вырабе скрабкоў і скобеляў. У параўнанні з папярэдняй эпохай шырокую распаўсюджанасць набылі шліфаванне і паліроўка. Каменныя сякеры шліфаваліся па ўсёй паверхні, а не толькі лязо, як гэта было раней. Адкрыццём новай эпохі стала свідраванне адтулін для рукаятак. Вынаходніцтва новых і ўдасканаленне старых спосабаў апрацоўкі каменю, косці, дрэва стварылі магчымасць старажытным людзям палепшыць якасць сваіх вырабаў.

Рос асартымент каменных сякер. Па знешнім выглядзе іх можна падзяліць на два тыпы. Першы — па сваёй знешняй форме нагадвае шліфаваныя кліны са старанна апрацаваным лязом. Другі тып характарызуецца больш складанай формай, строгім захаваннем знешніх прапорцый, дакладна выкананай свідраванай адтулінай для рукаяткі. Кожны з гэтых тыпаў мае свае спецыфічныя асаблівасці профілю, размяшчэння свідраванай адтуліны, папярочнага сячэння і формы вырабу. У музейнай экспазіцыі Навасёлкаўскай школы знаходзяцца свідраваныя сякеры чатырох відаў: клінападобныя, кароткаабушковыя, ромбападобныя і трохвугольныя. Шліфаваныя сякеры-кліны падзяляюцца на востраабушковыя, тонкаабушковыя, тоўстаабушковыя, плоскія. Такую шырокую разнастайнасць каменных сякер можна тлумачыць розным характарам іх прызначэння. Старанна адпаліраваныя прылады са свідраванай адтулінай можна разглядаць як зброю першабытнага чалавека. У бронзавым веку сутыкаліся плямёны не толькі ў барацьбе за жыццёвую прастору, на познім яго этапе мелі месца наскокі з грабежніцкімі мэтамі. Напэўна, гэтым мэтам служылі сякера-клявец і каменная булава, знойдзеныя ў ваколіцах Навасёлак.

У бронзавым веку адбыліся перамены ў вырабе глінянага посуду, ён стаў пласкадонным. У гэтым яго галоўнае адрозненне ад неалітычнага посуду з канічным дном, якім дагэтуль карысталіся мясцовыя жыхары. Побыт чалавека да гэтага часу, відавочна, значна змяніўся, ён абедаў ужо на стале, карыстаўся міскай, кубкам, лыжкай.

На рубяжы III — II тысячагоддзяў да н. э. з поўдня рушылі жывёла-

гадоўча-земляробчыя плямёны культуры шнуравой керамікі — «шнуравікі». Яны карысталіся гліняным посудам, упрыгожаным адбіткамі шнура. Рассяліўшыся на вялікай прасторы, «шнуравікі» месцамі выціснулі, месцамі асімілявалі мясцовае насельніцтва днепра-данецкай культуры, якое раней жыло тут, і сталі дамінуючым элементам новай этнічнай супольнасці. Тыповымі для гэтай культуры з'яўляюцца наземныя жытлы слупавай канструкцыі, якія абаграваліся агменямі. Посуд прадстаўлены гаршкамі, амфарамі, кубкамі, якія былі багата аздоблены шнуравым, гусенічным і лінейным арнаментамі. Да ліку асноўных катэгорый інвентару адносяцца тронкавыя і ліставідныя наканечнікі дроцікаў, трохкутныя наканечнікі стрэл, пласцінкавыя і блізкія да трохкутнай формы нажы, шліфаваныя сякеры-клíны і прасверленыя сякеры, медныя і бронзавыя ўпрыгажэнні, касцяныя вырабы.

Могільнікі вядомы як курганныя, так і грунтавыя з трупапакладаннем і трупаспаленнем. У пахаваннях знаходзяць разнастайны інвентар, які складаецца з гліняных сасудаў, крамянёвых і каменных рэчаў, касцяных, янтарных, медных упрыгажэнняў, а таксама зброі і бытавых прадметаў з металу. У насельніцтва сярэднедняпроўскай культуры склалася дынамічная шматгалінавая гаспадарка, спалучаючая паляванне, рыбалоўства, земляробства і жывёлагадоўлю. На паселішчах знойдзены косткі кароў, коз, авечак, свіней, коней, а таксама матыкі, зерняцёркі, крамянёвыя сярпы, адбіткі зерня культурных раслін на гліняным посудзе.

Эпоха сярэдняй бронзы звязана на Петрыкаўшчыне з помнікамі ўсходнетшынецкай культуры, якая існавала ў XV — XII ст. да н. э. Плямёны тшынецкай культуры займалі вялізную плошчу ад басейна Віслы на захадзе да сярэдняга Дняпра на ўсходзе (ад паселішча Тшынец на тэрыторыі Польшчы, дзе былі выяўлены характэрныя для гэтага часу старажытнасці прадметы). Усходне-тшынецкая культура цэнтральнага Палесся складалася, як мяркуе М. Крывальцэвіч, на аснове помнікаў палескага варыянту сярэднедняпроўскай культуры эпохі ранняй бронзы і дажыўшых да сярэдзіны II тысячагоддзя позніх неалітычных помнікаў. Невялікія пасёлкі ўсходнетшынецкага насельніцтва складаліся з некалькіх зямлянкавых жытлаў, каля іх знаходзіліся гаспадарчыя ямы-пагрэбы. Нябожчыкаў хавалі па абраду трупапакладання пад курганнымі насыпамі і па абраду трупаспалення ў грунтавых ямах. Найбольш характэрнымі для гэтай культуры былі ляпныя гаршкі з патоўшчаным краем вянца і маленькага дыяметру донцам. Верхняя частка гаршкоў звычайна ўпрыгожвалася пад



Матэрыялы эпохі бронзы: *1* — бранзалет; *2* — крамянёвы серп; *3, 4* — сасуды ўсходнетшынецкай культуры; *5* — бронзавыя бранзалет і шыла; *6—9* — наканечнікі стрэл; *10—12* — сасуды сярэднедняпроўскай культуры; *13—15* — сякеры



Прылады працы бронзавага веку — каменныя сякеры-кліны, долаты, цёрачнік, матыка, знойдзеныя каля вв. Навасёлкі і Фаставічы

вянцом кругавымі рыфлёнымі лініямі, ад якіх спускаліся вяршынямі ўніз трохкутнікі з прачэрчаных ліній. Выкарыстоўваліся крамянёвыя нажы, сярпы «валынскага» тыпу, тронкавыя і трохвугольныя наканечнікі стрэл з выемкай у аснове, праколкі, скрабкі, крамянёвыя сякеры, матыкі, цёслы. Прасочаны сляды мясцовай металургіі ў выглядзе жужлаў, цігляў, льячак. Знойдзены бронзавыя шылы, далоты, упрыгажэнні (падвескі, бранзалеты, шпількі, кольцы, бляшкі, фібулы).

Асновай гаспадаркі, відаць, была жывёлагадоўля, якой спрыялі багатыя травамі даліны Прыпяці і яе прытокаў. Значнае месца ў занятках жыхароў займалі земляробства, паляванне і іншыя промыслы. Матэрыялы ўсходнетшынецкай культуры выяўлены на шматслойных паселішчах Навасёлкі 1 і 2, Слабодка Чалюшчавіцкая 1 і 2, Майсеевічы 1 і 3, Шастовічы 3. На беразе р. Бобрык, каля вёскі Востраў, быў знойдзены цэлы невялічкі гаршчочак усходне-тшынецкай культуры.

Найменей даследаванымі на Палессі з'яўляюцца помнікі заключнага перыяду эпохі бронзы, які датуецца XI — IX ст. да н. э. З гэтым часам звязваюць лебядоўскую культуру (каля паселішча Лебядоўка на Украіне), бліжэйшыя да Петрыкаўшчыны пункты якой адзначаны каля Хільчыц на Прыпяці ў Жыткавіцкім, каля Бухліцкага хутара на Гарыні ў Столінскім раёне. Невялікі абломак верхняй часткі гаршка, які падобны да посуды лебядоўскай культуры, знойдзены ў 1992 г. каля в. Багрымавічы, ва ўроч. Гарадзёны. Для гэтай культуры найбольш характэрны таўстасценныя, часта шурпатыя гаршкі яйкападобнай формы з маленькім няўстойлівым донцам. Частка посуду арнаментавалася валікамі пад венцам, наколамі, косымі насечкамі і інш.

* * *

З VIII — VII ст. да н. э. на тэрыторыі паўднёвай Беларусі пачаўся жалезны век, які ахоплівае перыяд да V ст. н. э. Верагодна, што людзі ў розны час і на розных тэрыторыях прыйшлі да тэхналогіі атрымання і перапрацоўкі жалеза незалежна адзін ад аднаго. З новага металу пачалі выраблять прылады працы і зброю такой крэпасці і вастрыні, якія нельга было зрабіць з каменю ці бронзы. Нямногія дасягненні адной эпохі змаглі паскорыць прагрэс ва ўсіх сферах чалавечай дзейнасці, так, як атрыманне і выкарыстанне жалеза. Прыкладна ў гэты ж час распачаўся жалезны век і ў Цэнтральнай і Заходняй Еўропе. Распаўсюджванню чорнай металургіі спрыяла таксама даступнасць сыравіны. Жалеза ў старажытныя часы выраблялі з азёрных або балотных руд, адклады якіх маюцца па ўсёй тэрыторыі Беларусі, у тым ліку і на Петрыкаўшчыне. Здабыванне балотнай руды на Палессі не вымагала вялікіх затрат працы, яна залягае неглыбока, нярэдка зусім выходзіць на паверхню зямлі. Адклады балотнай руды (бурых жалезнякоў) і сляды старажытнай металургіі былі выяўлены на тэрыторыі Петрыкаўскага раёна А. Ляўданскім яшчэ ў пачатку 30-х гадоў.

Аб пашыранасці жалезаробчай і жалезаапрацоўчай вытворчасці сведчыць шматлікасць тапанімаў з асновай «руд»: рудня, руда, руднішча, рудка, рудніца, рудаўка, жалезня і т. п. А. Ляўданскі адзначыў адклады балотнай руды і рэшткі жалезаробчай вытворчасці каля вв. Аголіцкая Рудня, Сярэдняя Рудня, Бабунічы, Баклань, Балажэвічы, Глінка, Івашкавічы, Ільіч, Капаткевічы, Канстанцінаўка, Конкавічы, Ляскавічы, Рубча, Белка, Рудня (левы прыток р. Пціч), Рудня Камароўская, Слабодка Чалюшчавіцкая, Снядзін (уроч. Двары). Найбольш значнае радовішча балотнай руды А. Ляўданскі зафіксаваў каля в. Ільіч, паміж вв. Макарычы і Турок. Тут пласт балотнай руды таўшчынёй да 0,5 м займаў плошчу 20—30 га. Мясцовыя сяляне выкарыстоўвалі вялікія кавалкі руды для падмуркаў хат, печаў. Яшчэ ў XVIII ст. існавалі невялікія жалезаробчыя заводы, якія выраблялі метал для мясцовых кузняў і на вываз. На некаторых з іх для прывядзення ў дзеянне механічных молатаў выкарыстоўвалася сіла вады. Рэшткі гэтых заводаў можна прасачыць каля вв. Аголіцкая Рудня, Глінка, Рудня, Рудня Камароўская, Снядзін, Сярэдняя Рудня. Балотная руда на Петрыкаўшчыне змяшчала 40—50 % жалеза, перад пачаткам металургічнага працэсу яе ўзбагачалі: шмат разоў прамывалі, раздрабнялі да памераў арэха, прагартоўвалі на вогнішчы. У якасці паліва выкарыстоўвалі драўняны вугаль, каб не забруджваць метал попелам. Печы для вуглепалення сустракаюцца каля вв. Мардзвін (уроч. Курашоў), Бобрык (уроч. Калодзезь, Цагельня, Сінцы), Брынёў (уроч. Наўлессе, Брусава Грэбля, Крывуля), Фаставічы. Яны функцыянавалі працяглы час і, як сведчаць мясцовыя жыхары, некаторыя з іх выкарыстоўваліся ў час другой сусветнай вайны.

Да XIX ст. жалеза атрымлівалі сырадутным спосабам, пры гэтым адбываўся працэс узнаўлення жалеза з руды, а не плаўкі, для якой патрэбна была тэмпература звыш 1500°. Сырадутны горн — домніца — глінабітная печ з адтулінай-комінам уверсе і дзіркамі-паддуваламі знізу, у якія ўстаўляліся гліняныя трубкі-соплы са скуранымі мяхамі над імі. Жалеза ў домніцы атрымлівалі не ў вадкім (расплаўленым) стане, а ў выглядзе цестападобнай, з дамешкамі жужла крыцы.

Аснову гаспадаркі плямёнаў жалезнага веку складалі земляробства і жывёлагадоўля, якія дапаўняліся паляваннем, рыбалоўствам, збіральніцтвам. Земляробства было падсечным. Жалезная сякера і саха з жалезным лемяшом, рала з наральнікам, сярпы і косы дазвалялі значна павялічваць плошчы,

занятыя пасевамі, забяспечваць прадуктамі харчавання людзей і грамадскі статак і, звыш таго, ствараць пэўныя запасы. Удасканальваліся і іншыя заняткі насельніцтва, з'яўляліся неабходныя ў вытворчасці і побыце такія рэчы, як нажніцы, абцугі, пілы, напільнікі. Паляпшалася апрацоўка дрэва, выраблялiся новыя, больш дасканалыя інструменты і зброя, пашыраўся тавараабмен сярод людзей розных плямён і мясцовасцей.

У выніку росту вытворчасці працы ў асобных родаў і плямён назапашвалася пэўная маёмасць, што вяло да войнаў з мэтай грабяжу і заняволення. Каб абараніць дабро і жыццё суплямення-каў ад прагных да лёгкай здабычы суседзяў, насельніцтва пачынае сяліцца ў цяжкадаступных месцах сярод балот і лясоў і ўмацоўваць свае паселішчы земляными валамі і равамі. З тых даўніх часоў на Петрыкаўшчыне захавалася шмат гарадзішчаў, размешчаных у асноўным у басейне р. Пціч. Амаль усе яны маюць круглую ў плане пляцоўку, акружаную з усіх бакоў кальцавым валам і ровам. Па грэбені вала праходзіла драўляная сцяна. Размяшчаліся яны на невысокіх астраўках пасярод забалочаных нізін, таму атрымалі назву балотных.

Дзякуючы такому месцазнаходжанню і штучным абарончым збудаванням балотныя гарадзішчы ўяўлялі сабой добра ўмацаваныя пункты. Ні на адным з гарадзішчаў Петрыкаўскага раёна не праводзіліся археалагічныя раскопкі, яны толькі даследаваліся шляхам візуальнага агляду, некаторыя шурфаваліся. Шэраг з іх наогул ні разу не наведалі археолагі. Па назіраннях даследчыкаў, на іх адсутнічае культурны пласт, які ўзнікае ў час сталага пражывання насельнікаў. Гэты факт дае падставу зрабіць выснову, што гарадзішчы ў асноўным выкарыстоўваліся як сховішчы, куды ў час ваеннай небяспекі жыхары прылягаючай акругі зганялі жывёлу, зносілі свае пажыткі, за сценамі баранілі сваё жыццё. Тут жа маглі выконвацца рэлігійныя абрады і вырашацца агульныя пытанні грамадскага жыцця. Невялікая колькасць керамікі, знойдзеная на гэтых гарадзішчах, і супастаўленне яе з больш даследаванымі падобнымі помнікамі з іншых раёнаў Палесся дазваляе сцвярджаць, што яны будаваліся ў I тысячагоддзі да н. э. і на іх пражывалі плямёны мілаградскай і зарубінецкай культур жалезнага веку. У гэты ж перыяд існавалі і неўмацаваныя селішчы, якія становяцца адзіным тыпам пасёлкаў на Петрыкаўшчыне з першых вякоў н. э.

Мясцовыя жыхары добра ведаюць аб існаванні і месцазнаходжанні балотных гарадзішчаў, якія звычайна называюць «акопамі». Аб наяўнасці ўмацаваных пасёлкаў сведчаць таксама такія назвы (тапанімы), як вёска Гарадзішча, хутар Гарадзішча, уроч. Гарадзішча, Гарадзёнск, Гарадзёны, Гарадзіцкі Лес. Да гэтага часу жывуць у народзе паданні, звязаныя з гарадзішчамі. Яны не адлюстроўваюць храналагічныя рэаліі, а асацыіруюцца ў памяці людзей са значна больш познімі падзеямі. Цьмяна апавядаюць яны аб варожых нашэсцях татараў, а часам шведаў, якія чынілі расправу над мірнымі жыхарамі. Старых і малых заганялі ў хаты, прымушалі садзіцца на падлогу ўздоўж сцен і душылі масіўнымі дубовымі лавамі, тыя, каму пашанцавала пазбегнуць гвалту, шукалі сховішча за валамі «акопаў».

Чатыры балотныя гарадзішчы адзначаны каля в. Хвойня: у 5,5 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, справа ад дарогі на в. Падгаць ва ўроч. Цітовіцкае (Акоп) у лесе, у 0,4 км на паўднёвы ўсход ад жывёлагадоўчай фермы, у 1,8 км на ўсход, за меліярацыйным каналам і ва ўроч. Малая Ніва ў 5 км на поўнач, у густым балоцістым лесе. Усе яны круглыя ў плане, дыяметр пляцоўкі 80—100 м, вышыня валоў 0,5—2 м. У трох кіламетрах на паўночны захад ад в. Ванюжычы ва ўроч. Падлеснае (Акоп). Яго дыяметр каля 100 м, вышыня вала 1,2—1,5 м, шырыня 6—8 м. Пяць гарадзішчаў выяўлена каля в. Навасёлкі. Адно з іх размешчана на пясчаным узвышшы ў 2,5 км на паўночны захад ад вёскі ва ўроч. Рымшава Гара, на паўночным беразе меліярацыйнага канала. Яго памеры 250×110 км, пляцоўка авальнай формы, выцягнута з поўначы на поўдзень. Рэшткі вала прасочваюцца з паўднёвага ўсходу, поўдня і паўднёвага захаду. Паўночная частка помніка знесена. На захад ад Навасёлак адзначана 4 гарадзішчы. Адно з іх размешчана ва ўроч. Гарадзіцкі Лес, дыяметр яго дасягае амаль 200 м. Валы прасочваюцца вельмі слаба, яны поўнасцю развораны. Другое знаходзілася ў 2,5 км ад вёскі, зараз поўнасцю

знішчана, выбрана на дарожны насып. Трэцяе знаходзіцца ў 3 км, яго круглая ў плане пляцоўка дыяметрам каля 60 м абнесена валам, вышыня якога 1,2—1,6 м. Чацвёртае, падобнае па памерах і форме на папярэдняе, размешчана ў 3,5—4 км ад Навасёлак. Усе яны адносяцца да тыпу балотных.

Рэшткі пагоркавага гарадзішча выяўлены ў 0,7 км на ўсход ад в. Івашкавічы на правым беразе р. Пціч. Такога ж тыпу гарадзішча адзначана ў 3 км на поўдзень ад в. Івашкавічы ва ўроч. Курган. Авальная пляцоўка мае памеры 35×28 м, валы не прасочваюцца. З усходу абаронена старарэчышчам, з поўначы і захаду глыбокім ровам. У 80-я гады знішчаны балотныя гарадзішчы каля в. Боркі і на паўднёвы захад ад Філіпавіч. Пэўнай асаблівасцю канструкцыі вылучаецца гарадзішча, якое размешчана ў 8—9 км на паўднёвы захад ад в. Снядзін, на паўночным беразе меліярацыйнага канала, у які ператварылі р. Смедзінку. Пляцоўка авальнай формы, памерамі прыкладна 95—150 м, абкружана валам вышынёй 1,2—1,5 м і падзелена на дзве няроўныя часткі. Знаходзіцца ў густым лесе на невысокай градзе, акружанай з усіх бакоў балоцістай нізінай.

Сукупнасць археалагічных даных сведчыць, што плямёны ранняга жалезнага веку знаходзіліся на стадыі развітога патрыярхату. Самай меншай і асноўнай адзінкай грамадства з'яўлялася вялікая патрыярхальная сям'я, якая складалася з 2—3 пакаленняў блізкіх родзічаў. Некалькі такіх сем'яў аб'ядноўваліся ў патрыярхальны род. Ён меў сваю тэрыторыю, дзе размяшчаліся асобныя гарадзішчы, селішчы, участкі апрацоўваемай зямлі і пашы для статка. Устойлівых сувязей паміж плямёнамі не існавала. Сутычкамі паміж родамі і плямёнамі абумоўлены і факт з'яўлення ў гэты перыяд умацаваных паселішчаў. Гэта было грамадства эпохі распаду першабытнаабшчыннага ладу, у якім існавала спецыфічная арганізацыя ўлады, вядомая як «ваенная дэмакратыя».

Тэрыторыю сучаснай Петрыкаўшчыны засялялі плямёны мілаградскай культуры — ад гарадзішча Мілаград Рэчыцкага раёна, культурны пласт якога на шырокай плошчы быў даследаваны археолагамі. Мілаградская культура ў VIII — III ст. да н. э. займала тэрыторыю паўднёвай Беларусі і паўночнай Украіны. Яна прадстаўлена ўмацаванымі і неўмацаванымі паселішчамі, бескурганнымі могільнікамі з абрадам трупаспальвання і курганнымі з абрадам трупапакладання. Усе гарадзішчы, якія вядомы на тэрыторыі раёна, узведзены мілаградскім насельніцтвам. Селішчы гэтай культуры выяўлены каля вв. Багрымавічы (уроч. Гарадзёны), Турок, Вялікае Поле, Дарашэвічы 2 і 3, Лясковічы (уроч. Кабачок), Лучыцы (уроч. Млынішча), Мардзвін 1 (уроч. Песья), Мардзвін 2 (уроч. Борак), Майсеевічы 1 і 4 (уроч. Мардзвінскае Стойла), Навасёлкі 2 (уроч. Медля), Івашкавічы (уроч. Шутава Гара), каля Петрыкава (уроч. Беркава Гара). Мілаградскае насельніцтва жыло ў невялікіх наземных або злёгку паглыбленых дамах слупавой канструкцыі ці ў зрубных паўзямлянках, якія ацяплялiся адкрытымі агменямі, размешчанымі на пясчанай падлозе або ў неглыбокай ямцы. Выяўлены таксама гаспадарчыя збудаванні ў выглядзе наземных хлявоў і ям-пагрэбоў, у якіх трымалі харчовыя прыпасы і іншае дабро. Іх можна было хутка замаскіраваць у выпадку небяспекі. Нябожчыкаў мілаградскія плямёны звычайна спальвалі, ачышчаныя ад попелу і вуголля косткі збіралі і закопвалі ў неглыбокіх ямах. Пахавальны інвентар адсутнічае або вельмі нязначны (абломкі посуду, упрыгажэнні, побытавыя рэчы). Па пахаваных спраўлялі трызны.

Мілаградскае насельніцтва мела шырокія сувязі са сваімі паўднёвымі суседзямі — скіфамі, а таксама з насельніцтвам Цэнтральнай Еўропы. Часта сустракаюцца на палескіх паселішчах скіфскія бронзавыя наканечнікі стрэл, завушніцы, якія любілі насіць скіфянкі, шкляныя пацеркі, што выраблялiся ў грэчаскіх гарадах Паўночнага Прычарнамор'я і на Каўказе, фібулы-запінкі і бранзалеты. Мілаградская кераміка, якая складае найбольш масавы і характэрны элемент культуры, прадстаўлена кругладоннымі і пласкадоннымі ляпнымі гаршкамі з шарападобным або яйкападобным тулавам і прамым ці адагнутым вонкі венцам, а таксама гліняными грузікамі разнастайных форм.

У II ст. да н. э. на былых гарадзішчах і селішчах мілаградскага насельніцтва рассяляліся плямёны зарубінец-

кай культуры (ад раскапанага ў канцы IXX ст. грунтавога могільніка каля сяла Зарубінцы пад Кіевам). Зарубінецкія старажытнасці ўсюды перакрываюць тэрыторыю мілаградскай культуры, а на захадзе выходзяць за яе межы ў басейн Заходняга Буга. Яна даволі аднародная па ўсёй тэрыторыі свайго распаўсюджання, аднак пэўная розніца ў наборы керамікі, тыпах жытлаў і пахавальных звычаях вылучае тры лакальныя групы яе помнікаў: палескую, верхнедняпроўскую і сярэднедняпроўскую. У палескім рэгіёне, куды ўваходзіць і Петрыкаўшчына, найбольш даследаваны зарубінецкія помнікі каля вв. Велямічы, Ацвержычы, Давыд-Гарадок, Рубель, Рэмель Столінскага, Вароніна і Пагост Жыткавіцкага раёна. Насельніцтва карысталася гарадзішчамі, збудаванымі ў папярэднія часы мілаградскімі плямёнамі, а таксама жыло на неўмацаваных селішчах. Жытлы былі двух тыпаў: зрубныя паўзямлянкі і наземныя дамы слупавой канструкцыі, якія на Палессі ацяпляліся агменямі ці печамі, складзенымі з невялікіх камянёў і гліны. У Петрыкаўскім раёне зарубінецкія селішчы адкрыты каля вв. Вышалаў, Дарашэвічы 3, Лясковічы (Кабачок), Навасёлкі 2 і 3, Шастовічы (уроч. Царковішча). Яны не даследаваліся шляхам раскопак, а вядомы толькі на паверхневых зборах. Добра вывучаны і пахавальны абрад зарубінцаў. На тэрыторыі паўднёвай Беларусі даследавана звыш 700 пахаванняў. Могільнікі не маюць знешніх прыкмет, рэшткі крэмацыі нябожчыка змяшчаліся ў авальныя ці круглыя ямкі глыбінёй 0,2—1 м. Пахавальны інвентар даволі багаты і звычайна складаецца з глянцаваных гаршкоў, місак, кубкаў. У некаторыя пахаванні былі пакладзены фібулы з трохкутным шчытком, шпількі, кольцы, пацеркі, прывескі, прылады працы і зброя. Асновай гаспадаркі зарубінецкіх плямён былі земляробства і жывёлагадоўля. Насельніцтва займалася таксама чорнай і каляровай металургіяй, ткацтвам, апрацоўкай дрэва, ганчарствам. Густая сетка рачных шляхоў спрыяла развіццю эканамічных сувязей мясцовага насельніцтва з другімі народамі, перш за ўсё з Цэнтральнай Еўропай, з гарадамі Паўночнага Прычарнамор'я, плямёнамі Прыбалтыкі і інш.

У сярэдзіне і ў другой палове I ст. н. э. жыццё на палескіх помніках зарубінецкай культуры спыняецца, прасочваецца перамяшчэнне насельніцтва на захад, на тэрыторыю Польшчы, і на поўдзень, на Паўднёвы Буг і Днестр. Праз нейкі час, у які Палессе, магчыма, не было заселеным, у яго заходняй частцы рассяляюцца наплываючыя з тэрыторыі Польшчы плямёны вельбарскай культуры, а на ўсходзе фарміруецца кіеўская культура. Мяжой паміж імі была р. Гарынь, на берагах якой выяўлены самыя заходнія паселішчы і могільнікі вельбарскай культуры каля вв. Струга, Велямічы, Ацвержычы. Петрыкаўшчына ў 2-й чвэрці I тысячагоддзя н. э. уваходзіла ў сферу распаўсюджання помнікаў кіеўскай культуры, якая займала ўсходнюю частку Беларускага і Украінскага Палесся, паўднёвую частку Верхняга і паўночную частку Сярэдняга Падняпроўя. Кіеўская культура прадстаўлена неўмацаванымі селішчамі і грунтавымі могільнікамі з абрадам трупаспальвання. Дамы будаваліся паўзямлянкавыя і наземнай канструкцыі, ацяпляліся агменямі, складзенымі з невялікіх камянёў. Для гэтай культуры характэрны грубаляпны таўстасценны посуд, часам з глянцаванай або пакрытай расчэсамі паверхняй. Падобная кераміка знойдзена на селішчах каля вв. Турок, Вышалаў, Дарашэвічы 3, Шастовічы (уроч. Царковішча). Магчыма, да гэтага часу адносіцца і грунтавы могільнік, які размяшчаўся на паўночнай ускраіне в. Слабодка Чалюшчавіцкая. Там у пачатку 30-х гадоў А. Рынейскі знайшоў кальцынірараваныя косткі, бронзавы пярсцёнак з плоскім круглым верхам, які датуецца 2-й чвэрцю I тысячагоддзя н. э.

АД ЧАСОЎ ПЕРШАБЫТНЫХ

У сярэдзіне I тысячагоддзя н. э. на тэрыторыі Палесся з'яўляюцца помнікі пражскай культуры, славянская прыналежнасць якой не выклікае сумненняў у даследчыкаў (выяўлены ў ваколіцах Прагі чэшскім археолагам І. Баркоўскім у 1939 г.). Яна звязваецца з вядомымі па пісьмовых крыніцах славянскімі плямёнамі склавінаў. Славянскае супольніцтва ў V — VII ст. займала вялікую тэрыторыю ад Одэра і Эльбы на захадзе да Дняпра на ўсходзе, ад Балкан на поўдні да Прыпяці на поўначы. Матэрыяльная культура славян гэтага часу даволі ўніфікавана. Агульныя элементы назіраюцца ў тапаграфіі паселішчаў, іх тыпе, жыллёвым будаўніцтве. Для ўсёй тэрыторыі Усходняй Еўропы характэрны неўмацаваныя селішчы, забудаваныя чатырохкутнымі, блізкімі да квадрата паўзямлянкамі зрубнай або слупавой канструкцыі. Жытлы абагравaліся печамі-каменкамі ці, значна радзей, агменямі або глінабітнымі печамі.

Найбольш раннія паселішчы, якія адносяцца да V — VI ст., даследаваны на Палессі каля г. Петрыкава і вв. Востраў, Камень Пінскага, Кажан-Гарадок Лунінецкага раёна. На іх адкрыты неглыбокія паўзямлянкі слупавой канструкцыі з агменямі, збудаванымі з невялікіх камянёў і кавалкаў балотнай руды. Хаты мелі пясчаную падлогу і, хутчэй за ўсё, драўляна-земляныя дахі. Інтэр'еры, відаць, былі небагатыя і складаліся са сталоў, лавак ці табурэтак і спальных месцаў у выглядзе нараў. Славяне былі вельмі сціплыя ў сваім паўсядзённым жыцці, іх матэрыяльная культура не вызначаецца багаццем і разнастайнасцю. Звычайна на селішчах знаходзяць абломкі посуду, гліняныя грузікі, якія надзявалі на канец верацёнаў, грузілы ад вертыкальных ткацкіх станаў і рыбацкіх сетак, жалезныя нажы, адзінкавыя шкляныя пацеркі, зрэдку вырабы з каляровых металаў. Спецыфіку славянскіх культур вызначае гліняны посуд, яго тыпалогія добра распрацавана археолагамі-славістамі і дапамагае вызначаць храналогію помнікаў. Набор посуду таксама небагаты і прадстаўлены гаршкамі, міскамі, патэльнямі. Аснову керамічнага комплексу складаюць ляпныя гаршкі, сярод якіх вылучаюцца дзве формы: гаршкі з конусападобным, пашыраным у верхняй частцы тулавам і акруглымі плечыкамі, і гаршкі з пакатымі слабавылучанымі плечыкамі і найбольшым пашырэннем крыху вышэй ці пасярэдзіне іх вышыні. У Інстытуце гісторыі АН Беларусі захоўваюцца фрагменты глінянага посуду, які быў знойдзены ў 1932 г. А. Ляўданскім і А. Каваленяй у паўзямлянках на селішчы ва ўроч. Крутуха каля Петрыкава. Ёсць даволі вялікія абломкі гаршкоў і патэльняў, якія дазваляюць рэканструяваць іх выгляд. Падобныя пасудзіны былі знойдзены таксама каля Кіева, ва ўроч. Абалонь, яны датуюцца V — VI ст. Селішчы з матэрыяламі пражскай культуры прасочваюцца каля вв. Турок, Макарычы, Навасёлкі (на Прыпяці), Шастовічы (уроч. Царковішча), Снядзін. Гэта дае падставу меркаваць, што Петрыкаўшчына, як і астатняя тэрыторыя Папрыпяцця ад Пінска да Мазыра, уваходзіла ў арэал фарміравання раннесярэднявечнай славянскай культуры.

Аб еднасці духоўнай культуры славянства сведчыць наяўнасць аднолькавых форм пахавальнага абраду. Для ўсёй тэрыторыі пражскай культуры ў V — VII ст. характэрны могільнікі з трупаспаленнем. Перапаленыя косткі нябожчыка ссыпаліся ў урну (звычайны ляпны гаршчок) або проста ў невялікую ямку і закопваліся. Зрэдку ў пахаванне клаліся рэчы або біты посуд.

Даныя археалогіі, этнаграфіі і пісьмовыя крыніцы сведчаць, што асновай гаспадаркі славянскага насельніцтва было земляробства. На працягу I тысячагоддзя яго формы развіваліся і ўдасканальваліся, што прывяло да ўтварэння высокапрадукцыйнага ворнага земляробства, якое забяспечвала ўжо на рубяжы I і II тысячагоддзяў высокі эканамічны патэнцыял усходне-славянскага грамадства. Візантыйскі аўтар Маўрыкій у VI ст. н. э. адзначаў, што «ў іх (славян) вялікая колькасць рознай жывёлы ды пладоў зямных, якія складзены ў купы, асабліва проса і пшаніцы». Тапаграфія славянскіх паселішчаў таксама пэўным чынам раскрывае характар гаспадаркі. Яны размяшчаліся блізка да рэчак і азёр, непадалёку ад заліўных паплавоў. Тут, з аднаго боку, былі прыдатныя для палёў дзялянкі з параўнальна лёгкім для апрацоўкі грунтам, а з другога — існавала добрая жывёлагадоўчая база. Земляробства мела экстэнсіўны характар, выкарыстоўваліся падсека і пералог. Поле апрацоўвалі і засявалі да таго часу, пакуль яно радзіла. Потым яго пакідалі да ўзнаўлення прыроднай урадлівасці. Славянскія паселішчы гэтага часу невялікія па памерах, іх насельнікам час ад часу даводзілася перасяляцца ў сувязі з неабходнасцю змены палёў. Гадавалі пераважна буйную рагатую жывёлу і свіней, у меншай колькасці сустракаюцца на паселішчах косткі дробнай рагатай жывёлы і коней. Харчовы рацыён дапаўнялі прадукты паляванння, рыбалоўства, пчалярства, збіральніцтва. Акрамя сельскагаспадарчай вытворчасці жыхары славянскіх паселішчаў Палесся займаліся

чорнай і каляровай металургіяй, ганчарствам, ткацтвам, апрацоўкай скур, дрэва, косці.

На рубяжы VII — VIII ст. пражская культура павольна і арганічна перарастае ў культуру Лукі Райкавецкай, якая з'яўляецца наступнай, больш высокай ступенню развіцця славянскага грамадства (паселішча Лука ва ўрочышчы Райкавецкае). Яно складалася ўжо не столькі з асобных плямён, колькі з саюзаў плямён. Пачынаючы з канца VI — VII ст., па ўсёй тэрыторыі славян узнікаюць умацаваныя паселішчы-гарадзішчы, якія станавіліся палітычнымі, рэлігійнымі і эканамічнымі цэнтрамі саюзаў, месцам збору вайсковых дружын. У VII — VIII ст. у Папрыпяцці амаль на роўнай адлегласці адно ад другога ўзнікае некалькі такіх умацаваных пунктаў са спадарожнічаючымі ім селішчамі: Гарадзішча Пінскага, Хотамель Столінскага, Хільчыцы Жыткавіцкага раёна, Кімбараўка каля Мазыра. Не выключана, што і Петрыкаў быў падобным цэнтрам. Тут адкрыта нямала паселішчаў, якія існавалі ў VIII — X ст. і пазней — Петрыкаў (уроч. Перавоз, Старарэчча, Белка), Бяланавічы, Макарычы, Шастовічы. У гэты час пачынае змяняцца пахавальны абрад ад трупаспальвання ў грунтавых могільніках да трупаспальвання ў курганных насыпах. Посуд тыпу Лукі Райкавецкай адносіцца да таго віду, што і гаршкі пражскай культуры: форма іх конусападобная ці акруглабаковая, але сценкі і донцы іх больш масіўныя, узрастае колькасць нізкага міскападобнага посуду. Венцы арнаментуюцца насечкамі, а частка гаршчочкаў, галоўным чынам тых, што падпраўлялі-ся на ганчарным коле, аздоблена па плечыках хвалістым ці лінейным арнаментам.

У жыллёвым будаўніцтве працягваліся традыцыі папярэдняга часу, павялічвалася плошча жытлаў, яны ацяпляліся не агменямі, а складзенымі з невялікіх камянёў і гліны печамі. На паселішчах узрастала колькасць металічных, шкляных і касцяных вырабаў, якія адлюстроўвалі характар і ўзровень земляробства, рамёстваў і гандлю. Гэта наральнікі, сярпы, косы-гарбушы, жорны, сякеры, цёслы, далоты, праселкі, ліцейныя формы і многае іншае. Зброя прадстаўлена наканечнікамі стрэл, дзідаў, дроцікаў, упрыгажэнні — скроневымі кольцамі, бразготкамі, бранзалетамі, пярсцёнкамі, шкляными пацеркамі. Некаторыя з упрыгажэнняў траплялі на берагі Прыпяці з Прычарнамор'я, Каўказа, Падоння, Прыбалтыкі і паўночнай Беларусі. На селішчы каля Майсеевіч знойдзены фрагмент ажурнай срэбнай падвескі, якія выраблялiся ў далёкай Скандынавіі. Гэта дае падставу меркаваць, што ваенна-гандлёвыя шляхі вікінгаў у IX—X ст. праходзілі і па Прыпяці, якая звязвала басейны Дняпра, Нёмана і Віслы.

Узровень развіцця вытворчасці, якога дасягнулі славяне ў другой палове I тысячагоддзя, прывёў да распаду першабытнаабшчынных адносін, аддзялення рамяства ад земляробства. Замест родавай склалася тэрытарыяльная абшчына, якая аб'ядноўвала не кроўных родзічаў, а суседзяў. Члены абшчыны былі звязаны кругавой парукай, узаемнай адказнасцю за вынікі гаспадарчай дзейнасці і за падтрыманне норм звычаёвага права.

У гэты час пачынае фарміравацца племянное аб'яднанне дрыгавічоў, якое ў X ст. засяляла тэрыторыю паўднёвай Беларусі ўключна да сучаснага Мінска. Пачатковы летапіс адзначае, што напярэдадні дзяржаўных утварэнняў у некаторых славянскіх саюзаў плямён, у тым ліку і ў дрыгавічоў, існавала самастойнае палітычнае аб'яднанне — княжанне. Першай такой дзяржавай на дрыгавіцкай зямлі стала Тураўскае княства. Найбольш даўнія звесткі аб Тураўскай зямлі змяшчаюцца ў ранняй, недатаванай частцы летапісу «Аповесць старажытных часоў».

Курганны могільнік дрыгавічоў X — XII ст. каля в. Аносавічы

Этнаграфічныя асаблівасці дрыгавічоў добра прасочваюцца па матэрыялах курганных могільнікаў X—XIII ст., якія захаваліся на Палессі, у тым ліку на Петрыкаўшчыне. Звычка насыпаць курган над нябожчыкам і класці ў магілу рэчы сведчыць аб жывучасці язычніцкага светапогляду ў насельніцтва, хаця ў канцы X ст. усходнія славяне афіцыйна прымаюць хрысціянства.

Дрыгавіцкія курганныя могільнікі ўяўляюць сабой паўсферычныя, круглыя насыпы вышынёй 0,5—1,6 см, дыяметрам ад 3—4 да 8—10 м. У групе іх можа налічвацца ад адзінак да некалькіх дзесяткаў. Вядомы і адзіночныя курганы. Такія могільнікі захаваліся каля вв. Брынёў, Ванюжычы (уроч, Курганы, Аносавічы, Барсукі), Камаровічы, Капцэвічы, Лучыцы, Мардзвін, Белін, Міцуры, Малыя Сялюцічы, Снядзін, Фаставічы, Шастовічы. Яшчэ ў 30-х г. іх было значна болей, яны фіксаваліся таксама каля вв. Беседы, Івашкавічы, Вялаўск, Капцэвічы (на Пцічы), Колкі, Міцуры, Слабодка Чалюшчавіцкая, г. п. Капаткевічы. Прафесар У. Завітневіч раскапаў 87 курганоў каля вв. Вялаўск, Ванюжычы, Камаровічы, Міцуры, Шастовічы і ў г. п. Капаткевічы. Ва ўсіх насыпах адкрыты трупапакладанні. Нябожчыкі пахаваны галавой на захад на гарызонце ці ў падкурганнай ямцы. У некаторых выпадках (в. Ванюжычы) просочваюцца рэшткі драўляных трунаў. Пераважае трупапакладанне ў аснове насыпу, з 87 выпадкаў толькі ў 13 — пахаванні ў ямках. Тры курганы, даследаваныя каля Вялаўска ва ўроч. Прабітуха, былі пустыя. Мяркуюць, што яны насыпаны ў гонар загінуўшых далёка ад родных мясцін суродзічаў. Некаторыя пахаванні не маюць рэчаў, у іншых сустракаюцца разнастайныя ўпрыгажэнні, прадметы побыту. З нябожчыкам клалі гліняныя гаршкі, драўляныя вёдры, ад якіх захаваліся жалезныя дужкі і абручы, металічныя, шкляныя і каменныя пацеркі, скроневыя кольцы, бранзалеты, пярсцёнкі, падвескі, завушніцы, нажы, праселкі і інш. Упрыгажэнні звычайна выраблялiся з бронзы. Найчасцей сустракаліся вялікія бронзавыя зярнёныя пацеркі і пярсцёнкападобныя, закручаныя ў паўтара абароты скроневыя кольцы, якія лічаць этнаграфічнай прыкметай дрыгавіцкага жаночага ўбору.

Акрамя могільнікаў на Петрыкаўшчыне адкрыты паселішчы гэтага часу каля вв. Бяланавічы, Дарашэвічы, Івашкавічы, Ляскавічы, Макарычы, Млынок, Майсеевічы, Слабодка Чалюшчавіцкая, Шастовічы, Турок. Усе яны вядомы дзякуючы паверхневым зборам. Невялікія разведачныя раскопкі праведзены на двух селішчах, размешчаных на левым беразе Прыпяці на захад ад Макарыч. Гэта былі невялікія вёсачкі, якія займалі плошчу каля 1 га. У іх культурным пласце таўшчынёй 0,4—0,6 м знойдзены абломкі ляпнога посуду VI — IX ст. н. э. і раннеганчарнага X — XIII ст., фрагменты бронзавага крыжыка і шыфернага біканічнага праселка, якія выраблялiся каля г. Оўруч на Украіне і распаўсюджваліся амаль па ўсёй Усходняй Еўропе ў XI — першай палове XIII ст. Напластаванні X — XIII ст. на тэрыторыі Петрыкава прасочваюцца на гары ў парку ў раёне помніка вызваліцелям,

на сядзібах у пачатку вул. Леніна, каля Мікалаеўскай царквы. Гэта сведчыць, што з V ст. н. э. са з'яўленнем раннеславянскага насельніцтва жыццё на тэрыторыі горада не перапынялася да нашых дзён, хоць на старонкі пісьмовых крыніц Петрыкаў трапіў даволі позна, у XV ст. Вядомы даследчык гісторыі ваеннай справы на Беларусі М. Ткачоў адзначаў, што пры князю Юрыю Алелькавічу тут быў збудаваны драўляны замак, спалены ў 1535 г. маскоўскімі войскамі ў час руска-літоўскай вайны. У XVI ст. у Петрыкаве неаднойчы збіралася войска Вялікага княства Літоўскага, якое супрацьстаяла рабаўнічым набегам на Беларусь крымскіх татар. У XVII ст., калі горад перайшоў у прыватнае ўладанне да Хадкевічаў, у ім быў узведзены магутны бастыённы замак. М. Ткачоў выказаў меркаванне, што замак у XVI — XVII ст. размяшчаўся на мысападобным уступе карэннай тэрасы на высокім левым беразе Прыпяці, дзе зараз гарадскі парк. Аб тым, што замкавыя пабудовы існавалі яшчэ ў пачатку XIX ст., сведчаць запісы Петрыкаўскага інвентару 1810 г. На жаль, шырокамаштабныя археалагічныя даследаванні ў горадзе не праводзіліся.

У эпоху ВКЛ узнікае большасць сучасных вёсак, аб чым сведчаць як пісьмовыя крыніцы, так і археалагічныя даныя. Выразныя сляды існавання сярэдневяковых сельскіх паселішчаў прасочаны ў вв. Бобрык, Лясковічы (уроч. Старое Сяло), Млынок, Майсеевічы (уроч. Мардзвінскае Стойла) і інш. Ёсць і іншыя сведкі мінулых эпох. У 3 км на поўнач ад Брынёва, ва ўроч. Драніна, у густым лесе ляжыць вялікі камень-валун. Калісьці, стагоддзі назад, ён, відаць, быў язычніцкай святыняй. Аддаленыя водгукі былых традыцый захаваліся ў старажытным паданні. Кажуць, што калісьці нейкі чалавек парушыў Божыя запаветы і за гэта быў пакараны, ператвораны разам са сваімі валамі ў камень. Такое ўяўленне аб валуне даволі рэдкае на Палессі, але значна пашырана на поўначы Беларусі, дзе народ зберагае легенды аб камянях-шаўцах, краўцах, следавіках і ў некаторых мясцінах дагэтуль ахвяруе ім грошы, стужкі, ручнікі і іншыя рэчы.

З канца XVI—XVII ст. захаваліся надмагільныя камяні з чырвонага граніту з кірылічнымі надпісамі-прысвячэннямі. Два з іх знаходзяцца ў Петрыкаве, адзін ляжыць каля Мікалаеўскай царквы, другі — у рове ў гарадскім парку. Такі ж камень, які, у адрозненне ад петрыкаўскіх, захаваўся на сваім першапачатковым месцы, стаіць на могілках у в. Галубіца. Ён адкрыты мясцовым краязнаўцам П. Пашуком і апісаны даследчыкам А. Лозка. З надпісу вынікае, што камень устаноўлены ў 1595 г. на магіле Андрэя Каліны. Пасля вывучэння архіўных крыніц А. Лозка выказаў меркаванне, што пахаваны мог паходзіць з княжацкага роду літоўскіх татар Калінаў, прозвішча якіх сустракаецца ў судовых справах XVII ст. Яшчэ адзін цікавы надмагільны камень знаходзіцца ў в. Капцэвічы. Калісьці на паўночнай ускраіне вёскі знаходзіліся старыя могілкі, на якіх А. Рынейскі яшчэ ў 1930 г. налічваў 15 курганоў. У 60-я гады гэтыя могілкі знівеліравалі і паставілі абеліск у гонар загінуўшых землякоў, але ў бліжнім да вёскі кутку захаваўся камень шэрага колеру ў форме, блізкай да трохвугольніка. На ім высечаны крыж і арабскія лічбы 1812 і 28. На бакавых верхніх гранях — кірылічны надпіс у два радкі, які пакуль не ўдалося прачытаць:

ЗДЬ СЫПОК.
АНАС КОР

На петрыкаўскіх могілках захавалася пяць калон, выкладзеных з чырвонай цэглы. На астатняй тэрыторыі Белару-

Надмагільны камень у в. Капцэвічы

сі, як адзначае Л. Дучыц, вядома каля 20 падобных помнікаў. Выказваецца меркаванне, што яны ўзводзіліся ў памяць аб Канстытуцыі Рэчы Паспалітай 1791 г., якая вызначалася сваім дэмакратызмам і прагрэсіўнасцю. У 1793 г. Петрыкаўшчына ўвайшла ў склад Расійскай Імперыі, таму, магчыма, людзі ўзвядзеннем гэтых калон выказвалі свой пратэст супраць падзелу Польшчы. Ёсць на гарадскіх могілках і іншыя цікавыя помнікі і перш за ўсё драўляная цэркаўка канцаXVII — пачатку XVIII ст. Гэта месца апошняга прытулку многіх пакаленняў жыхароў Петрыкава, яго гісторыя, зафіксаваная ў камені.

Багата на археалагічныя помнікі розных эпох Петрыкаўская зямля. Адзіныя сведкі падзей, што губляюцца ў глыбіні тысячагоддзяў, яны захоўваюць рэшкі былых культур. Большасць з іх як след не вывучаны, але час і людзі нялітасцівыя да помнікаў. За апошняе паўстагоддзе развораны курганныя могільнікі каля вв. Беседы, Івашкавічы, Капцэвічы, Міцуры, Слабодка Чалюшчавіцкая, г. п. Капаткевічы, знішчаны або моцна пашкоджаны гарадзішчы каля вв. Навасёлкі, Боркі, Філіпавічы, Хвойня, паселішчы каля вв. Вышалаў, Вялаўск, Слабодка Чалюшчавіцкая, каля г. Петрыкава, забудоўваецца раннеславянскае селішча ў Навасёлках. З кожным зруйнаваным помнікам назаўсёды трацяцца старонкі гісторыі, губляецца духоўная сувязь з продкамі...

В. С. Вяргей, М. К. Селех

Вецер гісторыі над Петрыкаўшчынай

Тураўская зямля склалася ў выглядзе ўстойлівага палітычнага ўтварэння з асабістай тэрыторыяй летапіснага княжання дрыгавічоў і займала тэрыторыю ў межах рассялення гэтага племені. У асноўным гэта — Палессе, нізінная частка басейна Прыпяці. Тут многа рэк, пратокаў, ручаёў і азёр, вялікія забалочаныя прасторы і рэдкія ўзвышшы. Асноўная водная магістраль — Прыпяць з яе пратокамі. Землі малаўрадлівыя, недастаткова прыгодныя для апрацоўкі, амаль поўная адсутнасць карысных выкапняў, багацце дзічыны, цёплы і вільготны клімат — такая агульная характарыстыка краю[1]. На тэрыторыі дрыгавіцкага княжання і склалася Тураўскае княства. Але яно не ахоплівала ўсю этнічную тэрыторыю дрыгавічоў. Дрыгавіцкія пасяленні каля Мінска ўвайшлі ў склад Полацкага княства, ваколіцы Брагіна — Кіеўскага, Рэчыца — Чарнігаўскага княства.

Асобным княствам Тураў выступае ўжо ў канцы X ст. Найбольш старажытныя звесткі аб тэрыторыі і насельніцтве Тураўскай зямлі змяшчаюцца ў ранняй, недатаванай частцы старажытнага летапісу — «Аповесці мінулых часоў», летапісец якога Нестар пачынае выкладанне з 852 г. Першае ж упамінанне аб Тураве ў Іпацьеўскім летапісу адносіцца да 980 г.: «Рогволод бе пришед из заморья и имяше власть свою в Полотьске, а Тур Турове, от него же и туровца прозвашася...» Па Любецкаму з'езду былі перададзены «...Святополку Изяславичу з сынцы... Туров, Слуцк, Пинск и все города об оне стороны Припети»[1]. З гэтага можна зрабіць вывад, што ў X — першай палове XII ст. паўночная граніца Тураўскай зямлі праходзіла каля Клецка, Слуцка, уздоўж Дняпра — вышэй Рагачова, на поўдні — па правых прытоках Прыпяці, рр. Славечні, Убарці да верхняй Гарыні, уключаючы Мазыр, Тураў, Дубровіцу, па некаторых звестках, Сцепань, Чартарыйск, а на захадзе — да

[1] *Лысенко П. Ф.* Города Туровской земли, 1974.

[1] *Татищев В. Н.* История Российская, 1963.

П. Буга, уключаючы Бярэсце. Акрэсліць межы Тураўскага княства можна і па звестках аб гарадах, якія ўваходзілі ў Тураўскае княства: Бярэсце (1019), Пінск (1097), Слуцк (1116), Клецк (1128), Рагачоў (1142), Мазыр (1155); на мяжы XI—XII ст. узнік Давыд-Гарадок.

Тураўскае княства ўяўляла сабой больш высокі ўзровень сацыяльна-эканамічных адносін, чым княжанне дрыгавічоў, яно — далейшае развіццё і нашчадак былых палітычна-эканамічных адносін. Значэнне і магутнасць княства падкрэслівае і тое, што кіеўскі князь Уладзімір Святаслававіч перадаў яго трэцяму па старшынству сыну Святаполку, які пасля смерці бацькі некаторы час займаў Кіеўскі прастол.

Галоўныя заняткі насельніцтва княства — земляробства і жывёлагадоўля, а таксама рыбалоўства, вядомы былі і розныя рамёствы. Значнае развіццё атрымала культура, вядома была пісьменнасць, вялося летапісанне.

Пачынаючы з другой паловы XII ст. Тураўскае княства пачынае несці вялікія страты. На поўначы і на ўсходзе межы заставаліся ранейшымі, а на поўдні Мазыр і яго ваколіцы ў 1155 г. аддадзены Святаславу Ольгавічу і ўвайшоў у склад Кіеўскага княства, узмацніўшаеся Уладзімір-Валынскае княства падпарадкавала сабе Пабужжа і Пагарынне (Бярэсце і Чартарыйск). Час канчатковага падзелу Тураўскага княства дакладна ўстанавіць цяжка. Можна меркаваць, што працэс гэты пайшоў шпаркімі тэмпамі пасля смерці Юрыя Яраславіча ў 70-х гадах XII ст. Ужо ў падзеях 1174 г. тураўскія і пінскія князі названы паасобку. З гэтага часу значэнне і веліч некалі магутнага і вялікага Тураўскага княства няўхільна пайшлі на спад. З яго выдзелілася Клецкае, затым Пінскае княствы. У першай чвэрці XIV ст. у выніку захопніцкіх паходаў літоўскіх князёў паўднёвае Беларускае Палессе па Прыпяці, у тым ліку і Тураўскае княства, аказаліся ў валоданні Гедыміна, вялікага літоўскага князя.

Петрыкаў, размешчаны ў непасрэднай блізкасці ад Турава і маючы выдатныя водныя зносіны па р. Прыпяці, на працягу стагоддзяў быў кроўна звязаны са старажытнейшым горадам Беларусі і ў многім падзяляў яго лёс. Гэты край вельмі пацярпеў у 1241 г. ад татара-мангольскіх заваёўнікаў на чале з Гююкам і Койданам. На сваім шляху іх дзікія орды разбуралі, рабавалі, палілі... Яны не дасягнулі Мінска і каля Койданава былі разгромлены рускімі войскамі.

Аб заснаванні Петрыкава існуе некалькі легенд і паданняў. Найбольш распаўсюджаную і даставерную легенду прыводзіць вядомы гісторык і краязнавец нашага краю А. К. Кіркор: «При Припяти против устья реки Уборти довольно значительное местечко Петриков или Петриково, по преданию, будто бы основанное ятвяжским князем в X столетии и названное так от Петра, т. е. имени, которое принял этот князь при крещении»[1].

Старажытнарускія княствы, у тым ліку і Тураўская зямля, пацярпелі страшэнны разгром, развіццё эканомікі і культуры было адкінута на некалькі стагоддзяў назад. Яны засланілі сабой захад, які змог зрабіць дзякуючы трагедыі рускага народа вялікі крок наперад і далёка абагнаць Русь. У заходнім баку ад Тураўскай зямлі ў канцы XIII — пачатку XIV ст. пры Віцені і Гедыміне ўзнялося і ўзмацнела Вялікае княства Літоўскае, у склад якога паступова, рознымі шляхамі траплялі аслабленыя княствы на тэрыторыі сучаснай Літвы і Украіны.

В. Р. Феранц

Снядзін

Вяргей Валянціна Сяргееўна (н. у 1946 г. у г. Петрыкаў) — кандыдат гістарычных навук, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі АН Беларусі. Даследуе археалогію Беларусі,

[1] Живописная Россия, т. 3, с. 381.



Як і тысячу гадоў назад, плаўна і шырока нясе Прыпяць свае воды па-над старажытным Снядзінам...

гісторыю насельніцтва Беларускага Палесся ў жалезным веку і раннім сярэднявеччы. Выявіла і даследавала каля 100 археалагічных помнікаў, на 8 з іх правяла раскопкі. Даследавала амаль усе археалагічныя помнікі Петрыкаўшчыны, раскопкі ў Снядзіне і Макарычах.

На правым беразе Прыпяці, у 2,5—3 км на паўночны захад ад сучаснай в. Снядзін размешчаны цікавейшы археалагічны комплекс, які складаецца з трох старажытных паселішчаў, бескурганнага і курганнага могільнікаў. Паселішча 1 выяўлена ў 1992 г. у час пошуку курганнага могільніка, звесткі аб якім апублікаваў у 1991 г. П. Ф. Лысенка. У тым жа годзе адкрыты і бескурганны могільнік з абрадам трупаспальвання.

Паселішча 1 размешчана ва ўроч. Боркі на доўгім і вузкім, арыентаваным з захаду на ўсход пясчаным узвышшы, абкружаным з поўдня і поўначы балоцістымі нізінамі, на якіх месцамі захаваліся старычныя азёры. Займае плошчу прыкладна 550×70 м. Культурны пласт амаль не задзернаваны, раздзімаецца ветрам, там-сям пашкоджаны невялікімі ямамі і палявымі дарогамі, што цягнуцца да сенажацяў і палёў. Паверхневыя зборы далі падставу меркаваць, што паселішча шматслойнае і функцыянавала ў эпохі неаліту (IV—III тысячагоддзі да н. э.), бронзы (II тысячагоддзе да н. э.), жалезнага веку (VIII ст. да н. э.— I ст. н. э.) і раннім сярэднявеччы (V—X ст.).

На паселішчы 1 былі закладзены два раскопы: № 1 размяшчаўся ў цэнтральнай частцы помніка і № 2, які даследаваўся пад кіраўніцтвам М. М. Крывальцэвіча — ва ўсходняй частцы. Усяго двума раскопамі было ўскрыта каля 100 кв. м культурнага пласта, які складаўся з пяску шэрага колеру і дасягаў таўшчыні ў раскопе 1—0,1—0,2 м, у раскопе 2 даходзіў да 0,5 м. У абодвух раскопах не ўдалося выявіць жытлы жыхароў паселішча, аднак прасочаны звыш 30 гаспадарчых ям, якія адносяцца да розных перыядаў. Устаноўлена, што ўсходняя частка ўзвышша найбольш актыўна эксплуатавалася ў эпохі неаліту і бронзы, менавіта матэрыялы гэтых эпох пераважалі ў раскопе 2. Большасць знаходак раскопа 1 суадносілася з раннеславянскай культурай і датуецца V — XII ст. н. э.

Найбольш масавым матэрыялам, выяўленым у раскопах і сабраным на паверхні паселішча 1, з'яўляюцца абломкі ляпнога глінянага посуду. Да першай стадыі засялення ўзвышша ва ўроч. Барок адносяцца фрагменты вялікіх шыракагорлых вастрадонных гаршкоў днепра-данецкай неалітычнай культуры, што датуецца V—III тыс. да н. э.

Заходняя частка паселішча Снядзін 1 і прылеглае ўзвышша ў раннеславянскі час выкарыстоўваліся пад могіль-

нік. Два трупаспаленні былі раздзьмутыя ветрам і на паверхні азначыліся купкамі кальцыніраваных костак, пад якімі прасочаны невялікія круглыя ў плане ямкі дыяметрам 0,6—0,4 м і глыбінёй 0,3—0,4 м. Асобныя перапаленыя косткі нярэдка сустракаюцца на паверхні могільніка. Там жа знойдзена пашкоджаная ў агні блакітная шкляная 14-гранная пацерка, якая датуецца 2-й паловай I тысячагоддзя н. э.

Паселішча Снядзін 3 знаходзіцца ў 0,2 км на захад ад паселішча Снядзін 1 і аддзяляецца ад апошняга тэрыторыяй могільніка. Яно арыентавана з поўдня на поўнач, з захаду абмяжоўваецца старычным возерам Барацкое. Займае плошчу прыкладна 280×60 м, культурны пласт разворваецца. Раскопкамі не даследавалася. На паверхні сабраны абломкі ляпнога посуду раннеславянскай пражскай культуры V—VII ст., там жа можна назіраць значную колькасць жужлаў — адыходаў чорнай металургіі, кавалкі балотнай руды.



Знаходкі з селішчаў і бескурганнага могільніка каля в. Снядзін: *1—3, 7* — гліняныя праселкі; *4* — шыла; *5, 6, 12—14* — шкляныя пацеркі; *14—16* — крамянёвыя наканечнікі стрэл; *17* — крэсіва; *18* — наканечнік стралы

Паселішча Снядзін 2 размешчана ў 0,3 км на паўночны захад ад Снядзін 1 ва ўроч. Дворышча і аддзяляецца ад апошняга забалочанай нізінай. Займае заходнюю частку выцягнутага з усходу на захад узвышша, плошча каля 2 гектараў. Выкарыстоўваецца пад ворыва. У 1994 г. тут праведзены разведачныя раскопкі экспедыцыяй Інстытута гісторыі АН Беларусі. У раскопках таксама ўдзельнічалі амерыканскія археолагі пад кіраўніцтвам прафесара Волта Трымера. Даследавана 36 м² культурнага пласта таўшчынёю да 0,55 м. Выяўлена 6 гаспадарчых ям розных памераў і глыбіні. Адна з іх уяўляе рэшткі металургічнай печы, ад якой захавалася зробленая з перапаленай гліны ніжняя частка дыяметрам каля 0,8 м. Побач выяўлены вялікі кавалак крыцы — канечнага прадукту металургічнага працэсу. У раскопе знойдзена каля тысячы фрагментаў ляпной раннеславянскай керамікі V—VII ст., вялікая колькасць металургічных жужлаў, косткі жывёлін і рыб, гліняныя біканічныя праселкі, адно з якіх упрыгожана выявай крыжа, жалезнае шыла і пласцінкавае крэсіва, тачыльны камень, блакітная 14-гранная пацерка і пранізка са шкла колеру марской хвалі. Гэтыя рэчы характэрны для 2-й паловы I тысячагоддзя н. э.

Невялікія пакуль даследаванні на паселішчах у ваколіцах Снядзіна дазваляюць у пэўнай ступені прасачыць заняткі раннеславянскага насельніцтва. Аснову іх гаспадаркі складалі земляробства і жывёлагадоўля, аб чым паведамляюць і пісьмовыя крыніцы. Напрыклад, візантыйскі аўтар VI ст. Маўрыкій пісаў: «У іх (славян) шмат разнастайнай скаціны і злакаў, якія складзены ў сцірты — проса і полба. Жывуць яны сярод лясоў, рэк, балот і цяжка пераадольваемых азёр, устройва-

юць шмат выхадаў са сваіх жытлаў з-за спасцігаючай іх небяспекі, усё каштоўнае са сваіх рэчаў закопваюць у тайнікі, не трымаюць адкрыта нічога лішняга». І сапраўды, значная колькасць гаспадарчых ям, што адкрыты на паселішчах Снядзін 1 і 2, пацвярджае, што славяне звычайна хавалі ў зямлі харчовыя запасы, прадметы побыту, прылады працы, ямы маскіравалі зверху. Немалую ролю ў харчовых прыпасах жыхароў паселішчаў адыгрывалі прадукты рыбалоўства, што пацвярджаецца вялікай колькасцю лускі і костак рыб у культурным пласце. Жанчыны пралі і ткалі палотны, аб чым сведчаць праселкі. Была развіта чорная металургія. Такой колькасці металургічных жужлаў, якая знойдзена на паселішчах Снядзін 2 і 3, не сустракалася на раннеславянскіх паселішчах V—VII ст. на Палессі.

* * *

Далейшую гісторыю Снядзіна, які, відаць, у X—XI ст. быў перанесены на сучаснае яго месцазнаходжанне, можна прасачыць па пісьмовых крыніцах. Снядзін неаднаразова ўпамінаецца ў дакументах, звязаных з гісторыяй Тураўскага княства і Вялікага княства Літоўскага. Вядомы даследчык сярэдневяковага Палесся А. С. Грушэўскі цытуе звесткі з «Кіева-Пячорскага пацерыка» аб заснаванні ў 1005 г. Тураўскай епархіі і старажытнабеларускіх гарадах, што ўвайшлі ў яе склад. У гэтым пераліку прысутнічае і Смедань, якую можна атаясамліваць са Снядзінам (і зараз мясцовыя жыхары часта называюць вёску Смедзінам). Канцом XIV ст. датуюць «Список русских городов дальних и ближних», змешчаны ў «Новгородской первой летописи старшего и младшего изводов». У ім пералічана ў пэўным парадку 358 гарадоў, размеркаваных летапісцам па групах: спачатку — балгарскія і валошскія (малдаўскія), потым польскія, кіеўскія, літоўскія, смаленскія і залескія. Цяжка сказаць, якім прынцыпам карыстаўся аўтар, залічваючы іх да гарадоў рускіх. Мяркуюць, што спіс узнік у Ноўгарадскіх гандлёвых колах, якія былі звязаны гандлёвымі шляхамі з рознымі гарадамі рускага княства і Вялікага княства Літоўскага. У групе «кіеўскія» значыцца: «На Прыпети Чернобыль. Копыль. Мозырь. Переров. Смедин. Туров»... Безумоўна, у канцы XIV ст. гэтыя населеныя пункты ўваходзілі ў склад Вялікага княства Літоўскага, а ўказанне на размяшчэнне іх на Прыпяці з вялікай доляй верагоднасці дазваляе бачыць у летапісным Смедзіне сучасны Снядзін. На карысць такога меркавання сведчаць і археалагічныя даныя. У 1989 г. у 0,5 км на паўночны ўсход ад вёскі было адкрыта селішча плошчай звыш трох гектараў з матэрыяламі канца I — начатку II тысячагоддзяў.

У першай чвэрці XIV ст. Палессе ўваходзіла ў склад Вялікага княства Літоўскага. Тураўшчына пасля смерці апошняга наследнага князя Мітка Давыдавіча Гарадзецкага становіцца прыватным уладаннем вялікіх князёў літоўскіх, якія нярэдка перадаюць землі былога Тураўскага княства ва ўладанне ў якасці платы за дзяржаўную службу.

Прыкладна ў сярэдзіне XV ст. у Тураве ўпамінаецца князь Васіль Астрожскі — дзед знакамітага пераможцы ў бітве пад Оршай князя Канстанціна Астрожскага. Потым нейкі час Тураўшчынай валодаў князь Міхаіл Глінскі, а пасля яго здрады княству і ад'езду ў Маскву кароль і вялікі князь Жыгімонт актам 1511 г. пацвярджае правы ўладання князя Астрожскага на землі, якія належалі яго дзеду. Помнікам распараджэнняў К. І. Астрожскага ў Тураве захаваліся царкоўныя наданні ў карысць Тураўскага епіскапа і саборнай царквы Успення Багамацеры. Праваслаўнай царкве перадаваліся сёлы, мёд, дрэвы з борцямі, рыбныя азёры, сады і інш. У адной з даравальных грамат запісана, што Смедынь (Снядзін) і сёлы Смедынскай воласці —

Мардвіно (Мардзвін), Мосцевічы (?), Вышолгово (Вышалаў) абкладваюцца мядовым падаткам у карысць Тураўскага ўладыцтва і саборнай царквы.

У сярэдзіне XVII ст. Тураўшчына адыходзіць ва ўладанні кароны, якая, відаць, перадае Снядзінскую воласць Пінскаму езуіцкаму калегіуму. Звесткі аб гэтым маюцца ў запісках банкаўскага службоўца з Варшавы М. Контрыма.

У 80-х гадах XIX ст. у Снядзіне было 67 поўнанадзелавых сядзіб, парафіяльная царква Нараджэння Багародзіцы, якую наведвалі 1200 парафіян. З пачатку XIX ст. да 1917 г. Снядзін уваходзіў у склад маёнтка, які належаў Кеневічам. Цэнтральная сядзіба іх уладанняў знаходзілася ў Дарашэвічах. Апошні ўладальнік маёнтка Антон Кеневіч напісаў вельмі цікавыя ўспаміны аб жыцці сваёй сям'і на Палессі, выдадзеныя ў 1988 г. у Варшаве, з якіх можна даведацца таксама аб грамадскіх і рэлігійных адносінах, побыце розных груп насельніцтва, прадпрымальніцтве і гандлёвых сувязях, прыродных і этнаграфічных асаблівасцях Петрыкаўшчыны ў другой палове XIX — пачатку XX ст.

В. С. Вяргей

ЛІТАРАТУРА

Вяргей В. С. Справаздача аб палявых даследаваннях у Петрыкаўскім раёне ў 1993 г. — Мн., 1994.

Вяргей В. С., Крывальцэвіч М. М., Кудрашоў В. Я. Справаздача аб палявых даследаваннях у басейне р. Прыпяць. — Мн., 1990.

Грушевский А. Очерк истории Турово-Пинского княжества XI—XIII вв. — Киев, 1901.

Грушевский А. Пинское Полесье XIV — XVI вв. — Киев, 1903.

Крывальцэвіч М. М. Справаздача аб палявых даследаваннях у 1993 г. — Архіў Інстытута гісторыі АН Беларусі. — Мінск, 1994.

Лысенко П. Ф. Дреговичи. — МН., 1991.

Маврикий. «Стратегикон». // Свод древнейших письменных известий о славянах. Т. 1. — М., 1961.

Мельниковская О. Н. Племена южной Белоруссии в раннем железном веке. — М., 1967.

Новгородская первая летопись старшего и младшего извода. — М. — Л., 1950.

У Вялікім княстве Літоўскім і Рэчы Паспалітай

У канцы XIV ст. на яго тэрыторыі літоўскімі князямі створана Слуцкае княства, якое існавала да 1791 г. У яго складзе знаходзіліся і землі Петрыкаўшчыны. Пляменнік Альгерда Гедымінавіча Вітаўт Кейстутавіч, выгнаўшы з Кіева свайго стрыечнага брата Уладзіміра Альгердавіча (1395 г.), прызначыў яму ў валоданне замак Капыль і навакольныя ўгоддзі, куды ўваходзіў і Слуцк[1]. Так было заснавана Капыльска-Слуцкае княства. Да канца XVI ст. ім валодалі князі Алелькавічы, нашчадкі Уладзіміра Альгердавіча. Пачатак дынастыі паклаў яго сын Аляксандр, празваны Алелькам.

Тураў належаў князям Глінскім. У 1507—1508 гг. вялася вайна паміж маскоўскім і літоўскім вялікімі князямі. Міхаіл Глінскі падняў паўстанне ў Вялікім княстве Літоўскім. Вайна не прынесла перамогі ні аднаму з бакоў. Пры заключэнні міру ў 1508 г. з вялікім князем Жыгімонтам Тураў і навакольныя гарады і мястэчкі перайшлі да польскай кароны. Міхаіл Глінскі вымушаны быў збегчы ў Маскву. Кароль перадаў гэтыя землі ў валоданне гетмана князя Канстанціна Астрожскага, які завяшчаў іх сваёй другой жонцы, народжанай Алелькаўне[2]. Тураў і Петрыкаў перайшлі ў валоданне слуцкіх князёў. У іх валоданні ў гэты час знаходзіліся тэрыторыі сучасных Слуцкага, Капыльскага, Салігорскага, Любанскага, Старадарожскага, Петрыкаўскага, Жыткавіцкага, Глускага і Уздзенскага раёнаў. Значная частка зямель на гэтай тэрыторыі знаходзілася ў каралеўскім і вялікакняжацкім валоданні, а таксама належалі духоўным ордэнам і канфесіям.

Слуцкае княства знаходзілася ў ва-

---

[1] Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. Минская губерния. Ч. I, 1864.

[2] Россия. Полное географическое описание. Т. IX.

сальнай залежнасці ў вялікіх літоўскіх князёў. Яно адыграла значную ролю ў фарміраванні будучай беларускай народнасці, стрымлівала распаўсюджванне каталіцызму на паўднёвыя і ўсходнія землі Беларусі, супрацьстаяла набегам крымскіх татар, якія ў пачатку XVI ст. з'яўляліся ў яго межах. У 1502 г., прайшоўшы праз землі Украіны, татары пераправіліся праз Прыпяць і пачалі рабаваць землі на яе правым беразе. Аб'яднаны атрад слуцкага князя Сямёна Алелькі разбіў іх на рацэ Узе за Бабруйскам, адабраў нарабаванае дабро, вызваліў палонных.

На наступны год татары на чале з сынам хана Менглі-Гірэя зноў з'явіліся на беларускай зямлі. Трохтысячны атрад падышоў да Слуцка, разрабаваў яго ваколіцы і накіраваўся да Нава-



Петрыкаўшчына ў 1859 г. (карта рыхтавалася генералам В. Хшаноўскім у час падрыхтоўкі да паўстання пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага)

грудка. І зноў Сямён Алелька выступіў супраць рабаўнікоў, дагнаў і разграміў іх каля Давыд-Гарадка. Каб супрацьстаяць набегам татар, слуцкія князі вымушаны былі будаваць умацаваныя крэпасці. У 1509 г. быў умацаваны крэпасцю Слуцк, а князь Юрый Сямёнавіч (1492—1542) пабудаваў драўляную крэпасць у Петрыкаве для аховы паўднёвых граніц княства. Размяшчалася яна, мяркуючы па археалагічных знаходках і ўскосных гістарычных звестках, у цэнтры сучаснага горада, на высокім беразе Прыпяці, які перарэзваюць глыбокія кручы, на тым месцы, дзе цяпер знаходзіцца гарадскі парк. У час міжусобнай вайны вялікага маскоўскага князя Васіля IV з вялікім літоўскім князем Жыгімонтам крэпасць у 1535 г. была разбурана рускім ваяводай Аўчынай. Яна яшчэ некалькі разоў аднаўлялася і зноў разбуралася пры міжусобных войнах, якія доўгі час не давалі спакою гэтаму краю.

Князі Алелькавічы паходзяць з тых літоўскіх князёў, якія прынялі праваслаўную веру, рускую мову (у той час мову нашых продкаў), звычаі і ўклад жыцця нашага народа. Іх продак літоўскі князь Альгерд, сын вялікага літоўскага князя Гедыміна, хрысціўся ў праваслаўную веру і ажаніўся на праваслаўнай дачцэ віцебскага князя Яраслава з роду Рурыкавічаў. Нашчадкі князя засталіся вернымі запаветам. Яны пабудавалі ў Петрыкаве праваслаўныя цэрквы Святога Мікалая і Уваскрасення Гасподняга. Польскі кароль Казімір у 1481 г. выдаў указ, які забараняў будаваць новыя праваслаўныя цэрквы і аднаўляць старыя. Слуцкі князь Міхаіл Алелька ў тым самым годзе ўзначаліў супраць яго змову з мэтай далучыцца да Маскоўскага княства. Змова была раскрыта, Міхаіл Алелька і князь Гальшанскі, які таксама прымаў удзел у змове, пакараны смерцю, а стрыечны брат Міхаіла Фёдар Іванавіч Бельскі збег у Маскву.

Князь Юрый Алелька, які памёр у 1578 г., завяшчаў пахаваць яго па праваслаўнаму абраду ў Кіева-Пячорскім манастыры, дзе пахаваны яго продкі, а сынам — назаўсёды заставацца ў праваслаўнай веры.

Апошні з Алелькавічаў князь Юрый Юр'евіч памёр у 1586 годзе. Памерлі і яго сыны. Адзінай наследніцай засталася малалетняя дачка Соф'я. Апекуном яе быў прызначаны далёкі сваяк, жмудскі староста Юрый Хадкевіч, а пасля яго смерці апякунства перайшло да яго брата, віленскага каштэляна Гераніма Хадкевіча. Хадкевічы мелі вялікую запазычанасць князям Радзівілам і меркавалі паправіць свае справы за кошт багатай сваячкі, князёўны Соф'і. Яны заключылі з Радзівіламі дагавор, што пасля дасягнення паўналецця Соф'я выйдзе замуж за сына віленскага ваяводы Януша Радзівіла.

Соф'я расла ў глыбокай павазе да праваслаўнай царквы і дала згоду на шлюб, паставіўшы ўмову, што дзеці будуць праваслаўнымі. Януш Радзівіл быў кальвіністам. Ён вымушаны быў звярнуцца да папы рымскага за дазволам для ўступлення ў шлюб з княжной. Дазвол быў атрыманы і 1 кастрычніка 1600 г. у Брэсце адбылося вяселле.

Праз месяц па даравальнаму запісу слуцкіх князёў Соф'і Алелька і Януша Радзівіла ў Галоўным Трыбунале Вялікага княства Літоўскага мястэчка і маёнтак Петрыкаў з вёскамі і фальваркамі, якія належалі да яго, перайшлі ў валоданне віленскага каштэляна, брэсцкага старасты Гераніма Хадкевіча. Капаткевічы і навакольныя вёскі па волі караля Жыгімонта Аўгуста яшчэ ў 1568 г. былі перададзены «на вечнасць» на ленным праве Севярыну Руцкаму, потым перайшлі ў валоданне Яленскіх[1]. Маёнткі Навасёлкі, Філіпавічы, Ванюжычы па прывілею караля Жыгімонта III у 1623 г. перададзены ў леннае валоданне за вайсковыя заслугі Крыштофу Богушу і яго жонцы Аляксандры[2]. Снядзін, Мардз-

[1] НГА Беларусі, ф. 163. воп. 1, с. 678.
[2] НГА Беларусі, ф. 27, воп. 1, с. 10, л. 27.

він, Лобча, Турок, Вышалаў, Дарашэвічы, Галубіца, Капцэвічы, Гліннае знаходзіліся ў валоданні езуіцкага ордэна.

У 1596 г. у Брэсце сабор праваслаўных іерархаў, якія здрадзілі праваслаўю, прыняў дэкларацыю аб уніі (саюзе) праваслаўнай і каталіцкай царквы. Гэтым самым была створана новая канфесія — уніяцкая, якая была разнавіднасцю каталіцкай веры. На тэрыторыі Беларусі пачаўся прымусовы пераход праваслаўных беларусаў ва ўніяцтва. Гэта выклікала незадаволенасць і супраціўленне народных мас. Княгіня Соф'я ўгаварыла свайго мужа Януша Радзівіла звярнуцца да караля, каб той забараніў у іх валоданнях прымушаць праваслаўных да пераходу ў каталіцкую веру. Такі прывілей быў атрыманы, і нашчадкі Януша строга прытрымліваліся гэтых правілаў.

Княгіня Соф'я памерла ў 26 гадоў у час родаў, нашчадкаў у яе не засталося, і Слуцкае княства па духоўным завяшчанні перайшло ў поўнае валоданне Януша Радзівіла. Яшчэ пры жыцці княгіні Соф'і на Палессі разгарнуліся падзеі, якія пакінулі значны след у гісторыі краю. Гэтая зямля стала арэнай барацьбы сялянства супраць феадальнага ладу, барскага прыгнёту, нацыянальнага і рэлігійнага прыцяснення. У кастрычніку — снежні 1595 г. сялянскія паўстанні ахапілі поўдзень і ўсход Беларусі. Ядром паўстання быў атрад казакоў пад кіраўніцтвам Севярына Налівайкі. Да яго далучыліся сяляне, гарадская беднота, дробныя феадалы. У кастрычніку атрад прыбыў на тэрыторыю Беларусі, і першым населеным пунктам, які занялі паўстанцы, быў Петрыкаў. А 6 лістапада яны штурмам авалодалі Слуцкам, занялі яго ваколіцы. Беларускія сяляне і бяднейшыя гараджане аказвалі дапамогу паўстанцам, многія папаўнялі іх рады. Гэта дапамагло атраду Налівайкі прайсці па ўсёй усходняй Беларусі, заняць Магілёў, а потым праз Рэчыцу, Петрыкаў, Тураў, Давыд-Гарадок, Пінск выйсці на Украіну. Хадкевічы, якія былі блізкімі да каралеўскага двара, займалі ў той час высокія дзяржаўныя пасады ў Рэчы Паспалітай, праводзілі настойлівую палітыку акаталічвання мясцовых праваслаўных беларусаў.

Па Люблінскай уніі 1569 г. усе паўнамоцтвы ўлады на тэрыторыі Беларусі фактычна былі перададзены каралю. Яны падтрымлівалі ўрадавыя меры па апалячванні і акаталічванні беларускага сялянства. Створаная ўніяцкая царква яшчэ больш узмацняла нацыянальна-рэлігійны прыгнёт усіх слаёў насельніцтва. Падтрымлівалі гэтыя меры і ўслужлівыя каралеўскай уладзе многія мясцовыя феадалы.

У 1617 г. памёр Геранім Хадкевіч. Права на валоданне спадчынай перайшло да яго сына Крыштофа, мазырскага старасты, які ў хуткім часе быў прызначаны віленскім каштэлянам. Хадкевічы не маглі не лічыцца з запаветам княгіні Соф'і і прывілеем караля аб недапушчэнні прымусовага звароту праваслаўных у каталіцкую веру. Не парушаючы дзеянне двух праваслаўных цэркваў у Петрыкаве, Крыштоф Хадкевіч пабудаваў уніяцкую царкву, тым самым заснаваўшы тут новую рэлігійную канфесію. У 1630 г. пры гэтай царкве была адкрыта школа для выхавання дзяцей уніятаў. У 1638 г. ён са сваёй жонкай Зафіяй Горскай пабудаваў касцёл Благавешчання і адкрыў плябанію — прыход касцёла, якому быў выдадзены фундуш на валоданне фальваркам Навасёлкі з грунтам Яхаўшчына. Даходы з фальварка ішлі на ўтрыманне плябаніі і касцёла[1].

У выніку ўзмацнення феадальнага і нацыянальна-рэлігійнага прыгнёту ўзрастала незадаволенасць сялян, рамеснікаў, дробнай шляхты, што прывяло да паўстання 1648—1649 гг. Паўстанне пачалося супраць паноў на тэрыторыі Украіны, затым перакінулася на Беларусь і распаўсюдзілася на землях Петрыкаўшчыны. Першыя казацкія атрады

[1] НГА Беларусі, ф. 1728, воп. 1, с. 9.

з'явіліся на поўдні Палесся ў пачатку лета 1648 г. Да іх далучыліся сяляне, беднота гарадоў і мястэчак. Баі з урадавымі войскамі разгарнуліся на вялікай тэрыторыі ад Брэста да Слуцка і Мазыра. Паўстанцы падыходзілі да Мінска. Вясной 1649 г. Багдан Хмяльніцкі накіраваў у Беларусь трохтысячны атрад пад камандаваннем І. Галоты. Да яго далучыліся мясцовыя жыхары, ён вырас да 30 тысяч чалавек. Атрад разграміў вялікакняжацкія войскі на поўначы ад Прыпяці. Баі працягваліся на працягу трох месяцаў, і толькі ў чэрвені войскам гетмана Януша Радзівіла ўдалося нанесці паражэнне паўстанцам. Потым ён учыніў крывавую разню над уцалелымі паўстанцамі, спаліў і разарыў Тураў, знішчыў усё яго насельніцтва, аб чым гнеўна гаварыў каралеўскім паслам у Пераяслаўлі Багдан Хмяльніцкі.

Шмат зла Палессю прынесла вайна Масквы з Рэччу Паспалітай 1654—1667 гг. Яшчэ да пачатку яе ў Беларусі выказваліся ідэі далучэння да Расіі. Казацкія «загоны», высланыя Хмяльніцкім насустрач наступаючым рускім войскам, 7 ліпеня 1654 г. падышлі да Мазыра. Мазырскі гарнізон — атрад шляхцічаў пад камандаваннем Шымона Паўшы пакінуў горад і адышоў да Петрыкава. Ваявода Валконскі прыслаў сюды з Украіны атрад на чале з Фёдарам Парошыным і казакоў Паўла Яненкі. Кавалерыйскі атрад Шымона Паўшы вымушаны быў пакінуць мястэчка. Летам 1655 г. ва ўрочышчы Лях-хава Лаза адбылася жорсткая бітва паміж казакамі і палякамі, і рускія войскі ўвайшлі ў Петрыкаў.

Ваенныя дзеянні на палескай зямлі паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай узнавіліся ў пачатку 1660 г. Ваявода Шарамецеў прыслаў з Кіева ратнікаў Андрыяна і казакоў пад камандай наказнога палкоўніка Багдана Малявы. Да іх далучыліся мяшчане і просты люд Турава, Петрыкава і навакольных вёсак. Атрады казакоў і сялян грамілі маёнткі памешчыкаў і штурмам узялі Пінск. Мазырскі павет поўнасцю знаходзіўся пад уладай Расіі.

У маі 1664 г. на Палессі зноў успыхнула сялянскае паўстанне. Паўстанцы авалодалі Петрыкавам і накіраваліся да Турава. Гетман Сапега выслаў насустрач ім атрад служывых татар і шляхты, паўстанцы вымушаны былі накіравацца на Украіну. Пасля заканчэння вайны Петрыкаў і воласць знаходзіліся ў валоданні пляменніка Крыштофа Хадкевіча, абознага Вялікага княства Літоўскага, старасты блудзенскага Юрыя Карла Хадкевіча, палкоўніка польскага войска.

Вайна прывяла ў заняпад гаспадарку, парушылася гаспадарчае кіраванне і нават парадкі ў царкоўных прыходах у выніку страт старых дакументаў. Адміністрацыі давялося аднаўляць гаспадарчае кіраванне, размяжоўваць царкоўныя прыходы. У 1682 г. да Уваскрасенскай царквы аднесены в. Курыцічы, Бяланавічы, Міхедавічы, Навасёлкі, Белка; да царквы Святога Мікалая — Сялюцічы, Грабаў, Гаголічы (Аголічы) «з млынам» і Конкавічы «з млынам» на рэчцы Бобрык, Аціркі. За праваслаўнай царквой заставаліся таксама Смятанічы. Цэрквы атрымлівалі з гэтых вёсак фундуш на свае патрэбы, а сяляне, акрамя таго, плацілі петрыкаўскаму замку грашовы чынш — 60 злотых польскіх і пры панскім паляванні абавязаны былі хадзіць у аблаву на дзікага звера, а пры лоўлі рыбы цягнуць невад. У мястэчку мяжой прыходаў была Кіеўская вуліца, на якую выходзіў Слуцкі тракт. Па правым баку вуліцы жыхары адносіліся да прыходу Уваскрасенскай царквы, па левай — царквы Святога Мікалая. Акрамя абавязкаў па ўтрыманні царквы кожны мешчанін плаціў Петрыкаўскаму замку 10 коп польскіх грошай[1].

Пасля смерці Юрыя Карла Хадкевіча на руках у яго ўдавы Марыяны-Тэклі засталося двое непаўналетніх

[1] НГА Беларусі, ф. 1728, воп. 1, с. 4, л. 911—912; с. 9, л. 196—199.

дзяцей — Ян і Іагана. Дзяўчына па дасягненні паўналецця выйшла замуж за Пятра Міхала Паца, Жмудскага генеральнага старасты. Першае ўпамінанне аб ім у якасці новага гаспадара мястэчка адносіцца да 1693 г., калі ён даручае пінскаму мечніку абарону судовых інтарэсаў петрыкаўскага мешчаніна Івана Цярэшкі «ва ўрадзе» Слуцкага замка[1].

Да канца XVII ст. Петрыкаў ажыў і залячыў раны, нанесеныя войнамі. Мястэчка адбудавалася, павялічылася колькасць жыхароў. Агульнымі пытаннямі кіравання і судовымі справамі займаўся сам гаспадар, а штодзённае жыццё і парадак знаходзіліся ў веданні войта. Для зручнасці збірання з насельніцтва плацяжоў і шматлікіх падаткаў, падтрымання ўнутранага парадку мястэчка дзялілася на тры дзесяткі — Дзімітрыя Хмялеўскага, Сыча і Цімоха.

У 1694 г. Пацы пацвердзілі сваім кансэнсам канфірмацыю петрыкаўскіх пратапопаў Міхаіла і Яна Загароўскіх, якую ўвёў Юрый Хадкевіч. Свяшчэннікі захоўвалі права служыць у праваслаўных храмах, а сын пратапопа Міхаіла айцец Іван мог адпраўляць службу ў царкве Уваскрасення як пры жыцці, так і пасля смерці бацькі[2].

Жыхары мястэчка і навакольных вёсак з'яўляліся падданымі гаспадара, які прызначаў феадальныя павіннасці і сачыў за іх выкананнем. Мяшчане займаліся ў асноўным рамесніцтвам і дробным гандлем. Шырока было распаўсюджана агародніцтва. За зямлю пад пабудовы і агароды яны плацілі грашовы аброк (чынш). Некаторыя рамеснікі за работы «на патрэбы двара» («паслуг дворных») вызваляліся ад платы за зямлю. За зямельны надзел цяглыя сяляне плацілі памешчыку грашовы чынш і «даніну без меры», якую прызначаў гаспадар у залежнасці ад гаспадарчай дзейнасці сялянскага двара. Уносілі яе грашыма і натурай — зернем, жывёлай, мёдам.

Паншчына — работа ў маёнтку — распаўсюджвалася на ўсіх працаздольных падданых — мужчын з 17 гадоў, жанчын з 15 гадоў і састаўляла 1,5 дня ў тыдзень, або кожны трэці тыдзень. Былі работы агульныя на карысць памешчыка — згоны або гвалты. У залік паншчыны падданыя па чарзе неслі ахову гаспадарчага двара і ўгоддзяў. Даходы памешчыцкай гаспадаркі раслі, значная частка прадукцыі пастаўлялася на рынак — жывёла, мёд, рыба, зерне, гарэлка і іншае. Выкарыстоўваліся розныя арэнды. Палову ўсіх даходаў давала карчэмная арэнда. Маёнтак са 142 цяглымі службамі даваў 7 тысяч злотых гадавога прыбытку.

Пасля смерці Міхала Паца (каля 1709 г.) Петрыкаў зноў перайшоў у валоданне Хадкевічаў — спачатку Юрыя Карла Яна, а потым дачкі Іаганы, якая стала жонкай генеральнага старасты Самагіцкага Казіміра Заранкі. У 1716 г. Казімір і яго жонка Іагана падпісалі трохгадовы кантракт на перадачу мястэчка Іцку Моўшавічу і Моўшы Іцкавічу са штогадовай арэнднай платай 6000 злотых. Мястэчка перадавалася ў арэнду «з шынком мядовым, піўным, гарэлачным і тытунёвым, з перавозам на Прыпяці, з млынам на р. Бобрыч, другім у Ляскавічах, трэцім у Макарычах, з правам гандлю ў вёсках, якія да воласці належаць, з правам заводзіць свае шынкі»[1]. Пад пагрозай штрафу сялянам і мяшчанам забаранялася купляць на баку моцныя напіткі. Арандатарам дазвалялася браць маставыя на р. Бобрыч па два літоўскіх гроша з кожнага купецкага воза і столькі ж за прагон жывёлы.

Пасля смерці Іаганы Заранкавай Петрыкаў перайшоў у валоданне яе пляменніка Адама Хадкевіча, брэсцкага ваяводы. У яго быў адзін сын Ян. Яго жонка Разалія, якая засталася ўдавой,

---

[1] НГА Беларусі, ф. 694, воп. 1, с. 3.

[2] НГА Беларусі, ф. 1728, воп. 1, с. 4, л. 911–912.

[1] НГА Беларусі, ф. 163, воп. 1, с. 946.

выйшла замуж за падскарбія зямель прускіх графа Якуба Чапскага. Яго прыёмны сын Ян атрымаў тытул графа, а Петрыкаўская воласць пераўтворана ў графства з прызначэннем губернатара.

У пачатку XVIII ст. значна ўзрос прыгнёт сялян. Абвастрыліся класавыя, нацыянальныя і рэлігійныя супярэчлівасці. Асабліва садзейнічалі гэтаму прымусовае далучэнне праваслаўных беларусаў да ўніяцкай царквы і абавязковае ўвядзенне польскай мовы ва ўсіх афіцыйных зносінах. Сяляне скардзіліся на непамерныя прыцясненні і самаўпраўства з боку памешчыкаў, уцякалі ад сваіх гаспадароў, нападалі на іх маёнткі і землі, працівіліся распаўсюджанню каталіцызму і ўніяцтва. У 1737 г. сяляне суседніх вёсак разрабавалі фальварак Навасёлкі, які належаў петрыкаўскаму касцёлу, пашкодзілі гаспадарчыя пабудовы, секлі лес, нападалі на мясцовых жыхароў. Ксёндз Васілеўскі звярнуўся ў суд са скаргай на самаўпраўства прыгонных Хадкевічаў. У інцыдэнце былі замешаны таксама сяляне петрыкаўскай пратапопіі. Гаспадары маёнтка, каб прыцягнуць на свой бок яе кіраўнікоў, выдалі касцёлу фундуш на валоданне млынам у в. Белка і дазволілі «гарэлку гнаць пры неабходнасці на тое»[1]. Але канфлікт не заціхаў. У 1746 г. Разалія Хадкевіч накіравала ў Петрыкаў свайго камісара па гаспадарчых справах Грабіцкага. Не маючы паўнамоцтваў на ўмяшанне ў мясцовыя духоўныя справы, ён сабраў праваслаўных свяшчэннікаў з усёй воласці і ў іх прысутнасці ўчыніў суд над праваслаўным свяшчэннікам лясковіцкай царквы Сашкоўскім, абвінавачваючы яго ў перацягванні ўніятаў у праваслаўе. Свяшчэннік быў вызвалены ад пасады і арыштаваны, па загаду камісара яго вялі па рынку і прымушалі біць паклоны. Петрыкаўскае духавенства і «лепшыя мужы» мястэчка пайшлі ў плябанію, каб вызваліць свяшчэнніка, але іх і блізка не пусцілі, а на другі дзень усіх прывялі да касцёла і прымусілі таксама кланяцца і ляжаць на падлозе крыжам. Прыход Сашкоўскага быў напалову аддадзены ўніяцкай царкве, а царква Святога Мікалая ў мястэчку была закрыта. Пасля скаргі мяшчан пані Хадкевіч дазволіла зняць пячатку з царквы, але праваслаўных вернікаў размеркавалі паміж петрыкаўскім касцёлам і ўніяцкай царквой у Грабавічах (Грабаве). Праваслаўных в. Курыцічы прымусілі прыняць уніяцкую веру перад вікарыем петрыкаўскай плябаніі. Пад прымусам асвяцілі ва ўніяцкую веру царкву ў мясцовым манастыры в. Манастыр (зараз в. Саснавец) і далучылі да яе плябаніі жыхароў Бабуніч і Аголіч. Вёскі Сялюцічы і Міхедавічы не падпадалі пад ўніяцтва, але туды забараняўся доступ праваслаўных святароў.

Доўгія гады цягнулася цяжба і судовая справа паміж уладальнікамі маёнтка і петрыкаўскім пробашчам Томашам Яленскім. Спрэчкі ішлі за зямлю з пабудовамі, якія не былі закончаны з-за адсутнасці ў плябаніі дакументаў на гэтыя валоданні. Рэктар Пінскай калегіі езуітаў разам з пракуратарам Снядзінскай воласці ксяндзом Міхаілам Трацэўскім скардзіліся ў суд на гаспадара Петрыкава за рабаванне, што ўчынялі яго падданыя, а той, у сваю чаргу, скардзіўся на снядзінскіх езуітаў за нявыдачу беглых сялян Петрыкаўскаму графству. У 1756 г. узнікла судовая справа паміж плябаніяй і графствам з-за захопу сялянамі вёсак Сялюцічы і Міхедавічы ў жыхароў Грабава збажыны і вулляў з пчоламі. Справа ўскладнялася тым, што ні адзін бок не мог прадставіць дакументаў аб размежаванні зямель гэтых вёсак. Рашэннем суда жыхары Сялюціч абавязваліся ў вызначаны судом тэрмін вярнуць жыхарам вёскі Грабаў вуллі з пчоламі, самавольна захопленыя снапы жыта і грэчкі, а жыхары Міхедавіч павінны былі за спаленыя стагі кампенсаваць страты грашыма і сенам. Петрыкаўскаму губернатару даручалася

[1] НГА Беларусі, ф. 1728, воп. 1, с. 11, л. 779.

Надмагільныя каталіцкія помнікі-калоны на могілках у Петрыкаве, узведзеныя ў канцы XVIII – пачатку XIX ст. у знак пратэсту супраць падзелу Рэчы Паспалітай

правесці тэрміновае следства з мэтай выяўлення вінаватых і чатырох з іх пакараць пяццюдзесяццю ўдарамі пастронкамі.

Рэлігійнае супраціўленне вылівалася іншы раз у жорсткія сутычкі. Зімой 1761 г. была арганізавана працэсія місіянераў-дамініканцаў каталіцкай веры, якая павінна была закончыцца малебнам каля крыжа непадалёку ад Петрыкава. На працэсію, якая рухалася да петрыкаўскага парафіяльнага касцёла, напалі праваслаўныя мяшчане («дзезуніты»). Яны ўчынілі пабоі, адабралі харугвы і кінулі іх пад ногі. Больш за ўсіх пацярпеў ксёндз Лаўрын, які з цяжкасцю знайшоў сховішча ў петрыкаўскім замку. Гэта была рэакцыя на ранейшыя прыцясненні праваслаўных католікамі. Праз некаторы час жыхар в. Галубіца Фёдар Белакур, падданы снядзінскіх езуітаў, абакраў абедзве праваслаўныя цэрквы, забраў усе прыходскія грошы, каштоўныя культавыя рэчы і вопратку свяшчэннікаў. Пасля смерці ў 1781 г. Яна Мікалая Хадкевіча Петрыкаўскае графства з маёнткам перайшло ў карыстанне яго жонкі графіні Людовікі Хадкевіч, а вотчынныя правы засталіся за іх дзецьмі.

У канцы XVIII ст. мястэчка Петрыкаў становіцца адным з найбольш буйных на Палессі гандлёвых цэнтраў. Гэтаму садзейнічала атрыманне ад польскага караля адпаведнага прывілея. Ян Мікалай Хадкевіч становіцца гаспадаром краю. Тытул графа, дзяржаўныя пасады генеральнага старасты жмудскага, ваяводы брэсцкага і генеральскі чын садзейнічалі збліжэнню яго з каралеўскім дваром. У 1776 г. ён атрымлівае ад караля Сігізмунда прывілей на правядзенне ў мястэчку кірмашоў. Яны праводзіліся двойчы ў год – 20 ліпеня і 1 лістапада. На іх прыязджалі сяляне з усёй воласці і бліжэйшых паветаў, прадавалі жывёлу, коней, прадукты харчавання, тавары мясцовых промыслаў. Купцы з навакольных гарадоў і мястэчак прывозілі сукно, шоўк, вырабы з жалеза і скуры. Ярмаркі прыносілі немалы даход гаспадару мястэчка, арандатарам шынкоў.

М. К. Селех

Над матэрыялам раздзела працаваў
В. П. Мазуркевіч

ДАНІНА* КН. МІКАЛАЯ ЮР'ЕВІЧА РАДЗІВІЛА АД 15 ЛІПЕНЯ 1568 г. СЛУЖЭБНІКУ СЕВЕРЫНУ РУЦКАМУ НА С. КАПАТКОВІЧЫ МАЗЫРСКАГА ПАВ. ЗА СЛУЖБУ

...Станіслаў Аўгуст, Божай ласкай кароль польскі вялікі князь Літоўскі, Рускі, Прускі, Жмудскі, Мазавецкі, Кіеўскі, Валынскі, Падольскі, Падляшскі, Інфляндскі, Смаленскі, Сіверскі,

* Даніна (каралеўская) – маёнтак, пажалаваны каралём.

Чарнігаўскі і г. д. сведчым гэтым лістам нашым, выпісам, каму тое ведаць належыць, што ў кнігах Метрыкі Канцэлярыі нашай Галоўнай ВКЛ знаходзіцца даніна Северыну Руцкаму на 16 службаў людзей Мозырскай воласці, ленным правам за найяснейшага... нашага караля Жыгімонта Аўгуста ў 1568 г. месяца ліпеня 15 дня дадзена і прадстаўлена нам праз паноў радцаў і ўраднікаў..., каб мы гэтую даніну з тых жа кніг Метрыкі Канцэлярыі нашай Галоўнай ВКЛ выдаць дазволілі, якую слова да слова з рускага выпісалі...

Сім лістам нашым даем я. м. самому, жонцы, дзецям і патомкам яго ўласным ленным правам мужчынскага роду на вечнасць... тое сяло Капатковічы службаў аселых 16: на 1-ай — Ісай Радывановіч і Нараш Мікуліч — служба адна; Апанас Амельяновіч і Амельян Сямёнавіч — служба адна; Валер'ян Іванавіч — служба адна, Багдан і Савош Сенковічы — служба адна; Амельян Служчыч, Іван Пятровіч — служба адна; Петрыкей Сыменовіч — служба адна; Васіль і Сідар Стэпановічы — служба адна; Аніска Ціховіч — служба адна; Трахім Казловіч, Кузьма Грыневіч — служба адна; Грын Ласковіч з Восіпам — служба адна; Грын Левановіч, Багдан (Фаевіч) — служба адна; Нічыпар Бабновіч — служба адна; Васіль Церашковіч, Якаў Бурчыч — служба адна; Даніла і Сак Ласевічы — служба адна, Дзежка Грыневіч, Сямён і Мікіта Хадаровічы — служба адна; Іван і Курыла Андрэевічы — служба адна.

Мяжа таго сяла (Капатковічы) пачынаецца ад балота «Орменского» да калодзежа «Мархотчына», ад «Мархотчына» борам да Біцка востава, ад таго востава ў лесе ўрочышчам Пахучы, ад Пахучага ў Востышча балота, з таго балота праз рэчку бяжыць у Крывое возера, з таго возера ў р. Белку ўверх у «Балто сало» балотам у Рашэўскае балота, ад Рашэўскага балота да Укудавых ляскоў, ад ляскоў у зялёны мох, ад зялёнага моху у р. Ручыч, Ручычам уверх Саламейскі востраў, адтуль у Чортавы Берві, ад Бервей у Чытоўку — балота, ад таго балота да хвоі мяжовай урочышчам Татарын... Пры тым жа сяле востраў Рашэва мае С. Руцкі сам, жонка, дзеці і патомкі яго ўласныя мужчынскага роду, тое сяло памянёнае Капатковічы з грунтамі, людзьмі аселымі і пустымі, з данню грашовай і мядовай, з дзяклам, грашовымі, жытнімі, аўсянымі і сеннымі і з усімі платы, даходы і пажыткі, любым імем названымі, з таго сяла прыходзячымі, з землямі ворнымі і няворнымі, з барамі, гаямі, лясамі, з востравамі Рашэва, з сенажацьмі, з засценкамі, балотамі, хмызнякамі, з кустоўем і з праробкамі, з ловы звярынымі і птушынымі, з рэчкамі, з азёрамі, ставамі і з ставішчамі, з млынамі... з ловы рыбнымі, бабровымі гонамі, з крыніцамі, патокамі і з усім тым, што тое сяло... само ў сябе, у сваіх межах... мае, на сябе трымаць і ўжываць, прыбаўляць, пашыраць і ўсякія пажыткі паводле волі... сабе там прымнажаць, водле волі ленным правам на вечнасць...

У гэтым выпісу пры пячатцы ВКЛ подпіс п. падканцлера ВКЛ Антонія Пшэдзецкага...
...На тым жа выпісу подпіс я. м. метрыканта ВКЛ Юзафа Міклашэвіча.

ПОДЕЛ МЕЖДУ ЮРИЕМ, ЯНОМ-СЫМОНОМ И АЛЕКСАНДРОМ ОЛЕЛЬКАМИ, КОТОРЫЙ ПРОИЗОШЕЛ 6 ИЮЛЯ 1582 г. (ВЫПИСКА ИЗ КНИГ ГРОДСКИХ СЛОНИМСКИХ)

Раздел совершен между братьями с согласия матери их Екатерины Тенчинской.

...Александр [получил]: в Слуцке Остров с замковыми селами: Шостаки, Брановичи и двор Басловцы и фольварок Грозово. Дворы: Старица и Свидымский, Быстрицу, Белевичи, Куропатвинский с местечком Себежевским; дворец Душова, Велешено, Еремичи; местечко Дубайское и Язиль и вторую половину имений Глушкова и Дорошкова и двор Глуск.

В Мозырском повете — волость и замок Петриково, двор Колно с местечком Ленином, волости Добро-Деревскую и Юденевскую...

Минская старина, выпуск IV. 1913.

КАНСЕНС ПЯТРА МІХАЛА ПАЦА АД 1694 г., ПАЦВЯРДЖАЮЧЫ КАНФІРМАЦЫЮ ПРАТАПОПАЎ МІХАЛА І ЯНА ЗАГАРОЎСКІХ ЮРЫЕМ КАРЛАМ ХАДКЕВІЧАМ АД 24 СТУДЗЕНЯ 1682 г.

На рочках гродскіх мазырскіх лютаўскіх перада мной Гервазіям Аскеркам-старастам судовым, Юзафам Богушам-падстарастам, Міхалам (і Пагорскім) Ленкевічам-суддзёй, Рафалам Шумаўскім-пісарам — чыноўнікамі Мазырскага пав. прадставіў да актаў Мозырскага гродскага суда кс. Нарцыс Сімінскі ніжэйпададзены дакумент на асобы, у ім пазначаныя, наступнага зместу:

Пётр Міхал Пац, генеральны староста Жамойцкага княства, староста віленскі, бесагольскі, плотольскі, даўгялішскі і Марыяна Пацава, генеральная старасціна Жамойцкага княства, ... абвяшчаем гэтым нашым консенсам, каму аб гэтым ведаць трэба цяпер і ў будучым..., што звярнуліся да нас з прашэннем айцец Міхал Загароўскі, пратапоп петрыкаўскі з сынам сваім Янам Загароўскім, ... аб тым,

каб мы іх абодвух пры царкве Уваскрасення Божага і пры ўсіх даходах, што да царквы з даўніх часоў належаць, пакінулі служыць. На (што) і ліст далі св. айцы ад св. памяці пана Ежы Караля Хадкевіча, абознага ВКЛ, старасты блудзенскага, палкоўніка войск я. к. м. папярэдніка нашага. Перад намі паклалі з просьбай, каб мы гэты ліст пацвердзілі, які і даем ніжэй ад слова да слова.

Ежы Караль Хадкевіч, абозны ВКЛ, староста (палудзенскі), палкоўнік войск я. к. м. абвяшчаю гэтым маім адкрытым лістом і даводжу да ведамасці ўсім цяперашнім і будучым людзям (што)... з даўняга часу ў маім дзядзічным м. Петрыкаве былі дзве царквы — адна Уваскрасення Божага, а другая св. Міколы, уфундаваныя ад св. памяці продкаў маіх, да якіх належыць вёска Смятанічы з павіннасцямі (якія ўся воласць выконвае), і ў Білцы шэсць агароднікаў на выхаванне капланаў далучаны з тымі ж пляцамі зямлі, на якіх іх жыллё ў Петрыкаве стаіць. Правы і фундушавыя дакументы на гэта ўсё пад час вайны і беспарадкаў у дзяржаве загінулі. Нягледзячы на гэта, сцвярджаю, ... як сказана вышэй, капланаў цяперашніх а. Міхала Загароўскага і а. Яна Загароўскага пакідаю, і яны цяпер павінны будуць за душы як памерлых, так і жывых фундатароў кожны тыдзень чыніць па дзве службы кожны ў сваёй царкве. Да таго ж штогод, згодна даўніх звычаяў, з тых, вышэйзгаданых вёсак, мусяць чыншу 60 злотых польскіх у замак мой Петрыкаўскі аддаваць. Тыя ж вёскі разам з усёй воласцю павінны будуць адбываць згоны («хадзіць у аблавы»), цягнуць невад з азёраў Бобрычы, Чарноцкага і Запясечы.

Святыя айцы, згодна фундушу продкаў, павінны быць дакладнымі ва ўсялякіх царкоўных павіннасцях. Ніякіх лішкаў у аплаце ў мяшчан маіх і падданых у парафіях за выкананне абрадаў хрысціянскіх (хрэсбіны, пахаванне, малітвы) браць не павінны.

Кожная царква павінна абыходзіцца тым, што будуць даваць прыхажане. У сувязі з загінуўшымі старадаўнімі фундушамі не меў мажлівасці ведаць аб пэўных межах парафіі, і якія вёскі да якой парафіі належалі. Для забеспячэння парадку гэтым маім лістом загадваю: да царквы Уваскрасенскай мусяць належаць вёскі: Міхедавічы, Курытычы, Белановічы, Навасёлкі, Білка. Да царквы Мікалаеўскай — Грабаў, Сялюцічы, Гогалічы з млынам, Канонкавічы з млынам на Бобрычы. А ў пушчы маёй петрыкаўскай у грунце Бабыніч пад тытулам св. Панны Марыі ёсць цэркаўка. Жадаў бы, каб тая царква не заставалася без хвалы Божай, а была далучана да яе вёска мая Бабынічы на ўтрыманне святарам, якія там будуць заставацца... Аднак цяпер, у сувязі са смерцю святара, які служыў там, царква мае вакансію. Тая ж самая в. Бабінічы ўваходзіць павінна ў парафію Св. Мікалаеўскай царквы. А потым, калі трапіцца прыстойны каплан да гэтай самай царквы, звышпамянёная вёска належаць будзе. Само месца Петрыкаў і тое заставалася ў бяспарадку і мяшчане не ведалі, да якой царквы і парафіі якая вуліца мусіла хадзіць. І таму, гэтым маім фундатарскім лістом, на вечныя часы падзяліў і загадаў.

1. Ідучы з Кавышына гасцінцам Слуцкім, вуліцай (Кіеўскай) да пераправы Петрыкаўскай па правай руцэ, усё тое правае крыло прызначаю да парафіі царквы Уваскрасення Божага, да царквы ж св. Міколы, ідучы з Кавышына той жа самай вуліцай да пераправы Петрыкаўскай па левай руцэ, усё крыло назначаю і ўказваю. Абедзве парафіі межаў сваіх будуць пільнаваць, і кожная да назначанай паводле гэтага майго ліста парафіі і царквы; на розныя абрады царкоўныя, хрысціянскія і набажэнствы «под віно» платы — 10 коп на замак ад кожнага мешчаніна. Калі той, хто не будзе пільнавацца парафіі і царквы і да яе не будзе хадзіць, аб чым паведамяць св. айцы, той будзе павінен плаціць тую самую плату неадкладна.

А на гэтым гэты ліст дадзены на вечныя часы з подпісам рукі маёй і пячаткі айцам М. Загароўскаму. Гэты ліст будзе мець моц і права наступнікамі гэтых святароў і пасля іх смерці, аб чым я, як калятар (патрон) сцвярджаю і пастанаўляю.

Пісан у Петрыкаве, 1682 г. 24 студзеня.

У гэтым лісце подпіс: Ежы Кароль Хадкевіч абозны ВКЛ — староста блудзенскі, палкоўнік войск я. к. м. Пры тым і пячатка я. м. п. Хадкевіча, абознага ВКЛ.

НГА Беларусі, ф. 1728, воп. 1, с. 9, лл. 196—197.

Падрыхтавалі *В. Бабкова і А. Аляксандрава*

ІНВЕНТАР МЕСТА І ВОЛАСЦІ ПЕТРЫКОЎСКАГА, 1700 г.

На ўрадзе гродскім у замку я. к. м. Мазырскім староства вяльможнага п. Міхала [Паца] на Хальчу Халецкага абознага ВКЛ, старасты мазырскага

Перад актамі гродскімі мазырскімі пастанавіўшыся я. м. п. Аляксандр Прасаловіч, адміністратар м. Петрыкова і воласці, што належыць да замку Петрыкоўскага, я. в. я. м. п. старасты княства Жмудскага, гэты інвентар, што пану яго належыць да актаў гродскіх Мазырскіх падаў, тыя словы пісаны.





Інвентар м. Петрыкова і ўсёй воласці, што да замку Петрыкоўскага з вёскамі належыць, складзены праз нас: Феафіла Іпагорскага Зянкевіча, пісара гродскага мазырскага, Тадэвуша Апокі, намесніка гродскага мазырскага і Стэфана Піяровіча, каморніка Мазырскага, таксама шляхетнага Марціна Навіцкага, генерала я. к. м. павету Мазырскага, што пры нас знаходзіўся. Інвентар м. Петрыкова і ўсёй воласці, складзены ў цяперашнім 1700 г., намі, жыхарамі пав. Мазырскага, і пададзены да рук я. м. п. адміністратара м. Петрыкоўскага ... старасты княства Жмудскага. Слова ў слова пададзены.

Места Петрыкоў

Дзесятак Хмелеўскага

	Двор		За агароды	
	злоты	грошы	злоты	грошы
1. Мішкава Шыкха, удава	2	—	2	15
2. Лукашыха	2	—	2	15
3. Цімох, дзяк Увас-красенскай царк-вы	—	—	1	7½
4. Пётр Максімавіч	1	15	1	7½
5. Марцін арганіст Іван Рудка, пляц з агародам пусты	—	—	2	—
6. Кандрат Шпак	1	—	1	7½
7. Грышка Бушма-наў	—	15	2	15
8. Раман Крамянец Марушычыхі пляц з агародамі пусты	1	—	—	7½
9. Трахіміха, удава	—	15	—	—
10. Алеска Скапян	1	—	1	7½
11. Антон Лола	—	15	1	7½
12. Пархом Блатун	—	20	½	7½
13. Мішка Літам	1	—	1	4½
14. Павел Сідорка	3	—	2	15
15. Веремей Блатун	—	15	—	7½
16. Пётр Жарабец Прохара Блатуна пляц пусты, Багдана Шваля пляц з хатай	—	20	1	7½
17. Сава Хацянаў сын	1	—	1	7½
18. Боччыха, удава	—	15	1	7½
19. Алеска Маргун	—	15	—	—
20. Ігнат Жарабец	—	15	1	7½
21. Зверучыха, удава	1	—	1	7½
22. Яўсей Хіліман	—	22½	1	7½
23. Кірэй Зянкевіч	1	—	1	7½
24. Іван Молат	—	15	—	—
25. Мішка Глушко	1	7½	1	7½
26. Барыс Літам	1	22½	1	7½
27. Лаўрынчык Глушка пляц з хатай і агарод	1	—	1	7½
28. Мішка Шэўка,			1	7½

Працяг

	Двор		За агароды	
	злоты	грошы	злоты	грошы
папа Уваскрасенскага, з агарода плаціць				
Максіма пляц пусты				
29. Юрка Берковіч		25	1	7½
Мішка (Маўмота) пляц з хатай пусты				
30. Зміцер Хмелеўскі	—	15	—	—
31. Грышка Бірковіч	—	25	1	7½
32. Кірэй Гаркушын зяць	1	—	1	7½
33. Гараска Кушмер	—	15	1	7½
Жалезка пляц з агародам пусты				
34. Карней Хараставец	—	15	—	—
35. Паганечна, удава	1	—	1	7½
36. Хвеська Шумейка	3	—	1	7½
Шушпана пляц пусты				
37. Мацвей Пінчук	—	22½	1	7½
38. Маісей Пінчук	1	—	—	—
39. Андрэй Пінчук	—	15	1	7½
40. Мацвей Белахвост	—	15	1	7½
41. Філіпава ўдава	—	15	1	7½
42. Дрыпіха, удава	—	18	1	7½
43. Сенчыха, удава	—	15	1	7½
Бірчыхі пляц пусты				
44. Гапон Жук	—	7½	1	7½
45. Багдан Батура	1	—	1	7½
46. Міна Акалісты	—	15	—	—
47. Васко Хілімон, войт	—	15	—	—
48. Грышка Хілімон	—	15	—	—
49. Перепечоўка, удава	—	15	—	—
50. Вышынскі	—	10	—	—
51. Ярах Тэрус	—	15	—	—
52. Мацвей Гарошка	3	—	2	15
53. Мішка (Бочак)	—	15	—	—
54. Хвёдар Шкурань	—	15	—	—
55. Кірэй Маскаль	2	—	—	—
Луцка Цецерука пляц і агарод пусты				
56. Іван Цесля	—	10	1	7½
57. Стэфан Белахвост				
Івана Гарошка пляц з агародам пусты				
58. Іван Гардэль	—	7½	1	7½
Красіўка пляц і агарод пусты				
Івана Аркушы пляц і агарод пусты				
59. Амелька Краснік	—	15	1	7½
60. Петрыха, удава	—	15	1	7½
Зміцера Каленіка пляц і агарод пусты				
Пятра Белана пляц з хатай і агародам				
61. Хвеска Каленік	—	—	—	—
62. Даніла Каленік	—	—	—	—
63. Раман Каленік...	—	—	—	—

У гэтым дзесятку гаспадароў уласнікаў — 63, пустак — 34.

Дзесятак Сычоў

...У гэтым дзесятку гаспадароў уласнікаў — 57, пустак — 16.

Дзесятак Цімоха

...У гэтым дзесятку гаспадароў уласнікаў — 46, пустак — 13.

Вёска Петрыковічы

	Чынш (злоты)	Грошы	Дань (без меры)
1. Кандрат Хахель			
2. Грышка Хахель			
3. Грышка Леановіч			
4. Багдан Хахель			
5. Луцко Турчэня: усе 3 службы Клімаўскай; плацяць	20	—	12
6. Іван Паповіч			
7. Амелько Шчур: усе 3 службы Шчураўскай; плацяць	20	—	12
8. Влас Хахаліцкі з службы Велічкоўскай	10	—	6
9. Васька Мароз з паловы службы Мардзвінскай; плаціць, палова службы ідзе на двор	3	10	6
10. Еска Зарэцкі з службы Маляроўскай	—	—	—
11. Павел Зарэцкі, на паслугах дворных, чыншу не дае, толькі дань	—	—	6
12. Кірэй Грыбовіч з службы Шутаўскай; плаціць	10	—	6
13. Кірэй Пінчук	—	—	—
14. Клім Харса з службы Канчоўскай; плаціць	20	—	12
15. Васька Баўсун			

Працяг

	Чынш (злоты)	Грошы	Дань (без меры)
16. Мацвей Сметаніцкі з службы Мехедаўскай; плаціць	15	—	12
17. Ярмола Храпа з паловы службы Дылаўскай плаціць; другая палова службы ў пустцы	10	—	6
Службы Пяскоўскія			
18. Юрка Тэрус з службы Пікудзінскай; плаціць	5	—	—
Кірэй Пінчук з службы Красінкоўскай	5	—	—
19. Дзешка (Хайко) з службы Качуроўскай	5	—	—
20. Грышка Северка з службы Хамлоўскай	5	—	—
Кандрат Гаўрук з сябрамі з службы Мусінскай	5	—	—
21. Стэфаніха, удава, з службы Пікудзінскай	5	—	—
Васко Мароз з службы Піскуноўскай	5	—	—

Гэтая вёска заўсёды на паслугах дворных.

Вёска Ляскавічы

...З гэтай вёскі цяглых службаў — 27; пустых службаў — 6; з цяглай службы робяць паншчыну трэці тыдзень; варта нядзельная, па чарзе; сена рабіць без паншчыны — падвод 2; ялавіца — 1; баран або грашыма злотых 2/15; грыбоў па вянку, альбо грошай — 12.

Вёска Брынёў

З гэтай вёскі службаў цяглых 11, пустых — 21/2.

З усёй службы паншчыну дваровыя робяць 3-і тыдзень; варта нядзельная, па чарзе, гвалт да арання — падвода 1 з дыму; грыбоў — вянок, арэхаў — бязмен, з вёскі — ялавіцу, барана — мусяць даваць штогод.

...Вёска Сялюцічы

...У вёсцы службаў цяглых — 14; пустых — 2; з цяглых павінны рабіць трэці тыдзень; варта па чарзе, па тыдню; сенажаці павінны — на двор; гвалт да арання, падвода — 1, грыбоў, арэхаў — па бязмену з дыму або грашыма; ялавіца і баран.

Вёска Гогалічы

З гэтай вёскі службаў цяглых — 19, пустых — 3; з цяглых павіннасць работы — трэці тыдзень; варта па чарзе па тыдню; гвалт да арання; сена рабіць без паншчыны — падвода — 1; ялавіца, баран альбо грошы; аўса і жыта дзякельнага не даюць; грыбоў па вянку — з дыму.

Вёска Бабынічы

З гэтай вёскі службаў цяглых — 8, пустых — $1^1/_4$, з цяглых павіннасць двару — трэці тыдзень; варта па чарзе па тыдню; гвалт да арання; сена робяць без паншчыны; грыбоў — па вянку; арэхаў па бязмену з дыму; ялавіца, баран.

Вёска Мехедавічы

...У гэтай вёсцы службаў цяглых $5^1/_2$, пустых $2^1/_2$, з цяглых павіннасць паншчыны трэці тыдзень; варта па чарзе па тыдню; гвалт да арання; сена рабіць — падвода 1; грыбы, арэхі — з дыму.

Вёска Канонкавічы

...У гэтай вёсцы службаў цяглых — 9.

Павіннасць іх — паншчыну рабіць трэці тыдзень; варта па чарзе па тыдню... штодня мусяць ісці пасвіць, грыбоў вянок; арэхаў бязмен — з дыму.

З гэтай вёскі, з в. Аціpак, Бяланавіч, Белкі, з усяго Урэчча — падвода 1, ялавіца 1, баран кожны год.

Вёска Аціркі

...

Вёска Бяланавічы

...З гэтай вёскі цяглых службаў — 10, пустых — 5, з цяглых тыя ж павіннасці, як і ў Канонкавічах.

Вёска Белка

...З гэтай вёскі службаў цяглых — 4, пустых — 2, павіннасці, як і ў Канонкавічах, грыбоў 1, арэхаў не даюць.

Святар Васкрасенскай царквы з Смятаніч і Белкі з сваёй часткі павінен да двара даваць	30	—	6	—
Свяшчэннік Мікольскай царквы таксама з сваёй часткі мусіць даваць	30	—	6	—
З гэтай вёскі чысты даход	80		36	—

Гадавы даход м. Петрыкова і воласці

Чыншу з места	— зл. 438/14
Чыншу з воласці	— зл. 903
Арэнды карчэмнай	— зл. 505,0
(за розныя) арэнды	— зл. 300
За езы, азёры	— зл. 240
Сума складае	— зл. 6931/14
Мёду зданага (каменяў)	— 231
Жыта дзяклавага, вёдзер	— 6
Аўса дзяклавага, вёдзер	— 30
Яловіц, з усёй воласці	— 6
Бараноў, з усёй воласці	— 8
Грыбоў (вянкоў)	— 170
Арэхаў (бязменаў)	— 170
Кацёл піўны жалезны ў кухні	

Абора фальваркаў Петрыкоўскіх

Кароў дойных з цялятамі	— 12
Ялавіц	— 7
Бычкоў двухгадовых	— 8
Ялавіц трэцяга года	— 5
Бугай	— 1
Авечак	— 28
Вепраў	— 6
Свіней	— 5

НГА Беларусі, ф. 1728, воп. 1, с. 4, лл. 148—157.

ЖАЛОБА ДУХОВЕНСТВА ПЕТРИКОВСКОЙ ПРОТОПОПИИ НА ИМЯ АРХИМАНДРИТА СЛУЦКОГО

Духовенство заявляет, что в то время, когда архимандрит в 1746 г. выехал из Слуцка в Варшаву, в Петриково прибыл комиссар пани Ходкевич, воеводины Брестской их колляторши — некто Гребицкий по хозяйственным делам и, не имея никаких полномочий вторгаться в духовное управление протопопии, он тем не менее:

1. Вызвал в октябре всех священников в замок Петриковский. Здесь он ругал как их, так и духовное начальство их. Затем учинил сам суд священником из Ласкович, обвиняя его в совращении 18 униатов в православие, и хотя никаких доказательств не имелось, постановил: вернуть 18 человек в унию и в наказание приписать в унию еще 20 человек православных. Сашковского же на год отрешил от должности и арестовал его... В ноябре приказал под стражей вести его через рынок к костелу и заставил там бить поклоны. Когда же духовенство, войт и лучшие мужи петриковские, видя побои и мучения 60-летнего отца Ласковского, пошли в плебанию, прося комиссара освободить старика, то их выгнали, а на другой день привели в костел и заставили бить поклоны, лежать на полу крестом... Лишь после этого освободил ласковского священника.

2. Тот же комиссар, вызвав униатского священника из Колно, передал ему в заведывание $^1/_2$ прихода Ласковского... И теперь униат принуждает людей силой принять унию.

3. 1 ноября комиссар приехал в церковь с монастырем Пустынька Бобыницкая и передал ее униатам.

4. Еще им же переданы униатам 2 церкви в Кононковичах и Курытичах.

5. В Петрикове запечатал Св.-Никольскую церковь, и лишь когда жители обратились с жалобой к пани Ходкевич, велел ее отпечатать, но деревенских прихожан распределил между костелом в Петрикове и униатским священником в Грабовичах. Крестьян били, гоняли, заставили принять унию...

К этому документу приложена копия реестра от 24.1.1747 г. лиц, принявших и не принявших унию в Петриковской волости:

1) 19.XI.1746 г. село Курытичи приняло унию перед викарием Петриковской плебании...

3) 4.XII по отобрании и освящении монастыря присоединены деревни Бобиничи и Головличи.

4) 2. XII присоединены в костеле Петриковском часть жителей деревни Кононковичи. 7. XII присоединена вторая часть этой деревни и деревни: Белоновичи, Оцерки и Сметаничи. В Петрикове в приходе дизунитском имеется униатов: Алексей с целым домом и 10 женщин (издавна католичек), в никольском приходе 2 мужчин с женами и 2 женщины.

... 17.XII жители деревни Селютичи в церкви исповедовали веру, но присяги не учинили, почему оставлены в неопределенном положении до распоряженія вашей милости. Пока что венчают и крестят их православные священники, к которым ездят за требами, что же касается въезда православного духовенства в деревню, то это ему воспрещено...

Копия освидетельствована Григорием Зморовичем, протопопом Петриковским.

Минская старина, выпуск IV. 1913.

ДЭКРЭТ СУДА АД 30 ЛІПЕНЯ 1756 г. ПА СПРАВЕ ПАМІЖ ЧАПСКІМ І ПЕТРЫКАЎСКІМ ПРОБАШЧАМ ЕЛЕНСКІМ АБ ПРАВЕ ВАЛОДАННЯ ЎЧАСТКАМІ ЗЯМЛІ Ў м. ПЕТРЫКАВА, УДАКЛАДНЕННІ МЕЖАЎ вв. СЯЛЮЦІЧЫ, МІХЕДАВІЧЫ ПЕТРЫКАЎСКАГА ГРАФСТВА І в. ГРАБАВА ПЕТРЫКАЎСКАЙ ПЛЯБАНІІ, НАНЯСЕННІ ЎЗАЕМНЫХ ШКОДАЎ

Года 1769, месяца снежня, 30 дня

На ўрадзе я. к. м. гродскім у замку Мазырскім перада мной, Янам Валер'янам Вольскім, падстаростам гродскім і стражнікам пав. Мазырскага ад я. в. п. Гервасія Людвіка Аскеркі, рэферэндара ВКЛ старасты гродскага, апавядаў і дэкрэт да актавых кніг падаў пробашч петрыкаўскі Томаш Еленскі... па справе паміж п. Якубам Чапскім, падскарбіем зямель прускіх, п. Разаліяй Хадкевічавай ваяводзінай брэсцкай (Чапскай), п. Янам Мікалаем на Турцу, Петрыкаве і Колню гр. Хадкевічам, ваяводай брэсцкім і Томашам Еленскім пробашчам петрыкаўскім... Я, Гедэон Еленскі, пісар дэкрэтавы ВКЛ, падстараста судовы пав. Мазырскага, будучы запрошаным з абодвух бакоў, я, Андрэй Завіша, падскарбій зямель прускіх... прыйшлі да такога рашэння. Па-першае: справа аб праве валодання петрыкаўскім пробашчам пляцамі зямлі ў м. Петрыкаве (разам з будынкамі і людзьмі) будзе адкладзена ў сувязі з адсутнасцю ў петрыкаўскай плябаніі аўтэнтычных дакументаў на гэтае права. Па-другое: аб межах грунтаў, лясоў, сенажацей паміж вв. Селюцічы (Сялютычы), Міхедавічы Петрыкаўскага графства і в. Грабава (Грабаў) Петрыкаўскай плябаніі, ні з боку Петрыкаўскай плябаніі, ні з боку Петрыкаўскага графства не прадстаўлена ніводнага аўтэнтычнага і разгранічальнага дакумента, каб гэта пытанне дасягнула фіналу і было рассуджана. Таму да прадстаўлення дакументаў гэта справа адкладваецца. А цяперашнім нашым дэкрэтам петрыкаўскім вёскам Сялютычы, Міхедавічы, а таксама плябанскай в. Грабава ўсялякае забеспячэнне грунтаў, лясоў, сенажацей ад гвалту і грабяжу грунтаў, збожжа, паленя сена. Усе тры вёскі, г. зн. Сялютычы, Міхедавічы і плябанская в. Грабава, як кожная з іх да гэтага часу, да даты цяперашняга дэкрэту, карысталася грунтамі, сенажацямі, лугамі і ўсім, што было ва ўтрыманні, так гэта ўсё, без усялякай узаемнай перашкоды, гэтыя тры вёскі да будучага разгляду справы і працягвалі ўжываць. Наказваем, каб жыта і яравыя з палёў у сваіх цяперашніх межах збіралі, сенажаці таксама ў сваіх цяперашніх межах касілі і сена збіралі. А калі насуперак дэкрэту некаторыя з вёсак будуць захопліваць чужыя грунты, лясы, сенажаці, збожжа, сена забіраць, а тым больш паліць стагі, тады па паказанню і прысягах сведак, вартых веры, той вёскі, дзе быў учынены гвалт, нават за самае дробнае парушэнне будуць пакараны біццём пастронкамі (важжамі) і плацяжом 10 коп пацярпелым.

Пастанаўляем:

1. За забраныя ў 1747 г. жыхарамі в. Сялютычы ў в. Грабава 13 вулляў з пчоламі, каб гэта в. Сялютычы падданым грабаўскім 13 вулляў сваіх уласных з пчоламі ў гэтым 1756 г. пасля 2 тыдняў ад даты дэкрэта, г. зн. 14 жніўня, аддала.

2. За зацягванне пустых вулляў на сосны ў чужых межах віноўныя плацяць 10 коп.

3. За забраныя ў 1750 г. жыхарамі в. Сялютычы ў падданых в. Грабава 4 коп грэчкі — узаемная прэтэнзія в. Сялютычы да Грабава аб забранні грэчкі... кампенсуем. У тым жа 1750 г. в. Сялютычы забрала 2 капы жыта ў в. Грабава, тады каб тыя 2 капы жыта в. Сялютычы ў 1756 г. у дзень Св. Міхала, 20 верасня, аддала і на сваіх падводах у в. Грабава адвезла.

Што тычыцца прэтэнзій паміж вв. Грабава і Міхедавічы, то ў 1754 г. жыхары в. Міхедавічы папалілі стагі сена ў в. Грабава. Выслухаўшы паказанні падданых в. Грабава Каленіка, Осіпа, Івана, даведаліся, што падданыя в. Міхедавічы ў 1754 г. спалілі 25 стагоў сена ў Грабаве. У тых стагах было сена 70 вазоў. Кожны воз каштаваў злоты, а падданыя грабаўскія мусілі купляць сабе сена за вышэйшы кошт. Прысяга была выканана ў Петрыкаўскім касцёле. Пасля ўчыненай прысягі наказваем, каб в. Міхедавічы за спаленыя 70 вазоў сена — 70 злотых падданым грабаўскім заплаціла ў 1756 г. у дзень Св. Міхала, у в. Грабава тым самым тром людзям грабаўскім, што давалі сведчанне, в. Міхедавічы заплаціла і да рук аддала, а гэтыя тры чалавекі, атрымаўшы грошы, тым грабаўскім падданым, у якіх папалены стагі, узнагароду ўчынілі, і асобна за спалены стог сена ў ліпені 1756 г. мусяць міхедаўцы на месцы спаленага стагу паставіць новы стог на 12 вазоў у 1756 г. на дзень 20 жніўня.

А за гэты злы ўчынак палення стагоў, пасля правядзення губернатарам следства, 4 найбольш павінных у назіданне будуць пакараны пастронкамі (важжамі). Кожнаму па 50 пастронкаў (удараў)...

Пісан у в. Сялютычах.

НГА Беларусі, ф. 1728, воп. 1, с. 16, лл. 554—557, 651—654.

Падрыхтавалі *В. Бабкова і А. Аляксандрава*

У складзе Расійскай імперыі

Пасля другога падзелу Рэчы Паспалітай у 1793 г. цэнтральная Беларусь адышла да Расіі, была створана Мінская губерня, у склад якой уваходзіў Мазырскі ўезд, а на тэрыторыі Петрыкаўскага графства з навакольнымі вёскамі створана шэсць валасцей: Ляскавіцкая, Петрыкаўская, Камаровіцкая, Капаткевіцкая, Грабаўская і Лучыцкая. Такое адміністрацыйнае дзяленне захавалася да 1917 г. Улада на месцы перадавалася царскім чыноўнікам і дваранству. Феадальна-прыгонны лад і маёмасныя правы, якія склаліся пры польскім праўленні, засталіся некранутымі. Беларускія магнаты і шляхта захавалі ўсе свае правы і прывілеі. Царскі ўрад Кацярыны II замацаваў прыгоннае права, дапамагаў памешчыкам яшчэ больш закабаляць сялян. Зямлёй па-ранейшаму валодалі памешчыкі, значная частка яе належала дзяржаве і царкве і толькі невялікая колькасць угоддзяў знаходзілася ў сялян. Найбольш буйнымі землеўладальнікамі былі Хадкевічы. Яны заставаліся вернымі католікамі, прынялі польскую мову і карысталіся прыхільнасцю польскага караля. У адданасці каралю быў выхаваны і Аляксандр — сын і нашчадак Яна Мікалая. Калі ў 1812 г. французская армія ўвайшла ў межы Расійскай дзяржавы, акупіравала амаль усю Беларусь, за выключэннем яе паўднёвай часткі, і пачала насаджваць марыянетачныя мясцовыя структуры ўлады, палкоўнік Войска Польскага Аляксандр Хадкевіч увайшоў у Камісію часовага ўпраўлення Вялікага княства Літоўскага, створаную ў Вільні французскім камандаваннем і падпарадкаваную яму. Гэта быў дыпламатычны ход Напалеона. Каб прыцягнуць на свой бок польскіх і мясцовых магнатаў, а таксама шляхту, ён паабяцаў узамен на падтрымку яго захопніцкіх планаў аднавіць Рэч Паспалітую ў межах да першага яе падзелу 1772 г. Але хутка на галоўныя пасады адміністрацыі акупіраванай тэрыторыі былі пастаўлены французскія военачальнікі і інтэнданты. Магнаты і шляхта, якія прысягалі на вернасць Расійскай імперыі, сталі праваднікамі антынароднай палітыкі — экзекуцый, рабаванняў, рэквізіцый фуражу і хлеба для акупантаў у мясцовых сялян, усялякіх здзекаў над імі. Ствараліся шляхецкія ваенныя фарміраванні для падтрымкі напалеонаўскіх войск. Беларускія сяляне аказвалі супраціўленне французскім рэквізітарам і іх памагатым. Нападалі на асобных салдат, невялікія іх групы, фуражыраў і памешчыкаў, якія памагалі акупантам. Разгарнулася партызанская вайна.

Пасля разгрому і выгнання французскіх акупантаў царскі ўрад учыніў канфіскацыю памешчыцкіх маёнткаў тых, хто падтрымліваў Напалеона. Але праз некаторы час маніфестам імператара Аляксандра I было аб'яўлена ўсеагульнае дараванне, і Хадкевічы захавалі свае валоданні.

У 1816 г. памерла ўладальніца Петрыкава Людовіка Хадкевіч. Паўстала пытанне аб раздзеле спадчыны паміж яе дзецьмі. Сын Вацлаў памёр непаўналетнім. Дочкі — Елізавета, княгіня Радзівіл, і Разалія, княгіня Любамірская, атрымалі прыданае ў наяўным капітале і ад спадчыны адказаліся. Сын Восіп па разумовай адсталасці знаходзіўся пад прыглядам маці, а затым па спецыяльным асведчанні прызнаны недзеяздольным і па прыгавору Грамадзянскага Трыбунала Мазавецкага ваяводства адданы ў апякунства свякам. Фактычнае кіраванне Петрыкаўскім ключом перайшло да Аляксандра Хадкевіча, які па-ранейшаму знаходзіўся на службе ў Польскім каралеўстве і даслужыўся да брыгаднага генерала і сенатара.

Хадкевічы пастаянна пражывалі не ў Петрыкаве, а ў мястэчку Млынаў Дубенскага павета Валынскай губерні. Упраўленне шматлікімі маёнткамі магнатаў ажыццяўлялася праз даверaных асоб, якія прадстаўлялі інтарэсы

гаспадара ва ўсіх дзяржаўных, гаспадарчых і судовых органах. Непасрэдна гаспадарчымі справамі займалася петрыкаўская эканомія на чале з управляючым. Эканомія размяшчалася ў фальварку — жылой пабудове з гаспадарчымі службамі, якая знаходзілася на месцы былой крэпасці. Там былі лядзінік, лазня, важніца, васкабойня, разбіты агарод. Гаспадарчыя справы Хадкевічаў ішлі не вельмі паспяхова. Адміністрацыйная, літаратурная і навуковая дзейнасць гаспадара патрабавала немалых грошай. Даходы ад маёнтка не пакрывалі выдаткаў. Хадкевіч павінен быў браць пазыку, здаваць у арэнду і закладваць мёнткі. У закладным валоданні на 37 гадоў за 90 000 рублёў знаходзіўся фальварак Людзвіноў і іншыя. Даўгі пагражалі поўным разарэннем, і Хадкевіч вырашыў пагасіць частку іх за кошт сваіх уладанняў. 1 лютага 1825 г. у Чарнобылі адбыўся эксдывізарскі суд, які перадаў крэдыторам за даўгі землі разам з прыгоннымі сялянамі вёсак Бабунічы, Міхедавічы, Залессе, Галоўчыцы, Аголічы, Аголіцкая Рудня, Конкавічы, Міцуры, Аціркі. Але гэта не змагло пакрыць непамерныя расходы, і Хадкевічы вымушаны былі ў 1838 г. прадаць за 270 000 рублёў асігнацыямі быўшаму харунжаму Мазырскага павета дваранін Гераніму Кеневічу маёнтак Брынёў з вёскамі Брынёў, Ляскавічы, Баклань і іншымі, а таксама вёску Сялюцічы. Займаліся яны і фальсіфікацыяй, запісваючы ў прыгонныя вольных людзей, якія з'яўляліся арандатарамі іх зямлі. Гэтым прыёмам карысталіся амаль усе тутэйшыя памешчыкі.

У палове XIX ст. да адмены прыгоннага права ў судах і нават ва Урадавым Сенаце разглядаліся справы аб незаконных запісах памешчыкамі Хадкевічамі вольных людзей у прыгонныя: Пінчукоў і Адасёў з Аголіцкай і Вятчынскай Рудні, Васіля і Антона Грыневічаў з Аголіцкай Рудні, Мацвея Тураўца, Каюкалаў, Шабалтасаў, Яцкоўскіх, Сухамераў, Барысевічаў з в. Сялкі, Андрэя Юцэвіча з м. Петрыкава, жыхароў в. Краснаселко, 29 жыхароў маёнтка Слінкі[1].

Разглядаліся таксама справы аб незаконных запісах памешчыкам Кеневічам сялян Шлагаў і Шастакоў, памешчыкам Камарніцкім Івана не помняшчага свайго паходжання, в. Міхедавічы, памешчыкам Абуховічам Яворскіх, в. Грабаў, памешчыкам Яленскім Мазуркевічаў, в. Белка Капаткевіцкага маёнтка і інш. Частка маёнтка, якая знаходзілася ў апякунскім валоданні Аляксандра Хадкевіча, з 1828 г. перайшла ў яго поўную ўласнасць, а з 1838 г. увесь Петрыкаўскі ключ — да яго сыноў Карла, Мечыслава і Баляслава.

Прыгоннае права на Беларусі захоўвалася царскім урадам, а прыгнёт сялян узмацняўся. Свабодных сялянскіх гаспадарак-аднадворцаў былі адзінкі. Яны арандавалі зямлю ў памешчыкаў. Прыгонныя сяляне падраздзяляліся на памешчыцкіх — у маёнтках вотчынных, ленных — у маёнтках памешчыкаў, якія валодалі імі па ленным праве, і езуіцкіх — у маёнтках ордэна езуітаў. Былі казённыя сяляне, якія жылі ў казённых маёнтках (староствах) і абавязаны былі несці службу.

Езуіцкі маёнтак Снядзін, у склад якога ўваходзілі фальваркі Лобча, Мардзвін, Дарашэвічы, Галубіца, Макарычы, Паўлінава, Капцэвічы, Вышалаў, 1-я і 2-я Турка, а таксама фальварак Асавец па распараджэнню раздаўчай камісіі Рэчы Паспалітай яшчэ ў 1774 г. аддадзены віленскаму літоўскаму мечніку Міхаілу Радзівілу, а ў 1806 г. па купчай крэпасці яго набыў Антон Кеневіч. Па праву спадчыны ён знаходзіўся ў вотчынным валоданні Іпаліта і Гераніма Кеневічаў.

У вотчынным валоданні знаходзілі-ся, акрамя маёнткаў Хадкевічаў, маёнткі і вёскі Бобрык, Баклань, Бабунічы, Брынёў, Грабаў, Галоўчыцы, Дуброва, Замосце, Залессе, Конкавічы, Камаро-

[1] НГА Беларусі, ф. 163, воп. 1, с. 1986.

вічы, Ляскавічы, Міхедавічы, Мышанская Рудня, Аголічы, Аголіцкая Рудня, Аціркі, Слабодка, Сялюцічы, Слінкаўская Рудня, Церабаў, Чалюшчавічы. Леннымі з'яўляліся Ванюжычы, Яўсеевічы, Івашкавічы, Кашэвічы (Касейск). Каменкі, Капаткевічы, Лучыцы, Навасёлкі, Аносавічы, Філіпавічы, Хвойня, Хвоенская Рудня. Казённымі, арандуемымі памешчыкамі, былі Багрымавічы, Колкі, Млынок (Слабада), Рог, Фаставічы, Хуснае і частка маёнтка Бабунічы. У вотчынным валоданні нашчадкаў фельдмаршала Міхаіла Іларыёнавіча Галянішчава-Кутузава знаходзіўся фальварак Сякерычы. У 1793 г. маёнтак Якімавічы, у якім знаходзіліся Сякерычы, быў падараваны графу Алансусу. Па наследству фальварак перайшоў да ўнука фельдмаршала, сына старэйшай дачкі Праскоўі, крэсніка імператара Паўла I Паўла Мацвеевіча Талстога. Ён звярнуўся з прашэннем да Аляксандра II захаваць прозвішча дзеда і імператар указам ад 7 мая 1859 г. усяміласцівейша дазволіў да прозвішча Талстога дабавіць Галянішчаў-Кутузаў. Талстыя пастаянна жылі пад Масквой, у маёнтку Пакроўскае Падольскага павета. Фальварак Сякерычы заставаўся ў валоданні Галянішчавых-Кутузавых-Талстых да 1917 г.

У гэты час намеціўся пераход у памешчыцкіх маёнтках ад натуральнага да таварнага (капіталістычнага) спосабу вытворчасці. Наладжвалася перапрацоўка сельскагаспадарчай прадукцыі і сыравіны. Памешчыцкая гаспадарка паранейшаму трымалася за кошт сялянскай працы ў выглядзе баршчыны, якая складала ад 2 да 4 дзён у тыдзень з кожнай рабочай душы (мужчыны з 17 гадоў, жанчыны з 15 гадоў). У Брынёве, Галоўчыцах, Міхедавічах былі смалакурні, у Петрыкаве — цагельны завод, у Брынёве і Конкавічах — вадзяныя млыны, Старыне і Чалюшчавічах — ветраныя млыны, у Міхедавічах і Чалюшчавічах — вінакурні. Усё часцей сустракаліся ў маёнтках малацілкі, сечкарэзкі і іншыя машыны з выкарыстаннем пары.

Да адмены прыгоннага права сяляне дзяліліся на прыгонных, дваровых і вольных людзей. Прыгонныя і большасць вольных людзей сяліліся на памешчыцкай зямлі, за якую адраблялі баршчыну або плацілі натуральны ці грашовы аброк, а часцей тое і другое, памер якога ўстанаўліваў памешчык. Памешчык не меў права распараджацца асобай вольнага селяніна, але прыгонныя і дваровыя людзі былі зусім бяспраўнымі, знаходзіліся ў яго поўнай асабістай і маёмаснай залежнасці. Ён мог распараджацца імі, як сваёй асабістай маёмасцю: прадаць, абмяняць, перасяліць, пакараць. Жаніцца можна было толькі з дазволу памешчыка, а выходзіць замуж у другі маёнтак — за выкуп.

Сялянская гаспадарка была натуральнай, але многія сяляне займаліся промысламі — нарыхтоўкай дроў, клёпкі, зборам грыбоў, мёду — для сваіх патрэб і на продаж. Дваровыя людзі зямельных надзелаў не мелі, яны абслугоўвалі памешчыка і былі на яго поўным забеспячэнні. Ён мог вызначыць ім, як і другім прыгонным, за правіннасць па сваім выбары — да 40 удараў розгамі, да 15 удараў палкамі, да тыдня арышту, а ў асобных выпадках — да 2 месяцаў, хадайнічаць аб высылцы ці накіраванні ў выпраўленчыя арыштанцкія роты. Непісьменнаць сялян была пагалоўнай, чалавек, які мог чытаць і пісаць, сустракаўся рэдка і карыстаўся вялікай павагай.

Хут. Теребень	51	8	»
Д. Теребов	690	116	(Копаткевичская)
Застенок Торгашин	45	7	(Лясковичская)
Д. Турок	486	78	»
Д. Убибатьки	768	136	(Комаровичская)
Д. Фастовичи	415	61	»
Д. Филиповичи	433	82	»
Хут. Филипоны	22	5	(Лясковичская)
Уроч. Хильки	10	1	(Копаткевичская)
Ф. Хильки	25	4	»
Д. Хойно	858	147	(Лучицкая)
Д. Хусное	663	100	(Копаткевичская)
Имение Челющевичи	33	1	»
Село Челющевичи	593	76	»
Уроч. Яковщина	25	3	(Петриковская)

СПИСОК ВЛАДЕЛЬЦЕВ ЗЕМЛИ ИЛИ ДРУГОГО НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА МИНСКОЙ ГУБЕРНИИ, МОЗЫРСКОГО УЕЗДА, ГРАБОВСКОЙ, КОМАРОВИЧСКОЙ, КОПАТКЕВИЧСКОЙ, ЛУЧИЦКОЙ, ЛЯСКОВИЧСКОЙ И ПЕТРИКОВСКОЙ ВОЛОСТЕЙ И ИМЕЮЩИХ ПРАВО ПО ЭТОМУ ВЛАДЕНИЮ ПРИНИМАТЬ УЧАСТИЕ В ИЗБРАНИИ УЕЗДНЫХ ЗЕМСКИХ ГЛАСНЫХ МОЗЫРСКОГО УЕЗДА НА ТРЕХЛЕТИЕ с 1911 г.

1. Владельцы не менее 300 десятин земли или недвижимого имущества стоимостью не менее 7500 рублей.

Ф. И. О. землевладельца	Место расположения	Количество десятин
Непольского происхождения		
1. Бродович Людмила Васильевна	Им. Оголичи Петриковской вол.	301
2. Вильсон Иван Иванович	Им. Лучицы Лучицкой вол.	3642
3. Кирилюк Николай Григорьевич	Им. Оголичская Рудня Петриковской вол.	370
4. Кирхнер Ида Александровна	Им. Константиново Копаткевичской вол.	2326
5. Лемергерт Генриетта Христиановна	М. Копаткевичи (имущество 17 673 руб.)	
6. Милорадович Григорий Александрович, граф	Им. Комаровичи Комаровичской вол.	5530
...8. Хряков Петр Николаевич	Им. Конковичи Петриковской вол.	2911
9. Шеншина Татьяна Николаевна	Им. Копаткевичи Копаткевичской вол.	1257
10. Ящинская Наталья Емельяновна	Им. Белый Переезд Комаровичской вол.	2780

Польского происхождения

11. Богуш Иосиф Урбанович	Им. Новоселки Комаровичской вол.	5117
12. Бродович Чеслав Генрихович	Им. Оголичи Петриковской вол.	710
13. Бродович Казимир Генрихович	Им. Оголичи Петриковской вол.	909
14. Булат Ядвига Доминиковна	»	832
15. Венцлавович Владислав Антонович	Им. Ванюжичи Комаровичской вол.	2829
16. Довгялло Анна Карловна	Им. Петриков	10 827
17. Кеневич Иероним Иеронимович	Им. Бринёв Лясковичской вол.	12 395
18. Кассаговская Мария Карловна, графиня	Им. Петриков	10 827
19. Кеневич Антон Иеронимович	Им. Дорошевичи Лясковичской вол.	619
20. Левандовский Людвиг Генрихович	Им. Челющевичи Копаткевичской вол.	1083
21. Ленкевич Адам Сабинович	Им. Копцевичи Лучицкой вол.	2152
22. Ленкевич Александр Сабинович	»	2152
23. Ленкевич Мечеслав Сабинович	»	2152
24. Пржиборо Троян Северинович	Х. Коржевка	340
25. Фон-Путкамер Лаврентий Станиславович, граф	Им. Павлиново Лясковичской вол.	5893
26. Пржиборо Юлия Станиславовна	Им. Слинки Петриковской вол.	1285
27. Статкевич Станислав Гордеевич	Им. Старина Копаткевичской вол.	348
28. Шиманский Антон Генрихович	Им. Лучицы Лучицкой вол.	2213

2. Владельцы не менее 60 десятин земли или недвижимого имущества стоимостью не менее 1500 рублей.

Непольского происхождения

1. Андрюк Василий Иванович	М. Петриков (имущество 1500 руб.)	
2. Барановская Надежда Игнатьевна	М. Петриков	67
3. Борисевич Михаил Иванович	Грабовская вол.	78...

...[100]

Польского происхождения

...[10]

3. Владельцы менее 60 десятин, но не менее 30 десятин земли или недвижимого имущества стоимостью менее 1500 рублей, но не менее 750 рублей.

Непольского происхождения

...[166]

Польского происхождения

...[17]

Список землевладельцев Минской губернии, 1911 г.

Плешча Прыпяць у берагі...

ЭТНАГРАФІЯ ПЕТРЫКАЎШЧЫНЫ

Пасяленні, сядзібы, жыллё

Неад'емнай часткай яркай і самабытнай культуры беларускага народа з'яўляецца матэрыяльная і духоўная культура Петрыкаўшчыны — аднаго з прыгажэйшых куткоў Прыпяцкага Палесся, слаўнага сваімі промысламі, рамёствамі, песнямі, легендамі, цікавымі звычаямі і абрадамі. Працавітыя, дасціпныя, надзеленыя сакавітым гумарам палешукі займаліся земляробствам і жывёлагадоўляй, а мнагаводная Прыпяць з упадаючымі ў яе рэкамі, густыя лясы і шматлікія азёры давалі петрыкаўцам магчымасць прыдбаць яшчэ шмат чаго да свайго стала.

Прыродныя ўмовы і гаспадарчыя за-

няткі насельніцтва сфарміравалі асаблівасці архітэктурнага аблічча палескіх вёсак, якія размяшчаліся на пясчаных дзюнах сярод лясоў і балот або па берагах рэк ці азёр. Да пачатку 30-х гадоў XX ст. вясковыя пасяленні былі невялікімі, не болей 50—60 двароў. На кожнай вуліцы меўся калодзеж са зрубнай шахтай і жураўлём, на якім вісела драўлянае вядро. Каля калодзежа звычайна стаяла выдзеўбаная з тоўстай калоды камяга, з якой паілі коней і кароў.

У пачатку вёскі, на перакрыжаванні вуліц і дарог, устанаўліваўся высокі драўляны крыж. Калі ў сялянскай сям'і хто-небудзь хварэў або трапляў у бяду, на яго чаплялі вышыты ручнічок або фартушок, таму крыжы называлі аброчнымі. Каля крыжа спыняліся пахавальныя працэсіі для развітання з нябожчыкам тых, хто не праводзіў яго да могілак.

Для вясковай забудовы Петрыкаўскага раёна характэрны тры асноўныя планіровачныя тыпы: вулічная (адна- і шматвулічная); лінейная (шэрагавая); гнездавая, або скучаная (бессістэмная). У вёсках, размешчаных на берагах рэк, хаты часта будаваліся на адзін бок вуліцы (лінейная забудова). Пры вулічнай планіроўцы вёсак хаты звычайна размяшчаліся па абодвух баках вуліцы. Агароды, участкі ворнай зямлі, сады ўздоўж вуліц абносіліся агароджамі з жэрдак (праслам). Большасць хат стаяла тарцовым бокам на вуліцу, іншыя — падоўжанай сцяной з вокнамі.

Асноўнай структурна-планіровачнай адзінкай вёскі была сядзіба, якая складалася з хаты, гаспадарчых пабудоў, двара, невялікага сада, агарода і надзела ворнай зямлі. Найбольш тыповай формай сядзібы з'яўляўся двор з нязвязанымі пабудовамі, размешчанымі бессістэмна. У пачатку стагоддзя яшчэ былі распаўсюджаны чатырохвугольныя двары, абнесеныя з боку вуліцы высокім плотам з бярвён гарызантальнай кладкі, замацаваных у шулы. Вышыня парканаў звычайна — 2—2,5 м. З вуліцы ў іх рабіліся двухстворчатыя вароты і веснічкі. Плеценымі (плятнямі) і жардзянымі (праслам) платамі абгароджвалі сядзібу з тыльнага боку. Платы з дошак (штыкетнік) атрымалі распаўсюджанне ў другім дзесяцігоддзі XX ст.

Асноўным відам жылля была драўляная, зрубнай канструкцыі адна-, двух- і трохкамерная хата. Зруб адкрытага тыпу рубілі з распілаваных бярвён (дыляў) ці кругляка ў просты вугал з астаткам — невялікім выпускам (20—30 см). Канцы 2—3 верхніх бярвён выступалі за плоскасць сцяны на 50—70 см — кожнае на розную даўжыню: лічылася, што такі вугал менш прамярзае і не прапускае вільгаць. Толькі пасля вайны, у 40-х гадах, вуглы пачалі абразаць пад шнур — у чысты (нямецкі) вугал.

Самы архаічны і просты тып вясковага жылля — аднакамерная хата без сенцаў (сяней) з маленькімі квадратнымі ваконцамі, якія па вышыні займалі 2—3 бервяны. Больш складаным тыпам жылля з'яўляецца двухкамерная хата (хата і рубленыя сенцы, якія далучаліся да хаты пры дапамозе шулаў). Найбольш распаўсюджаным тыпам традыцыйнага жылля канца XIX — пачатку XX ст. была трохкамерная хата (хата, сенцы, камора).

Сцены знутры хаты не тынкавалі і не бялілі, толькі некаторыя гаспадары для цяпла абмазвалі пазы паміж бярвёнамі глінай. Звычайна падлога была глінянай. Падлогу з дошак, якія прыганяліся ўпрытык пад фуганак і насціляліся на дубовыя брусы (лагі, падваліны), у дарэвалюцыйны час мелі толькі найбольш заможныя жыхары вёскі. Да канца 30-х гадоў XX ст. лагі клалі проста на зямлю, затым пачалі ўжываць драўляныя ці цагляныя слупкі-апоры. Для захавання цяпла прастора пад падлогай засыпалася пяском, але паміж дошкамі падлогі і пяском пакідаўся запас паветра для вентыляцыі.

Падмуркаў не рабілі, першы, дубовы вянец хаты клалі прама на зямлю. У па-

чатку XX ст. хаты пачалі ставіць на тоўстыя дубовыя калодкі (штандары). Столь клалі на папярочныя бэлькі, якія падтрымліваліся «трамам». Бэлькі ўсякалі ў перадапошні вянец хаты (запясочнік). Столь бялілі.

Стрэхі былі стромкія, двухсхільныя, зрэдку — чатырохсхільныя. Яшчэ ў сярэдзіне XX ст. у вёсках Петрыкаўшчыны можна было бачыць у старых хатах, клецях і хлявах стрэхі архаічнай канструкцыі закотам (на лемягах). У гэтых будынках бярвёны тарцовых сцен вышэй верхняга вянца зруба, які служыў апорай для канструкцыі страхі, паступова ўкарочваліся да вільчыка, дзякуючы чаму франтон набываў выгляд ступеньчатага трохвугольніка.

У другім дзесяцігоддзі XX ст. пачалі рабіць стрэхі на страпілах. Спачатку іх урубалі ў апошні верхні вянец хаты (ацэп), потым сталі ўрубаць у бэлькі. Страпілы (кроквы) замацоўваліся цвікамі. На адлегласці 1 м ад грэбеня страхі (вільчыка) у страпілы ўрубаўся папярочны брус (пояс). Затым страху «абрашэчвалі»: на страпілы ўздоўж прадольных сцен набівалі «латы» (дошкі або жэрдкі).

Хаты крылі саломай, снапкамі колас сам уніз, а пазней снапкамі камлём уніз (пад штрыхоўку). Грэбень страхі закладвалі прыблізна на 40 см прымятай саломай і прыціскалі «козламі», каб яе не разносіла ветрам. Пазней сталі крыць стрэхі дранкай і гонтамі.

Вакол хаты, калі зруб стаяў на зямлі ці на штандарах, часта рабілася прызба — невысокі, да ўзроўню трэцяга вянца насып, умацаваны звонку жэрдкамі або дошкамі. Прастора паміж дошкамі і сцяной засыпалася зямлёй, каструбцай або хваёвай ігліцай. Курныя хаты будавалі да апошняй чвэрці XIX ст. Да пачатку 20-х гадоў XX ст. печы былі глінабітныя, потым іх сталі класці з самаробнай цэглы-сырца. Падмурак печы (апечак) вязалі з бярвён у «чысты» (нямецкі) вугал або ставілі яе на слупах (штандарах). Печ заўсёды рабілі справа ці насупраць ад уваходу вусцем да прадольнага боку хаты. Займала яна каля $^1/_4$ жылой плошчы хаты. Насцеленыя ад печы да сцяны дошкі ўтваралі «пол» (полік), які служыў ложкам для сялянскай сям'і. Каля яго да столі падвешвалася на вяроўках плеценая ці збітая з дошак калыска. Тут жа на падлозе звычайна стаяў чурбак тоўстага дрэва (калодка), на якую станавіліся, каб залезці на «пол» ці з яго на печ.

На працягу многіх стагоддзяў склаўся традыцыйны падзел прасторы сялянскай хаты на функцыянальныя часткі, якія мелі канкрэтнае прызначэнне: месца прыгатавання ежы, сну, чырвоны вугал (покуць) і г. д. Традыцыйнае хатняе начынне складалі стол, лавы, услоны, куфар, лыжачнік, палаці, жэрдка для адзення, абразы. Стол стаяў у вуглу па дыяганалі ад печы, дзе віселі абразы. Злева ад уваходу каля парога — услон з вядром вады, каля яго цэбар для памыяў. Уздоўж сцен цягнуліся шырокія масіўныя лавы, якія служылі ўдзень месцам для сядзення, а ноччу для спання, справа ад стала стаяў куфар.

На сцяне каля дзвярэй умацоўваліся драўляныя паліцы для посуду. Сярод хаты, бліжэй да печы, рабіўся посвіт (прыстасаванне для асвятлення хаты), які меў выгляд конусападобнай трубы, расшыранай знізу. Верхні, завужаны канец посвіта замацоўваўся ў зробленай у столі адтуліне. Ніз і верх рабіліся з дрэва, а сярэдняя частка з драўляных абручоў, якія абцягваліся палатном. Уся канструкцыя абмазвалася глінай і бялілася. Да ніжняга раструба посвіта падвешвалася жалезная рашотка, на якой гарэла лучына. На падлогу пад посвіт ставілі драўлянае вядро з вадой, куды ападала вуголле згарэўшай лучыны.

Аздабленнем хаты служылі вышытыя або упрыгожаныя тканым узорам ручнікі, якія вешалі на абразы. На святы вышытыя ручнікі развешвалі на сценах. Стол накрывалі абрусам (настольнікам). Пасцель засцілалі саматканымі пакрываламі (посцілкамі). У XIX ст. посцілкі былі ў асноўным двухколернымі (чорны з чырвоным, чорны з жоўтым). З канца XIX ст. са з'яўленнем хімічных фарбавальнікаў іх пачалі ткаць паліхромнымі.

У покуці пад абразамі на лаве стаяла дзежка, у якой рашчынялі хлеб. Часта ў хаце знаходзіліся жорны і ступа, а калі да хаты прымыкалі сенцы, жорны і ступа стаялі там. Столі ў сенцах, як правіла, не рабілі, падлога была гліняная, на сцяне віселі сярпы, косы. Многія гаспадары ў сенцах адгароджвалі камору — кладоўку, дзе захоўвалі муку, зерне, кубел з салам, куфар з адзеннем і палатном, запас лапцей і лыкаў.

У комплекс традыцыйных гаспадарчых пабудоў сядзібы ўваходзілі клець, розныя хлявы, варыўня (сцёпка, стопка або пограб), гумно, павеці. Лазняў звычайна не будавалі.

Клець уяўляла сабой невялікі, блізкі ў плане да квадрата будынак. Ставілі яе на камяні або на штандары, як правіла, насупраць хаты. З боку, дзе рабіліся дзверы, канцы бярвён ніжніх 2—3 вянцоў бакавых сцен выпускалі прыблізна на 1 м і зверху на іх насцілалі дошкі. Разам з апорнымі слупамі і выступаючым паддашшам яны ўтваралі прыклетнік. Падлогу насцілалі з жэрдак або плах, столлю служыла скляпенне страхі. Стрэхі былі двухсхільныя, зашчыткі (франтоны) рабілі з тонкіх бярвён закотам. Справа ад уваходу паўз сцяны адгароджвалі засекі, у якіх захоўвалі збажыну. Летам у клеці спалі маладажоны.

На задах сядзібы размяшчалася гумно — прамавугольная зрубная пабудова, прызначаная для захавання і апрацоўкі неабмалочанай збажыны. Рубілі гумны з сасны і асіны ў прасты з астаткам вугал, прагоны сцен замацоўвалі ў шулы. Падмуркаў не было, ніжні вянок зруба клалі прама на зямлю. Найбольш старажытная канструкцыя страхі — «на сохах». На іх клалі ўздоўж бэльку, на якой мацаваліся ключыны. Да ключын прыбіваліся латы. У больш позні час гуменныя стрэхі рабілі на кроквах (страпілах) і пакрывалі саломай.

У тарцовым баку гумна былі адно- або двухстворкавыя вароты. Насупраць іх прыкладна на $^1/_3$ даўжыні гумна ішоў ток — утрамбаваная з гліны пляцоўка для малацьбы. Абапал тока знаходзіліся застаронкі, аддзеленыя ад тока невысокай, у 2—3 бервяны агароджай (прыстаронкамі), у якія складвалі снапы жыта, ячменю, грэчкі.

Хлеў таксама рубілі ў прасты вугал з астаткам, канцы бярвён на прагонах доўгіх сцен замацоўвалі ў шулы. На хлеў звычайна выкарыстоўвалі больш нізкі па якасці лес, чым на клець і хату. Стрэхі рабілі двух, трох- і чатырохсхільныя. Хлеў разгароджвалі перагародкамі з жэрдак на катухі, у якіх трымалі каня, авечак. Для кароў рабіўся асобны хлеў. На подсціл выкарыстоўвалі лісце, хваёвае «шыгалле» (ігліцу), салому.

Варыўня (сцёпка, стопка) — зрубная гаспадарчая пабудова для захавання бульбы і агародніны памерам 2,5×2,5 або 3×3 м, з кругляка ці паўкругляка ў прасты з астаткам вугал. Столь — з плах ці дошак, страха двухсхільная, без падлогі. Бульбу і агародніну сыпалі прама на зямлю. Зімой для абагрэву ставілі чыгунок з гарачым вуголлем (жарам), часам рабілі невялікую простую печ з цэглы. Сцёпка з'яўляецца абавязковым будынкам на сядзібе ў тых вёсках, дзе грунтавыя воды падыходзяць блізка да паверхні зямлі, на астатняй тэрыторыі раёна распаўсюджаны пограбы. Яму пограба абшывалі драўляным зрубам (цяпер абкладваюць цэглай або заліваюць бетонам). Дно заўсёды земляное для лепшага захавання бульбы і агародніны. На ўзроўні зямлі ў пограбе робіцца гарызантальнае ўцяпленне, зверху — двухсхільная паграбня з дзвярамі.

Для захавання сена і саломы рабілі павеці (абарогі) — чатыры слупы, звязаныя зверху ў квадрат тонкімі бярвёнамі ці жэрдкамі і пакрытыя саламянай страхой. Звычайна абарог меў «под» — прымітыўную падлогу з жэрдак, дошак для засцярогі сена ад паводкі.

Адзенне

Традыцыйнае адзенне насельніцтва Петрыкаўскага раёна адлюстроўвала ўсе адметныя рысы агульнабеларускага нацыянальнага касцюма, але мела свае асаблівасці, якія сфарміраваліся пад уплывам гістарычных, сацыяльна-эканамічных і геаграфічных фактараў.

Жаночы касцюм складаўся з палатнянай белай сарочкі, упрыгожанай чырвона-чорнай вышыўкай або чырвоным тканым узорам, безрукаўкі (камізэлькі,

гарсэта), фартуха і суконнага андарака або саяна. Шылі сарочкі звычайна з «подтачкай»: верх рабілі з самага тонкага, «кужэльнага» палатна, ніз — з больш грубага.

Пануючым тыпам крою традыцыйнай жаночай сарочкі на тэрыторыі раёна была сарочка з палікамі (устаўкамі) на плячах. Каля стаячага каўняра яна дробна прызборвалася і спераду завязвалася на стужачку, тасьму або ссучаныя ніткі. Рукавы доўгія, даволі шырокія, прызбораныя каля вузкага, на адзін гузік манжэта (чэхліка, чохлика). Манжэты рабілі з брыжыкамі ці без іх. Пад рукавы ўстаўлялі невялікія квадратнай формы ўстаўкі (ластаўкі).

У пачатку XX ст. атрымалі пашырэнне сарочкі на какетцы (гестцы) з гладкімі плячамі. Каля гесткі сарочкі дробна прызборваліся. У гэты ж час сталі насіць паркалёвыя кофты. Пад іх апраналі сарочкі са швом на плячах, якія выконвалі ролю ніжняй бялізны. Святочныя сарочкі ўпрыгожваліся вышыўкай крыжыкам або гладдзю, а таксама затыкаліся па паліках, верхняй частцы рукава і на манжэтах. Вышывалі чырвонымі і чорнымі ніткамі з перавагай чырвонага колеру. Тканыя ўзоры былі толькі чырвонага колеру.

Паясное адзенне жанчын складалі суконныя андаракі (саяны), палатняныя або пакупныя паркалёвыя спадніцы, у назвах якіх існаваў вялікі разнабой. Так, у вёсцы Бяланавічы андаракам называлі любую жаночую спадніцу. У Залессі суконную спадніцу называлі андаракам, а палатняную спадніцай. Тую ж палатняную спадніцу ў Смятанічах называлі парцяком. У Баклані і Славінску суконную спадніцу называлі саянам, летнюю — андаракам і г. д.

Зімнія спадніцы — андарак, у іншых вёсках — саян шылі доўгімі і шырокімі, ля пояса прызборвалі або закладвалі ў складкі. Гледзячы на тое, для свят ці штодзённага нашэння шылі андаракі, на іх выкарыстоўвалі даматканае сукно самай рознай якасці і афарбоўкі. Калі клятчастыя і паласатыя андаракі дзяўчат і маладых жанчын спалучалі 5 і больш яркіх, часам падабраных з вялікім мастацкім густам кантрастных колераў, то ў сталых і старых жанчын яны былі сціплай цёмнай каляровай гамы або аднатонныя.

Палатняныя спадніцы звычайна шыліся ў 3—5 палотнішчаў, даўжынёй да пчыкалатак. На іх выкарыстоўвалі даматканае крашанае палатно, вытканае ў клеткі ці паскі. Каля вузкага паяска (каўняра) спадніцы прызборваліся або закладваліся ў дробныя складачкі. У спякотныя летнія дні, ідучы на працу ў поле, зграбаць ці стагаваць сена, жанчыны надзявалі спадніцы з нефарбаванага белага палатна.

Абавязковым элементам традыцыйнага жаночага касцюма быў фартух (хвартук, хвартух), які шылі ў дзве прадольныя полкі. Адна полка рэзалася на два кліны, якія прышываліся абапал асноўнага палотнішча вузкай часткай да пояса. Ля вузкага паяска, які пераходзіў у завязкі (матузы), фартухі збіраліся ў дробныя зборкі. Па падолу святочныя фартухі ўпрыгожваліся тканым узорам чырвонага колеру, карункамі, фальбонамі, вышываліся крыжыкам і гладдзю.

Ідучы жаць жыта, некаторыя жанчыны апраналі замест спадніцы два фартухі — адзін наперадзе, другі ззаду, што не замінала рухацца, калі трэба было часта і нізка нагінацца. Па вуліцы так не выхадзілі. Часам фартухі шылі з двух прамых полак. Знізу да яго прышывалі прызбораны валан шырынёй у 20—30 см.

Паверх сарочкі жанчыны насілі адразныя або прышытыя да андарака безрукаўкі (гарсэты, камізэлькі). Часам безрукаўкі прышываліся да андарака — так цяжкія зімнія суконныя андаракі было ямчэй насіць. Часцей за ўсё камізэлькі былі адразныя, шчыльна аблягалі фігуру, мелі выраз пад горла, наперадзе зашпільваліся на гузікі ці гаплікі. Шылі іх з паркалю, аксаміту, крамнага сукна на падкладцы з даматканага палатна. Святочныя камізэлькі ўпрыгожваліся наперадзе рознакаляровымі стужкамі і тасьмой па вырazу, проймах рукавоў, уздоўж засцежкі.

З традыцыйных галаўных убораў на тэрыторыі Петрыкаўшчыны да XX ст. шырока бытавалі наміткі (у пачатку XX ст. іх насілі на святы толькі старыя жанчыны), а таксама чапцы і разнастайныя па матэрыялу, памеры і афарбоўцы хусткі. У цёплую пару года дзяўчаты хадзілі з непакрытай галавой. Валасы запляталі ў 1—2 касы. Толькі ідучы «на людзі» (у лаўку, на ігрышча, у царкву ці на кірмаш), дзяўчаты накрывалі галаву хусткай, складзенай

па дыяганалі і павязанай пад падбародак або вакол галавы. На вяселле дзяўчаты надзявалі самаробны ці пакупны вянок са штучных кветак з каснікамі, а пазней з вэлюмам.

Жанчыны кос не плялі, а раздзялялі валасы на прамы прабор на дзве часткі і закручвалі вакол галавы. Зверху на закручаных валасах замужнія жанчыны абавязкова насілі чапец (павойнік) — неглыбокую круглую шапачку, якая шчыльна аблягала галаву. Святочныя чапцы звычайна шылі з яркіх тонкіх фабрычных матэрыялаў: паркалю, шоўку, аксаміту, тонкага сукна. Наперадзе чапцы ўпрыгожваліся зборачкамі, стужкамі, карункамі, тасьмой, вышыўкай і г. д. Чапец жанчына надзявала пасля вяселля і насіла з гэтага часу ўсё жыццё да скону.

Паверх чапца да пачатку XX ст. жанчыны павязвалі намітку — ручніковы галаўны ўбор, шырока вядомы ўсім славянскім народам. Яна ўяўляла сабой доўгі (2,5—3,5 м) ручнік з заткanымі чырвонымі ніткамі або вышытымі канцамі. Завязванне наміткі было даволі складаным, у кожнай мясцовасці па-свойму.

З канца XIX ст. розныя па памеры і матэрыялу хусткі пачынаюць замяняць намітку, затым чапец. Ужо ў другім дзесяцігоддзі XX ст. многія жанчыны замест чапца шчыльна абвязвалі вакол галавы невялікую тонкую паркалёвую хустачку, а зверху — другую, большую.

Жаночы касцюм аздаблялі разнастайнымі пацеркамі (маністамі, каралямі), завушніцамі, пярсцёнкамі. Бедныя насілі шкляныя маністы, танныя металічныя завушніцы, пярсцёнкі (з вочкам), кольцы (чыгункі) з цёмнага металу і абручальныя сярэбраныя пярсцёнкі. Адзенне жанчыны заўсёды адпавядала прынятым у данай мясцовасці стандартам, узросту і сямейнаму статусу, але кожная сялянка ў вышыўцы, падборы аздаблення, упрыгажэннях праяўляла столькі фантазіі, мастацкага густу, выдумкі, так старалася, каб былі да твару і ўпрыгожвалі яе, што кожная сарочка, фартух, гарсэт, чапец былі надзвычай індывідуальнымі і ніколі не паўтаралі адзін другога поўнасцю.

Комплекс традыцыйнага мужчынскага адзення Петрыкаўшчыны складаўся з даматканай сарочкі, такіх жа нагавіц і тканага ці плеценага пояса і безрукаўкі. Мужчынскія сарочкі шылі з даматканага палатна ў два і больш палотнішчаў. У адрозненне ад жаночых на іх ішло палатно больш грубае, нізкэйшага гатунку. Найбольш архаічнай была кашуля тунікападобнага крою — сарочка «з голымі плячыма». Аснову яе складала полка даматканага палатна, якая перагіналася па ўтку на дзве роўныя часткі. На лініі перагібу рабілася адтуліна для галавы. Па баках на ўзроўні пляча прышываліся рукавы, пад імі ўстаўляліся прамыя або касыя бакавыя кліны, каўнер стаячы, разрэз (пазуха) наперадзе злева або па цэнтры. Рукавы доўгія, з манжэтамі (чахламі). Зашпільваліся на самаробны гузік. Разам з кашулямі тунікападобнага крою былі пашыраны сарочкі з палікамі (устаўкамі, прырамнікамі) на плячах. Палікі былі прамавугольнай формы і каля каўняра прызборваліся.

Кашулі на гестцы — больш позні крой, у пачатку XX ст. іх насіла ў асноўным моладзь. Пярэдняя полка такой кашулі была цэльнай, гестка была толькі ззаду, каўнер — стаячы, разрэз злева. Старыя мужчыны насілі кашулі з адкладнымі каўнярамі, разрэз рабіўся наперадзе па цэнтры.

У мужчынскіх сарочках усіх тыпаў ззаду з унутранага боку ад каўняра да сярэдзіны спіны прышываўся прамавугольны кавалак палатна — «падаплека», якая мела чыста практычнае прызначэнне, бо тут тканіна хутка прэла ад поту.

Кашулі насілі звычайна навыпуск зверху нагавіц і абавязкова з тканым, плеценым або раменным поясам. Без пояса мужчына хадзіў тады, калі той замінаў рабоце (на касьбе, уборцы хлеба, сена, на малацьбе). Тканыя і плеценыя паясы былі аднатонныя і паліхромныя, самых разнастайных колераў.

Шырока бытавалі самаробныя папругі з сырамятнай скуры. Святочныя мужчынскія кашулі ўпрыгожваліся вышыўкай на манішцы, на каўняры і манжэтах.

На кашулю ў святочныя дні апраналі безрукаўку (камізэльку). Пярэднюю частку яе звычайна рабілі з пакупной тканіны, часцей за ўсё з сукна, спінку — з даматканага палатна. Камізэлькі былі прамога крою, распашныя, з чатырох полак, спераду зашпільваліся на гузікі.

Нагавіцы шылі з даматканага палатна, сукна і паўсукна ў дзве полкі. Летам мужчыны насілі адны палатняныя нагавіцы белага колеру без споднікаў. Нагавіцы з даматканага шэрага сукна надзявалі звычайна зімой або на святы.

Мужчынскія зімовыя шапкі выраблялі з аўчыны, зрэдку з футра лісіцы, зайца, вавёркі, воўны. У канцы XIX — пачатку XX ст. старыя людзі насілі яшчэ высокія аўчынныя шапкі з круглым верхам, пакрытыя сукном, якія ззаду завязваліся тасёмкамі (шапкі «на завесах»). Але найбольш пашыранымі былі аўчынныя круглыя шапкі футрам вонкі (кучомкі), якія нагадвалі па форме нізкую папаху, і шапкі-аблавухі, пакрытыя зверху сукном. Аблавуха мела чатыры вялікія вухі, прышытыя да асновы шапкі. Два бакавыя вухі завязваліся пад падбародкам, пярэдняе і задняе — зверху. У пачатку XX ст. паявіліся шапкі-вушанкі, падобныя на сучасныя. Рэдка сустракаліся валеныя шапкі (магеркі), якія выраблялі з воўны вандроўныя шапавалы.

Найбольш распаўсюджаны летні мужчынскі галаўны ўбор — плецены саламяны брыль, які ў першыя дзесяцігоддзі XX ст. заменены шапкай з казырком (картузом). Шылі іх вясковыя або петрыкаўскія майстры з пакупнога матэрыялу або тонкага даматканага паўсукна.

Да 20-х гадоў XX ст. асноўнымі матэрыяламі для верхняга адзення былі даматканае сукно, паўсукно, радзей — палатно. Сукно і паўсукно ткалі звычайна ў чатыры ніты, што забяспечвала матэрыялу шчыльнасць і трываласць. Перад шыццём даматканае сукно і паўсукно валілі ў валюшнях пры мельніцах або апрацоўвалі дома, абліваючы кіпнем і адбіваючы ў ступах таўкачом ці на рабрыстай паверхні вальком. Матэрыял, які ішоў на выраб верхняга адзення, звычайна меў натуральны белы або шэры колер.

Сярод верхняга мужчынскага і жаночага суконнага адзення найбольшае пашырэнне мелі світы з адразной спінкай (прамой або прыталенай), з прамымі суцэльнакроенымі поламі. У бакавыя швы світы ўніз ад лініі таліі ўстаўляліся трапецападобныя кліны, якія ля таліі прызборваліся. Каўнер быў стаячы або адкладны, рукавы прамыя. Сяляне стараліся мець дзве світы: на святы і для штодзённага нашэння.

У больш цёплае надвор'е жанчыны і дзяўчаты апраналі каптанчыкі, якія шылі з палатна, даматканага або пакупнога сукна, даўжэй кофты. Спінка ў іх рабілася суцэльнай, каўнер нізкім стаячым, па баках устаўляліся кліны.

У якасці лёгкага верхняга адзення мужчыны насілі суконныя «пінжакі» — кароткія світы прамога свабоднага крою. Шыліся яны звычайна двухбортнымі, з накладнымі кішэнямі. Каўнер рабіўся невялікі, адкладны, наперадзе вопратка зашпільвалася на гузікі.

Зімой мужчыны і жанчыны насілі кажухі жоўтага, карычневага, чорнага ці белага колеру, аўчыну для пашыву якіх выраблялі ў Петрыкаве. Кароткія кажухі звычайна шылі з адразной спінкай у заборы ззаду, іх выкарыстоўвалі для паўсядзённай працы. Доўгія кажухі (казачыны) апраналі ў дарогу.

Традыцыйным сялянскім абуткам былі ліпавыя або лазовыя лапці прамога пляцення. Скураныя лапці (пасталы, маршчакі) рабілі са старой халявы або куска сырамятнай скуры, у якой па краях прарэзвалі дзіркі і працягвалі скураныя валокі, пры дапамозе якіх лапці мацаваліся на назе. На нагу накручвалі белыя палатняныя анучы, зімой — суконныя, зверху якіх накручвалі палатняныя. Мужчыны абмотвалі нагу валокамі крыху вышэй шчыкалаткі, жанчыны амаль да калена.

Па святах насілі боты (чобаты), а жанчыны — чаравікі. Некаторыя, больш заможныя сяляне, куплялі хромавыя боты ў Петрыкаве, дзе была майстэрня. У пачатку XX ст. у чаравікі жанчыны надзявалі самаробныя панчохі. Чаравікі шылі з высокімі халяўкамі, наперадзе на шнуроўцы, гузіках, гапліках, часам на высокіх абцасах.

Боты былі двух відаў: прышвыя і

выцяжкі. Выцяжкі шылі без перадоў, галянішча ў іх плаўна пераходзіла ў перад і сшывалася швом ззаду. Прышвыя (прышыўныя) боты былі падобныя на сучасныя, з прышыўнымі перадамі. Боты абодвух відаў шылі са скуры чорнага або карычневага колеру, пераважна рантавымі, на нізкіх прамых абцасах, з шырокімі круглымі насамі. Падэшву прымацоўвалі драўлянымі, а пазней жалезнымі цвікамі.

Валены абутак (валёнкі, валенцы) у канцы XIX — пачатку XX ст. былі прыналежнасцю толькі заможных сялян. Іх валілі часцей за ўсё вандроўныя шапавалы з Расіі і Магілёўшчыны. Для трываласці валёнкі падшывалі сырамятнай скурай або войлакам.

Сельскагаспадарчая тэхніка

Аснову палескага земляробства складаў трохпольны севазварот, пры якім кавалак ворнай зямлі пад збожжа дзялілі на тры часткі. Адну засявалі азімымі, другую — яравымі, трэцюю частку пакідалі пад папар. На другі год пад папар пакідалі ўчастак, дзе сеялі азімае, на трэці — той, дзе было яравое, і г. д.

У XIX ст. на тэрыторыі Петрыкаўскага раёна аралі двухпаліцавай сахой, вядомай пад назвай «палескай». Асновай яе служыў «рагач» — доўгая (да 2,5 м) жэрдка, да якой скуранымі або вяровачнымі прывязкамі мацавалася «расоха» — крыху выгнутая драўляная плаха, на раздвоеныя канцы якой набіваліся жалезныя нарогі. Для адвальвання зямлі мацаваліся дзве лапатападобныя паліцы (або паліца і прыполак) з выгнутых дошчачак. Паліца, якая прымацоўвалася да левага нарога, паднімала адрэзаны пласт глебы, а другая (прыполак), на правым нарозе, адкідвала яго набок. Для акучвання бульбы карысталіся адназубай сошкай.

У канцы XIX ст. найбольш заможныя сяляне пачалі ўжываць драўляныя плугі з жалезным нарогам (лямешам) і адвалам. Напярэдадні першай сусветнай вайны з'явіліся жалезныя плугі, аднак бяднейшыя сяляне карысталіся сахой да пачатку 30-х гадоў.

Найбольш старажытнымі і прымітыўнымі прыладамі рыхлення глебы былі сукаватка і смык. Сукаватка — яловая вершаліна з абрубленымі завостранымі канцамі сукоў даўжынёй 40—60 см, выкарыстоўвалася для баранавання ляда. Смык рабілі з расколатых надвое яловых вершалін з сукамі даўжынёй 40—60 см.

У другой палове XIX ст. на Палессі пачалі з'яўляцца плеценыя бароны з дубовымі, бярозавымі або яловымі завостранымі зубамі (кляцамі). У канцы XIX ст. у сялянскі ўжытак уваходзіць рамная папярочна-брусковая барана, зробленая па ўзору фабрычнай з 25—30 кляцамі.

Пясчаныя палескія землі патрабавалі добрага ўгнаення. З хлява гной нагружалі на калёсы драўлянымі двухзубымі віламі — сахаром. З ручных прылад працы сяляне карысталіся таксама драўлянымі лапатамі, якія акоўваліся вясковымі кавалямі жалезам, матыкамі (капаніцамі, капачкамі) рознай формы і памераў.

Традыцыйнымі прыладамі для ўборкі збожжавых з'яўляліся сярпы, радзей косы. Сярпы былі двух відаў: паўкруглыя і падоўжаныя (авальныя), якія разлічваліся памерам рэжучай часткі. Сярпы сяляне набывалі ў мясцовых кавалёў або куплялі ў Петрыкаве, Жыткавічах, Тураве ці на вясковых кірмашах.

Грэчку і авёс касілі косамі (яны мелі назвы літоўка, варшаўка, сямёрка, васьмёрка — у залежнасці ад якасці і памеру). Да драўлянага кася каса прымацоўвалася пры дапамозе жалезнага кольца (банькі, наперстка). Лязо адбівалі вострым канцом малатка на жалезнай квадратнай або круглай бабцы, убітай у калодку. У час работы касу вастрылі (мянтачылі) бруском на драўлянай ручцы (мянташкай). Калі касілі грэчку, да касы прымацоўвалі лучок, а пры ўборцы аўса — паўкруглыя грабелькі з тонкіх лазовых пруткоў.

Снапы вязалі перавясламі і ставілі для прасушкі па 10—15 снапоў «у бабкі» або «мар'янкі», складвалі ў копы. Авёс і ячмень састаўлялі «ў хрэсцікі», грэчку сушылі ў кучках. Прасушаныя снапы на

вазах звозілі на гумно і складвалі абапал тока ў застаронкі. Паколькі сцены гумна не імшылі і не абцёсвалі, паміж бярвёнамі былі шчыліны, дзякуючы чаму снапы на скразняку праветрываліся і дасыхалі. Там збожжавыя захоўваліся да позняй восені, пакуль не заканчваліся ўсе палявыя работы. Тады селянін прыступаў да малацьбы.

Малацілі на таку цэпам, які складаўся з цапільна і біча (бічака, біяка), прывязанага да цапільна сырамятнымі раменьчыкамі. Тут жа на таку зерне веялі шуфлікам з кароткай ручкай (веялкай, шопелькай), а затым «ветрылі» пры дапамозе рэшата. Калі зерне было недастаткова ачышчана яго «апалалі», падкідваючы ў невялікіх лёгкіх драўляных начоўках. Чыстае зерне ссыпалі ў клеці ў засекі, бочкі, плеценыя з саломы каробкі.

Традыцыйнымі прыладамі апрацоўкі зерня з'яўляліся жорны, ручныя і нажныя ступы, вадзяныя і ветраныя млыны. На тэрыторыі Петрыкаўскага раёна бытавалі ручныя каменныя жорны і жорны з драўлянымі калодкамі, на рабочыя плоскасці якіх былі набіты асколкі чыгуна. Таўклі зерне ў ручных ці нажных ступах. Рабілі іх звычайна з яловай калоды, у якой выпальвалі заглыбленне, затым павялічвалі яго да неабходных памераў цяслой і долатам. Таўкачы склюдавалі сякерай, затым апрацоўвалі нажом. Пазней крупы рабілі на спецыяльных «крупарушках».

Промыслы і рамёствы

Петрыкаўшчына — раён з традыцыйна развітай прамысловай дзейнасцю насельніцтва. Тут здаўна быў развіты сплаўны промысел, плытагонства, бурлацтва, якімі займаліся сяляне і бяднейшыя жыхары Петрыкава. Багатую шматвяковую гісторыю маюць таксама дрэваапрацоўчыя промыслы і рамёствы. Сяляне займаліся імі звычайна ў асенне-зімні перыяд.

Найбольш складаным рамяством, якое патрабуе высокай кваліфікацыі, з'яўляецца сталярнае. Вясковыя сталяры па-майстэрску выраблялі мэблю — сталы, лаўкі, ложкі, канапы, куфры, шафы, ткацкія станы, пралкі, жорны, сельскагаспадарчыя прылады, аконныя рамы, аканіцы і г. д. Важным і неабходным лічылася таксама бандарнае рамяство. Займаліся ім восенню, зімой і вясной. У халодны час бондар працаваў у хаце, у цёплае — у сенях, клеці, хляве, пад павеццю. Выраб бандарных прадметаў уключаў некалькі стадый. Спачатку дрэва — дуб, сасну, ясень, ліпу распілоўвалі і калолі на розныя па велічыні «целяшы» (плахі), якія затым разбівалі на клёпкі. Клёпкі склюдавалі спецыяльнай падоўжанай сякерай і чысцілі стругам. Абручы склюдавалі з маладога дуба ці арэшніку, распарвалі ў лазні або ў «парні» і гнулі на калодцы, тонкія — проста на калене. Затым клёпкі і абручы высушвалі. Пасля гэтага прыступалі да вырабу бочкі, дзежкі, кубла, вядра, баклагі і г. д. Прадавалі бандарныя вырабы ў Петрыкаве і Тураве, на кірмашах на Ражство ў Дарашэвічах, на Вялікдзень у Галубіцы, на Міхайлу ў Ляскавічах.

Паўсюднае распаўсюджанне мела стальмашнае рамяство (выраб драбін, павозак, саней, калёс, дуг, палазоў). Ім у вольны ад сельскагаспадарчых работ час займаліся амаль у кожнай вёсцы па некалькі чалавек. Колы да вазоў рабілі з дуба або ясеня. Дрэва калолі на брускі, склюдавалі, чысцілі і закладвалі на суткі і болей у парню ці лазню. Распараныя брускі гнулі на калодзе (бабцы, гбале), закопанай у зямлю.

Для саней склюдавалі палазы з дуба, ясеня, клёна, вяза або бярозы.

На тэрыторыі раёна мела пашырэнне вытворчасць дзяўбанага посуду, прадметаў хатняга начыння, лодак. Матэрыялам для вырабу служыла бяроза, яблыня (лыжкі), ліпа (міскі, чашкі, начоўкі, вуллі, жлукты, ліпаўкі для мёду і г. д.), клён (грабяні), асіна (лапаты, ложкі, чаўны, камягі, карыты).

Для лодкі ці чаўна бралі патрэбнай даўжыні і таўшчыні калоду (балван),

прасякалі яе ў многіх месцах сякерай. У адтуліны ўбівалі колічкі (стараж-кі) і нутро калоды выдзёўбвалі цяслой. Затым яе распарвалі, пры дапамозе палак разгіналі краі і ўстаўлялі папярочнікі. Гатовую лодку са знешняга боку прасмальвалі.

Выраб лодак і вязанне сетак мелі распаўсюджанне ў вёсках уздоўж Прыпяці і Пцічы, дзе сяляне шырока займаліся рыбалоўным промыслам. У 30-я гады ў Петрыкаве існавала арцель «Сеткапляценне», у якой працавала 40 рабочых. Яны вязалі каля 1500 сетак у год. У в. Лучыцы жыў Тарас Сядзельскі, які выраблял скуру — сырыцу на гужы, вожкі, аброці, хамуты. Ён быў выдатным бондарам, гнуў дугі, плёў рыбалоўныя сеткі. Загінуў Тарас Аляксандравіч у 1943 г.

На тэрыторыі раёна з даўніх часоў было вядома пляценне з лазы, лучыны, саломы, бяросты. Плеценыя вырабы былі вельмі разнастайныя па сваім прызначэнні — «казуб», «кырчаг» — ёмістасць 1,5 м вышынёй і 1—1,5 м шырынёй з саломы і лазы для захавання збожжа, розныя кошыкі (карзіны), плеценыя з лазы «сявенькі», якія выкарыстоўваліся для пасеву збожжавых, люлькі і г. д.

Было шмат кузняў. Кузня — зрубны будынак без падлогі і столі, крыты дошкамі або дранкай. Вясковыя кавалі выраблялі металічныя прылады працы або асобныя часткі да іх, прадметы паўсядзённага побыту. Тут стаяў горан з паддувалам і мяхамі для паддуву, накавальня (кавадла) — жалезная масіўная падстаўка для коўкі, станок для падкоўвання коней, тачыла, нацягач — прыстасаванне для нацягвання шын на колы. Такая кузня існавала пасля вайны ў в. Капцэвічы, у якой працаваў каваль Юцэвіч. Ён сам паліў вугаль для кузнечнага горна і мог выкаваць практычна любую рэч сялянскага побыту.

У раёне здаўна былі развіты скураныя рамёствы. Петрыкаў славіўся вырабам ботаў і чаравікаў, якімі гандлявалі ў мястэчках і вёсках ад Пінска да Мазыра. Тэхналогія апрацоўкі скур для абутку ўключала наступныя асноўныя аперацыі: адмоку, заленне, мяздрэнне, галенне поўсці, дубленне, мягчэнне, аддзелачныя аперацыі (жыраванне, фарбоўку, глянцаванне).

У XIX — пачатку XX ст. шырокае распаўсюджанне меў выраб сырамятнай скуры (сырамяці), якая выкарыстоўвалася для конскай вупражы, вырабу скураных лапцей і раменных абор для іх, рамянёў для ўвязкі цапоў, пуг. На сырамяць ішла скура буйной рагатай жывёлы. Толькі на Петрыкаўшчыне да сярэдзіны XX ст. захоўваўся старажытны спосаб выдзелкі скур, калі іх замест квашэння і залення закопвалі ў гной на тры дні, дзе яны «пацелі». Пасля гэтага скура добры мяздрылася і ад яе адыходзіла шэрсць. У Снядзіне выдатна выраблялі скуру Яўхім Хамлюк і Васіль Чарняўскі.

Здаўна існаваў кушнерскі промысел. Матэрыялам для яго служылі пераважна аўчыны, хаця выраблялі скуры і пушных звяроў: лісіц, куніц, тхароў, выдраў. Да канца XIX ст. аўчыны не дубілі, таму яны былі белага колеру. У канцы XIX ст. пачалі ўжываць дубленне, што павышала трываласць і носку кажухоў. У пачатку XX ст. аўчыны пачалі фарбаваць у чорны і карычневы колеры. Да 70-х гг. у многіх вёсках раёна захаваўся традыцыйны, без дублення, метад вырабу аўчын. Так выраблял іх Мікіта Цярэшчанка ў в. Лучыцы, а Маісей Зуй у час вайны шыў з такіх аўчын кажухі партызанам.

Выраб скур для абутку быў больш характэрны для мяшчан, але з другой паловы XIX ст. пачаў распаўсюджвацца і на вёсках. Заказчыкамі скураных ботаў і чаравікаў спачатку былі больш заможныя сяляне. У пачатку XX ст. скураны абутак пачалі шыць і купляць сяляне, але абувалі яго толькі на святы. Шылі скураны абутак шаўцы, якіх у вёсках было па 2—3.

Валюшны промысел уключаў катанне сукна на світы, выраб валеных шапак і валёнак. Да сённяшняга часу дайшло толькі валенне (катанне) валёнак, якое працягвае існаваць у невялікіх памерах. Да вайны шмат валілі (білі) валёнкаў у Лучыцах, Снядзіне. Выраб валёнак падраздзяляецца на чатыры этапы: насцілка шэрсці, валенне, фармоўка і канчатковая аддзелка.

Воўну часалі трыма спосабамі: на грэбені, на машыне — «ваўначосцы» і разбівалі на «струне». Вядома было валенне сукна ў ступе, па шэрахаватай паверхні (в. Лучыцы) і разбіванне «струной» (в. Снядзін).

Ткацтва

Апрацоўка ільну, пянькі, а таксама воўны, прадзіва і ткацтва з'яўляліся найбольш пашыранымі і развітымі хатнімі рамеснымі заняткамі. Займаліся імі выключна жанчыны, якія выраблялі для патрэб сям'і ільняныя, суконныя і паўсуконныя тканіны.

Лён — далікатная сельскагаспадарчая культура, якая патрабавала ад селяніна вялікіх працоўных затрат і земляробчых навыкаў. З яго севам, вырошчваннем і апрацоўкай звязана мноства прымхаў, феналагічных прыкмет, абрадавых і магічных дзеянняў, фальклорных твораў, у якіх адлюстроўваецца багацце духоўнай культуры народа. Лён убіралі апошнім, у канцы жніўня — пачатку верасня. Рвалі (бралі) яго з карэннем, рассцілалі па полі для прасушкі, потым вязалі ў снапкі і ставілі ў копкі. Калі пры патрэсванні снапа семя «звінела», ільняныя галоўкі абівалі драўляным пранікам. Пасля абівання лён рассцілалі на льнішчы або лузе на некалькі тыдняў, пакуль пад уздзеяннем дажджу, туману і сонца валакно не пачынала лёгка аддзяляцца ад трасты. Часта з гэтай мэтай лён вымочвалі ў сажалках, азёрах або рэчках. Затым яго сушылі і церлі на церніцы (мялцы, мяліцы). На Петрыкаўшчыне яго церлі на гарызантальнай ці наклоннай церніцы, якая з боку ручкі абапіралася на слупок-ножку. Затым лён трапалі з дапамогай трапла — дошчачкі з вострымі краямі для аддзялення ад валакна кастрыцы і пянькі (патропак). Наступнай вытворчай аперацыяй па апрацоўцы ільну было часанне яго на лапатападобным грэбені, у выніку чаго атрымлівалі высакаякаснае валакно (кужаль) і абдзіркі (пачэссе), якія ішлі на выраб зрэбнага палатна. На гэтых жа прыладах апрацоўвалі і каноплі, якія выкарыстоўваліся на ўток пры тканні 4-нітовых настольнікаў і ручнікоў у традыцыйнай бела-шэрай каляровай гаме. Для вырабу зімніх тканін для жаночага паяснога адзення на ўток шырока выкарыстоўвалася пража з авечай воўны.

Прасці пачыналі звычайна глыбокай восенню, на Піліпаўскі пост, найбольш цёмную і сумную пару года з доўгімі халоднымі вечарамі. Мусіць, таму ў беларусаў паўсюдна была шырока распаўсюджана традыцыя сумеснага прадзіва. Збіраліся на попрадкі-вячоркі да гаспадароў, якія мелі прасторную хату, дзе былі дзеўкі на выданні, або за невялікую плату да адзінокай жанчыны. На попрадкі хадзілі дзяўчаты, якія аблягчалі гэту манатонную і працаёмкую работу песнямі, казкамі, рознымі гісторыямі, жартамі.

Пралі на веслападобных прасніцах з дашчатым днішчам, часта па-мастацку ўпрыгожаных разьбой. Такія прасніцы нярэдка дарылі мужы жонкам або хлопцы нявестам. Ніткі скручвалі на выструганае ці вытачанае на такарным станку верацяно або пралі на самапрадцы (калаўроце). Гатовую пражу змотвалі на гарызантальнае 2-крыжовае матавіла. Для размотвання нітак з маткоў існавала спецыяльнае аднакрыжовае матавіла (размотыч), вертыкальна замацаванае на падстаўцы.

Пры неабходнасці частку пражы адбельвалі або фарбавалі натуральнымі фарбавальнікамі, прыгатаванымі з адвараў і настояў кары, лісця, каранёў, шышак расліны. Чырвоны колер давалі корань дугавой марэны і мацярдушка, жоўты — крушыннік, альха, верас, бяроза, васількі, каноплі, яблыня; чорны атрымлівалі з адвару талакнянкі і бабоўніку[1].

Пасля каляд пачыналі ладзіць (снаваць) кросны і прыступалі да ткацтва. Для Петрыкаўшчыны быў характэрны рамны ткацкі стан (кросны, варштат), аснову якога складала прамавугольная рама, умацаваная на чатырох ножках. Асаблівасць яго складала тое, што навой з асновай знаходзіўся на станінах, а пражны навой мацаваўся на падстаўках і быў вышэй. Ніты мацаваліся на паднебніку. На кроснах выраблялі разнастайныя па якасці, прызначэнні і арнаментыцы тканіны. Паколькі прадзенне і ткацтва звычайна вялося на працягу восеньскіх і зімовых месяцаў, жанчыне даводзілася працаваць па 12—15 гадзін у суткі. Сялянка магла выткаць за зіму да 100 аршын палатна (аршын — 71,12 см)[2]. Палатно, якое прызначалася на жаночыя сарочкі, ткалі звычайна з кужэльных нітак і часта па рукавах і паліках упрыгожвалі пры дапамозе ператыкання (затыкання) чырвонымі ніткамі. Больш

---

[1] *Супинский А. К.* «Понева» и «вставка» в белорусской женской одежде//Советская этнография. 1932. № 2.

[2] *Шейн П. В.* Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. Т. III. 1902.

складаны ўзор атрымлівалі бранай тэхнікай ткацтва «на дзве дошкі». Упрыгожаныя рукавы жаночых сарочак, на якіх папярочныя, гладка затканыя чырвоныя паскі чаргаваліся з белымі фонавымі, называліся «скразявымі». Вядомы этнограф М. Я. Нікіфароўскі пісаў: «На святочным адзенні паляшучак можна бачыць тканіну, выраб і апрацоўка якой могуць спрачацца з фабрычнымі, і не хочацца верыць, што яна зроблена таўстаскурымі пальцамі на грубым «кросінным ставу».

Значная ўвага ў ткацтве аддавалася ручнікам, якія акрамя свайго прамога прызначэння ігралі вялікую ролю ў вясельных і пахавальных абрадах, упрыгожванні хатняга інтэр'ера. Акрамя ператкання і вышыўкі яны звычайна ўпрыгожваліся вязанымі кручком ці плеценымі карункамі. Абрусы ткаліся звычайна ў чатыры ці ў восем нітоў у бела-шэрай каляровай гаме, клятчастым узорам (у шашкі). Яны сшываліся з двух полак ажурным швом (прошвай) або пасярэдзіне ўшывалася паласка карункаў.

Асобнае месца адводзілася вырабу посцілак і полагаў. Да пачатку XX ст. сярод посцілак пераважалі 4-нітовыя клятчастыя саржавага і жакардавага перапляцення, у якіх узор ствараўся каляровым утком па чорнай аснове. У якасці коўдры выкарыстоўвалася «дзяруга», вытканая «ў рады» 4-нітовай тэхнікай. У пачатку XX ст. пры ператканні і перабіранні пачалі выкарыстоўваць чырвоныя фабрычныя ніткі (бель, забалаць). У гэты час пачынаецца выцясненне самаробнага сялянскага адзення фабрычнымі вырабамі.

Старадаўняе традыцыйнае адзенне сялян, народны касцюм і ткацтва перасталі насіць дамінуючы характар у 30-х гадах XX ст. Аднак у час Айчыннай вайны і пасля яе ткацтва адрадзілася ў сваіх прасцейшых формах, пакуль прамысловасць не пачала забяспечваць сялян тканінамі і вопраткай. Калі патрэба ў даматканых тканінах адпала, народнае ткацтва набыло мастацкі напрамак і пачало развівацца як галіна народнай мастацкай творчасці. Асаблівых поспехаў ткачыхі Петрыкаўскага раёна дасягнулі ў 50—70-я гады ў вырабе дэкаратыўных тканін. Дэкор посцілак і дываноў складваўся на працягу першай паловы XX ст., што звязана з павышэннем іх ролі ў аздабленні інтэр'ера. Посцілкамі засцілалі ложкі і куфры, скарыстоўвалі ў якасці дывана. Яны набывалі яркі каларыт, у якім спалучаліся ад трох да дзесяці колераў, развівалася і ўскладнялася арнаментыка, мянялася сыравіна. Асноўным матэрыялам для ткання сучасных дываноў і посцілак з'яўляюцца белыя і чорныя льняныя, а таксама рознакаляровыя шарсцяныя, шаўковыя і сінтэтычныя ніткі.

Аб высокім мастацкім гусце і ткацкім майстэрстве ткачых Петрыкаўскага раёна сведчыць удзел іх у многіх рэспубліканскіх і міжнародных выставах, дзе посцілкі, дываны і дарожкі Ульяны Туравец з в. Лясковічы, Валянціны Лаворчык з в. Бобрыкі, Вольгі Загорац з в. Забродзе і многіх іншых былі адзначаны прэміямі, дыпломамі і граматамі.

Грамадскі і сямейны побыт

Традыцыйны сялянскі быт вызначаўся цыклічнасцю земляробчай працы і быў цалкам ёй падпарадкаваны. Уся гаспадарчая дзейнасць селяніна строга прыстасоўвалася да пэўных дат народнага сельскагаспадарчага календара і суправаджалася строгай сістэмай звычаяў, абрадаў, павер'яў.

Каляндарна-абрадавыя святы ўзніклі ў сівой мінуўшчыне, карані іх узыходзяць да магічных дзеянняў, накіраваных на тое, каб вызваць урадлівасць зямлі, рост хлябоў, прыбытак хатняй жывёлы. З прыняццем хрысціянства гэтыя святы істотна змяніліся і многія з іх прыстасаваліся да царкоўных свят, такіх, як Ражство, Вялікдзень, Сёмуха і інш.

Першым у гадавым крузе старажытных народных свят былі Каляды, якія пачыналіся з Ражства (24 снежня па ст. ст.) і цягнуліся да Вадохрышча

(7 студзеня). Каляды азначалі пачатак новага гаспадарчага года і асноўны магічны сэнс каляднай абраднасці звадзіўся да жадання забяспечыць добры ўраджай у наступаючым годзе і стварыць спрыяльныя ўмовы для павелічэння статка хатняй жывёлы. Гэта свята завяршала доўгі Піліпаўскі пост і праходзіла ў адносна спакойны для селяніна перыяд, калі асноўныя сельскагаспадарчыя работы былі закончаны. Да Каляд прыберагалі каўбасы, кумпякі, сыры. Самыя неабходныя гаспадарчыя справы рабілі днём, усе вечары лічыліся святымі. У гэты час моладзь ладзіла вячоркі з танцамі і гульнямі, якія цягнуліся амаль да раніцы.

Галоўным кампанентам каляднай абраднасці было хаджэнне са «звяздой», абход моладдзю двароў са святочна-велічальнымі песнямі і карнавальна-рытуальнымі гульнямі-паказамі (ваджэнне «казы», «мядзведзя», «жорава», «кабылы»). У сваіх песнях яны славілі гаспадароў і іх дзяцей, жадалі ім здароўя, усялякага дабрабыту. За гэта іх шчодра адорвалі хлебам, кавалкамі сала і каўбас, грашыма і г. д. Дзяўчаты варажылі, стараючыся пазнаць свой лёс і суджанага. Сталыя людзі пасля наведвання царквы хадзілі да сваякоў або прымалі гасцей у сябе.

Пасля Каляд на вячоркі ўжо не збіраліся. У хатах ладзілі кросны і ў Велікодны пост пачыналі ткаць, размяркоўваючы працу так, каб да Вялікадня саткаць усё, што было напрадзена.

Веснавы цыкл каляндарнай абраднасці пачынаўся з «гукання вясны». На Еўдакею (1 сакавіка ст. ст.), Соракі (9 сакавіка), Благавешчанне (25 сакавіка) групы дзяўчат з сонечных высокіх пагоркаў і стагоў пераклікаліся з хлопцамі кароткімі песнямі-вяснянкамі, у якіх клікалі вясну, наладжвалі вясёлыя ігрышчы, вадзілі карагоды.

Галоўным веснавым святам быў Вялікдзень. Пасля сямітыднёвага посту і цяжкай працы селянін зноў мог павесяліцца, з'ездзіць у госці ці на кірмаш, наведаць царкву. У Вялікдзень моладзь з валачобнымі песнямі абходзіла двары, вадзіла карагоды, гойдалася на арэлях, катала крашаныя яйкі.

На Сёмуху (Духа) сяляне ўпрыгожвалі хаты зялёнымі галінкамі ліставых парод дрэў, усцілалі падлогу аерам. На духаўскім тыдні дзяўчаты плялі вянкі з лугавых кветак і ішлі ў лес «завіваць» бярозкі. А праз тыдзень з песнямі ішлі развязваць вяршаліны звязаных дрэў («каб дрэва не праклінала»). Кожнае абрадавае дзеянне мела свой магічны сэнс, які з цягам часу забыўся і ў канцы XIX — пачатку XX ст. моладзь успрымала іх толькі як абавязковую ў гэты дзень традыцыю, забаву.

Аснову летняга цыкла каляндарнай абраднасці складала святкаванне Купалля, Пятрова і Ільліна дзён. Асаблівае ўрачыста было прынята святкаваць Купалле, якое прыходзіла на перыяд летняга сонцастаяння. Гэты дзень у беларусаў быў акружаны мноствам легенд, звычаяў, абрадаў і земляробчых павер'яў. Сутнасць гэтых легенд і павер'яў заключалася ў тым, што нібыта ў купальскую ноч ведзьмы, чэрці і іншыя злыя сілы маглі пашкодзіць чалавеку, хатняй жывёле, пасевам.

Каб ачысціцца і аберагчыся ад нячыстай сілы, ноччу перад Купаллем на ўзгорку раскладвалі вогнішча са старых венікаў (дзеркачоў), паламаных калёс і іншага друзу, палілі чучала ведзьмы і скакалі праз агонь. На досвітку качаліся ў расе. Дзяўчаты плялі з кветак і магічных траў вянкі і пускалі іх па рацэ, каб угадаць сваю долю; рвалі зубамі падарожнік, тады, па павер'і, ноччу павінен быў сасніцца будучы муж; уставалі на Купалле на досвітку («калі сонца грае»), і, ні з кім не гаворачы, беглі да плота і абхоплівалі яго рукамі. Лічылася, што калі абхваченыя колікі цотныя — дзяўчына пойдзе ў гэты год замуж. З гэтай жа мэтай купальскай раніцай беглі да суседкі ў хату і чакалі, што яна скажа. Калі першым словам было «ідзі» — быць вяселлю, калі «сядзь» — яшчэ год «сядзець у дзеўках» і г. д.

Пасля Пятра наступала пара сенакосу, а затым жніво, пачатак якога (зажынкі) таксама суправаджаліся мноствам павер'яў і магічных дзеянняў, а першы зжаты сноп урачыста ўстанаўліваўся на покуці пад абразамі. Восеньскі цыкл уключаў абрады ў дзень заканчэння жніва (дажынкі) і ўсіх палявых работ, святкаванне царкоўных свят — Спаса, І-й і ІІ-й Прачыстай, Узвіжання, Пакрова.

Такім чынам, абрадавы бок каляндарных свят заўсёды складаўся з нейкіх магічных дзеянняў, заклінанняў, ахвярапрынашэнняў, якія павінны былі, згодна народным вераванням, забяспечыць поспех у працы і аберагчы сям'ю і жывёлу ад заганы. Аднак ні адно свята не заканчвалася абрадамі. Пасля іх ішлі масавыя гулянні з адпаведнымі для кожнага свята песнямі, гульнямі, карагодамі, танцамі, у якіх кожны быў выканаўцам і гледачом папераменна.

Сямейны быт селяніна таксама вызначаўся традыцыяй. Калі сям'я была поўнай, яе галавой заўсёды быў мужчына. Ён прадстаўляў сям'ю на сельскім сходзе, быў распарадчыкам гаспадарчых работ і сямейнай касы. На руках гаспадыні былі ўсе хатнія работы: прыгатаванне ежы, догляд за дзецьмі і хатняй жывёлай, ткацтва і шыццё адзення на ўсіх членаў сям'і. Разам з тым яна была памочніцай мужа ў полі, на сенакосе і малацьбе. Усё гэта абумовіла яе амаль раўнапраўны ўдзел у вырашэнні ўсіх важных спраў сям'і.

Узаемаадносіны членаў сям'і рэгламентаваліся звычаёвым правам. Дзеці паважалі бацькоў, малодшыя слухаліся старэйшых, а тыя клапаціліся і аберагалі малодшых. Непаслушэнства і непадпарадкаванне бацькам рэзка асуджалася грамадскай думкай.

За стол садзіліся толькі пасля бацькі, які займаў самае пачэснае месца, на покуці. За ім з аднаго боку садзіўся бацька гаспадара, старэйшы сын і потым у строгай паслядоўнасці па старшынству ўсе прадстаўнікі мужчынскай паловы сям'і, з другога боку — жаночай. Гаспадыня ж садзілася з краю, так як ёй трэба было падаваць і ўбіраць са стала. Ніхто не меў права прыступіць да яды раней за гаспадара.

За вячэрай гаспадар звычайна размяркоўваў, каму якую работу рабіць на наступны дзень. Бацькавы распараджэнні з'яўляліся абавязковымі для дзецей, якіх з малых год прывучалі да працы. Ад бацькоў і старэйшых яны пераймалі працоўныя навыкі і ў 13—15 год як хлопчыкі, так і дзяўчынкі ўмелі рабіць усе асноўныя сялянскія работы.

У асенне-зімні перыяд мужчыны займаліся промысламі, возніцтвам, ганчарствам, высечкай лесу, рыбалоўствам і паляваннем. Жанчыны і дзяўчаты, пасля таго як выпальвалі печ, збіраліся да каго-небудзь з суседзяў на попрадкі. Тут жа гатавалі ежу, абедалі і пралі да вечара. Вечарам сталыя жанчыны ішлі дадому, а да дзяўчат завітвалі хлопцы з гармонікам ці скрыпкай і тады праца адкладвалася. Танцавалі польку, «Суботу», «Нарэчаньку», «Войру», «Каробачку», «Васадулю», «Кадрэль». Гулялі ў «Рэпіцу», «Матроса», «Заіньку», танцы змяняліся песнямі, гульнямі. Тут жа, у гаспадара, часта заставаліся начаваць. На падлогу клалі саламяныя маты, якія накрывалі дзяругамі, світамі, старой адзежай. Дзяўчаты і хлопцы спалі разам, і рэдка хто адважваўся пераступіць маральна-этычныя нормы... Нягледзячы на цяжкую працу, сяляне заўсёды давалі магчымасць моладзі «пагуляць», «нагуляцца». Дзяўчаты гадоў з 15 пачыналі хадзіць на вячоркі, прымаць удзел у святочных ігрышчах, абрадах і забавах моладзі.

Своеасаблівую і вельмі цікавую частку беларускай народнай культуры складалі гульні, якія падзяляліся на дзіцячыя, падлеткавыя, маладзёжныя і дарослыя. Гадоў да сямі дзяўчынкі і хлопчыкі гулялі разам: бегалі навыперадкі, куляліся з пагоркаў, гулялі ў хованкі, пяклі з гліны ці пяску «бліны» і рабілі «хаткі», з чурбачкоў і анучак — лялькі.

Пасля ўступлення ў шлюб маладыя — мужчыны і жанчыны ўжо не наведвалі вячоркі і гулянкі моладзі. Мужчыны часам мераліся спрытам і сілай (гнулі падковы, паднімалі цяжкія мяхі, ламалі тоўстыя палкі, бароліся і г. д), разгадвалі на пары загадкі. Пройгрышы пераводзілі на грошы, кварты гарэлкі.

Захавалася толькі малая частка народных гульняў спартыўнага характару (лапта, гарэлкі, чыжы). Гульні-паказы, страціўшы свой магічны сэнс, існуюць у асноўным толькі ў другасных, сцэнічных варыянтах у рэпертуары самадзейных фальклорных калектываў.

В. М. Бялявіна

РЫМШАВА ГАРА

(легенда)

У вёсцы Навасёлкі Капаткевіцкага раёна з пакалення ў пакаленне перадаецца паданне пра гордага і смелага хлопца Рымшу.

Было гэта яшчэ ў часы панщчыны. Злыя былі паны. Не людзі, а звяры. Асабліва лютаваў пан у маёнтку недалёка ад Навасёлак. І што толькі ён не тварыў. Страх як з сялян здзекаваўся. А сваіх мужыкоў і за людзей не лічыў.

Загадаў раз гэты пан, каб усе, у каго былі валы на продаж, прыводзілі іх толькі да яго, на панскі двор. Загадана — нічога не зробіш: у пана ўлада. І павялі сяляне да яго сваіх валоў. А пан выйдзе на ганак, паглядзіць і кажа:

— Што гэта ты прывёў, асёл? Гэта ж не вол, а казёл.

І плаціў, як за казла. А хто спрабаваў пярэчыць — таго пасылаў на стайню і даваў бізуноў.

Доўга мучыліся людзі з такім панам, доўга цярпелі, а паскардзіцца няма каму. Паны ж усюды тады сядзелі — і ў маёнтках, і ў судах.

Але знайшоўся нарэшце адзін чалавек, што адплаціў пану за ўсе людскія крыўды і слёзы. Быў гэта Рымша — прыгожы, горды хлопец. Прывёў ён раз на панскі двор вала прадаваць. Выйшаў пан на ганак і кажа:

— Што гэта ты прывёў, асёл? Гэта ж не вол, а казёл.

Схапіў тады Рымша здаравенную жардзіну і пытаецца:

— Што гэта, пан, бяроза ці лаза? Я ж табе прывёў вала, а не казла. — І давай пярэсціць пана жардзінай. Б'е і прыгаварвае: — Вось табе за тое, што ты з людзей здзекуешся. А калі ачуняеш, чакай мяне яшчэ ў госці.

Толькі на трэці дзень апрытомнеў пан. Пачалі шукаць Рымшу, а таго і след прастыў.

Не раз яшчэ прыходзіў Рымша да пана, не раз помсціў яму за людзей. І, кажуць, хаваўся ён на гары між Заполлем і Навасёлкамі. Да гары той цяжка было падступіцца. Наўкола — непраходныя балоты і хмызняк. Адзін толькі Рымша ведаў туды патаемную сцежку.

І дагэтуль стаіць тая гара. Людзі завуць яе Рымшавай.

З кнігі «Дрэва кахання».

Спынюся каля Рымшавай гары.
Здарожаны, прысяду пад сасною.
З мінулым пачынаю гаварыць,
Яно спрабуе гаварыць са мною.

Злажылі крылы сінія вятры
І цішыня на дыбках падступае.
Кастром заранак памяць не згарыць
За небакраем песеннага мая.

Урочышча Рымшава гара каля в. Навасёлкі. Старадаўняе гарадзішча

Адвечна чую кліч дрыгавіча
Над пусткамі балот з лазою ніцай.
Чужынцаў лёс — на вайстрыні мяча,
Спапелены кальчужнай бліскавіцай.

Квітнець Айчыне полымем садоў.
Жыве твая крылатая Пагоня...
Схіляюць галаву слупы вякоў,
І звон капыт агністагрывых коней...

Міхась Селех

ОТ МОЗЫРЯ ДО ТУРОВА

Мозырщина — часть западно-русского Полесья, охватывающего весь Мозырский уезд Минской губернии с принадлежащими ему старинными местечками, из которых многие некогда в древности были известными укрепленными городами, отмеченными в истории удельных западно-русских княжеств, татарских наездов и польского владычества. Таковы — Туров, Скригалов, Снядин, Давид-Городок и Петриков...

...По мере удаления парохода от Мозыря берега Припяти все более и более закрывались тенистыми кустарниками можжевельника и сосняка, постепенно сменявшимися густым лесом, превратившимся, наконец, в самые глухие, не тронутые рукою человека чащи гигантских, толстейших дубов, которые народ называет столетними. И действительно, дубы огромных размеров — трем человекам с трудом обхватишь; и все эти дубы стоят целыми семьями на высоких, постоянно перемежающихся горах, нередко окаймленных рыхлыми болотистыми топями; между тем берега Припяти все ниже и ниже становятся, так что при такой только низменности берегов понятен тот страшный разлив вод, которыми наполняются прибрежные лесные местности. Но вот, наконец, на самом близком расстоянии выглянуло местечко Петриков, разбросанное в живописном беспорядке на обрывистом берегу Припяти. Местечко расположено на высокой горе, все здания деревянные, и церковь и костел архитектуры незавидной. Петриков принадлежит владельцу князю Горскому-Ходкевичу, предку старинной литовской фамилии, последние представители которой считались виленскими каштелянами; тут есть торговая пристань для местных суден, торговля производится деревом и рогатым скотом, особенно во время ярмарок, которыми богато местечко. В Петрикове когда-то был укрепленный замок с бастионами и временным гарнизоном слуцкого князя Юрия Олельковича, знаменитого родоначальника древней западно-русской династии в Слуцком княжестве; Петриков составлял некогда поветовый городок слуцкого удела князей Олельковичей, а от них, по праву родства в женской линии, перешел к Ходкевичам. Пароход остановился в Петрикове на всю ночь для нагрузки кож, и я поспешил воспользоваться свободным временем, чтобы побродить по ближайшим лесам и курганам местечка. Это было под вечер, солнце клонилось к закату. Я обходил почти все ближайшие чащи дубов и пробирался к пристани, как вдруг поражен был в самом глухом месте леса страшным заревом; мне показалось — не пожар ли в местечке, но, подходя ближе к огню, увидел совсем другое. На высоком, почти квадратном кургане, — кто знает, не древнего ли какого-нибудь исторического происхождения, толпа поселян и поселянок кружилась, приплясывала и пела при пылавшем костре из хвороста и ветвей.

«Что такое у вас?» — спросил я одну поселянку.

«Купалу справляем», — наивно отвечала молодая девушка.

Купалу?.. Тут я вспомнил, что попал на народный праздник языческого происхождения, известный в великорусских деревнях под именем Иванова дня. В западно-русском краю этот день называется Купалой в память древнего языческого славяно-русского божества Купалы, покровителя цветов и плодов, от которого выродился в простонародье праздник, совершаемый накануне Иванова дня, 23 июня.

Посреди кургана прикреплен был в углублении длинный деревянный шест, весь обитый зеленью, на верхушке его привязано несколько венков из цветов и березовых ветвей. Этот шест изображает бога Купалу; его приносит обыкновенно молодая, красивая девушка, называемая по этому случаю купальницей. Купальница тоже вся покрыта с ног до головы зеленью и цветами, с венком на голове. Она обязана воткнуть в яму шест, а прочие подруги — вокруг шеста — на незначительном расстоянии от него (чтоб не сгорел прежде времени) набрасывают хворост, ветки и венки из свежих и сухих трав. Все это приготовляется до заката солнца. Как только скроется солнце, купальница с завязанными глазами садится в яму, хоровод девиц и парней кольцом кружится вокруг ямы и шеста с разными припевами. Между тем купальница без разбора вынимает из ямы венки и раздает их подругам. Если которой девице попадется венок из свежих цветов, это значит — быть ей счастливой и богатой замужем. Если же достанется венок из сухих трав — это значит, девица будет несчастна и бедна замужем. По окончании гаданий парни бросают солому и лесной хворост в яму и зажигают их, а чтоб иллюминация купальная продолжалась, — подбавляют сухих прутьев и листьев до тех пор, пока не угомонится праздничная пляшущая компания. К концу сгорает и самый шест...— С этим обрядом соединяются довольно забавные народные поверья. Думают, что купальная ночь полна необыкновенных происшествий; верят, будто в ту ночь веселится и пляшет весь свет... Главное веселье происходит на Лысой горе, где ведьмы справляют торжественный шабаш; на этот шабаш должны съехаться все ведьмы и подвластные им чаровницы и чаровники; оттого-то в купальную ночь не оставляют лошадей на пастбищах в полном убеждении, что какой-нибудь ведьмарь или колдун непременно уедет на самом лучшем коне. Мельники отправляются на лодках по реке и привораживают

рыб на зло рыбакам, которые в эту ночь получают какое-то особенное прозрение от необыкновенного отсвета на озерах. Этот отсвет будит уток и других речных птиц, которые весело перекликаются своим птичьим говором. Деревья пляшут и переходят с одного места на другое; разговаривают между собою посредством шума листьев и ветвей. Чтоб понимать этот разговор, нужно найти цветок папоротника и носить его в сапогах или в лаптях. С папоротником ищут кладов и уверены, что находят: остановка только за цветком...

П. Шпилевский. Мозырщина. 1859 г.

Асветніца, пісьменніца з Камаровіч

Эма Яленская - Дмахоўская (н. 29.2.1864 г. у в. Камаровічы) — асветніца, вядомая беларуская фалькларыстка і этнограф, польскамоўная пісьменніца і драматург. Разам з маці да 1890 г. жыла ў Камаровічах, затым пераехала ў Вільню, але ніколі не парывала сувязі з радзімай. Маці бачыла здольнасці Эмы і прыклала ўсе намаганні, каб яна змагла набыць веды за мяжой.

Яленская з юнацтва цікавілася грамадскімі, нацыянальна-вызваленчымі праблемамі, што наклала адбітак на ўсё жыццё. Пад уплывам Яна Карловіча і Зыгмунта Вольскага яна захапілася побытам і духоўнай культурай беларускага народа. Жыццёвы лад і вусная паэзія палескіх сялян былі тым вытокам, з якога пачалася фальклорна-этнаграфічная, літаратурная, палітыка-асветніцкая яе дзейнасць. Яленская запісала 11 сшыткаў народных песень, склала два рукапісныя зборнікі казак, якія ўключалі 62 творы і былі выдадзены пад назвай «Беларускі казачны эпас». Асноўнай этнаграфічнай працай Яленскай-Дмахоўскай з'яўляўся выдадзены ў 1891 г. у часопісе «Вісла» этнаграфічны нарыс «Вёска Камаровічы», у якім яна грунтоўна падала багатыя апісанні матэрыяльнай і духоўнай культуры палескіх сялян. Гэтаму быў прысвечаны і артыкул «У палескай вёсцы», які быў надрукаваны ў 1895 г. у французскім часопісе «Традыцыя». Там былі змешчаны таксама ў перакладзе на французскую мову 8 беларускіх песень.

Яленская-Дмахоўская займалася літаратурнай дзейнасцю. Яе прыцягвалі традыцыі Баляслава Пруса і Элізы Ажэшкі. Пакінула цэлы шэраг літаратурных і драматычных твораў. У 1897 г. за аповесць «Паненка» атрымала першую ўзнагароду на конкурсе імя Баляслава Пруса. У 1903 г. на конкурсе драматургіі імя Генрыка Сянкевіча была адзначана драма Яленскай-Дмахоўскай «Сын», якую ставілі ў тэатрах Вільні і Лодзі. Ёю былі напісаны кнігі «Матка», «Двор у Галінішках», «Ад кахання», зборнік навэл «Бацяны», п'есы «Крыўда» і «Хвіля».

Яленская-Дмахоўская шмат сіл аддавала грамадскай і асветніцкай дзейнасці. Яна стварала рухомыя бібліятэкі, арганізоўвала школы і сама выкладала ў іх, дапамагала настаўнікам маральна і матэрыяльна. Праводзіла навучанне народных настаўнікаў, клапацілася аб рыштунку для навакольных школ. Рэдагавала часопіс, з-за зместу сваіх артыкулаў неаднаразова трапляла ў канфлікты з цэнзурай і паліцыяй. Выданне часопіса закончылася яго закрыццём і працяглым палітычным судовым працэсам. Яленская-Дмахоўская ў 1911 г. была прыгаворана да двухмесячнага турэмнага зняволення.

У час нямецкай акупацыі Эма Яленская-Дмахоўская была звязана з так званым Адукацыйным камітэтам, з'яўлялася заснавальніцай і прэзідэнтам Патрыятычнага саюзу полек.

Памерла Эма Яленская-Дмахоўская 24 кастрычніка 1919 г.

М. К. Багадзяж

Прыляцела ластаўка — чэ-чэ-чэ,
Села ў оконца, шчабеча:
— Скажу, табе, Марыська, я весці,
Ужо твой Ясенька на дварэ
Пытаецца ў ойчанька пра цябе.
Яшчэ з коніка не ссядаў,
Ужо свёкратку паклон даў:
— Чы дома дзеванька Марыся-душа,

Яна для мяне адна хараша.
Сем вёсак у тыдзень аб'ездзіў,
Да так ні адной ні злюбіў,
Як тваю дочаньку Марысеньку
У том касцёлку ў ляску.
Яе чорныя вочы, белае ліцо,
З валашачкі вянок,
Жоўты паясок.
Не разлучыць са мной яе ніхто,
Як жоўты пясок.

Запісана ў Грабаўскай вол.
Мазырскага пав.

...На Брестско-Брянской железной дороге, построенной в 1886 г., находится ст. Копцевичи, грузящая до 350 тыс. пуд. лесных грузов. Верстах в 13 к ю.-з. от Копцевич на р. Припять лежит с. Дорошевичи. Имение Дорошевичи, как и лежащее к востоку от него с. Снядинь, некогда принадлежало иезуитам, а с конца XVIII ст. — Кеневичам. Здесь сохранился архив и много художественных произведений. На р. Припять в Дорошевичах есть пристань, но особенного значения она не имеет...

В 33 в. за Копцевичами на Брестско-Брянской железной дороге находится ст. Птичь при одноименной реке, грузящая до 750 тыс. пуд. лесных и отчасти хлебных грузов. К северу от ст. Птичь верстах в 15 расположено на р. Птичь довольно крупное местечко Копаткевичи, или Копатковичи, в котором есть паромная переправа и водяная мельница. В прежнее время Копаткевичи были королевским имуществом, а потом были отданы на ленное владение Еленских. Здесь есть православная Покровская церковь, построенная прихожанами, а раньше был и деревянный католический костел, построенный помещиком Еленским в 1796 г. В 1863 г. Копаткевичи были секвестированы, а в 1869 г. пожалованы генералу Цилову. Выше м. Копаткевичи, по направлению к северу, невдалеке от р. Птичь, лежат на битой дороге деревни Заречка, Копцевичи, Лучицы и некоторые другие. Копцевичи и Лучицы служат весной временными пристанями, с которых отправляются лес и другие лесные материалы...

В Мозырском уезде бондарный промысел существует в вол. Копаткевичской... Больше всего занимаются кустари изделием сох, а также борон, лопат и разных принадлежностей для обработки полей в ... Копаткевичской вол. Плотники широко встречаются в Минской губернии в Мозырском уезде, в вол. Копаткевичской.

В 20 верстах к востоку от Дорошевич вниз по Припяти... древнее местечко Петриков. По преданию, оно получило название от имени своего основателя. Надо полагать, что Петриков перешел во власть кн. Олельковичей не ранее конца XV в. В Петрикове существовала крепость, построенная князем Юрием Олельковичем. В 1572 г. местечко досталось в удел Александру, сыну Юрия, прославившегося победой над татарами под Руткой, а в XVII в. перешло по женской линии к гр. Ходкевичам. Петриковская крепость просуществовала недолго: в 1535 г. во время войны в. кн. Василия IV с Сигизмундом войсками под предводительством кн. Овчины-Телепнева-Оболенского она была уничтожена; позже еще дважды казаки под предводительством Наливайки разоряли Петриков — в 1595—1596 гг. и в 1776 г. Ходкевичи исхлопотали себе привилей у короля Станислава-Августа, на основании которого и в настоящее время в Петрикове собираются большие ярмарки для продажи и покупки крупного рогатого скота, лошадей, рыбы и разного домашнего имущества — 20 июля и 1 октября. В Петрикове есть деревянный костел Благовещения, построенный в 1638 г. Криштофом Ходкевичем и женой его Софьей, две православные церкви, из которых одна — Воскресения, построена в 1846 г., а другая — приходская св. Николая, бывшая униатская, существует с 1772 г. В местечке имеется также сельская школа, становая квартира и еврейская синагога. Имение Ходкевичей включает 720 волок хорошей земли и много лугов, винокуренный завод и мельницы. Значительный доход местечку дает рыболовство. В Петрикове насчитывается 400 дворов и свыше 3000 жителей, которые занимаются главным образом сапожничеством; вообще они отличаются промышленным и предприимчивым характером; многие из них имеют свои берлины и возят на них лес, многие занимаются рыбной ловлей. Между жителями кроме евреев есть раскольники, которые переселились сюда во время Никона, патриарха московского. В Петрикове есть пристань на Припяти, на которой выгружаются пароходы, идущие снизу. Всех грузов, хлебных и лесных, отсюда отправляется до 100 тыс. пуд., а прибывает до 30 тыс. пуд.

Россия. Полное географическое описание нашего Отечества (Под ред. В. П. Семенова). 1905 г.

Камаровічы

Вёска знаходзіцца ў паўночна-ўсходняй частцы Мазырскага павета, у самой глыбі так званага Палесся, сярод пушчаў, пяскоў і балот. Узнікла гэтае пасяленне, відаць, калісьці яшчэ на тэрыторыі старадаўніх драгавічанаў, вельмі даўно, аб чым сведчаць і могілкі, якія год таму назад вывучаў прафесар Завітневіч з Кіева, і якія, паводле яго вызначэння, бяруць свой пачатак прыкладна з VIII або IX ст[1]. У XVI ст. Камаровічы ўваходзілі ў склад уладанняў князёў Алелькавічаў Слуцкіх, а пасля распадзення іх на дробныя часткі пераходзілі з рук у рукі, пакуль не даста-

[1] *Завитневич В. З.* Из археологической экскурсии в Припятское Полесье. Киев, 1890.

ліся ў пачатку XVIII ст. польскай шляхецкай сям'і, якая валодае гэтымі землямі і цяпер. У выніку розных змяненняў, асабліва ў выніку распараджэнняў уладальніка Камаровіч, даўнейшы выгляд і воблік вёскі змяніўся. Старыя людзі памятаюць, як Камаровічы былі адной доўгаю вуліцаю, пасярэдзіне якой быў панскі двор. Потым, відаць, калі людзей стала больш, вёска падзялілася на дзве часткі і абедзве адступілі ад двара, можа, дзеля таго, каб мець болей поля. Такім чынам, цяпер існуюць дзве асобныя вёскі: адна Камаровічы, а ў паўвярсце ад двара — там знаходзіцца дом праваслаўнага святара і некалькі хацін, заселеных колішнімі панскімі слугамі і іх нашчадкамі, — другая, Заполле, на большай адлегласці ад панскіх будынкаў і аддзеленая грэбелькаю, большая за Камаровічы. Там знаходзіцца «воласць», школа і дом фельчара са шпіталем. Паміж жыхарамі Заполля і Камаровіч няма ніякай розніцы ні ў мове, ні ў звычаях, людзі ладзяць паміж сабой, жывуць у прыязні і згодзе, разам прыходзяць на работу, жэняцца, не разбіраючы, хто з якой вёскі. Спытайце селяніна: «Адкуль ты?» Спакойна адкажа, чухаючы галаву: «А камаровіцкі, паночку», альбо: «Адкуль жа? З Заполля».

Камаровіцкая воласць даволі вялікая. У яе ўваходзяць 13 вёсак: Камаровічы, Заполле... Галоўчыцы, Філіпавічы, Ванюжыцы, Навасёлкі, Гурыны, Млынок, Бобрык, Фаставічы. Паколькі ўсе воласці ў імперыі і Заходніх губернях маюць самаўладдзе, выбіраюць «старшын», «сотнікаў» і г. д., у суседніх воласцях старшынёю прызначылі самага нядбайнага гаспадара, бо з такім заўсёды лягчэй дамовіцца, менш будзе пільнаваць за парадкам, больш людзі атрымаюць свабоды. У Камаровічах атрымалася наадварот: старшыня мужык даволі малады, інтэлігентны, былы салдат, суровы, але справядлівы. Лепшым довадам кемлівасці тутэйшых сялян з'яўляецца той факт, што выбіраюць яго ўжо ў чацвёрты раз... Да бліжэйшай станцыі Капцэвічы Гомель-ска-Пінскай чыгункі вёрст 35, да павятовага горада Мазыра больш 80 вёрст. Бліжэйшае мястэчка — бедныя, непрыглядныя Капаткевічы, вёрст 5 да яго, заселенае пераважна яўрэямі і некалькімі сем'ямі рамеснікаў-хрысціян. Там ёсць пошта, аптэка, нядаўна прыехаў лекар. Акрамя таго, была яшчэ каталіцкая парафія і пробаства, але ўжо некалькі год, як пробашч памёр і пасля яго смерці месца засталося свабодным, а касцёл перайшоў пад управу мазырскага дзяка.

Такім чынам, вёска Камаровічы, можна сказаць, знаходзіцца ў самым цэнтры глухамані. Сувязь са знешнім светам, акрамя валасной пошты, якая дастаўляе лісты і пісьмы 2 разы ў тыдзень, вельмі складаная. Дрэнныя дарогі, летам пяскі, а ўвосень і вясною непраходныя балоты ў вёсках і на грэблях з'яўляюцца яшчэ прычынаю таго, што жыхары жывуць самі сабою, адасоблена, па сваіх законах і не цікавяцца тым, што робіцца там недзе, па-за імі. У свядомасці паляшука, які нарадзіўся ў сваёй вёсцы, вырас у вузкім коле сваёй сям'і і суседзяў, пражыў сярод іх усё жыццё, астатні свет уяўляецца як нешта не зусім рэальнае, крыху нават казачнае, дзівоснае, і ў якое можа паверыць толькі наіўны чалавек. Нават з пункту гледжання водных шляхоў зносін, якімі так шырока карыстаюцца на Палессі, Камаровічы не могуць пахваліцца. У трох вярстах ад вёскі цячэ рака Арэса, якая ўпадае ў Пціч, але як водны шлях можа служыць толькі вясною, калі яе воды шырока разліваюцца і па ёй могуць ісці нават вялікія баркі. Летам месцамі яна амаль поўнасцю перасыхае і яе можна пераплыць і перайсці, абмінаючы віры і ямы. Цячэнне яе моцнае і хуткае, прыводзіла ў рух млыны, паўвека таму назад была тут паперня. Цяпер на беразе засталіся толькі сляды ад грэблі, рэшткі печаў ва ўрочышчы Рудня, дзе калісьці капалі жалезную руду.

Навакольныя балоты змяшчаюць вялікую колькасць жалезнай руды, выпальванне яе тут было галоўным промыслам. У Арэсы берагі нізкія, уздоўж іх цягнецца сасновы лес. Рэчышча даволі шырокае, з цікавымі паваротамі. Рачныя сажалкі, зліваючыся ў адну водную прастору, утвараюць пасярэдзіне рэчкі большыя або меншыя астравы, берагі пазарасталі магутнымі лазняка-мі і чаротам.

Вёска Камаровічы разбудавалася на пакатай раўніне. Па адзін бок цягнуцца роўнымі шнурамі сялянскія палі, па другі — вялікія плошчы забалочаных земляў.

Вёска Заполле амаль каля самага лесу, адным канцом кранаецца да яго і мае весялейшы выгляд. Мясцовасць гэта на Палессі наогул роўная, з балотамі, пакрытая рэдкім лесам, часта карлікавым, з пясчанымі палянкамі, на якіх акрамя дзядоў і бяссмертнікаў нічога не расце. Пры ўзыходзе і заходзе сонца паветра запаўняецца серабрыстым туманам, які ўздымаецца над балотамі і лугамі і засланяе неба... Тады чалавек адчувае сябе як бы адарваным ад усяго свету, выкінутым на бязлюдны востраў.

Палескія маёнткі адзначаюцца перш за ўсё вялікімі ўладаннямі... У даўнейшыя часы, пры паншчыне, гэта былі вялікія, багатыя памесці. Цяпер, пасля адмены прыгонніцкіх адносін, вялікія абшары зямель засталіся без дастатковай колькасці рабочых рук, лясы высечаны, не дагледжаны, пакінутыя былымі ўладальнікамі. Палескія маёнткі, бясспрэчна, маюць вялікую будучыню: багатая зямля, нягледзячы на невялікія ўраджаі, бясконцыя лугі, лясы — усё гэта пры добрай працы і капітале магло б прыносіць высокія працэнты. Малых маёнткаў адносна мала ў нашых краях. Тыя, якія ёсць, узніклі як маленькія фальваркі, дадзеныя былымі панамі сваім эканомам, лоўчым і г. д. за добрую службу. Новыя гаспадары за іх моцна трымаюцца. А вялікія маёнткі сапраўды вялікія. Не гаворачы ўжо пра такія магнацкія маёнткі, як Петрыкаўшчына Хадкевічаў, або ўладанні былых Радзівілаў, што належаць цяпер княжне Гогенлоэ, дзе ў звычайнага шляхціца больш 20 тыс. кв. дзесяцін.

Маёнтак Корчы, не ўлічваючы зямлі сваіх сялян, займае 1600 кв. дзесяцін. Суседзі заўсёды далёкія, вёска ад вёскі не блізка, край вельмі мала заселены. На поўдзень ад фальварка, які знаходзіцца больш-менш у цэнтры ўладанняў, праехаўшы 10 вёрст летняй дарогай, убачыце фальварак Галоўчыцы, а на поўнач, вёрст 12 — Бобрык... Вёскі тут добраўпарадкаваныя — Фаставічы, Хвастовічы. Далей ідуць багатыя ўладанні, якія засталіся яшчэ ад Радзівілаў, — Грабаў, Навасёлкі, Філіповічы, праз вёрст 15 — Ванюжыцы, уласнасць гаспадара з-пад Вільні; яшчэ чатыры мілі — і Лучыцы, што мяжуюць з Галоўчыцамі — даўняе ўладанне вядомага філантропа Напалеона Яленскага, цяпер купленае гаспадаром з-пад Масквы, Міхедавічам. Далей вёскі, якія не мяжуюць з Камаровічамі: Слабада, Ляскавічы, Капцэвічы, Чалюшчавічы, Дарашэвічы, Капаткевічы... Зносіны паміж вёскамі амаль адсутнічаюць. Яўрэі дапамагаюць падтрымліваць гэтыя сувязі: сярод вяскоўцаў ёсць людзі, якія за некалькі дзесяцігоддзяў не адлучаліся ад сваёй вёскі далей, як на пару вёрст. Цікаўнасць зусім не з'яўляецца рысай палешука, наадварот, ён моцна прывязваецца да сваіх родных вуглоў і неахвотна іх пакідае. Даволі рэдка выбіраюць сабе і жонку або мужа не ў сваёй вёсцы, а на ўсялякіх агульных зборах, калі даводзіцца сустракацца з жыхарамі суседніх аколіц і весак; іх узаемная непрыхільнасць заўважаецца ў жартах, кпінах і самім непрыйманні, супраціўленні і адрозненні сваіх ад чужых. Найбольш збіраецца людзей у Камаровічах пад час капання бульбы. У гэты час з навакольных і нават далёкіх вёсак на некалькі дзён прыбываюць на работу жанчыны і маладыя хлопцы. Збіраецца іх такім чынам да 300 работнікаў...

Эма Яленская-Дмахоўская, 1911 г.

Капаткевічы

Там, дзе Пціч робіць круты паварот на поўдзень, паміж лясоў і цяпер асушаных балот, раскінуўся гарадскі пасёлак Капаткевічы. Энцыклапедычныя даведнікі ўдакладняюць: за 35 км на паўночны ўсход ад Петрыкава, 63 км ад Мазыра, 179 км ад Гомеля і 18 км ад чыгуначнай станцыі Пціч на асфальтаванай дарозе Любань — Пціч, за 12 км ад бетоннай дарогі Калінкавічы — Брэст.

З даўніх часоў жывуць тут людзі: аруць, сеюць, даглядаюць жывёлу, ловяць рыбу... Старажылы Капаткевіч памятаюць старыя, па некалькі соцень гадоў ліпы, якімі была высаджана вуліца, што ішла ўздоўж Пцічы і вядома пад назвай Дамаха. Аб старажытнасці пасялення нагадвалі яшчэ ў канцы XIX ст. дзве групы курганаў. Адна з іх, да 15 насыпаў, знаходзілася каля балота ва ўрочышчы Гальца, за 2—3 вярсты на захад ад мястэчка, другая, з пяці курганаў, ва ўрочышчы Балотца. У 1889 г. тут праводзіў раскопкі вядомы беларускі археолаг, прафесар Кіеўскай духоўнай акадэміі У. Завітневіч. Ён раскапаў пяць курганаў у першай групе і два — у другой. Ва ўсіх былі знойдзены старажытныя пахаванні людзей.

Першае ўпамінанне пра Капаткевічы ў гістарычных дакументах сустракаецца ў актавых кнігах Мазырскага гарадскога суда. У іх прыведзены звесткі, што каралём Сігізмундам Аўгустам была пацверджана прывілея на сяло Капаткевічы, дадзеная ў 1568 г.

Што значыць назва пасёлка? У старажытных дакументах і ў літаратуры існуюць розныя формы гэтага найменння: Копаткевічы, Копатковічы, Копытковічы. Найбольш старажытнай з'яўляецца форма Капытковічы, г. зн. дзеці Капытка, ці Капыткі, затым гук ы асімілюваўся ў а — Капаткевічы (Копатковічы). Такім чынам, назва пасёлка звязана з патронімам Капыток ці Капытка.

У 1768 г. Капаткевічы аддадзены Рафаілу Яленскаму. У 1775 г. у адным з дакументаў падкрэслівалася, што Яленскія, «пакуль меч хопіць», павінны вечна валодаць Капаткевічамі разам з прылягаючымі землямі Касейска (Кашэвіч), Лучыц і Хойна (Хвойні). Была прызначана камісія для канчатковага вызначэння межаў уладанняў.

Пасля ўтварэння Мінскай губерніі (1795 г.) сяло называлася мястэчкам Капаткевічы, а побач узнікла вёска з такой самай назвай. У дакументах запісана: мястэчка і вёска Капаткевічы. Разам з вёскамі Івашкавічы (у дакуменце — Івашкевічы), Слабодка і Гарадзішча яны ўваходзілі ў склад маёнтка Капаткевічы Капаткевіцкай воласці Мазырскага павета. У 1861 г. памешчык Антон Паўлавіч Яленскі падаў на сялян маёнтка Капаткевічы ў суд за невыкананне імі інвентарных павіннасцей. 18 чэрвеня 1861 г. мінскі губернатар даносіў міністру ўнутраных спраў, што сяляне гэтага маёнтка, нягледзячы на ўгаворы міравога пасрэдніка, адмовіліся адбываць на карысць памешчыка павіннасці ў памерах, вызначаных інвентаром. Для навядзення парадку ў Капаткевічы была ўведзена 10-я рота Калужскага пяхотнага палка.

У 1863 г. успыхнула паўстанне пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага. Непасрэдным кіраўніком паўстанцкай арганізацыі Міншчыны стаў Антон Яленскі, той самы, які не так даўно судзіўся з сялянамі. 1 чэрвеня 1863 г. царскія ўлады арыштавалі яго і ў 1865 г. асудзілі на 15 гадоў катаргі ў Сібір. Апошнія гады жыцця А. П. Яленскі правёў у Кракаве. А. П. Яленскі быў пазбаўлены права валодаць Капаткевічамі, якія перайшлі ў царскую казну.

У мястэчку было адкрыта народнае вучылішча, якое размяшчалася ў грамадскім доме. На ўтрыманне вучылішча адпускалася 175 руб. з дзяржаўнага казначэйства і 80 руб. ад сялянскай грамады. У 1878/79 навуч. годзе ў вучылішчы займаліся 34 хлопчыкі і 3 дзяўчынкі: лічылася, што дзяўчатам

навука не патрэбна, іх удзел — хатняя гаспадарка. Настаўніцай працавала Марыя Шалковіч.

У 1868 г. імператар Аляксандр II аддаў Капаткевічы ў якасці ўзнагароды генералу М. І. Цылаву, вядомаму аўтару брашуры пра Зігмунта Серакоўскага. Генерал здаваў маёнтак у арэнду. Акрамя зямельных угоддзяў у яго былі два вадзяныя млыны і тры карчмы, якія таксама здаваліся ў арэнду і прыносілі ўладальніку прыбытак 1286 руб. у год.

З 1867 г. капаткевіцкія сяляне пачалі выкупляць свае зямельныя надзелы. Выкуп зацягваўся на многія гады. Дакументы сведчаць, што сяляне мястэчка і вёскі Капаткевічы ў колькасці 249 душ мужчынскага полу (102 двары) выкупілі 1039 дзесяцін зямлі і павінны былі выплаціць 9361 руб. срэбрам на працягу 49 гадоў. Селянін Іван Логвінаў, а потым яго дачка П. І. Логвінава за 21 дзесяціну зямлі на працягу больш за 36 гадоў выплаціла 76 р. 33 к. Аднак не ўсе сяляне маглі гэта зрабіць.

Адмена прыгоннага права садзейнічала развіццю ў Капаткевічах саматужных промыслаў. У мястэчку з'явіліся бандары, краўцы, шорнікі, кавалі, узніклі прыватныя лаўкі і шынкі.

У дакументах пад 1693 г. упершыню ўпамінаецца Капаткевіцкая царква. У 1796 г. пры ўдзеле памешчыка Яленскага быў пабудаваны драўляны касцёл, які належаў да мазырска-рэчыцкага дэканата. На пачатку 80-х гадоў XIX ст. акрамя царквы і касцёла ў мястэчку мелася сінагога. Тут ужываліся разам людзі розных веравызнанняў: праваслаўнага, каталіцкага, іудзейскага. У мястэчку налічвалася 140 дамоў, у якіх жылі 1500 чалавек...

А. В. Солахаў

* * *

Хай іншым дорыць глобус
чужыя астравы.
Вязі мяне, аўтобус,
у край той баравы,
дзе Пціч,
дзе Капаткевічы
сумуюць над вадой.

Там дзед,
у лодцы седзячы,
вяслуе барадой.
Б'юць дрыжыкі па скуры —
характарам размяк! —
У лодцы той панура
рагаціша вядзьмак.

Сівы і барадаты —
як дзеду, мабыць, год, —
за раніцу пад хатай
скапыціў агарод.
Вязе казла дзед.
Страшыць.
Такі прысуд казлу:
«Не хочаш добрай пашы,
пацерабі лазу!»

Хоць праклінаюць жонкі
хібарку ля ракі,
крыкліваю гамонкай
заняты дзецюкі.

А выветрыць кішэні
вясёлы «Вецярок»,
упрошваюць калені
звaліцца ў чабарок.

А там і дню спачынак
калышуць чараты
і вывадак качыны
кульгае ад вады.

І гэтак пахнуць зёлкі,
плывуць, як ад ракі
па вуліцах пасёлка
рагоў маладзікі.

Над цёплай азярынай
перамяшаў туман
гаркавінку каліны,
вугельчыкаў дурман.

Такая вокал ціша!
Чуваць,
як нейкі птах
пяром дзяркатым піша
паэму
у кустах...

Генадзь Пашкоў

Кашэвічы

Кашэвічы — вёска ў Лучыцкім сельскім савеце, адна з найбольш старажытных у раёне. Непадалёку ад яе знаходзіцца ўрочышча Селішча — відавочна, старадаўняе паселішча. Старажылы расказваюць такое паданне. Мірнае жыццё людзей было парушана нападам

татар, яны бязлітасна забівалі ўсіх мужчын, жанчын, старых. Дзяцей вораг забіралі ў рабства. І праязджала па гэтых месцах жонка знатнага начальніка. Яна заўважыла дым над комінам адной з хат, спынілася. Жанчына паліла ў печы, дзіця бавілася побач. Чужынка паімкнулася забраць малое. Жанчына выхапіла чыгун з варам і лінула ў твар няпрошанай госці, схапіла дзіця і кінулася бегчы. Назаўтра ворагі спалілі вёску дашчэнту. Сяльчане пакінулі абжытыя мясціны, падаліся на поўдзень, дзе і заснавалі Касевічы (да сярэдзіны мінулага стагоддзя вёска называлася Касейск).

У другім паданні пра Селішча гаворыцца так: «Цяпер там ніхто не жыве, а калісьці жылі людзі, таму і называецца — Селішча... Калі ішлі шведы, там людзі акопваліся, шведы іх не чапалі. Аднойчы быў такі выпадак. Зайшоў у хату чужаземец і загадаў гаспадыні гатаваць абед. Яна нагрэла кіпню і выліла яго на ворага... Як і татары, шведы былі вельмі паганыя: паложаць на лаву малых дзяцей, прыкладуць дошкай і душаць усіх разам».

У «Літоўскай метрыцы» ўтрымліваецца «Справа Макара Марціновіча і Андрэя Каліты і іх жонак з Грычынаю аб межах памесця Касевіцкага» ад 4 лістапада 1561 г., у якой ідзе рэч аб раздзеле Касевіцкага памесця паміж М. Марціновічам і А. Калітой з з Ф. Грычынаю.

У канцы XVI ст. за кіламетр на поўдзень ад Кашэвіч нехта Яўсей пабудаваў хату. Пазней з'явілася яшчэ некалькі будынін. Назвалі вёску Яўсеевічы. На ўзгорку сярод векавых дубоў паміж Яўсеевічамі і Касевічамі ў 1642 г. пабудавана Успенская царква. Яна складаецца з квадратнага асноўнага і амаль роўнага з ім па плошчы гранёнага алтарнага зрубаў. У 1868 г. да асноўнага зруба прыбудавана званіца. Драўляны будынак царквы захаваўся да цяперашняга часу.

Дакумент ад 27 снежня 1762 г. сведчыць: «Па прывілеі Караля Аўгуста III судзілі Вілкамірскаму Рахаілу Яленскаму па праву атрымання ў спадчыну гр. Феліксу Яленскаму маёнтак Лучыцкі з вёскай Касейск...» Маёнтак Лучыцы і Касевічы па рэвізіі 27 снежня 1844 г. належалі Напалеону Феліксаваму Яленскаму. У маёнтку было 450 мужчын, 480 жанчын, лік работнікаў: мужчын 222, жанчын 238. Ворнай зямлі ў памешчыка: $333^{1}/_{3}$ дзесяціны, сенакосаў $333^{1}/_{3}$, пад лесам 2150. У сялян: на кожнага мужчыну рабочага пад сядзібу 1, ворнай 10. Для хат пабудоў лес даваць па неабходнасці. Прыгон два дні ў тыдзень. Іншыя дадатковыя павіннасці — па 6 дзён у год з кожнага двара. У 1886 г. вёска Касевічы налічвала 35 двароў, дзе пражывала 280 жыхароў. У 1870 г. пры ліквідацыі прыгоннага права памешчыцкія землі вакол в. Яўсеевічы былі канфіскаваны і прададзены сялянам.

Улетку 1890 г. па беразе р. Пціч за тры кіламетры ад вёскі ва ўрочышчы Набруснае іншаземныя купцы пабудавалі лесапільны завод, выраблялі шпулі і іншыя драўляныя дэталі для ткацкіх фабрык. Другі лесапільны завод працаваў каля самай вёскі. Насельніцтва Касейска кармілася дзякуючы заводам.

1 кастрычніка 1908 г. у Касейску адкрылася народнае вучылішча. Заняткі вяліся на рускай мове. Больш 40 хлопчыкаў і дзяўчынак вучыў настаўнік Аляксандр Паўлавіч Буйвал. У час першай сусветнай вайны ён быў прызваны ў армію, паранены ў баях. Вярнуўся і зноў настаўнічаў да 30-х гадоў, пакуль не трапіў пад колы сталінскай рэпрэсіўнай машыны.

У 1914 г. угоддзі вакол Касевіч, якія належалі землеўладальніку Пацёмкіну, а затым яго зяцю Васільсону, выйграў у карты былы падпаручнік Рыбкін. Ён жаніўся на беднай дзяўчыне з Касевіч Лукер'і, у якой было дванаццаць братоў і сясцёр. Пацёмкін пабудаваў дом, але жыў у ім нядоўга, незадоўга да рэвалюцыі прадаў яго і выехаў з сям'ёй у Польшчу.

Рыбкін забараніў сялянам карыстацца выганам для жывёлы. Вяскоўцы мелі сервітутнае права на прагон, але падпаручнік і слухаць не хацеў. Справа дайшла да сената. Суд прызнаў сервітутнае права за сялянамі. На судзе ў Мінску іх інтарэсы прадстаўляў Кірыл Іванавіч Чавус, жыхар Касевіч, найбольш адукаваны сярод сяльчан, ён закончыў Лучыцкае народнае вучылішча.

У Касевічах на пачатку дваццатага стагоддзя пражывала больш 700 чалавек. Акрамя лесапільных заводаў, працавалі паравы млын, крупадзёрка, маслабойня. У вёсцы была карчма і крама. Пасля рэвалюцыі заводы закрылі, млын, крупадзёрка і маслабойня працавалі да 1941 г. З 1917 г. в. Касевічы называюцца Кашэвічы.

У. М. Пугач

Міхедавічы

Першае ўпамінанне аб в. Міхедавічы ў актах рэвізіі выканання прывілея Вялікага князя літоўскага Казіміра IV аб праве ўласнікаў на зямлю адносіцца да 1447 г. Налічвалася ў вёсцы 14 жыхароў — 5 мужчын і 9 жанчын... На геаграфічнай карце 1560 г. міхедавіцкія землі, а таксама землі ў ваколіцах Бобрыка, Грабава, Капаткевіч аднесены да вялікакняжацкіх, Петрыкава, Кашэвіч, Колкаў, Багрымавіч — да шляхецкіх...

Адносна паходжання тапаніма Міхедавічы існуе наступная легенда.

Землі гэтыя належалі курыцкаму памешчыку Богуту. Плошчы пад ворыва ўвесь час пашыраліся, прыгонныя сялянне круглы год карчавалі лес. Аднаго хлопца, які працаваў у лесе, звалі Міхед Налецька. Богуту здалося, што той недастаткова шчыруе на рабоце, і аднойчы пачаставаў яго бізуном... Міхед, выбраўшы зручны момант, адпомсціў свайму крыўдзіцелю, збіў на горкі яблык і ўцёк.

Памешчык выліў злосць на бацьках Міхеда, выселіў іх на балоцістыя, непрыгодныя для жылля месцы. І калі людзі пыталіся — хто гэта жыве ў лесе, сярод балота, атрымлівалі адказ:

— Міхедавы... Родныя Міхеда.

К. І. Рыгораў

З гісторыі народнай адукацыі

Невялікі працэнт насельніцтва Петрыкаўшчыны ў мінулым стагоддзі быў пісьменны, нярэдка ва ўсёй вёсцы нельга было знайсці ніводнага «грамацея». Мясцовыя ўлады не былі зацікаўлены ў гэтым, палітыка царскага ўрада наогул не спрыяла развіццю адукацыі народа: дастаткова прыгадаць славуты ўказ міністра народнай адукацыі графа Уварава аб «кухарчыных дзецях», які на многія дзесяцігоддзі адсунуў назад культуру Расіі, неад'емнай часткай якой была Беларусь...

Пісьменнасць у народ несла галоўным чынам праваслаўная царква, у прыходах якой адкрываліся царкоўна-прыходскія школы, настаўнікамі былі першапачаткова святчэннікі і дзячкі. У лісце Петрыкаўскага святчэнніка Андрэя Байкоўскага на адрас Мінскай духоўнай Кансісторыі 2 студзеня 1852 г. адзначалася, што ўладальнікі маёнткаў «не толькі не садзейнічаюць адкрыццю вучылішчаў пры цэрквах, але стараюцца, каб такіх зусім не было, пра гэта ўтрымліваюць народ у цемнаце, вальней маглі б выкарыстоўваць яго на свае лішнія, незаконныя работы»...

Аналагічнае данясенне паступіла ад Мазырскага благачыннага пратаірэя Васіля Дашкевіча. Мінская духоўная Кансісторыя за подпісам Епіскапа Мінскага і Бабруйскага Міхаіла аб'явіла заўвагу «за неактыўнасць», патрабавала прыняць меры да арганізацыі пасялянскіх вучылішчаў і прапанавала выкарыстоўваць для гэтага свае памяшканні. У рапарце Мінскага і Тураўскага Епіскапа ўказвалася, што павятовыя чыноўнікі садзяць пад арышт старост, якія па закліку ўрада адкрылі царкоўна-прыходскія школы.

У 1863 г. у ведамасці для будаўніцтва ў першачарговым парадку дамоў для сельскіх вучылішчаў пры царкоўных прыходах Мазырскага павета пералічана 29 пасяленняў, у тым ліку Петрыкаўскі прыход. Адкрыты народныя вучылішчы ў м. Петрыкаў (настаўнік свяшчэннік Антон Бяляўскі), у м. Капаткевічы (настаўнік свяшчэннік Іаан Ждановіч), у с. Лучыцы (настаўнік Стэфан Антановіч), а таксама ў Макарычах. У інструкцыі для настаўнікаў указана, што ў народных вучылішчах выкладаюць закон божы, рускую мову — чытанне і пісьмо, славянскую мову — чытанне, арыфметыку і царкоўныя спевы. Там жа сказана: «Бесталковае завучванне не дапускаецца»...

У 1883 г. адкрыты Лясковіцкае народнае вучылішча (настаўнік Якаў Вяраксіч), Камаровіцкае (настаўніца Аляксандра Неўская), а таксама вучылішча ў Колках. У 1884 г. яго наведвала 30 хлопчыкаў і адна дзяўчынка, у 1885 г. — 28 хлапчукоў. У 1884 г. адкрылася змешаная аднакласная царкоўна-прыходская школа ў Грабаве. Яна размяшчалася ў царкоўным доме, навучалася 18 хлопчыкаў і 2 дзяўчынкі. Настаўніцай была дачка свяшчэнніка Вольга Шаркоўская. У 1885 г. у Кляса-ве пачала працаваць школа граматы (па хатах), дзе навучалася 10 хлопчыкаў і 2 дзяўчынкі, у 1888 г. у Навасёлках — змешаная аднакласная царкоўна-прыходская школа (ва ўласным доме). Вучылася ў ёй 30 хлопчыкаў і 4 дзяўчынкі. Настаўніцай была Марыя Загароўская. У 1889 г. адкрыты царкоўна-прыходскія школы ў вёсках Чалюшчавічы і Капцэвічы. На дзень праверкі 17 сакавіка 1886 г. інспектар народных вучылішчаў Пятроўскі засведчыў, што «Петрыкаўскае народнае вучылішча наведвае 26 вучняў. Вучылася адна дзяўчынка, але яна пакінула вучобу»... Наогул заканчваць вучобу даводзілася далёка не ўсім вучням.

Настаўніца Праскоўя Осіпаўна Жураўская адзначала: «Сталоў не хапае, тыя, што маюцца, нягодныя. На ўсё вучылішча адны лічыльнікі. На рамонт вучылішча ў год адпускаецца 12 рублёў»...

Из «Памятной книжки Минской дирекции народных училищ за 1891—1892 гг.»

Петриковское. Учащихся 41 мальчик, 4 девочки. Учитель Яков Трифонович Черник.
Лясковичское. Учащихся 31 мальчик и 11 девочек. Учитель Петр Петрович Копицкий.
Комаровичское. Учащихся 45 мальчиков и 1 девочка. Учитель Николай Иванович Юшков.
Копаткевичское. Учащихся 70 мальчиков и 7 девочек. Учительница Мария Дмитриевна Молкович.
Лучицкое. Учащихся 16 мальчиков и 3 девочки. Учитель Александр Казимирович Сержуптовский.

4 сакавіка 1907 г. дэпутаты ад мяшчан Петрыкаўскага таварыства сабраліся на сход. Ішла размова аб адкрыцці ў Петрыкаве вучылішча: «...акрамя аднаго народнага вучылішча, прызначанага толькі для сялянскіх дзяцей, іншых навучальных устаноў няма». Звяртаючыся ў Мазырскую ўездную ўправу з хадайніцтвам аб адкрыцці гарадскога вучылішча, яны бралі на сябе расходы «па найму памяшкання, за ацяпленне, асвятленне і ўтрыманне вартаўніка».

У гэтым годзе было адкрыта 4-класнае вучылішча. Настаўнікам быў Іосіф Лабоцкі. Заняткі вяліся ў двух наёмных дамах. Плата за навучанне дзіцяці ўстанаўлівалася ў памеры дзесяці рублёў. Заняткі вялі тры настаўнікі і свяшчэннік. Будаўніцтва памяшкання гарадскога вучылішча пачалося ў маі 1910 г., у жніўні 1912 г. закончана. Цэгла дастаўлялася з Кіева, жалеза — з завода Якаўлева ў Сібіры. Праз тры гады адбыўся першы выпуск 23 навучэнцаў вучылішча.

15 ліпеня 1897 г. мешчанін Л. Гутман напісаў прашэнне на імя Мінскага губернатара: «У м. Петрыкаве, дзе я маю ўласны дом, лік насельніцтва дасягае дзесяці тысяч, акрамя масы інтэлігентных землеўладальнікаў і служачых у іх асоб. Усё гэта насельніцтва адчувае

недахоп у кнігах для чытання і павінны, калі жадаюць, дабываць іх ва ўездным г. Мазыры, што звязана з вялікімі невыгодамі... У сувязі з гэтым маю чэсць прасіць, Ваша сіяцельства, дазволіць мне адкрыць у м. Петрыкаве бібліятэку»...

Губернатар адказаў Мазырскаму ўяднаму іспраўніку: «Пражываючы ў м. Петрыкаве мешчанін Ліпус Аронаў Гутман звярнуўся з просьбай аб выдачы яму дазволу на права адкрыцця бібліятэкі рускіх і яўрэйскіх кніг. Прадпісваю Вам аб'явіць Гутману пад распіску, якую праправадзіць у канцылярыю губернатара, што просьба яго не падлягае задавальненню».

У 1903 г. адкрыта Брынёўскае народнае вучылішча (настаўнік Сямён Фёдаравіч Пыж), у 1907 г.— Курыціцкае народнае вучылішча (настаўнік Аляксандр Сідарэнка), Чалюшчавіцкае (настаўнік Сямён Радзько).

У 1908 г. адкрыты аднакласныя народныя вучылішчы ў Конкавічах (настаўнік Андрэй Малец), у Міхедавічах (настаўніца Аляксандра Кабычкіна), у Млынку (настаўніца Яўгенія Мадзелеўская), Аголічах (настаўніца Лідзія Юцэвіч).

У 1909 г. адкрыта Петрыкаўскае аднакласнае народнае вучылішча (настаўнік Уладзімір Літвіновіч), Сялюціцкае (настаўнік Аляксандр Прышчэпчык), у 1910 г. Бобрыцкае (настаўнік Вікенцій Пыліла), Смятаніцкае (настаўнік Іван Баранцэвіч). У 1911 г. пачалі дзейнічаць Капцэвіцкае аднакласнае народнае вучылішча (настаўніца Наталля Пазняк) і Петрыкаўскае прыватнае аднакласнае жаночае вучылішча (гаспадыня Эстэр Крэмер).

У 1913 г. адкрыты Пціцкае чыгуначнае (настаўніца Марыя Зарэмба-Уладычынская) і Галоўчыцкае (настаўнік Андрэй Бобрык) аднакласныя народныя вучылішчы. У 1914 г. прыняло навучэнцаў трэцяе Петрыкаўскае аднакласнае народнае вучылішча (настаўніца Аляксандра Рачэўская). 4-класнае гарадское вучылішча ў снежні 1913 г. ператворана ў вышэйшае пачатковае.

Адукацыя шырокіх народных мас набывала ўсё большае развіццё. У Петрыкаве функцыянавала вышэйшае пачатковае і два аднакласныя народныя вучылішчы, на тэрыторыі сучаснага Петрыкаўскага раёна — 25 аднакласных народных вучылішчаў.

Шумеў, непакоіўся край...

Нялёгкім было становішча і ўмовы працы на прадпрыемствах і ў маёнтках памешчыкаў і прадпрымальнікаў, якія ўсё больш шырокімі тэмпамі ладзілі капіталістычныя ўмовы. На Брынёўскім вінакурным заводзе для рабочых устанаўлівалася 16 абавязкаў: «пазбягаць залішніх размоў», «захварэўшы рабочы атрымлівае палову падзённай платы на працягу не больш чатырох тыдняў...» Штрафы на лесапільных і вінакурных заводах Петрыкаўшчыны накладваліся за найменшую правінасць: «за адлучку з работы — 30 капеек, за дзёрзкасць, непаслухмянасць распараджальнікам — 50 капеек; калі штрафы, накладзеныя на аднаго рабочага, складуць дзённы заработак, рабочы можа быць неадкладна звольнены з завода». Рабочы дзень на Грабаўскім лесапільным заводзе працягваўся 13 гадзін — з 6 раніцы да 7 вечара з перапынкам на абед 1 гадзіну і другім паўгадзінным. Качагары паравых катлоў працавалі з 5 раніцы да паловы восьмай вечара. Надзвычай нездавальняючай была ахова працы. У в. Дарашэвічы на вінакурным заводзе ў чан з кіпнем упаў трохгадовы сын сялянкі Варвары Занкевіч Станіслаў... У 1911 г. Петрыкаўскі лекарскі ўчастак абслугоўваў насельніцтва пяці валасцей на адлегласці 75 вёрст. У ім працавала тры ўрачы і 9 фельчараў. З 31 580 чалавек, якія пражывалі на тэрыторыі ўчастка, хворых у тым годзе зарэгістравана 21 617. Найбольш распаўсюджанымі хваробамі былі адзёр, шкарлятына, малярыя, скурныя захворванні, якімі пакутавалі 2752 чалавекі.

...У архіўных дакументах знаходзяцца звесткі аб тым, што Пётр Сядзельнікаў з в. Капцэвічы 29 жніўня 1905 г. збіраў у лесе рабочых фанерна-лесапільнага завода, «выказваў прамовы і падстракаў да забастоўкі». Пры вобыску Сядзельнікава былі знойдзены лістоўкі з патрабаваннямі павялічыць заработную плату, паменшыць рабочы дзень і палепшыць бытавыя ўмовы рабочых. 30 лістапада 1905 г. Мазырскі павятовы спраўнік даносіў Мінскаму губернатару: «Селянін в. Камаровічы той жа воласці Мазырскага павета Аляксандр Абрамовіч разводзіць сярод сялян агітацыю: «Гасудар нам не патрэбны, ён павінен быць выбраны на тры гады, у нас павінна быць рэспубліка...»

У жніўні 1915 г. на адной з вуліц Капцэвіч некалькі жыхароў вялі размову аб вайне, прасілі, каб Бог дапамог гасудару перамагчы немцаў. У гэты час да іх падышоў селянін Канстанцін Казловіч і пачаў, як адзначаў мазырскі павятовы спраўнік Валюжаніч у сваёй пастанове, дзёрзка, зневажальна выказвацца ў адрас цара, імператрыцы і нашчадкаў. 30 лістапада павятовы спраўнік даносіў Мінскаму губернатару: «Казловіч, грубага і дзёрзкага характару, непісьменны... затрыманы, абвінавачаны і сяго чысла заключаны ў Мазырскую турму».

За такія ж выказванні на данясенні Капцэвіцкага сельскага старасты Івана Казловіча да адказнасці прыцягваўся лінейны вартаўнік ст. Капцэвічы Андрэй Налівайка...

РАПОРТ МОЗЫРСКОГО УЕЗДНОГО ИСПРАВНИКА МИНСКОМУ ГУБЕРНАТОРУ О ПОРУБКЕ ПОМЕЩИЦКОГО ЛЕСА КРЕСТЬЯНАМИ д. КОНКОВИЧИ И ПРИНЯТЫХ К НИМ МЕРАМ

Доношу Вашему Превосходительству, что 21 сентября 1914 г. крестьяне Петриковской волости скопом произвели порубку леса в им. Конковичи владельца ротмистра Петра Снитковского. О порубке управляющим имения Владиславом Ветеско 22 сентября было заявлено старшему уряднику 6 участка вверенного мне уезда Пашуку, который прибыл в д. Конковичи с двумя полицейскими стражниками 27 сентября и при содействии 4 лесных сторожей им. Конковичи приступил к розыску срубленного леса. Когда обыск производился во дворе крестьянина Федора Обибока, последний оказал сопротивление при отобрании найденного у него порубленного в им. Конковичи леса, а собравшаяся к дому Обибока толпа крестьян до 50 человек с кольями и топорами с угрозами по отношению урядника и лесной стражи криками поощряла Федора Обибока не отдавать отбираемый лесной материал, ввиду чего Обибок опрокинул воз, на который был частью наложен лес и согнал со двора волов с телегой. Когда урядник хотел задержать из толпы крестьянина Александра Омельченко, как возбудителя толпы к оказанию сопротивления полиции и как ратника ополчения, отправленного на сборный пункт в Мозырь, а между тем оказавшегося дома в деревне и кроме того подлежащего 3-месячному аресту по приговору суда, брат Александра Омельченко Иван Омельченко нанес уряднику удар сзади колом по голове с такой силой, что кол сломался, а урядник, потеряв сознание, свалился на землю, в это же время Александр Омельченко палкой нанес еще несколько ударов уряднику; оба стражника поспешили к упавшему уряднику, а возбужденная толпа с криками «бей их» начала наступать на полицейских стражников и лесников, вследствие чего последние произвели несколько выстрелов из револьверов, чем рассеяли толпу, после чего урядника Пашука в бессознательном состоянии положили на телегу и повезли в имение, где управляющим имения Владиславом Ветеско была оказана ему возможная медицинская помощь. От полученных ударов у урядника Пашука получилась сильная опухоль головы и пальцев рук.

Произведенным 4 октября Приставом 2-го стана дознанием выяснены следующие крестьяне, принимавшие участие в порубке леса и в оказании сопротивления уряднику при отобрании леса и в нанесении ему побоев: 1) Федор Иванов Жук, 2) Андрей и 3) Степан Алексеевы Грабко, 4) Федор и 5) Яков Николаевы Обибоки, 6) Михаил Григорьев Обибок, 7) Даниил Андреев Нестерчук, 8) Георгий Иванов Оскерко, 9) Василий Петров Нестерчук, 10) Иван Степанов Нестерчук, 11) Яков Федоров Обибок, 12) Александр и 13) Иван Ивановы Омельченки, 14) Николай Демьянов Обибок и 15) Степан Васильев Нестерчук, из них Андрей Грабко, Федор Жук, Федор Обибок и Александр Омельченко — ратники ополчения, призванные по сентябрьской мобилизации на службу и самовольно отлучившиеся со сборного пункта. Из числа поименованных лиц задержаны и заключены под стражу Александр и Иван Ивановы Омельченки и Георгий Иванов Оскерко, остальные скрываются, к розыску и задержанию их приняты меры...

За исправника *Чумаков*

ЦГИА, ф. 102, оп. 4, д. 40, лл. 25—26б.

1917

1941

ЧАС ТРЫВОГ І ВЫПРАБАВАННЯЎ

Восень 1917 г. прынесла на Петрыкаўшчыну шмат размоў і меркаванняў адносна палітычнай улады. У валасных цэнтрах па-ранейшаму функцыянавалі земскія ўправы, якія ажыццяўлялі ўладу на месцах. Яны праводзілі сходы галосных, дзе вырашаліся пытанні гаспадарчага жыцця, выконвалі ўказанні вышэйшых органаў улады. Кайзераўскія генералы не гублялі мары выйграць безнадзейную вайну, канца якой не было відаць. Перагаворы ў Брэсце паміж Германіяй і савецкай Расіяй па заключэнню мірнага дагавора былі сарваны, германскія войскі 18 лютага 1918 г. пачалі наступленне. Маладая Чырвоная Армія не змагла стрымаць ворага, немцы прасоўваліся ўглыб Беларусі шпаркімі тэмпамі. Ім супрацьстаяла 2-я армія, але сілы былі няроўныя, і да канца лютага Петрыкаўшчына была акупіравана нямецкімі войскамі. Яна ўвайшла ў склад «Украінскай дзяржавы» гетмана Скарападскага. На акупіраванай тэрыторыі немцы захавалі дзейнасць валасных земстваў, якім дазвалялася вырашаць пытанні ўнутранага жыцця насельніцтва: грамадскага парадку, гаспадарчай дзейнасці, адукацыі, аховы здароўя. Немцы і гайдамакі ўвялі на захопленай тэрыторыі жорсткі акупацыйны рэжым. Увечары забаранялася выходзіць з хат, паўсюдна рэквізавалася жывёла — каровы, коні, выграбаліся з засекаў збожжа, бульба.

У лістападзе 1918 г. у Германіі ўспыхнула рэвалюцыя. 13 лістапада Савецкі ўрад ануляваў Брэсцкі дагавор, германскія войскі пачалі пакідаць тэрыторыю Беларусі. 3-й брыгадзе са 151-м і 153-м палкамі 17-й стралковай дывізіі было загадана выйсці на рубеж Магілёў — Жлобін — Бабруйск і р. Бярэзіна. Чыгунка Рэчыца — Лунінец знаходзілася пад кантролем немцаў, дэмаркацыйная лінія прайшла ў 10 вярстах ад чыгункі.

Да сярэдзіны снежня была вызвалена значная частка Беларусі. На перагаворах у Гомелі, якія вёў Д. З. Мануільскі, было дамоўлена, што 17 снежня 1918 г. нашы войскі зоймуць лінію Калінкавічы — Мазыр — Лунінец, немцы застаюцца тут да таго часу, пакуль не з'явіцца для іх магчымасць выехаць. Але пад нажымам Петлюры немцы сарвалі гэтую дамоўленасць. Камандаванню 17-й дывізіі 9 студзеня быў аданы загад выйсці на рубеж Пінск — Лунінец — Мазыр — Рэчыца. У сярэдзіне студзеня 1919 г. Петрыкаўшчына поўнасцю была вызвалена ад нямецкіх захопнікаў.

Насіллю з боку акупантаў насельніцтва супрацьпаставіла ўзброеную барацьбу. У большасці выпадкаў гэта былі стыхійныя выступленні сялян, часта слаба ўзброеных. Выступленні сялян супраць немцаў і гайдамакаў адзначаліся ў м. Капаткевічы, у в. Пціч і Камаровічы. У мястэчку Капаткевічы партызаны пад кіраўніцтвам Іоны Кузьміча задоўга да выгнання з рэспублікі нямецка-гетманскіх войск вызвалілі мястэчка ад ворага і ўстанавілі ў воласці савецкую ўладу.

27 жніўня 1918 г. Савецкі ўрад падпісаў з Германіяй дадатковы дагавор, паводле якога яна згадзілася вывесці войскі з тэрыторыі Беларусі на ўсход ад р. Бярэзіны. 13 лістапада ВЦВК РСФСР анулюваў Брэсцкі мірны дагавор, і Чырвоная Армія перайшла ў наступленне. 2 снежня 1918 г. часці 151-га палка пачалі наступленне ў бок м. Капаткевічы.

Адразу пасля выгнання немцаў і гайдамакаў у валасных цэнтрах былі створаны часовыя органы савецкай улады — валасныя рэвалюцыйныя камітэты. У Лучыцах валрэўком узначаліў Анікей Нашук, у Грабаве — Максім Кебец, у Ляскавічах — Сцяпан Бамбіза, у Камаровічах — Лазар Назараў (яго намеснік Антон Баранаў адказаўся выконваць свае абавязкі і замест яго быў выбраны Шмуіл Ліўшыц).

Члены рэўкома выязджалі ў вёскі, збіралі сходы сялян, на якіх выбіраліся саветы сялянскіх дэпутатаў. Рэўкомы вялі падрыхтоўку да зямельнай рэформы, канфіскоўвалі памешчыцкія маёнткі, бралі на ўлік іх маёмасць. Каб пазбегнуць яе раскрадання, у былыя маёнткі прызначаліся ўпаўнаважаныя і вартаўнікі. Аднак яны часта не спраўляліся са сваімі задачамі. Маёнтак Гераніма Кеневіча ў Дарашэвічах разрабавалі сяляне. Барыс Пашук з в. Галубіца прывёз з маёнтка вялікае трумо. Яно не праходзіла ў дзверы, давялося паставіць люстру ў хлеў, дзе знаходзіўся бык. Той, убачыўшы сваё адлюстраванне, кінуўся на трумо і разбіў яго...

Рэгулярныя часці не заўсёды лічыліся з інтарэсамі сялян, без дазволу і ведама валасных рэўкомаў забіралі хлеб і фураж. Больш забяспечаныя маёнткі, напрыклад у Камаровічах, якія мелі харчовыя запасы, адпускалі іх па ўмераных цэнах бяднейшаму насельніцтву, сіротам, удовам, інвалідам, сем'ям палонных і чырвонаармейцаў.

Праводзілася нацыяналізацыя прадпрыемстваў — броварaў, дрэваапрацоўчых заводаў, млыноў. Нацыяналізаваўшы паравы млын, які належаў мясцоваму жыхару Шчурыку, Капаткевіцкі рэўком знізіў натураплату за памол зерня. Растаўшчыкі і больш заможныя сяляне плацілі рэўкомам так званую кантрыбуцыю — грошы, якія ішлі на аплату працы яго членаў, ахову здароўя, утрыманне школ. Рэўкомы размяшчаліся ў канфіскаваных, лепшых будынках, яны кіравалі ўсімі без выключэння сферамі жыцця на вёсцы.

Нягледзячы на цяжкае эканамічнае становішча, недахоп хлеба, сяляне Петрыкаўшчыны са спачуваннем адносіліся да харчовых праблем у гарадах Беларусі і Расіі. Насельніцтва Лучыцкай воласці правяло збор хлеба для рабочых Піцера і Масквы. З Капаткевіцкай воласці харчовая дапамога па рацэ Пціч і Прыпяць была адпраўлена ў Мазыр.

Дзеяннямі рэўкомаў былі не задаволены заможныя сяляне, яны вялі агітацыйную работу сярод насельніцтва з мэтай узняць яго на барацьбу супраць савецкай улады. Гэтаму садзейнічала неспакойная абстаноўка на фронце, наступленне польскіх войск. У сакавіку 1919 г. удалося ўзняць сялян і накіраваць іх супраць рэўкомаў у Капаткевічах і Лучыцах. У Капаткевічах яны захапілі будынак рэўкома і арыштавалі старшыню І. С. Кузьміча, членаў рэўкома К. Красоўскага і А. Пундзіка. У Лучыцкай воласці азвярэлы натоўп забіў старшыню рэўкома А. Г. Нашука. Аднак выступленне не атрымала падтрымкі сярод большай часткі насельніцтва, з дапамогай часцей Чырвонай Арміі яно было падаўлена, арганізатары арыштаваны і аддадзены пад суд ваеннага трыбунала.

У складаных умовах праходзіла пасяўная кампанія 1919 г. Не хапала насення, не ўсе беззямельныя і малазямельныя своечасова атрымалі зямлю. У Камаровічах толькі 6 ліпеня на валасным з'ездзе сельскіх саветаў была прынята пастанова аб раздачы ворыўных і сенакосных угоддзяў у маёнтках Камаровічы, Філіпавічы, Гарадзяцічы.

Рэўкомы многае зрабілі для арганізацыі школ, бясплатнага харчавання ў іх. Улічваючы вострую патрэбу ў педагагічных кадрах, Петрыкаўскі валвыканком хадайнічаў перад Мазырскім павятовым аддзелам адукацыі аб адкрыцці ў мястэчку педагагічных курсаў.

* * *

У лютым 1919 г. Беларусь зноў стала арэнай ваенных дзеянняў. Каля адзінаццаці польскіх дывізій распачалі наступленне дзвюма групамі на тэрыторыю рэспублікі. У канцы ліпеня яны прарвалі фронт і наблізіліся да Мінска, 8 жніўня авалодалі горадам. 28 жніўня часці Чырвонай Арміі спыніліся на рубяжы Старушкі — Брынёў — Хлупін, аднак стрымаць націск польскіх войск не ўдалося. 12 верасня

Камандны і палітычны склад 64-га стралковага палка ў Аляксандраўскіх казармах у Маскве перад адпраўкай на Заходні фронт восенню 1918 г. Сярод камандзіраў і камісараў многія з тых, хто вызначыліся ў баях супраць польскіх акупантаў на Петрыкаўшчыне: камандзір палка А. М. Новікаў, камісар У. А. Сулацкі, камандзіры рот У. М. Хоцінскі, П. А. Баранаў, І. В. Талбузін, І. К. Часнакоў, памочнік камандзіра палка А. П. Крумін, камандзіры батальёнаў І. С. Ляпанаў, П. П. Засецкі, К. А. Лаўдэнбах

чырвонаармейскія часці знаходзіліся на ўсходніх межах Петрыкаўшчыны, перайшоўшы ў контрнаступленне, занялі вёскі Валосавічы, Колкі, Сякерычы. Гэта быў поспех мясцовага значэння. Невялікі атрад чырвонаармейцаў у Хвойні выступіў супраць ворага. Бой быў няроўным, загінула 7 нашых байцоў. Іх пахавалі ў в. Кашэвічы. У гонар іх адна з вуліц вёскі названа вуліцай 7-і бальшавікоў.

Па-рознаму сустракалі палякаў петрыкаўчане. У Грабаўскай воласці, напрыклад, на іх ускладалі вялікія надзеі, спадзяючыся, што акупацыйныя ўлады дапамогуць атрымаць соль, мануфактуру і іншыя неабходныя тавары. Асноўная ж маса насельніцтва Петрыкаўшчыны была настроена да акупантаў варожа.

На захопленай тэрыторыі польскія інтэрвенты ўстанавілі жорсткі акупацыйны рэжым. У Капаткевічах у першы ж дзень яны расстралялі старшыню мясцовага валрэўкома Ваяводу і двух маракоў-балтыйцаў — Аркадзя Лазарчыка і Адама Цылько. Чырвонаармейцу Л. Оркіну азвярэлыя пілсудчыкі заганялі іголкі пад пазногці, ламалі ў дзвярах пальцы, пакуль не замучылі. Дорага абышлося панскае трумо Барысу Пашуку з Галубіцы. Палякі шомпаламі скрывавілі яму спіну, чалавек ледзь застаўся жывым. У в. Ванюжычы жаўнеры загадалі за кароткі тэрмін сабраць 700 пудоў аўса, потым — яшчэ 900. Схапілі Фёдара Кудраўца, а таксама старшыню вясковага камітэта беднаты Дзям'яна Кудраўца, клалі паміж пальцаў пяньку, змочаную ў газе, і падпальвалі. За час акупацыі яны расстралялі ў вёсцы сем чалавек.

Палякі гвалтавалі жанчын, адбіралі ў сялян хлеб, бульбу, адзенне, сена, калёсы, грошы, рэквізавалі коней, ка-

роў, свіней, авечак, курэй. У в. Клясаў нарабавалі 130 пудоў жыта, 250 пудоў бульбы, 300 пудоў сена, 15 пудоў сала, 5 пудоў масла, вывелі з сялянскіх двароў на свае патрэбы 2 коней, 20 кароў, 10 авечак. У заможнага жыхара в. Навасёлкі Стэфана Дубіны адабралі 2 коней, паўтары тысячы рублёў золатам. Усе страты жыхароў гэтай вёскі склалі каля 8 тысяч залатых рублёў.

Не спраўдзіліся надзеі сялян Грабаўскай воласці атрымаць ад палякаў тавары і прадукты. Па сцверджанні старшыні Грабаўскага рэўкома М. А. Гуткоўскага 16 жніўня 1920 г., «пацярпелі ў надзвычайнай меры гаспадаркі ўсяго насельніцтва. Расстраляны як праціўнік польскай улады селянін Барата, арыштаваны камуністы Макаравец, Тур і Уцэхоўскі, школьны работнік Прышчэпчык памёр у турме...» Старшыня Лучыцкага рэўкома М. І. Маставы пасля вызвалення ад палякаў адзначаў, што страты ад грабяжу каласальныя, вызначыць іх цяжка.

У час польскай акупацыі спалены 22 сялянскія двары ў Багрымавічах, 17 гаспадарак — у Рубчы, лесапільны завод у Капаткевіцкай воласці. Жаўнеры разбурылі лесапільны завод і фанерную фабрыку ў Капцэвічах, паравы млын у Брынёве, бровар у Лучыцкай воласці. У дакладзе Мазырскага павятовага аддзела сацыяльнага забеспячэння ў ліпені 1920 г. адзначалася: «Няма амаль чалавека, які не панёс бы страт ад палякаў... Што тычыцца вёскі, то там не пацярпеўшых таксама няма: дзікі разгул польскай шляхты на шляху адступлення ўсё знішчаў, разбураў ушчэнт...»

Расла незадаволенасць польскай уладай сярод мясцовага насельніцтва. З першых дзён акупацыі народ узнімаўся на барацьбу з ворагам. Газета «Звязда» 19 кастрычніка 1919 г. паведамляла, што на р. Пціч у кожнай вёсцы ёсць партызанскі атрад. У Колках не даваў спакою ворагам атрад Рыгора Грушко. У наколіцах Петрыкава паспяхова дзейнічаў партызанскі атрад 70-гадовага Васіля Ісакавіча Талаша, у якім налічвалася каля 300 чалавек. Партызаны В. І. Талаша нападалі на палякаў, вялі разведку аб размяшчэнні польскіх падраздзяленняў, усю інфармацыю перадавалі камандаванню Чырвонай Арміі. У Петрыкаве працавалі падпольныя групы Лаўрэна Злотнікава і Стэфана Міцкевіча, Пятра Шпака, Фамы Серашіна. У лодцы з двайным дном падпольшчыкі пад відам гандляроў журавінамі даставілі ў Пінск з Мазыра нелегальную літаратуру. Сувязь з Петрыкаўскай падпольнай арганізацыяй падтрымліваў з Мазыра М. Андрэеў.

У маёнтках Дарашэвічы і Брынёў на сродкі насельніцтва існавалі школы, дзе навучанне вялося на рускай мове. У архіве захавалася ведамасць на выдачу заработнай платы настаўнікам Лясковіцкай воласці. Настаўнікі Лясковіцкай школы В. Бамбіза, Дарашэвіцкай К. Пырх, Галубіцкай К. Сяўрук атрымалі па 3652 рублі, Вышалаўскай П. Яцкевіч, Турокскай М. Сінкевіч — 3412, Бакланскай М. Літвіновіч, Брынёўскай А. Куцях, Капцэвіцкай І. Атліванаў, школы пры фанернай фабрыцы Э. Шпілеўская — 1992 рублі. У некаторых вёсках адкрываліся польскія школы, якія фінансавалі акупацыйныя ўлады. Акупанты назаўсёды збіраліся панаваць на захопленай тэрыторыі. Аднак нядоўга глумілiся польскія заваёўнікі. 4—7 ліпеня 1920 г. войскі Заходняга фронту перайшлі ў наступленне і нанеслі моцныя ўдары па

К. К. Красоўскі

П. Р. Пашук

ворагу. Наступленне чырвонаармейцаў падтрымлівалі маракі Дняпроўскай флатыліі. 11 ліпеня Петрыкаў быў вызвалены ад палякаў. У аператыўнай зводцы Заходняга фронту 12 ліпеня 1920 г. паведамлялася: «У Мазырскім раёне нашы часці ў выніку цяжкага бою фарсіравалі р. Пціч і занялі м. Капаткевічы і ст. Пціч. Наступленне працягваецца...»

* * *

У першыя дні пасля вызвалення ў валасных цэнтрах ствараліся рэвалюцыйныя камітэты, якія прыступалі да выканання функцый органаў дзяржаўнай улады. У Петрыкаве валасны рэўком распараджэннем ваеннага камісара 510-га стралковага палка (старшыня Лаўрэнцій Мацкевіч, члены П. І. Лапета, Д. І. Кебец) быў створаны 12 ліпеня 1920 г. Тады ж ваенны камісар 170-й брыгады 57-й стралковай дывізіі аддаў распараджэнне аб арганізацыі валаснога рэўкома ў м. Капаткевічы (старшыня Ф. Р. Арыновіч, члены П. П. Красоўскі, Ц. С. Пігулеўскі, С. Б. Расоўскі). У в. Ляскавічы валасны рэўком (старшыня С. І. Туравец, члены Н. Ф. Бамбіза, С. Л. Бамбіза, Л. І. Буднік, З. А. Літаш) створаны 17 ліпеня. Камісар 510-га палка 31 ліпеня 1920 г. аднавіў рэўком у в. Грабаў (старшыня М. А. Гуткоўскі, члены С. К. Дзягцяр, М. Ц. Кебец, Кот, Т. Н. Навічэнка).

У Камаровіцкай воласці былы старшыня рэўкома Л. С. Назараў правёў у вёсках сходы сялян. Былі выбраны сельскія саветы, яны дэлегавалі на валасны з'езд 18 ліпеня 1920 г. сваіх прадстаўнікоў. З'езд абраў старшынёй рэўкома Л. С. Назарава, членамі Р. К. Гайдукевіча, А. М. Ермалінскага. Ініцыятарам стварэння Лучыцкага валрэўкома стаў Павел Мінчук. З'езд дэлегатаў сельскіх саветаў воласці адбыўся 18 ліпеня 1920 г., на ім старшынёй рэўкома быў выбраны Р. А. Ходзька, якога праз некалькі дзён змяніў М. І. Маставы, членамі рэўкома — С. П. Лабовіч, А. Ф. Есьмановіч, А. Содзель.

Пры валасных рэўкомах ствараліся аддзелы, якія па колькасці і па структуры былі неаднолькавыя. Пры Петрыкаўскім валрэўкоме мелася шэсць аддзелаў: кіравання, зямельны, ваенны, народнай адукацыі, харчавання і міліцыі. У складзе трох рэўкомаў знаходзілася па чатыры аддзелы: Грабаўскага і Камаровіцкага — кіравання, зямельны, харчавання і працы, Лучыцкага — кіравання, зямельны, народнай адукацыі і працы.

Рэўкомы арганізоўвалі ў вёсках сельскія саветы, нацыяналізавалі панскія маёнткі, прадпрыемствы, угоддзі і лясы, вялі ўлік працаздольнага насельніцтва, а таксама жывёлы, інвентару, дапамагалі сем'ям чырвонаармейцаў і бяднейшым сялянам, кантралявалі выкананне працоўнай і гужавой павіннасці, размяркоўвалі заданні па развёрстцы, забяспечвалі парадак. У маёнтках ствараліся батрацкія камітэты, якія бралі на ўлік панскую маёмасць, арганізоўвалі збор ураджаю. На іх базе з'явіліся першыя саўгасы. Найбольш высокі ўраджай у першы пасля вызвалення год быў атрыманы ў маёнтках Канстанцінава і Чалюшчавічы Капаткевіцкай воласці, дзе было сабрана адпаведна 254,5 і 131 капы жыта, 6 і 41 — ячменю, 8,5 і 50 коп аўса. Добры ўраджай сабралі і ў маёнтку Дуброва Лучыцкай воласці — 140 коп жыта, 66 — ячменю, 39,5 коп аўса [1 капа — 60 снапоў].

Наладжвалася работа брояараў у народных маёнтках Дуброва, Лучыцы, Канстанцінава, Чалюшчавічы, Дарашэвічы і інш. Былі пушчаны ў работу паравыя млыны ў маёнтках Канстанцінава Капаткевіцкай і Філіпавічы Камаровіцкай воласці. У Філіпавічах працавала таксама лесапілка, у маёнтку Гарынава Ляскавіцкай воласці — фанерны завод. Ішла падрыхтоўка да пуску дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў у Петрыкаве, Філіпавічах, на ст. Капцэвічы і Пціч.

Праводзілася работа па рамонту дарог і аднаўленню мастоў. Разбураныя масты будавалі сапёрныя падраздзяленні чырвонаармейцаў. Валасныя рэўкомы па патрабаванню камандзіраў накіроўвалі на дапамогу ім неабходную колькасць людзей і падвод.

Цяжкім ярмом для насельніцтва валасцей была харчовая развёрстка. Для таго каб палепшыць харчаванне Чырвонай Арміі, гарадоў і прамысловых цэнтраў, у Мазырскім павеце з 24 жніўня да 1 верасня 1920 г. праводзіўся «тыдзень харчавання». Сялянам Грабаўскай воласці прадпісвалася здаць на ссыпныя пункты на ст. Капцэвічы і Пціч 200 пудоў жыта, Петрыкаўскай — 500 пудоў, Лучыцкай і Ляскавіцкай — па 1000 пудоў, Камаровіцкай і Капатке-

І. І. Лапета

А. В. Палупанаў

віцкай — па 1500 пудоў. У загадзе павятовай харчовай камісіі адзначалася, што «грамадзяне, якія будуць супрацьдзейнічаць правядзенню «харчовага тыдня», будуць арыштаваны, маёмасць іх канфіскавана». У верасні 1920 г. да кожнай воласці было даведзена цвёрдае заданне на пастаўку па развёрстцы жывёлы.

5 верасня 1920 г. Мазырскі павятовы ваенны камісар і начальнік мабілізацыйнага аддзела выдалі загад аб прызыве на тэрміновую ваенную службу грамадзян 1889—1900 гадоў нараджэння. Устанаўліваліся апошнія дні яўкі на зборны пункт Мазырскага павятовага ваенкамата прызыўнікоў: Капаткевіцкай і Лучыцкай валасцей — 10 верасня, Камаровіцкай, Петрыкаўскай і Ляскавіцкай — 12, Грабаўскай воласці — 14 верасня. «Грамадзяне, якія не з'явіліся ў вызначаны тэрмін,— гаварылася ў загадзе,— будуць лічыцца дэзерцірамі і аддадзены пад суд Рэўтрыбунала, маёмасць іх канфіскавана». Нягледзячы на строгае папярэджанне, тых, хто не хацеў служыць у Чырвонай Арміі, было многа. Гэтаму спрыяла тое, што з захаду набліжалася новая небяспека. З боку Пінска рухаліся атрады Станіслава Булак-Балаховіча, які ставіў мэту абараніць насельніцтва Беларусі ад дамаганняў Польшчы і Расіі, падняць сялянскі мяцеж на ўсёй Беларусі. 8 лістапада 1920 г. яны захапілі Петрыкаў, праз тры дні — усю тэрыторыю раёна. Валасныя рэўкомы, паштовыя аддзяленні спешна эвакуіраваліся. У Петрыкаве балахоўцы разграмілі будынак рэўкома, разрабавалі і спалілі магазіны, стварылі камітэт мясцовага самакіравання, забілі каля 50 чалавек. У вёсках нярэдкімі былі выпадкі рабавання сялян.

16—20 лістапада 1920 г. часці 16-й арміі Заходняга фронту разграмілі атрады Булак-Балаховіча, рэшткі якіх рассеяліся па лясах. У канцы лістапада 1920 г. усе валасныя рэўкомы Петрыкаўшчыны аднавілі сваю работу. Агенты чырвонаармейскіх часцей праводзілі рэквізіцыю прадуктаў харчавання і фуражу ў насельніцтва, не лічачыся з яго патрэбамі, многія сяляне былі кроўна пакрыўджаны сваёй уладай, на якую ўскладвалі такія вялікія надзеі...

А. В. Солахаў

ИЗ ПРОТОКОЛА ЗАСЕДАНИЯ ЛЯСКОВИЧСКОГО ВОЛОСТНОГО РЕВОЛЮЦИОННОГО КОМИТЕТА

1 февраля 1919 г.

Об удовлетворении хлебом из имения Судибор населения волости, крайне нуждающегося в хлебе...

Слушали доклад члена комитета Савошко о том, что при проверке имущества, взятого на учет в им. Судибор, им обнаружена молотьба (зерна), взятого на учет в им. Судибор представителем продовольственного отдела Мозырского уездного революционного комитета Мозолевским, из какового должна половина пойти для удовлетворения продовольствием населения м. Петрикова, а вторая половина — на прокормление советских войск, как это заявил ему Савошко, представитель продовольственного отдела Мозолевский. Для прокормления же населения волости из этого хлеба ничего не оставляется, тогда как масса населения волости крайне нуждается в хлебе: в д. Дорошевичи имеется 12 семейств с 63 душами населения без одного фунта хлеба, 25 семейств со 144 душами населения имеют только 43 пуда хлеба. Семейств же, у которых хватит хлеба до нового, имеется в деревне не более 3, у которых были бы остатки от годового потребления в дер. Дорошевичи семейств не имеется. В Дорошевичах имеется много семейств, у которых хватит хлеба не более чем на два месяца. В д. Баклань имеется на 208 душ всего насе-

ления только 69 пудов ржи, 2 пуда ячменя, 51 пуд гречихи и 303 пуда картофеля, как это видно из сведений, представленных сельским комитетом. В других деревнях население терпит не меньшую нужду в хлебе.

Постановили: просить продовольственный отдел, если не может быть оставлен весь хлеб для прокормления населения волости из им. Судибор, которого имеется 1500 пудов, хоть половину такового, дабы населению волости не пришлось умирать от голода...

ФГА Гомельской обл. в г. Мозыре, ф. 103, оп. 1, л. 2, лл. 66—68.

Чырванела зорка над краем

1918 год пачынаўся цяжка і трывожна для савецкай краіны. Перамір'е з Германіяй у лютым было парушана, пачалося наступленне нямецкіх войск на Беларусь. У зводцы з тэатра баявых дзеянняў Наркамата па ваенных справах 27 лютага паведамлялася: «24 лютага ішлі баі з германа-ўкраінскімі бандамі ў раёне Калінкавіч. Савецкія войскі выбілі непрыяцеля з Калінкавіч, але ўвечары зноў адступілі. Чырвоная Армія расце, узбройваюцца сяляне»[1]...

З успамінаў І. Д. Лапета. «Немцы з'явіліся ў Петрыкаве ў канцы 1918 г. Разам з нямецкімі часцямі ваявалі ўкраінскія банды, якія стваралі свае «варты». Насельніцтва Петрыкава і воласці сустрэлі чужаземцаў варожа, асабліва франтавікі, якія вярнуліся з вайны. Хоць усе тры царквы, пяць сінагог і касцёл у Петрыкаве не былі зачынены, немцы і гайдамакі ўсяляк прыціскалі гараджан, рабавалі, гвалтавалі. Звычайнай з'явай стала біццё непакорных розгамі і шампаламі. Многія мясцовыя палякі, хоць і не адкрыта, дапамагалі акупантам, ліквідавалі органы савецкай улады, выдавалі актывістаў.

Варожасць мясцовага насельніцтва да акупантаў усё ўзрастала. Франтавікі пачалі арганізоўвацца да барацьбы. Найбольш актыўна выступалі і дзейнічалі Сямён Шпак, адзін з арганізатараў падпольнай групы, браты Пятро і Іван Лапета — кіраўнік баявога атрада, Іван Рудзько — будучы генерал Чырвонай Арміі, Дзмітрый Туравец, Фама Каленік, Якаў Яшчукоўскі, Трафім Каленік, Фядос Семечка. Рашуча і непрымірыма да ворагаў была настроена і моладзь. У маладзёжную арганізацыю — аснову будучай камсамольскай — уваходзілі Дзмітрый Лапета, Афанасій Шпак, Пятро Жарабцоў, Парфірый Занкевіч, Яфім Андрук, Пётр Кебец, Аляксандр Мейлах, Георгій Братко, Іван Дамброў. Устанаўлівалася сувязь з Мазыром, Туравам і Жыткавічамі, падпольшчыкі збіралі зброю і рыхтавалі партызанскі атрад. Зброю дастаўлялі ў Петрыкаў у лодках з двайным дном. У Капаткевічы зброю дастаўляў Іона Кузьміч... Петрыкаўскія партызаны нападалі на ворага не толькі каля мястэчка, але дапамагалі і Тураўскім патрыётам, калі там успыхнула паўстанне. Потым многія з іх пайшлі дабравольцамі ў 2-і Палескі Камуністычны полк, змагаліся каля Турава, Лунінца, Пінска»...

У снежні 1918 г. немцы пакідалі Палессе. Каб захаваць ваенную і дзяржаўную маёмасць, у Капаткевічах была створана каменданцкая каманда, у якую ўвайшлі мясцовыя жыхары — Міхаіл Губар з Грабава, Фядос Глушко з Бабуніч, Сяргей Дзянега з Залесся, Ілья Дубік з Аголіч, Раман і Кірыл Панцюкі, Емяльян Мазуркевіч, Антон Шляга, Міхаіл Туравец і многія іншыя. Каменданцкая каманда была баявой адзінкай Капаткевіцкага рэўкома, які быў створаны адразу пасля адыходу кайзераўскіх акупантаў. Рэўком быў створаны і на Капцэвіцкай фанернай фабрыцы братоў Кеневічаў. Прадстаўнікі яго Яўген Эртман і Вячаслаў Жаўняровіч атрымалі ад камандавання 2-га паўстанцкага палка 20 вінтовак і

[1] РДВА, ф. 1, воп. 1, с. 50, л. 109.

ўзброілі членаў рэўкома і каменданцкую каманду. Асаблівай актыўнасцю вызначаліся ў 1918—1919 гг. старшыня і сакратар камітэта беднаты в. Бабуні-чы Ф. Панцюк і М. Некрашэвіч, старшыня і сакратар сельскага камітэта в. Аголічы Максім і Іван Строкачы, старшыня сельскага камітэта в. Слабодка М. Кандрашонак, старшыня і сакратар камітэта рабочых Капцэвіцкай фанернай фабрыкі К. Валункоў і В. Федаровіч. 16 лютага 1919 г. яны былі залічаны ў 8-ю роту 2-га Палескага паўстанцкага палка.

Закрануў Петрыкаўшчыну і стракапытаўскі мяцеж. Супраць мяцежнікаў, якія імкнуліся прарваць на злучэнне з белапалякамі ў бок Калінкавіч і далей Петрыкава — Лунінца, былі кінуты значныя сілы Чырвонай Арміі. Іх стрымлівалі часці 1-й брыгады 17-й дывізіі. Камандзір 2-га батальёна Засецкі з штабам знаходзіўся на ст. Муляраўка, затым перабраўся ў Навасёлкі. Батальён ахоўваў Навасёлкаўскі стратэгічны мост праз Прыпяць. Мост даўжынёй 1 вярста 33 сажні (1,8 км) і шырынёй 12,8 м быў пабудаваны ў 1915 г. Ён меў разводную частку і перадмаставое ўмацаванне для яго абароны: 5 кулямётных пляцовак, 5 радоў дротавай агароджы даўжынёй 2800 крокаў, 20 рагатак. Другі мост даўжынёй паўвярсты быў пабудаваны каля в. Вялаўск.

Ц. І. Сарочык, старшыня Камаровіцкага савета рабочых і сялянскіх дэпутатаў на пачатку 20-х гадоў. Загінуў ад рук бандытаў у 1924 г.

З красавіка ў Капаткевічы прыбыла 2-я рота ў складзе каля 130 чалавек, з іх 10 камуністаў — для «падаўлення паўстання». Паступілі звесткі, што ў пяці кіламетрах ад Капаткевіч знаходзіцца атрад паўстаўшых. У «Журнале баявых данясенняў 64-га палка» ёсць запіс: «2 кулямёты і каманду ў 23 чалавекі накіраваць на ст. Пціч на ўціхамірванне паўстаўшых сялян м. Капаткевічы...»[1]. Хутчэй за ўсё, гэта была адна з груп стракапытаўцаў, якая хацела прарвацца ў Польшчу. У журнале адзначана, што каля Капаткевіч затрымана некалькі чалавек з 67-га (мяцежнага) палка...

16 красавіка 1919 г. начальнік 8-й стралковай дывізіі загадаў камандзіру інжынернага батальёна Халастову арганізаваць на Прыпяці ваенную флатылію, аб чым паведаміў тэлеграмай камандуючаму беларуска-літоўскай арміяй А. Снесараву. У састаў яе былі намечаны колавыя параходы «Ржышчаў», «Сокал», «Уюн», «Чацвёрты», шэсць маторных катэраў і адзінаццаць невялікіх суднаў.

23 мая ў сувязі з актывізацыяй палякаў у вярхоўях Пряпяці і пагрозай іх наступлення на Петрыкаў і Мазыр камандуючы Дняпроўскай флатыліяй А. В. Палупанаў прыняў рашэнне паслаць

[1] РДВА, ф. 3224, воп. 1, с. 60, л. 24.

на Прыпяць бронепараход «Адмірал» (камандзір П. Істрын) для разведкі і аказання падтрымкі часцям першай брыгады. У Петрыкаў прыбылі два параходы і бронепараход «Адмірал», узброеныя дзвюма 76-міліметровымі гарматамі і чатырма кулямётамі з камандай 40 чалавек. На другі дзень бронепараход і другія судны накіраваліся ў распараджэнне камандзіра 64-га стралковага палка на раз'езд Прыпяць. Польскія войскі да гэтага часу занялі Столін, ст. Гарынь. Петрыкаў стаў прыфрантавой зонай. Супраць першай брыгады 8-й стралковай дывізіі ў маі 1919 г. ваявалі 34-ы і 22-і польскія пяхотныя палкі, 250 рускіх афіцэраў белай гвардыі, дружына з мясцовых палякаў, чатыры эскадроны кавалерыі, рачная флатылія з шасці ўзброеных катэраў і пантонаў.

У ліпені абстаноўка на фронце ўскладнілася. Польскія легіянеры пачалі наступленне, занялі Давыд-Гарадок, адрэзалі ад асноўных сіл два нашы катэры і іх базу. 66-ы полк адышоў да Лезніцы, адступаў і 64-ы полк. 11 ліпеня палякі захапілі Тураў, гаспадарылі ў Лунінцы і Давыд-Гарадку. Над Петрыкавам навісла рэальная пагроза. З Кіева ў Петрыкаў прыбыў бронепараход «Даратэя». Па загаду камандуючага флатыліяй А. Палупанава быў пасланы таксама бранякатэр «К. Маркс», які сумесна з ротай 10-га пагранічнага палка стаў на ахову маста ў в. Навасёлкі.

26 ліпеня раніцай пачаліся баі за вызваленне Турава, да вечара старажытны горад быў поўнасцю ачышчаны ад захопнікаў. Палякі нанеслі значныя страты ад агню «Апалона» і бранякатэра № 3. У камандавання з'явілася ўпэўненасць у магчымасці канчатковага выгнання ворага з тэрыторыі рэспублікі, але гэтым планам з-за шэрагу прычын не суджана было ажыццявіцца.

Абарона ўчастка Дарашэвічы — Петрыкаў — Навасёлкі і мост каля Навасёлак была ўскладзена на 8-ю роту 10-га пагранпалка, якой камандаваў Д. Дубенскі. Каля Дарашэвіч 19 ліпеня двойчы

Р. Ю. Каленік

Р. П. Кебец

з'яўлялася варожая разведка. Асноўныя сілы роты знаходзіліся ў Навасёлках. З дапамогай старшыні Петрыкаўскага валвыканкома Пучынскага чырвонаармейцы сумесна з прадстаўнікамі Беларуска-Літоўскай рэспублікі ўдзельнічалі ў нарыхтоўцы прадуктаў для патрэб арміі. Для ўмацавання атрада рачных караблёў у Петрыкаў прыбыў бронепараход «Ветка» пад камандаваннем латыша А. Я. Зарынко. Са штаба 1-й брыгады 8-й дывізіі, які знаходзіўся ў Петрыкаве, быў аддадзены загад трымаць усе караблі ў раёне Турава, у непасрэднай блізкасці ад непрыяцеля. У гэты час напружаныя баі ішлі за Туравам, каля в. Альшаны і Мочулі. Нашы часці неслі вялікія страты, маральны дух байцоў падаў... У гэтых баях быў сур'ёзна пашкоджаны бронепараход «Трахтаміраў», пабудаваны ў 1912 г. як буксірны калёсны параход. На «Трахтаміраве» з восені 1919 г. служылі ўраджэнцы Петрыкава і в. Навасёлкі Рыгор Кебец, Антон Корж, Рыгор Каленік.

13 жніўня загадам заходняга фронту «старшым марскім начальнікам над усімі параходамі» быў прызначаны марак-балтыец Пётр Пашкін. Штаб 1-й брыгады размясціўся ў Капцэвічах. Па ўсіх напрамках вялася конная разведка. Польская разведка была заўважана за Жыткавічамі. Начальнік коннай разведкі 64-га палка Часнакоў дакладваў, што каля Капаткевіч разагнана шайка бандытаў...

18 жніўня для ўмацавання флатыліі з Мазыра ў Петрыкаў прыбыў параход «Ремесленник», ён замяніў гружаны зернем «Сокал». Рулявым на «Ремесленнике» быў ураджэнец Петрыкава Афанасій Ус.

Баявыя дзеянні перамясціліся на Петрыкаўшчыну. У штаб палка прыйшоў загад камбрыга Шапкіна адбыць на ст. Коржаўка і рухацца ў Петрыкаў, 3-й роце заняць пазіцыі ў в. Дарашэвічы, базіравацца ў панскім двары. Ад ст. Коржаўка правесці тэлефонную сувязь. Не даваць магчымасці ворагу пераправіцца на правы бераг Прыпяці і дапусціць яго рух на Мазыр. Камендантам м. Петрыкаў быў прызначаны Уласаў. Камандзір сапёрнай роты дакладваў, што з дапамогай мясцовага насельніцтва капаў акопы па лініі Старушкі — Вял. і Мал. Сялюцічы — Брынёў — Дарашэвічы.

У Петрыкаў на змену «Трахтаміраву» прыйшоў бронепараход «Бужын» з начальнікам флатыліі П. Пашкіным і камісарам А. Кульбергам, які асабліва вызначыўся ў баях на Петрыкаўшчыне восенню 1919 г., быў прадстаўлены да ордэна Чырвонага Сцяга. Разам з камандаваннем стралковага палка абмяркоўваўся план абароны горада. Сілы былі вельмі малыя: лінію абароны ад в. Хлупін каля Турава да в. Навасёлкі займала 4-я рота, у якой налічвалася 88 байцоў і 6 інструктараў, 9 кулямётчыкаў, адзін кулямёт; у в. Дарашэвічы — 3-я рота (92 байцы, 4 інструктары, 15 кулямётчыкаў, кулямёт); у Петрыкаве — штаб палка, сапёрная і каменданцкая каманды. Вельмі мала было боепрыпасаў, штабы рот запоўнены толькі напалову...

У пачатку верасня белапалякі актывізавалі свае дзеянні. 8 верасня яны атакавалі палкавую школу і прымусілі чырвонаармейцаў адступіць у Петрыкаў, затым, разам з 3-й ротай 64-га палка далей, да Навасёлак. Параходы «Бужын» і «Звязда» абстрэльвалі працiўніка, з нашага боку былі забітыя і параненыя. Памочнік палкавога ад'ютанта Грыгор'еў трапіў у палон, але яму ўдалося збегчы і вярнуцца ў полк з каштоўнымі звесткамі аб ворагу. Легіянеры, не вытрымаўшы артылерыйскага агню параходаў, пакінулі Петрыкаў. Камандзір брыгады ў сваім загадзе патрабаваў утрымліваць горад чаго б гэта ні каштавала — гэтая лінія абароны была асабліва важнай. Начальнік Прыпяцкай флатыліі П. І. Пашкін аб'явіў удзячнасць маракам «Бужына» і «Звязды». На рапарце камандзіра «Бужына» Д. Н. Малафеева ён напісаў: «Ганаруся «Бужынам» пад Петрыкавам. 10.9.1919 г. Пашкін».

Абарона чырвонаармейцаў была ўмацавана Кіеўскім асобным палком чыгуначнай аховы пад камандаваннем А. А. Арлова, добра ўзброеным і паўнакроўным. У ім налічвалася звыш 1000 чалавек, былі гарматы і кулямёты. Легіянеры вымушаны былі адступіць да Брынёва. Яны рабілі вылазкі і рэйды ў савецкі тыл, пераходзілі да партызанскіх метадаў вайны. Атрад байцоў Чырвонай Арміі пад камандаваннем І. І. Варфаламеева разграміў польскі ўланскі полк, у раёне в. Колкі былі знішчаны яго рэшткі. У Конкавічах банда дыверсантаў у колькасці 40 чалавек падпаліла стратэгічны мост праз Прыпяць. Параход «Звязда» быў у тыя дні заменены «Туравам». Настрой маракоў быў бадзёрым і баявым. Былі вы-

Камандуючы Прыпяцкай ваеннай флатыліяй П. І. Пашкін. 1919 г.

Камандуючы Дняпроўскай ваеннай флатыліяй у 1920 г. П. І. Смірноў

браны кантрольна-гаспадарчая і культурна-асветная камісіі, якія ўзначалілі ўраджэнцы гэтых месц Н. П. Аніш-чанка і І. А. Герасіменка. Маракі прынялі рэзалюцыю, у якой гаварылася: «Дайце нам снарады, абмундзіраванне, правізію, і мы будзем стаяць да апошняга. Прымусьце пяхоту зрушыць наперад, і мы будзем прабіваць дарогу да светлай будучыні». Настрой сухапутных чырвонаармейскіх часцей Петрыкаўскага баявога ўчастка быў не такім бадзёрым і ўпэўненым. І. П. Істрын даносіў камандаванню: «Настрой няважны... Байцы распранутыя і босыя, яны часта галодныя, і гэта прымушае іх адступаць... Праносіцца чутка, што ззаду іх вялікія сілы, і адразу пачынаецца адступленне». Начальнік баявога ўчастка камандзір батальёна Храмцоў накіраваўся быццам для агляду пазіцый і не вярнуўся. Як стала вядома потым, ён перабег да белапалякаў. Было меркаванне, што сілы легіянераў слабыя, і можна рашучым ударам адкінуць палякаў да Давыд-Гарадка. Але рэальнасць была другой. Часта падраздзяленні Чырвонай Арміі кідаліся наўцёк пры набліжэнні ворага. Нярэдкімі былі выпадкі дэзерцірства, панікі, пераходу ў стан ворага. На фоне агульных няўдач радасным выглядаў поспех 2-й роты 64-га палка, якая заняла в. Людзвіноў і ўстанавіла страчаную сувязь з 65-м палком. Фронт у тыя дні праходзіў па лініі: Вуглы — Ашква — Рудня — М. Нівы — Хвойня (65-ы полк, камандзір Іеўлеў), далей Капаткевічы — Муляраўка — Людзвіноў (66-ы полк, камандзір Лукс).

14 верасня «Тураў» вёў бой з белапалякамі каля Галубіцы і Дарашэвіч. Дыверсійны атрад ворага імкнуўся прарвацца ў абход Петрыкава да Навасёлак з мэтай узарваць стратэгічны мост. У гэты дзень каля х. Гараваха загінуў разведчык 4-й роты Леўшын. Варожы атрад абстраляны з парахода «Бужын», аперацыя была сарвана. Было відавочна, што белапалякі, атрымаўшы звесткі ад Храмцова аб настроі, узбраенні, сілах чырвонаармейцаў, будуць імкнуцца захапіць Петрыкаў. Сіл, якія маглі б супрацьстаяць ворагу, не хапала, не было гармат, часта не кожны баец узброены нават вінтоўкай, нярэдка яны выходзілі са строю з-за адсутнасці ружэйнага масла. Патронаў было па 20—30 штук на байца. На дапамогу 64-му палку спяшаўся 397-ы полк, якім камандаваў К. Р. Ляпеха. Па чыгунцы і на параходах па Прыпяці роты палка кіраваліся на лінію фронту. А пакуль у белапалякаў былі яўныя перавагі.

Раніца 17 верасня была туманнай, караблі з Прыпяці не маглі падтрымаць пяхоту. Легіянеры нечакана атакавалі пазіцыі чырвонаармейцаў і вымусілі іх адступіць з Петрыкава да Бялынавіч. Палякі захапілі таксама параход «Струмень». Страта Петрыкава ў другі раз за 10 дзён выклікала вялікую занепакоенасць у камандавання. Параход «Тураў» быў накіраваны ў разведку ўверх па Прыпяці. Ён падабраў адступіўшых з мястэчка савецкіх і партыйных работнікаў, абстраляў пазіцыі легіянераў, знішчыў агнявыя кропкі і без страт вярнуўся назад. Была сарвана пераправа праціўніка каля Петрыкава. У гэты дзень да чырвонаармейцаў перайшоў польскі салдат Юзэф Шатура, які перадаў важныя звесткі аб сілах і ўзбраенні белапалякаў. Рабілася ўсе захады, каб вярнуць Петрыкаў. На фронт прыбылі начальнік флатыліі П. І. Пашкін і камісар флатыліі А. М. Кульберг. Назапашваліся

П. Т. Семечка

С. Р. Грышкоў

сухапутныя сілы, у Бяланавічы прыбыў батальён 397-га палка. Вораг замацоўваўся ў Петрыкаве і спрабаваў захапіць новыя пазіцыі, але беспаспяхова. У 21 гадз. 19 верасня пачалася аперацыя па вызваленню Петрыкава. У раёне ст. Муляраўка арганізавана падманнае наступленне, каб адцягнуць увагу палякаў, асноўны ўдар наносіўся з боку в. Белка. Пяхота падтрымлівалася гарматным агнём з параходаў «Карл Лібкнехт», «Бужын», «Тураў». Аперацыю флатыліі ўзначаліў П. І. Пашкін. Белапалякі не вытрымалі трапнага агню гармат і кулямётаў і пакінулі свае пазіцыі. З сушы іх атакавалі чырвонаармейцы, з параходаў высаджаны дэсант. Петрыкаў зноў стаў савецкім. Са штаба акупантаў у Кащэвічах на дапамогу палякам спяшаліся дзве роты з гарматамі, але было позна.

Шмат бед паспелі нарабіць акупанты ў Петрыкаве за гэтыя дні. Яны расстрэльвалі камуністаў і савецкіх работнікаў. Так, каля сцяны Нікольскай царквы былі расстраляны жыхары Петрыкава, выдадзеныя свяшчэннікам Кіркевічам, бальшавік П. Т. Семечка, міліцыянер Т. Каленік і 9 партызан з Конкавіч. Да паўсмерці быў збіты А. С. Кебец. Многія былі выратаваны ад гібелі рашучым наступленнем Чырвонай Арміі і ўліліся ў яе рады — П. П. Занкевіч, Я. М. Андрук, П. А. Кебец, А. К. Мейлах, Г. П. Братко, І. Дамброў, Д. Д. Лапета, І. Д. Лапета і іншыя. Разведка ўстанавіла, што ў ваколіцах Петрыкава белапалякаў не відаць, яны не падыходзілі да Прыпяці і ў Вышалаве, Галубіцы, Дарашэвічах — баяліся агню артылерыі з бронепараходаў. Усе караблі 4-й брыгады Прыпяцкай ваеннай флатыліі былі накіраваны ў Гомель, на змену ім прыбывала 2-я брыгада флатыліі. Камісар парахода «Бужын» М. А. Лімончанка дакладваў у палітаддзел флатыліі: «Настрой маракоў баявы, хоць зусім няма абмундзіравання, не хапае харчоў... Насельніцтва добразычліва адносіцца да маракоў. Баяздольнасць парахода добрая. Сёння бамбардзіравалі польскі флот, даволі паспяхова»... Фронт устанавіўся па лініі Вуглы — Ашква — Майсееўка — М. Ніва — Хвойня — Чалюшчавічы — Курыцічы — Смятанічы — Петрыкаў — Майсеевічы — Убарцкая Рудня... У задачу войск уваходзіла актыўная абарона гэтага ўчастка фронту, прарывамі непакоіць непрыяцеля і не даваць яму замацавацца. Чакалася далейшае наступленне пры падтрымцы двух бронепаяздоў, укамплектаваных маракамі-балтыйцамі. Палякі абстрэльвалі пазіцыі нашых войск каля Петрыкава з гармат з боку Макарыч, спрабавалі атакаваць, але поспеху не дабіліся.

Баі ішлі і вакол вёсак Філіпавічы, Лучыцы. Палякі трымаліся да апошняга і не здавалі пазіцыі. Загінула нямала чырвонаармейцаў, у тым ліку палітработнікі Оссер, Палякоў, Мезжыл. Ішла змена часцей на Петрыкаўскім напрамку, пазіцыі займалі байцы 58-га палка. Белапалякі, якія рабавалі народ, здзекаваліся над людзьмі, не знаходзілі ніякай падтрымкі ў насельніцтва. Яны канцэнтравалі свае сілы для далейшага наступлення.

Цяжкім выдаўся дзень 1 кастрычніка. З аператыўнай зводкі 44-й дывізіі: «У 4 гадз. 500 чалавек пяхоты працоўніка з гарматамі і эскадронам кавалерыі павялі наступленне на Петрыкаў. Пасля цяжкага 2-гадзіннага бою палякі завалодалі мястэчкам. Мы страцілі каля 70 чалавек забітымі, параненымі і прапаўшымі без вестак. 58-ы полк змагаўся да апошняга патрона, і з-за адсутнасці боепрыпасаў вымушаны быў адысці да Вялаўска. Салдаты працоўніка, у асноўным палякі з Познані, п'яныя... Удалося зняць і адвесці да Скрыгалава бронепараходам «Трахтамераў» разводную частку моста каля Навасёлак».

Удзельнік таго бою Ф. І. Карвіга ўспамінаў, што прычынай паражэння ў многім было і тое, што камісар 3-га батальёна ўстроіў у тую ноч у Петрыкаве вечарынку для моладзі, а многія

жыхары мястэчка сімпатызавалі палякам і неадкладна паведамілі ім аб гэтым, ворагі выкарысталі зручны момант... Камандзір батальёна Арцёменка здолеў адвесці асноўныя сілы, але не далічыліся многіх. Загінуў і камандзір 7-й роты Аляксандраў, які толькі выскачыў з зямлянкі пры набліжэнні палякаў.

Меры, прынятыя для ліквідацыі прарыву белапалякаў, поспеху не прынеслі. Караблі флатыліі ў Конкавічах абстраляны артылерыяй праціўніка і адышлі да Балажэвіч. Войск было мала, разбіты ў Петрыкаве 3-і батальён адказаўся пераходзіць з Шастовіч да Балажэвіч. Камандаванне прыслала боепрыпасы, але патроны не падыходзілі да вінтовак...

Левы фланг 397-га палка палякі адкінулі да Пцічы, 5 кастрычніка была захоплена і станцыя Пціч. Толькі дзякуючы рашучым дзеянням маракоў параходаў «Гарачы» (былы «Трахтамірaў») і «Грамавы» («Карл Лібкнехт») праціўнік не змог рэалізаваць свае вялікія задумы. 8 кастрычніка палякі былі выбіты з Пцічы, а ўвечары таго ж дня зноў захапілі станцыю. Ад частай стральбы на «Гарачым» выскачыў з гнязда вал гарматы. Палякі спрабавалі ўзнавіць мост каля Навасёлак, але агнём з караблёў яго ўдалося падпаліць...

Баявыя дзеянні на тэрыторыі Петрыкаўшчыны працягваліся з пераменным поспехам да сакавіка 1920 г. Барацьба была цяжкай, часта няроўнай: у падраздзяленняў Чырвонай Арміі не хапала боепрыпасаў, медыкаментаў і харчоў, на караблях флатыліі часта не было паліва. Але маракі не давалі спакою непрыяцелю, абстрэльвалі яго пазіцыі ў Петрыкаве, ст. Пціч, Багрымавічах, Конкавічах. Нашым войскам супрацьстаялі моцныя, добра ўзброеныя польскія часці — уланскі і тры стралковыя палкі, кавалерыйская часць «Татарская язда», марскі батальён, узмоцненыя трыма бронепаяздамі. У сярэдзіне лістапада караблі флатыліі пайшлі ў Мазыр на зімоўку. Недахоп харчавання ярмом клаўся на сялян навакольных вёсак...

У снежні нашы войскі атрымалі загад авалодаць ст. Коржаўка. Фронт праходзіў па лініі Слабодка — Капцэвічы — Чалюшчавічы — Капаткевічы — Івашкавічы. Цяжкія баі ішлі каля Хвойні з мэтай авалодаць Лучыцамі, Капцэвічамі, Навасёлкамі, але яны не маглі прынесці поспеху, наступаць не было каму, 422-і і 423-і палкі зняты з фронту і накіраваны на Украіну. Была арганізавана дзёрзкая вылазка маракоў сумесна з партызанамі ў тыл палякаў праз Прыпяць каля в. Конкавічы, знішчана шмат варожых салдат, 6 гармат, узяты вялікія трафеі. Загінула два маракі — камандзір узвода Г. Беркум-Васільеў і Мярэжка.

З новай сілай баі разгарэліся ў сярэдзіне студзеня. Палякі ўсімі сродкамі імкнуліся адсунуць лінію фронту ўглыб савецкай тэрыторыі. Асабліва нялёгка прыходзілася каля в. Хуснае і ст. Пціч. Палякі захапілі Гарадзішча, Хвойню, Івашкавічы і выйшлі да р. Трэмля. Нашы войскі амаль поўнасцю былі выціснуты з Петрыкаўшчыны, заставаўся толькі невялікі перадмаставы плацдарм каля чыгуначнага маста каля ст. Пціч, які ўтрымліваўся з дапамогай бронепаяздоў № 92, № 35 «Чырвоны барэц» і № 48 імя Булычова, каманды якіх складаліся з маракоў.

Г. К. Казак, палітком браняпоезда «Даратэя»

К. Р. Клешчанок, начальнік 1-й брыгады караблёў. ДВФ

В. П. Крупчынскі

А. М. Кульберг

22 студзеня палякі запрасілі часовага перамір'я з мэтай абмену аднаго з відных дзеячоў каталіцызму на члена ЦК РКП(б) К. Радэка. Рэўваенсавет Паўднёва-Заходняга фронту з дазволу У. І. Леніна даў распараджэнне спыніць баявыя дзеянні да 4 гадзін 24 студзеня. 23 студзеня позна ўвечары К. Радэк прайшоў па масту праз Пціч і на браняпоездзе выехаў у Калінкавічы, дзе яго сустрэў член Рэўваенсавета 12-й арміі С. Аралаў. У палякаў у гэты час знаходзіўся ў якасці заложніка камісар 1-й брыгады 47-й дывізіі М. Данілеўскі.

У баях на Петрыкаўшчыне ў тыя дні асабліва вызначыліся байцы 415-га палка. Ён панёс немалыя страты, каля в. Хвойня былі забіты С. Мазейка, В. Гаўрылюк, І. Пракоф'еў, Я. Гармаш, У. Кароткі, прапалі без вестак А. Цыплякоў, С. Курамшаў, А. Навіцкі і многія іншыя чырвонаармейцы. У спіскі палка былі занесены многія партызаны імя III Інтэрнацыянала і іншых атрадаў — жыхары вв. Хвойня, Грабаў, 2-я Слабодка, Лучыцы, Сякерычы і іншых. Пасля цяжкіх баёў каля Хвойні жывым застаўся былы партызан з 2-й Слабодкі У. Мазай, а ў сакавіку 1930 г. ён быў забіты бандытамі стрэлам у акно.

Напружаныя баі каля ст. Пціч не заціхалі і ў лютым 1920 г. 416-ы полк (камандзір Я. А. Калюжны) умацаваўся на лініі ад Хвойні да Церабава — Беседак. Актыўна дзейнічалі на гэтым участку партызанскія атрады. Пазіцыі палякаў каля Капаткевіч былі ўмацаваны, іх сілы амаль удвая перавышалі нашы. Каманды караблёў ДВФ пераведзены на сушу і называліся 1-м марскім берагавым атрадам, якім камандаваў ваенмор І. Зелянцоў. 25 лютага яны зрабілі смелы налёт на Кацуры і адкінулі палякаў да р. Пціч. У час бою загінулі маракі эстонец Іаган Барт і І. Кавалёў.

27 лютага польскае камандаванне пачало Мазырскую наступальную аперацыю. У гэты час Чырвоная Армія праводзіла перагрупіроўку, змену часцей на фронце, усюды панавала неразбярыха, многія камандзіры выйшлі са строю з-за хвароб і раненняў. Аб гэтым праз агентуру было вядома палякам. Да таго ж пачалася адліга, вясенняя распуціца. Артылерыя з Петрыкаўскага напрамку была знята і адпраўлена да Калінкавіч, кавалерыя не магла дзейнічаць... 4 сакавіка легіянеры пайшлі ў рашучую атаку. Наступалі яны і на другі дзень. У выніку ўся Петрыкаўшчына аказалася пад ботам ворага. Увечары 5 сакавіка быў захоплены Мазыр.

* * *

На Палессі не заціхала полымя партызанскай барацьбы. Каля Петрыкава, Навасёлак, Пцічы дзейнічаў атрад В. І. Талаша, на поўначы — атрад імя III Інтэрнацыянала, у якім змагалася з акупантамі моладзь вёсак Зарэчка, 2-я Слабодка, Хвойня, Чалюшчавічы, Філіпавічы, Грабаў. У Петрыкаве дзейнічалі падпольшчыкі, якія трымалі сувязь з Мазыром, Лунінцом і іншымі гарадамі. Легіянеры змаглі выйсці на след арганізацыі, многіх актыўных удзельнікаў яе схапілі і пакаралі смерцю. У Петрыкаве расстралялі Канстанціна Яцкоўскага, Антона Ланька, Семечку і іншых.

19 чэрвеня 1920 года Чырвоная Армія пачала наступленне на белапалякаў. 29 чэрвеня канлодка «Губительный», на якой служыў ураджэнец Петрыкава

П. А. Кебец, прарвалася да Мазыра, высадзіла дэсант, які сустрэўся там з разведчыкамі 215-га стралковага палка. Камандуючы флатыліяй П. І. Смірноў аддаў загад кананерскім лодкам правесці налёт на Балажэвічы і Скрыгалаў і пасеяць паніку ў тыле ворага. Экіпажы караблёў былі пераапрануты ў польскую форму, ворагі прымалі іх за сваіх. 1 ліпеня апоўдні падышлі да Навасёлак, дзе дзейнічалі два пантонныя масты праз Прыпяць. Па іх бесперапынным патокам рухаліся польскія абозы. Караблі адкрылі агонь, узнялася паніка. Палякі кідаліся ў ваду, уздымалі ўгару рукі. Быў узяты ў палон штаб 22-га палка з дакументамі, захоплены вялікія трафеі, абозы і масты разбіты і спалены... На зваротным шляху караблі былі абстраляны каля Балажэвіч, але агнём у адказ варожая батарэя была знішчана. Каля Пцічы караблі флатыліі былі яшчэ раз абстраляны з браняпоезда, але рашучымі дзеяннямі маракі нанеслі значны ўрон праціўніку.

2 ліпеня на світанні белапалякі пад націскам 510-га палка вымушаны былі паспешна адступіць з в. Кацуры, пакінуўшы непашкоджанымі чыгуначныя збудаванні. Ворага праследавалі партызанскія атрады. Кананерскія лодкі «Гордый», «Грозный», «Мстительный» і «Могучий» непрыкметна прайшлі ўверх па Прыпяці да Балажэвіч і абстралялі праціўніка. Налёт быў нечаканым і моцным, ён застаў ворага знянацку, агонь у адказ ён вёў зусім у іншым напрамку. Але на сушы вораг павёў энергічнае наступленне і вымусіў нашы часці пакінуць в. Кацуры. Агнём караблёў наступленне было прыпынена, абстрэл вёўся, пакуль туман не скрыў ворага. На наступны дзень экспедыцыйны атрад заняў без бою Мышанку і Беседкі, што стала магчымым пасля рэйду караблёў па Прыпяці. Была вызвалена таксама в. Церабаў.

Увечары 10 ліпеня праціўнік паміж р. Мышанкай і Пціч высадзіў з браняпоезда вялікі дэсант, які павёў наступленне і адцясніў правы фланг нашых войск. Палякі ўзарвалі мост праз Пціч, падпалілі станцыю, лесапільны завод, склады. Хутка станцыя была занята чырвонаармейцамі, а ў канцы дня стомленыя чырвонаармейцы ўвайшлі ў Коржаўку.

Вызваленне населеных пунктаў было б немагчымым без актыўнай падтрымкі наступаючых войск караблямі флатыліі з раёна в. Беседкі. У час абстрэлу праціўніка ў ствале гарматы канлодкі «Могучий» разарваўся 130-міліметровы снарад, загінулі маракі Р. С. Канавалаў, В. І. Гавядзінаў, Я. С. Ганчарэнка, А. І. Яўсеенка, Ю. Я. Рудзіт.

11 ліпеня начальнік штаба 170-й брыгады Келерман дакладваў: «508-ы полк вёў наступленне на Івашкавічы — Слабодку — Капаткевічы. Каля 2 гадзін нашы часці перайшлі р. Пціч, занялі в. Івашкавічы і наступаюць на Капаткевічы. Праціўнік у паніцы адступае... 510-ы полк наступае на в. Рог».

Камандзір экспедыцыйнага атрада дакладваў, што бой каля р. Пціч працягваўся ўсю ноч, да раніцы быў заняты ўвесь левы бераг. 510-ы полк раніцай заняў вв. Гарадзішча, Хуснае, наступаў на 1-ю Слабодку, Івашкавічы, Капаткевічы. Пачалася Петрыкаўская аперацыя.

Раніцай 11 ліпеня палякі былі выбіты са ст. Пціч і в. Багрымавічы. Хутка занялі Івашкавічы, 508-ы полк узяў напрамак на Капаткевічы. У 11 гадзін, пераправіўшыся праз Прыпяць, часці Чырвонай Арміі ўвайшлі ў Петрыкаў. Удзень быў заняты раз'езд Коржаўка, 1-ы батальён 508-га палка разам з партызанамі вызвалілі Капаткевічы, а ўвечары таго ж дня Бабунічы. Праціўнік у паніцы адступаў, пакідаючы шмат амуніцыі, зброю, склады... У Петрыкаў прыбылі, хоць і з вялікімі цяжкасцямі з-за падзення ўзроўню вады ў Прыпяці, караблі флатыліі «Грозный», «Гордый», «Губительный» і «Патрон».

Далейшы шлях наступаючых часцей Чырвонай Арміі ляжаў на Ванюжычы,

Я. Забродскі, Д. Дамброўскі, матросы парахода «Арол». Загінулі ў 1920 г.

Бабунічы да лініі Грабаў — Старушкі. Экспедыцыйны атрад з Коржаўкі і Конкавіч рухаўся на Аголіцкую Рудню. 510-ы полк заняў Грабаў і Старушкі і выйшаў на тэрыторыю Жыткавіцкай воласці. Камандзір 508-га палка Г. Скіба аддаў 14 жніўня 1920 г. загад № 1: «Звяртаюся да вас, чырвоных герояў слаўнага 508-га палка, з сардэчнай удзячнасцю. Вы заўсёды чэсна і мужна выконвалі баявыя загады, нягледзячы на цяжкасці, голад і холад. Я не магу не ўспомніць тыя дні, калі мы вялі цяжкія баі, бралі ўмацаваныя пазіцыі праціўніка на Пцічы, пры вызваленні Капаткевіч, ...дзе вы праявілі ўзоры мужнасці, пераадольваючы як прыродныя, так і тэхнічныя ўмацаванні»... У 508-м палку змагалася нямала петрыкаўчан, сярод іх — В. Батураў, С. Грышкоў, чалавек незвычайнага лёсу, якому даводзілася трапляць у выключна складаныя ўмовы, не раз ён быў прысуджаны да пакарання смерцю. Загінуў С. Грышкоў у студзені 1944 г.

У пратаколе земскага сходу галосных Камаровіцкай валасной земскай управы ад 22 кастрычніка 1917 г. было запісана: «Прыняць у сваё распараджэнне ўсю маёмасць, якая значыцца па вопісах былога валаснога праўлення, аднолькава і ўсе бланкі, якія лічацца па існуючых грашовых кнігах»... Жыццё ў воласці пераходзіла на новыя рэйкі. У снежні 1917 г. праходзіў Мінска-Вілейскі губернскі сялянскі з'езд, на які ад Камаровіцкай воласці былі вылучаны чатыры дэлегаты — Дзмітрый Дубіна, Іван Швец, Іван Выбранец і Рыгор Марачкоў. У студзені 1918 г. дэпутатам у члены Мазырскага выканаўчага камітэта саветаў рабочых і сялянскіх дэпутатаў быў выбраны Мяфодзій Ракіцкі з в. Навасёлкі.

Хутка пасля перамогі Кастрычніка ў Беларусь уварваліся нямецкія захопнікі. Рэжым акупантаў працягваўся ў воласці з лютага па лістапад 1918 г. У мэтах аховы грамадзян ад захопнікаў у вёсцы ствараліся народныя дружыны. Выканкомы саветаў узначалілі барацьбу працоўных супраць акупантаў за аднаўленне савецкай улады. Сяляне ішлі добраахвотнікамі ў Чырвоную Армію.

Нядоўгім было зацішша на Палессі. У другой палове 1919 г. Мазырскі павет аказаўся ў цяжкім становішчы: войскі буржуазна-памешчыцкай Польшчы пачалі наступленне ў бок Мазыра і Калінкавіч. Польскія акупанты рабавалі насельніцтва, арыштоўвалі, расстрэльвалі людзей, саджалі ў турмы. Пры адступленні скошвалі зялёныя яравыя пасевы, забіралі жывёлу, хлеб, іншыя харчы. Гаспадарка воласці прыйшла ў заняпад. І, як толькі яна была вызвалена, сталі аднаўляцца органы савецкай улады — рэўкомы. У іх абавязак уваходзіла садзейнічанне Чырвонай Арміі, дапамога сем'ям чырвонаармейцаў, барацьба з дэзерцірамі, поўнае выкананне развёрстак, рамонт дарог, тэлефоннай сувязі. 18 ліпеня 1920 г. арганізаваны Камаровіцкі валасны рэвалюцыйны камітэт. Старшынёй рэўкома быў абраны Лазар Сцяпанавіч Назараў, членамі рэўкома — Рыгор Канстанцінавіч Гайдукоў і Андрэй Мітрафанавіч Ермалінскі. Усе яны — выхадцы з сялян, маладыя, поўныя творчай энергіі і энтузіязму, адданыя справе рэвалюцыі людзі. «Мы ўсе, як адзін, па першай неабходнасці станем на барацьбу з капіталізмам і ўсімі сродкамі будзем падтрымліваць Савецкую уладу», — запісана ў рэзалюцыі валасной беспартыйнай канферэнцыі 2 лістапада 1920 г.

Ворагі савецкай улады не раз нападалі на рэўкомы, забівалі адданых савецкім людзей. 1 мая 1921 г. іх ахвярай стаў старшыня Камаровіцкага рэўкома І. Р. Каляда. Урачыстым абяцаннем у адказ на забойства прагучалі словы на з'ездзе прадстаўнікоў сельскіх саветаў 8 мая 1921 г.: «Мы будзем змагацца з бандытамі ўсімі мерамі, каб змыць гэту ганебную пляму, і ў далейшым будзем ісці насустрач Савецкай уладзе ва ўсіх яе пачынаннях дзяржаўнага будаўніцтва...»

26 снежня 1922 г. адбыўся І з'езд саветаў Камаровіцкай воласці, на якім абмяркоўвалася Дэкларацыя IV з'езда Саветаў Беларусі аб утварэнні Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Прадстаўнікі працоўнага сялянства воласці, заслухаўшы і абмеркаваўшы Дэкларацыю, у сваёй рэзалюцыі пастанавілі «поўнасцю адобрыць гэта рашэнне».

У састаў Камаровіцкай воласці ўваходзіла 17 сельсаветаў: Камаровіцкі, Старагалоўчыцкі, Новагалоўчыцкі, Бобрыкаўскі 1, Бобрыкаўскі 2, Замосцкі, Вялікагарадзяцкі, Малагарадзяцкі, Ванюжыцкі, Навасёлкаўскі, Клясаўскі, Гурынскі, Фаставіцкі, Убібацькаўскі, Філіпавіцкі, Млыноцкі, пражывала каля 14 тысяч чалавек, якія ў пераважнай большасці займаліся сельскай гаспадаркай. Зямлі не хапала. Напрыклад, у в. Фаставічы ў 1922 г. быў 101 сялянскі двор, пражывала 579 чалавек і на іх долю прыходзілася

толькі 136 дзесяцін ворнай зямлі. Сялянская беднота надзялялася зямлёй з фондаў непрацоўнага карыстання — памешчыцкай і царкоўнай, ёй прадастаўляўся сельскагаспадарчы крэдыт на набыццё насення і прылад працы. На былой панскай зямлі быў арганізаваны саўгас «Камаровічы». Ён меў 324 дзесяціны ворнай зямлі, 500 дзесяцін пашы і 1400 дзесяцін лесу. У гаспадарцы налічвалася 12 кароў, 6 валоў, 5 коней, 6 цялят. Было 10 плугоў, 6 барон і 4 акучнікі. Нягледзячы на такую слабую матэрыяльную базу, у саўгасе атрымлівалі ўраджаі значна вышэйшыя, чым у аднаасобных гаспадарках. Працоўныя воласці дзяліліся апошнім куском хлеба з галадаючымі Паволжа.

У 1922—1923 гг. у воласці працавала 10 пачатковых школ, у якіх навучалася 652 вучні, з іх 152 дзяўчынкі, а ў некаторых школах іх зусім не было. Не хапала памяшканняў, падручнікаў, сшыткаў і алоўкаў. Бацькі рамантавалі памяшканні і інвентар, забяспечвалі школу палівам і нярэдка ўтрымлівалі за свой кошт настаўнікаў.

Ва ўсіх буйных населеных пунктах дзейнічалі хаты-чытальні. У валасным цэнтры працаваў клуб і бібліятэка. Вялікай папулярнасцю карыстаўся драматычны гурток. Медыцынскую дапамогу насельніцтву аказваў фельчарскі пункт, размешчаны ў Камаровічах.

У імя заўтрашняга дня

Напярэдадні першамайскіх свят Іван Каляда атрымаў з Мазыра прыемнае паведамленне: на чыгуначную станцыю для воласці паступіла насенне аўса, ячменю і проса. Трэба неадкладна засяваць пустыя палоскі зямлі, якімі надзялілі тых, хто яе раней не меў, а сеяць няма чым. Ён аддаў указанні, каб сабраліся з падводамі сяляне, сеў за стол і запісаў у кнігу загадаў: «Загад № 95 старшыні выканкома Камаровіч. 27 красавіка 1921 г. Ад'язджаючы ў гэты дзень на ст. Капцэвічы і Жыткавічы па авёс і проса на насенне для насельніцтва воласці, выкананне сваіх абавязкаў усладваю на члена выканкома Загорца».

1 мая Каляда зайшоў у будынак валвыканкома. Хацеў перагледзець спісы сялян, чырвонаармейцаў і беднякоў, якім прызначалася насенне, і хутчэй прыступіць да яго раздачы... Раптам парог пераступілі незнаёмыя людзі, у руках іх была зброя. Бандыты!.. Прагрымелі стрэлы. Трыццацігадовага старшыню валвыканкома расстралялі ва ўпор...

Нарадзіўся Іван Раманавіч Каляда 22 лютага 1891 г. у в. Зарэчка Капаткевіцкай воласці. Вучыцца ў школе не давялося, чытаць і пісаць навучыўся сам. Тры з паловай гады служыў у царскай арміі, быў кавалерыстам, ваяваў на руска-германскім фронце. Там уступіў у партыю бальшавікоў. Вярнуўся дадому, ажаніўся. У в. Заполле яго ведалі як выдатнага майстра-каваля.

26 ліпеня 1920 г., пасля вызвалення вёскі ад палякаў, Івана Каляду прызначылі ваенным камісарам Камаровіцкай воласці, 25 лістапада выбралі членам валаснога рэўкома — загадчыкам земельнага аддзела. Незадоўга да трагічнай падзеі на яго плечы ляглі абавязкі старшыні валвыканкома. Да апошняй хвіліны Іван Каляда жыў клопатамі пра людзей і пра заўтрашні дзень...

А. В. Солахаў

З успамінаў былога старшыні Капаткевіцкага валаснога рэўкома І. С. Кузьміча

...Пераправіліся (праз Пціч) на паўночны бераг ля в. Хвойня. Там, на беразе, сабралася многа народу. Але што ж там мы ўбачылі!.. Старшыня Лучыцкай воласці Анікей Нашук стаяў бледны, як смерць. Бандыты яго схапілі і на расправу аддалі.

Шуміць натоўп звярыным рыкам. Па камандзе бандыты пачалі біць Анікея па твары, па спіне, руках, нагах палкамі, каламі, вілами, нажамі. У крывавую мешанку ператварылі Анікея, ён упаў. Вочы яго яшчэ блішчаць, не про-

сіць літасці, толькі нянавісцю дыхае да ворагаў свабоды... Раздаўся стрэл з рэвальвера — і Анікей панік... Натоўп у жаху пачаў разбягацца.

Дыханне стаіўшы, мы, трое звязаных, з жахам глядзелі на гэту дзікую расправу мясцовых кулакоў над сваім аднавяскоўцам — багатырскай сілы чалавекам і сумленным бальшавіком, старшынёй рэўкома Лучыцкай воласці.

ИЗ ПРОТОКОЛА КОМАРОВИЧСКОГО ВОЛОСТНОГО СЪЕЗДА ЧЛЕНОВ ДЕРЕВЕНСКИХ И ДВОРОВЫХ КОМИТЕТОВ

2 марта 1919 г.

Мы, нижеподписавшиеся, все члены деревенских и дворовых комитетов, собравшиеся на волостной съезд в числе 52 человек от 69 всех, имеющих право голоса, в присутствии председательствующего Василия Боярина и секретаря Михаила Гуриновича обсуждали вопрос об организации отдела волостного социального обеспечения инвалидов, калек и проч. По обсуждению постановили: организовать отдел социального обеспечения при волостном ревкоме, заведующим этим отделом избрать члена ревкома Григория Леонтьевича Лаптева, обязанности секретаря возложить на секретаря ревкома Михаила Гуриновича...

Слушали распоряжение отдела народного образования Мозырского ревкома от 13 февраля с. г. за № 610 об организации отдела народного образования при волостном ревкоме, а потому постановили: организовать отдел народного образования при волостном ревкоме, заведующим отделом избрать учителя Никонора Дробова, делопроизводителем — учителя Якова Пырха и членом отдела — учителя Филиппа Жудро и гражд. Трофима Мухина.

Слушали распоряжение Мозырского ревкома от 25 февраля за № 801 об организации волостной избирательной комиссии по выборам сельских и волостных советов, по обсуждению постановили: организовать волостную избирательную комиссию, в члены комиссии выдвинуть партийных лиц, гражд. волости, товарищей: х. Замостье — Петра Степура, с. Ванюжичи — Демьян Кудравец, д. Новоселки — Демьян Сенько, д. Бобрик — Тарас Дудка, д. Филиповичи — Михаил Кукса, д. Головчицы — Трофим Мухин...

Имели суждение об избрании председателя в волостную продовольственную комиссию. Постановили: председателем продовольственной волостной комиссии избрать гражданина с. Комаровичи Степана Мухина, в члены включить члена волостного ревкома Самуила Ливчица и Григория Лаптева...

ФГА Гомельской обл. в г. Мозыре, ф. 269, оп. 1, д. 1, лл. 55—57.

ИЗ ОБЪЯСНИТЕЛЬНОЙ ЗАПИСКИ ПРЕДСЕДАТЕЛЯ КОМАРОВИЧСКОГО ВОЛОСТНОГО ИСПОЛКОМА ИВАНА ЗРЕНИКА

...Разграбление двух батарей (свыше 1000 пудов) картофеля в им. Комаровичи было совершено гражданами с. Комарович под руководством и подстрекательством бывшего председателя волостного ревкома Василия Бояринова. Брали и насыпали в мешки картофель ночью, кто посильнее и понахальнее, а беднота ожидала, что будет наделена картофелем при посредстве местной Советской власти. Когда утром сообщили, что две батареи картофеля разграблены, я, как председатель исполкома, взял с собой членов и контролера имения и милицию и арестовал картофель впредь до особого распоряжения. До этого картофель отпускался комиссией на основании решения схода граждан с. Комарович и д. Заполье по 8 руб. за пуд более нуждающемуся населению. Бедным допускался кредит. Бояринов Василий, увидев, что ему картофеля могут не дать, как имеющему полнадела земли, подговорил граждан с. Комарович, людей имущих, которые охотно пошли за ним, игнорируя распоряжения Советской власти, т. к. знали, что исполком стоит за бедноту, неимущих... Василий Бояринов является запевалой анархических мотивов, не уважая Советской власти, подрывает к ней доверие у населения.

Никакого другого имущества не расхищено.

Земельный отдел при исполкоме организован давно, но, ввиду занятия Мозыря петлюровцами, к исполнению своих обязанностей не приступал, а председатель земельного отдела сложил с себя полномочия. Доносы, которые дает на меня Бояринов письменно и устно в Мозырь, являются гнусной клеветой озлобленного человека, как бывшего председателя ревкома и мечтающего занять эту должность...

1 мая 1919 г.

ФГА Гомельской обл. в г. Мозыре, ф. 269, оп. 1, д. 34, л. 29.

Рэўкомаўцы

Дзягцяр Сяргей Кузьміч (н. у 1891 г. у в. Грабаў) — беспартыйны, селянін-бядняк. Служыў радавым у 36-м пяхотным палку. З 13 ліпеня 1920 г. — член Грабаўскага рэўкома, загадчык зямельнага аддзела.

Гуткоўскі Міхаіл Андрэевіч (н. у 1876 г.) — селянін в. Міхедавічы, беспартыйны. Адукацыю атрымаў у хатняга настаўніка. З 13 ліпеня 1920 г. — старшыня Грабаўскага рэўкома.

Кебец Максім Цярэнцьевіч (н. у 1880 г. у в. Грабаў) — беспартыйны, селянін. У царскай арміі — старшы унтэр-афіцэр, ваяваў на германскім фронце. У 1919 г. — старшыня Грабаўскага валвыканкома, з 13 ліпеня 1920 г. — член Грабаўскага рэўкома, загадчык аддзела кіравання. 15 жніўня 1920 г. ён пісаў: «Улада сапраўды правільная, як абаронца бедняка, але правядзенне камуны з'яўляецца несвоечасовым»...

Навічэнка Трафім Навумавіч (н. у 1892 г. у в. Грабаў) — селянін, нежанаты. Адукацыю атрымаў у хатняга настаўніка. У царскай арміі служыў яфрэйтарам. З 13 ліпеня 1920 г. — член Грабаўскага рэўкома, загадчык аддзела працы.

Гайдукоў Рыгор Канстанцінавіч (н. 12.6.1890 г. у в. Новыя Галоўчыцы) — беспартыйны, селянін. У 1902 г. скончыў адзін клас народнага вучылішча. Служыў у царскай арміі, выбіраўся членам савета рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў. У 1919 г. з'яўляўся членам Камаровіцкага рэўкома. Пасля выгнання палякаў з ліпеня 1920 г. — загадчык аддзела працы рэўкома. «Савецкую ўладу, — пісаў ён у анкеце 18 жніўня 1920 г., — адабраю як тую, якая аб'ядноўвае ўсе працоўныя класы і абараняе беднату»...

Ермалінскі Андрэй Мітрафанавіч (н. 22.10.1889 г. у в. Камаровічы) — селянін, меў 1 дзесяціну зямлі, 2 каровы, 2 цялушкі, 5 авечак. У 1904 г. скончыў адзін клас Камаровіцкага народнага вучылішча. Служыў у царскай арміі малодшым унтэр-афіцэрам, у гады рэвалюцыі забяспечваў харчаваннем 507-ы Рэчыцкі полк. З 28 чэрвеня да 26 жніўня 1919 г. працаваў загадчыкам зямельнага аддзела Камаровіцкага рэўкома, на гэтай пасадзе быў і пасля выгнання палякаў.

Назараў Лазар Сцяпанавіч (н. 3.11.1888 г.) — беспартыйны, нежанаты. Служыў у царскай арміі старшым унтэр-афіцэрам, ваяваў на германскім фронце і трапіў у палон. Вярнуўшыся на радзіму, жыў у в. Камаровічы. З 28 чэрвеня да 26 жніўня 1919 г. і пасля выгнання палякаў — старшыня Камаровіцкага рэўкома.

Арыновіч Фёдар Рыгоравіч (н. 22.4.1897 г. у в. Чалюшчавічы) — беспартыйны, селянін-бядняк. У 1910—1914 гг. вучыўся ў Петрыкаўскім вышэйшым пачатковым вучылішчы, у 1917 г. скончыў Дзвінскую гімназію. Служыў у царскай арміі пісарам палкавой канцылярыі. Да польскай акупацыі працаваў настаўнікам Капаткевіцкай школы. У 1919 г. — старшыня сельсавета і старшыня валаснога кааператыва. З 13 ліпеня 1920 г. — старшыня Капаткевіцкага рэўкома.

Красоўскі Пётр Паўлавіч (н. у 1884 г. у м. Капаткевічы) — мешчанін, служыў чыноўнікам ваеннага ведамства. Да лютага 1917 г. загадваў лазарэтам 43-га палка, выбіраўся старшынёй Савета салдацкіх дэпутатаў. З 13 ліпеня 1920 г. — член Капаткевіцкага рэўкома, загадчык зямельнага аддзела.

Пігулеўскі Цімафей Сцяпанавіч (н. у 1887 г. у м. Капаткевічы) — мешчанін, нежанаты. У 1903—1906 гг. вучыўся ў Рагачоўскім гарадскім вучылішчы, у 1912—1916 гг. — ва універсітэце. Валодаў беларускай, рускай, лацінскай, французскай, нямецкай, польскай, сербскай мовамі. У царскай арміі служыў радавым, з 1919 г. настаўнічаў, выбіраўся старшынёй савета Капаткевіцкай працоўнай школы. З 28 ліпеня 1920 г. — член Капаткевіцкага рэўкома, загадчык аддзела адукацыі.

Расоўскі Сроль Беніямінавіч (н.

15.3.1873 г. у м. Капаткевічы) — служачы, да ваеннай службы прызнаны непрыгодным. У 1919 г. выбіраўся членам Капаткевіцкага рэўкома, з 13 ліпеня 1920 г.— член рэўкома, загадчык аддзела працы.

Есьмановіч Аляксандр Фаміч (н. у 1884 г. у в. Касевічы) — селянін, вучыўся ў сельскай школе. У царскай арміі — радавы. Выбіраўся старшынёй сельскага савета, з 18 ліпеня 1920 г.— загадчык аддзела працы Лучыцкага рэўкома.

Лабовіч Сцяпан Пятровіч (н. у 1892 г.) — жыхар хутара Студзеньскае Лучыцкай воласці. У царскай арміі — пісар штаба дывізіі. З 18 ліпеня 1920 г.— член Лучыцкага рэўкома.

Маставы Міхаіл Ігнатавіч (н. у 1894 г. у в. Яўсеевічы) — селянін, служыў рахункаводам у земскага начальніка 8-га Мазырскага ўчастка. У 1917 г. займаў пасады справавода Мінскага ссуднага камітэта, рахункавода будаўнічага ўпраўлення ў Мінскім раёне. З 10 сакавіка да 22 жніўня 1919 г.— рахункавод нацыяналізаванага маёнтка Слабада. Пасля вызвалення Лучыцкай воласці ад палякаў увайшоў у склад рэўкома, узначальваў зямельны аддзел, затым абраны старшынёй рэўкома.

Ходзька Рыгор Аляксеевіч (н. у 1880 г. у в. Хвойня) — селянін-бядняк, меў сямёра дзяцей. У 1917 г. выбраны сельскім старастам в. Хвойня. З сакавіка 1919 г. працаваў старшынёй Хвойненскага сельсавета, у час польскай акупацыі знаходзіўся ў партызанскім атрадзе. З ліпеня 1920 г.— старшыня Ляскавіцкага валаснога рэўкома.

Бамбіза Ніканор Фёдаравіч (н. у 1888 г.) — селянін, служыў у царскай арміі радавым 301-га пяхотнага палка. У час польскай акупацыі выбіраўся старастам. З 17 ліпеня 1920 г.— член Ляскавіцкага рэўкома.

Бамбіза Сцяпан Лявонцьевіч (н. 2.8.1893 г.) — беспартыйны, малазямельны. Служыў у царскай арміі ў 38-м марцірным дывізіёне. Да прыходу палякаў працаваў старшынёй Ляскавіцкага рэўкома.

Буднік Дзмітрый Іванавіч (н. 8.2.1866 г. у в. Ляскавічы) — селянін-бядняк, меў сям'ю з васьмі чалавек. Служыў у царскай арміі фейерверкерам батарэі палявой артылерыі. У 1915 г. выбіраўся сельскім старастам, з 1916 г.— член крэдытнага таварыства. З 18 ліпеня 1920 г.— член Ляскавіцкага рэўкома.

Літаш Захар Архіпавіч (н. 23.3.1867 г.) — беспартыйны, малазямельны, сям'я складалася з 14 душ. Адзін з сыноў быў міліцыянерам, у час польскага наступлення адступаў з войскамі Чырвонай Арміі і загінуў. З. А. Літаш з 1910 г. выбіраўся членам Ляскавіцкага крэдытнага таварыства, з сакавіка 1917 г. да 1918 г.— член харчовага камітэта. 18 ліпеня 1920 г. каптаваны членам Ляскавіцкага валрэўкома. Лічыў, што «савецкая ўлада — самая добрая і падыходзячая ўлада для беднага насельніцтва».

Туравец Севасцьян Іванавіч (н. 19.12.1881 г. у в. Ляскавічы) — беспартыйны, селянін. Да 1914 г. працаваў рабочым у французскім акцыянерным таварыстве. З 17 студзеня да 14 кастрычніка 1918 г.— старшыня земскай управы Ляскавіцкай воласці, з 17 ліпеня 1920 г.— старшыня рэўкома.

Кебец Дзмітрый Іванавіч (н. у 1897 г. у м. Петрыкаў). У 1912 г. скончыў Петрыкаўскае гарадское вучыліш-ча, вытрымаў іспыты ў Мазырскай гімназіі на званне настаўніка двухкласных вучылішчаў. У армію прызваны 15 мая 1916 г., служыў пісарам у 2-й артылерыйскай дывізіі. У маі 1917 г. уступіў у партыю бальшавікоў, у кастрычніку таго ж года выбраны членам Смаленскага Савета рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў. У час польскай акупацыі — на падпольнай рабоце, быў арыштаваны. Пасля вызвалення Петрыкава — член Петрыкаўскага валаснога ваенрэўкома, загадчык аддзела працы.

Лапета Пётр Іванавіч (н. у 1891 г. у м. Петрыкаў) — беспартыйны, з мяш-

чан. Да 1917 г. служыў у царскай арміі, у лютым — ліпені 1917 г. з'яўляўся членам Мінскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў, затым да сакавіка 1918 г. быў старшынёй Петрыкаўскага валаснога харчовага камітэта. З ліпеня 1920 г. — член Петрыкаўскага валаснога ваенрэўкома, загадчык зямельнага аддзела.

З рэгістрацыйных анкет ФДА Гомельскай вобл. у г. Мазыры, ф. 307, воп. 2, с. 1; ф. 79, воп. 1, с. 3.

ДОКЛАД БЫВШЕГО ЧЛЕНА МОЗЫРСКОЙ ПОДПОЛЬНОЙ ОРГАНИЗАЦИИ КП(б) ЛиБ М. А. АНДРЕЕВА (ШЕЙНКМАНА)

30 июля 1920 г.

...Налет польских контрреволюционных банд на Мозырь был так неожидан, что т. Богданович (член Мозырского комитета партии большевиков) не успел передать мне связи и пароли с Пинской, Слуцкой, Бобруйской и др. подпольными организациями, потому в месяце марте мы особенно плодотворной работы не проявили. В начале апреля к нам приехал т. Прокопчук, присланный ЦК ЛитБел сначала в Мозырь, затем Мозырским подпольным комитетом он был направлен в Брест-Литовск... Цель приезда т. Прокопчука была: во-первых, получить средства для работы Брест-Литовской и Пинской организаций, которые (по его словам) в последнее время не имели связи со Смоленском и крайне нуждались в средствах, во-вторых, связаться с Мозырской организацией для переброски в Пинск части литературы, которая находилась в Мозыре. Связавшись через т. Прокопчука с Пинском, я поехал в м. Петриков, где была подпольная организация, связался с ними, и они приступили к переправе литературы на Пинск. Из Брест-Литовска прибыл т. Злотников, который работал в Мозырской подпольной организации. Злотников остался в Петрикове руководить работой петриковских товарищей. В деревне Лучицах мной был организован передаточный пункт и склад для литературы. Затем была отправлена первая партия литературы в количестве пяти пудов; через несколько времени отправлена вторая партия литературы в количестве четырех пудов...

Я получил сведения о провале в Петрикове. Немедля поспешил туда — оказалось, что была арестована часть литературы, которая хранилась у т. Мицкевича Лаврена. Сам Мицкевич был вовремя об этом предупрежден и скрылся. Устроив совещание с товарищами, мы решили, что необходимо загладить следы провала посредством подкупа польской жандармерии, на что последние всегда охотно шли. Для них через одного гражданина м. Петрикова была устроена выпивка, где они обещали оправдать Мицкевича Л. Но по истечении нескольких дней Мицкевич Л. был арестован и после допросов помещен в местную тюрьму, откуда ему удалось сбежать. Прошло довольно продолжительное время, мы принялись снова за работу. От т. Злотникова приехал из Петрикова т. Серапин, который привез доклад и отчет о работе. В тот же день был арестован один из наших складов литературы, это совпадение навело подозрение на т. Серапина, и мной были приняты некоторые меры по отношению к Серапину.

Затем через несколько дней были произведены обыски у меня в квартире и в квартире т. Сафьяна, где арестовали Сафьяна и моего брата, который случайно ночевал у меня, я же вовремя скрылся. В тот же день были привезены из Петрикова тт. Злотников, Шпак и член ячейки т. Турецкий. Тогда же арестован был еще один наш склад литературы, а также печать организации и все документы. Т. Шпаку, как он сам передает, удалось скрыться, тт. же Сафьян, Злотников и Турецкий после жестоких пыток были отправлены из Мозыря, вероятно, в концентрационный лагерь. Брат мой, просидев пять дней в тюрьме и испытав все орудия пыток, от которых он теперь болен, был освобожден. Перед отправкой Сафьян передал моему брату для передачи мне, что у него есть материал, что провоцировали организацию тт. Шпак и Серапин и что Злотников во время пытки выдал всех товарищей Мозырской и Пинской организаций. Я же скрывался до освобождения Мозыря от гнета польской шляхты...

ЦК КПЛиБ, приняв от меня подробный доклад о работе и о провале организации, распорядился дело о провокаторах передать в Мозырскую партийную тройку.

Состав Петриковской организации:
1. Мицкевич Стефан.
2. Мицкевич Лаврен.
3. Шпак Петр.
4. Серапин Фома (уже во время оккупации привлеченный к работе).

Андреев

Гомельский государственный областной архив, ф. 68, оп. 1, д. 7, лл. 3—4.

Заціхлі віхуры...

Звесткі аб колькасці саўгасаў (маёнткаў), іх знаходжанні, колькасці рабочых і батрацкіх камітэтаў

20 жніўня 1920 г.

Грабаўская воласць: м. Сялюцічы; Камаровіцкая воласць: м. Ванюжычы, Камаровічы, Філіпавічы; Капаткевіцкая воласць: м. Канстанцінава (20 рабочых, батрацкі камітэт), Мышанка, Чалюшчавічы (12 рабочых, батрацкі камітэт); Лучыцкая воласць: м. Дуброва, Капцэвічы, Лучыцы; Ляскавіцкая воласць: м. Брынёў (21 рабочы, батрацкі камітэт), Дарашэвічы (26 рабочых, батрацкі камітэт), Судзібар (16 рабочых), ф. Паўлінава, Лобча; Петрыкаўская воласць: м. Конкавічы, Аголічы, Слінкі, Петрыкаў.

Ч. загадваючы павятовым земаддзелам
Загадваючы райсаўгасам

Гомельскі дзяржаўны абласны архіў, ф. 68, воп. 1, с. 56, лл. 2—3.

ИЗ ДОКЛАДА МОЗЫРСКОГО УЕЗДНОГО РЕВКОМА О ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ВОЛРЕВКОМОВ С МОМЕНТА ИХ ОРГАНИЗАЦИИ ПО 1 СЕНТЯБРЯ 1920 г.

...3. Грабовский волревком

Волревком организован 31 июля с. г... При волревкоме созданы следующие отделы: управления, земельный, продовольственный и комтруд. Организовано 5 сельских советов. Взяты на учет все лесные материалы и дрова. Составлены списки: заседателей нарсуда, польского населения в волости, семейств красноармейцев на получение пайка и граждан, пострадавших от контрреволюции. Открыты 4 избы-читальни. Собраны с полей яровые хлеба в им. Селютичи. Взято на учет сено, накошенное на болотах, и фруктовый сад в заст. Михедовичи. Переписаны все дойные коровы волости, взяты на учет имеющиеся ульи, сделана разверстка скота для реквизиции. Подготовляются списки бедноты. Взято на учет все мужское население волости от 16 до 40 лет, а также лошади, волы, возы и проч. Кроме вышеуказанного исполнено следующее: установлено гужевое движение по доставке корреспонденции на ближайший почтовый пункт, организована комиссия по борьбе с дезертирством. В состав волревкома входят председатель и 4 члена, все беспартийные...

...7. Комаровичский волревком

Волревком организован 18 июля с. г. съездом сельских советов волости, последние были организованы 6. председателем Комаровичского волисполкома в количестве 22. При волревкоме организованы следующие отделы: управления, земельный, продовольствия и комтруда...

...Волость разбита на 4 района. 8 августа был митинг по поводу недели больного и раненого красноармейца. Произведен сбор и собрано следующее: 4190 руб. деньгами, 29 п. 5 ф. ржи, 41 п. муки, 3 п. 31 ф. крупы, 25 пуд. гречихи, 20 ф. ячменя, 19 ф. сала, 2 ф. масла, 1273 яйца, 39 ф. сыра, 4 ф. ягод сухих, 39 шт. сорочек, 12 шт. кальсон, 150 арш. холста, $^1/_2$ ф. табака, 20 карандашей и 140 конвертов. В состав волревкома входят председатель и 3 члена — все беспартийные. Деятельность ревкома слаба.

8. Копаткевичский волревком

Волревком организован 12 июля с. г. военкомом 170-й бригады. При волревкоме существуют следующие отделы: управления, земельный, народного образования, продовольственный и комитет труда. Издан приказ о недопущении потрав и рубки леса. Взяты на учет мельницы. Образована комиссия по регистрации убытков, причиненных польскими бандами. Взяты на учет все свободные сенокосы и земли, а также кожевенные заводы и мельницы. Изданы постановления о сдаче населением оружия и вещей, оставленных польскими бандами. Составлен список всего населения мужчин от 18 до 50 лет и женщин от 18 до 45 лет. Взяты в ведение ревкома фруктовые сады при имениях. 3 августа с. г. был съезд представителей сельских советов волости, на котором по текущему моменту вынесли следующее: приветствовать нашу Красную Армию и ее вождей... Все на борьбу против дезертирства, между нами не должно быть шкурников, все способные носить оружие — на Красный фронт... Решили избрать комиссию по сбору подарков для Красной Армии. В состав волревкома входят председатель и 5 членов, все беспартийные.

...12. Лучицкий волревком

Волревком организован 18 июля с. г. съездом делегатов Лучицкой волости. При волревкоме организованы следующие отделы: управления, народного образования, земельный и комтруд. Составлен список всех дезертиров в волости и список их имущества. 5 августа был устроен съезд представителей волости... Деятельность Лучицкой волости, сравнительно с другими, очень хорошая: аккуратно доставляются протоколы заседаний волревкома, исполняются различные распоряжения. В состав ревкома входят председатель и 4 члена, все сочувствующие партии большевиков.

13. Лясковичский волревком

Волревком организован 17 июля с. г. В состав волревкома входят следующие отделы: управления, земельный и продовольственный. 4 августа с. г. был съезд представителей волости... Ввиду того что население добывает спирт из земли около ректификационного завода, вылитый в 1915 г., постановили немедленно принять меры к прекращению добывания спирта; лиц, не подчиняющихся распоряжению, арестовать и разыскать аппараты, перегоняющие спирт, для уничтожения таковых... Работа в Лясковичской области удовлетворительная. В состав волревкома входят председатель и 4 члена, все беспартийные.

...16. Петриковский волревком

Волревком организован 12 июля с. г. военкомом 510-го стрелкового советского полка. Постановили: 1) составить опись имущества лиц, бежавших от Советской власти; 2) установить охрану над имуществом имений. При ревкоме организованы следующие отделы: управления, земельный, народного образования, продовольственный, военкомата и милиции. Взяты на учет мельницы волости... Доставлено 86 деревьев для исправления железнодорожного моста через р. Бобрич. Составлены списки всех пострадавших от контрреволюции. Открыта советская гостиница, столовая и организован детский очаг на 50 детей-сирот и беднейшего населения. Национализированы фруктовые сады при имениях... 1 августа председатель волревкома был арестован по распоряжению уполномоченного Реввоенсовета Запфронта т. Левина и отправлен в Пинск... 20 августа с. г. на должность председателя Петриковского волревкома был назначен инструктор информационно-инструкторского подотдела при отделе управления... Избрана комиссия из 3 лиц по проведению недели продовольствия и о реквизиции у жителей волости скота для нужд Красной Армии, а именно: 75 голов крупного и 88 голов мелкого. Население волости относится сочувственно к проводимой неделе продовольствия и реквизиции скота...

ФГА Гомельской обл. в г. Мозыре, ф. 307, оп. 1, д. 2, лл. 55—62.

ИЗ ДОКЛАДА ОТДЕЛА ДЕРЕВОПЕРЕРАБАТЫВАЮЩЕЙ ПРОМЫШЛЕННОСТИ МОЗЫРСКОМУ ВОЕННО-РЕВОЛЮЦИОННОМУ КОМИТЕТУ

28 августа 1920 г.

...5. Фанерно-лесопильный завод ст. Птичь

Завод сожжен поляками. Главные части машин, пасы, пилы и проч. забрано поляками, лесные материалы и фанера также вывезены немедленно по оставлении Птичи Советскими властями. Будут приняты меры отделом деревообрабатывающей промышленности к сбору оставшегося имущества машин. Часть инвентаря, оставшегося от пожара, будет использована для других заводов. Завод взят на учет 27 июля 1920 г. Временным заведующим назначен Франц Пущин.

...9. Петриковский лесопильный завод

Завод взят на учет 3 августа. Временным завед. назначен т. Фридман. Машинные части нуждаются в довольно значительном ремонте, требуется ремонт здания. Запаса смазочных и прочих материалов нет. Нет некоторых ремней. Необходим слесарный инструмент, наждачные камни...

...11. Лесопильно-бочарный завод Белый Переезд

Завод взят на учет 30 июля 1920 г. На заводе имеется два локомобиля, два лесопильных станка и бочарное отделение. Завод находится на расстоянии 40 верст от железной дороги, несмотря на то что он

сохранился в годном для пуска в ход состоянии, вопрос о пуске подлежит рассмотрению райлескомом ввиду трудности снабжения сырьем и вывоза готового материала. Предполагается перенос одного локомобиля с лесопильным станком на ст. Житковичи, где производство более благоприятно в транспортных условиях. Временным завед. назначен т. Барон.

12. Лесопильно-бочарный завод Филиповичи

Завод взят на учет 29 июля 1920 г. Принимая во внимание отдаленность завода от железной дороги (около 30 верст), необходимо перенести в Житковичи часть машин. Локомобиль необходимо оставить для функционирования мельницы и бочарного завода. Необходимо исправить крышу, полы, произвести ремонт станков и машин. Временным заведующим назначен т. Бабенчук.

Завед. отделом деревообраб. промышлен.

ФГА Гомельской обл. в г. Мозыре, ф. 307, оп. 3, д. 1, лл. 92—93.

ДОКЛАД ПРЕДСЕДАТЕЛЯ КОМАРОВИЧСКОГО ВОЛОСТНОГО ВОЕНРЕВКОМА Н. ВАВРИЩУКА О ПОЛОЖЕНИИ ДЕЛ В КОМАРОВИЧСКОЙ ВОЛОСТИ ЗА НОЯБРЬ – ДЕКАБРЬ 1920 г.

1920 г. ноября 1 дня согласно предписанию Мозырского Увоенревкома я прибыл в Комаровичскую волость для принятия от бывшего председателя Назарова Комаровичского волвоенревкома. Состав ревкома был кулацкий,... вследствие чего являлся самым черносотенным и до крайности контрреволюционным настроением, все распоряжения центра не только не выполнялись, но делалась масса таких распоряжений, которые в корне подрывали Советскую власть... Приняв ревком, мне хотелось знать настроение массы в связи с наступлением поляков. Случаем к этому явилась беспартийная конференция, созванная 2 ноября в присутствии инструкторов тт. Алиферовича и Левковича. Делегатами на эту конференцию явились представители обществ Комаровичской волости в числе 32 человек из общего числа 41 вызывавшихся. Среди явившихся делегатов было много враждебно настроенных по отношению к власти. Резолюция конференции выработана мною... Делегатами задавались вопросы следующего характера: «Будет ли Белоруссия самостоятельна? А если она будет самостоятельна, то будет ли в ней Советская власть?» При выносе резолюций помогать всеми средствами Красной Армии раздавались крики: «Мы то помогаем, а чем же нам помогают?», «Уже надоело помогать». Только благодаря умелому ведению конференция не была сорвана.

Вслед за беспартийной конференцией 5 ноября мною был созван съезд сельсоветов. На съезде сельсоветов прений было меньше, так как делегатами съезда являлись председатели сельсоветов Комаровичской волости и их заместители — люди, сами стоящие у власти... Чувства, выраженные в резолюции съезда, некоторыми из председельсоветов проявились на деле. Стали поступать в волвоенревком заявления, что такой-то и такой-то дезертир скрывается там-то. Некоторые же из председельсоветов по-прежнему остались безучастны. Правда, халатность к службе со стороны некоторых из председельсоветов объясняется тем, что они не получали и не получают от власти никакой оплаты. Этот недостаток мною был подмечен, но помочь делу не было никакой возможности, ибо касса ревкома при приеме такового оказалась пустою... За такой короткий срок работы я, безусловно, не мог поставить дела на стальные ноги, потому что в первую очередь пришлось повести интенсивную борьбу с дезертирством, установить бдительный надзор за проникновением польских шпионов, так как ревком работал в 10 верстах от польских войск. Говоря о работе ревкома, я должен отметить, что по делу народного образования ко дню годовщины революции мною было открыто и налажено всего лишь 5 училищ, остальные не могли быть открыты. К этому времени за недостатком отчасти школьных помещений, а также и шкрабов, к тому же само население в таких обществах не пошло навстречу волревкому.

Самый день праздника революции в Комаровичской волости был проведен блестяще. Повестка дня была следующая: в 4 часа дня был устроен громадный митинг, для чего было приглашено все население волости. Для успешного проведения митинга мною были приглашены военный комиссар 86-го полка, комбаты и политруки, кроме местного населения на митинге присутствовали и войсковые части, находившиеся в районе волости. В 7 часов вечера был дан спектакль на тему «Бувальщина», после чего был концерт; вечер закончился танцами...

Отмечая о положении дел в Комаровичской волости, в каком она сейчас находится, я должен сознаться, что за последний срок таковое сильно пошатнулось. Комаровичская волость сейчас больна эпидемически и больна опасно. Причина этой эпидемической болезни — балаховщина, поголовное дезертирство и злостный бандитизм. В 1919 г. Комаровичская волость от призыва в Красную Армию отказалась, в 1920 г. хотя сразу и все явились в назначенный срок мобилизации, но благодаря неоднократной эвакуации уезда и подхода войск противника в ней развилось дезертирство, и так как по сложившимся военным обстоятельствам волость очутилась в нейтральной полосе, то дезертирство в ней развилось и приняло

угрожающие размеры. Из дезертиров с течением времени образовались банды и заполнили собою прилегающие леса Комаровичской, Грабовской и Дяковичской волостей. С момента появления на фронте Балаховича, дезертирство приняло организованный характер и под предводительством своих вожаков начало нападать даже на отдельные войсковые части Красной Армии... 5 ноября был убит красноармеец тов. Лейкин, 24 ноября была обстреляна разведка при дер. Фастовичи в количестве 30 человек, причем с нашей стороны были убитые и раненые. При этом само население идет навстречу дезертирству, как своим сыновьям, кормит их и укрывает. Например, убитые и раненые разведчики при дер. Фастовичи были немедленно сокрыты населением той же деревни. Есть сведения, что таковые потоплены в реке Орессе. Банды дезертиров смотрят на ревком как на своего личного врага, ввиду чего я лично неоднократно получал анонимные письма с угрозой убить меня...

ФГА Гомельской обл. в г. Мозыре, ф. 307, оп. 1, д. 5, лл. 86—89.

ДОНЕСЕНИЕ ВОЕННОГО КОМИССАРА ЛУЧИЦКОЙ ВОЛОСТИ В МОЗЫРСКИЙ УЕЗДНЫЙ ВОЕНКОМАТ

8 декабря 1920 г.

Доношу, что в дни налета балаховской банды 15-летний мальчик из Лучиц Андрей Елизаров по моему приказанию делал деятельную разведку, добывал и сообщал важные сведения, чем дал мне возможность своевременно спрятать канцелярию и поставить в известность особоуполномоченного дивизии. Благодаря упоминаемому мальчику балаховцам не удалось застигнуть нас внезапно.

Докладывая о вышеизложенном, прошу, если признаете возможным, для поощрения среди населения выдать по своему усмотрению вознаграждение для Елизарова Андрея через уездвоенкомат.

Лучицкий волвоенком
Делопроизводитель

ФГА Гомельской обл. в г. Мозыре, ф. 307, оп. 1, д. 6, л. 38.

СПИСОК СЛУЖАЩИХ КОМАРОВИЧСКОГО РЕВКОМА (ДЕКАБРЬ 1920 г.)

Имена, отчества и фамилии	Занимаемая должность	Возраст	Характеристика
Вавpищук Николай Кондратьевич	Председатель ревкома	28	Коммунист, активный работник
Баранов Андрей Андреевич	Секретарь управления	45	Беспартийный, усердный канцелярский работник
Коледа Иван Романович	Член ревкома и зав. зем. отд.	30	Коммунист, малограмотный, прилежный работник
Ермолинский Андрей Митрофанович	Делопроизвод. зем. отд.	32	Кулак, беспартийный, находится под контролем Коледы
Гайдуков Георгий Константинович	Зав. волкомтруда	31	Беспартийный, бедняк
Лифшиц Шмуйло Хаимов	Делопроизвод. комтруда	45	Беспартийный, усердный канцелярский работник
Масаковский Василий Петрович	Военком	27	Коммунист, активный работник
Рудзинский Феофил Алексеевич	Делопроизвод. военкома	28	Коммунист, прилежный работник
Новохацкий Андрей Афанасьевич	Завед. отд. народобр.	32	
Кисель Дмитрий	Зав. продотд.	37	Соч. коммунизму, бедный, усердный работник
Гуринович Петр Иосифович	Делопроизвод. продотд.	23	Канцелярский служитель
Сливец Савва Михайлович	Сторож	47	Беспартийный, бедняк

ФГА Гомельской обл. в г. Мозыре, ф. 269, оп. 1, д. 7, л. 72.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ ЛЯСКОВИЧСКОГО ВОЛОСТНОГО РЕВОЛЮЦИОННОГО КОМИТЕТА

14 декабря 1920 г.

Лясковичский волостной революционный комитет, рассмотрев выборное производство по выбору сельских комитетов Лясковичской волости,постановил: утвердить сельские комитеты в следующем составе

Название комитета	Председатель	Секретарь	Член комитета
Лясковичский	Будник Софрон	Стульба Александр	Туровец Семен
Дорошевичский	Жуковец Герасим	Пинчук Павел	Пашук Иван
Голубицкий	Пашук Иван	Пашук Никифор	Литвин Дмитрий
Вышеловский	Морозько Иван	Голод Трофим	Марцинкевич Яков
Турокский	Хальченя Иван	Пилецкий Устин	Жуковец Михаил
Рубчанский	Домасевич Федор	Занкевич Иосиф	Прикота Макарий
Снядинский	Руцкий Андрей	Шовкович Владимир	Руцкий Павел
Бринёвский	Пинчук Софрон	Шаруба Антон	Тереня Роман
Копщевичский	Жуковец Яков	Козлович Михаил	Баранич Петр
Копщевичская фабрика	Копацевский Иосиф	Новик Александр	Мялевский Николай
Бакланский	Туровец Тимофей	Авдеев Степан	Стельмашонок Иван

Председатель волревкома
Представитель Мозырского уревкома
Секретарь

ФГА Гомельской обл. в г. Мозыре, ф. 103, оп. 1, д. 2, л. 115.

ШЛЯХАМ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ ПЕРАЎТВАРЭННЯЎ

Адгрымелі баі грамадзянскай вайны. За кароткі тэрмін валасныя рэвалюцыйныя камітэты аднавілі ў мястэчках і вёсках Петрыкаўшчыны савецкую ўладу, выканаўшы задачы, якія на іх ускладаліся. 5 студзеня 1921 г. Мазырскі павятовы ваенна-рэвалюцыйны камітэт сваім загадам скасаваў валасныя рэўкомы, часова пакінуўшы толькі некаторыя з іх, у тым ліку Петрыкаўскі. Усе справы ў валасцях былі перададзены выканаўчым камітэтам. Па просьбе Камаровіцкага валрэўкома тэрмін яго функцыянавання быў таксама падоўжаны да сярэдзіны сакавіка 1921 г.

Палітычная і эканамічная сітуацыя была вельмі складаная. Разгул бандытызму, па дарогах страшна было ісці і ехаць. У лясах хаваліся розныя ўзброеныя атрады, якія ў канцы 1920 г. папоўніліся недабітымі балахоўцамі. Узброеныя банды засылаліся таксама з тэрыторыі Польшчы. Яны нападалі на савецкіх работнікаў і чырвонаармейцаў, рабавалі і знішчалі мірных вясковых жыхароў. 22 лютага 1921 г. быў абрабаваны жыхар в. Фаставічы Піліп Бараноўскі. Ноччу 28 лютага праз акно быў забіты грамадзянін в. Востраў Яфрэм Бубіч. 19 сакавіка трое бандытаў напалі на дом грамадзяніна в. Фаставічы Лейзера Шлепянтоха, застрэлілі яго жонку, забралі адзенне, посуд і іншыя рэчы. 20 сакавіка на дарозе Навасёлкі — Заполле стрэлам з вінтоўкі забіты фурман, жыхар в. Старыя Галоўчыцы Харытон Мухін, які вёз кантралёра млыноў. 30 сакавіка банда, што з'явілася з боку в. Грабаў, абстраляла рабочых, якія працавалі ў лесе. 1 мая каля паўсотні чалавек напалі на будынак Камаровіцкага валвыканкома, забілі старшыню выканкома Івана Каляду, знішчылі

ПОСТАНОВЛЕНИЕ ЛЯСКОВИЧСКОГО ВОЛОСТНОГО РЕВОЛЮЦИОННОГО КОМИТЕТА

14 декабря 1920 г.

Лясковичский волостной революционный комитет, рассмотрев выборное производство по выбору сельских комитетов Лясковичской волости,постановил: утвердить сельские комитеты в следующем составе

Название комитета	Председатель	Секретарь	Член комитета
Лясковичский	Будник Софрон	Стульба Александр	Туровец Семен
Дорошевичский	Жуковец Герасим	Пинчук Павел	Пашук Иван
Голубицкий	Пашук Иван	Пашук Никифор	Литвин Дмитрий
Вышеловский	Морозько Иван	Голод Трофим	Марцинкевич Яков
Турокский	Хальченя Иван	Пилецкий Устин	Жуковец Михаил
Рубчанский	Домасевич Федор	Занкевич Иосиф	Прикота Макарий
Снядинский	Руцкий Андрей	Шовкович Владимир	Руцкий Павел
Бринёвский	Пинчук Софрон	Шаруба Антон	Тереня Роман
Копщевичский	Жуковец Яков	Козлович Михаил	Баранич Петр
Копщевичская фабрика	Копацевский Иосиф	Новик Александр	Мялевский Николай
Бакланский	Туровец Тимофей	Авдеев Степан	Стельмашонок Иван

Председатель волревкома
Представитель Мозырского уревкома
Секретарь

ФГА Гомельской обл. в г. Мозыре, ф. 103, оп. 1, д. 2, л. 115.

ШЛЯХАМ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ ПЕРАЎТВАРЭННЯЎ

Адгрымелі баі грамадзянскай вайны. За кароткі тэрмін валасныя рэвалюцыйныя камітэты аднавілі ў мястэчках і вёсках Петрыкаўшчыны савецкую ўладу, выканаўшы задачы, якія на іх ускладаліся. 5 студзеня 1921 г. Мазырскі павятовы ваенна-рэвалюцыйны камітэт сваім загадам скасаваў валасныя рэўкомы, часова пакінуўшы толькі некаторыя з іх, у тым ліку Петрыкаўскі. Усе справы ў валасцях былі перададзены выканаўчым камітэтам. Па просьбе Камаровіцкага валрэўкома тэрмін яго функцыянавання быў таксама падоўжаны да сярэдзіны сакавіка 1921 г.

Палітычная і эканамічная сітуацыя была вельмі складаная. Разгул бандытызму, па дарогах страшна было ісці і ехаць. У лясах хаваліся розныя ўзброеныя атрады, якія ў канцы 1920 г. папоўніліся недабітымі балахоўцамі. Узброеныя банды засылаліся таксама з тэрыторыі Польшчы. Яны нападалі на савецкіх работнікаў і чырвонаармейцаў, рабавалі і знішчалі мірных вясковых жыхароў. 22 лютага 1921 г. быў абрабаваны жыхар в. Фаставічы Піліп Бараноўскі. Ноччу 28 лютага праз акно быў забіты грамадзянін в. Востраў Яфрэм Бубіч. 19 сакавіка трое бандытаў напалі на дом грамадзяніна в. Фаставічы Лейзера Шлепянтоха, застрэлілі яго жонку, забралі адзенне, посуд і іншыя рэчы. 20 сакавіка на дарозе Навасёлкі — Заполле стрэлам з вінтоўкі забіты фурман, жыхар в. Старыя Галоўчыцы Харытон Мухін, які вёз кантралёра млыноў. 30 сакавіка банда, што з'явілася з боку в. Грабаў, абстраляла рабочых, якія працавалі ў лесе. 1 мая каля паўсотні чалавек напалі на будынак Камаровіцкага валвыканкома, забілі старшыню выканкома Івана Каляду, знішчылі

справаводства. 21 кастрычніка ноччу бандыты зноў напалі на валвыканком, забілі двух чырвонаармейцаў і члена сельсавета, паранілі трох чалавек, разрабавалі лаўку спажывецкага таварыства. Ноччу 13 снежня быў спалены лесапільна-бандарны завод у засценку Белы Пераезд, пашкоджаны машыны...

Адна з найбольш крывавых трагедый адбылася ў Капаткевічах. 9 чэрвеня 1921 г. узброеныя бандыты — не менш 100 чалавек — уварваліся спачатку ў в. Лучыцы, забілі члена і сакратара валвыканкома, двух міліцыянераў. Затым бандыты накіраваліся ў Капаткевічы, ноччу 10 чэрвеня ўчынілі страшэнны пагром. Гэта быў небывалы па бесчалавечнасці і жорсткасці акт насілля. Забілі 120 чалавек, 35 паранілі. Асабліва здзекаваліся над яўрэямі. Газета «Большэвік» пісала: «Азвярэлыя палякі білі ўсіх, хто толькі трапляў ім пад рукі, не шкадуючы ні жанчын, ні старых. Некаторыя яўрэйскія сем'і, напрыклад Анцулы Гінзбурга, Бініяміна Шапіры, Давіда Шапіры і іншых, былі поўнасцю знішчаны. Вуліцы мястэчка завалены трупамі, залиты крывёю. Усе, хто мог, ратаваліся ўцёкамі...»

Створаная ў Мазыры павятовая камісія па барацьбе з бандытызмам прадпісвала валасным выканкомам не менш двух разоў на тыдзень інфармаваць аб стане спраў, чутках пра бандытаў. У загадзе 1 ліпеня 1921 г. адзначалася, што «кожны, хто мае якія-небудзь весткі пра банды і не паведаміць іх своечасова ў камісію, мясцовы выканком ці савет, з'яўляецца ўкрывальнікам і падсобнікам бандытаў і будзе прыцягнуты да суровай адказнасці». Для барацьбы з бандытамі прыцягваліся воінскія фарміраванні. Яны размяшчаліся ў Петрыкаве, затым — у Капаткевічах, Камаровічах, на ст. Пціч і Капцэвічы. Да сем'яў бандытаў прымяняліся жорсткія меры: іх маёмасць канфіскоўвалася, а самі яны высяляліся прымусова за межы Беларусі.

Сяляне нярэдка цярпелі ад пажараў. У красавіку 1921 г. згарэла 37 гаспадарак у в. Фаставічы. У пачатку лістапада пайшлі на дым 9 хат, 21 хлеў і 2 гумны ў в. Новыя Галоўчыцы. Пагарэльцам патрабавалася неадкладная дапамога ў лесаматэрыялах, шкле, цвіках, а таксама ў прыладах працы — косах, сярпах, плугах, баронах і т. д. Па меры магчымасці дапамога аказвалася праз пададдзел дапамогі Мазырскага павятовага выканкома. Аднак яна была вельмі нязначнай у параўнанні з той, якая патрабавалася. У дакладзе VI павятоваму з'езду саветаў 1 снежня 1921 г. адзначалася: «Насельніцтва павета, якое перажыло некалькі белагвардзейскіх акупацый і ў апошні час бандытызм, амаль усё знаходзіцца ў вялікай беднасці. Ніколі яшчэ ў практыцы сабеса не сустракалася столькі людзей, што церпяць нястачы ў выніку стыхійных і сацыяльных бедстваў. У той час, калі ў іншых пададдзелах зацішша, у пададдзеле дапамог небывалы прыток грамадзян, якія маюць патрэбу ў лесаматэрыялах, шкле, жалезе і прадуктах. Калі ўсё адпушчанае ім перавесці на кошт па рыначных цэнах, то атрымаецца вялізная сума»...

Цяжкім ярмом на плячах насельніцтва ляжала харчовая развёрстка — абавязковая здача сялянамі лішкаў сельскагаспадарчых прадуктаў дзяржаве. Гандляваць прадуктамі харчавання забаранялася. Былі абсталяваны ссыпныя пункты на станцыях Пціч і Капцэвічы, куды звозілі зерне з навакольных вёсак. Збор збожжа праводзіўся пад пільным наглядам упаўнаважаных Мазырскага павятовага выканкома, якія стваралі ўдарныя групы. Пры адмове сялян выконваць развёрстку супраць іх прымянялася ўзброеная сіла, асобныя грамадзяне і нават сельсаветы арыштоўваліся. Згодна загаду № 62 Мазырскай павятовай камісіі ад 4 сакавіка 1921 г. для забеспячэння бальніц і лазарэтаў была ўведзена развёрстка на масла і курыныя яйкі ў наступным аб'ёме: Грабаўская воласць павінна была здаць 100 пудоў масла і 3310 яек, Камаровіцкая — адпаведна 418 і 6052, Капаткевіцкая — 418 і 22 050, Лясковіцкая — 192 і 3095, Лучыцкая — 197 і 10 490, Петрыкаўская — 100 пудоў і 10 700 штук.

У красавіку пачаліся бульбяная і малочная кампаніі. Аднак вясной 1921 г. развёрстка на асноўныя

віды прадуктаў харчавання была закончана, 17 красавіка III сесія ЦВК БССР дазволіла свабодны абмен збожжа і фуражу ва ўсім Мазырскім павеце, які выканаў харчразвёрстку. З пераходам краіны да новай эканамічнай палітыкі ў ліпені 1921 г. харчразвёрстка замянялася харчовым падаткам, дазвалялася свабодны абмен сельгаспрадуктамі. Сяляне Петрыкаўшчыны станоўча сустрэлі гэтыя перамены. У пастанове, прынятай на канферэнцыі грамадзян Грабаўскай воласці 14 жніўня 1921 г., гаварылася: «Прызнаючы цяжкае становішча краіны, мы ведаем, што толькі пры добрасумленнай здачы харчпадатку гэта становішча палегчыцца. Наша задача — сумленна, акуратна і своечасова здаць ускладзены на нас падатак, што мы на канферэнцыі і пастанаўляем аднагалосна»...

Усё часцей арганізоўваліся сялянскія абозы, якія везлі збожжа на прыёмныя пункты. 20 верасня 1921 г. сяляне в. Рог Капаткевіцкай воласці накіравалі абоз з 500 пудамі збожжа і бульбы на станцыю Пціч. Над абозам развяваліся чырвоныя сцягі, наперадзе палымнеў лозунг: «Харчпадатак з'яўляецца галоўнай апорай Расійскай сацыялістычнай краіны, ён яе выратуе ад голаду і нястачы». Гэтак жа ўрачыста 13 верасня 1922 г. здавалі харчпадатак жыхары вёсак Брынёў, Найда і Баклань Ляскавіцкай воласці. На ста фурманках яны прывезлі ў Кашэвічы ўвесь харчпадатак. Але не ўсюды і не заўсёды справы са здачай харчпадатку ішлі добра. Каб хутчэй справіцца са зборам збожжа, павятовыя харчінспектары ў большасці выпадкаў самі складалі спісы плацельшчыкаў падатку і налічвалі яго суму. У такіх умовах не магло абысціся без перагібаў і недахопаў. Асобыя праверачныя камісіі нярэдка ўстанаўлівалі ўтоеныя аб'екты абкладання. Мазырскі харчовы камітэт у дакладзе VI павятоваму з'езду саветаў 1 снежня 1921 г. адзначаў: «Падводзячы вынікі ўзятага ў насельніцтва як па развёрстцы, так і па харчпадатку, атрымліваецца, што ўсяго забрана ў пераводзе на залатую валюту на суму 1 081 402 руб. Выдадзена ж сельскаму насельніцтву прадметаў шырокага ўжытку ў пераводзе на залатую валюту на суму 30 428 р. 26 к. ...» Няцяжка падлічыць, што гэта ўсяго 2,8 %.

Не меншае значэнне, чым харчпадатку, надавалася працоўнай гужавай павіннасці. Для нармальнай работы заводаў і фабрык, чыгуначнага транспарту, ацяплення памяшканняў у гарадах не хапала паліва, патрэбны былі дровы. Іх нарыхтоўкай і вывазкай займаліся аддзелы працы валвыканкомаў. У Петрыкаве і Капаткевічах працоўная гужавая павіннасць замянялася грашовым падаткам. Кожны працездольны мужчына ва ўзросце 18—50 гадоў і жанчына 18—40 гадоў павінны былі заплаціць 396 руб., а таксама 1422 руб. — за кожнага каня або вала. Акрамя харчпадатку і працоўнай гужавай павіннасці ўстанаўліваўся агульнаграмадзянскі, падворны і падаходны падаткі, падаткі з пабудоў, з жывёлы, ураўняльны збор, страхавыя ўзносы...

І ўсё ж людзі, выплаціўшы вялікую колькасць падаткаў, часта недаядаючы, дабравольна ахвяравалі ў фонд галадаючых Паволжа, не працівіліся канфіскацыі золата і срэбра з цэркваў, сінагог і касцёлаў у 1922 г., каб людзі за тысячы кіламетраў ад іх не памерлі з голаду... 2 кастрычніка 1921 г. Камаровіцкі валвыканком перадаў у фонд галадаючых 29 300 руб., 36 пудоў 13 фунтаў жыта, 5 пудоў 19 фунтаў ячменю, 22 фунты аўса, 1 пуд грэчкі, сабраных насельніцтвам воласці. У Петрыкаўскай воласці ў 1923 г. на карысць хворых на сухоты сабралі 1605 р. 75 к. і 55 к. срэбрам, для чырвоных інвалідаў — 310 р. 54 к.

У 1923 г. харчовы і іншыя віды падаткаў былі заменены адзіным сельскагаспадарчым падаткам. Сялянам дазвалялася разлічвацца з дзяржавай не толькі натураплатай, але і грашыма. Першыя крокі па зборы гэтага падатку прынеслі шмат непаразуменняў. У 1924 г. вынікі ўліку аб'ектаў абкладання насельніцтву не аб'яўляліся, абкладныя лісты сялянам уручаліся 21—25 верасня — праз месяц пасля таго, як выканаўчымі камітэтамі быў спынены разгляд скаргаў на няправільнасць уліку аб'ектаў абкладання. Фінагенты сельсаветаў, складаючы спісы пасяленняў, у выпадках, калі кантрольная лічба не сыходзілася з рэальнай, даписвалі аб'екты абкладання тым гаспадаркам, якія мелі менш зямлі і жывёлы або дадавалі для абкладання па адной дзесяціне ворыва і сенажаці ўсім без разбору. Часта пры абкладанні падаткам не ўлічваліся ўсе едакі. Напрыклад, у падатковым лісце Сцепаніды Ярыгі з Бабуніцкага сельсавета, маці пецярых дзяцей, самаму старэйшаму з якіх было 9 гадоў, а малодшаму — 10 месяцаў, замест 6 едакоў было запісана 5, што істотна ўплывала на памер падатку, завышала яго.

Ваенныя дзеянні, што адбываліся на Петрыкаўшчыне, празмерныя паборы, якія чынілі над сялянамі немцы і гайдамакі, палякі і балахоўцы, чырвонаармейцы і савецкія органы, прывялі

Ярмарка ў Петрыкаве. 1925 г.

сельскую гаспадарку ў заняпад. Вясной 1921 г. не хапала насення. Мазырскі павятовы зямельны аддзел накіраваў у воласць насенны матэрыял. Камаровіцкая воласць атрымала 2550 пудоў аўса, 75 пудоў ячменю, 830 пудоў проса. Большая частка збожжа была раздадзена сем'ям чырвонаармейцаў і беднякам. Былому маёнтку ў Камаровічах адпушчана 350 пудоў аўса. Але не хапала коней, валоў, у многіх гаспадарках асноўным сродкам апрацоўкі зямлі была саха.

Не песціла хлебароба і надвор'е. 28 чэрвеня 1921 г. град пабіў на 36 дзесяцінах пасевы жыта і яравых культур ва ўрочышчах Падвезак, Паддупельскае і Пасохля, непадалёку ад в. Заполле. 30 чэрвеня ад граду пацярпелі жыхары хутароў паблізу в. Замосце Франц і Сямён Эсмантовічы, Міхаіл Трухан, Варфаламей Сініцкі, Іосіф Левановіч, Рыгор Пінкоўскі і іншыя. На нізкіх месцах пасевы часта вымакалі. Аднак у 1921 г. быў атрыманы ў цэлым неблагі ўраджай збожжа.

Каб палепшыць аддачу зямлі, выканаўчыя камітэты паставілі задачу пакончыць з цераспалосіцай і дальнезямеллем. У вёскі выязджалі прадстаўнікі савецкіх органаў, вялі растлумачальную работу сярод насельніцтва, арганізоўвалі абследаванне сялянскіх надзелаў. Лепшай формай землекарыстання ў Мазырскім павеце была прызнана пасялковая. У 1922 г. у Ляскавіцкай воласці ўтварылася 6 пасёлкаў, пад якія адвялі 689 дзесяцін зямлі на 157 сем'яў батракоў. У 1923 г. 16 зямельных суполак Петрыкаўскай воласці ўзбудзілі хадайніцтвы аб правядзенні ў іх землеўпарадкавання, 13 з якіх Мазырскім павятовым зямельным управленнем былі задаволены.

Да 1917 г. у Мазырскім павеце ў сярэднім на 1 сялянскі двор прыходзілася па 7 дзесяцін зямлі, на кожнага едака — па 1,1 дзесяціны. На 1 сакавіка 1924 г. на сялянскую гаспадарку прыпадала ўжо 10,5 дзесяціны, на едака — 1,9 дзесяціны. Забяспечанасць зямлёй працоўнага сялянства Петрыкаўшчыны выглядала наступным чынам: у Камаровіцкай воласці на 1 двор — 13,27 дзесяціны, на кожнага едака — 2,7 дзесяціны, у Капаткевіцкай — 6,57 і 1,7, у Лучыцкай — 8,89 і 1,63, у Ляскавіцкай — 6,9 і 1,44, у Петрыкаўскай — 11,47 і 2,21 дзесяціны.

Шмат праблем было ў жывёлагадоў-

лі. Лепшых коней пазабіралі розныя вайсковыя часці, многа кароў і свіней рэквізавалі нямецкія і польскія заваёўнікі, а таксама савецкія органы для выканання харчразвёрсткі. Звычайнай з'явай былі захворванні жывёлы, адзначалася павальнае запаленне лёгкіх буйной рагатай жывёлы, сібірская язва, кароста і афрыканскі сап у коней, рожа ў свіней. Са Слуцкага і Бабруйскага паветаў пагражала небяспекай чума. Тэрмінова ствараліся валасныя ветэрынарна-фельчарскія пункты і супрацьчумныя камісіі, якія рабілі ўсё неабходнае, каб не дапусціць страшную хваробу.

* * *

У 1921 г. на тэрыторыі раёна існавала пяць саўгасаў, якія былі арганізаваны на базе былых панскіх маёнткаў: «Канстанцінава» Капаткевіцкай, «Лучыцы» і «Дуброва» Лучыцкай, «Камаровічы» Камаровіцкай і «Дарашэвічы» Ляскавіцкай воласці. Гэта былі яшчэ вельмі слабыя гаспадаркі з невялікай колькасцю рабочых. У саўгасе «Лучыцы» ў 1921 г. мелася ўсяго 6 коней, налічвалася 14 рабочых, якія паступова гаспадарка станавілася на ногі. Многае зрабіў для гэтага кіраўнік саўгаса Данецкі. У 1923 г. саўгас набыў воз, 2 плугі і 2 акучнікі, жатку, конныя граблі, сеялку, 4 пары валоў, вярнуў пазыку ў 640 пудоў збожжа. Рабочыя сабралі на саўгасных нівах 500 коп жыта, 64 капы аўса, 65 коп ячменю, 4500 пудоў бульбы, пасеялі 45 дзесяцін азіміны. За прададзенае сена гаспадарка атрымала 900 пудоў жыта.

Наладжваліся справы і ў саўгасе «Дуброва». У 1923 г. было сабрана 275 коп жыта, 108 коп аўса, 60 коп гароху, 60 коп грэчкі, 60 пудоў ячменю, 3550 пудоў бульбы, 356 пудоў канюшыны, накасілі 5000 пудоў сена. Добры ўраджай даў магчымасць набыць 4 валоў і 2 коней, за якія заплацілі 678 пудоў збожжа. Рабочыя адрамантавалі малацілку, якую бясплатна давалі для патрэб насельніцтва в. Дуброва, адрамантавалі жылыя памяшканні. Восенню ўзнялі 30 дзес. зяблівa, на 10 дзес. унеслі мінеральныя ўгнаенні, вывезлі 750 вазоў гною.

У саўгасе «Канстанцінава» ствараласяся племянная ферма, дзе ў 1922 г. знаходзілася 43 галавы буйной рагатай жывёлы. Працавалі масларобчы завод і млын, але ён абкладаўся вялікім падаткам і прыносіў значныя ўбыткі.

У пачатку 20-х гадоў у сувязі з новай эканамічнай палітыкай пачалі ствараць прасцейшыя формы сельскагаспадарчай кааперацыі. На I аб'яднаным пленарным пасяджэнні Петрыкаўскага валвыканкома са старшынямі, сакратарамі і ўпаўнаважанымі па землеўпарадкаванню 11 снежня 1923 г. гаварылася, што Петрыкаўскае сельскагаспадарчае таварыства, «церпячы на першым часе няўдачы, урэшце выйшла на шырокую дарогу дзейнасці і цяпер прыступіла да выканання сваіх абавязкаў — дапамогі сельскай гаспадарцы. Калі ў пачатку таварыства налічвала 18 членаў з капіталам 18 пудоў, то цяпер яно дайшло да 60 чалавек і аперыруе фондам у 1500 пудоў. Да вясны 1924 г. таварыства здолее забяспечыць насельніцтва воласці як сельскагаспадарчымі прыладамі, так і насеннем культурных траў»...

Пашыралася сетка спажывецкіх кааператываў. Аднак пакупная здольнасць іх была нязначная: цэны на прадметы спажывання ўстанаўліваліся вельмі высокія, а на хлеб — нізкія, сяляне вымушаны былі купляць тавары ў крэдыт. У Лучыцкі спажывецкі кааператыў у 1923 г. уваходзіла 76 пайшчыкаў. За 10 месяцаў кааператыў прадаў тавараў на 2020 пудоў збожжа. Яму належала таксама шавецкая майстэрня. Кааператыў адпусціў 3 р. 30 к. на патрэбы асветы, дапамагаў сям'і забітага палякамі аднавяскоўца.

Узнікалі першыя калгасы. У Брынёўскім сельсавеце ў 1924 г. быў арганізаваны калгас «Чырвоны сцяг». Калектыўныя гаспадаркі ледзь трымалі-

Члены ЦВК БССР. Другі злева ў другім радзе — селянін з в. Бобрык Ц. С. Цукраў

ся, настолькі яны былі слабыя.

З прамысловых прадпрыемстваў на Петрыкаўшчыне ў пачатку 20-х гадоў найбольш буйным была лесапільна-фанерная фабрыка «Звязда» на ст. Капцэвічы, дзе працавала 212 рабочых. Фабрыка мела тры аддзяленні: лесапільнае, фанернае і бандарнае. Прадукцыйнасць працы ў 1923—1924 гг. на фабрыцы ў параўнанні з 1913 г. узрасла на 22 %, зарплата кваліфікаваных рабочых узнялася на 75 %, жанчын — на 130 %, чорнарабочых — на 43 %. Прадукцыя фабрыкі ішла ў асноўным на знешні рынак. Працавалі лесапілкі таксама ў Петрыкаве і Філіпавічах.

Многія прадпрыемствы ў гады грамадзянскай вайны былі зруйнаваны. Спаленымі аказаліся лесапільна-фанерная фабрыка на ст. Пціч і лесапільна-бандарны завод у Белым Пераездзе. На многіх прадпрыемствах было выведзена са строю абсталяванне. Смоласкіпідарны завод у в. Курыцічы не мог быць пушчаны — сяляне разабралі печ. У 1921 г. завод здадзены ў арэнду, для яго рамонту адпушчана цэгла.

Вынікам мінулых ваенных ліхалецяў, галадання і антысанітарыі былі масавыя захворванні людзей на інфекцыйныя хваробы. Асабліва лютаваў брушны тыф. У Камаровіцкай воласці ў канцы студзеня 1921 г. на тыф хварэла 59, у лютым — 69, у сакавіку — 110, у красавіку — 59 чалавек. Неабходна было прымаць неадкладныя меры для лячэння хворых і прафілактыкі хвароб. У 1921 г. бальніца ў Петрыкаве была пашырана з 25 ложкаў да 40, адкрыта аддзяленне для парадзіх на 5 ложкаў. Меркавалася адкрыць бальніцу ў Капаткевічах на 25 ложкаў, аднак з-за адсутнасці памяшкання яна была толькі на 10 ложкаў. У 1922 г. пры бальніцах створаны інфекцыйныя (заразныя) аддзяленні, пры Петрыкаўскай — і хірургічнае.

У лячэбных установах не хапала спецыялістаў, не было лекаў. Зубаўрачэбныя амбулаторыі ў Петрыкаве і Капаткевічах адкрыліся яшчэ ў 1920 г., аднак урачоў не было. У 1922 г. павет быў разбіты на сем урачэбных участкаў, у кожным мелася бальніца. Жыхары Петрыкаўскай і Ляскавіцкай валасцей адносіліся да Петрыкаўскага ўчастка; Капаткевіцкай, Лучыцкай і Камаровіцкай — да Капаткевіцкага; Грабаўскай — да Жыткавіцкага.

У Петрыкаве існаваў інвалідны дом,

Кіраўнікі і спецыялісты суднарамонтных майстэрань. 1927 г.

у якім знаходзілася 13 састарэлых чалавек, а таксама дзіцячы прыют, у якім у 1922 г. выхоўвалася 50 сірот.

* * *

Адной з асноўных задач, якія стаялі перад валаснымі выканаўчымі камітэтамі, была ліквідацыя непісьменнасці, арганізацыя навучання дзяцей. Зімой 1921 г. аддзелы народнай адукацыі складалі спісы непісьменных, каб у далейшым прыцягнуць іх да вучобы. Для арганізацыі навучальнага працэсу выкарыстоўваліся школы і хаты-чытальні. У Камаровіцкай воласці вясной 1921 г. працавала 6 школ і 14 хат-чытальняў.

Навучанне дзяцей і ліквідацыя непісьменнасці сярод дарослых пачыналася позняй восенню, калі завяршаліся сельскагаспадарчыя работы, і канчалася з сыходам снегу. Не хапала школьных памяшканняў, часта пад школу за невялікую плату выкарыстоўвалі сялянскія хаты. У Грабаўскай і Камаровіцкай валасцях такія школы былі ў 4 вёсках, у Капаткевіцкай — у 8, у Лучыцкай — у 3, у Ляскавіцкай — у 5, у Петрыкаўскай — у 10. Восенню 1921 г. у Петрыкаве адкрыты педагагічны тэхнікум. У кастрычніку 1922 г. устанаўлівалася дзяржаўная школьная сетка, вясковыя суполкі павінны былі заключыць калектыўныя дагаворы з валаснымі аддзеламі народнай адукацыі. Але не ўсе вёскі заключалі дагаворы, у выніку колькасць школ і класаў-камплектаў значна скарацілася. Калі на пачатак навучальнага года ў Камаровіцкай воласці працавала 18 школ пры 23 камплектах, то пасля заключэння калектыўных дагавораў засталося толькі 10 пры 12 камплектах. У Капаткевіцкай воласці было 15 школ, у Ляскавіцкай — 12, у Петрыкаўскай — 13.

С. І. Дзечка, начальнік суднарамонтных майстэрань у 20-я гады

24 верасня 1923 г. у Петрыкаве была адкрыта 2-я сямігадовая школа. Пад яе аддалі былы будынак валвыканкома. З 286 вучняў у ёй вучылася 212 беларусаў, 66 яўрэяў, 5 палякаў і 3 рускіх. У мястэчку працавала таксама 1-я сямігадовая школа і савецкая яўрэйская школа. Пад яўрэйскую школу, у якую хадзіла 164 вучні, быў адрамантаваны дом, што раней займала хата-чытальня.

Вялікай радасцю для школьнікаў было атрыманне падручнікаў і школьных пісьмовых прылад. Але іх адпускалася мала, у пачатку 1924 г. на кожную школу было выдзелена па 100 сшыткаў, 19 алоўкаў, 5 пёраў, 4 чарнільныя парашкі, 2 ручкі. Гэтыя лічбы сведчаць аб суровай рэальнасці жыцця. Да дабрабыту было яшчэ вельмі далёка. А ў парадку дня ўжо наспявала калектывізацыя сялянства з яе здабыткамі і яшчэ большымі стратамі...

А. В. Солахаў

Дакументы расказваюць

ИЗ ОТЧЕТОВ О ДЕЯТЕЛЬНОСТИ КОМАРОВИЧСКОГО РЕВКОМА

Январь 1921 г.

С 16 января по 1 февраля 1921 г. задержано в лесу до 120 бандитов, добровольно явилось 4...

Для лесных учреждений выделено 519 подвод на 2 месяца, для постройки в Лучицах моста по 25 под. и 50 раб. на неопределенный срок.

Заготовлено и доставлено к речным пристаням шпал 1500 шт., дров — 105 куб. саж.

Тифа брюш. — 59.

Членами комячейки велась усиленная агитация в смысле просвещения путем устройства повсеместных митингов, каковых было устроено за отчетный период 12...

февраль 1921г.

... Заболеваний тифом 69 ч.

Народ. образ. устроены избы-читальни, избраны сельсоветы по нар. обр.

4 февраля был съезд председателей всех сельсоветов по вопросу государственной разверстки и проведения продмесяца.

июнь 1921 г.

Тайное недовольствие Советской властью... по случаю летних работ по уборке сенокосов и посевов и по поводу дачи $^1/_3$ части сенокоса и посева в совхоз. Настроение населения к Сов. власти натянутое.

Было нападение бандитов в числе 7 чел. на кооперативную лавку в д. Новоселках, которая ими же ограблена. В Новоголовчицких хуторах также появились бандиты в числе 3—5 чел.

Родилось 22, умерло 27, бракосочетаний — 27, разводов — 1.

Были кражи, грабежи, убит бандитами гражд. (еврей) Мельцер около дер. Новоселок...

июль 1921 г.

Добровольно явилось бандитов 30 человек. 20 человек сданы под расписку... для направления в Житковичи в выезд. сессию, 10 человек отправлены в уездвоенкомат.

Военным частям ВЧК (выделено) 355 подвод...

Родилось 39, бракосочетаний — 8, умерло 32.

Открыта изба-читальня в д. Замостье, а всего в волости 14 изб-читален.

Грабежей — 2, краж — 3, пожаров не было, убийств не было...

ФГА Гомельской обл. в Мозыре, ф. 269, оп. 1. д. 7, лл. 37—39, 105—106, 178,205—206.

ПРОТОКОЛ

общего собрания граждан села Комаровичи Комаровичской приходской церкви, состоявшегося 16 июня 1922 г. под председательством т. Прокофия Мухина и секретаря т. Якова Талецкого.

Мы, граждане прихода Комаровичской церкви, собравшись на собрание по докладу церковного совета о том, что 15-го сего июня на собрании в волисполкоме предъявлено верующим циркулярного распоряжения т. прокурора по Мозырскому уезду избрать делегацию для заключения договора об изъятии в аренду нашей приходской церкви

Постановили: По обсуждению между собою считаем для себя подобное явление крайне обидным и непосильным, считая великим позором пред всем христианским миром и грехом от церкви отказываться, так как церковь наша сооружена и поддерживалась верующими нашими праотцами, и нашими отцами, и нами самими, а потому постановили от церкви не отказываться, и считаем наши внутренние религиозные чувства неотъемлемыми, что же касается взять церковь в аренду, считаем для себя позором и от арендной сделки отказываемся, и если это властям желательно закрыть церковь, то мы оспаривать бессильны и будем исполнять свои обряды под открытым небом.

Предсобрания *Прокофий Мухин*
Т. предсобрания *Иван Иваненко*
Секретарь *Яков Талецкий*

ФГА Гомельской обл. в г. Мозыре, ф. 269, оп. 1, д. 12, л. 157.

СПИСОК РАБОЧИХ И СЛУЖАЩИХ СОВХОЗА «КОМАРОВИЧИ» С УКАЗАНИЕМ ИХ ДОЛЖНОСТЕЙ И МЕСЯЧНЫХ ОКЛАДОВ (1922 г.)

Имя, отчество и фамилия	Занимаемая должность	Месячный оклад в ржаных единицах	Имя, отчество и фамилия	Занимаемая должность	Месячный оклад в ржаных единицах
Адам П. Насукович	Рабочий	5 п. 20 ф.	Петр В. Моргун	Ночной сторож	5 п. 20 ф.
Максим И. Куприянович	То же	»	Роман Шаблович	Пастух	5 п. 20 ф.
Сергей М. Трофимов	»	»	Платон М. Мацкевич	Плотник	7 пуд.
Платон П. Бренчак	»	»	Иван С. Арбуз	Рабочий	5 п. 20 ф.
Иван Ивашкевич	»	»	Мария В. Добралет	Рабочая	4 п. 20 ф.
Тимофей Бер.	Предрабочком	6 пуд.	Григорий А. Логойко	Конторщик	6 пуд.
Федор Максимович	Рабочий	5 п. 20 ф.	Николай К. Леонов	Управляющий	4 п. 20 ф.
Антон Рутковский	То же	»	Сергей Н. Андрущенко	Пом. управляющего	6 пуд.

Управляющий совхоза
Конторщик

ФГА Гомельской обл. в Мозыре, ф. 269, оп. 1, с. 14, л. 95.

ИЗ ОТЧЕТОВ ОТДЕЛА НАРОДНОГО ОБРАЗОВАНИЯ ВОЛОСТИ [1922 г.]

До 1 октября существовало 18 школ при 23 комплектах; за прошлый учебный год из них работало 16, не работало 2 — Фастовичская и Клясовская. Школьных работников в школах 20 человек. С 15 мая 5 работников уволено по их неработоспособности и за политическую неблагонадежность.

Учащихся ... за прошлый учебный год посещало 618 человек.

Для поддержания школ, ввиду бедности государства, в прошлом учебном году волостным съездом советов 16 ноября 1921 г. принято школьное самообложение продуктами в следующем количестве: ржи — 795 пудов, крупы — 92 п. 16 ф., картофеля — 516 пуд., жиров — 61 пуд... Поступило 646,5 пуд. ржи, 189 картофеля, 60,2 круп, 21 $^{3}/_{4}$ жира...

На выдачу пайков школьным работникам и сторожам с 1 ноября 1921 г. по 1 сентября 1922 г. израсходовано: ржи — 399 пуд., картофеля — 189,24, крупы — 54 п. 22 ф., жиров — 22 п. 34 ф., но так как жиров

поступило 21 п., из них 21 ф. постного масла испортилось, то 1 п. 34 ф. жиров заменено рожью по 10 ф. за 1 ф. жира, для чего потребовалось ржи 18,2 п.

На выдачу жалованья школьным работникам с 1 апреля по 1 июля израсходовано ржи 94 п. 6 фунтов... На выдачу суточных школьным работникам, которые ехали на курсы в Мозырь, израсходовано 4 пуда ржи.

С 1 октября ввиду того, что население неохотно идет навстречу школам, ... решено установить твердую школьную государственную сеть и часть школ сократить или отнести на полное содержание самого населения, вследствие чего в волости остались перезаключенными в государственную сеть 12 школ при 14 комплектах. Заключили с отделом народного образования коллективные договора 10, а остальные сельсоветы отказались пойти навстречу школе, пришлось их закрыть.

Завед. культ.-просветит. делами *Д. Коновальчик*

ЗАЯВЛЕНИЕ гр. д. ЛЯСКОВИЧИ Ф. И. КУДРА В ЛЯСКОВИЧСКУЮ ВОЛОСТНУЮ ИЗБИРАТЕЛЬНУЮ КОМИССИЮ

Лясковичский сельский совет, составляя списки лиц, имеющих право голоса на выборах в советы, внес меня в список лиц, не имеющих права голоса на выборах, за то, что я служил в 1914 г. в полиции. В полицию я поступил не для того, чтобы защищать царский строй, а для того, чтобы не участвовать в империалистической войне, зная, что в империалистической войне напрасно льется кровь трудящихся. После свержения царского строя я служил в рядах армии, откуда возвратился по демобилизации домой. Возвратясь домой, я все время нахожусь на трудовой норме земли и чужого труда не эксплуатирую, а живу на средства, добываемые своим трудом, а посему прошу избирательную комиссию восстановить меня в правах. Если волостная комиссия не может восстановить меня в правах, то ходатайствовать перед высшим органом о восстановлении меня в правах, причем я обязуюсь выполнять все требования и распоряжения Соввласти в духе программы законов Соввласти.

Просит Феодосий Кудра.
3 ноября 1922 г.

ФГА Гомельской обл. в г. Мозыре, ф. 103, оп. 1, д. 8, л. 87.

ПОСТУПЛЕНИЕ РАЗНЫХ ВИДОВ НАЛОГА ПО м. ПЕТРИКОВ И ВОЛОСТИ ЗА ВРЕМЯ С 1 ДЕКАБРЯ 1922 ГОДА ПО 1 ОКТЯБРЯ 1923 г.

Общегражданского налога	18 452 р. 50 к.	Подоходного налога	11 431 р. 39 к.
Трудгужналога	174 818 р. 91 к.	Взыскано ВИКом страховки	3653 р. 67 к.
Налога со строений	6685 р. 30 к.	Разных неокладных сборов	4906 р. 87 к.
Квартирного налога	1079 р. 16 к.	Взыскано штрафов	8755 р. 30 к.
Налога с животных	11 028 р. 31 к.	За регистрацию домов	
Уравнительного сбора	87 018 р. 39 к.	в м. Петрикове	38 944 р.
Доплата к патентам	1575 р.	Гербового	9165 р.
Подворного налога	16 616 р. 47 к.	Всего взыскано	394 209 р. 27 к.

13 октября 1923 г.

...Сообщаю, что организована 2-я Петриковская семилетка. Классные занятия начались с 24 сентября в следующем составе:

подготовительная группа — 84 чел.
1-й класс — 44 чел.
2-й класс — 40 чел.
3-й класс — 40 чел.
4-й класс — 28 чел.
5-й класс — 28 чел.
6-й класс — 24 чел.

Преподаватели: Слижевич П. Л. (зав. школой), Горошко-Былинский И. И. (зам. зав. школой), Горошко Ф. И. (секретарь совета и деловод), Стороженко Н. М. (не явилась), Слижевич М. В. (1-я подготовительная группа), Кебец А. О. (2-я подготовительная группа), Король Е. М. (1-я группа), Горошко-Былинская А. М. (2-я группа).

Произведен ремонт: починено 77 скамеек, вставлено 25 стекол, прорублено 3 окна, побелены оба здания...

Зав. школой
Делопроизводитель

ФГА Гомельской обл. в г. Мозыре, ф. 221, оп. 1, д. 1, л. 133; ф. 269, оп. 1, д. 14, лл. 80—81.

СПИСОК СЛУЖАЩИХ ПЕТРИКОВСКОЙ СОВЕТСКОЙ БОЛЬНИЦЫ НА 1923 г.

1. Рутковский М. А.	ставрач	5. Ясемчик С. Л.	брат милосердия
2. Калманович С. Л.	врач	6. Семенова В. И.	сестра милосердия
3. Вавуло И. Н.	лекпом	7. Андрусевич Д. С.	сестра милосердия
4. Рудько Т. А.	акушерка	8. Красильщик М. В.	зубврач

О численности работников Петриковской больницы на 1923 г.

Петриковская больница на 40 коек, зав. больницей — 1, врачей — 2, зубврачей — 1, лекпомов — 2, акушерок — 1, среднего персонала — 3, завхоз — 1, кухарок — 1, прачек — 1, сторож — 1.

ИЗ ПРОТОКОЛА СЪЕЗДА МЕДИЦИНСКИХ РАБОТНИКОВ МОЗЫРСКОГО ОКРУГА (29—31 АВГУСТА 1924 г.)

Доклад Петриковского врачебного участка (доктор Калманович)

С 1.1.23 г. по 1.8.24 г. принято амбулаторных больных (кроме фельдшерских пунктов) 3702, стационарных больных 563. Отпущено рецептов 3346. Продовольствием, медикаментами и перевязочным материалом участок снабжается удовлетворительно. Взаимоотношения с местной администрацией удовлетворительные. Связь с фельдшерскими пунктами носит чисто случайный характер, так как средствами передвижения участок не располагает. Очень развито знахарство, особенно в лечении малярии. По санпросветительной работе были прочитаны лекции и проведены собеседования на разные темы. Имеется сантройка, которая ведет наблюдение за санитарным состоянием дворов и улиц...

Зубоврачебная помощь оказывается в амбулатории, где имеется зубоврачебный кабинет.

...Считать возможным на 1925 г. установить следующую сеть лечебных учреждений по Петриковскому району:

1. Больница на 50 коек, в том числе родприют на 10 коек.
2. Амбулатория с зубным кабинетом.
3. Консультация.
4. Врачебный пункт при ст. Копцевичи.
5. Фельдшерский пункт в Бабуничах.
6. -»- в Лясковичах.
7. -»- в Грабове.
8. -»- в Снядине.
9. Врачебный пункт в Комаровичах.

Сеть лечебных учреждений по Копаткевичскому району:

1. Больница на 15 коек.
2. Амбулатория.
3. Фельдшерский пункт в Птичи.
4. -»- в Новоселках.
5. -»- в Лучицах.

ПРОТОКОЛ ЗАСЕДАНИЯ ПЕТРИКОВСКОГО ПОКАЗАТЕЛЬНОГО РИКа ОТ 24.10.24 г.

О состоянии Советской больницы

Тов. Рудковский (зав. Советской больницей) указал, что больница открыта еще в 1914 г. Это здание бывшего военного склада, состоящее из 3 зданий: одно — заразный барак, второе — сторожка, третье — каменное здание, неприспособленное. Все здания требуют ремонта, ограды нет. Постоянных больных на 66 коек, налицо всего 30 коек. Технического персонала 22 чел., 3 врача, 2 фельдшера и низший персонал. Амбулаторная работа в упадке, в год посещает до 5000 чел. Из них прошло 980 застрахованных и 438 заразных.

Инвентарь можно отнести к третьей категории, хозяйственный инвентарь в большинстве отсутствует: нет посуды, белья. Кровати некомплектные, разношенные. Снабжение лекарствами случайное. С перевязочным материалом дело обстоит очень плохо. Суточное довольствие больных составляет 9—10 коп. на

больного, часто больные остаются без питания. При переходе больницы на местные средства трудно надеяться на улучшение, так как еще много больных поступает из других районов...

Социальных болезней из всех больных составляет 15 %, туберкулезных, венерич. очень мало — 2—3 %.

...Произведен капитальный ремонт Петриковской больницы.

С июня 1925 г. организован прививочный пункт в г. Петрикове и укушенные в г. Минск не направляются, прививки производятся на месте... Открыта районная врачебно-контрольная комиссия.

ФГА Гомельской обл. в г. Мозыре, ф. 60, оп. 1, д. 15, 28.

ВЫПИСКА ИЗ ЗАСЕДАНИЯ МЕСТКОМА СОЮЗА «МЕДСАНТРУД» ПЕТРИКОВСКОГО РАЙОНА

23 апреля 1927 г.

...Деятельность больницы за март выразилась в следующем: состояло 34 чел., прибыло, выписалось 87, умерло 9 и осталось на 1 апреля 36 чел.

Выездов сделано врачами: 3 выезда, на что потрачено 42 часа; фельдшерами 2 выезда — 24 часа.

МК находит настоятельным вопрос врача М. А. Рутковского о его работе как специалиста высшей квалификации с хирургическим уклоном и гинекологическо-оперативным, обслуживающего не только Петриковский район, а и близлежащие районы, которых 4... разгрузить его от мелкой повседневной работы и оставить как хирурга для операций и общего наблюдения...

ФГА Гомельской обл. в г. Мозыре, ф. 115, оп. 1, д. 39, л. 174.

За архіўным радком

14 лістапада 1923 г. адбыўся VIII з'езд саветаў Петрыкаўскай воласці. Петрыкаўшчына аднаўлялася пасля віхуры грамадзянскай вайны. Працоўныя шчыра верылі, што толькі савецкая ўлада прывядзе іх да лепшага, шчаслівага жыцця...

З'езд пачаў сваю работу з адпраўкі тэлеграмы У. І. Леніну з пажаданнямі хутчэйшага выздараўлення і вяртання да работы.

У справаздачным дакладзе валаснога выканкома адзначалася, што ў склад воласці ўваходзіць 110 населеных пунктаў, у тым ліку 80 хутароў, у якіх налічвалася 3950 сялянскіх гаспадарак. На іх долю прыходзілася 4470 дзесяцін ворыва і 4963 дзесяціны сенакосаў. Беззямельныя і малазямельныя сяляне атрымалі з фонду непрацоўнага карыстання, г. зн. былой памешчыцкай і царкоўнай зямлі, 1453 дзесяціны ворыва і 3374 — сенакосаў, але ўсё роўна яе не хапала, асабліва ворнай. Становішча ўскладнялася тым, што сялянскія надзелы знаходзіліся далёка і былі разбіты на мноства ўчасткаў цераспалосна-га карыстання. Многія надзелы былі настолькі вузкімі, што міжвольна парушаліся межы суседзяў, гэта нярэдка выклікала сваркі.

Патрабавалася новае землеўпарадкаванне. Мясцовыя партыйныя і савецкія органы праводзілі растлумачальную работу сярод сялянства з мэтай ліквідацыі дальнезямелля і цераспалосіцы. На з'ездзе адзначалася, што 16 зямельных таварыстваў воласці пачалі хадайніцтва аб правядзенні ў іх землеўпарадкавання. З'езд прыняў рашэнне паскорыць гэтую работу, прызнаўшы найбольш мэтазгоднай формай землекарыстання пасялковую. Супраціўляліся гэтаму больш заможныя сяляне, таму што іх хутары мелі суцэльныя зямельныя масівы, а пасялковае землекарыстанне закранала іх інтарэсы.

З'езд адзначыў, што да 1923 г. сельская гаспадарка ў воласці ўзнялася, аднак працягвала заставацца адсталай і малапрадуктыўнай. Сяляне-ўласнікі вялі гаспадарку дзедаўскім спосабам, зямля апрацоўвалася прымітыўнымі прыладамі працы. У воласці функцыянавалі прасцейшыя формы селькааперацыі: сельскагаспадарчае і крэдытнае таварыствы, якія дапамагалі працоўным сялянам у набыцці сельгасінвентару,

гатунковага насення, цяглавай сілы і г. д., ахоўвалі працаўнікоў сяла ад кулацкай кабалы. Вялікую дапамогу сялянскай беднаце аказваў камітэт сялянскай грамадскай узаемадапамогі.

Спажывецкая кааперацыя праз сетку магазінаў у вёсках забяспечвала насельніцтва прадметамі першай неабходнасці, выціскаючы ўласніка са сферы гандлю.

З'езд удзяліў многа ўвагі рабоце ўстаноў культуры і аховы здароўя. У воласці налічвалася 13 школ, з іх дзве сямігодкі ў мястэчку Петрыкаў. Акрамя іх былі яшчэ школы дагаворныя, яны ўтрымліваліся на сродкі насельніцтва. Усе сельскія школы былі пачатковымі. Многія з іх не мелі ўласных памяшканняў і цясніліся ў сялянскіх хатках. Не хапала падручнікаў, наглядных дапаможнікаў. Валасны выканком правёў рамонт школ і школьнага інвентару, забяспечыў палівам... Вялікая работа вялася па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослага насельніцтва, асабліва моладзі. «З гэтай мэтай, — адзначалася ў справаздачным дакладзе, — валасны выканком закупіў на тры чырвонцы газы, якая была раздзелена паміж школамі з разліку па паўфунта ў дзень...»

У валасным цэнтры былі клуб і хата-чытальня. Добраўпарадкоўвалася мястэчка Петрыкаў. Адрамантаваны многія грамадскія дамы, драўляныя тратуары, выкапаны новыя калодзежы. Новая, свежая плынь улівалася паўсюдна ў жыццё...

Працоўныя Петрыкаўшчыны адкліkаліся на ўсе грамадскія кампаніі. У фонд Таварыства сяброў паветранага флоту сабрана 52 пуды хлеба і 11 872 рублі...

СПИСОК НАСЕЛЕННЫХ МЕСТ БССР НА 1924 г.
(Белтрестпечать, Мн., 1924 г.)

Грабовская волость. Аграбовка (хут.), дворов — 1, жителей — 6; Березняки (хут.) — 1, 5; Березовка (хут.) — 14, 83; Брисов (хут.) — 1, 6; Вепры (уроч.) — 5, 21; Ветрок (хут.) — 5, 35; Ворошня (уроч.) — 1, 5; Глинище (хут.) — 1, 10; Городище (хут.) — 4, 18; Грабов (село) — 216, 1208; Грузливец (хут.) — 1, 13; Дубок (хут.) — 3,13; Жердь (уроч.) — 1, 7; Заберезье (уроч.) — 1, 5; Загалье (уроч.) — 1, 7; Замошье (хут.) — 33, 200; Клобук (хут.) — 9, 64; Колотница (хут.) — 3, 22; Кошевище (хут.) — 2, 9; Михедовичи I (дер.) — 106, 614; Михедовичи II (дер.) — 51, 262; Михедовичи (заст.) — 41, 267; Нагласино (уроч.) — 2, 14; Ожиновка (хут.) — 7, 33; Остров (хут.) — 3, 18; Подерье (хут.) — 3, 20; Поломка (хут.) — 2, 10; Рябка (хут.) — 11, 78; Селютичи I (дер.) — 177, 1063; Селютичи II (дер.) — 18, 87; Селютичи (фольв.) — 1, 17; Теребень (хут.) — 10, 74; Трояны (хут.) — 3, 23; Шилен (уроч.) — 2, 16; Эльжбетин (хут.) — 1, 7;

Комаровичская волость. Белка (хут.), дворов — 4, жителей — 24; Белка (хут.) — 2, 19; Белка (хут.) — 5, 39; Бервы Старые (хут.) — 2, 16; Березка Ближняя (уроч.) — 3, 21; Березка Дальняя (хут.) — 6, 40; Беседки (Озероды) (хут.) — 5, 29; Бобрик (дер.) — 100, 596; Бобрик (заст.) — 33, 225; Бор Зеленый (хут.) — 3, 32; Борки (фольв.) — 2, 9; Броды (хут.) — 1, 7; Ванюжичи (имение) — 1, 48; Ванюжичи (село) — 74, 473; Головчицы Новые (хут.) — 53, 347; Головчицы Старые (дер.) — 125, 735; Горка Красная (хут.) — 2, 11; Горное (Филиповичи) (лес. зав.) — 5, 76; Гряда (хут.) — 2, 19; Гурины (дер.) — 56, 328; Забинье (хут.) — 2, 7; Заболотье (хут.) — 2, 10; Забродье (дер.) — 18, 118; Завод Смолярный (хут.) — 2, 10; Замостье (заст.) — 29, 190; Заполье (село) — 123, 743; Заречье (Заречка) — 84, 508; Клясово (заст.) — 43, 219; Комаровичи (имение) — 1, 10; Комаровичи (село) — 107, 672; Кузьмичи (Новоселки) (дер.) — 225, 1278; Млынок (дер.) — 18, 136; Нивы Долгие (хут.) — 1, 6; Новоселки (имение) — 3, 20; Оносовичи (хут.) — 1, 3; Переезд Белый (зав.) — 1, 10; Переезд Белый (хут.) — 31, 205; Проходы (хут.) — 3, 26; Фастовичи (дер.) — 94, 542; Филиповичи (дер.) — 91, 491;

Копаткевичская волость. Багримовичи (дер.), дворов — 101, жителей — 625; Баташин (уроч.) — 1, 5; Берег Белый (уроч.) — 6, 37; Белка (хут.) — 14, 84; Беседки (село) — 110, 682; Бобречье (дер.) — 98, 674; Гореваха (хут.) — 2, 15; Городище (дер.) — 43, 303; Горы (Горки) (хут.) — 6, 38; Залесье (дер.) — 75, 418; Залесье (заст.) — 23, 140; Заречка (дер.) — 84, 510; Ивашковичи (дер.) — 149, 848; Копаткевичи (мест.) — 383, 2774; Млынок (дер.) — 29, 257; Мосты (хут.) — 7, 33; Мышанка (хут.) — 49, 226; Птичь (пос. и дер.) — 120, 663; Радки (хут.) — 5, 26; Рог (дер.) — 111, 706; Слободка I (дер.) — 119, 695; Слободка II (дер.) — 100, 561; Старина (заст.) — 13, 83; Теребов (дер.) — 126, 837; Хусное (дер.) — 102, 668; Челющевичи (село) — 94, 625;

Лучицкая волость. Ашква (хут.), дворов — 10, жителей — 71; Беседы (хут.) — 8, 69; Деменка Большая (дер.) — 37, 224; Деменка Малая (дер.) — 9, 60; Дуброва (хут.) — 22, 118; Евсеевичи (дер.) — 64,

403; Кощевичи (дер.) – 114, 642; Косейск (фольв.) – 16, 105; Косейск (хут.) – 19, 132; Кошевичи (дер.) – 70, 427; Лучицы (село) – 171, 1045; Нива Долгая (хут.) – 2, 12; Остров Бабий (хут.) – 3, 14; Пилатовка (хут.) – 17, 85; Поле Великое (фольв.) – 4, 52; Старина (хут.) – 9, 68; Хойно (дер.) – 158, 984;

Лясковичская волость. Беляны (заст.), дворов – 11, жителей – 126; Баклань (дер.) – 31, 205; Бринево (дер.) – 97, 520; Вышелов (дер.) – 72, 466; Глинка (хут.) – 17, 102; Голубица (дер.) – 126, 786; Полежач-Гора (хут.) – 26, 151; Дорошевичи (дер.) – 150, 868; Кабачок (хут.) – 5,36; Кощевичи (дер.) – 107, 550; Кощевичи (пос.) – 39, 215; Кощевичи (ж.-д. ст.) – 33, 203; Кощевичи (фабрика) – 14,134; Лясковичи (село) – 176,1107; Рубча (дер.) – 35, 255; Слензаки Бриневские (хут.) – 11, 85; Слензаки Дорошевичские (хут.) – 6, 42; Снядин (село) – 134, 870; Судибор (фольв.) – 1, 81; Торгашин (заст.) – 7, 62; Турок (дер.) – 108, 562; Филипоны (хут.) – 9, 58;

Петриковская волость. Адаси (дер.), дворов – 18, жителей – 116; Бабуничи (дер.) – 137, 820; Бахмат (хут.) – 4, 21; Белановичи (дер.) – 109, 667; Белка (дер.) – 111, 663; Болото-Янино (уроч.) – 7, 62; Боричев (дер.) – 25, 159; Верба (хут.) – 3, 17; Гороваха (хут.) – 12, 65; Каленики (дер.) – 30, 177; Конковичи (дер.) – 158, 1025; Коржевка (хут. и разъезд) – 27, 172; Куритичи (дер.) – 245, 1067; Лобча (заст.) – 18, 114; Людвинов (фольв.) – 1, 79; Макаричи (село) – 178, 1076; Мицуры (дер.) – 37, 250; Мойсеевичи (дер.) – 64, 406; Монастырь (хут.) – 13, 77; Мордвин (дер.) – 86, 517; Муляровка (ж.-д. ст. и хут.) – 27, 138; Новоселки (дер.) – 43, 279; Оголичи (дер.) – 174, 934; Акрыёны (хут.) – 9, 72; Атирки (дер.) – 43, 264; Петриков (мест.) – 1008, 6795; Подозбин (уроч.) – 6, 46; Рудня Оголичская (дер.) – 38, 233; Рудня Средняя (дер.) – 26, 177; Слинки (дер.) – 26, 157; Слобода Красноселка (дер.) – 86, 492; Сметаничи (дер.) – 110, 683; Сотничи (дер.) – 44, 278.

ОТЧЕТ О РАБОТЕ ПЕТРИКОВСКОГО РАЙКОМА КПБ ЗА ЯНВАРЬ – МАРТ 1925 г.

I. Краткая характеристика общих условий работы

Петриковский район является одним из наиболее крупных районов на территории Мозырского округа и объединяет 16 с/советов. Связь с отдаленными населенными пунктами плохая, так как там отсутствуют телеграф и телефон. Связь с округом в зимний период также недостаточна, так как поезд и почта бывают 2 раза в неделю...

Население района как в культурном отношении, так и в отношении обработки земли чрезвычайно отсталое.

II. Хозяйственное состояние района

1. Промышленность

На территории района имеется одна фанерно-лесопильная фабрика «Звезда». Фабрика имеет лесопильное, бочарное и фанерное отделения. В настоящее время на фабрике работает 137 человек рабочих.

Кроме фанерно-лесопильной фабрики на территории района имеются: мельниц паровых – 4, водяных – 2, ветряных – 10, кузниц – 20, кожевенных мастерских – 9, вовночесок и сукновалок – 15, всего 60 предприятий, которые как промышленные единицы существенного значения для района не имеют.

2. Сельское хозяйство.

Сельское хозяйство района находится на самой низкой ступени развития. Наиболее распространенным видом землепользования является чересполосица со всеми отрицательными качествами последней (дальноземелие и т. д.), а также хуторское хозяйство. Севооборот по преимуществу трехпольный.

Лучшей нормой землепользования по району признана поселковая, которая широкого применения, однако, не получила.

Тяга у крестьян к выделению на хутора имеется и в значительной степени большая, нежели к переходу на поселковую систему.

По данным земотдела Петриковского района имеется земли в пользовании крестьян 8647,49 десятин, из коих:

а) усадебной – 234,51 дес.; б) пахотной – 21 052,36 дес. ;

в) сенокосной – 27 513,32 дес.;

г) неудобной и под запасом – 29 554,3 дес.

Кроме того, лесная площадь по району определяется в 112 671 десятину.

Кулацкого элемента в районе почти нет. Колхозов в районе три. Экономическая мощность их чрезвычайно слабая, что объясняется отсутствием живого и мертвого инвентаря в них, с одной стороны, и неудачным подбором работников и неумением вести сельское хозяйство, с другой стороны. Отношение крестьян к колхозам отрицательное, так как крестьяне нуждаются в земле.

Совхозов два. Экономически также они очень слабые. Хотя по сравнению с прошлыми годами замечено некоторое улучшение. Отношение крестьян к совхозам еще более отрицательное, чем к колхозам...

Поселков в районе 9. Организованы они сравнительно очень недавно...

Работа ЛКСМБ

Петриковская организация ЛКСМБ состоит из 9 ячеек и насчитывает в своем составе 205 человек, из них: рабочих 104, крестьян 69, батраков 16, прочих категорий 16.

Беспартийная крестьянская молодежь находится полностью под влиянием комсомола, вследствие чего в других юношеских организациях в деревнях не нуждаются.

Политически комсомольцы слабо развиты, за исключением Копцевичской и Петриковской ячейки.

Пионерских отрядов в районе три. Всего пионеров 131 человек. Недавно в д. Конковичи организован еще пионерский отряд в количестве 23 человек, но он еще не утвержден.

В м. Петрикове в феврале месяце закончен ремонт и оборудование комсомольского клуба и клуба пионеров...

Профработа

Профбюро объединяет десять местных комитетов...

НИА Беларуси, ф. 75, оп. 1, д. 149, лл. 8—9.

ВЕДОМОСТЬ АДМИНИСТРАТИВНЫХ ВЗЫСКАНИЙ ПО ПЕТРИКОВСКОМУ РАЙОНУ ЗА ВРЕМЯ С 1 ЯНВАРЯ 1925-го ПО 1 ЯНВАРЯ 1926 г.

Группа нарушений	Число лиц, подвергнутых штрафу	На общую сумму (руб.)
Нарушение правил, охраняющих публичный порядок	9	26
Нарушение правил благоустройства, строительства и пожарных	105	188,5
Нарушение правил учета населения	10	16,5
Нарушение правил о занятиях промыслами и торговлей	8	10
Нарушение правил о выполнении налогов	—	—
Другие нарушения:		
изготовление и хранение самогонки	52	297
хранение огнестрельного оружия	2	5
потравы сенокосов	660	1333
лесонарушения	187	201

ФГА Гомельской обл. в Мозыре, ф. 60, оп. 1, д. 151, л. 25

* * *

У час кастрычніцкіх падзей 1917 г. большасць капаткевіцкай зямлі належала Шчурыку, Сіцкаму, Мазуркевічу і Перагуду. Мястэчка абслугоўваў адзін фельчар — Дубіцкі. У 4-класнай царкоўна-прыходскай школе вучылася каля 250 вучняў, у асноўным хлопчыкаў. Акрамя таго працавала яўрэйская школа (хедар), дзе равін навучаў дзяцей яўрэяў роднай мове. Пры касцёле існавала польская школа.

У 1918 г. Капаткевічы былі акупіраваны немцамі і гетманаўцамі. 15 верасня 1918 г. партызанскі атрад пад кіраўніцтвам Іоны Кузьміча вызваліў мястэчка ад захопнікаў, устанавіў савецкую ўладу і ўтрымліваў яе да прыходу ў снежні часцей Чырвонай Арміі.

У лютым 1919 г. мястэчка захапілі польскія жаўнеры, пад уладай якіх яно знаходзілася да 12 ліпеня 1920 г. У лістападзе 1920 г. некалькі дзён «гаспадарылі» атрады Булак-Балаховіча, нарабіўшы тут нямала бед.

У выніку новага тэрытарыяльна-адміністрацыйнага падзелу, які праводзіўся ў 1924 г., Капаткевічы сталі цэнтрам Капаткевіцкага раёна. За невялікім перапынкам у першай палове 30-х гадоў, ён праіснаваў да 1962 г., затым увайшоў у склад Петрыкаўскага раёна.

Указам Вярхоўнага Савета БССР «Аб класіфікацыі населеных пунктаў Беларускай ССР» ад 27 верасня 1938 г. Капаткевічы атрымалі статус гарадскога пасёлка. Тут была электрастанцыя, радыёвузел, хлебапякарня, МТС, радзільны дом, Дом сацыялістычнай культуры. Мясцовы калгас называўся «Ленінская

іскра». У 1938 г. адбыўся першы выпуск дзесяцікласнікаў. Заканчвалася будаўніцтва раймага, бальніцы, былі пабудаваны 7 жылых дамоў, 1 памяшканне дзіцячага садка. На развіццё камунальнай гаспадаркі і дабрабыт пасёлка дзяржава затраціла 220,2 тыс. руб., у 1939 г. — 584,9 тыс. руб.

А. В. Солахаў

КРАТКИЕ СВЕДЕНИЯ О КОПАТКЕВИЧСКОМ РАЙОНЕ МОЗЫРСКОГО ОКРУГА [1925 г.]

Район объединяет 11 сельсоветов с населением 26 842 человека. Территория района занимает 1268 кв. километров.

Район обслуживается одной семилеткой и 29 школами типа 0—3, в числе последних 2 национальных еврейских.

Специальных общественных библиотек не имеется, а имеются библиотеки при школах, избах-читальнях и нардомах, из последних имеются 2 избы-читальни и один нардом.

Район имеет больницу на пять коек и три фельдшерских пункта. Ветфельдшерский пункт один. Агропунктов 1, все эти учреждения состоят на местном бюджете и подведомственны РИКу. Кооперативных предприятий имеется 5... Частных мелких торговых предприятий имеется в м. Копаткевичи 12, на районе 7, совхозов 3, колхозов 1. Заводов: лесопильно-бочарный, кожевенных — 5, кирпичных — 3, дегтярных — два. Мельниц: паровых 6, водяных 2, ветряных 12... Совхозы и 2 паровые мельницы находятся в ведении Белсельтреста, две паровые мельницы — в ведении РИКа. Из учреждений, находящихся на окружном бюджете, имеется одно лесничество и один инвалидный дом. Учреждений, состоящих на местном бюджете, подотчетных округу — раймилиция и нарсуд. Для борьбы с пожарами организованы три пожарные дружины, приобретен обоз из двух новых насосов, два насоса отремонтированы...

НГА Беларуси, ф. 6, оп. 1, д. 864, л. 87—89.

ПРАТАКОЛ ПЛЕНАРНАГА ПАСЯДЖЭННЯ КАПАТКЕВІЦКАГА РАЁННАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА

пас. Птыч, 15 лістапада 1925 г.

...Сельскі савет абслугоўвае 7 вёсак, 2 вялікія хутары з лікам гаспадарак 713 і насельніцтвам 4150 асоб, зямлі ворнай 1306 дзес., сенажаці 647 дзес., жывёла: коней 267, валоў 867, кароў 875, авечак 2120, свіней 652. У сельскім савеце ёсць ніжэйступовыя прадпрыемствы: паравы млын, вадзяная сукнавалка, 4 кузьні, 8 маляроў, 3 сталяры і 3 краўцы, 3 тарговыя прадпрыемствы, спажывецкае таварыства, 2 прыватныя мясныя крамы, 2 бакалейна-галантарэйныя і піўная. Раней праца с.-с. праводзілася няпланава, а ў сучасны момант — па плану, выпрацаванаму сельскім саветам сумесна з камісіямі... Сельскім саветам праведзена праца па папраўцы 2 мастоў, пабудаваны тратуары ў пас. Птычы, якія пабудаваны на 70 %. Арганізавана пажарная дружына, якая яшчэ мае помпы... Пры яўрэйскай школе чытаюцца вячэрнія лекцыі для насельнікаў, пры школе працаўнікоў чыгункі арганізавана вячэрняя змена, у якую ходзяць беларускія і рускія дзеці школьнага ўзросту, якія засталіся па-за школаю з прычыны адчынення ў пас. Птыч яўрэйскай нацыянальнай школы, а таксама пры сельскім савеце арганізавана школа для дзяцей нулявой групы. Усяго школ у с.-с. 7, якія абслугоўваюць 65 % усіх дзяцей. Выпіска газеты павялічылася з 13 па 384, сцянных газет выпушчана 7... 4 гаспадаркі сеюць канюшыну. Праводзілася праца па разгляданню зямельных скаргаў, а гэтаксама па раздзелу сенажаці. Па сельскагаспадарчаму падатку належала да ўзыску ў першую чаргу 1113 руб., выпаўнена 1557 руб. Па страхоўцы ўзыскана 70 %. За 1925 г. прапала жывёлы 35 шт., за якія выплачана страхоўка. Камітэт узаемадапамогі працуе слаба, усяго ўцягнута да 45 % насельніцтва... Краж было 16, ёсць тайны выган самагону, з якім прымаюцца меры барацьбы...

Старшыня	*Жукаў*
Сакратар	*Стульба*

НГА Беларусі, ф. 34, воп. 1, с. 414, л. 1298.

ВЯЧОРКІ

(в. Бабрэчча Капаткевіцкага раёна)

— Куды ты ідзеш, Лявон? — запытаў малады хлапец свайго таварыша.

— На вячоркі, — адказаў той і ляснуў дзвярамі сянец.

Дзеўкі пелі нудную песню пра любосці голасна-голасна, нібы жадаючы заглушыць роў самапрадкі і ласкавы спеў верацяна. Лявон увайшоў у хату, зняў шапку, кашлянуў, закінуў грыўку, правёў рукою па збунтаваных рыжаватых валасах і моўчкі падышоў да дзяўчыны Параскі.

Параска ласкава глянула на Лявона, на твары яе вызначыўся аганёк маладосці і шэрыя вугалькі-вочы нібы перадалі яе шчасце таваркам. Лявон моўчкі блудзіў па стане Параскі рукою і час ад часу самазадаволена ўсміхаўся пад кірпаты нос... Дзела было ў пару пад пеўні, калі Параска паслала пасцель, Лявон зняў світку і боты.

Хлапец ён быў, як яго звалі ў сяле, савецкага пакрою, але па дзедаўскіх слядах ішоў да сямейнага шчасця.

У в. Бабрэчча звычай такі: дзеўкі ходзяць па некалькі на вячоркі з начлегам, ці дзе дзянуюць, там і начуюць, а да іх ходзяць хлапцы... Начоўкі хлапцоў з дзеўкамі мераюцца часта гадамі — тры, пяць, а то і дзесяць год.

Так! У вас можа, таварышы, саюз маладых людзей завецца «любоў», а ў нас — па-прасцяцкі — гэта завецца проста «спаць». Лявону васемнаццаты год і ён ужо сыць з Параскаю тры гады з гакам. Параску сваталі добрыя людзі і, як гэта падабае дзяўчыне, яна запытала, ці ісці замуж не ў бацькоў, а ў Лявона. Той нібы нехаця адказаў: «Як хочаш!» Вядома, што Парасцы як будучай матцы важна будзе слухаць, калі яе дзіцё толькі за эканамічную залежнасць чужога чалавека будзе зваць: «Тата, бацька ці, далікатней, папа». З другога боку, яе пужае суд людзей, які чакае яе, калі Лявон яе не возьме. Лявон ужо і цяпер пачынае заігрываць з другімі дзяўчатамі, і ёй часта гавораць, што Лявон начуе з другою.

Той вечар, калі Лявон з ёю, яна ад радасці гатова пацалаваць, а калі яго няма, то слёзы заместа мачалкі змочваюць нітку і зматваюцца з ёю на кацёлку ці верацяно.

Яна часта разважае сабе: «Возьме мяне Лявон, збудуем новую хату, падзелімся з бацькамі і будзем гартаваць свае думкі ў працы і спажываць яе». Але часам смутныя, чорныя думкі закалышуць сэрца. Потым слёзы замыкаюцца ў дзявочы хвартух, і яна зноў смяецца і шукае позірку Лявона.

Лявон цяпер у задуменні, часта злуецца на паказаўшага гэту начную дарогу, але сам над сабою не гаспадар... Часта абодва яны плачуць і клічуць: «Вячоркі... у нябыт!»

Хведар Бужан
«Савецкая вёска», 14 лютага 1926 г.

ПАСТАНОВА ПЕТРЫКАЎСКАГА РАЁННАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА АБ УСТАНАЎЛЕННІ КІРМАШНЫХ ДЗЁН У ПЕТРЫКАВЕ

13 сакавіка 1926 г.

У цэлях паляпшэння збыту сялянству маёмасці сваёй гаспадаркі і купчы такіх, Петрыкаўскі раённы выканаўчы камітэт пастанаўляе:

1. Кірмашныя дні ў г. Петрыкаве ўстанавіць тыднёва, па аўторках, чацвяргах, пятніцах і нядзелях...

2. Каля паждэпо і кааперацыі на асобных вітрынах будуць вывешвацца ў дні кірмашу расцэначныя табліцы на ўсе прадукты.

3. Месца для кірмаша — Чырвоная Плошча.

4. Назіранне за выпаўненнем гэтай пастановы ўскладваецца на міліцыю і гарсавет. Віноўныя ў невыкананні пастановы будуць прыцягвацца да штрафу ў адміністратыўным парадку да 25 руб. альбо прымусовых работ да 2 тыдняў.

Старшыня РВК — *Купрыянаў*
Заг. Камгас. — *Фарвегін*
Сакратар — *Волкаў*

ФДА Гомельскай вобл. у г. Мазыры, ф. 60, воп. 1, с. 151, л. 9.

РЕЗУЛЬТАТЫ ПЕРЕПИСКИ МЕСТНОЙ ПРОМЫШЛЕННОСТИ ПЕТРИКОВСКОГО РАЙОНА ПО СОСТОЯНИЮ НА 1 СЕНТЯБРЯ 1926 г.

I. Мукомольная промышленность.

...Насчитывается мельниц: государственных — 2, из коих 1 паровая, 12 л.с., вторая — водяная, турбинная, 18 л.с.; 9 частных, из них 5 паровых и 4 водяных колесных, а также по всему району имеется мельниц-ветрянок 24, в среднем 6 л.с. каждая... Во всем районе имеется мельниц общей силовой установкой 342 л.с., из коих 184 силы приводится в движение ветром, 50 — водой и 108 — дровяным топливом.

Все мельницы при полной загрузке имеют возможность пропустить в течение года 646 000 пуд. зерна. Мельницами обслуживается район в 19 300 десятин пахотной земли. Район, обслуживаемый мельницами, ежегодно производит в среднем 775 800 пуд. зерна, из коего для перемола идет 467 620 пуд., фактически же перемалывается 437 000 пуд. зерна, следовательно, мельницы загружены на 67 %.

Работнікі шавецкай арцелі «Аб'яднанне» каля сцяга арцелі. 1927 г.

Помольная плата взимается: водяными мельницами и ветряными — 3 фунта с пуда, паровыми — 4 фунта. Всего же в течение года собрано помольного сбора 38 470 пуд. на сумму 46 164 рубля. Имеющиеся при мельнице подсобные предприятия (вовночески, сукновязки) дают ежегодно доходность 1228 рублей...

II. Кожевенная промышленность

В радиусе до 9 верст в районе м. Петрикова имеется 9 кустарных кожевенных заводов, объединяющих 27 кустарей-кожевников. Заводы примитивного типа, не механизированы, в 2 из них имеются приводы лошадиной тяги для рубки коры. Время выработки кожи продолжается в среднем 3 месяца. Всего заводами ежегодно обрабатывается сырья в среднем 2800 пуд. на сумму 44 800 руб.

III. Обувное производство

Среди кустарей Петриковского района самым мощным является обувной цех как по количеству членов, так и по количеству производимых изделий. Всего в Петриковском районе насчитывается 297 обувщиков... Ежегодно производится 17 856 пар обуви. Району же требуется значительно меньше, исходя из расчета: число жителей — 41 500; потребное количество обуви (41 500×0,25)=10 400, следовательно, 17 856—10 400=7456 пар обуви вывозится за пределы района... Обувь в размере 65 % производимого количества изготовляется из местной кожи (полувал — юфта), остальные 35 % производятся из привозимых товаров (хром, шевро, бланк)...

IV. Мыловарение

Имеющийся в м. Петрикове кустарный завод гр-на Гутника оборудован котлом вместимостью 40 пуд. готового изделия. Для получения сорока пудов мыла одной варки необходимо: жиров — 20 пуд. (по цене 11 руб.); каустической соды — 3,10 п. (по 6 руб.); графита — 0,25 п. (по 5 руб.); воды — 22 п.

Стоимость пуда мыла равняется 7 руб. 75 коп. Продолжительность одной варки с просушкой и обработкой мыла равняется 10 дням.

До 40 % продукции производства поглощается местным рынком, остальные 60 % вывозятся за пределы района. Сырье добывается: каустическая сода — в Мозыре и Киеве, жиры — 60 % на местном рынке, 40 % за пределами района.

V. Винокурение

В Петриковском районе имеется 4 винокуренных завода, из коих в Лобчанском и Брынёвском здания

разбросаны на 70 %, а из оборудования сохранились котлы годностью 25 %. Здание Дорошевичского винокуренного завода сохранилось на 95 %, оборудование на 50 %; что касается Комаровичского, то таковой оборудован полностью и работает.

VI. Смолокуренное производство

В районе имеется один смолокуренный завод, который арендуется гражданами Бельшаном и Чаурским. Оборот печи продолжается в течение 5 дней. Таким образом, считая по 5 оборотов в месяц, в течение года получаем: 60 обор. в год×25 пуд. смолы; 80 обор. ×10 пуд. скипидара; 60 обор. ×50 пуд. угля.

Указанный завод обеспечен сырьем на 10 лет. До 60 % общей продукции забирается госторгом, остальная отправляется за пределы района...

VII. Выгонка дегтя

В районе имеется один дегтярный завод, частный, в Комаровичском с/с. Завод оборудован 5 котлами вместимостью 5 пуд. сырья каждый. Оборот котлов — 1 сутки. Котлы обслуживаются гонщиком и упаковщиком. Каждый пуд бересты дает 0,25 п. дегтя... Что касается сбыта продукции, то на рынке большой спрос на деготь.

VIII. Кирпичное производство

Имеется 3 кирпичных завода, из коих один находися в Грабовском с/с, 2 в м. Петрикове. Первый завод оборудован на выпуск до 100 000 кирпича ежегодно, а остальные два могут выбросить ежегодно до 150 000 кирпича, но один из них, гр-на Сливко, находящийся на окраине г. Петрикова, с пропускной способностью 100 000 шт., в последнее время не работает.

IX. Комбинат

В следующем бюджетном году заканчивается постройка в городе комбинированного предприятия с силовой установкой в 33 силы, объединяющего в себе электростанцию, мельницу, лесопильный завод, просорушку, вовноческу и сукновалку.

Мельница: пропускная способность при одной смене в течение рабочего года — 140 000 пуд. зерна, фактически мельница перемалывает не больше 52 200 пуд...

Лесопильный завод: пропускная способность одной рамы в год в одну смену ежедневно 125 000 куб. фут., фактически лесопильный завод будет распиловывать не больше 38 000 куб. фут... Госпароходство в заливе Бычек, на берегу которого расположен комбинат, ставит на зимовку до 40 судов, которым требуется как мелкий, так и капитальный ремонт, следовательно, и пиленый лесоматериал.

Іван — старэйшы, надзея сям'і, апора і памочнік бацькі. Вельмі ласкавай і спрытнай была Воля, а Ніна, як хлапец — баявая, працавітая, нястомная. Ёй было сем гадоў, яна пасвіла авечак — сваіх і чужых. Сядзіць неяк на пагорку, спявае сабе ціхенька, раптам бачыць — авечкі спудзіліся, кінуліся ўбок спалохана, а барана воўк валачэ ў кусты. Баран вялікі і цяжкі. Ніна хутка дагнала драпежніка. Ухапіла барана і да сябе цягне, крычыць што мае сілы. Кінуў воўк барана, ні з чым шмыгнуў у хмызняк, а Ніна прыгнала дахаты ўвесь статак. Пасля гэтага выпадку голас страціла, доўга не магла гаварыць, толькі шаптала.

Раслі мы самі па сабе. Няньчыцца не было каму, ды і часу не было. Мала хто з дарослых ў хаце бываў у гарачы летні ці асенні час, усе справай занятыя. Прыбяжыць маці, дасць грудзі — да чатырох гадоў грудзьмі карміла дзяцей — і зноў у поле ці на сенажаць. Я памятаю сябе чамусьці з вельмі малых гадоў, нават памятаю, як важылі мяне, калі яшчэ немаўлём была: пакладзе бацька ў хустку, звяжа ў вузельчык і чапляе на бязмен...

Іван, Оля і Ніна хадзілі ў школу, вярнуўшыся, увесь час да позняга вечара дапамагалі бацьку ці маці па гаспадарцы. Былі і святы, вольныя часіны, асабліва зімой. Маці хораша спявала, бацька любіў слухаць яе. Нярэдка ў хату прыходзілі на вячоркі суседзі, гаманілі, жанчыны зацягвалі песню — то сумную, гаротную, а то вясёлую, бадзёрую. Са Старыны ў Кашэвічы іншы раз праходзілі вясковыя хлопцы з гармонікам ці музыкі на свята, на вяселле — бацька заўсёды запрашаў іх у хату. Частаваў, яны іграліі спявалі — от была радасць, было свята для нас!..

А потым скончыліся святы. Ва ўжытак увайшлі новыя, незнаёмыя словы — калгас, падатак, цвёрдае абкладанне... Памятаю, зімовай раніцай прыйшлі два фінагенты з Капаткевіч. Прынеслі пастанову на падаткі. Мы ў гэты час снедалі. Усе ўсталі з-за стала перад няпрошанымі гасцямі. А я, самая маленькая, устала на лаву і перахрысцілася на ікону, што вісела ў покуці. Тыя, камсамольцы ці яшчэ вышэй — партыйныя, так і кінуліся да мяне: «Хто навучыў?» «Ніхто, — адказваю, — сама навучылася». Бацькі глядзяць на мяне ні жывыя, ні мёртвыя, у той час за

гэта па галоўцы не пагладзілі б, вельмі лёгка можна было трапіць у лік раскулачваемых за «разбэшчанне дзяцей рэлігійным дурманам». Я так і засталася стаяць на сваім: сама навучылася хрысціцца.

Бацька, Рыгор Кірылавіч Чаус, быў дэпутатам сельсавета. Атрымаў ён неяк спіс вяскоўцаў, што прызначаліся да высылкі. Маці прачытала яго — Божа, усе свае людзі, добрыя гаспадары... І кінула паперу ў печ, у агонь. Бацька не на жарт перапалохаўся: «Што ты зрабіла, ды мяне ж самога за гэта...» Неяк выкруціўся перад сельсавецкім начальствам, сказаў, што згубіў паперу. Далі прачуханца, аблаялі добра, але не ўсіх з таго чорнага спісу выселілі з вёскі. Енк і галашэнне стаялі тады над вёскай. Нкусаўцы кідаюць на воз клункі са скарбам небарак, а суседзі, асабліва мы, дзеці, стараемся, хапаем і цягнем назад з воза, іншых дзяцей, сваіх сяброў, трымаем моцна, не аддаём... Так некалькі дзён ваявалі. Тады, як гурганы, ноччу наляцелі нкусаўцы і вывезлі няшчасныя сем'і.

Да пачатку калгасаў не хапала прамысловых тавараў, вопраткі і абутку, усе на будні насілі лапці. Але харчоў было даволі. Толькі што смачнейшае — масла, яйкі, сала стараліся прадаць, каб займець капейчыну выплаціць падаткі — квітанцыямі на розныя падаткі была запоўнена цэлая скрынка — ды купіць якую неабходную для гаспадаркі рэч.

У канцы зімы 1939 г. бацька запрог кабылу і пасадзіў на воз невясёлую маці, павёз яе ў Камаровічы ў бальніцу. Я бягу за возам, плачу — і мяне вазьміце, раней заўсёды бралі, але на гэты раз было не да мяне. Я спатыкнулася, упала і, плачучы, вярнулася дамоў. А маці нарадзіла яшчэ аднаго хлопчыка. Роды былі цяжкімі, доктар не адпускаў яе дахаты. Але аднойчы маці прыехаў наведаць Іван, яна падала праз акно малодшага браціка, затым сама пралезла — і дамоў... Цукар, што давалі ёй у бальніцы да чаю, прыпасла і нам усім на гасцінец раздала.

Паклалі хлопчыка на печ, мы ўсе чацвёра абкружылі яго. Даволі буйны, чырвоны, і не крычыць, не плача... Навіна для ўсіх нас, радасць. Бацька пытае: «Як назавём браціка? Вось як малодшая, Анюта, скажа, так і будзе». А я не доўга думаючы: «Пятро!» Так з'явіўся ў нас самы малодшы брат Пётр. Царква ў нас была ўжо закрыта, але маці, набожная жанчына, вельмі хацела ахрысціць хлопчыка. Калі крыху паправілася, закруцілі яго ў вялікую хустку і паехалі з бацькам у царкву ў Бабруйск.

А дома на хрэсьбіны сабралася ўся радня, галоўнае, што час быў большменш вольны, самы пачатак вясны. У калыску клалі падарункі, сядалі за стол. Частаваліся, пілі гарэлку з чацвярцінак. Тады наогул многа не пілі. Спявалі... А ў канцы свята разбівалі гаршчок з прасяной кашай, якую павінен быў пакаштаваць кожны госць. Тады за стол дазвалялі сесці ўсім нам, дзецям.

Перад вайною было загадана ўсім пераселяцца з хутароў у вёску. Бацькі ў гэты час дома не было, ён па разнарадцы працаваў у Мазыры. Хата наша стаяла зусім недалёка ад Старыны, спадзяваліся, што, можа, так і застанемся на месцы. Але вясковыя актывісты на чале з Андрэем Рудым не пагадзіліся. Прыйшлі аднойчы раніцай, і як маці ні прасіла, ні маліла пачакаць, пакуль прыедзе бацька з Мазыра, жардзінамі разбурылі печ, скінулі дах і пайшлі. Так мы апынуліся, маці з пяццю дзяцьмі, у хляве. У двары распальвалі вогнішча, варылі ежу сабе і жывёле. Прыехаў бацька, з дапамогай сваякоў перавезлі хату і склалі яе на новым месцы. Праз тры дні ён паехаў назад у Мазыр, а мы з маці, пакуль не наступілі халады, пілавалі дошкі, рабілі цэглу для печы, а жылі па-ранейшаму у хляве на старым селішчы.

А ў бацькі ў Мазыры справы склаліся вельмі дрэнна: за спазненне на работу яго арыштавалі. Добрыя людзі паве-

дамілі нам пра гэта, сказалі, калі будзе суд. Маці вельмі плакала і гаравала, а ў дзень суда запрагла кабылу і паехала разам са мною ў Капаткевічы, куды перавялі да гэтага часу бацьку. Зайшлі да яго сястры Кацярыны, распраглі кабылу. І вось — суд... Як убачыла я роднага чалавека, кінулася яму з плачам на шыю, міліцыянеры не могуць адарваць мяне. Так і пайшоў ён на лаву падсудных з дзіцём на руках. Як ні прасілі мяне пакінуць бацьку, цукеркі прапанавалі і пагражалі маці штрафам — я ні на што не згаджалася. Суддзі пайшлі раіцца, мы сядзім з бацькам, чакаем, што будзе. Вярнуліся, абвяшчаюць прысуд: тры гады прымусовых работ... Потым адзін засядацель гаварыў, што хацелі прысудзіць да турмы, ды дзіця пашкадавалі...

Прымусовыя работы бацька адрабляў дома на лесапавале. Пілаваў лес, вазіў бярвенне на чыгунку, працаваў ад цямна да цямна, але ўсё ж вырываў гадзіну-другую, каб абсталяваць новую хату. Ужо і хлеў, і гумно, і лазню пабудавалі. Сад пасадзілі. Маці выздаравела, бацька павесялеў. Пакрыху падрасталі мы. Іван ужо гаспадарыў нараўне з бацькам, Оля і Ніна жалі, касілі. Ніхто не здагадваўся, якія цяжкія выпрабаванні чакаюць нас наперадзе. Ішоў 1941 год...

Г. Р. Вільчанка

На старонках раённых газет

«КАЛГАСНІК ПЕТРЫКАЎШЧЫНЫ»

Ад забітай вёскі — да чырванасцяжнага калгаса

У 1925 г. у в. Вышалаў пабудавалі прасторную, чыстую школу, арганізавалася камсамольская ячэйка, членам якой з'яўляўся і я. Надышоў 1929 год. Камсамольцы і актыў сталі праяўляць ініцыятыву ў арганізацыі калгаса. Пад'ехалі ўпаўнаважаныя, зашумелі. Ну тут і пайшло. Калектывізавалі вёску і пачалі ўсё абагульваць, нават курэй. Шкодная работа, ліпавы калгас не ўтрымаўся на нагах. Усе разышліся.

Мы не закідалі работы. Нарэшце, восенню 1930 г. нам удалося скалаціць калгас з 7 гаспадарак. А вось у 1931 г. пачалі ўступаць шмат аднаасобнікаў у калгас. У гэты час раз'ярыўся кулак Курловіч Сцяпан і адкрыта выступіў супраць калектывізацыі. Дайшло нават да таго, што кулак Курловіч арганізаваў шайкі са сваіх агентаў і рыхтаваўся знішчыць арганізатараў калгаса, асабліва тачылі зубы на сакратара камсамольскай ячэйкі і на мяне.

Перамаглі і гэтую перашкоду. Курловіча раскулачылі і выслалі (дарэчы, ён зараз вярнуўся і працуе ў Дарашэвіцкім вінзаводзе). І ўсё ж яшчэ было цяжкавата: адсутнічаў учот, дрэнна арганізавана работа. Але мы ўжо моцна сталі на рэйках калектыўнай гаспадаркі.

Цяпер мы яшчэ больш памацнелі. К канцу года калгаснікі на працадзень атрымоўвалі па 2 кіло збожжа і 5 кіло бульбы... У 1933 г. ужо на працадзень прыпадала збожжа 2,5 кіло і бульбы 7 кіло.

Занкевіч Рыгор
1 мая 1935 г.

Сабатажнікі пакараны

Выкананне плана веснавой сяўбы з'яўляецца цвёрдым абавязкам кожнай аднаасобнай гаспадаркі. Гэтага не хацелі зразумець аднаасобнікі в. Міцуры Конкавіцкага сельсавета Ярыга В. і Міцура С., якія да выканання плана сяўбы ранніх яравых культур амаль не прыступілі і гэтым самым свядома сабатавалі выкананне плана веснавой сяўбы.

Петрыкаўскі нарсуд разгледзеў гэтую справу і прыгаварыў Ярыгу В. да двух год, а Міцуру С. да трох год пазбаўлення волі.

Скотчанка
2 чэрвеня 1935 г.

Новы Петрыкаў

На месцы дамоў і магазінаў былых купцоў Зарэцкіх, Богіных, Рапапортаў выраслі вялікія кааператыўныя магазіны: раймагі, прадмагі і іншыя. На месцы суднабудаўнічай верфі судаўласнікаў Бурака, Прахоцкага і Занкевічаў суднабудаўнічая арцель «Чырвоны суднабудаўнік» са сваім камбінатам.

У горадзе распачата брукаванне і азеляненне вуліцы, чыстыя прасторныя вуліцы горада асвятляюцца электрычнасцю. Былыя царквы, касцёлы і сінагогі ператвораны ў клубы, тэатры. У Петрыкаве сваё гукавое кіно, радыёвузел са 130 кропкамі ў кватэрах рабочых і служачых.

Зараз у горадзе налічваецца 6 школ, у тым ліку адна сярэдняя. У гэтых школах навучаецца 1129 чалавек. Поўнасцю ліквідавана непісьменнасць...

На месцы быўшых тракціраў і «заезных дамоў» выраслі культурныя гасцініцы, сталовая.

7 лістапада 1935 г.

Часцей прыязджайце з такімі карцінамі...

У кастрычніку месяцы ва многіх калгасах дэманстраваўся фільм «Чапаеў». Фільм быў сустрэты з вялікай радасцю. Многія калгаснікі прыслалі ў рэдакцыю свае ўражанні наконт гэтага фільма.

У калгасе імя Чарвякова Скрыгалаўскага сельсавета на кінасеансе прысутнічала каля трохсот чалавек. Калгаснікі прасілі кінамеханікаў часцей прыязджаць з такімі карцінамі.

Рудзько, Стральчэня, Казловіч
26 лістапада 1935 г.

Завод «Звязда»

З 7 красавіка на заводзе пачаўся стаханаўскі двухдэкаднік па ўдарнаму выкананню вытворчай праграмы красавіка месяца. Так, на сартыроўцы гатовай прадукцыі дзённае заданне выконваецца да 250 прац., на сушцы — да 160, сартыроўцы шпон — 200 прац., клейцы — 180—190 прац.

Зараз у цэхах распачата распрацоўка адкрытага пісьма камандарма цяжкай прамысловасці тав. Арджанікідзе аб арганізацыі стаханаўскай сустрэчы Першага мая.

12 красавіка 1936 г.

«БОЛЬШЭВІК»

17 студзеня адбыўся раённы злёт стаханаўцаў

200 стаханаўцаў і стаханавак — барацьбітоў за павышэнне ўраджайнасці, за сацыялістычную жывёлагадоўлю 17 студзеня сабраліся ў мястэчка Капаткевічы на свой раённы стаханаўскі злёт. На раённым злёце ўдзельнічае 63 калгасніцы-стаханаўкі. З усяго ліку стаханаўцаў ёсць 35 чалавек, працуючых на калгасна-таварных фермах. У ліку 200 стаханаўцаў раёна прысутнічае ардэнаносец тав. Ігнатаў — з калгаса «Чырвоны колас» Лучыцкага сельсавета.

Калгас расце

Калгас «Чырвоная Дуброва» Чалюшчавіцкага сельсавета арганізаваны ў 1929 годзе. Зараз усе 55 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак вёскі Дуброва ўступілі ў калгас.

Да чэрвеня месяца 1935 года калгас меў рад недахопаў. Адсутнічала працдысцыпліна, улік заблытан. Такое становішча адбілася на зніжэнні ўраджаю і падзяжы жывёлы ў калгасе. З чэрвеня месяца 1935 года, пры пачатку работы старшыні калгаса тав. Дубровы Спірыдона, усё ў хуткім часе ў калгасе змянілася. Спыніўся падзеж цялят і свіней. Цяглавая сіла з ніжэй сярэдняй упітанасці стала сярэдняй і вышэй сярэдняй.

Калгас зараз мае буйную МТКФ, у якой налічваецца 199 штук буйнарагатай жывёлы, 49 свіней і 45 коней.

Засімаў
8 лютага 1936 г.

Падрыхтоўка МТС да веснавой сяўбы

Прайшло ўжо больш 8 месяцаў з часу арганізацыі МТС у нашым раёне. Зараз МТС мае 20 трактароў, 4 складаныя малатарні, плугоў 18 штук, 3 штукі дзіскавых барон і 2 сеялкі.

У гэтым годзе МТС павінна абслужыць сваёй сілай 32 калгасы. Зіма праходзіць. Набліжаецца стаханаўская вясна. Аднак на сённяшні дзень МТС знаходзіцца ў дрэнным становішчы. Да гэтага часу МТС не забяспечана гаручым. Дырэктар МТС тав. Дамарацкі спасылаецца на аб'ектыўныя прычыны (адсутнасць цыстэрны), а сам бяздзейнічае...

Брыгада рэйда: *Дзінарштэйн, Мычко*
17 лютага 1936 г.

За парушэнне калгаснага Статута — да суровай адказнасці

У новым статуце сельскагаспадарчай арцелі ўказана, што цяжарныя жанчыны-калгасніцы павінны карыстацца адпачынкам на месяц да родаў і адзін месяц пасля родаў. Разам з гэтым за перыяд свайго адпачынку калгасніцы павінны атрымаць працадні.

У калгасе «Бальшавік» Бобрыцкага сельсавета гэтага не выконваецца. Ні адна цяжарная калгасніца адпачынкам не карыстаецца. Старшыня Ястрэмскі цяжарных жанчын пасылае на цяжкія работы. Калгасніца Харланава Мар'я адпачынку не атрымала. Праўленне калгаса не давала ёй падводы для таго, каб паехаць у бальніцу. Увесь час Харланава працавала на цяжкіх работах. Ідучы з Капаткевіч (адлегласць 30 кіламетраў), Харланава ў дарозе радзіла нежывое дзіцё.

Старшыня калгаса Ястрэмскі не надзяляе калгаснікаў прысядзібнымі ўчасткамі.

20 мая 1936 г.

Адданы паступак двух піянерак

Піянерка Козік Мар'я скончыла 5-ю групу Навасёлкаўскай НСШ, яе бацька калгаснік. Сенько Маня ў гэтым годзе на выдатна скончыла 6-ю групу. Бацька Мані з'яўляецца актыўным членам Навасёлкаўскага сельсавета.

23 чэрвеня Мар'я і Маня пайшлі ў лес збіраць ягады. У гэты час падняўся вецер-буран, які вырваў дрэва і паваліў на пуць чыгункі. Сенько і Козік ведалі, што хутка павінен ісці са станцыі Старушкі на Заполле стаханаўскі цягнік. Піянеркі хутка пабеглі на станцыю Заполле і паведамілі аб гэтым дзяжурнаму па станцыі. Але ўжо было позна, цягнік са Старушак выйшаў. Тады дзяжурны па станцыі хутка паведаміў чыгуначнаму вартаўніку, які жыве недалёка ад паваленага дрэва, каб затрымаць цягнік...

Ганчароў
21 чэрвеня 1936 г.

Раўняцца па Навасёлкаўскаму сельсавету

Калгас «Чырвоны Кастрычнік» Навасёлкаўскага сельсавета за датэрміновае выкананне плана нарыхтовак і вывазак лесаматэрыялаў другога і трэцяга кварталаў атрымаў прэмію — патэфон, а старшыня калгаса тав. Дудка — 100 руб. грашыма.

Горш абстаіць справа па лесавывазках і нарыхтоўках у Камаровіцкім і Бобрыцкім сельсаветах. Калгасы «10-ы з'езд Саветаў», «Бальшавік», «Чырвоны Сцяг» і некаторыя іншыя таксама не займаюцца справай нарыхтоўкі і вывазкі лесу.

Сакавец
21 чэрвеня 1936 г.

На адкрыцці піянерскага лагера

16 ліпеня піянеры калгаса імя Галадзеда Лучыцкага сельсавета святкавалі дзень адкрыцця лагера. На адкрыцці піянерскага лагера прысутнічалі сакратар РК КП(б)Б тав. Узілеўскі і старшыня РВК Араўчык, прадстаўнікі АК КП(б)Б і АВК Нэйнштат, Патапенка, Крымскі і сакратар АК ЛКСМБ тав. Баранкін.

На піянерскім зборы з піянерамі гутарылі сакратар РК КП(б)Б тав. Узілеўскі і сакратар АК ЛКСМБ Баранкін.

Пасля гутаркі піянеры выканалі некалькі танцаў і песень. Прагледзеўшы самадзейнасць, прыехаўшыя прадстаўнікі партыйных і савецкіх арганізацый акругі і раёна пакаталі дзяцей на машынах.

Файнберг
19 ліпеня 1936 г.

На дапамогу братам па класу

5 жніўня ў калгасе «Чырвоны араты» і «Чырвоны барэц» Колкаўскага сельсавета адбыліся мітынгі калгаснікаў, прысвечаныя гераічнай барацьбе іспанскага народу супраць фашысцкіх мяцежнікаў. Калгаснікі вітаюць гераічнае змаганне іспанскіх рабочых і сялян супраць азвярэлых фашысцкіх генералаў Франко і Мола, падтрымліваемых фашыстамі Германіі і Італіі.

Прысутнічаўшыя на мітынгу калгаснікі сабралі 300 руб. грошай для дапамогі іспанскаму народу...

8 жніўня 1936 г.

Стаханаўка апрацоўкі ільну

Мароз Парасцы ўжо 70 год. Аднак працаваць яна любіць. Параска з'яўляецца лепшай ільнотрапальшчыцай у калгасе «Дзень ураджаю» Беседскага сельсавета.

Добрай высушкай ільну, правільным уходам за ім, раннім выхадам на працу Мароз Параска дабілася таго, што норму на тропцы ільну перавыконвае штодзённа на 60—70 і 100 прац. Замест нормы 10 кг Параска натропвае па 17—20 кг. Так, напрыклад, 22 верасня яна натрапала 17 кг, а 23 верасня — 21 кг. Мароз заўсёды дае высоканумарнае ільновалакно.

Паддубны Фёдар
28 верасня 1936 г.

Расце завод

Недалёка ад рэчкі Арэсы, на невялікім узгорку, паабапал акружаны рознымі дрэвамі, распаложаны Камаровіцкі спіртзавод. Тут жа прыгожы парк, дзе летам у вольны ад работы час адпачываюць рабочыя, а ў парку — бюст Леніна. Зімні вольны час рабочыя весела і культурна праводзяць у клубе. На заводзе, які вырас на месцы раней непраходнага балота, працуе каля 70 вясёлых, жыццярадасных рабочых і работніц. З іх лепшымі барацьбітамі-стаханаўцамі з'яўляюцца Еўсюк Есіп, Шарамета Ісак, Еўсюк Ганна, Феська Арсень, Клепусэвіч Якаў, Новік Ціт, Літвінаў Андрэй.

Маленькі па свайму аб'ёму заводзік, але ён прыносіць вялікую карысць. Штогод ён дае 177 тысяч 965 рублёў прыбытку.

С. Аўдзейчык
1 студзеня 1938 г.

Жывецца заможна і радасна

Цяжка ўспамінаюцца тыя тры гады, якія я прабатрачыў у крывасоса пана Левендоўскага, у якога было ў тры разы больш зямлі, чым ва ўсёй вёсцы Чалюпічавічы. Большую палову года мы работалі на пана, а плату атрымоўвалі вельмі мізерную. К прыкладу, за месяц работы ў пана я сама больш атрымоўваў 5 рублёў грошай. Хлеба хватала толькі да сакавіка месяца.

Зусім іншае цяпер... Вось хоць бы ўзяць 1937 год. За гэты год я выпрацаваў 930 працадзён. На працадні атрымаў 60 пудоў адных зернавых, 5580 кілаграм бульбы, 837 рублёў грошай і г. д. Таксама ў гэтым годзе я пабудаваў новую хату. Апрача гэтага, я маю 2 каровы, 3 свіней, 2 авечкі і шмат дробнай птушкі. Дзеці мае таксама вучацца...

Козінец Рыгор
Калгас «Пабеда»
1 мая 1938 г.

Сцягванне хутароў праходзіць марудна

Працоўныя нашага раёна падалі заявы аб перасяленні ў цэнтры калгасаў — 699 заяў. Аднак бяда ў тым, што кіраўнікі райвыканкома і старшыні сельсаветаў і паасобныя старшыні калгасаў мала ўдзяляюць увагі справе сцягвання хутароў.

Да прыкладу, калгаснік калгаса «Чырвоная вёска» Колкаўскага сельсавета Удод Рыгор Данілавіч яшчэ 5 мая 1938 г. падаў заяву старшыні калгаса т. Равуцкаму на сцягванне хутара. Гэта заява праляжала 3 месяцы ў Равуцкага. Толькі ў жніўні ён яе перадаў у РВК на афармленне. Зусім недапушчальна марудна ідзе сцягванне хутароў па Бобрыцкаму сельсавету. Тут, у калгасе «Бальшавік», патрэбна сцягнуць 26 хутароў, а сцягнута 16. Калгасу «Новы Млынок» патрэбна сцягнуць 5 хутароў, але ў выніку бяздзейнасці старшыні калгаса ніводзін хутар не сцягнут.

Беразень
14 жніўня 1938 г.

Прагульшчыкі звольнены

27 студзеня гэтага года на кожзаводзе м. Капаткевічы спазніўся т. Кветны Янкель на 35 мінут, Кветны Г. А. на 30 мінут. Адміністрацыя зволіла іх з работы як прагульшчыкаў прадпрыемства.

Такое становішча наглядаецца і ў адкормачным пункце Камаровіцкага спіртзавода. Тут т. Кормач Н. Ф. зрабіў прагул, т. Марціноўскі спазніўся на работу звыш 20 мінут. Усе яны як прагульшчыкі, дэзарганізатары вытворчасці дырэкцыяй зняты з работы.

3 лютага 1939 г.

ШЛЯХАМ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ ПЕРАЎТВАРЭННЯЎ

Калгасная пасека

Калгас «Асветнік» Лучыцкага сельсавета ў сваім карыстанні мае вялікі прыгожы сад. На тэрыторыі сада адведзена месца для пасекі.

Калгас у 1936 годзе меў усяго толькі два вуллі, у 1939 г. ён мае 36 вулляў з пчоласем'ямі. З кожнай пчоласям'і калгас у 1937 г. атрымаў па 72 кг мёду, а ў мінулым годзе з кожнай сям'і сабрана 82 кг мёду.

У гэтым годзе калгас у многа раз расшырыў сваю пасеку. Было пабудавана 16 вулляў, якія зараз поўнасцю заселены пчоласем'ямі.

Еськоў Ф. С.,
пчалавод калгаса «Асветнік»
6 жніўня 1939 г.

Падарункі дзецям Заходняй Беларусі

Вучні Капаткевіцкай СШ і рускай НСШ, Мышанскай СШ і іншыя рашылі паслаць свае падарункі дзецям Заходняй Беларусі. Вучні гэтых школ сабралі падручнікаў і літаратуры на суму 1500 рублёў. Сабраны пісьмовыя прылады, партрэты правадыроў і г. д. Кожны дзень паступаюць усё новыя і новыя падарункі.

Асабліва каштоўныя падарункі прыпаднеслі вучні Капаткевіцкай рускай школы Бальшакоў, Донін і Фарбер. Яны закупілі бюст М. І. Калініна, бібліятэчку з творамі савецкіх пісьменнікаў і паэтаў. Вучні гэтай школы Глускін і Райхчын рашылі паслаць альбом аб жыцці і дзейнасці таварыша Сталіна.

М. Кот,
заг. аддзела школьнай моладзі
РК ЛКСМБ
24 кастрычніка 1939 г.

З СТАТЫСТЫКА-ЭКАНАМІЧНАГА ДАВЕДНІКА «РАЁНЫ БССР» (МЕНСК, 1936 г.)

Капаткевіцкі раён. Насельніцтва — 39,6 тыс. чал. Сельсаветы: Бобрыцкі, Галоўчыцкі, Камаровіцкі, Кашэвіцкі, Колкаўскі, Капаткевіцкі, Капаткевіцкі (мест.), Лучыцкі, Навасёлкаўскі, Ніцкі, Чалюшчавіцкі, Беседскі, Церабаўскі, Герм.-Слабодскі.

Адна электрастанцыя — Чалюшчавіцкага вінзавода (30 тыс. квт/гадз.). У 1933 г. — 25 прадпрыемстваў (валавая прадукцыя — 1212 тыс. руб.), у тым ліку саюзных і рэспубліканскіх — 3, прамкааперацыі — 18, калгасных — 10, іншых — 7; лесахімічных — 3, дрэваапрацоўчых — 12, адзёжных і абуткових — 3, харчовых — 17. Цэнзавых прадпрыемстваў (без лесараспрацовак) на 1934 г. — 5 (саюзных і рэспубліканскіх — 3, прамкааперацыі — 2). Важнейшыя галіны — дрэваапрацоўчая і вінакурная. Галоўныя — дрэваапрацоўчая арцель (засн. у 1930 г., 27 рабочых), Чалюшчавіцкі вінзавод (засн. у 1907 г., 17 рабочых), Камаровіцкі вінзавод (засн. у 1905 г., 17 рабочых).

Сельская гаспадарка (зерневая): усяго ўгоддзяў — 139 640 га, у тым ліку ворыва — 26 295 га, сенажаць — 27 175 га, агароды — 934 га, сады — 107 га, лес — 50 600 га, балоты — 8052 га. Саўгасаў — 5, калгасаў — 62, іншых сельгаспрадпрыемстваў — 9 (на 1.1.1935 г.). Усіх гаспадарак — 3919.

Школы ўсеагульнага навучання: пачатковых — 39, няпоўных сярэдніх — 13, у іх навучалася 5976 вучняў, з іх у няпоўных сярэдніх — 3269; дзіцячых садоў — 2 на 45 месц; хата-чытальня — 1 (на 1.1. 1934 г.).

1 бальніца на 20 ложкаў, 4 урачэбныя амбулаторыі, 3 фельчарскія пункты.

На 1.1.1935 г. быў 51 магазін, з іх 9 дзяржаўных і 42 спаж. кааперацыі.

Петрыкаўскі раён. Насельніцтва — 49,9 тыс. чал. Петрыкаў — 5,2 тыс. чал. Гарсавет — Петрыкаўскі, сельсаветы: Асавецкі, Бабуніцкі, Белкаўскі, Брынёўскі, Грабаўскі, Глініцкі, Курыцкі, Конкавіцкі, Капцэвіцкі, Ляскавіцкі, Макарыцкі, Смятаніцкі, Снядзінскі, Скрыгалаўскі.[1]

Чатыры электрастанцыі — Петрыкаўскага камбіната (30 квт/гадз.), лесазавода «Смычка» (7 квт/гадз.), фанернага завода «Звязда» (216 квт/гадз.). У 1933 г. — 41 прадпрыемства (валавая прадукцыя — 6330 тыс. руб.), у тым ліку саюзных і рэспубліканскіх — 4, РВК — 3, прамкааперацыі — 18, калгасных — 11, іншых — 5, сілікатна-керамічных — 3, машынабудаўнічых — 2, дрэваапрацоўчых — 4, швейных — 4, абуткових — 4, харчовых — 17. Цэнзавых прадпрыемстваў — 7 (саюзных і рэспубліканскіх — 3, РВК — 2, прамкааперацыі — 2).

[1] 1.1.1933 г. — 25 сельсаветаў, агульная плошча раёна — 290 700 га (54 % землі сельскагаспадарчага прызначэння, 42 % — лес; 89,7 % прыгоднай сельскагаспадарчай зямлі, 10,3 % — непрыгоднай). Насельніцтва — 82 846 чалавек: беларусаў 93,1 %, яўрэяў 3,1, палякаў 2,1, рускіх 0,3, іншых нацыянальнасцей 1,4 %.

САЎГАСЫ ПЕТРЫКАЎСКАГА РАЁНА

Назва саўгасаў	Плошча	Лік тракторaў	Лік пастаянных рабочых	Назва саўгасаў	Плошча	Лік тракторaў	Лік пастаянных рабочых
Лучыцы	1456	1	76	Петушкоў	710	1	49
Дуброва	344	—	36	Калініна, насенняводчы	1114	4	135
Дарашэвічы	678	2	135	Скрыгалава	1411	8	52
Камаровічы	1335	5	119				

Важнейшыя галіны — металаапрацоўчая, фанерная, шавецкая, вінакурная. Галоўныя прадпрыемствы: цагельны завод № 18 (засн. у 1931 г., рабочых — 37), суднабудаўнічая верф «Чырвоны суднабудаўнік» (засн. у 1927 г., рабочых — 132), фанерны завод «Звязда» (засн. у 1904 г., рабочых — 664), шавецкая арцель «Аб'яднанне» (засн. у 1924 г., рабочых 47), Дарашэвіцкі вінзавод (засн. у 1932 г., рабочых — 26), леспрамгас (засн. у 1930 г., рабочых — 972).

Сельская гаспадарка (зерневая): усяго ўгоддзяў — 174 970 га, у тым ліку ворыва — 24 707, агароды — 1497 га, сады — 184 га, сенажаці — 26 465 га, лес — 82 190 га, балоты — 11 205 га. Саўгасаў — 3, калгасаў — 82, іншых сельгаспрадпрыемстваў — 14. Усіх гаспадарак — 4943, МТС — 1.

Школ усеагульнага навучання — 73, з іх сярэдніх — 2, няпоўных сярэдніх — 17, пачатковых — 54; агульная колькасць вучняў — 8471 чал., у тым ліку ў сярэдніх — 24, няпоўных сярэдніх — 132. Дзіцячых садоў — 6 на 265 месц, клубаў — 10, дамоў соцкультуры — 2, хаты-чытальні — 8 (на 1.1.1935 г.).

Бальніц — 3, у іх ложкаў — 80, урачэбных амбулаторый — 4, здраўпунктаў — 5, фельчарскіх пунктаў — 4.

На 1.1.1935 г. у раёне існавала 74 магазіны, у тым ліку 17 дзяржаўных, 57 — спаж. кааперацыі.

У раёне выяўлены наступныя карысныя выкапні: гліна ў в. Крутуха; жалезнякі — у вв. Скалодзіна, Аголіцкая Рудня, м. Капаткевічы, уроч. Гольцы; торф — вугаль і сапрапель — у в. Ляскавічы. 8,572 га балот са значнымі запасамі торфу...

На плыні жыцця

Ад родных ніў...

Дарожны Сяргей (Сяргей Міхайлавіч Серада) нарадзіўся 25.2.1909 г. У 1915 г. сям'я вымушана была эвакуіравацца ў Варонеж. Бацька, Міхаіл Серада, быў прызваны ў армію і загінуў у гады імперыялістычнай вайны. Праз тры гады вярнуўся ў Беларусь, у в. Ляскавічы, адкуль родам быў бацька Сяргея. У 1921 г. Сяргея, сясцёр Марыю і Надзю накіравалі ў Мазырскі дзіцячы дом.

У дзіцячым доме Сяргей закончыў сем класаў, напісаў першы верш, прысвечаны У. І. Леніну. У 1924 г. Сяргей Дарожны паступіў вучыцца ў Мінскі педагагічны тэхнікум, з 1928 па 1930 г. вучыўся на літаратурна-лінгвістычным аддзяленні педагагічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта. Друкавацца пачаў з 1925 г. Прымаў актыўны ўдзел у дзейнасці літаратурных аб'яднанняў «Маладняк», «Узвышша», супрацоўнічаў з рэспубліканскімі газетамі і часопісамі.

Выдаў зборнік вершаў «Звон вясны» (1926 г., сумесна з І. Плаўнікам), «Васільковы россып» (1929 г.), «Пракосы на памяць» (1932 г.). У сваіх вершах славіў гераічныя будні краіны сацыялізму, пісаў пра рэвалюцыйную барацьбу працоўных Заходняй Беларусі. Пераклаў на беларускую мову асобныя творы Дз. Беднага, М. Кальцова, А. Твардоўскага, У. Караленкі, С. Кірсанава, А. Новікава-Прыбоя, І. Уткіна, раман Г. Караваевай «Лесазавод».

Вёска Ляскавічы... Шмат успамінаў звязана з ёю ў Сяргея Дарожнага.

Вёска мілая,
Вёска родная,
Не магу я цябе не любіць...

Хаты вёскі раскінуліся паўз Прыпяць. Тут сапраўды хораша і вольна... Вясной, калі выходзіць з берагоў рака,

Сяргей Дарожны

разліваецца сапраўднае мора. Тут любіў бываць, адпачываць і тварыць паэт. Адсюль вёў перапіску з сябрамі. Ён пісаў Петрусю Глебку:

«Пятрусь! Пішу табе, браток, з далёкага «Сіберу», куды, як ведаеш, трэба ехаць два дні з гакам... Адным словам, мая вёска мне больш да душы, чымся ўсё расфарбаванае і няшчырае. Тут нама куды спяшыць, усё гэтае жыццё здаецца простай ідыліяй. Як тут хораша!

Пасылай па адрасу: Мазырская акруга, Петрыкаўскі раён, сяло Лясковічы, С. Серадзе».

Да Сяргея Дарожнага з павагай адносіліся многія пісьменнікі — Кандрат Крапіва, Пятрусь Глебка і іншыя. У 1932 г. Крапіва ў паэме «Хвядос — чырвоны нос» пісаў:

Вунь да Лясковіч дарога,
Жыў там сябра мой Сярога...

Творчасць Сяргея Дарожнага выпала на вельмі складаны і цяжкі час гісторыі Беларусі, калі свет як ніколі ні раней, ні пасля падзяляўся на знешнія, паказальныя і парадныя відовішчы, вясёлыя і радасныя будні, і цёмныя і змрочныя, патаемныя нкусаўскія скляпенні. Пра іх толькі здагадваліся і зацята маўчалі пад вечным страхам смерці людзі, і ў тых кругах пекла наканавана было закончыць свае дні паэту. Ён, як і ўсе іншыя, мог толькі славіць і захапляцца, у мажорных красках апісваць «працоўныя гераічныя дні» пралетарыяту і сялянства — у вершах «На ўдарных франтах», «Грыміць мураваны бетон», «Краіне», «Пагранічнікі», «Пад высокім сонцам» і многіх іншых. Захоплены і зачараваны родным краем, С. Дарожны піша пранікнёныя лірычныя вершы, прысвечаныя прыродзе, порам года, у якіх вельмі адчуваецца ўплыў яго цёзкі, Сяргея Ясеніна. Тут і «ружовыя коні», і нязменныя клён і пунцовая рабіна, і бярозка «ў залатым убранні», і «Добры дзень, матуля, гэта я, Сяргей, твой сын», і «З брэхам бобік наш дваровы зноўку лашчыцца да ног...» У нечым вельмі падобныя лёсы гэтых двух паэтаў: выхадцы з вясковай глыбінкі, аднолькавае ўспрыманне рэчаіснасці, вонкавае захапленне ёю і зачараванне жыццём, прыродай, людзьмі, потым забвенне і новае адкрыццё чытачам. Нават творчы шлях Дарожнага і Ясеніна выпаў на адзін час і працягваўся прыкладна аднолькавы перыяд, і лёс адмераў адзін узрост...

Максім Лужанін пісаў, што Сяргей Дарожны «найбольш абяцаў з маладых тады паэтаў, па ім засталося некалькі тонкіх, амаль забытых цяпер кніжачак... Лёс не быў да яго шчодрым, гэты здольны чалавек пайшоў ад нас, многа чаго не дагаварыўшы ў сваіх песнях». Дарожнаму было ўсяго 27 гадоў, калі ў 1936 г. яго беспадстаўна арыштавалі, абвініўшы ў падрыхтоўцы да забойства першага сакратара ЦК КП(б) М. Ф. Гікала, пра якога ён збіраў матэрыял для кнігі. Пакаранне адбываў на будаўніцтве «горада юнацтва» Камсамольска-на-Амуры, дзе загінуў у 1943 г., не дачакаўшыся вызвалення. В. Хомчанка, які сустракаў Дарожнага на Далёкім Усходзе ў 1940 г., успамінаў, што ён напісаў некалькі вершаў на рускай і роднай мове, але гэтыя апошнія творы паэта не захаваліся.

У 1957 г. Сяргей Дарожны рэабілітаваны і ўзноўлены ў Саюзе пісьменнікаў Беларусі.

В. Р. Феранц

Зіма цяпер і снегу па калені,
Ні сцежак, ні дарог няма,
Цярусяцца і падаюць сняжынкі памаленьку.
Зіма, зіма...

У палях снягоў сярэбраная ціша
Асела белаю і звонкай сівізной.
Ізноўку думы галаву маю калышуць,
Ізноў, ізноў.

Не спіцца мне, не спіцца мне, і часта.
Палае снег барвовістым агнём...
Не ведаю чаго, на радасць ці няшчасце,
Злятаецца сюды з паўночы вараннё.

На белы снег садзяцца і садзяцца,
Крыламі веючы над полем цемнату...
Гады, гады, міне ўжо скора дваццаць,
А дні сняжынкамі лятуць, лятуць.

Сяргей Дарожны
1928 г.

Неспакойнае сэрца

Дудар Алесь (Дайлідовіч Аляксандр Аляксандравіч). Нарадзіўся 24.12.1904 г. у в. Навасёлкі. Вучыўся на лінгвістычным аддзяленні педагагічнага факультэта БДУ, але не закончыў вучобу. У 1921 г. у газеце «Савецкая Беларусь» быў надрукаваны першы верш «Прэч з дарогі». Паэт ярка выражанага грамадзянскага тэмпераменту, адзін з лідэраў літаратурнага аб'яднання маладых пісьменнікаў «Маладняк», у 1928 г. выйшаў з яго і далучыўся да новага літаратурнага аб'яднання «Полымя». У зборніках вершаў «Беларусь бунтарская», «Сонечнымі сцежкамі» (1925), «І залацісцей, і сталёвей» (1926), «Вежа» (1928) услаўляў Кастрычнік, з захапленнем пісаў пра сацыялістычнае будаўніцтва. Многія вершы (балады «Машыніст», «Трыццаць пяць»), паэмы «Шанхайскі шоўк» (1926), «Слуцак» (1934) прасякнуты гераікай рэвалюцыйнай барацьбы. Пісаў пра сацыялістычнае пераўтварэнне горада і вёскі — паэмы «Вайна за мір», (1932), нізка вершаў «Палескія ночы» (1936). Выступаў у прозе (раман «Ваўчаняты») і ў крытыцы.

31 кастрычніка 1936 г. пісьменніка беспадстаўна арыштавалі і праз год, пасля жорсткіх допытаў і катаванняў, расстралялі, магчыма, у Курапатах.

Рэабілітаваны Алесь Дудар у 1957 г.

Узімку 1927 г. я выпадкова напаткаў у сельскай бібліятэцы невялічкую кніжку з назвай «Шанхайскі шоўк». Тады я як актыўны чытач у свабодны ад вучобы час дапамагаў бібліятэкару. На вокладцы гэтай кніжкі стаяла прозвішча Алеся Дудара. З ім я ўжо быў знаёмы па першай кніжцы «Беларусь бунтарская». Мяне здзівіла назва новай. «Паэт і раптам піша аб такіх празаічных рэчах, як шоўк», — падумаў я пра сябе. А калі адкрыў яе, то ўбачыў нешта зусім іншае. Пачаў чытаць гэтую кніжку, якая пачыналася радкамі.

Вандравалі гора з бядою,
Вандравалі не год і не два.
Пралілося віно дарагое
На ўзорны персідскі дыван.

Я ўжо не мог адарвацца ад кніжкі. Гэта была паэма, прысвечаная рэвалюцыйнай барацьбе кітайскага народа за сваю свабоду і незалежнасць. Яна зрабіла на мяне вялікае ўражанне. Я пачаў цікавіцца творчасцю Алеся Дудара. Адшукаў і прачытаў яшчэ дзве яго паэтычныя кніжкі — «Сонечнымі сцежкамі», «І залацісцей, і сталёвей». А потым набыў і прачытаў новую яго вершаваную кніжку «Вежа». З таго часу Алесь Дудар зрабіўся адным з любімых маіх паэтаў.

Як і яго сучаснік Андрэй Александровіч, Алесь Дудар лічыў сябе вучнем Маякоўскага і Чарота. Яго запал не знаходзіў граніц.

Хто прайшоў — галаву павесіў.
(Мільёны пудоў у гадах).
Ну, а я малады — мне весела
Разганяцца ў мяцежную даль.

З неспакойным сэрцам паэт Алесь Дудар скалясіў усю рэспубліку, якую ён любіў шчырай сыноўняй любоўю. Спачатку ў ролі артыста вандроўнага тэатра У. Галубка, потым у якасці журналіста. «Мая асноўная прафесія, — пісаў ён у сваёй аўтабіяграфіі, — газетны работнік, я працую на гэтай ніве бесперапынна з 1922 г.» І вандраванне з тэатрам, і паездкі па заданнях рэспубліканскіх газет дапамаглі Алесю Дудару яшчэ больш пазнаць і палюбіць Беларусь:

Мне казалі калісь: — Беларусь —
Гэта толькі балоты ды ўзгоркі,
Ды народ, што сагнуўшыся ў крук,
Лье свой пот у чужыя разоры.
Беларусь мая ў фабрычных трубах;
Беларусь нікім яшчэ не змерана...

Алесь Дудар быў цалкам адданы сваёй Радзіме і яе новаму жыццю. Радаваўся яве і прагна глядзеў у будучыню, як верны сын сваёй Радзімы, які ніколі не шукаў спакою і ціхай прыстані... Любіў новыя месцы, хацеў як мага больш ведаць родную Беларусь, таму заўсёды быў у дарозе, у вандроўках: ён

Алесь Дудар

гаварыў, што «ваўка ногі кормяць, а пісьменніку тэмы прыносяць».

З цягам часу А. Дудар станавіўся больш разважлівым і памяркоўным, ды і час быў такі, што лішняга слова лепш было не гаварыць. У апошнія гады жыцця ён быў зусім не такім, як у 20-я гады, больш-менш вытрыманым і асцярожным, немнагаслоўным, але вельмі прынцыповым, гатовым у любую мінуту адстаяць свой чалавечы гонар і годнасць. Больш крытычна пачаў адносіцца да сябе і да свайго слова. За гэта гавораць яго творы, напісаныя ў 30-я гады. Калі раней Алесь Дудар ішоў ад Чарота, то цяпер ён выбраў у настаўнікі Янку Купалу. Нездарма ён у аўтабіяграфічным артыкуле гаворыць: «Паміж паэтаў асабліва люблю Купалу, Чарота, Маякоўскага». Пад канец творчага жыцця Дудара пачало ўсё больш і больш цікавіць роднае Палессе, якім ён проста захапляўся. Вось як гаворыць пра гэта паэт у вершы «Палескае лета»:

Вось і золак. Уздымаюцца людзі і песні,
Як жар-птушка, гарыць, зіхаціць небакрай.
Спатыкае жаданага госця Палессе —
Умалотны, калгасны залаты ўраджай

Алесь Дудар шмат удзяляў увагі мастацкаму перакладу, асабліва ў сталыя гады сваёй творчасці. Ім перакладзены на беларускую мову «Яўгеній Анегін» А. Пушкіна, «Дванаццаць» А. Блока, «Самі» А. Ціханава, «Фауст» Гётэ, «Вільгельм Тэль» Ф. Шылера, «Германія» Г. Гейнэ, творы ўкраінскіх аўтараў.

За сваё кароткае жыццё Алесь Дудар паспеў зрабіць нямала, хоць мог зрабіць значна больш, ён пайшоў з жыцця ў самым росквіце сіл, таленту і задумак... Але і тое, што ён пакінуў, з'яўляецца найвялікшай каштоўнасцю. Гэта — дар яго неспакойнага сэрца нам, сучаснікам і нашчадкам.

*П. І. Прудніка*ў

ПЦІЧ

У балота ўрэзалася Пціч,
шырока поймы разгарнула.
Тут часам птушка праляціць,
А зверу не знайсці прытулку.

Павольна цягнецца рака
ў цяжкім гарнітуры балота:
яе пільнуе асака,
яе ахоўваюць балоты.

Але, зглынаючы засеў
тысячагодняга спакою
далоні жорсткія шасэ
мастом спляліся над ракою.

Пяюць на трасе малаткі,
усё бліжэй, усё імклівей —
яны ўбіваюць у вякі
тысячагоднюю імклівасць.

Каму было б тут галасіць?
Пад сонечнаю пазалотай
маўчалі дальнія лясы —
васалы вечныя балота.

Ім не сарвацца, не ўцячы:
маўклівасць — доля іх глухая.
...І з пасівелых хваль Пцічы
ахрыплы голас далятае:

— Мяне не ўцяць і не ўсушыць!
Я гэты край апанавала!
Жыве, жыла і будзе жыць
мая зялёная навала.

Я помню прадзеда твайго:
загнаны горам і турботай,
сюды прыйшоў ён, і яго
схавала я ў сваіх чаротах.

Касою твой гарэзны дзед
парушыў скарб майго спакою —
расплыўся знак яго і след
у глыбіні пад асакою.

І бацька твой пайшоў на дно.
І човен згніў, і згнілі вёслы:
і берагоў маіх радно
яго адпела безгалоссем.

І сын твой прыйдзе да мяне
ад долі жорсткай і нясытай
і супакоіцца ў багне,
маім туманам апавіты.
Як тысячу гадоў назад,
я буду несці смерць наўкола,
і подых мой вастрэй нажа
ўпівацьмеся ў людское горла.

І будуць ціснуцца палі,
далёка нікацьмуць дарогі!
Мяне вы не перамаглі
і не дажыць вам перамогі.

Вы хочаце бліжэй і лепш,
а будзе так, як я хачу!..
І з пасівелых хваль Пцічы
ахрыплы голас далятае:
— Таго табе не дачакаць.
Дый не было таго спрадвеку,

каб пакарылася рака
нікчэмнай сіле чалавека,

Мяне рукамі не ўбярэш
і за касу мяне не ўхопіш.
Ніякай сілай не прарвеш
мае дрыгвяныя акопы.

Мяне не ўцяць і не ўсушыць,—
я гэты край апанавала!
Жыла, жыве і будзе жыць
мая зялёная навала...

Але, зглынаючы засеў
тысячагодняга спакою
далоні жорсткія шасэ
мастом спляліся над ракою.
І далятаюць з-за ракі,
з-за столак сінечы туману,
аўтамабільныя гудкі —
сігналы заўтрашняга рання.

Алесь Дудар
1932 г.

На высокай ноце

Дзягцяр Мота Ізраілевіч (н. 15.7.1909 г. у в. Камаровічы) — яўрэйскі пісьменнік, які ў 30-х гадах актыўна выступаў у друку з нарысамі, апавяданнямі, аповесцямі.

Памёр у 1939 г.

Калі Моту споўнілася тры гады, бацькі пераехалі на жыхарства на станцыю Пціч. Бацька зарабляў на хлеб шыццём ботаў. Вучыўся гэтаму змалку і сын. Ён быў здольным вучнем, ужо ў 10 год амаль ні ў чым не ўступаў бацьку.

Аднак юнака не захапляла прафесія шаўца. У васемнаццацігадовым узросце ён паехаў шукаць шчасця ў Мазыр, уладкаваўся грузчыкам на чыгуначнай станцыі. У 1929 г. Мота пераехаў у Мінск: рэдакцыя газеты «Молодой рабочий» паслала яго на курсы будаўнікоў. Скончыўшы іх, працаваў мулярам на будоўлях сталіцы. У гэты час у друку пачалі з'яўляцца яго творы. Першае апавяданне М. Дзегцяра было надрукавана ў 1930 г. Мота скончыў рабфак, затым літаратурны факультэт Мінскага пединстытута імя М. Горкага.

Першая кніга празаіка пад назвай «На рыштаваннях» выйшла ў свет у 1934 г. Кожны новы год прыносіў новыя творчыя здабыткі. Адзін за другім выходзілі зборнікі твораў М. Дзегцяра «Савецкая Беларусь» (1935), «Будаўнікі» (1936), «Браты» (1937), «Верныя вартавыя» (1938). У сваіх творах пісьменнік расказваў пра энтузіязм і творчую працу рабочых, адлюстроўваў гераічнае мінулае нашага краю, паказаў нялёгкія, драматычныя падзеі грамадзянскай вайны. Чытаеш творы М. Дзегцяра — нібы сустракаеш знаёмых, як Прохар Бужан і Панас Дуда з апавядання «Пад дубам». Гэтыя прозвішчы распаўсюджаны на Петрыкаўшчыне. Дзяцей Прохара і Панаса — васемнаццацігадовага Трахімку і яго каханую Марфуську — павесілі польскія жаўнеры...

З 1937 г. Мота Дзягцяр служыў у Чырвонай Арміі. У верасні 1939 г. ён удзельнічаў у вызваленні заходніх абласцей Беларусі.

9 лістапада 1939 г. Моты Дзегцяра не стала.

Праз некалькі дзён пасля смерці пісьменніка з друку выйшаў новы зборнік яго апавяданняў — «На нашай зямлі», які пачынаўся са слоў: «Памёр малады цымбаліст...» Як песня цымбаліста Аніські з апавядання «Цымбалы» абарвалася на самай высокай ноце, так і жыццё пісьменніка спынілася ў самым росквіце яго творчых сіл.

Творы М. Дзегцяра перакладаліся на беларускую мову, у 1940 г. выйшаў зборнік «Апавяданні». У 1969 г. у перакладзе на рускую мову выдадзена кніга «Цымбалы».

А. В. Солахаў

Мота Дзягцяр

ПАСТАНОВА КАПАТКЕВІЦКАГА РК КП(б)Б АБ ВЫКЛЮЧЭННІ З РАДОЎ КП(б)Б Х. В. СТРОНГІНА

20 студзеня 1938 г.

Слухалі: Партыйную справу члена КП(б)Б 1924 г. Стронгіна Хаіма Вульфавіча — па соцстановішчы рабочы, па нацыянальнасці яўрэй. Скончыў камуністычны універсітэт імя В. І. Леніна, партспагнанням не падвяргаўся. У сучасны момант працуе дырэктарам фанернага завода «Звязда» — Капцэвічы.

Працуючы першым сакратаром Капаткевіцкага РК КП(б)Б у 1937 г., сваёй беспрынцыпнасцю, патазействам, бяспечнасцю і поўным прытупленнем бальшавіцкай пільнасці стварыў умовы ворагам народа — агентам замежных разведак праводзіць сваю гнусную падрыўную дыверсійную работу. На шэраг сігналаў аб варожай дзейнасці заядлых ворагаў народа Стронгін не рэагаваў, а падыходзіў к гэтым пытанням фармальна.

Стронгін, працуючы сакратаром РК КП(б)Б, замест бальшавіцкай карпатлівай работы і мабілізацыі партарганізацыі па павышэнню бальшавіцкай пільнасці і выкарчоўванню ворагаў народа, арганізацыйнага ўмацавання калгасаў, палітычнага забеспячэння выканання ўсіх гаспадарча-палітычных задач раёна і разгортвання палітыка-выхаваўчай работы калгасаў усе гэтыя мерапрыемствы падмяняў шумімхай, параднасцю і падхалімствам.

РК КП(б)Б адзначае адзін з вапіючых фактаў падхалімства і ўгодніцтва з боку Стронгіна, па ініцыятыве якога ў красавіку 1936 г. быў арганізаваны ўрачысты вечар сустрэчы ў калгасе «Чырвоны колас» ворага народа, на што патрачана 7566 руб. дзяржаўных і калгасных сродкаў, што выклікала недавольства калгаснікаў, пагоршыла іх матэрыяльнае становішча...

Поўная страта бальшавіцкай пільнасці з боку Стронгіна вызвана яго нерэагаваннем на сігналы, меўшыеся ў партарганізацыі, па варожай дзейнасці ворагаў народа, сістэматычным п'янстве, злоўжыванні, растранжырванні дзяржаўных сродкаў, засоранасці апарата РК КП(б)Б, дзе на працягу доўгага часу знаходзіўся на пасадзе інструктара польскі шпіён...

Выходзячы з чаго райком КП(б)Б пастанаўляе: За поўную страту бальшавіцкай пільнасці, адсутнічанне барацьбы з ворагамі народа і неразаблачэнне іх варожай дзейнасці ў бытнасці яго... першым сакратаром Капаткевіцкага РК КП(б)Б, адрыў ад мас, нерэагаванне на маючыеся сігналы аб контррэвалюцыйнай, варожай дзейнасці ворага народа, падхалімства і ўгодніцтва, арганізацыю ўрачыстай сустрэчы ворага народа і растранжырванне для гэтай мэты 7566 руб. дзяржаўных і калгасных сродкаў Стронгіна Хаіма Вульфавіча з радоў КП(б)Б выключыць.

«Бальшавік»
26 студзеня 1938 г.

У гушчыні жыцця

Бумажкоў Ціхан Піменавіч (н. 4.6.1910 г.) — гаспадарчы і партыйны дзеяч, арганізатар і кіраўнік партызанскага руху на Палессі. Першы Герой Савецкага Саюза ў гады Вялікай Айчыннай вайны — партызан. У 1938—1939 гг. працаваў дырэктарам цагельнага завода № 18 у Петрыкаве, старшынёй Петрыкаўскага райвыканкома.

Загінуў у верасні 1941 г.

Ц. П. Бумажкоў

...У лістападзе 1936 г. дырэктара Клімавіцкага завода будаўнічых матэрыялаў Ц. П. Бумажкова выклікалі ў Мінск. Дырэктар трэста выслухаў даклад аб становішчы спраў на заводзе, а потым без доўгіх прадмоў сказаў:

— Тое, што вы зрабілі, Ціхан Піменавіч, на заводзе ў Клімавічах, добра. Але другая пяцігодка набывае нябачаныя тэмпы, і не ўсе паспяваюць з яе рытмам. Словам, ёсць прапанова — узначаліць другі, больш буйны завод. Такі завод на Палессі, у Петрыкаве. Цагельны завод нумар васемнаццаць. Як вы на гэта паглядзіце?

— Калі давяраеце, давер трэба апраўдаць.

— Тады — у добры час. Здавайце справы ў Клімавічах парторгу, забірайце сям'ю — і ў Петрыкаў. Калі будуць якія пытанні ці непаразуменні,

звяртайцеся ў трэст.

Палессе! Край легенд, дзіўных казак, шчодрых і мужных людзей, край непаўторнай прыгажосці... Ціхан Піменавіч тут ніколі не быў, але чуў пра Палессе многа. Хацелася глыбей заглянуць у яго гісторыю, і, на вялікую радасць, яна аказалася дзіўна блізкай і зразумелай. І радкі купалаўскай паэмы «Над ракой Арэсай»: «Між топкіх багнішчаў, на выдмах пясчаных...», і бясстрашны партызан грамадзянскай вайны Васіль Ісакавіч Талаш — знакаміты па аповесці Я. Коласа «Дрыгва» дзед Талаш, і Прыпяць, і чароды птушак у вясеннім небе над галоўнай ракой Палесся — усё гэта было нібы даўно знаёма і дорага яго душы... Ціхан Піменавіч адразу, непрыкметна для сябе палюбіў гэты край, яго прыроду і людзей. З душой і ўвагай унікаў у іх жыццё і турботы, і «палешукі» адказвалі яму ўзаемнасцю, не толькі давяралі, але і паверылі яму. Паверылі ў чэснасць і мэтанакіраванасць маладога дырэктара, у яго веды і імкненне рабіць сваю справу лепш, з выгадай для краіны і людзей.

Праз год пасля прыезду Бумажкова ў Петрыкаў яго абралі старшынёй райвыканкома, дэпутатам абласнога Савета. А ў ліпені 1939 г. працаўнікі Петрыкаўскага раёна выбралі Ціхана Піменавіча дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. Старшыня райвыканкома быў заўсёды сярод людзей, раіўся з імі, з увагай адносіўся да турбот і просьб сялян і рабочых — ён валодаў цэльнай, валявой і чыстай натурай. У гэтым і заключаўся «сакрэт» поспеху, які нязменна спадарожнічаў Бумажкову ў любой даручанай справе. А справы ў раёне ў гэты час развіваліся бурна і імкліва. Мацнелі, набіралі сілу калгасы, знікалі хутары і з'яўляліся новыя вёскі і пасёлкі, якія атрымлівалі назвы — сімвалы свайго часу: Серп і Молат, Ільіч, Рэкорд, будаваліся школы і клубы, хаты-чытальні і дашкольныя дзіцячыя ўстановы. Гэта былі агульныя, калектыўныя дасягненні, але яны былі б немагчымымі без зацікаўленага, умелага кіраўніцтва. Ціхан Піменавіч, як заўсёды, працаваў творча, самааддана. У раёне, які ўжо крыху акрыяў ад жудасных яжоўскіх «чыстак», усё больш устанаўлівалася абстаноўка ўпэўненасці і аптымізму...

Але нядоўга давялося працаваць Ц. П. Бумажкову на Палессі. Сумленнага, разумнага, энергічнага кіраўніка заўважылі і ацанілі ў цэнтры вобласці — у Мазыры, і восенню 1939 г. прапанавалі новую, больш адказную работу ў толькі што створаным Акцябрскім раёне. Гэта была знакамітая Рудабелка — былая Рудабельская рэспубліка, якой было наканавана яшчэ раз праславіцца ў час вайны, што ўжо стаяла каля парога, і ўзначаліць барацьбу рудабельцаў давялося іх партыйнаму кіраўніку Ц. П. Бумажкову.

В. Р. Ферапц

ПРОТОКОЛ ЗАСЕДАНИЯ ПЛЕНУМА ПЕТРИКОВСКОГО РК КПБ

8/II-1940 г.

...Если на 1.1.1938 г. в районе насчитывалось 69 колхозов с количеством хозяйств 6197 — процент коллективизации 87,5, то на основе хозяйственного роста колхозов в 1938 г. вступило 501 хозяйство и в 1939 г. — 103 хозяйства. Теперь в колхозах района насчитывается 6801 хозяйство — процент коллективизации 96 (колхозов 68). Колхозы «Новая Глинка» и «Бринёв» Бринёвского с/совета объединены в один колхоз им. Чкалова.

МТС имеют 48 тракторов, кроме этого, палучили еще 5, три комбайна, автопередвижку, плугов тракторных 2, молотилок 52, сеялок 16, молотилок МХ-1100—6, молотилок БДО — 34.

Кроме этого, колхозы района имеют 28 автомашин.

НИА Беларуси, ф. 7, оп. 4, д. 968, л. 45.

* * *

...В школах Копаткевичского района на конец 1939—40 уч. года насчитывалось 53 школы, из них 5 СШ, 12 НСШ, в том числе 3 растущие и 36 начальных школ. Обучалось в них 6385 учеников. В результате проведения весенних и осенних испытаний переведены в старшие классы и выпущены со школ 5375 учеников, оставлено на второй год 930 учеников.

На начало 1940—41 уч. года в районе насчитывается 51 школа, из них 5 СШ, 13 НСШ, и 33 начальные школы (1 начальная переведена в растущую НСШ в д. Рог). Учитывая выпуск 4—7—10-х классов и набор в 1—5—8-е классы при условии, что ученики не выедут в другие учебные заведения, в школах района должно быть 7250 учеников... В школы должны были прийти 7069 учеников, посещают школы на 7 октября, по представленным отчетам, 6968 учеников. Неохват по району составляет 101 ученик...

В школах района работает 267 учителей. Из них с высшим образованием — 22, с незаконченным высшим — 33, со средним — 101, с незаконченным средним — 107 человек. На 10 октября некомплект учителей составляет для 5—10-х классов 18 человек...

Полностью обеспечены топливом только 11 школ. Заготовлены дрова, но не вывезены в 9 школах. Остальные школы обеспечены топливом на 50—60 %...

* * *

По Копаткевичскому району насчитывается неграмотных, по неточным данным, 1314 человек, малограмотных 1526 человек, из них на 10 октября обучается 475 человек, в том числе 121 человек обучается в школах повышенного типа. Во многих населенных пунктах района работают ликпункты и вечерние школы, но с малым посещением учащихся.

Насчитывается 13 ДСК, имеются 3 стационарные киноустановки, в последнее время работала кинопередвижка в районе. При ДСК работают библиотеки.

ФГА Гомельскай обл. в г. Мозыре, ф. 463, оп. 3, д. 12, сс. 131—134.

СПІС СЕЛЬСКІХ САВЕТАЎ І КАЛГАСАЎ КАПАТКЕВІЦКАГА І ПЕТРЫКАЎСКАГА РАЁНАЎ (1941 г.)

№ п/п	Сельскі савет	Калгас	Населены пункт, дзе размешчаны цэнтр калгаса	Колькасць двароў
Капаткевіцкі раён				
1.	Бобрыцкі	«Бальшавік»	Бобрык	218
		«Новае жыццё»	Клясаў	44
		«Чырвоны сцяг»	Белы Пераезд	30
		Імя Сталіна	Замосце	41
		«Новы Млынок»	Млынок	47
		«Новае Забінне»	Забінне	23
		Імя Кірава	Забродцзе	38
2.	Беседскі	Імя Варашылава	Беседкі	167
		«Чырвоны сцяг»	Мышанка	58
		«Першае Мая»	Ст. Кацуры	52
		«Дзень ураджаю»	Новыя Кацуры	44
3.	Галоўчыцкі	«Шлях Леніна»	Старыя Галоўчыцы	157
		«Новы араты»	Новыя Галоўчыцы	74
		Імя Варашылава	Праходы	80
4.	Капаткевіцкі	«Чырвонае сяло»	Вялікае сяло	186
		«Чырвоны партызан»	Першая Слабодка	163
		«Чырвоная Армія»	Івашкавічы	251
5.	Капаткевіцкі (гарпасялковы)	«Ленінская іскра»	Капаткевічы	156
6.	Камаровіцкі	«Новае жыццё»	Камаровічы	142
		«X з'езд Саветаў»	Заполле	229
		«Савецкая Беларусь»	Фаставічы	154
8.	Колкаўскі	«Чырвоны араты»	Колкі	201
		Імя Сталіна	Забродцзе	51
		«Чырвоны барэц»	Дуброва	93
		«Чырвоная вёска»	Сякерычы	194

№ п/п	Сельскі савет	Калгас	Населены пункт, дзе размешчаны цэнтр калгаса	Колькасць двароў
		«Чырвоная зорка»	Зарыжжа	76
		Імя Леніна	Зублішча	75
9.	Лучыцкі	«Асветнік»	Лучыцы	297
		«XVI партз'езд»	Капцэвічы	170
		«Новыя Беседы»	Беседы	33
		«Новая Хвойня»	Хвойня	213
10.	Навасёлкаўскі	«Чырвоны Кастрычнік»	Навасёлкі	246
		«Камінтэрн»	Філіпавічы	131
		«2-я пяцігодка»	Ванюжычы	184
		Імя Будзённага	Гурыны	73
11.	Пціцкі	Імя Чапаева	Багрымавічы	139
		«Новы Рог»	Рог	161
		Імя Фрунзе	Хуснае	190
		Імя Варашылава	Млынок	48
		Імя Молатава	Бабрэчча	186
		«Чырвоная Града»	Радкаў	33
		«Абарона Саветаў»	Гарадзішча	42
12.	Церабаўскі	«Чырвоны маяк»	Церабаў	182
		«Чырвоная зорка»	Баянаў	42
13.	Чалюшчавіцкі	«Ленінскі шлях»	Чалюшчавічы	174
		«Бальшавік»	Зарэчка	152
		«Перамога»	Перабітая Гара	49
		«Чырвоная Дуброва»	Дуброва	77
		«Новае Залессе»	Залессе	117
		Імя Кагановіча	Другая Слабодка	108
		Імя Будзённага	Засценак Залессе	30
		«Чырвонае Поле»	Вялікае Поле	48
Петрыкаўскі раён				
14.	Петрыкаўскі (гарадскі)	«Чырвоны агароднік»	Петрыкаў	50
15.	Белкаўскі	Імя Кірава	Белка	130
		Імя Варашылава	Бяланавічы	123
		Імя Чапаева	Гараваха	31
		«Чырвоны партызан»	Навасёлкі	61
		«XI з'езд Саветаў»	Чарноцкае	39
		«2-я пяцігодка»	Майсеевічы	114
16.	Конкавіцкі	«VII з'езд Саветаў	Конкавічы	75
		«Першае Мая»	Конкавічы	136
		Імя Сталіна	Аціркі	57
		«Зорка»	Міцуры	57
		«Чырвоная ніва»	Слінкі	47
		«Веснаход»	Акрыёны	43
		«Чырвоны Кастрычнік»	Адасі	26
17.	Курыціцкі	«Бальшавік»	Курыцічы	215
		«Шлях да сацыялізму»	Курыцічы	247
18.	Смятаніцкі	«II з'езд калгаснікаў»	Смятанічы	120
		«Чырвоная Рудня»	Сярэдняя Рудня	52
		«Чырвоны Будаўнік»	Слабодка	103
		«Чырвоны Кастрычнік»	Людзвіноў	62
		Імя Горкага	Коржаўка	43
19.	Бабуніцкі	«Зоў Ільіча»	Бабунічы	132
		«Сейбіт»	Міхедавічы	145
		«Пераможац»	Міхедавічы	136
		«Новы Барычаў»	Барычаў	48
		«Чырвонае Палессе»	Падканаплішча	77
		«XIII Кастрычнік»	Сотнічы	97

№ п/п	Сельскі савет	Калгас	Населены пункт, дзе размешчаны цэнтр калгаса	Колькасць двароў
20.	Грабаўскі	«Перамога-Грабаўскі»	Грабаў	259
		«Чырвоны араты»	Рабка	44
		«Новы быт»	Сялюцічы 1	177
		«XIII Кастрычнік»	Сялюцічы 2	82
21.	Капцэвіцкі	«Іскра»	Капцэвічы	150
		«Прафінтэрн»	Аголічы	130
		Імя Калініна	Беразнякі	44
		«Свабода»	Мельніцкае поле	28
		«Ленінец»	Аголіцкая Рудня	52
22.	Ляскавіцкі	«Калгасная праца»	Ляскавічы	279
		Імя Молатава	Дарашэвічы	198
		«Чырвоны Пасёлак»	Пасёлак	70
		«Чырвоны пагранічнік»	Баклань	71
23.	Снядзінскі	«Новае жыццё»	Снядзін	208
		«Савецкая Беларусь»	Белін	75
		«Чырвоны араты»	Мардзвін	103
24.	Брынёўскі	Імя Чкалава	Брынёў	176
		«Чырвоны сцяг»	Брынёў	86
		«Перамога»	Піліпоны	90
25.	Глініцкі	«Бальшавік Палесся»	Глініца	130
		«Чырвоны Скалодзін»	Скалодзін	80
		«Чырвоны маяк»	Шастовічы	158
		Імя Калініна	Крынічная Града	30
		Імя Кірава	Вялаўск	137
26.	Макарыцкі	«Ленінскі шлях»	Макарычы	236
		«Камунар»	Галубіца	146
		«Чырвоны будаўнік»	Вышалаў	129
		«Чырвоны прамень»	Турок	157
		«Першае Мая»	Ільіч	75
		Імя Калініна	Рубча	85

ФДА Гомельскай вобл. у Мазыры, ф. 463, воп. 3, с. 31, лл. 3—5, 37—39.

Ахвяры масавых рэпрэсій — бязвінна загінуўшыя землякі ў гады сталінскага беззаконня

БАБУНІЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА БАРЫЧАЎ

КРУКОЎСКІ Іван Іванавіч, н. у 1893 г., расстраляны 11.3.1938 г.

МІХАЙЛОЎСКІ Міхаіл Іосіфавіч, н. у 1906 г., расстраляны 16.2.1938 г.

МІХАЙЛОЎСКІ Сцяпан Данілавіч, н. у 1900 г., расстраляны 11.3.1938 г.

СТРАЛЬЧЭНЯ Пракоп Данілавіч, н. у 1888 г., расстраляны 11.3.1938 г.

ВЁСКА МІХЕДАВІЧЫ

БЕЛАСТОЦКІ Канстанцін Раманавіч, н. у 1895 г., загінуў у месцах зняволення (Комі АССР).

КОЛЬ Станіслаў Іванавіч, н. у 1896 г., расстраляны 28.1.1938 г.

ЛЕАНОВІЧ Аляксандр Іванавіч, першы старшыня калгаса «Сейбіт», н. у 1898 г., арыштаваны ў 1933 г., далейшы лёс невядомы.

СОКАЛ Андрэй Іванавіч, н. у 1901 г., расстраляны 2.11.1937 г.

СОКАЛ Пётр Міхайлавіч, н. у 1900 г., расстраляны 27.4.1938 г.

ЦЕЦЯРУК Уладзімір Мартынавіч, н. у 1892 г., расстраляны 5.1.1938 г.

ШУМСКІ Іван Іванавіч, н. у 1880 г., расстраляны 10.11.1937 г.

ВЁСКА САСНАВЕЦ

СУХОЦКАЯ Казіміра Казіміраўна, н. у 1890 г., памерла ў 1939 г. у Новасібірскай вобл.

СУХОЦКІ Адам Браніслававіч, н. у 1890 г., расстраляны 10.11.1938 г.

СУХОЦКІ Міхаіл Браніслававіч, н. у 1893 г., расстраляны 10.11.1937 г.

ПРЫЗНАЦЬ ВОРАГАМ НАРОДА...

Скупыя радкі са спраў яшчэ нядаўна засакрэчаных архіваў, за якімі — лёсы людскія... «15 лютага 1938 г. арыштаваны Крукоўскі Іван Іванавіч, 1893 г. нараджэння, ураджэнец в. Барычаў. Да арышту працаваў калгаснікам калгаса «Новы Барычаў», абвінавачаны ў антысавецкай агітацыі. Пастановай Асобай тройкі НКУС БССР прыгавораны да расстрэлу. Прыгавор прыведзены ў выкананне 11.3.1938 г...»

З «пасведчання аб смерці»:

«Крукоўскі Іван Іванавіч памёр 11.3.1938 г. ва ўзросце 45 гадоў, аб чым у кнізе рэгістрацыі актаў зроблен запіс № 36...

Прычына смерці: расстрэл... Месца смерці: г. Мазыр».

Дачцэ Івана Крукоўскага Зіне ў той страшны год пайшоў другі год, Ніна толькі нарадзілася. Прышылі немаўлятам бірку «дзеці ворагаў народа», ім не знайшлося месца ў Барычаве. Асірацелыя дзеці Крукоўскіх апынуліся ў Гаравасе (цяпер Першамайск). Знайшліся добрыя людзі, узялі да сябе, збераглі. Яны і цяпер жывуць у Першамайску.

Яшчэ больш трагічны лёс напаткаў сям'ю Сухоцкіх з Манастыра (цяпер Саснавец).

«Сухоцкі Адам Браніслававіч, 1888 г. нараджэння, арыштаваны 10.8.1937 г. Мазырскім акруговым аддзяленнем НКУС, абвінавачваецца ў контррэвалюцыйнай дзейнасці. Па пастанове Народнага Камісара Унутраных спраў СССР і Пракурора СССР ад 5.10.1937 г. расстраляны 5 лістапада 1937 г. у г. Мазыры.

Сухоцкая Казіміра Казіміраўна (жонка Сухоцкага), 1890 г. нараджэння, арыштавана 11.8.1937 г. Мазырскім акруговым аддзелам НКУС, абвінавачваецца ў правядзенні контррэвалюцыйнай дзейнасці... Заключана ў папраўча-працоўны лагер тэрмінам 10 гадоў. Адбывала пакаранне ў г. Марыінску Новасібірскай вобласці...»

З «пасведчання аб смерці»:

«Сухоцкі Адам Браніслававіч памёр 5.11.1937 г. ва ўзросце 49 гадоў...

Прычына смерці: расстрэл... Месца смерці: г. Мазыр».

«Сухоцкая Казіміра Казіміраўна памерла 18.12.1939 года.

Прычына смерці: не ўстаноўлена. Месца смерці: г. Марыінск, Новасібірскай вобласці...»

...І яшчэ адна справа.

З адказу Гомельскага абласнога суда Кучук Антаніне Аляксееўне, якая пражывае ў в. Бабунічы:

«29 лістапада 1933 г. ваш бацька Ярыга Аляксей Васільевіч, 1893 г. нараджэння, ураджэнец в. Бабунічы, да арышту працаваў у калгасе в. Бабунічы. Пастановай тройкі АПУ арыштаваны і прыгавораны да заключэння ў г. Ухта Комі АССР.

Справа па абвінавачванню Ярыгі А. В. перагледжана прэзідыумам Гомельскага абласнога суда 1 красавіка 1957 г. і па справе ён рэабілітаваны...»

З «пасведчання аб смерці»:

«Ярыга Аляксей Васільевіч памёр 9.12.1944 г. ва ўзросце 51 год. Прычына смерці: параліч сэрца. Месца смерці: г. Ухта, Комі АССР...»

ГАЛУБІЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА ВЫШАЛАЎ

ДАМАСЕВІЧ Іван Яфімавіч, н. у 1904 г., расстраляны 29.12.1937 г.

ВЁСКА ГАЛУБІЦА

ГАНЧАР Сцяпан Фёдаравіч, н. у 1876 г., расстраляны 31.1.1938 г.

ЖУКАВЕЦ Іван Сцяпанавіч, н. у 1866 г., расстраляны 31.1.1938 г.

КУЛЬЧЫЦКІ Пётр Сцяпанавіч, н. у 1896 г., расстраляны 31.1.1938 г.

КУЛЬЧЫЦКІ Сцяпан Васільевіч, н. у 1873 г., расстраляны 31.1.1938 г.

ПАШУК Павел Майсеевіч, н. у 1857 г., расстраляны 14.10.1937 г.

ПЕТРАВЕЦ Іван Міхайлавіч, н. у 1874 г., загінуў у 1938 г. у месцах зняволення.

ХАРКАВЕЦ Даніла Аксенцьевіч, н. у 1885 г., расстраляны 19.10.1937 г.

ШПАКОЎСКІ Антон Мікалаевіч, н. у 1888 г., расстраляны 24.12.1937 г.

ЮЗЭФОВІЧ Казімір Казіміравіч, н. у 1871 г., расстраляны 2.10.1937 г.

ВЁСКА РУБЧА

ПРЫКОТА Іван Максімавіч, н. у 1867 г., расстраляны 27.9.1937 г.

ПРЫКОТА Макар Максімавіч, н. у 1868 г., загінуў у 1937 г. у месцах зняволення.

ПРЫКОТА Міна Максімавіч, загінуў у 1937 г. у месцах зняволення.

ПРЫКОТА Пётр Максімавіч, н. у 1885 г., расстраляны 19.10.1937 г.

ПРЫКОТА Сцяпан Пятровіч, н. у 1909 г., расстраляны 5.3.1933 г.

ВЁСКА СЛАВІНСК

АДАМЕНКА Іван Мікалаевіч, н. у 1896 г., ветурач, загінуў у 1937 г. у месцах зняволення.

БЕНЯК Пётр Міхайлавіч, н. у 1905 г., старшыня калгаса, расстраляны 22.5.1938 г.

ЖУКАВЕЦ Майсей Зіноўевіч, н. у 1898 г., загінуў у 1937 г. у месцах зняволення.

КАВАЛЬСКІ Франц Францавіч, н. у 1899 г., загінуў у 1937 г. у месцах зняволення.

КАВЕЦКІ Станіслаў Людвігавіч, н. у 1911 г., расстраляны 22.5.1938 г.

КАЗАКОЎСКІ Ігнат Данілавіч, н. у 1886 г., расстраляны 10.11.1937 г.

КАЗАКОЎСКІ Іван Андрэевіч, н. у 1905 г., расстраляны 27.4.1938 г.

ЛІГОРСКІ Антон Юльянавіч, н. у 1908 г., расстраляны 21.7.1938 г.

ЛІГОРСКІ Іван Юльянавіч, н. у 1906 г., расстраляны 27.4.1938 г.

ЛІГОРСКІ Іосіф Іванавіч, н. у 1900 г., расстраляны 22.5.1938 г.

ЛІГОРСКІ Іосіф Юльянавіч, н. у 1916 г., расстраляны 22.5.1938 г.

ЛІГОРСКІ Сямён Францавіч, н. у 1883 г., расстраляны 16.2.1938 г.

ЛІГОРСКІ Юльян Паўлавіч, н. у 1882 г., расстраляны 10.11.1937 г.

МОЙЖАШ Антон Іванавіч, н. у 1899 г., расстраляны 27.4.1938 г.

МОЙЖАШ Антон Іосіфавіч, н. у 1895 г., загінуў у 1938 г. у месцах зняволення.

МОЙЖАШ Іван Іванавіч, н. у 1908 г., расстраляны 22.5.1938 г.

МОЙЖАШ Іосіф Іванавіч, н. у 1906 г., загінуў у 1938 г. у месцах зняволення.

МОЙЖАШ Казімір Францавіч, н. у 1910 г., загінуў у 1938 г. у месцах зняволення.

МОЙЖАШ Уладзімір Францавіч, н. у 1907 г., расстраляны 16.2.1938 г.

ПЯТРОВІЧ Якаў Феліксавіч, н. у 1898 г., расстраляны 22.5.1938 г.

ПЯТРОВІЧ Якуб Іванавіч, н. у 1902 г., загінуў у 1938 г. у месцах зняволення.

ГРАБАЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА ГРАБАЎ

ГУБАР Дзям'ян Рыгоравіч, н. у 1894 г., расстраляны 5.1.1938 г.

ГУБАР Сцяпан Гаўрылавіч, н. у 1915 г., расстраляны 5.1.1938 г.

КЕБЕЦ Іван Васільевіч, н. у 1872 г., расстраляны 2.11.1937 г.

КЕБЕЦ Мітрафан Іванавіч, н. у 1893 г., расстраляны 27.9.1937 г.

КІЛБАС Іван Мікалаевіч, н. у 1878 г., расстраляны 2.11.1937 г.

КІЛБАС Трафім Кузьміч, н. у 1906 г., расстраляны 24.12.1937 г.

КІЛБАС Уладаімір Антонавіч, н. у 1907 г., расстраляны 5.1.1938 г.

МАСКАЛЬЧУК Сава Данілавіч, н. у 1898 г., расстраляны 27.4.1938 г.

НАВІЧЭНКА Дзмітрый Сямёнавіч, н. у 1867 г., расстраляны 2.11.1937 г.

НАВІЧЭНКА Кузьма Тарасавіч, н. у 1869 г., расстраляны 2.11.1937 г.

САЙДЗЕЛЬ Мікалай Іосіфавіч, н. у 1900 г., расстраляны 5.1.1938 г.

ЧЫЖЫК Сяргей Раманавіч, расстраляны 5.1.1938 г.

ЧЫЖЫК Фёдар Сяргеевіч, н. у 1906 г., расстраляны 5.1.1938 г.

ВЁСКА СЯЛЮЦІЧЫ

ГАРОШКА Міхаіл Мікалаевіч, н. у 1898 г., расстраляны 27.4.1938 г.

ГУЗОЎСКІ Антон Вікенцьевіч, н. у 1880 г., расстраляны 2.10.1937 г.

САВАСЦЕНЯ Даніла Максімавіч, н. у 1868 г., расстраляны 2.11.1937 г.

ВЁСКА ЦЕРАБЕНЬ

ГАЛЕНЯ Вікенцій Іосіфавіч, н. у 1880 г., расстраляны 2.10.1937 г.

КАМАРОВІЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА БОБРЫК

МАЛЫШАЎ Максім Уласавіч, н. у 1900 г., расстраляны 5.1.1938 г.

ЦФАСМАН Залман Элінавіч, н. у 1900 г., расстраляны 5.1.1938 г.

ШПАКОЎСКІ Сямён Мікалаевіч, н. у 1892 г., расстраляны 27.9.1937 г.

ВЁСКА ЗАБІННЕ

МОХАРТ Сцяпан Сцяпанавіч, н. у 1887 г., расстраляны 27.4.1938 г.

ПЯСОЦКІ Іван Фёдаравіч, н. у 1899 г., расстраляны 21.7.1938 г.

РУДАЎСКІ Рыгор Аляксандравіч, н. у 1888 г., расстраляны 21.7.1938 г.

ВЁСКА ЗАМОСЦЕ

БОБЕР Ульян Тамашавіч, н. у 1897 г., расстраляны 21.7.1938 г.

ІВАШКЕВІЧ Міхаіл Васільевіч, н. у 1901 г., расстраляны 21.7.1938 г.

САЛАСНЮК Яфім Мартынавіч, н. у 1897 г., расстраляны 21.7.1938 г.

ТРУХАН Сямён Мартынавіч, н. у 1892 г., расстраляны 27.4.1938 г.

ВЁСКА КАМАРОВІЧЫ

БАЯРЫН Нікіфар Кузьміч, н. у 1896 г., расстраляны 24.12.1937 г.

БАЯРЫН Пётр Рыгоравіч, н. у 1890 г., расстраляны 10.11.1937 г.

БОГАЧ Людвіг Іванавіч, н. у 1888 г., расстраляны 29.11.1937 г.

ВАРАБ'ЁЎ Мікіта Сідаравіч, н. у 1908 г., расстраляны 5.1.1938 г.

ГЛАДУН Іван Паўлавіч, н. у 1893 г., расстраляны 29.11.1937 г.

ГУТКОЎСКІ Адам Мікалаевіч, н. у 1908 г., расстраляны 16.2.1938 г.

ГУТКОЎСКІ Рыгор Мікалаевіч, н. у 1897 г., расстраляны 31.1.1938 г.

ДРЫНЯ Іван Аляксеевіч, н. у 1873 г., расстраляны 29.11.1937 г.

ЕРМАЛІНСКІ Мікалай Мітрафанавіч, н. у 1902 г., расстраляны 24.12.1937 г.

ЕЎДАКІМЧЫК Іосіф Навумавіч, н. у 1896 г., расстраляны 7.12.1937 г.

ЖУДРО Пімен Рыгоравіч, н. у 1906 г., расстраляны 29.12.1937 г.

ЗАМЖЫЦКІ Іван Якаўлевіч, н. у 1867 г., расстраляны 20.11.1937 г.

ЗРЭЛІК Андрэй Фёдаравіч, н. у 1896 г., расстраляны 29.11.1937 г.

ЗРЭЛІК Іван Фёдаравіч, н. у 1892 г., расстраляны 29.11. 1937 г.

КАРНЕЙЧЫК Мірон Клімавіч, н. у 1892 г., расстраляны 24.12.1937 г.

КАРУЖЭЛЬ Іван Канстанцінавіч, н. у 1891 г., расстраляны 16.2.1938 г.

КІСЕЛЬ Дзмітрый Ігнатавіч, н. у 1882 г., расстраляны 5.1.1938 г.

КУРАЧ Іван Нікіфаравіч, н. у 1888 г., расстраляны 29.11.1937 г.

ЛАПЦЕЎ Рыгор Лявонцьевіч, н. у 1896 г., расстраляны 29.11.1937 г.

ЛАЎРОЎ Фёдар Сцяпанавіч, н. у 1895 г., расстраляны 24.12.1937 г.

ЛІТОШЫК Сафрон Васільевіч, н. у 1890 г., расстраляны 19.10.1937 г.

ЛЯШКЕВІЧ Васілій Іосіфавіч, н. у 1908 г., расстраляны 29.11.1937 г.

МАЖАР Аляксандр Антонавіч, н. у 1899 г., расстраляны 7.12.1937 г.

МАЛЫШАЎ Сцяпан Мінавіч, н. у 1895 г., расстраляны 7.12.1937 г.

МАЛІНОЎСКІ Уладзімір Іванавіч, н. у 1897 г., расстраляны 7.12.1937 г.

МУХІН Фёдар Пракопавіч, н. у 1910 г., расстраляны 24.12.1937 г.

НІКІЦІН Павел Захаравіч, н. у 1901 г., расстраляны 24.12.1937 г.

НІКІЦІН Сямён Іванавіч, н. у 1902 г., расстраляны 24.12.1937 г.

НОВІК Мартын Міхайлавіч, н. у 1904 г., расстраляны 7.12.1937 г.

НОВІК Пімен Савіч, н. у 1904 г., расстраляны 29.12.1937 г.

НОВІКАЎ Фядосій Міхайлавіч, н. у 1906 г., расстраляны 29.11.1937 г.

СІГАЧ Станіслаў Ігнатавіч, н. у 1892 г., расстраляны 24.12.1937 г.

СНЕТКА Міхаіл Пятровіч, н. у 1892 г., расстраляны ў 1938 г.

ТАЛЕЦКІ Пётр Усцінавіч, н. у 1889 г., расстраляны 24.12.1937 г.

ТАЛЕЦКІ Сямён Канстанцінавіч, н. у 1900 г., расстраляны 7.12.1937 г.

ТРУБЧЫК Іван Іванавіч, н. у 1886 г., расстраляны 5.1.1938 г.

ТРУБЧЫК Іван Каленікавіч, н. у 1865 г., расстраляны 11.3.1938 г.

ТУРУЦІН Аляксей Андрэевіч, н. у 1894 г., расстраляны 7.12.1937 г.

ТУРУЦІН Іосіф Фёдаравіч, н. у 1892 г., расстраляны 7.12.1937 г.

УШЧАНКА Яўгеній Міхайлавіч, н. у 1909 г., расстраляны 28.1.1938 г.

ШАРАМЕТ Рыгор Антонавіч, н. у 1898 г., расстраляны 24.12.1937 г.

ШЧУРЫК Баляслаў Міхайлавіч, н. у 1902 г., расстраляны 10.11.1937 г.

ШЫШЛАЎ Дзмітрый Арцёмавіч, н. у 1893 г., расстраляны 24.12.1937 г.

ВЁСКА ФАСТАВІЧЫ

САВІН Іван Гаўрылавіч, н. у 1908 г., расстраляны 28.1.1938 г.

ЧЫЧЫКАЙЛА Аркадзій Якубавіч, н. у 1911 г., расстраляны 7.12.1937 г.

ЧЫЧЫКАЙЛА Ігнат Пятровіч, н. у 1900 г., расстраляны 7.12.1937 г.

ЧЫЧЫКАЙЛА Феадосій Міхайлавіч, н. у 1894 г., расстраляны 11.3.1938 г.

ЧЫЧЫКАЙЛА Фёдар Міхайлавіч, н. у 1900 г., расстраляны 11.3.1938 г.

КАПАТКЕВІЦКІ ПАСЯЛКОВЫ САВЕТ

ВЁСКА ІВАШКАВІЧЫ

ДРУК Лявонцій Апанасавіч, н. у 1900 г., расстраляны 7.4.1933 г.

КАЗЕЛЬКА Аляксандр Паўлавіч, н. у 1882 г., расстраляны 20.11.1938 г.

КАЗЕЛЬКА Фёдар Паўлавіч, н. у 1875 г., расстраляны 20.10.1937 г.

ФЯСЮК Якаў Рыгоравіч, н. у 1898 г., расстраляны 27.9.1937 г.

Г. П. КАПАТКЕВІЧЫ

АНТАНІШЫН Максім Аляксеевіч, н. у 1902 г., расстраляны 29.12.1937 г.

АНТАНІШЫН Цярэнцій Якаўлевіч, н. у 1911 г., расстраляны 19.11.1937 г.

АРАПУЧЫК Андрэй Майсеевіч, н. у 1898 г., расстраляны 28.1.1938 г.

КАСЦЕЕЎ Міхаіл Нікіфаравіч, н. у 1873 г., расстраляны 24.12.1937 г.

ЛІПСКІ Вікенцій Юльянавіч, н. у 1885 г., расстраляны 21.7.1938 г.

ЛІПСКІ Рыгор Іосіфавіч, н. у 1891 г., расстраляны 21.7.1938 г.

ЛЯШКЕВІЧ Максім Янавіч, н. у 1872 г., расстраляны 5.1.1938 г.

ЛЯШКЕВІЧ Фёдар Іванавіч, н. у 1880 г., расстраляны 28.1.1938 г.

ЛЯШКЕВІЧ Якаў Іванавіч, н. у 1901 г., расстраляны 29.12.1937 г.

МАНЬКО Іван Пятровіч, н. у 1898 г., расстраляны 29.12.1937 г.

ШГУЛЕЎСКІ Пётр Аляксандравіч, н. у 1888 г., расстраляны 5.1.1938 г.

ФІЛІППОВІЧ Флор Сямёнавіч, н. у 1890 г., расстраляны 24.12.1937 г.

ХАЦІЛОЎСКІ Міхаіл Пятровіч, н. у 1898 г., расстраляны 20.3.1938 г.

ЦАРУН Віктар Захаравіч, н. у 1907 г., расстраляны 24.12.1937 г.

ЯКАВЕЦ Рыгор Фёдаравіч, н. у 1891 г., расстраляны 24.12.1937 г.

Без віны вінаватыя

Людзі паверылі ў палітыку, якая праводзілася на вёсцы, аднаасобнікаў заставаліся адзінкі. Але разам з ростам самасвядомасці, павышэннем дабрабыту працоўных абвастрыўся недавер да іх з боку ўлад. У 1937—1938 гг. ішлі масавыя арышты нявінных людзей. Сотні такіх адданых савецкай уладзе працаўнікоў сталі ахвярамі сталінскай палітыкі і загінулі ў засценках НКУС.

Расказвае Аляксандра Максімаўна Антанішына. У калгасным клубе нас, школьнікаў-васьмігодак, прымалі ў акцябраты. На грудзях заззялі пяцікутныя зорачкі. Мы танцавалі, спявалі, дэкламавалі вершы. Радасці не было канца. Я пабегла дамоў, каб падзяліцца сваёй радасцю з бацькамі. У хаце ўсё раскідана, маці голасна плакала, а бацькі ўжо не было...

У Капаткевіцкім астрозе яго трымалі цэлы тыдзень. Маці кожную ноч хадзіла туды. Праз слёзы расказвала, як нямым голасам крычалі мужчыны на допытах... Потым бацьку разам з іншымі вязнямі вывезлі ў Мазыр. Ён сядзеў у кузаве бледны, са слязамі на вачах, маці бегла за машынай і плакала, як па нябожчыку...»

У 1953 г. мы напісалі пісьмо ў ЦК КПСС, каб мне адказалі — за што расстралялі бацьку. Толькі праз чатыры гады пасля шматлікіх хадайніцтваў атрымалі наступную даведку.

СПРАВКА

Дело по обвинению Антонишина Максима Алексеевича, до ареста 8 ноября 1937 г. работал председателем колхоза «Ленинская искра» Копаткевичского р. Гомельской обл., пересмотрено Военным трибуналом Белорусского военного округа 10 декабря 1957 г.

Постановление от 6 декабря 1937 г. в отношении Антонишина Максима Алексеевича отменено и дело за отсутствием состава преступления прекращено. Антонишин Максим Алексеевич реабилитирован посмертно.

Зам. председателя Военного трибунала Белорусского военного округа,
полковник юстиции *В. Кондратьев*

У невялікай вёсцы Беседы сталінская рэпрэсіўная машына захапіла і знішчыла 20 чалавек — яны былі палякамі і агулам абвінавачваліся ў шпіёнскай дзейнасці на карысць польскай разведкі... Ядвіга Іосіфаўна Пякарская ўспамінае: «Я была самай меншай у сям'і. Помню, як бацька песціў мяне на руках. Ён працаваў жывёлаводам. Яго схапілі па дарозе дамоў, прывялі ў хату і пачалі рабіць вобыск. Адкінулі падушку, там качалка ляжала — кажуць: польскі пісталет... Развітваючыся, бацька гаварыў: «Я ні ў чым не вінаваты, хутка вярнуся». Не вярнуўся, пакінуў васьмёра дзяцей... Пятро, мой брат, пасля вайны служыў у марфлоце. Хацеў уступіць у партыю — не прынялі — сын «ворага народа»...

...Людзі баяліся сказаць лішняе, неасцярожнае слова. Баяліся гаварыць, баяліся думаць; адно, што ад іх патрабавалася, — працаваць, славіць лад, пры якім жылі, партыю і яе правадыроў...

КАПЦЭВІЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ПАСЁЛАК КАПЦЭВІЧЫ

АМЯЛЬКОВІЧ Іосіф Аляксандравіч, н. у 1908 г., расстраляны 1.11.1937 г.

БАРЧАК Сцяпан Паўлавіч, н. у 1895 г., расстраляны 2.12.1937 г.

БУДЗЯКОЎСКІ Казімір Францавіч, н. у 1902 г., расстраляны 24.12.1937 г.

ВАЛЫНЕЦ Уладзімір Ефрасімавіч, н. у 1905 г., расстраляны 5.1.1938 г.

ВІКТАРОВІЧ Васіль Аўгуставіч, н. у 1880 г., расстраляны 16.2.1938 г.

ДУБІНІН Іосіф Пятровіч, н. у 1886 г., расстраляны 29.11.1937 г.

ЖЭРКА Аляксандр Сідаравіч, н. у 1895 г., расстраляны 29.11.1937 г.

КОЗЕЛ Афанасій Якаўлевіч, н. у 1865 г., расстраляны 16.11.1937 г.

КОЦІК Фалк Мордухавіч, н. у 1893 г., расстраляны 10.10.1937 г.

КУЗМІЧ Уладзімір Іванавіч, н. у 1898 г., расстраляны 29.11.1937 г.

МАКЛЯК Канстанцін Міхайлавіч, н. у 1869 г., расстраляны 27.4.1938 г.

МАЦЮК Віктар Сцяпанавіч, н. у 1900 г., расстраляны 10.11.1937 г.

МАЦЮК Сцяпан Антонавіч, н. у 1864 г., расстраляны 29.11.1937 г.

НАУМОВІЧ Віктар Паўлавіч, н. у 1905 г., расстраляны 25.11.1937 г.

ПАЛІЎКА Якаў Рыгоравіч, н. у 1889 г., расстраляны 5.11.1937 г.

ПУПЕНКА Андрэй Міхайлавіч, н. у 1896 г., расстраляны 29.11.1937 г.

САЛАЎЯН Іван Савіч, н. у 1886 г., расстраляны 10.11.1937 г.

ЧУДУК Вікенцій Паўлавіч, н. у 1886 г., расстраляны ў 1937 г.

ШЛЯГА Андрэй Іванавіч, н. у 1886 г., расстраляны 24.11.1937 г.

ШЫЛА Іван Фаміч, н. у 1890 г., расстраляны 10.11.1937 г.

ШЫЛА Кліменцій Сцяпанавіч, н. у 1893 г., расстраляны 10.11.1937 г.

ВЁСКА КАПЦЭВІЧЫ

КАЗЛОВІЧ Іван Арцёмавіч, н. у 1905 г., расстраляны 27.11.1938 г.

САВОШ Венядзікт Іванавіч, н. у 1884 г., расстраляны 27.4.1938 г.

КОЛКАЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

БАНДАРЭНКА Дзмітрый Лявонцьевіч, н. у 1887 г., расстраляны 29.11.1937 г.

БАНДАРЭНКА Пётр Васільевіч, н. у 1899 г., расстраляны 27.4.1938 г.

БАНДАРЭНКА Пётр Лявонцьевіч, н. у 1896 г., расстраляны 19.11.1938 г.

ГАРБАЧЭЎСКІ Міхаіл Уладзіміравіч, н. у 1913 г. у в. Брады, расстраляны 13.5.1933 г.

ГЕРАД Браніслаў Фёдаравіч, н. у 1898 г., расстраляны 29.11.1937 г.

ГЛАДКІ Анатоль Станіслававіч, н. у 1895 г., расстраляны 29.12.1937 г.

ГРУШКО Яўціхій Сцяпанавіч, н. у 1867 г., загінуў у 1931 г. у месцах зняволення.

ДАНІЛОВІЧ Аксіння Дзмітрыеўна, н. у 1891 г., расстраляна ў 1938 г.

ДАНІЛОВІЧ Дзям'ян Васільевіч, н. у 1895 г., загінуў у 1931 г. у месцах зняволення.

ДАНІЛОВІЧ Канстанцін Якаўлевіч, н. у 1892 г., загінуў у 1940 г. у месцах зняволення.

ЗАЛЕСКІ Пётр Вікенцьевіч, н. у 1879 г., расстраляны 29.11.1937 г.

МАРКАЎ Фёдар Міхайлавіч, н. у 1911 г., расстраляны 24.12.1937 г.

МІРАНОВІЧ Іван Маркавіч, н. у 1890 г., расстраляны 29.12.1937 г.

ПЛЫТКЕВІЧ Кузьма Нікіфаравіч, н. у 1887 г., расстраляны 29.12.1937 г.

РАВУЦКІ Карней Сцяпанавіч, н. у 1900 г., расстраляны 28.1.1938 г.

РАВУЦКІ Платон Сцяпанавіч, н. у 1897 г., расстраляны 28.1.1938 г.

РАВУЦКІ Рыгор Платонавіч, н. у 1889 г., загінуў у 1938 г. у месцах зняволення.

РАВУЦКІ Фёдар Лукіч, н. у 1892 г., памёр у 1931 г. у месцах зняволення.

СІДАРЭНКА Фёдар Паўлавіч, н. у 1899 г., памёр 3.3.1941 г. у месцах зняволення.

ЯКІМЧАНКА Мікалай Майсеевіч, н. у 1896 г., загінуў у 1930 г. у месцах зняволення.

КОНКАВІЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА АКРЫЁНЫ

НАВАЦКІ Мікалай Адамавіч, н. у 1899 г., расстраляны 19.10.1937 г.

ПРЫСАДА Уладзімір Іванавіч, н. у 1865 г., расстраляны 19.10.1937 г.

СЕГЛІН Якаў Хрыстафоравіч, н. у 1861 г., расстраляны 19.10.1937 г.

ВЁСКА КОНКАВІЧЫ

АМЕЛЬЧАНКА Васілій Васільевіч, н. у 1887 г., загінуў у месцах зняволення.

АМЕЛЬЧАНКА Іван Васільевіч, н. у 1904 г., загінуў у месцах зняволення.

АСКЕРКА Васілій Іванавіч, н. у 1878 г., расстраляны 19.10.1937 г.

АСКЕРКА Васіль Ігнатавіч, н. у 1885 г., расстраляны 19.10.1937 г.

АСКЕРКА Мікалай Васільевіч, н. у 1893 г., расстраляны 19.10.1937 г.

ДАБРЫНСКІ Павел Уладзіміравіч, н. у 1861 г., расстраляны 19.10.1937 г.

ДАБРЫНСКІ Уладзімір Міхайлавіч, н. у 1916 г., расстраляны 19.10.1937 г.

ЖУК Іван Васільевіч, н. у 1865 г., расстраляны 19.10.1937 г.

ПЛІКУС Аляксандр Якаўлевіч, н. у 1879 г., расстраляны 11.3.1938 г.

ПЛІКУС Канстанцін Аляксандравіч, н. у 1912 г., расстраляны 11.3.1938 г.

ВЁСКА МІЦУРЫ

МІЦУРА Якаў Сцяпанавіч, н. у 1898 г., расстраляны 16.2.1938 г.

ВЁСКА СЛІНКІ

БРЫЗІЦКІ Аляксандр Казіміравіч, н. у 1902 г., расстраляны 19.10.1937 г.

ЛУЧЫЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА БЕСЕДЫ

ГЛОЎКА Адам Карпавіч, н. у 1900 г., расстраляны 10.11.1937 г.

ГЛОЎКА Уладзімір Карпавіч, н. у 1896 г., расстраляны 7.12.1937 г.

ЗБОРЫН Антон Бернатавіч, н. у 1895 г., расстраляны 10.11.1937 г.

ЗБОРЫН Іван Бернатавіч, н. у 1895 г., расстраляны 21.7.1937 г.

ЗБОРЫН Людвіг Бернатавіч, н. у 1888 г., расстраляны 27.4.1938 г.

ЗБОРЫН Пётр Бернатавіч, н. у 1905 г., расстраляны 27.4.1938 г.

ЗБОРЫН Уладзімір Карлавіч, н. у 1887 г., расстраляны 7.12.1937 г.

ЗБОРЫН Францц Карлавіч, н. у 1908 г., расстраляны 10.11.1937 г.

МІХАЛЬСКІ Юльян Карпавіч, н. у 1884 г., расстраляны 21.7.1938 г.

ПЕКАРСКІ Іосіф Антонавіч, н. у 1885 г., расстраляны 7.12.1937 г.

ПЯТРОЎСКІ Уладзімір Андрэевіч, н. у 1884 г., расстраляны 16.2.1938 г.

УРБАНЧЫК Адам Варфаламеевіч, н. у 1878 г., расстраляны 2.12.1937 г.

УРБАНЧЫК Антон Сцефанавіч, н. у 1904 г., расстраляны 29.12.1937 г.

УРБАНЧЫК Людвіг Іванавіч, н. у 1905 г., расстраляны 7.12.1937 г.

ВЁСКА КАПЦЭВІЧЫ

БУЕВІЧ Яўтеній Антонавіч, н. у 1907 г., расстраляны 10.11.1937 г.

УСЦІНОВІЧ Станіслаў Назаравіч, н. у 1896 г., расстраляны 5.1.1938 г.

ШПАРЫК Канстанцін Філіпавіч, н. у 1890 г., расстраляны 29.12.1937 г.

ЮШЫНСКІ Пётр Андрэевіч, н. у 1877 г., расстраляны 10.11.1937 г.

ВЁСКА КАШЭВІЧЫ

БАРКОЎСКІ Антон Антонавіч, н. у 1869 г., расстраляны 31.1.1938 г.

БУЗАНОЎСКІ Міхаіл Андрэевіч, н. у 1887 г., расстраляны 28.1.1938 г.

БУЙВАЛ Аляксандр Паўлавіч, н. у 1883 г., расстраляны 28.1.1938 г.

ЕСЬМАНТОВІЧ Міхаіл Васільевіч, н. у 1888 г., расстраляны 16.2.1938 г.

РАМАНОЎСКІ Мікалай Іванавіч, н. у 1905 г., расстраляны 11.3.1938 г.

ФЯДОСІК Іван Яфімавіч, н. у 1878 г., расстраляны 11.3.1938 г.

ХАРАМЕЦКАЯ Юлія Сцяпанаўна, н. у 1886 г., расстраляна 2.10.1937 г.

ШАХ Уладзімір Мікалаевіч, н. у 1894 г., расстраляны 11.3.1938 г.

ЯКУБОЎСКІ Іван Адольфавіч, н. у 1898 г., расстраляны 11.3.1938 г.

ВЁСКА ЛУЧЫЦЫ

КОРШАК Рыгор Васільевіч, н. у 1896 г. расстраляны 10.11.1937 г.

КРЫШЧУК Канстанцін Ерамеевіч, н. у 1899 г., расстраляны 11.3.1938 г.

ПІГУЛЕЎСКІ Каленік Сцяпанавіч, н. у 1880 г., расстраляны 27.9.1937 г.

ПЛЫТКЕВІЧ Аляксандр Антонавіч, н. у 1892 г., расстраляны 27.4.1938 г.

ВЁСКА СТАРЫНА

ГАЎРЫЛОВІЧ Андрэй Уласавіч, н. у 1903 г., расстраляны 16.2.1938 г.

ЦЕРАХОВІЧ Юльян Францавіч, н. у 1869 г., расстраляны 31.1.1938 г.

ВЁСКА ФІЛАТАЎКА

ТАРАСЕВІЧ Сямён Аляксандравіч, н. у 1885 г., расстраляны 16.2.1938 г.

ВЁСКА ХВОЙНЯ

ВАСІЛЮК Фёдар Рыгоравіч, н. у 1885 г., расстраляны 27.4.1938 г.

ЗВАНКОВІЧ Павел Цімафеевіч, н. у 1902 г., расстраляны 27.4.1938 г.

КОРШАК Рыгор Васільевіч, н. у 1896 г., расстраляны 10.11.1937 г.

КУЛЬЧЫЦКІ Фёдар Дзмітрыевіч, н. у 1915 г., расстраляны 19.11.1937 г.

НЯДВЕЦКІ Барыс Францавіч, н. у 1898 г., расстраляны 16.2.1938 г.

ЛЯСКАВІЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

...У людзях пасяліўся страх. Баяліся размаўляць, адзін другога баяліся, жылі пастаянна як бы з аглядкай. У выхадны дзень сядзелі дома. А ўлетку пачаліся арышты. З Петрыкава на машыне прыязджаў оперупаўнаважаны Мінаеў і забіраў людзей. Ён на ўсіх як на ворагаў глядзеў з-пад казырка сваёй сіняй фуражкі. Ладны, высокі, у сінім галіфэ і начышчаных да бляску ботах — яго баяліся як агню. Забіралі звычайна ноччу. Прагурчыць па вуліцах машына — і няма чалавека, як і не было. Людзі пашэпчуцца паміж сабою і больш выгляду не падаюць. Тыя няшчасныя сем'і, з якіх забіралі кармільцаў, абходзілі ад граху далей бокам. Не баяліся Мінаева толькі Ігнат Талаш, Цярэнцій і Даніл Цярэні. Яны ў Мінаева ў памочніках хадзілі. Сцяліліся перад ім, прама спіну гнулі... Яны і прадавалі сваіх землякоў, даносілі ў НКУС. Нават суседзяў сваіх не пашкадавалі. Не дарма начальнік Петрыкаўскага райаддзела міліцыі падараваў Ігнату Талашу патэфон і хромавыя боты. У Ігната перад НКУС асобыя заслугі былі, многіх па яго ўказцы на той свет адправілі. Потым людзі палічылі — 31 чалавека забралі з Брынёва ў той страшны год, вярнуўся толькі адзін...

ВЁСКА БРЫНЁЎ

БАРЫСАЎ Дзмітрый Парфенавіч, н. у 1898 г., расстраляны 19.10.1937 г.

БАРЫСАЎ Іван Парфенавіч, н. у 1900 г., загінуў у месцах зняволення.

БРУЯКА Пракоп Адамавіч, н. у 1894 г., расстраляны 19.10.1937 г.

БРУЯКА Фёдар Адамавіч, н. у 1894 г., расстраляны 19.10.1937 г.

БРУЯКА Фёдар Ісакавіч, н. у 1905 г., расстраляны 19.10.1937 г.

ВОЙЦІК Адам Андрэевіч, н. у 1900 г., расстраляны 10.11.1937 г.

ГАЛОНСКІ Аляксандр Цімафеевіч, н. у 1889 г., расстраляны 22.5.1938 г.

ГАЛОНСКІ Іосіф Адамавіч, н. у 1912 г., расстраляны 22.5.1938 г.

ГАЛОНСКІ Сямён Адамавіч, н. у 1894 г., расстраляны 5.1.1938 г.

КЕШНЕР Аляксандр Іванавіч, н. у 1901 г., расстраляны 16.2.1938 г.

КЕШНЕР Антон Іванавіч, н. у 1906 г., расстраляны 15.1.1938 г.

КЕШНЕР Лявонцій Іванавіч, н. у 1912 г., расстраляны 16.2.1938 г.

КЕШНЕР Фелікс Вікенцьевіч, н. у 1894 г., расстраляны 29.12.1937 г.

КЛІМЕНКА Мікалай Ільіч, н. у 1898 г., загінуў у месцах зняволення.

КЛІМЧЫК Мацвей, загінуў у месцах зняволення.

КЛІМЧЫК Павел Ігнатавіч, н. у 1890 г., расстраляны 16.2.1938 г.

КРАМЕНСКІ Казімір Іванавіч, н. у 1900 г., расстраляны 5.1.1938 г.

КРАМЕНСКІ Павел Іванавіч, н. у 1895 г., расстраляны 5.1.1938 г.

НАЗАРАЎ Іван, загінуў у месцах зняволення.

НЕВЯРКЕВІЧ Антон Рыгоравіч, н. у 1907 г., расстраляны 1.12.1937 г.

НЕВЯРКЕВІЧ Баляслаў Рыгоравіч, н. у 1903 г., расстраляны 7.12.1937 г.

СІНЧУКОЎСКІ Пётр Міхайлавіч, н. у 1904 г., расстраляны 27.4.1938 г.

СТАНЧЫЦ Іван Іосіфавіч, н. у 1894 г., расстраляны 5.1.1938 г.

СТАНЧЫЦ Уладзімір Іосіфавіч, н. у 1901 г., расстраляны 22.5.1938 г.

ФЕЛЬКІН Карл Валянцінавіч, н. у 1883 г., расстраляны 10.11.1937 г.

ФЕЛЬКІН Франц Валянцінавіч, н. у 1892 г., расстраляны 10.11.1937 г.

ЦІШКЕВІЧ Васілій Антонавіч, н. у 1898 г., расстраляны 19.10.1937 г.

ЮШЧУК Павел Піліпавіч, н. у 1911 г., расстраляны 16.2.1938 г.

ЯГАДА Іосіф Іосіфавіч, н. у 1864 г., расстраляны 24.12.1937 г.

ЯРМОЛЕНКА Васілій Іванавіч, н. у 1907 г., расстраляны 7.12.1937 г.

ВЁСКА ГЛІНКА

БАРАНІЧ Іван, арыштаваны ў 1937 г., загінуў у месцах зняволення.

ВОЙЦІК Казімір Андрэевіч, н. у 1905 г., расстраляны 16.2.1938 г.

КАВАЛЬСКІ Іван Аляксандравіч, н. у 1907 г., расстраляны 11.3.1938 г.

КАВАЛЬСКІ Станіслаў Іванавіч, н. у 1908 г., расстраляны 16.2.1938 г.

КАВАЛЬСКІ Фадзей Валянцінавіч, н. у 1910 г., расстраляны 29.11.1937 г.

КРАМЕНСКІ Станіслаў Іванавіч, н. у 1904 г., расстраляны 15.1.1938 г.

МАЛАК Людвіг Францавіч, н. у 1907 г., расстраляны 11.3.1938 г.

ПЛЕР Іосіф Францавіч, н. у 1886 г., расстраляны 7.12.1937 г.

ПЛЕР Станіслаў Францавіч, н. у 1907 г., расстраляны 11.3.1938 г.

ПЛЕР Франц Францавіч, н. у 1883 г., расстраляны 22.5.1938 г.

ФЕЛЬКІН Валянцін Валянцінавіч, н. у 1890 г., расстраляны 19.11.1937 г.

ЯГАДА Адам Валянцінавіч, н. у 1911 г., расстраляны 7.12.1937 г.

ВЁСКА ПАЛЯЖАЧ-ГАРА

АНДРАСЮК Вікенцій Адамавіч, н. у 1909 г., расстраляны 16.2.1938 г.

АНДРАСЮК Іван Адамавіч, н. у 1898 г., расстраляны 5.1.1938 г.

АНДРАСЮК Карл Адамавіч, н. у 1907 г., расстраляны 5.1.1938 г.

БРЭЗІЦКІ Адам Аляксандравіч, н. у 1892 г., расстраляны 7.12.1937 г.

БРЭЗІЦКІ Адольф Аляксандравіч, н. у 1890 г., расстраляны 10.11.1937 г.

БРЭЗІЦКІ Альбін Геронімавіч, н. у 1893 г., расстраляны 19.11.1937 г.

БРЭЗІЦКІ Вітольд Адамавіч, н. у 1892 г., расстраляны 7.12.1937 г.

БРЭЗІЦКІ Іосіф Геронімавіч, н. у 1890 г., расстраляны 5.1.1938 г.

БРЭЗІЦКІ Міхаіл Валянцінавіч, н. у 1866 г., расстраляны 7.12.1937 г.

БРЭЗІЦКІ Станіслаў Канстанцінавіч, н. у 1896 г., расстраляны 5.1.1938 г.

БРЭЗІЦКІ Фелікс Аляксандравіч, н. у 1882 г., расстраляны 5.1.1938 г.

ВЁСКА ДАРАШЭВІЧЫ

БАТАН Сяргей Міхайлавіч, н. у 1889 г., расстраляны 27.9.1937 г.

ВЁСКА ЛЯСКАВІЧЫ

БАМБІЗА Пётр Трафімавіч, н. у 1855 г., расстраляны 2.11.1937 г.

БАМБІЗА Сямён Лявонцьевіч, загінуў у месцах зняволення.

БРАІМ Аляксандр Іванавіч, н. у 1899 г., расстраляны 12.4.1940 г.

БРАІМ Васіль Іванавіч, н. у 1911 г., загінуў у месцах зняволення.

БУДНІК Міхаіл Карнеевіч, загінуў у месцах зняволення.

БЫЧКОЎСКІ Сава Сцяпанавіч, загінуў у месцах зняволення.

ПАБЫЛОЎСКІ Іван, загінуў у месцах зняволення.

САВОШКА Уладзімір Піліпавіч, н. у 1915 г., расстраляны 7.12.1937 г.

САВОШКА Фама Цітавіч, загінуў у месцах зняволення.

СЕРАДА Іван Трафімавіч, н. у 1865 г., расстраляны 17.4.1942 г.

СЕРАДА Кандрат Іванавіч, загінуў у месцах зняволення.

СЕРАДА Мікалай Міхайлавіч, н. у 1902 г., расстраляны 2.11.1937 г.

ТУРАВЕЦ Васіль Іосіфавіч, н. у 1878 г., загінуў у месцах зняволення.

ТУРАВЕЦ Раман Якаўлевіч, загінуў у месцах зняволення.

ТУРАВЕЦ Цімафей Якаўлевіч, сакратар сельсавета, загінуў у месцах зняволення.

БРЭЗІЦКІ Якаў Ульянавіч, н. у 1891 г., расстраляны 16.2.1938 г.

КАЗЛОЎСКІ Адольф Дзям'янавіч, н. у 1884 г., расстраляны 16.2.1938 г.

ЛАДЗІНСКІ Віктар Карлавіч, н. у 1903 г., расстраляны 5.1.1938 г.

ЛАДЗІНСКІ Лявонцій Карлавіч, н. у 1909 г., расстраляны 16.2.1938 г.

ПАПРОЦКІ Мартын Францавіч, н. у 1906 г., расстраляны 5.1.1938 г.

РУДНІЦКІ Уладзімір Францавіч, н. у 1907 г., расстраляны 7.12.1937 г.

РУДНІЦКІ Франц Сямёнавіч, н. у 1880 г., расстраляны 24.12.1937 г.

ТАРГОНСКІ Адольф Феліксавіч, н. у 1905 г., расстраляны 7.12.1937 г.

ТАРГОНСКІ Людвіг Феліксавіч, н. у 1904 г., расстраляны 11.3.1938 г.

ХМУРА Вікенцій Урбанавіч, н. у 1890 г., расстраляны 16.2.1937 г.

ВЁСКА ПІЛІПОНЫ

БРАІМ Якаў Андрэевіч, н. у 1887 г., расстраляны 31.1.1938 г.

ВЁСКА СЕРП

ВАСІЛЕЎСКІ Станіслаў Антонавіч, н. у 1904 г., расстраляны 22.5.1938 г.

НІКЕЛЬ Вячаслаў Генрыхавіч, н. у 1909 г., расстраляны 27.4.1938 г.

ТОМАЛЬ Адам Францавіч, н. у 1892 г., расстраляны 22.5.1938 г.

ТОМАЛЬ Франц Францавіч, н. у 1887 г., расстраляны 22.5.1938 г.

ТУРМОВІЧ Іван Людвігавіч, расстраляны 24.12.1937 г.

ТУРМОВІЧ Кузьма Якаўлевіч, н. у 1911 г., расстраляны 21.7.1938 г.

ШЫФКО Герман Аўгуставіч, н. у 1898 г., расстраляны 27.4.1938 г.

ШЫФКО Фрыдрых Аўгуставіч, н. у 1892 г., расстраляны 22.5.1938 г.

МУЛЯРАЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА КОРЖАЎКА

ДЗЕГЯЛЕВІЧ Фёдар Канстанцінавіч, н. у 1870 г., расстраляны 10.11.1937 г.

ЛІСОЎСКІ Мікалай Іванавіч, н. у 1878 г., расстраляны 10.11.1937 г.

ВЁСКА КУРЫЦІЧЫ

БАЯРЧУК Аляксандр Рыгоравіч, н. у 1894 г., расстраляны 27.4.1938 г.

ГРЭСЬКА Нікіфар Яфімавіч, н. у 1871 г., расстраляны 14.10. 1937 г.

МАШУК Іван Рыгоравіч, н. у 1892 г., расстраляны 16.2.1938 г.

МАШУК Рыгор Емяльянавіч, н. у 1860 г., расстраляны 10.11.1937 г.

СІТНІЦА Максім Якаўлевіч, н. у 1882 г., расстраляны 10.11.1937 г.

ХАМЕНЯ Пётр Міхайлавіч, н. у 1857 г., расстраляны 10.11.1937 г.

ВЁСКА МУЛЯРАЎКА

ГРЫБ Мікалай Прохаравіч, н. у 1896 г., расстраляны 27.9.1937 г.

ЗУБАР Майсей Мендзелевіч, н. у 1909 г., расстраляны 29.12.1937 г.

ЧАРНЕЦКІ Эдуард Іосіфавіч, н. у 1912 г., расстраляны 22.5.1938 г.

ВЁСКА СЯРЭДНЯЯ РУДНЯ

ЖУРАЎСКІ Мікалай Сцяпанавіч, н. у. 1872 г., расстраляны 10.11.1937 г.

КІЯХОЎСКІ Антон Іосіфавіч, н. у 1893 г., расстраляны 26.10.1937 г.

МЫШАНСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

АНДРУХОВІЧ Пётр Іванавіч, н. у 1902 г., загінуў у 1942 г. у месцах зняволення (Комі АССР).

ГРАМОВІЧ Гаўрыла Мікалаевіч, н. у 1887 г., памёр у 1934 г. у месцах зняволення (г. Магілёў).

ГУРЫНОВІЧ Іван Уладзіміравіч, н. у 1910 г., расстраляны 29.11.1937 г.

ДАШКЕВІЧ Іван Канстанцінавіч, н. у 1894 г., загінуў у месцах зняволення.

ДАШКЕВІЧ Сцяпан Сідаравіч, н. у 1902 г., расстраляны 2.10.1937 г.

ДАРОШКА Фёдар Міхайлавіч, н. у 1895 г., расстраляны 27.4.1938 г.

ЛУК'ЯНОВІЧ Васілій Іосіфавіч, н. у 1908 г., расстраляны 29.11.1937 г.

ПОЛЯК Адам Міхайлавіч, н. у 1887 г., расстраляны 27.4.1938 г.

СЯРПІНСКІ Іосіф Станіслававіч, н. у 1913 г., расстраляны 5.1.1938 г.

ЦІШКЕВІЧ Іван Рыгоравіч, н. у 1882 г., расстраляны 27.4.1938 г.

НАВАСЁЛКАЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА АНОСАВІЧЫ

ТАРАСЕВІЧ Іван Рыгоравіч, н. у 1894 г., расстраляны 14.4.1933 г.

ВЁСКА ВАНЮЖЫЧЫ

КУДРАВЕЦ Мікалай Іонавіч, н. у 1898 г., расстраляны 14.4.1933 г.

ВЁСКА ЗАБРОДДЗЕ

АЛЬХІМОВІЧ Алесь Адамавіч, н. у 1888 г., расстраляны 5.1.1938 г.

ГАРБАЧЭЎСКІ Аляксандр Іларыёнавіч, н. у 1880 г., расстраляны 27.9.1937 г.

ВЁСКА КЛЯСАЎ

БЕЛЬСКІ Анісім Пятровіч, н. у 1907 г. у в. Залессе, загінуў у месцах зняволення.

ІСКРЫЦКІ Іван Рыгоравіч, н. у 1885 г., расстраляны 14.4.1933 г.

ПЕРАГУД Іван Іванавіч, н. у 1901 г., расстраляны 7.12.1937 г.

РУДЗІНСКІ Аляксандр Сямёнавіч, н. у 1886 г., расстраляны 28.4.1933 г.

РУДЗІНСКІ Мікалай Анісімавіч, н. у 1918 г., загінуў у месцах зняволення.

РУДЗІНСКІ Уладзімір Аляксандравіч, н. у 1910 г., загінуў у месцах зняволення.

РУДЗІНСКІ Павел Васільевіч, н. у 1895 г., загінуў у месцах зняволення.

САСНОЎСКІ Якуб Іванавіч, н. у 1913 г., загінуў у месцах зняволення.

ВЁСКА НАВАСЁЛКІ

БРЭУС Максім Сысоевіч, н. у 1900 г., расстраляны 2.10.1937 г.

ГОРБАЧ Мечыслаў Лявонавіч, н. у 1898 г., расстраляны 14.4.1933 г.

ГУРЫН Арцём Іванавіч, н. у 1900 г., расстраляны 14.4.1933 г.

ЖУДРО Андрэй Іванавіч, н. у 1894 г., расстраляны 14.3.1933 г.

ЖУДРО Піліп Купрыянавіч, н. у 1895 г., расстраляны 14.3.1933 г.

ЖУДРО Фядос Мацвеевіч, н. у 1890 г., расстраляны 14.4.1933 г.

ЗАГОРАЦ Макар Мікалаевіч, н. у 1894 г., расстраляны 14.4.1933 г.

КАЛІНА Андрэй Якаўлевіч, н. у 1885 г., расстраляны 14.4.1933 г.

КАЛІНА Піліп Рыгоравіч, н. у 1910 г., расстраляны 14.4.1933 г.

КАСЦЕЕЎ Сямён Трафімавіч, н. у 1884 г., расстраляны 14.4.1933 г.

КАСЦЕЕЎ Павел Трафімавіч, н. у 1876 г., расстраляны 27.9.1937 г.

КУКСА Мікіта Іларыёнавіч, н. у 1885 г., расстраляны 14.4.1933 г.

КУКСА Фёдар Іларыёнавіч, н. у 1878 г., расстраляны 14.4.1933 г.

КУКСА Ціт Іларыёнавіч, н. у 1871 г., расстраляны 14.4.1933 г.

ЛЯШЧЫНСКІ Павел Паўлавіч, н. у 1892 г., расстраляны 14.4.1933 г.

РАКІЦКІ Логвін Клімавіч, н. у 1893 г., расстраляны 10.11.1937 г.

СЯНЬКО Іван Міхайлавіч, н. у 1879 г., расстраляны 14.3.1933 г.

СЯНЬКО Пётр Лук'янавіч, н. у 1902 г., расстраляны 14.4.1933 г.

ФУРМАН Сава Іванавіч, н. у 1879 г., расстраляны 14.3.1933 г.

ЧЫЖЭЎСКІ Іван Пятровіч, н. у 1866 г., расстраляны 14.4.1933 г.

ВЁСКА ФІЛІПАВІЧЫ

ДЗЕГЦЯРЭНКА Цімафей Іонавіч, н. у 1883 г., расстраляны 14.4.1933 г.

РОГ Сямён Аліферавіч, н. у 1889 г., расстраляны 14.4.1933 г.

СТАТКЕВІЧ Аляксандр Георгіевіч, н. у 1904 г., расстраляны 24.12.1937 г.

СТАТКЕВІЧ Уладзімір Рыгоравіч, н. у 1900 г., расстраляны 16.2.1938 г.

ШЫБУТ Марк Дзмітрыевіч, н. у 1883 г., расстраляны 14.4.1933 г.

ГОРАД ПЕТРЫКАЎ

БАРЫСЮК Аляксандр Антонавіч, н. у 1905 г., расстраляны 5.1.1938 г.

ВЕЦЕР Лявон Іванавіч, н. у 1896 г., расстраляны 27.9.1938 г.

ВОЛЬСКІ Дзмітрый Якаўлевіч, н. у 1888 г., расстраляны 11.3.1938 г.

ВОЛЬСКІ Канстанцін Якаўлевіч, н. у 1900 г., расстраляны 11.3.1938 г.

ГАТАЛЬСКІ Андрэй Яфімавіч, н. у 1905 г., расстраляны 23.10.1937 г.

ГАТАЛЬСКІ Яфім Анісімавіч, н. у 1871 г., расстраляны 23.10.1937 г.

ГОЛІК Пётр Іванавіч, н. у 1903 г., расстраляны 27.4.1938 г.

ГРЫБ Максім Максімавіч, н. у 1867 г., расстраляны 23.10.1937 г.

ДРЫГА Аляксандр Лук'янавіч, н. у 1886 г., расстраляны 19.10.1937 г.

ДРЫГА Васілій Апанасавіч, н. у 1896 г., расстраляны 19.10. 1937 г.

ЖУКОЎСКІ Дарафей Сямёнавіч, н. у 1887 г., памёр у 1938 г. у месцах зняволення.

ЗЕМЛЯНІК Кацярына Іванаўна, н. у 1888 г., расстраляна 23.10.1937 г.

ЗЯНКЕВІЧ Герасім Аляксеевіч, н. у 1895 г., расстраляны 24.12.1937 г.

ЗЯНКЕВІЧ Іосіф Васільевіч, н. у 1895 г., загінуў у месцах зняволення.

КАРОЛЬ Васілій Верамеевіч, н. у 1870 г., расстраляны 14.10.1937 г.

КЕБЕЦ Дзмітрый Іванавіч, н. у 1897 г., дырэктар школы, расстраляны 10.10.1937 г.

КРУЛЬ Антон Іосіфавіч, н. у 1892 г., расстраляны 23.10.1937 г.

КУЛАК Герасім Іванавіч, н. у 1875 г., расстраляны 20.10.1937 г.

КУЛАК Фёдар Іванавіч, н. у 1872 г., расстраляны 23.10.1937 г.

ЛАНЬКА Пётр Якаўлевіч, н. у 1895 г., бухгалтар будаўнічай арганізацыі, загінуў у 1938 г. у месцах зняволення.

ЛАПЕТА Аляксандр Андрэеевіч, н. у 1891 г., расстраляны 29.11.1937 г.

МАЛАФЕЕВА Ганна Васільеўна, н. у 1876 г., расстраляна 20.10.1937 г.

МАРТЫНАЎ Ілья Акімавіч, н. у 1886 г., электрамеханік прамкамбіната, расстраляны 16.11.1938 г.

МЕЙЛАХ Сцяпан Фёдаравіч, н. у 1872 г., расстраляны 20.4.1938 г.

МІЦКЕВІЧ Іван Данілавіч, н. у 1904 г., расстраляны 23.10.1937 г.

НЕВЯРОЎСКІ Васіль Раманавіч, н. у 1907 г., расстраляны 20.10.1937 г.

НЕВЯРОЎСКІ Мікіта Лаўрэнавіч, н. у 1865 г., расстраляны 14.10.1937 г.

НЕВЯРОЎСКІ Раман Трафімавіч, н. у 1851 г., расстраляны 20.10.1937 г.

ПАПОЎ Міхаіл Фаміч, н. у 1889 г., старшыня калгаса «Савецкая Беларусь» (в. Камаровічы), расстраляны 5.1.1937 г.

РУДЗЬКО Іван Якаўлевіч, н. у 1882 г., загадчык гаспадаркі лясгаса, расстраляны 11.3.1938 г.

СЕМЕЧКА Ігнат Міхайлавіч, н. у 1906 г., расстраляны 28.1.1938 г.

ШІСКУНОЎ Іосіф Сцяпанавіч, н. у 1910 г.; арыштаваны ў 1938 г. і загінуў у месцах зняволення.

РАГАЛЕВІЧ Рыгор Антонавіч, н. у 1904 г., расстраляны ў 1937 г.

СЕРАПІН Георгій Васільевіч, н. у 1897 г., настаўнік, расстраляны 14.10.1937 г.

СЛАБОДНІК Мордух Лейбавіч, н. у 1888 г., расстраляны 20.10.1937 г.

СЛУПСКІ Міхаіл Антонавіч, н. у 1903 г., расстраляны 24.12.1937 г.

СЛЯЗЬ Аляксандр Пятровіч, н. у 1897 г., расстраляны 5.1.1937 г.

СУХАМЕРА Сцяпан Фёдаравіч, н. у 1896 г., расстраляны 16.2.1938 г.

СУШЫНСКІ Павел Кліменцьевіч, н. у 1860 г., расстраляны 10.10.1937 г.

СУШЫНСКІ Яўген Паўлавіч, н. у 1899 г., памёр у 1937 г. у г. Новасібірск.

ТУРАВЕЦ Міна Васільевіч, н. у 1868 г., расстраляны 23.10.1937 г.

КРЫЖАНОЎСКІ Стась Гаўрылавіч, н. у 1863 г., расстраляны 1.12.1937 г.

ЦЕРАШКОВІЧ Аляксей Васільевіч, н. у 1873 г., расстраляны 14.10.1937 г.

ЦЕРАШКОВІЧ Андрэй Міхайлавіч, н. у 1873 г., расстраляны 14.10.1937 г.

ШАБАЛТАС Сцяпан Андрэевіч, н. у 1888 г., кіраўнік спраў Савета Міністраў БССР, памёр у 1937 г. у месцах зняволення.

ШЛЯПАЧНІК Янкель Мееравіч, н. у 1891 г., бухгалтар аддзялення сельгасбанка, расстраляны 14.10.1937 г.

ШПАК Іосіф Якаўлевіч, н. у 1890 г., расстраляны 27.4.1938 г.

ШПАК Павел Трафімавіч, н. у 1872 г., расстраляны 14.10.1937 г.

ШПАК Пётр Пятровіч, н. у 1886 г., загадчык хлебапякарні, расстраляны 10.11.1937 г.

ЯНКЕВІЧ Людвіг Іосіфавіч, н. у 1887 г., расстраляны 19.11.1937 г.

ЯШЧЫКОЎСКІ Якаў Пятровіч, н. у 1888 г., загінуў у 1937 г. у месцах зняволення.

ПЕТРЫКАЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА АГОЛІЧЫ

БУЛАВА Аляксей Марцінавіч, н. у 1876 г., расстраляны 20.10.1937 г.

СТРАКАЧ Павел Рыгоравіч, н. у 1873 г., расстраляны 19.10.1937 г.

СУМАР Фёдар Цярэнцьевіч, н. у 1884 г., расстраляны 19.10.1937 г.

ВЁСКА БЕРАЗНЯКІ

ВЯЧЭРА Іван Іванавіч, н. у 1891 г., расстраляны 2.12.1937 г.

ВЁСКА БЯЛАНАВІЧЫ

ЖАДЗЬКА Георгій Рыгоравіч, н. у 1890 г., памёр у верасні 1942 г. у месцах зняволення.

ЯГЛІНСКІ Уладзімір Амбросьевіч, н. у 1902 г., расстраляны 5.1.1938 г.

ЯЦУК Прохар Захаравіч, н. у 1896 г., памёр у маі 1942 г. у месцах зняволення.

ВЁСКА ВЯЛАЎСК

ЧЫРЫЧ Лявон Рыгоравіч, н. у 1898 г., загінуў у студзені 1938 г. у месцах зняволення.

ВЁСКА ІЛЬІЧ

БАНДАРЫК-БЕДНАРЫК Іван Антонавіч, н. у 1909 г., расстраляны 19.11.1937 г.

БЕДНАРЫК Адам Антонавіч, н. у 1911 г., расстраляны 5.1.1938 г.

БЕДНАРЫК Антон Сямёнавіч, н. у 1890 г., расстраляны 19.11.1937 г.

ГОЛІК Пётр Іванавіч, н. у 1903 г., расстраляны 27.4.1938 г.

ГРАЛЬКА Браніслаў Францавіч, н. у 1907 г., расстраляны 19.11.1937 г.

ГРАЛЬКА Іван Ігнатавіч, н. у 1907 г., расстраляны 19.4.1938 г.

ГРАЛЬКА Станіслаў Андрэевіч, н. у 1890 г., расстраляны 1.12.1937 г.

ГРАЛЬКА Фларыян Андрэевіч, н. у 1894 г., расстраляны 1.12.1937 г.

ГРАЛЬКА Франц Андрэевіч, н. у 1883 г., расстраляны 1.12.1937 г.

КАВЕЦКІ Станіслаў Людвігавіч, н. у 1911 г., расстраляны 22.5.1938 г.

КАСТЫЛЕЦКІ Іван Ігнатавіч, н. у 1905 г., расстраляны 21.7.1938 г.

СІЛІВОНЕЦ Рыгор Васільевіч, загінуў у месцах зняволення.

ЧЭРКАС Сцяпан Макаравіч, н. у 1903 г., расстраляны 1.12.1937 г.

ЯКУБОВІЧ Сідар Іванавіч, н. у 1905 г., расстраляны 1.12.1937 г.

ВЁСКА ХУСНАЕ

ПАПОК Адам Сцяпанавіч, н. у 1885 г., расстраляны 2.10.1937 г.

ПОЛЯК Анікей Лаўрэнавіч, н. у 1899 г., расстраляны 28.1.1938 г.

ПОЛЯК Мікалай Лазаравіч, н. у 1887 г., расстраляны 19.10.1937 г.

СНЯДЗІНСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА БЕЛІН

КОРЗУН Ясь Самойлавіч, н. у 1877 г., расстраляны 27.4.1938 г.

МАСЛА Уладзімір Адамавіч, н. у 1895 г., расстраляны 5.3.1933 г.

ВЁСКА СНЯДЗІН

БУРАКЕВІЧ Пётр Дзямідавіч, н. у 1900 г., расстраляны 27.4.1938 г.

ДАМАСЕВІЧ Мікалай Сцяпанавіч, н. у 1908 г., расстраляны 5.3.1933 г.

ДАМАСЕВІЧ Фёдар Паўлавіч, н. у 1890 г., старшыня калгаса «Новае жыццё», расстраляны 11.3.1938 г.

ЖУКАВЕЦ Софія Міхайлаўна, н. у 1891 г., расстраляна 2.10.1937 г.

ЗАНКЕВІЧ Аляксандр Іванавіч, н. у 1897 г., расстраляны 5.3.1933 г.

ЗАНКЕВІЧ Андрэй Кліменцьевіч, н. у 1886 г., расстраляны 5.3.1933 г.

ЗАНКЕВІЧ Іван Аляксандравіч, н. у 1899 г., расстраляны 5.3.1933 г.

ЗАНКЕВІЧ Іван Лаўрэнавіч, н. у 1890 г., рэпрэсіраваны ў 1932 г., загінуў у месцах зняволення.

ЗАНКЕВІЧ Майсей Дзямідавіч, н. у 1893 г., рэпрэсіраваны ў 1932 г., загінуў у месцах зняволення.

ЗАНКЕВІЧ Павел Аляксандравіч, н. у 1898 г., расстраляны 5.3.1933 г.

ЗАНКЕВІЧ Рыгор Іванавіч, н. у 1903 г., рэпрэсіраваны ў 1932 г., загінуў у месцах зняволення.

ЗАНКЕВІЧ Сцяпан Сямёнавіч, н. у 1887 г., арыштаваны ў 1932 г., загінуў у месцах зняволення.

ЗАНКЕВІЧ Сяргей Адамавіч, н. у 1890 г., рэпрэсіраваны ў 1937 г., загінуў у г. Архангельск.

ЗАНКЕВІЧ Уладзімір Антонавіч, н. у 1903 г., расстраляны 28.1.1938 г.

ЗІНКЕВІЧ Іосіф Кліменцьевіч, н. у 1889 г., расстраляны ў 1937 г. у Томску.

ЛІТНЕР Яфім Фёдаравіч, н. у 1900 г., расстраляны 5.3.1933 г.

МАРОЗЬКА Аляксей Піліпавіч, н. у 1902 г., рэпрэсіраваны ў 1932 г., загінуў у месцах зняволення.

МАРОЗЬКА Сава Піліпавіч, н. у 1909 г., рэпрэсіраваны ў 1932 г., загінуў у месцах зняволення.

МАРОЗЬКА Сцяпан Піліпавіч, н. у 1907 г., арыштаваны ў 1932 г., загінуў у месцах зняволення.

МАРЦЫНКЕВІЧ Павел Пятровіч, н. у 1893 г., расстраляны 5.3.1933 г.

НАВАК Міхаіл Аляксандравіч, н. у 1907 г., рэпрэсіраваны ў 1932 г., загінуў у месцах зняволення.

НАВАК Раман Адамавіч, н. у 1879 г., расстраляны 19.10.1937 г.

НАВАК Яфім Пятровіч, н. у 1886 г., расстраляны 5.3.1933 г.

ПЛЕЦКІ Сцяпан Апанасавіч, н. у 1902 г., рэпрэсіраваны ў 1932 г., загінуў у месцах зняволення.

ПРЫКОТА Андрэй Пятровіч, н. у 1904 г., расстраляны 5.3.1933 г.

РУЦКІ Андрэй Васільевіч, н. у 1889 г., расстраляны 16.2.1938 г.

ТРАЯНОЎСКІ Ілья М., н. у 1885 г., рэпрэсіраваны ў 1932 г., загінуў у месцах зняволення.

ХАМЛЮК Сцяпан Мінавіч, н. у 1903 г., расстраляны 5.3.1933 г.

ХАМЛЮК Фёдар Мінавіч, н. у 1915 г., расстраляны 5.3.1933 г.

ЧАРНЯЎСКІ Аляксандр Іосіфавіч, н. у 1893 г., расстраляны 5.3.1933 г.

ЧАРНЯЎСКІ Андрэй Васільевіч, н. у 1885 г., рэпрэсіраваны ў 1932 г., загінуў у месцах зняволення.

ЧАРНЯЎСКІ Фёдар Васільевіч, н. у 1895 г., рэпрэсіраваны ў 1937 г., загінуў у месцах зняволення.

ШАЙКЕВІЧ Антон Іванавіч, н. у 1892 г., расстраляны 5.1.1938 г.

ШАЙКЕВІЧ Іосіф Іванавіч, н. у 1898 г., рэпрэсіраваны ў 1932 г., загінуў у месцах зняволення.

ШАЛКОВІЧ Уладзімір Мікалаевіч, н. у 1894 г., расстраляны 31.1.1938 г.

ВЁСКА ТАРГАШЫН

ЮХНЕВІЧ Вольга Карпаўна, н. у 1900 г., расстраляна 2.10.1937 г.

ЧАЛЮШЧАВІЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА ВЯЛІКАЕ ПОЛЕ

БУХТАРЭВІЧ Арсеній Аляксеевіч, н. у 1899 г., загінуў у месцах зняволення.

ВЁСКА ДРУГАЯ СЛАБОДКА

ЮДЭНКА Васіль Карпавіч, н. у 1900 г., загінуў у 1942 г. у месцах зняволення (Комі АССР).

ВЁСКА ДУБРОВА

АЛЬХІМОВІЧ Віктар Францавіч, н. у 1913 г., загінуў у месцах зняволення.

ЖУК Уладзімір Максімавіч, н. у 1873 г.

ЗБОРЫН Франц Карлавіч, н. у 1908 г., расстраляны 10.11.1937 г.

МІХНЕВІЧ Рыгор Сямёнавіч, н. у 1884 г., расстраляны 11.10.1938 г.

ТАРАСЕВІЧ Сямён Аляксандравіч, н. у 1885 г., расстраляны 16.2.1938 г.

ВЁСКА ЗАЛЕССЕ

АСТРЭЙКА Аляксандр Мікалаевіч, н. у 1875 г., загінуў у месцах зняволення.

БАРАНОЎСКІ Лявон Канстанцінавіч, н. у 1904 г., загінуў у месцах зняволення.

БАРАНОЎСКІ Севасцьян Канстанцінавіч, н. у 1883 г., расстраляны 16.2.1938 г.

БЕЛЬСКІ Анісім Пятровіч, н. у 1903 г., расстраляны 14.4.1933 г.

БЕЛЬСКІ Віктар Міхайлавіч, н. у 1913 г., расстраляны 16.2.1938 г.

БЕЛЬСКІ Павел Іванавіч, н. у 1914 г., расстраляны 27.4.1938 г.

БЕЛЬСКІ Пракоп Пятровіч, н. у 1899 г., расстраляны 27.4.1938 г.

БЕЛЬСКІ Сцяпан Іванавіч, н. у 1902 г., расстраляны 16.2.1938 г.

БЕЛЬСКІ Уладзімір Пятровіч, н. у 1901 г., расстраляны 16.2.1938 г.

БЕЛЬСКІ Юльян Міхайлавіч, н. у 1903 г.

БЕНЦ Фёдар Міхайлавіч, н. у 1893 г., загінуў у месцах зняволення.

ВЯРЦІНСКІ Леанід Генрыхавіч, н. у 1914 г., загінуў у месцах зняволення.

ВЯРЦІНСКІ Юльян Генрыхавіч, н. у 1918 г., загінуў у месцах зняволення.

ГАНУСЕВІЧ Іван Рыгоравіч, н. у 1887 г., расстраляны 11.10.1938 г.

КРАСОЎСКІ Казімір Людвігавіч, н. у 1909 г., расстраляны 16.2.1938 г.

КУНЦЭВІЧ Антон Іванавіч, н. у 1907 г., расстраляны 24.8.1937 г.

МАРГУН Барыс Нічыпаравіч, н. у 1879 г., расстраляны ў сакавіку 1930 г.

МАРГУН Пелагея Іванаўна, н. у 1881 г., загінула ў месцах зняволення (Комі АССР).

РАГАЛЕВІЧ Альбін Браніслававіч, н. у 1903 г., расстраляны 20.10.1938 г.

РАГАЛЕВІЧ Антон Браніслававіч, н. у 1902 г., расстраляны 27.4.1938 г.

РЫБАК Пётр Сямёнавіч, н. у 1895 г., расстраляны 11.3.1938 г.

СКОРЫ Рыгор Іванавіч, н. у 1910 г., расстраляны 29.12.1937 г.

УРБАНЧЫК Пётр Антонавіч, н. у 1909 г., расстраляны 16.2.1938 г.

УРБАНЧЫК Станіслаў Антонавіч, н. у 1917 г., расстраляны 27.4.1938 г.

ВЁСКА ЧАЛЮШЧАВІЧЫ

ВАЛАТАЎСКАЯ Домна Васільеўна, н. у 1878 г., расстраляна 2.10.1937 г.

ГАПОНЧЫК Васіль Аляксандравіч, н. у 1874 г., расстраляны 7.4.1933 г.

ЖУКОЎСКІ Мікалай Іванавіч, н. у 1900 г., расстраляны 26.3.1933 г.

КАРОТКІ Андрэй Іванавіч, н. у 1905 г., загінуў у месцах зняволення.

КУРАТНІК Дзям'ян Мікалаевіч, н. у 1908 г., расстраляны 16.2.1938 г.

МАЗАЙ Іосіф Антонавіч, н. у 1864 г., расстраляны 24.8.1937 г.

МАРЦІНКЕВІЧ Аўгусцін Мікалаевіч, н. у 1901 г., расстраляны 7.4.1933 г.

МІРАНОВІЧ Барыс Еўдакімавіч, н. у 1897 г., расстраляны 29.12.1937 г.

СІТКО Іосіф Вікенцьевіч, н. у 1897 г., расстраляны 29.12.1937 г.

СТАРАКАТЛІЦКІ Іван Уладзіміравіч, н. у 1889 г., расстраляны 7.4.1933 г.

СУРЖАНКА Абрам Яфімавіч, н. у 1869 г., расстраляны 5.1.1938 г.

ХАНЧЭЎСКІ Цярэнцій Андрэевіч, н. у 1897 г., расстраляны 14.4.1933 г.

ЧАУС Міхаіл Данілавіч, н. у 1883 г., расстраляны 11.3.1938 г.

ЧАУС Баляслаў Якаўлевіч, н. у 1905 г., расстраляны 27.4.1938 г.

ШПАЛАК Іван Іосіфавіч, н. у 1905 г., расстраляны 28.1.1938 г.

ВЁСКА ЧЫРВОНАЯ ГОРКА

БАР'ЯШ Емяльян Іванавіч, н. у 1898 г., расстраляны 28.1.1938 г.

ДРАБІК Іосіф Станіслававіч, н. у 1903 г., расстраляны 28.1.1938 г.

ДРАБІК Сцяпан Станіслававіч, н. у 1914 г., расстраляны 28.1.1938 г.

КАВАЛЬЧУК Адам Іванавіч, н. у 1909 г., расстраляны 28.1.1938 г.

ЛЕБЯДЗЕЎСКІ Трафім Рыгоравіч, н. у 1904 г., расстраляны 28.1.1938 г.

МІХНАВЕЦ Аляксандр Сцяпанавіч, н. у 1911 г., расстраляны 28.1.1938 г.

ТЫЧЫНА Іосіф Іванавіч, н. у 1901 г., расстраляны 27.9.1937 г.

У царкве, у турме...

...Прыйшла бяда і ў дом Невяркевічаў. Забралі двух братоў, Баляслава і Антона. Прыпомнілі ім старэйшага, Станіслава, які з 1920 года жыў у Польшчы. Баляслава і Антона аб'явілі ворагамі народа і агентамі дэфензівы. А Станіслава ўжо 17 гадоў ніхто ў вочы не бачыў, ніякіх вестак не было ад яго. Антону яшчэ і шкодніцтва прыпісалі — тады, як на грэх, на канюшні, дзе ён працаваў, ад менінгіту здохла некалькі коней. Прасілі прыслаць з раёна ветэрынара, так і не дапрасіліся. Так і прапалі браты без вестак з таго часу, як забраў іх Мінаеў. Невядома, дзе галаву склалі.

Самага меншага з братоў, Валодзю, які нарадзіўся ў 1917 г., актыўнага камсамольца — як ён радаваўся, калі незадоўга перад гэтым прынялі ў ЛКСМ! — выключылі з камсамола; звольнілі з работы. Тры дні пасля таго памятнага сходу Валодзя бязвылазна сядзеў дома. Маці ўспакойвала, суцяшала яго. Па старэйшых сынах яна плакала і ўбівалася, як па нябожчыках. Бацька пацямнеў і высах, як цень хадзіў па хаце... Праўду гавораць — бяда адна не ходзіць. Праз тыдзень пасля арышту Баляслава і Антона неяк раніцай перад хатай Невяркевічаў спынілася машына. Маці як выглянула ў акно, так і зайшлася крыкам: з машыны, пацягваючыся, выйшаў Мінаеў і ўладарна накіраваўся да дзвярэй. Хромавыя боты пабліскваліна сонцы... Халодным слізгаючым поглядам Мінаеў абвёў усіх у хаце, затым уставіўся на Валодзю і насмешліва працадзіў: «Ну што, камсамолец... Збірайся! Пойдзеш услед за сваімі братамі». Потым прайшоў у пакой, нажом пачаў успорваць падушкі і матрасы. Рабіў усё неяк неахвотна, абы як, быццам ведаў, што нічога не знойдзе — дзеля інструкцыі. Выкінуў усё на падлогу з шафы, дзе маці захоўвала чыстую бялізну, палатно. Плачучы і галосячы, яна збірала Валодзю якую-такую ежу на дарогу — хлеба з салам, некалькі салёных агуркоў, кавалак мыла, змену бялізны. На развітанне, калі Мінаеў выводзіў Валодзю з хаты, толькі і паспела перахрысціць дрыжачай рукой найменшага сына. І ўпала без сіл на падлогу. Тыдзень не ўставала, думалі, памрэ, але выжыла.

Не спатрэбіліся сабраныя маці рэчы. У Петрыкаўскім райаддзеле, куды Мінаеў прывёз хлопца, мяшок выкінулі. У Валодзі забралі папругу, зрэзалі ўсе гузікі. Ды ў Петрыкаве доўга не трымалі, усяго адну ноч, назаўтра ўпіхнулі ў «чорны воран» і адвезлі ў Мазыр.

Машына спынілася каля царквы. Тут Валодзя не раз быў у дзяцінстве. Цяпер мазырская царква зусім не нагадвала тую, якую ён памятаў. Сцены ў брудных пацёках, тынкоўка ў многіх месцах абвалілася, тырчыць чырвоная цэгла. З усіх бакоў — калючы дрот у два чалавечыя росты, уздоўж узад-уперад ходзіць вартавы. На зямлі валяецца крыж, што некалі ўзвышаўся на царкоўным купале... Валодзю ўпіхнулі ў камеру і зачынілі жалезныя дзверы. Заскрыгатала цяжкая засаўка. Спачатку, пакуль вочы не асвоіліся ў цемры, ён не мог арыентавацца. Толькі нейкія злавесныя цені, якія ледзь варушыліся... Камера была крокаў пяць у даўжыню і крыху больш упоперак, уся набітая людзьмі. Цені на сценах — гэта людзі, іх было тут чалавек пяцьдзесят, а можа і болей...

...«Хлопец, ты адкуль будзеш?» — спытаў дзядзька са скуластым знямоглым тварам. Валодзя адказаў. У камеры аказалася трое мужыкоў з суседняй вёскі, яны добра ведалі Валодзевага бацьку. Размаўлялі ў камеры шэптам. Ледзь скажаш гучней слова, вартавыя стралялі на гук. Яны стаялі на вышках па вуглах царквы. Зверху ўсё добра праглядвалася, хоць вокны былі забіты дошкамі і дзённае святло ледзь прабівалася. У тую ноч Валодзя не змог заснуць. Ляжаў, звярнуўшыся ў вузельчык, каля сцяны.

Жудаснай была тая першая ноч у няволі. А раніцай зноў заскрыгатала засаўка. У камеру ўвайшлі двое ў арыштанцкай вопратцы, але добрай і чыстай, паголеныя, з адкормленымі тварамі. Гэта былі, як потым даведаўся Валодзя, крымінальнікі — адносіны да іх былі зусім не такія, як да палітычных. Ззаду каля дзвярэй стаяў канваір. Крымінальнікі вынеслі парашу, потым промень ліхтара вартавога спыніўся ў адным вуглу, дзе чамусьці нікога не было, толькі цямнела нерухомая фігура на бруднай перацёртай саломе. Там ляжаў нябожчык, мужык гадоў 45—50. Валодзя здагадаўся, што гэта быў той няшчасны, што ўсю ноч стагнаў. Мерцвякоў выносілі з камеры кожную раніцу, іншы раз некалькі, і кожны думаў, што такое ў любы момант можа здарыцца і з ім, і кожны прымаў гэта як непазбежнае. Людзі гублялі розум, іх адольвалі хваробы, вошы, не спыняліся жорсткія пабоі і зневажанні — усе яны былі па-за межамі гэтага свету.

Увесь дзень Валодзя сядзеў у здранцвенні, чакаючы вызаву на допыт. Але яго ніхто не турбаваў. Дзверы камеры яшчэ адчыняліся двойчы — прыносілі ежу. Пайкі раздавалі тыя ж крымінальнікі — раніцай луста хлеба грамаў трыста і кубак крыху падсалоджанай вады, у абед разлівалі ў гліняныя міскі баланду — шэрую вадкасць з пахам бульбы і рыбы. Кожны дзень адно і тое ж. Хлеб Валодзю навучылі есці разважліва, з розумам: раніцай крыху, у абед з баландой і рэштку — на вечар. Быццам тры разы ў дзень еў, але ногі і твар пухлі з голаду.

Не вызвалі Валодзю і на другі дзень, і на трэці. Так прайшоў тыдзень, мінуў другі, пачаўся трэці... Хлопец ужо пачаў прывыкаць, быццам супакоіўся. Калі б не бачыў кожны дзень, як у камеру прыносілі і кідалі на падлогу збітых да паўсмерці, акрываўленых, без прытомнасці людзей... А ў канцы трэцяга тыдня на парозе з'явіўся ахоўнік: «Невяркевіч ёсць?» Валодзю нібы ўдарыла электрычным токам. «Ёсць», — хрыпла адказаў ён. «Ідзі за мной». Па змрочным праходзе сярод царквы, засыпаным пілавіннем, Валодзя пайшоў у прыбудову з тыльнага боку будынка. Ахоўнік ушіхнуў туды Валодзю. Балюча ўдарыла па вачах сонечнае святло. Валодзя заплюшчыў іх, а калі адкрыў, убачыў чалавека сярэдніх гадоў у форме НКУС. У пятліцах шпалы — маёр, чын немалы. Рэдкія валасы зачэсаны з бакоў на сярэдзіну, на патыліцы лысіна велічынёй з кулак. Стол быў завалены папкамі са справамі, адна з іх, раскрытая, ляжала перад афіцэрам. Маёр паглядзеў на Валодзю і хмура сказаў: «Маё прозвішча Раговін. Буду весці следства па вашай справе». На слове «вашай» пакрывіўся: сапляк, а трэба звяртацца на «вы». Раговін паведаміў сутнасць справы: шпіянаж на карысць польскай контрразведкі. «У нас ёсць усе доказы вашай прыналежнасці да шпіёнскага падполля ў Петрыкаўскім раёне». З зачытаных Раговіным матэрыялаў вынікала, што Валодзя, будучы сакратаром камсамольскай арганізацыі, вёў контррэвалюцыйную прапаганду сярод камсамольцаў, выступаў з падбухторваннямі супраць савецкай улады. Фармуліроўкі абвінавачванняў былі нейкімі закругленымі, быццам узятыя з падручніка... «У нас ёсць паказанні сведкаў — вашых аднавяскоўцаў, якія выкрываюць вашу злачынную дзейнасць. Так што лепш адразу прызнацца»...

Валодзя спачатку сумеўся, думкі карагодам круціліся ў галаве. «Што ён пляце?.. Які шпіянаж?» Сабраўся з духам і пачаў гаварыць. Ніякай злачыннай дзейнасцю ён не займаўся, ніякі ён не шпіён... Яму здавалася, што ён зможа пераканаць маёра Раговіна, даказаць сваю невінаватасць, адкрыць яму вочы на страшную памылку... Раговін слухаў моўчкі, уставіўшыся немігаючымі вачыма на Валодзю. Затым на твары з'явіўся выраз агіды, халодныя звераватыя вочы наліліся крывёю. Крык Раговіна абарваў Валодзю на паў-

слове: «Шчанюк, шпіён, задумаў выкруціцца? Не выйдзе! Не на таго напаў, польскі гадаванец. Так проста адсюль не выйдзеш! Апошні раз пытаю — падпішаш?» Валодзя маўчаў: «Што ж, даю табе дзень на роздум. Не надумаеш, крыўдзіся на сябе. Па-другому гаварыць будзем». Валодзю павялі назад ў камеру.

На допыт вызвалі ноччу. На стале гарэла яркая лямпа, за вокнамі стаяла цемра. Раговін, як і ў першы раз, сядзеў за сталом, перад ім ляжала тая ж папка. Ён адразу спытаў: «Ну што, надумаў?» «Я не шпіён», — цвёрда адказаў ён. Раптам следчы выхапіў наган і навёў яго на здранцвеўшага хлопца. «Станавіся тварам да сцяны! Лічу да трох, калі не прызнаешся, я цябе, шпіёнскага вылюдка, сваёй уладай рашу!». Апошнія словы ён злосна прашыпеў. «Раз — два». Валодзя ўвесь сціснуўся ў камяк. «Тры» — і адразу грымнуў стрэл. Валодзя ўздрыгнуў... І застаўся на нагах. «Шкада, не пацэліў, — прамармытаў Раговін. — Падпішаш?» Валодзя маўчаў. Галава была цяжкай, кроў шумна біла ў скроні. «Так? Ну, глядзі, на гэты раз я не прамахнуся, прыстрэлю, як апошнюю сволач. Станавіся да сцяны!». І зноў адлік, і зноў стрэл... Так страляў Раговін разоў пяць, надрыўна крычаў і размахваў перад тварам хлапца наганам. Нарэшце кінуў яго на стол і злосна прагаварыў: «Не, гад, лёгкай смерцю ты ў мяне не памрэш. Я прымушу цябе гаварыць».

Валасы на галаве Раговіна ўзмакрэлі і зліпліся, ён скомканай шэрай хусцінкай раз-пораз выціраў лысіну. Потым падышоў да дзвярэй, прыадчыніў іх і паклікаў некага. У пакой зайшоў ахоўнік, дужы, каржакаваты, у новеньких бліскучых ботах. «Апошні раз пытаю — падпішаш?» — скрозь зубы працадзіў Раговін, звяртаючыся да Валодзі. Той маўчаў. Абыякавасць, невыносная стома наваліліся на яго. Толькі заўважыў, што ахоўнік замахнуўся... Моцны ўдар у твар збіў з ног.

Апрытомнеў у тым самым пакоі для допытаў. Ён ляжаў на падлозе, святло лямпачкі на століе біла ў вочы. Першае, што адчуў, — холад, увесь мокры ён ляжаў проста ў лужыне вады. Значыць, яго адлівалі... Побач з тварам — тыя ж боты, крыху далей — прымятае вядро. Ножкі стала Раговіна... «Ну што, адышоў? Уставай, хопіць прыдурвацца». Голас Раговіна гучаў нібы здалёку, Валодзя чуў яго быццам праз вату ў вушах. Паспрабаваў устаць, але цела не слухалася, было нібы драўляным. Упаў зноў на падлогу, потым, сабраўшы ўсе сілы, устаў.

Як дайшоў да камеры, не памятаў. Ахоўнік расчыніў дзверы і моцна штурхнуў у спіну. Валодзя паляцеў наперад, але нечыя рукі падхапілі яго, не далі ўпасці. Наступіла забыццё. Потым ён даведаўся, што допыт цягнуўся на працягу трох сутак, і таварышы па няшчасці ў камеры лічылі, што ён ужо не вернецца. Аднаго з землякоў ужо не было, ён памёр ад зверскіх пабояў следчымі. А на трэці дзень пад вечар Валодзю зноў выклікалі на допыт. Зноў усё паўтаралася — яго білі па-зверску, як жывёліну, — кулакамі, потым нагамі, ляжачага без пачуццяў на падлозе. Не раз хлопец траціў прытомнасць, яго адлівалі вадой і зноў білі. Валодзя адчуваў, як шчымлівым болем запаляўся мозг, але пакуль знаходзіў сілы адказваць Раговіну: «Не»... Але сілы былі вельмі няроўныя. Пасля чацвёртага допыту яго волакам прыцягнулі ў камеру. Валодзя глуха стагнаў. Аднакамернікі перанеслі яго на руках у свабодны кут, паклалі на салому. Нехта заплакаў: «Што зрабілі з хлопцам... Нелюдзі, заб'юць жа насмерць!» Яму далі вады, а потым усе дружна пачалі ўгаворваць: «...прызнавайся, падпішы, так хоць якая надзея ёсць выжыць, інакш — закатуюць насмерць». Невыносна балела кожная костачка, кожны нерв. І на наступным допыце ён усё падпісаў...

А. І. Майсеня

1941

1945

ІШЛА ВАЙНА НАРОДНАЯ...

Вайна грымела недзе далёка на захадзе, але трывога адчувалася і тут, у пакуль яшчэ далёкім тыле. Ужо ў панядзелак 23 чэрвеня пачалася мабілізацыя. Каля ваенкаматаў у Петрыкаве і ў Капаткевічах ігралі гармонікі, плакалі і смяяліся людзі, адпраўляліся да чыгункі ў Муляраўцы каманды. Ніхто не ведаў, не мог здагадацца і прадбачыць, якія выпрабаванні чакаюць усіх у бліжэйшы час... Двор сярэдняй школы ў Петрыкаве быў перапоўнены мабілізаванымі, вакол тоўпіліся бацькі, родныя, знаёмыя. Адчувалася трывога і напружанасць, але панікі не было. Людзі прагна лавілі навіны, апошнія звесткі з фронту, распытвалі бежанцаў з заходніх абласцей Беларусі, якім давялося перажыць шмат гора, што прынесла вайна. Людзі ішлі на працягу сутак, пешшу, часта з анухшымі нагамі, галодныя, але і тут не затрымліваліся, імкнуліся адысці як мага далей ад пекла вайны, у якім ужо давялося пабываць...

24 чэрвеня ў Петрыкаве праходзіла нарада раённага актыву. У зале Дома культуры сабраліся людзі розных прафесій і ўзростаў, вясковыя жыхары крыху спазніліся. На сцэну падняўся каржакаваты дзядок з ордэнам Чырвонага Сцяга на грудзях.

— Я звяртаюся да вас як стары салдат, — пакаціўся па зале гучны і бадзёры голас. — Абараняйце нашу краіну так, як мы абаранялі яе ў грамадзянскую. Біце фашыстаў усюды. Чуеце? Яны набліжаюцца да Пінска. Паўзуць да нас...

— Гэта ж дзед Талаш, — пранеслася па зале.

Васіль Ісакавіч стаяў не за трыбунай, а перад прэзідыумам. Звяртаўся да прысутных на сваёй паляшуцкай мове, часам узмахваў рукой. Гаварыў проста, зразумела, словы яго краналі душу кожнага, хто прысутнічаў. Здавалася, вось сыйдзе дзед са сцэны і павядзе ўсіх за сабою, як у грамадзянскую вайну...

Увечары адбыўся пленум райкома партыі. Было прынята рашэнне аб стварэнні знішчальнага батальёна з ліку партыйна-савецкага актыву і старых камуністаў, арганізаваны савет па эвакуацыі. Старшынёй яго прызначаны начальнік раённага аддзела НКУС маёр Жукаў, членамі — старшыня гарсавета Яфім Зарэцкі і народны суддзя Сапажынскі. Кіраўнікі калгасаў, МТС, прадпрыемстваў азнаёміліся з планам эвакуацыі матэрыяльных каштоўнасцей і людзей. Эвакуацыя праходзіла з вялікімі цяжкасцямі. Чыгунка была перагружана ваеннымі эшалонамі, над цягнікамі кружыліся фашысцкія сцярвятнікі, бамбілі і расстрэльвалі іх. Усё ж значную колькасць дзяржаўнай маёмасці, жывёлу ўдалося выратаваць. Мікалай Шамрыла, Васіль Налецька, Вольга Налецька з калгаса «Сейбіт» даставілі ў Курскую вобласць 220 галоў жывёлы.

Батальён, створаны сіламі партыйна-савецкіх работнікаў, нёс вартавую службу ў раёне, сачыў за парадкам у го-

радзе, на мабілізацыйным пункце, узяў пад кантроль плаўсродкі на Прыпяці. Усе аўтамашыны былі мабілізаваны для фронту. Каля трыццаці аўтамашын замацавалі за 110-м медсанбатам 75-й стралковай дывізіі. У горадзе была сфарміравана група народнага апалчэння ў колькасці 60 чалавек непрызыўнога ўзросту, у асноўным з ліку рабочых суднаверфі і цагельнага завода. Яны займаліся рамонтам дарог і мастоў па шляху перамяшчэння нашых войск.

Выключную пільнасць у першыя дні вайны праяўлялі работнікі аддзела ўнутраных спраў. На чацвёрты дзень вайны ўвечары ў Петрыкаў прыбыла аўтамашына, у якой ехалі пяць камандзіраў Чырвонай Арміі ў званні ад лейтэнанта да маёра. Аўтамашына спынілася па вуліцы Чырвонаармейскай супраць дома сакратара райкома партыі Варгаўціка. У гэты час патрульную службу нёс лейтэнант міліцыі Семяніцкі. Нешта ў паводзінах вайскоўцаў яму здалося падазроным, і з дапамогай таварышаў ён затрымаў «афіцэраў», якія аказаліся фашысцкімі дыверсантамі.

Баявыя дзеянні ў гэтым раёне Беларусі пачаліся значна пазней, толькі ў другой палове ліпеня, калі ў іншых напрамках нямецка-фашысцкія войскі прарваліся ўжо далёка на ўсход. Гітлераўскія стратэгі яшчэ з часоў першай сусветнай вайны засцерагаліся цяжкапраходных Пінскіх балот, дзе назаўсёды спыніўся фронт імперыялістычнай вайны, і спланавалі свае асноўныя ўдары па поўдзень, галоўным чынам на поўнач ад Палесся, пакінуўшы гэты, як яны лічылі, другарадны ў стратэгічных адносінах раён у сваім глыбокім тыле.

75-я стралковая дывізія 4-й арміі, якой камандаваў генерал-маёр Нядзвігін, з цяжкімі баямі вырваўшыся з акружэння з-пад Брэста, у сярэдзіне ліпеня заняла абарону на лініі Ленін — Жыткавічы — Тураў. Дывізія панесла вялікія страты, тут яе часці папоўніліся людскімі рэзервамі. У рады чырвонаармейцаў стала і больш 120 петрыкаўчан, прызваных у армію па мабілізацыі. На камандныя і палітычныя пасады ў дывізію было накіравана звыш 100 савецкіх і партыйных работнікаў Палескай вобласці.

У ноч на 22 ліпеня пасля жорсткіх баёў за Жыткавічы байцы 115-га стралковага палка і атрад пагранічнікаў у колькасці больш 200 чалавек вымушаны былі адступіць і заняць пазіцыі на чыгуначнай станцыі Капцэвічы. 34-ы стралковы полк, а таксама частка байцоў 68-га артылерыйскага палка з гарматамі ўзялі кірунак на Петрыкаў. 28-ы полк пераправіўся праз Прыпяць і, прайшоўшы з баямі Тураўскі і Лельчыцкі раёны, заняў абарону на тэрыторыі Асавецкага сельсавета.

Заняўшы пазіцыі каля Капцэвіч, чырвонаармейцы рыхтаваліся да бою. Мясцовыя жыхары былі эвакуіраваны ў лес ва ўрочышча Вірок. У чатырох кіламетрах ад станцыі з правага боку ад дарогі Брынёў — Капцэвічы размясціўся заслон пагранічнікаў. Мясцовыя жыхары дапамагалі капаць акопы.

У 18 гадзін фашысты рушылі ў атаку з боку Брынёва. З другога боку яны наступалі ад в. Сялюцічы ў напрамку Капцэвіч. Вораг меркаваў адным ударам прарваць лінію абароны і авалодаць чыгуначнай станцыяй. Але іх сустрэў шчыльны кулямётна-вінтовачны агонь воінаў-пехацінцаў і пагранічнікаў. Становішча абаронцаў аблягчалася тым, што абапал іх пазіцый, недалёка ад Капцэвіч, у шасці кіламетрах ад Сялюцічы, цягнулася вялікае балота, непраходнае для тэхнікі.

Тры разы хадзілі ў атаку фашысцкія аўтаматчыкі і кожны раз пад шквальным агнём вымушаны былі адступаць. Працаўнік выклікаў авіяцыю. Некалькі самалётаў бамбілі пазіцыі чырвонаармейцаў. У 7 гадзін раніцы 23 ліпеня фашысты зноў пайшлі ў атаку і зноў яна не прынесла поспеху. Усе свае сілы вораг кінуў на пазіцыі, якія ўтрымлівалі пагранічнікі. Тут яны пакінулі дзесяткі сваіх забітых салдат і афіцэраў, але радзелі і рады абаронцаў. Быў

паранены намеснік камандзіра атрада лейтэнант Ніканаў. Мужнасць і адвагу праявіў у гэтых баях шафёр 110-га медсанбата жыхар Капцэвіч Даніла Туравец. Ён дапамагаў выносіць з поля бою параненых, даставіў у медсанбат каля х. Гараваха і Ніканава.

У другой палавіне дня на дапамогу абаронцам на станцыю Капцэвічы з Калінкавіч прыбылі два бронепаязды. Адзін з іх спыніўся непадалёку ад вакзала і прыкрываў агнём пазіцыі 115-га палка, другі стаў каля чыгуначнага маста каля в. Аголіцкая Рудня і падтрымліваў пагранічнікаў. Мінуў яшчэ адзін дзень напружаных кровапраліт ных баёў.

24 ліпеня фашысты падцягнулі артылерыю і ў 10 гадзін раніцы адкрылі агонь па нашых пазіцыях. У атаку пайшла пяхота. Нягледзячы на мужнае супраціўленне савецкіх байцоў, да канца дня фашыстам удалося пацясніць наш стралковы полк. Чырвонаармейцы пакінулі в. Капцэвічы і занялі абарону на ўскраіне п. Капцэвічы. Фашысты занялі выгадныя пазіцыі, на могілках устанавілі артылерыю.

Вялікую дапамогу абаронцам Капцэвіч аказаў атрад апалчэнцаў з мясцовага насельніцтва пад камандаваннем дырэктара Капцэвіцкага фанернага завода «Звязда» А. Зубрыцкага. Атрад размясціўся паблізу перадавой лініі ў лесе ва ўрочышчы Града. Апалчэнцы хадзілі ў разведку, прыносілі каштоўныя звесткі аб варожых пазіцыях, былі праваднікамі байцоў.

Раніцай 25 ліпеня фашысты адкрылі з могілак ураганны артылерыйскі агонь па пазіцыях 115-га палка і пагранічнікаў. Чырвонаармейцы пры падтрымцы агню бронепаяздоў не адступалі. Але сілы былі няроўнымі. Становішча ўскладнілася тым, што знайшліся здраднікі з мясцовых жыхароў, якія правялі фашыстаў праз балота ў тыл нашых пазіцый. Камандаванне дывізіі рашыла адвесці войскі на загадзя падрыхтаваныя пазіцыі ў раён Аголіцкай і Сярэдняй Рудні, пакінуўшы для прыкрыцця батальён Ярышкіна. З усходняга боку чыгуначнага вакзала гітлераўцы змаглі наблізіцца да браняпоезда, абстраляць яго з мінамётаў і вывесці са строю. Яны чакалі лёгкай нажывы, але своечасова падаспеў на дапамогу другі браняпоезд ад Руднянскага маста.

Фашысты, не здолеўшы авалодаць браняпоездам і не зламаўшы супраціўленне байцоў батальёна Ярышкіна, узмацнілі мінамётна-артылерыйскі агонь. Асноўныя нашы сілы адступілі і занялі новыя пазіцыі. Затым пачаў адступаць і батальён Ярышкіна. Жыхарка Капцэвіч Алена Дзечка вывела байцоў небяспечнай дарогай.

У 22 гадзіны фашысты занялі станцыю Капцэвічы і рушылі па чугункі ў бок Аголіцкай і Сярэдняй Рудні. Неабходна было спыніць іх, каб паспець прывесці падраздзяленні ў баявы парадак і замацавацца на новых пазіцыях. Такі загад атрымаў 1-ы батальён 115-га палка. Браняпоезд заняў абарону ў 400 м за стрэлкамі Коржаўскага раз'езда. Батарэя 68-га артылерыйскага палка пад камандаваннем лейтэнанта Пятра Насонава, прыданая 115-му палку, заняла агнявыя пазіцыі ў хмызняку за в. Бяланавічы па дарозе на Конкавічы.

Аддзяленне разведкі пад камандаваннем Юсупава вывучыла пазіцыі праціўніка. Гарматы і мінамёты ворага стаялі ў 500 м ад перадавой на ўскрайку лесу ў 300 м ад в. Аголіцкая Рудня. Юсупаў даў сігнал чырвонай ракетай, батарэя лейтэнанта Насонава і браняпоезд адкрылі агонь. Чырвонаармейцы, якія занялі пазіцыі непадалёку ад станцыі Муляраўка ў лесе, прыціхлі ў чаканні каманды ў атаку. Адзін з узводаў узначальваў былы камандзір першага артылерыйскага дывізіёна супрацьтанкавых гармат 115-га палка Веньямін Кудзелін. Пад выбухамі снарадаў ён падняў байцоў у атаку. Пракацілася магутнае «ўра», пяхота пайшла ў наступленне. Фашысты супраціўляліся адчайна, завязаўся рукапашны бой. Гітлераўцы пачалі адступаць, па-

кідаючы забітых і параненых.

Асноўныя сілы стралковага палка і частка пагранічнікаў пасля гэтага бою адышлі да в. Слінкі і занялі абарону з усходняга боку ўрочышчаў Хохла і Азяроднае, дзе ўзвод Кудзеліна падпаліў драўляны мост праз р. Слінка. Фашысты замацаваліся з заходняга боку ва ўрочышчы Зубковае поле па р. Бобрык. Насельніцтва пасёлка было эвакуіравана ў лес.

Да 25 ліпеня палова тэрыторыі раёна была акупіравана фашыстамі. У гэтыя дні ў горад прыбыў камісар 75-й дывізіі І. С. Ткачэнка. Партыйна-савецкі актыў раёна знаходзіўся на казарменным становішчы. У 10 гадзін вечара ў памяшканні райкома партыі сабраліся на нараду прадстаўнікі партыйна-савецкага актыву, камсамольскіх і грамадскіх арганізацый з удзелам камандавання 75-й дывізіі. На ёй былі выпрацаваны сумесныя дзеянні па абароне Петрыкава, вызначаны рубяжы абароны, распрацаваны мерапрыемствы па эвакуацыі дзяржаўнай маёмасці і насельніцтва. Для гэтай мэты быў выдзелены аўтатранспарт дывізіі. Насельніцтва прыцягвалася для капання траншэй і акопаў, праведзена дадатковая мабілізацыя для папаўнення асабовага саставу. Работу па мабілізацыі ўзначаліў ваенком раёна капітан Сергіенка.

Нарада працягвалася да поўначы. Была чутна блізкая артылерыйская канада. У гэтую ноч савецка-партыйныя органы эвакуіраваны з Петрыкава за Прыпяць у в. Асавец.

Паспяхова спраўляўся са сваімі абавязкамі знішчальны батальён, у саставе якога ўваходзілі работнікі міліцыі і НКУС. У прыфрантавым горадзе быў бездакорны парадак, адказнасць за які была ўскладзена на кіраўнікоў раённага аддзела НКУС Жукава і Малчанава.

За некалькі дзён да акупацыі Петрыкава на адным з пасяджэнняў райкома партыі, якое праходзіла ў в. Асавец, было вырашана адправіць частку раённага актыву з сем'ямі і дзяржаўнымі каштоўнасцямі ў тыл краіны. Упраўляючаму аддзялення Дзяржбанка Грошману і бухгалтару Чарнаму даручалася вывесці 400 тысяч рублёў, асабовыя рахункі і іншую дакументацыю. Машыністка райкома партыі Геня Шусцерман павінна была эвакуіраваць у Тамбоў партыйныя, камсамольскія дакументы і Чырвоны сцяг раёна. Для гэтай мэты выдзяляліся дзве аўтамашыны, шафёрамі былі Сяргей Вяргей і Васіль Канонік. Загружаліся ноччу, раніцай 21 ліпеня машыны ўзялі кірунак праз Мазыр у тыл краіны. З Канонікам схаў хворы старшыня райвыканкома Зобаў. Адказнае заданне было выканана паспяхова. Каштоўнасці, дакументацыя і Чырвоны сцяг раёна былі перададзены ў Тамбоўскі абласны Дзяржаўны банк, абласныя камітэты партыі і камсамола*.

І. С. Ткачэнка

26 ліпеня з Петрыкава эвакуіраваўся шпіталь, які размяшчаўся ў раённай бальніцы. Усіх параненых вывезлі. Большасць медыцынскага персаналу выехала ў Пціч, а частка медыкаў засталася ў горадзе. Медыцынскае абсталяванне было вывезена, астатняе закапана. Эвакуіраваўся і 110-ы медсанбат, які дыслацыраваўся каля х. Гараваха. Ён таксама ўзяў кірунак на чыгуначную станцыю Пціч. Жорсткія баі ў гэты дзень ішлі ў раёне станцыі Муляраўка. Байцы 34-га палка трымалі абарону з

* У жніўні 1944 г. пасля вызвалення Петрыкава ад фашыстаў Тамбоўская кантора абласнога банка вярнула дакументацыю і грошы. Захаваліся партыйныя і камсамольскія дакументы і Чырвоны сцяг раёна.

заходняга боку Петрыкава. Пазіцыі чырвонаармейцаў праходзілі ад могілак праз пасевы жыта калгасаў імя Кірава, «Гігант», у 150 метрах ад в. Белка. Правы фланг упіраўся ў абрыў урочышча Абалонне. Байцы пехаціпцы займалі таксама пазіцыі па-над гарой Абалоння, каля цагельнага завода, стадыёна, аптэкі (цяпер РДК), у гарадскім парку. Участкам абароны каля аптэкі і на вуліцы Камунальнай кіраваў ураджэнец Петрыкава малодшы лейтэнант Якаў Ус. Былі арганізаваны засады чырвонаармейцаў з кулямётамі. Пад кулямётным абстрэлам трымаліся скрыжаванні галоўных вуліц горада, з могілак абстрэльвалася вуліца Леніна. З гэтага часу райком партыі стаў падпольным, а знішчальны батальён — партызанскім атрадам.

27 ліпеня ў 7 гадзін немцы пачалі абстрэльваць горад з мінамётаў. Баі ішлі ў прыгарадзе і ў самім Петрыкаве на працягу амаль двух дзён. 29 ліпеня савецкія войскі вымушаны былі пакінуць горад. 1 жніўня значная частка раёна была акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Камандаванне дывізіі прыняло рашэнне сіламі 28-га Чырванасцяжнага, 34-га і 115-га стралковых палкоў і Дняпроўскай ваеннай флатыліі на золку 2 жніўня атакаваць праціўніка на ўчастку фронту Майсеевічы — Конкавічы — Коржаўка. Бой пачаўся ў 5 гадзін раніцы, а ў 11 гадзін вызвалены Петрыкаў. Вораг панёс вялікія страты, было забіта больш як 300 салдат. У Петрыкаве адбыўся мітынг, на якім выступілі І. Ткачэнка і сакратар райкома партыі Х. Варгаўцік. У гэты дзень было вызвалена яшчэ некалькі вёсак раёна. Але нядоўгай была радасць вызваленых жыхароў раёна. У той дзень нямецкая авіяцыя бамбіла в. Кашэвічы і станцыю Пціч. Нашы вайсковыя часці вымушаны былі адступіць, да 6 жніўня лінія фронту прасунулася да р. Пціч.

Аказваючы ўпартае супраціўленне ворагу, нашы часці адыходзілі на ўсход. Эвакуіравана значная частка маёмасці, а таксама насельніцтва. Вывозілася тэхніка, на ўсход гналі калгасную жывёлу, вязлі збожжа. Што нельга было вывезці, знішчалася або раздавалася жыхарам раёна. Так, быў падпалены фанерны завод «Звязда» ў п. Капцэвічы. Выканаць гэтае заданне даручана камсамолкам Марыі Мялешка і Кацярыне Дубік. Яны спалілі завод, але патрыётак схапілі фашысты і тут жа расстралялі.

У сярэдзіне жніўня 1941 г. тэрыторыя Петрыкаўскага і Канаткевіцкага раёнаў — апошніх на Беларусі — поўнасцю была акупіравана фашысцкімі войскамі.

В. М. Чарнобылец

На грані мірнага жыцця

Яшчэ па мірных рэйках коцілася жыццё неабсяжнай краіны, ціхімі і сонечнымі, не зацягнутымі дымам пажарышчаў былі летнія раніцы, а на заходніх рубяжах даспявалі чорныя гронкі вайны... Да яе спакваля, не верачы, што вайна ўсё-такі ў хуткім часе грымне, рыхтаваліся, многа гаварылі, спрачаліся. Сярод насельніцтва значна актывізавалася абаронча-масавая работа, праводзіліся зборы, ваенныя гульні дзяцей і моладзі. Было завершана будаўніцтва дотаў па рэках Прыпяць і Пціч, каля мастоў і чыгуначных станцый, а між тым магутныя жалезабетонныя ўмацаванні на старой польскай граніцы незадоўга да вайны ўзрываліся і засыпаліся зямлёй як непатрэбныя... Папоўніўся новымі сіламі гарнізон, прыбыла спецыяльная сапёрная часць для ўдасканалення абаронных работ і добраўпарадкавання аэрадрома. Адкрыліся два парты на Прыпяці — каля в. Дарашэвічы і ў Петрыкаве, дзе базіраваліся атрады ваенных бранякатэраў.

Жыццё ў Петрыкаве і ў раёне ішло сваім парадкам. У 1940 г. было закончана брукаванне вуліц у цэнтры горада. Вакол парку — любімага месца адпачынку гараджан — узведзена новая прыго-

-ая агароджа. Рабочыя суднаверфі абсталявалі танцавальную пляцоўку, а камунгас — летнюю эстраду для паказу кінафільмаў. Камсамольцы горада зрабілі баскетбольную і валейбольную спартыўныя пляцоўкі. У парку штодзень праводзілі вольны час жыхары Петрыкава і навакольных вёсак. Увечары чулася музыка духавыў аркестраў, іх было ў горадзе пяць. Ігралі лётчыкі, матросы, а таксама гарадскі аркестр. Старэйшыя ішлі ў клуб, да якога нядаўна было прыбудавана новае фае. У ім выстаўлены партрэты перадавікоў вытворчасці раёна, лепшых калгаснікаў.

Непазнавальна змяніўся ў перадваенныя гады горад. На базе дробных уласных кустарных майстэрняў узніклі тэхнічна аснашчаныя прадпрыемствы. Найбольш буйныя з іх — суднаверф, дзе працавала больш 500 рабочых, цагельны завод і іншыя.

...Вестка аб нападзе на нашу краіну фашысцкіх войск маланкай абляцела Петрыкаў. Сонечны нядзельны дзень адразу стаў змрочным. Вуліцы горада былі перапоўнены людзьмі. Праз дзве гадзіны пасля перадачы інфармацыйнага паведамлення на плошчы каля райкома партыі адбыўся агульнагарадскі мітынг. Першы сакратар райкома партыі Х. І. Варгаўцік і старшыня райвыканкома Зобаў выступілі з прамовамі, заклікалі да пільнасці і спакою.

Юнакі і дзяўчаты накіраваліся на стадыён, дзе павінен быў адбыцца футбольны матч паміж гарадской камандай і матросамі. Гарадская каманда была ў форме, трэніравалася на полі і чакала каманду маракоў. Гледачы, яшчэ не да канца ўсвядоміўшы памер небяспекі, якая павісла над народам, займалі месцы балельшчыкаў і чакалі пачатку матча. Раптам ў небе з'явіліся два самалёты, наблізіліся і рэзка пайшлі ўніз. Ад іх аддзяліліся чорныя кропкі, пачуліся моцныя выбухі. З'явіліся чорныя клубы дыму. Самалёты кружыліся, страчылі з кулямётаў. Людзі мітусіліся, разбягаліся ў розныя бакі, збіваючы адзін другога, пад стадыёнам стаяў плач, крыкі... Ад бамбёжкі і абстрэлу ў той дзень загінулі чатыры чалавекі, два паранены. Так у Петрыкаў прыйшла вайна...

У. А. Браім

Бой вялі пагранічнікі

Кудзелін Веньямін Рыгоравіч, лейтэнант, з 20 чэрвеня 1941 г. — камандзір узвода 115-га палка 75-й стралковай дывізіі, удзельнік баёў з нямецка-фашысцкімі захопнікамі на тэрыторыі раёна, з восені 1941 г. — партызан Палескага злучэння. У пасляваенны час — супрацоўнік, затым дырэктар мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць — герой».

Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, баявымі медалямі.

...У другой палове ліпеня 1941 г. 115-ы стралковы полк з баямі пакінуў Жыткавічы і рухаўся ў напрамку станцыі Капцэвічы. Першы батальён выйшаў да раз'езда Старушкі. Выявілася, што чыгуначны шлях перад Капцэвічамі захоплены немцамі. Першай роце батальёна, у складзе якой быў і мой узвод, загадана было рухацца ў напрамку в. Брынёў. На подступах да яе нечакана наткнуліся на варожую засаду. Прыйшлося трымаць бой. Далейшы шлях ляжаў у абход вёскі. Ішлі па лесе, без дарогі. Потым аказалася, што мы апынуліся ў варожым кальцы. У лесе пад Капцэвічамі нечакана сустрэліся з чатырма пагранічнікамі, старшым быў капітан Елкін. Акрамя нагана, што вісеў у кабуры на поясе, капітан быў узброены вінтоўкай са штыком.

Наша з'яўленне для пагранічнікаў было яшчэ больш нечаканым: мы ішлі з боку праціўніка. Пачалі дзейнічаць разам. Яшчэ пры першай сустрэчы я звярнуў увагу на ўпэўненасць і рашучасць капітана Елкіна. Ад яго зыходзіў нейкі спакой, перакананая смеласць. Нават кароткая размова з ім адразу надавала давер і павагу. Я не быў навічком на вайне, з першага дня вайны ад Маларыты мы вялі моцныя баі, але пазайздросціў вытрымцы гэтага чалавека.

Праз некалькі дзён мяне накіравалі для сувязі да пагранічнікаў, якія трымалі пад наглядам чыгунку. Тады вялікае значэнне на нашым участку меў браняпоезд, якога ў тэлефонных размовах умоўна называлі «Барыс Пятровіч», а пагранічнікаў — «казыркамі». Пагранічнікі — гэта зводны пагранполк, аснову якога складалі байцы і камандзіры 18-га Жыткавіцкага атрада. Я звярнуў увагу на высокую дысцыплі ну пагранічнікаў, хуткае і дакладнае выкананне імі загадаў. Бязмежнай павагай у іх карыстаўся камандзір, палкоўнік Мацвей Аканін. Аднойчы група камандзіраў стаяла на паўночнай ускраіне в. Слабада, калі разгарэлася артылерыйская дуэль паміж браняпоездам і батарэяй праціўніка. Браняпоезд маневраваў па пуцях, гітлераўцам не ўдавалася накрыць яго агнём. Раптам назіральнік, які сядзеў на дрэве, паведаміў, што падраздзяленне пагранічнікаў пад націскам ворага пачало адступаць. Палкоўнік Аканін адразу ўскочыў на аўтамашыну, на якой знаходзілася зенітная ўстаноўка, стаў за кулямёт і загадаў ехаць да перадавой лініі. Машына з ходу ўварвалася на перадавую, развярнулася, і палкоўнік пачаў весці агонь. Варожае наступленне было адбіта, байцы, натхнёныя прыкладам камандзіра, зноў занялі свае акопы.

У другім месцы на ўчастку абароны аддзяленне пагранічнікаў мужна вытрымлівала націск ворага, які значна пераўзыходзіў іх па сілах. Было адбіта ўжо некалькі атак. Да канца дня становішча ўскладнілася, і тады прынята рашэнне адысці на новы рубеж. Але як перадаць загад аддзяленню, якое трымала абарону далёка наперадзе? Тэлефоннай сувязі не было. Паслалі сувязнога, але ён не дайшоў, загінуў. Толькі позна ўвечары ў цемры ўдалося дабрацца да абаронцаў рубяжа. Яны не збіраліся адыходзіць, хоць ведалі, што знаходзяцца амаль у акружэнні: не было загаду.

К. П. Елкін

Запомніліся баі ў раёне раз'езда каля в. Коржаўка. Наш полк знаходзіўся ў двух-трох кіламетрах на ўсход ад Коржаўкі і на поўдзень да в. Конкавічы. Каля ракі абарону трымалі байцы нашай дывізіі. Пагранічнікі, як і раней, абаранялі чыгунку. Гэта была ўжо невялікая група, многія загінулі ці ваявалі на другіх участках фронту. У ноч на 1 жніўня праведзена разведка, на світанку мы пайшлі ў наступленне. Была пастаўлена задача выбіць фашыстаў з раз'езда, а затым, працягваючы наступленне, захапіць в. Коржаўку, дзе размяшчаўся штаб гітлераўскага палка. Артпадрыхтоўку вёў браняпоезд, ён суправаджаў нас у наступленне, пакуль дазваляла чыгуначнае палатно. Многія агнявыя кропкі ворага былі знішчаны яго агнём. У той час у дывізіі амаль не было артылерыі, а ў нашым палку налічвалася ўсяго тры гарматы. Аднак наступленне было імклівым і паспяховым. Я з узводам рухаўся па левым баку чыгункі. Мы выбівалі фашыстаў кароткімі атакамі. З ходу была ўзята Коржаўка, разгромлены штаб варожага палка, захоплены трафеі. У тыя дні два стралковыя палкі, 28-ы Чырванасцяжны і 34-ы, ва ўзаемадзеянні з катэрамі Дняпроўскай ваеннай флатыліі вызвалілі ад ворага раённы цэнтр Петрыкаў.

У баі за Коржаўку капітан Елкін здзейсніў свой апошні подзвіг. Ён з падраздзяленнем пагранічнікаў рухаўся па правым баку чыгункі. На подступах да вёскі шлях перапыніў варожы кулямётчык. Некалькі адчайных спроб знішчыць агнявую кропку ворага не далі поспеху. Гінулі байцы. Тады капі-

Брацкая магіла воінаў Чырвонай Арміі ў Петрыкаве, якія загінулі ў 1941—1945 гг.

тап Елкін дзе кароткімі перабежкамі, дзе паўзком наблізіўся да кулямёта, але ў апошнія хвіліны быў цяжка паранены. Усё ж ён знайшоў сілы, каб падняцца, кінуцца на ворага і штыком прыкончыць кулямётчыка. Шлях наступаўшым быў адкрыты цаной жыцця героя.

...Пасля вайны я доўга шукаў звесткі пра капітана Елкіна — ведаў толькі яго прозвішча і званне. Адказ прыйшоў з Цэнтральнага архіва пагранічных войск, затым з Кастрамы. Стала вядома, што Канстанцін Паўлавіч Елкін быў земляком легендарнага Івана Сусаніна. Нарадзіўся ён у 1907 г. у в. Гульнава Сусанінскага раёна Кастрамской вобласці, з 1927 г. — на вайсковай службе. Кароткім быў яго ўдзел у Айчыннай вайне, але з першага дня яе афіцэр-пагранічнік, як і яго легендарны зямляк, паказаў сябе сапраўдным патрыётам, мужным і адважным воінам.

Медыкі ў баявым страі

У сярэдзіне ліпеня 75-я стралковая дывізія вяла цяжкія баі на Петрыкаўшчыне. Параненых дастаўлялі ў шпіталь, створаны на базе Петрыкаўскай раённай бальніцы. Увесь медыцынскі персанал быў мабілізаваны на выратаванне жыцця нашых воінаў. Самаадданана працавалі ўрачы Духноў, Ракаўшчык, Красільшчык, Шаніра, медработнікі Марыя Кароль, Наташа Лапета, лабарантка Сцепанькова і іншыя работнікі 110-га медсанбата дывізіі.

27 ліпеня каля аперыцыйнай спынілася аўтамашына з параненымі. Шафёр Рыгор Пінчук далажыў, што прывёз цяжкапараненых байцоў 34-га палка. Медсёстры Марыя Кароль і Наташа Лапета пачалі падрыхтоўку да аперацыі, тэрмінова выклікалі хірурга Лапцейку. Першым на аперацыйны стол паклалі цяжкапараненага камандзіра аддзялення Найдзёна, былога старшыню калгаса «Сейбіт». На жаль, выратаваць яго не ўдалося... Ён здзейсніў сапраўдны подзвіг на адным з каналаў рыбгаса «Чырвоная Зорка», дзе воіны сустрэлі фашыстаў агнём. Двойчы гітлераўцы пад прыкрыццём бронетранспарцёра хадзілі ў атаку, але беспаспяхова. Найдзён павёў салдат у контратаку. З гранатай кінуўся да бронетранспарцёра, пачуўся выбух... Пяхота фашыстаў адступіла, але хутка зноў пайшла ў атаку. Камандзір аддзялення атрымаў смяротнае раненне.

Нашы войскі адступалі. Камандзір медсанбата Контараў і камісар Манахаў далі каманду старшыні медслужбы Івану Дубіку рыхтавацца да эвакуацыі. Хірург Іваноў, аперацыйны фельчар Пікалаеў і Мітрафан Семечка рыхтавалі ў гэты час да аперацыі цяжкапараненага капітана Люціна. Раптам пачуўся гул матораў самалётаў. Фашысцкія сцярвятнікі палівалі агнём мірных жыхароў, потым наляцелі на калону аўтамашын з раненымі байцамі, пачалі скідваць бомбы. Адна з іх разарвалася зусім блізка ад аперацыйнай.

Асколкам быў забіты капітан Лошін, хірург Іваноў кантужаны. Мітрафан Семечка паранены асколкамі ў плячо і шыю. Медсанбат у гэты дзень эвакуіраваўся далей на ўсход, у раён хутароў Гараваха.

В. М. Чарнобылец

«Білі і біць будзем!..»

Гамолка Мікалай Іванавіч (н. 11.3.1922 г. у в. Брыпёў) — беларускі пісьменнік, аўтар многіх дзіцячых і фантастычных аповесцей і раманаў. Закончыў філалагічны факультэт Белдзяржуніверсітэта, у гады вайны — у Чырвонай Арміі. Першыя вершы надрукаваў у 1937 г. Многія творы пісьменніка прысвечаны подзвігу народа ў Вялікай Айчыннай вайне — аповесці «Лясная крэпасць», «Сокалы-сакаляняты», «Дзяўчына ішла на вайне», «Партызанскія сёстры», аповесці «Лета ў Калінаўцы», «Добры дзень, школа», фантастычны раман «Шосты акіян». Неаднаразова яны выдаваліся на рускай і іншых мовах.

Памёр М. І. Гамолка ў 1992 г.

...У Талашовай хаце, якая двума вокнамі глядзіць на раку, таксама сядзелі без святла, гаманілі ціха, прыглушана. Змітрок, меншы дзедаў сын, вярнуўся з Петрыкова і прыпёс навіны. Але яны былі няўцешныя, горкія, як палын-трава. Змітрок сутыкнуўся там з немцамі.

— Дык, кажаш, іх у гарадку поўна?.. — спытаў Талаш, пыхкаючы люлькай. Сядзеў ён за сталом, каля акна, якое глядзелася на Прыпяць, быў у белай кашулі, перахопленай раменьчыкам.

— Бацько, у іх — танкі... Ты не бачыў іх танкаў, во дзе страхоцце. Так што да іх зубоў не вельмі дастанеш.

— Танкаў і ў нас многа...

— А ў нас во тут нідзе нямашака.

— Можа, спецыяльна прытрымліваюць. А патом...

— Пешта не верыцца, тато. То чаму ж на глум етым гадам аддаюць нашу зямлю. Чуў у Петрыкове, што Мінска ўжо няма, забралі. Бомбаў насыпалі на яго, гарыць... Могуць і Петрыкоў спаліць. Гітлеру стаму як двойчы два.

Талаш зноў адмоўна пакруціў галавой.

— Не, сыпу,— праз хвіліну з глыбокай самотнасцю адказаў ён.— Мінска не спаляць. Бачыў яго, ён увесь каменны. А камень, хлопча, не гарыць. Яго можна хіба што скрышыць.— Памаўчаўшы, зноў загаварыў.— І шчэ скажу: тое, што ты чуў, ето, хлопчэ, плёткі. Нехто хочэ, каб нам было горай, каб мы спудзіліся і пабеглі. А калі чалавека апаноўвае страх і ён бяжыць, спыніць яго ой як цяжка. Ты ж, відаць, чуў: палахліваму і мыш — мядзведзь... Заўтра пайду ў Петрыкоў,— нечакана ціха і рашуча абвясціў дзед.

— Во яно як! — аж усклікнуў Змітрок.— Які там у цябе за клопат?

— Немцаў хачу пабачыць, танкі іхнія.

— Невялікая радасць... Ды яны і самі сюды прыйдуць. Навошта табе ногі свае старыя вярэдзіць? Прыйдуць, ты толькі рыхтуйся. Стажок твой зруйнуюць, як піць даць, у кубел з салам заглянуць, карову адбяруць і вепрука ў прыдачу. Яны спрытныя — на танках і матацыклетках...

На золку, як заўсёды, дзед пайшоў на Прыпяць. На беразе стаяў чалавек і з цікавасцю разглядаў яго.

— Дзеду,— сказаў чалавек, яшчэ зусім малады. На ягоных ботах серабры-

В. І. Талаш і сакратар ЦК КПБ Цімох Гарбуноў сярод лётчыкаў

ліся шпоры, і Талаш здагадаўся, што перад ім кавалерыст.— Ты не палохайся. Трэба дапамога...

— А што такое, дзеткі? — дзед скокнуў уніз, апынуўся побач з чырвонаармейцам.

— Патрэбна лодка. Нам трэба туды, на другі бераг...

Пад расахатым старым дубам, які бліжэй за іншыя знаходзіўся ад маяка, сядзела купка вайскоўцаў. Адзін з іх адразу ўстаў, напраўляючы партупею.

— Добры вечар, дзядзька! — выйшаў наперад камандзір.— Нам, дзядзька, патрэбна неадкладная дапамога. Ён, відаць, вам ужо сказаў...

За плячыма камандзіра бачылася яшчэ чацвёра з карабінамі і шашкамі. Адразу кідаліся ў вочы параненыя: у шыракатварага байца забінтавана галава, глядзіць адным вокам, а далей зусім маладзенькі баец падкурчыў правую нагу, пакалыхвае яе, відаць, каб суцішыць боль.

— Пры шашках і шпорах,— заўважыў дзед.— А дзе ж ето вашы коні?

— Пра гэта, дзядзька, потым. Нам трэба пераправіцца цераз раку.

— Перавязу, калі ето так шльно трэба,— пацвердзіў сваю згоду дзед.— Ох, настаў час... І што ж ето такое? Да вума не прыкладу. Вы ўцякаеце нібыто?

— Не ўцякаем, а адступаем, дзядзька. Ты нас вінаваціш? А мы, зразумей, ні ў чым не вінаватыя.

Камандзір махнуў рукой, і байцы, што сядзелі пад дубам, усталі.

— Усе за мной! — прыцішана сказаў камандзір.— Уніз, да ракі! — сам ён крута павярнуўся і, падтрымліваючы шашку, рушыў услед за Талашом.

У лодцы запанавала цішыня. Чырвонаармейцы сумна пазіралі на цёмную раку.

— Калі стакая заварылася каша,— разважаў, вяслуючы, дзед,— мабуць, тут не абыдзецца без мяне. Трэ неяк памагчы... Яны, ворагі, не дачакаюцца, каб Талаш залез на печ і з той печы, шібыта з нейкай гары, назіраў за вайной. Трэ, як і тады, у грамадзянскую, браць ружжо і падавацца ў лес. І з лесу, з засады, лупцаваць гадаў, каб ажно дым каромыслам...

Мікола Гамолка

Хмары над краем

Мая родная вёска Кашэвічы была спалена 2 жніўня 1941 г., калі пра партызан яшчэ і не чулі. Няпраўда, што знішчэнне насельніцтва фашыстамі было справацыравана іх дзейнасцю, быццам нямецка-фашысцкія захопнікі нібы вымушаны былі ажыццяўляць акцыі знішчэння мірнага насельніцтва ў адказ на разгром гітлераўскіх гарнізонаў, падрыў мастоў, пуск пад адхон эшалонаў, пакарапне гаўляйтэра Кубэ і інш.

У той дзень у вёску прыехалі на веласіпедах восем гітлераўцаў з франтавой разведкі. Яны цяжка паранілі чырвонаармейца, які разам з чатырма іншымі байцамі вёў назіранне за палётам самалётаў. Неўзабаве да першай групы немцаў далучылася больш салдат. Раптам з-за высокага чыгуначнага насыпу праз пераезд выскачыў грузавік, а за ім другі. Гэта рухаўся знішчальны атрад лейтэнанта Любацава. Чырвонаармейцы адкрылі агонь з кулямёта і вінтовак па гітлераўцах. Тыя не чакалі нападу, кінуліся ўцякаць, але кулі даганялі іх. Пад нашай прызбай ляжаў забіты немец... Знішчыўшы разведку, машыны ад'ехалі за пераезд, але адна з іх загрузла ў пяску ў канцы вёскі. У гэты час з'явіліся гітлераўцы з перадавога атрада наступаючых войск. Яны адкрылі агонь па чырвонаармейцах. Нямецкі самалёт каршуном кружыў над вёскай. Бой працягваўся некалькі гадзін. Раз'юшаныя фашысты вырашылі пакараць сялян. Яны расстралялі дзесяць ні ў чым не вінаватых жыхароў вёскі, спалілі датла ўсе пабудовы. У чым правініліся мірныя людзі? Гэта ажыццяўляўся генеральны план «Ост», які быў распрацаваны фашысцкімі стратэгамі пасля нападу на Савецкі Саюз. А. Адамовіч, Я. Брыль і У. Калеснік

у кнізе «Я з вогненнай вёскі...» прыводзяць вытрымкі з тых дакументаў. «Згодна з планам прадугледжваецца высяленне 75 працэнтаў беларускага насельніцтва з займаемай тэрыторыі... Пад выглядам барацьбы з партызанамі — знішчаць, знішчаць, знішчаць насельніцтва. Каб на потым меней працы засталося»...

Пакуты жыхароў Кашэвіч і навакольных вёсак на гэтым не скончыліся. Праз вёску рухаліся на ўсход нямецкія войскі, у Яўсеевічах (яго называлі Малое сяло, Кашэвічы — Вялікае сяло) была размешчана камендатура. З усяго раёна па загаду каменданта сюды ішлі рэгістравацца дарослыя мужчыны. Многія з іх не вярнуліся дамоў: за царквой і могілкамі каля чыгуначнага насыпу расстрэльвалі падазроных, савецкіх актывістаў, палонных чырвонаармейцаў. Іх трымалі ў царкве, ператворанай у турму, не дазвалялі выходзіць нават па патрэбе. Кашэвіцкая царква — каштоўны архітэктурны помнік (пабудавана ў 1642 г.) была разрабавана, пакінута на здзек.

Камендатура выдала загад аб перапісу насельніцтва. «Грамадзяне абодвух палаў ад 16 гадоў павінны прайсці прапіску. Тым, хто не мае пашпартоў, атрымаць пасведчанне аб прапісцы з камендатуры. Асобы, затрыманыя без пашпарта ці пасведчання, будуць расстрэльвацца»...

Добраахвотна мала хто ішоў на прапіску, толькі па прымусу акупацыйных улад і карнікаў, ад якіх дарослае насельніцтва ўцякала ў лес. Сяляне дапамагалі чырвонаармейцам, якія выходзілі з акружэння, прадуктамі, адзеннем. Калгаснік з Лучыцкага сельсавета Л. Ходзька вывеў роту чырвонаармейцаў за лінію фронту[1].

Фашысты жорстка распраўляліся з мірным насельніцтвам, асабліва з савецкімі актывістамі. Яны зверскі закатавалі сакратара Бобрыцкага сельсавета Івана Лаворчыка, старшыню Кашэвіцкага калгаса імя Чапаева Цярэшчанка, забілі старшыню Піцкага сельсавета Аляксея Дуброва разам з сям'ёй і многіх іншых.

Трагічна скончылася жыццё 30-гадовай Алёны Маставой. Яна наведвала царкву, шчыра малілася, верыла ў бессмяротнасць душы, імкнулася жыць па хрысціянскіх запаведзях. Не раз яна гаварыла, што гатова на пакутную смерць за хрысціянскія ідэалы і справядлівасць. Як і яе брат, Віктар Маставы, не сумнявалася ў канчатковай перамозе нашага народа над нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Фашысты даведаліся, што Алёна Назараўна аказвала медыцынскую дапамогу раненым чырвонаармейцам, знайшлі ў хаце санітарныя насілкі. Ёй адрэзалі грудзі, білі да страты прытомнасці, патрабавалі выдаць партызан. Аднак жанчына нічога не сказала, яна прыняла пакутлівую смерць...

А. С. Фядосік

Петрыкаўшчына партызанская

Германскія войскі шалёна рваліся на ўсход, Чырвоная Армія ў гарачыя летнія дні 1941 г. вяла жорсткія баі. У савецкім тыле ў тэрміновым парадку спецыяльныя атрады аднаўлялі ўздоўж былой польскай граніцы доты, якія былі ўзарваны і засыпаны зямлёй у 1939 г. як непатрэбныя. Палеская вобласць да часу набліжэння немцаў да яе межаў мела на заходняй граніцы ўмацаваны рубеж, што дало свае станоўчыя вынікі ў час абаронных баёў супраць наступаючага нямецкага 35-га армейскага корпуса. Абарону раёна трымала 75-я стралковая дывізія 4-й арміі пад камандаваннем генерал-маёра С. Нядзвігіна, якая прабілася з акружэння з-пад Брэста, Дняпроўская ваенная флатылія

[1] НГА Беларусі, ф. 3500, воп. 4, с. 221, л. 85.

і знішчальныя атрады. У сярэдзіне ліпеня баі вяліся на заходняй частцы вобласці ўздоўж былой польскай граніцы на тэрыторыі Тураўскага і Жыткавіцкага раёнаў. 18 ліпеня невялікія механізаваныя групы ворага спрабавалі пранікнуць на тэрыторыю Капаткевіцкага раёна, але былі адкінуты часцямі Чырвонай Арміі і знішчальным батальёнам. Перад кіраўніцтвам Капаткевіцкага і Петрыкаўскага раёнаў паўстала задача арганізацыі партызанскіх атрадаў. Яшчэ да акупацыі ў Петрыкаўскім раёне была створана падпольная група на чале з першым сакратаром райкома партыі Х. І. Варгаўцікам, у Капаткевіцкім — пад кіраўніцтвам старшыні райвыканкома А. Ц. Міхайлоўскага.

На захопленай тэрыторыі гітлераўцы адразу пачалі ствараць свой «новы» парадак. Беларусь, якую немцы называлі «генерал-бецырк Беларутэнія», распаласавалі на кавалкі. У заходняй частцы была ўтворана правінцыя Остзюйдпрусэн, усходняя частка называлася вобласцю армейскага тылу, паўднёвая, у тым ліку і Петрыкаўшчына, увайшла ў рэйхскамісарыят Украіны. На гэтай тэрыторыі былі створаны чатыры гебітскамісарыяты: Мазырскі (куды ўваходзіў Капаткевіцкі раён), Васілевіцкі, Ельскі і Петрыкаўскі. У райцэнтрах ствараліся раённыя ўправы, на тэрыторыі сельсаветаў — воласці. З першых дзён вайны акупанты прыступілі да масавага знішчэння людзей, вялася настойлівая антысавецкая прапаганда.

Насельніцтва паўсюдна аказвала супраціўленне новым парадкам, уздымалася на барацьбу з ворагам. Створаны ў ліпені 1941 г. Петрыкаўскі партызанскі атрад прымаў удзел у баявых аперацыях сумесна з 75 й дывізіяй. Пасля адыходу нашых войск атрад ваяваў самастойна. На тэрыторыі акупіраванага раёна па заданню камандавання Заходняга фронту дзейнічала група савецкіх байцоў на чале з сяржантам В. Гардзіенкам, затым групы Х. Варгаўціка і В. Гардзіенкі зліліся ў адзін атрад.

Пасля бою. Партызаны 150-й брыгады імя Ф. М. Языковіча (стаіць крайні справа начальнік штаба брыгады М. І. Гардзіенка)

Ім былі затоплены два нямецкія катэры на Прыпяці, парушалася тэлефонная і тэлеграфная сувязь, рабіліся напады на ворага з засад. У адной з сутычак з немцамі каля в. Турбінка загінуў сакратар Петрыкаўскага падпольнага райкома КП(б)Б Х. Варгаўцік. У кастрычніку атрад распаўся, частка партызан вярнулася дамоў, некаторыя накіраваліся праз лінію фронту да Чырвонай Арміі, іншыя ўліліся ў атрад Ц. Бумажкова. З 21 кастрычніка перастаў існаваць і Петрыкаўскі падпольны райком партыі.

6 жніўня 1941 г. быў апублікаваны Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб прысваенні вышэйшай узнагароды краіны першым героям Вялікай Айчыннай вайны. Першым значыўся былы старшыня Петрыкаўскага райвыканкома Ц. П. Бумажкоў. Лістоўка з Указам выпадкова трапіла ў рукі ста-

рэйшага брата Бумажкова Макара Піменавіча. 121-я стралковая дывізія, у якой ён служыў у Бабруйску, уступіла ў бой з ворагам у першыя дні вайны і была разбіта ў раёне Слоніма, лейтэнант Макар Бумажкоў амаль два месяцы змагаўся ў акружэнні. Даведаўшыся пра лёс брата, ён вырашыў ісці да яго ў Петрыкаўскі раён, куды прыязджаў у госці напярэдадні вайны. Макар Піменавіч знайшоў атрад брата ў Акцябрскім раёне, але самога яго не застаў, Ціхан Піменавіч да гэтага часу быў адазваны ў Маскву, прызначаны начальнікам палітаддзела дывізіі і загінуў у верасні 1941 г. у час пераправы праз р. Сулу ў Палтаўскай вобласці. Макар Піменавіч застаўся ў тыле ворага, група ў 17 чалавек, якую ён узначальваў, выросла ў партызанскі атрад. Неаднаразова ён змагаўся разам з петрыкаўскімі і капаткевіцкімі партызанамі — у разгроме варожага гарнізона ў Бярозаўцы, узрыве чыгуначнага маста праз Пціч восенню 1942 г. і ў многіх іншых аперацыях і дыверсіях. З атрада М. П. Бумажкова выдзелена ў верасні 1942 г. ініцыятыўная група, якая склала ядро партызанскага атрада І. В. Дубіка.

Створаны 17 жніўня ў Церабаўскім сельсавеце Капаткевіцкі партызанскі атрад з байцоў знішчальнага батальёна пачаў наносіць удары па ворагу з пачатку акупацыі. Першай буйнай аперацыяй было знішчэнне лесапільнага завода і склада боепрыпасаў у в. Філіпавічы, якой кіравалі А. Карпейчык і М. Гардзіенка. У кастрычніку гэты атрад таксама быў расфарміраваны. Партызанскі рух, які ўзнік адразу пасля акупацыі на тэрыторыі раёна, да канца 1941 г. пачаў затухаць. У партызанскіх атрадах было шмат байцоў Чырвонай Арміі, якія з цягам часу накіроўваліся да лініі фронту. У партызан не было вопыту, узбраення, ім супрацьстаяў моцны, добра ўзброены вораг, да таго ж набліжаліся зімовыя халады. Страцілася сувязь з партыйнымі і савецкімі органамі, некаторыя людзі разгубіліся і пакідалі партызанскія атрады. Але знікнуць зусім партызанскі рух не мог, нянавісць да ворага расла і мацнела. Да рашучых баявых дзеянняў партызан супраць ворагаў заклікаў 99-гадовы дзед Талаш, словы якога далёка разносіліся па партызанскай Беларусі. Ужо ў студзені 1942 г. аднавіўся Капаткевіцкі партызанскі атрад, створаны з груп А. Міхайлоўскага, Я. Кліменценкі, А. Жыгара, Стральцова-Юрасава, А. Вырвіча. Ён быў перададзены ў склад «Гарнізона Паўлоўскага» ў Акцябрскі раён. Гэта была буйная баявая адзінка, у лютым 1942 г. «гарнізон» налічваў 1300 чалавек. Ф. Паўлоўскі звязаўся з Цэнтральным штабам партызанскага руху ў Маскве і атрымаў указанне падпарадкавацца Мінскаму абкому партыі на чале з В. Казловым. У 1942 г. з атрадаў «гарнізона» ствараецца брыгада Ф. Паўлоўскага, у склад якой уваходзіў атрад А. Міхайлоўскага. Атрад хутка рос, у лінені з яго вылучылася група Балотнікава (І. Глушко) у колькасці пяці чалавек і накіравалася ў Петрыкаўскі раён для арганізацыі новага партызанскага атрада. Такі атрад быў арганізаваны ў жніўні 1942 г., штаб яго знаходзіўся ў в. Бобрык. Да студзеня 1943 г. атрад дзейнічаў самастойна, ён налічваў 125 чалавек. У кастрычніку з ініцыятыўнай групы М. Бабкова і І. Дубіка, якая была вылучана ў верасні 1942 г. у колькасці 15 чалавек з атрада Ц. Бумажкова, створаны атрад М. Бабкова. Зонай дзеяння яго былі в. Кашцэвічы, Рабка, Церабень, Падоссін.

Партызанская барацьба нарастала. 15 студзеня 1942 г. атрад Далідовіча разграміў паліцэйскія гарнізоны ў вёсках Камаровічы і Навасёлкі. 17 студзеня нечаканым ударам двух партызанскіх атрадаў — Далідовіча і «Чырвоны Кастрычнік» — быў разбіты гарнізон у Капаткевічах, які налічваў каля 100 немцаў і паліцаяў. Каля 60 з іх было забіта, толькі частцы ўдалося ўцячы на ст. Пціч. Захоплена зброя, 200 скрынак з боепрыпасамі, 100 тон хлеба, 10 бочак мёду. У атрад Міхайлоўскага ўлілося шмат добраахвотнікаў. 17 лютага сумесна з атрадам Паўлоўскага быў разгромлены паліцэйскі гарнізон у в. Васласовічы. У ноч на 23 лютага 1942 г. атрады Міхайлоўскага, Каваленкі, Чырліна і Жулегі пад кіраўніцтвам С. Маханько на ст. Муляраўка знішчылі 29 нямецкіх салдат, 8 здаліся ў палон. Станцыя была спалена. У гэтым баі адзін партызан загінуў і двое было паранена. Гэта быў падарунак партызан да свята 24-й гадавіны Чырвонай Арміі. 22 мая атрад Міхайлоўскага, які дзейнічаў у раёне Петрыкава, нечаканым ударам па ворагу знішчыў 58 фашыстаў, захапіў 2 кулямёты і 30 вінтовак.

У красавіку 1942 г. у г. Петрыкаве створана камсамольска-маладзёжная

падпольная арганізацыя, якой кіраваў Ф. Кляўцоў. У яе ўваходзілі Сцяпан Грабінецка, Лідзія Чарнобылец, Мікалай Каржаноўскі, Іван Сцебуноў, Адольф Уладычанскі, Васіль Чарнобылец, Марыя Петравец, Юрый Бажок. С. Грабінецка прымаў па радыё зводкі Саўінфармбюро, падпольшчыкі распаўсюджвалі сярод насельніцтва лістоўкі. З восені 1942 г. падполле было цесна звязана з партызанамі і выконвала заданні камандавання атрадаў Балотнікава і Бабкова. У жніўні 1942 г. члены арганізацыі падпалілі лесасклад у Капцэвічах, згарэла і сховішча паліва. 29 студзеня 1943 г. Л. Чарнобылец узарвала гебітскамісарыят у Петрыкаве.

Дыверсійная група партызанскага атрада Балотнікава 8 верасня 1942 г. на ўчастку чыгункі Коржаўка – Пціч падарвала варожы эшалон, 16 вагонаў пайшлі пад адхон. Дыверсійная група В. Вялігіна з Капаткевіцкага атрада 15 кастрычніка ўзарвала чыгуначны састаў на ўчастку Жыткавічы – Старушкі. Паравоз сышоў з рэек, паліва з 35 цыстэрнаў вылілася. 17 кастрычніка на ўчастку Старушкі – Капцэвічы падарваны эшалон з 5 пасажырскіх, 3 таварных вагонаў і 2 платформ. З двух бакоў была ўзарвана чыгунка і сапсавана сувязь. Паміж гітлераўцамі і партызанамі завязаўся бой, які цягнуўся каля гадзіны... Усе аперацыі і дыверсіі партызан на чыгунцы цяжка пералічыць. Вялікі ўрон ворагу нанесла дыверсійная група, затым атрад Р. Такуева. Найбольш бліскучай і складанай партызанскай аперацыяй у 1942 г. быў узрыў чыгуначнага маста на р. Пціч, у выніку якога рух па чыгунцы ў час напружаных баёў у Сталінградзе спыніўся на 18 сутак. 7 партызан загінула, 12 было паранена, вораг панёс значна большыя страты. Многія ўдзельнікі аперацыі былі адзначаны ўрадавымі ўзнагародамі.

У 1942 г. на бок партызан пачалі пераходзіць славацкія салдаты і афіцэры, якіх гітлераўскае камандаванне накіравала для аховы чыгункі на Палессі. Яны адчувалі даўнюю братнюю славянскую дружбу з беларускім народам, спачувалі насельніцтву, часта не перашкаджалі партызанам выконваць баявыя заданні. У Жыткавічах, Старушках, Капцэвічах, Мулярaўцы, Пічычы, Капаткевічах, Хойніках размясціўся 101-ы полк. Штаб палка знаходзіўся ў Петрыкаве, начальнікам штаба яго быў Ян Налепка (Рэпкін). У чэрвені 1942 г. ён звязаўся з атрадам Міхайлоўскага. Першая група славакаў – 35 чалавек – перайшла да партызан у в. Камаровічы 15 верасня, затым пераход набыў масавы характар. Да лютага 1943 г. у партызанах было ўжо звыш 180 славакаў. У асноўным яны змагаліся ў атрадах Міхайлоўскага і Краўца. Была сфарміравана славацкая рота, якая ўвайшла ў склад Капаткевіцкай брыгады. Разам з народнымі мсціўцамі славакі грамілі варожыя гарнізоны ў Залессі, Навасёлках, Галоўчыцах, Чалопчавічах, Праходах, Філатаўцы і іншых вёсках, узарвалі чыгуначны мост на р. Бобрык, нападалі на абозы каля Мышанкі і Міхедавіч, пускалі пад адхоны цягнікі на ўчастку Пціч – Жыткавічы. Каб спыніць пераход славакаў да партызан, нямецкае камандаванне перакінула 101-ы полк на чыгунку Ельск – Корасцень.

15 сакавіка 1943 г. было створана Палескае партызанскае злучанне, якое аб'ядноала 21 атрад, што дыслацыраваліся ў Акцябрскім і Капаткевіцкім раёнах. Узначаліў падпольны абком партыі, створаны ў лютым 1943 г., і партызанскае злучэнне Ф. М. Языковіч. Абком і штаб злучэння размяшчаліся ў в. Камаровічы.

Стварэнне ў 1943 г. чатырох партызанскіх брыгад – 130-й Петрыкаўскай, 120-й і 125-й Капаткевіцкіх і 150-й брыгады імя Ф. М. Языковіча – сведчыць аб тым, што партызанскі рух у раёне насіў масавы характар. Для кіраўніцтва партызанскай і масава-палітычнай работай у красавіку 1943 г. створаны Петрыкаўскі і Капаткевіцкі падпольныя райкомы партыі. Петрыкаўскі райком узначаліў І. Скалабан, Капаткевіцкі – А. Міхайлоўскі. Крыху раней пад кіраўніцтвам сакратара ЦК ЛКСМБ К. Мазурава былі створаны падпольныя райкомы камсамола. Капаткевіцкі падпольны райком ЛКСМБ, які прыступіў да работы 8 кастрычніка 1942 г., знаходзіўся ў 125-й брыгадзе. Узначаліў райком Франц Плавінскі. Петрыкаўскі падпольны райком ЛКСМБ прыступіў да работы 1 студзеня 1943 г.

Камандаванне 125-й Капаткевіцкай партызанскай брыгады

У пачатку вясны 1943 г. у в. Старына сакратар ЦК КП(б)Б М. Аўхімовіч правёў нараду з работнікамі падпольнага друку. Пачалі выдавацца падпольныя раённыя газеты — Петрыкаўская «Сталінская праўда» (рэдактар А. Курапаценка) і Капаткевіцкая «Бальшавік» (рэдактар Т. Ганусевіч). У раёне друкавалася таксама падпольная абласная газета «Бальшавік Палесся».

Партызаны часта выратоўвалі мірнае насельніцтва. 7 сакавіка 1943 г. на дарозе Грабаў — Вятчын разведкай з атрада Балотнікава было вызвалена мірнае насельніцтва, якое акупанты гналі для вывазу ў Германію. 5 немцаў было забіта, людзі ўцяклі ў лес. Партызаны брыгады А. Жыгара ў пачатку сакавіка 1943 г. не дапусцілі знішчэння вёсак Міхедавічы і Бобрык. 26—27 мая атрад Балотнікава яшчэ раз адстаяў Міхедавічы ад знішчэння карным атрадам, які налічваў 300 салдат і афіцэраў. У час бою было знішчана 35 гітлераўцаў.

Новым этапам партызанскага руху стала рэйкавая вайна. Сіламі 125-й Капаткевіцкай брыгады ў адну ноч на 7 жніўня 1943 г. на ўчастку чыгункі Жыткавічы — Калінкавічы было перабіта 63 рэйкі, а з 3 па 7 жніўня на гэтым участку — 186 рэек. На ўчастку чыгункі Старушкі — Бабруйск (гэтая чыгунка не аднавілася) было разбурана 5860 м чыгуначнага палатна. Усяго брыгадай за жнівень 1943 г. было ўзарвана 734 рэйкі і пушчаны пад адхон цягнік. Пасля масіраваных удараў па чыгункі у немцаў не хапала ні матэрыялаў, ні рабочай сілы на яе аднаўленне. Рух на ўчастку Жыткавічы — Калінкавічы быў паралізаваны, а чыгунка Бабруйск — Старушкі да канца жніўня 1943 г. была поўнасцю выведзена са строю.

Другі этап рэйкавай вайны пад кодавай назвай «Канцэрт» пяцігуўся з 19 верасня да лістапада 1943 г. Толькі 130-й Петрыкаўскай брыгадай за кастрычнік 1943 г. было знішчана 44 немцы і 14 паліцэйскіх, пушчана пад адхон 20 эшалонаў, разбіта 109 вагонаў і 34 платформы, сапсавана 18 паравозаў, знішчана 10 танкаў, спалена 11 цыстэрн паліва, перабіта 144 рэйкі, парвана 4 км тэлеграфнай сувязі, спалена 23 масты.

Насельніцтва з акупіраваных вёсак

Камандаванне 150-й партызанскай брыгады імя Ф. М. Языковіча

Набліжаўся 1944 год. Чырвоная Армія падыходзіла да граніц Петрыкаўшчыны. У звароце Палескага абкома КП(б)Б з выпадку 25-годдзя стварэння БССР да партызан і ўсіх жыхароў вобласці, які быў надрукаваны ў газеце «Балыпавік Палесся» 1 студзеня 1944 г., гаварылася: «Паглядзіце на наша Палессе! Здаецца, няма жывога кутка на гэтай квітнеўшай пры Савецкай уладзе зямлі. У зону пустынь ператварылі фашысцкія душагубы... Акцябрскі, Капаткевіцкі, Петрыкаўскі раёны... Па ўсёй вобласці, з краю ў край рэхам разносяцца стогны і енкі абяздоленых немцамі людзей. Яшчэ стогне пад фашысцкай пятой наш абласны цэнтр — г. Мазыр. Яшчэ плачуць абяздоленыя гітлераўскімі душагубамі жанчыны і дзеці ў Петрыкаве, у Тураве і ў Жыткавічах. Яшчэ палыхае агонь пажараў... у Капаткевіцкім раёне... У імя поўнага вызвалення нашай зямлі, у імя нашага шчасця, светлай будучыні нашых дзяцей — мацней агонь па гітлераўскаму звяру!»

ішло ў лес з маёмасцю і жывёлай. Так паступілі жыхары Сотніч, Аголіцкай Рудні, Коржаўкі і іншых вёсак. Сяляне в. Палессе і Барычаў разбурылі тры масты, выкапалі равы і зрабілі завалы на дарогах. Тое ж было зроблена ў Міхедавічах, Бабунічах, Курыцічах.

У студзені 1944 г. 136-ы атрад А. Трухановіча (264 чалавекі) і 138-ы І. В. Дубіка (221 чалавек) злучыліся з часцямі Чырвонай Арміі. У красавіку 1944 г. загінуў І. Скалабан, 130-ю брыгаду ўзначаліў М. Волкаў.

Да сярэдзіны студзеня 1944 г. былі вызвалены першыя населеныя пункты Петрыкаўскага раёна па левым беразе р. Пціч — в. Кацуры, Беседкі, Баянаў, Багрымавічы і іншыя. Камандаванне Палескага злучэння паставіла перад партызанскімі брыгадамі і атрадамі задачу перакрыць шляхі адыходу ворага і ўсімі сіламі перашкаджаць яго адступленню.

Канцэнтрацыя варожых войск павялічвалася. Яны размяшчаліся не толькі ў населеных пунктах, але і ў лясах.

І. І. Маставы

Становішча партызан ускладнялася, весці баявыя аперацыі ў прыфрантавой зоне станавілася ўсё цяжэй. Вораг насядаў на партызанскую зону, прымяняючы авіяцыю, завязаліся жорсткія баі. Зімой карнікі пачалі блакаду 125-й Капаткевіцкай брыгады, яна вяла цяжкія баі да дня вызвалення. Партызаны актыўна вялі разведку варожай арміі. Прыбліжэнне фронту садзейнічала таму, што паліцэйскія гарнізоны пачалі разлагацца, шмат паліцэйскіх пераходзіла да партызан.

Да летняга наступлення Чырвонай Арміі ў чэрвені 1944 г. лінія абароны ворага праходзіла па правым беразе Пцічы, паварочвала на захад і ішла па левым беразе Прыпяці, а ў раёне Навасёлак Петрыкаўскага сельсавета і Петрыкава пераходзіла на правы бераг. Гітлераўскія войскі мелі добра падрыхтаваныя доты, у раёне Петрыкава і Дарашэвіч створаны ўмацаваныя апорныя пункты. Ім супрацьстаяла 61-я армія (генерал лейтэнант П. Бялоў) і частка сіл 28-й арміі (генерал-лейтэнант А. Лучынскі).

Значную дапамогу пры вызваленні Петрыкаўскага і Капаткевіцкага раёнаў аказвалі партызаны. З пачаткам летняга наступлення Чырвонай Арміі партызанскія атрады накіраваліся на знішчэнне чыгуначнага палатна на адрэзку дарогі Калінкавічы — Жыткавічы. Рэйкі ўзрывалі, адкручвалі гайкі і расцягвалі іх. Паспяховыя аперацыі былі праведзены пад Курыцічамі, каля ст. Пціч. Атрад Бабкова разграміў вялікую групу гітлераўцаў з Капцэвіцкага і Петрыкаўскага гарнізонаў. Атрад Мядзведзева напаў на варожы абоз па дарозе Грабаў — Сялюцічы і вызваліў ад угону ў Германію больш за 150 хлопцаў і дзяўчат. Атрад Арцюха рашуча дзейнічаў каля Муляраўкі і Смятаніч. Партызаны на заключным этапе сваёй гераічнай барацьбы з нямецка-фашысцкімі акупантамі ўнеслі значны ўклад у іх выгнанне з тэрыторыі раёна, у канчатковы разгром ворага.

У. А. Браім

З першых дзён вайны

Для арганізацыі барацьбы з акупантамі ў тыле ворага з першых дзён вайны пачалі стварацца падпольныя групы і партызанскія атрады. На акупіраванай тэрыторыі было пакінута 45 чалавек — членаў КП(б)Б і савецкіх работнікаў, спіс якіх быў зацверджаны на бюро Палескага абкома партыі. Зацверджаны таксама Петрыкаўскі падпольны РК КП(б)Б. У яго ўвайшлі першы сакратар райкома партыі Х. І. Варгаўцік, другі сакратар І. К. Талкачоў, рэдактар раённай газеты І. І. Альшэўскі, начальнік райаддзела міліцыі А. П. Жукаў і намеснік начальніка райаддзела Малчанаў. Для арганізацыі падпольнай работы ў тыле ворага і падрыхтоўкі матэрыяльнай базы партызанскіх атрадаў створана тройка, у склад якой увайшлі Варгаўцік, Жукаў і Малчанаў. Я быў прызначаны камандзірам партызанскага атрада, камісарам зацверджаны старшыня райвыканкома І. Г. Зобаў. Хутка ён захварэў і быў эвакуіраваны, а камісарам прызначаны С. І. Сакалоўскі. У жніўні 1941 г. І. І. Альшэўскі быў камандзіраваны ў раён Мазыра для вываду групы афіцэраў і салдат-акружэнцаў з мэтай злучэння з рэгулярнымі часцямі. Ён выбыў са складу падпольнага райкома партыі, членам райкома замест яго зацверджаны камісар партызанскага атрада С. І. Сакалоўскі. Партыйныя білеты камуністаў, якія заставаліся змагацца з ворагам на акупіраванай тэрыторыі, былі адабраны на захаванне ў партархіў ЦК КП(б)Б.

В. І. Гардзіенка

М. Ф. Бабкоў

Да ядра будучага партызанскага атрада далучаліся камсамольцы і беспартыйныя, работнікі савецкіх органаў і актывісты, супрацоўнікі НКУС і міліцыі. Хутка ў ім налічвалася каля 100 чалавек, потым улілася група чырвонаармейцаў, салдат і афіцэраў, якія выходзілі з акружэння. Да атрада далучыліся таксама група аператыўных работнікаў з раёнаў Заходняй Беларусі, а таксама група з Жыткавіцкага раёна пад камандаваннем Кавалеўскага. Партызанскі атрад дыслацыраваўся ва ўрочышчы Зялёны мох, ля леснічоўкі непадалёку ад в. Асавец і Снядзін. У загадзя падрыхтаваныя сховішчы былі завезены прадукты харчавання і вопратка, а таксама зброя. Наступала восень, народныя мсціўцы рыхтаваліся да сур'ёзнай барацьбы з ворагам.

Першыя баявыя аперацыі — разведка і засады на дарогах. Было выкрыта і ліквідавана некалькі здраднікаў. Партызаны рабілі налёты на варожыя гарнізоны ў Глінішчах, Снядзіне, Майсеевічах, Асаўцы. У канцы лета атрад перабраўся праз р. Прыпяць каля в. Ляскавічы і рушыў у напрамку Капцэвіч. Гэта нарабіла нямала перапалоху сярод гітлераўцаў. Сілы партызан былі значна перабольшаны, акупанты пакінулі Петрыкаў, Капцэвічы і Капаткевічы.

Нямецкія акупацыйныя ўлады першачарговай задачай ставілі ўзнаўленне камунікацый, сродкаў сувязі, руху параходаў на Прыпяці і Дняпры. Партызаны знішчылі ўсю маёмасць на Прыпяці ад Мазыра да Турава — паромы і катэры, лодкі і бакены. А ў Петрыкаве была разгромлена суднаверф. На берагах ракі рабілі засады, з якіх абстрэльвалі варожыя караблі і баржы. Усяго было знішчана 14 катэраў, разбурана 16 мастоў, парушана звыш 100 км тэлефоннай сувязі.

Найбольш значная аперацыя была праведзена на Прыпяці ў пачатку верасня 1941 г. У сямі кіламетрах ад Петрыкава партызаны зрабілі на беразе засаду. Раніцай паказаўся буксірны катэр з баржай, уся палуба яе была застаўлена бочкамі з палівам. З засады партызаны адкрылі агонь з усіх відаў зброі. Бочкі загарэліся і хутка ўся баржа была ахоплена полымем. Не ўратаваўся і буксірны катэр. Усяго загінула каля 40 ворагаў, знішчана вялікая колькасць ваеннай маёмасці і боепрыпасаў.

У зводцы Саўінфармбюро 17 лістапада 1941 г. паведамлялася: «Партызанскі атрад пад камандаваннем Г., які ўзнік яшчэ ў ліпені, працягвае весці пасяховую барацьбу з нямецкімі акупантамі... У час бою з карным атрадам ворага партызаны знішчылі 12 немцаў. У другім баі было забіта 16 і паранена 10 гітлераўцаў. Партызаны ўзарвалі і патапілі нямецкі параход з ваенным грузам...»

У склад партызанскага атрада ўваходзілі тры ўзводы. Першым узводам камандаваў Яворскі, былы старшыня Грабаўскага сельскага савета. Ён загінуў у баі з ворагамі ў канцы снежня 1941 г. Камандзірам другога ўзвода быў былы дырэктар Капцэвіцкага фанерна га завода «Звязда» А. Зубрыцкі, трэцім узводам камандаваў былы старшыня Петрыкаўскага гарсавета Я. Зарэцкі. Гаспадарчую групу ўзначальваў Я. Палтаран.

У сярэдзіне кастрычніка вораг сабраў значныя сілы, каля 600 гітлераўцаў і паліцаяў. У атрадзе на той час налічвалася 120 чалавек. Пасля цяжкага бою каля в. Турбінка ворагу ўдалося часткова разграміць атрад, захапіць харчовую базу і склад боепрыпасаў. У тым баі загінуў першы сакратар пад-

польнага райкома КП(б)Б Х. Варгаўцік.

Тыя, хто выйшаў з бою, сабраліся 20 кастрычніка на агульны партыйны сход. Для лепшага манеўравання і забеспячэння прадуктамі і боепрыпасамі было вырашана раздзяліць атрад на тры асобныя групы і дзейнічаць кожнай з іх самастойна. Камандзірам першай групы быў зацверджаны Яворскі, другой — А. Зубрыцкі, трэцяй — я. У нашай групе застаўся і камісар атрада С. Сакалоўскі. Яна накіравалася ў бок лініі фронту на тэрыторыі Пінскай і Чарнігаўскай абласцей, дзве астатнія засталіся змагацца з ворагам у Петрыкаўскім раёне.

Цяжкім быў шлях нашай групы на занятай ворагам роднай зямлі. Частымі былі сутычкі з ворагам, даводзілася весці пяроўныя баі, адступаць. Тры партызаны загінулі, было шмат параненых. Позняй восенню ў Дабранскім раёне Чарнігаўскай вобласці сустрэлі разведку ўкраінскага партызанскага атрада, далучыліся да яго і на працягу месяца дзейнічалі разам. Амаль штодня даводзілася адбіваць атакі карнікаў, і мы вымушаны былі перабрацца ў Лоеўскі раён. Там атрад зноў раздзяліўся, наша група перайшла ў лясы Парычскага, затым Хойніцкага раёнаў, дзе дзейнічала да лютага 1942 г. Праз некаторы час яна ўлілася ў атрад імя Суворава Палескага партызанскага злучэння, які 12 снежня 1943 г. злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі.

* * *

Арганізатары партызанскага руху і байцы, якія найбольш вызначыліся ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі з першых дзён акупацыі: Х. І. Варгаўцік, першы сакратар падпольнага РК КП(б)Б; І. К. Талкачоў, другі сакратар, С. І. Сакалоўскі, камісар атрада, А. І. Малчанаў, А. П. Жукаў, І. І. Альшэўскі — члены падпольнага РК КП(б)Б; Яворскі, А. Зарэцкі, А. К. Зубрыцкі — камандзіры ўзводаў, Я. М. Палтарап — начальнік гаспадарчай часткі, партызанскія разведчыкі Т. І. Арцюх, М. В. Корж, А. Піскун, Г. Шусцерман, партызаны А. С. Булаў, М. М. Галіцкі, А. М. Бычкоўскі, І. Т. Сугрэй, Д. Андрук, М. П. Ільіч, А. І. Барабаш, Бажок (загінуў у 1942 г.), Капанчук, А. Калакін (загінуў у Петрыкаве), Л. Жукавец — партызанка, прыйшла ў атрад разам з бацькам, які загінуў у адным з баёў, Афанасьеў, акружэнец, загінуў у баі ў Дабранскім раёне на Украіне.

В. І. Гардзіенка

З верай у перамогу

Міхайлоўскі Анатоль Цімафеевіч (н. у 1898 г.) напярададні вайны працаваў старшынёй Капаткевіцкага райвыканкома. Пасля акупацыі раёна — камандзір партызанскага атрада, сакратар Капаткевіцкага падпольнага райкома партыі. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай Вайны I і II ст., Чырвонага Сцяга.

У Капаткевіцкім раёне партызанскі атрад у колькасці каля пяцідзесяці чалавек быў створаны яшчэ да прыходу гітлераўцаў. 30 ліпеня атрад, якім камандаваў М. І. Гардзіенка, пайшоў на загадзя падрыхтаваную лясную базу. Не ва ўсіх была зброя, неабходныя рэчы для суровых умоў жыцця, але ўсе былі поўныя рашучасці змагацца з ворагам і разграміць яго. Збіралі зброю і боепрыпасы, сустракалі акупантаў з засад, грамілі валасныя ўправы і паліцэйскія ўчасткі, праводзілі масава-палі-

А. Ц. Міхайлоўскі

тычную работу сярод насельніцтва. Атрад пастаянна папаўнялічваўся з ліку патрыётаў — мясцовых жыхароў, чырвонаармейцаў-акружэнцаў.

21 жніўня 1941 г. у в. Навасёлкі партызаны адабралі ў ворага 125 галоў буйной рагатай жывёлы і пераправілі яе праз лінію фронту для Чырвонай Арміі. Праз нскалькі дзён яны ўзарвалі склад боепрыпасаў ворага, знішчылі аўтамашыну і кухню, у перастрэлцы было забіта больш 10 акупантаў. З кожным днём рос аўтарытэт партызан у насельніцтва. Партызанскі рух станавіўся ўсё больш масавым. Атрады раслі колькасна, мацнела іх матэрыяльная і баявая база. Упаўнаважаны ЦК КП(б)Б, сакратар Мінскага падпольнага абкома партыі Р. Н. Мачульскі ў канцы 1942 г. дакладваў у запісцы ў ЦК партыі: «Амаль поўнасцю пайшло ў партызаны насельніцтва вёсак Міхедавічы і Бобрыкі Петрыкаўскага раёна...»

16 студзеня 1942 г. народныя мсціўцы на чале з Героем Савецкага Саюза Ф. І. Паўлоўскім разграмілі варожы гарнізон у Капаткевічах. З гэтага дня я стаў камандзірам партызанскага атрада. Першае яго баявое хрышчэнне — — налёт на в. Пціч, дзе размяшчаўся гарнізон гітлераўцаў. Тады было забіта сем немцаў, у якасці трафеяў мы ўзялі кулямёт, 13 вінтовак і шмат боепрыпасаў. У далейшым здзейснілі некалькі ўдачных аперацый у Акцябрскім раёне, разгромілі паліцэйскія ўчасткі ў в. Міхедавічы, Савічы. Вялікую работу па арганізацыі партызанскай барацьбы, падполля на занятай ворагам тэрыторыі праводзілі С. І. Боеў, Ф. А. Плавінскі, І. І. Кацько, В. А. Перфільеў, Л. Л. Федаровіч.

У лютым 1943 г. на Палессе прыбыў сакратар Палескага абкома КП(б)Б і камандзір партызанскага злучэння Ф. М. Языковіч. Пад яго кіраўніцтвам на акупіраванай тэрыторыі пачалі стварацца падпольныя райкомы партыі. У красавіку 1943 г. быў створаны Капаткевіцкі падпольны райком КП(б)Б, я быў прызначаны яго сакратаром. Пачалася новая старонка барацьбы партызан. Мацнелі рады народных мсціўцаў, актывізаваліся іх баявыя дзеянні. У студзені 1943 г. была створана 125-я Капаткевіцкая брыгада, у ліпені — 130-я Петрыкаўская. У 125-й Капаткевіцкай брыгадзе 1 жніўня 1943 г. налічвалася сем партыйных арганізацый. Мужнымі байцамі зарэкамендавалі сябе многія патрыёты, сярод якіх асабліва вызначыліся У. І. Кулак, А. І. Цалко, В. У. Ключнік, Ф. І. Самбук і многія іншыя.

Не скарыліся ворагу

Волкаў Міхаіл Адамавіч (н. у 1905 г. у в. Сяліцічы) — член Петрыкаўскага падпольнага райкома КП(б)Б, камандзір партызанскага атрада, затым — 130-й Петрыкаўскай партызанскай брыгады. Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, медалямі. Пасля вайны М. А. Волкаў выбраны старшынёй Петрыкаўскага райвыканкома, затым працаваў у саўгасе «Галубіцкі».
Памёр у 1974 г.

...У сярэдзіне жніўня 1941 г. мы пайшлі ў снядзінскія лясы. Сюды павінна было прыбыць кіраўніцтва Свяцілавіцкага райкома партыі і камандаванне ўтвараемага партызанскага атрада. Але ішоў час, ніхто не з'яўляўся. Настрой у людзей падаў, частка партызан накіравалася да лініі фронту, іншыя разышліся па дамах.

Наша невялікая група рухалася ў бок Бранска. Спадзяваліся сустрэць партызан і дзейнічаць разам. Ішлі з вялікай перасцярогай, рызыкуючы наткнуцца на гітлераўцаў. Так і здары-

М. А. Волкаў

лася ў лістападзе 1941 г. у адной невялікай вёсцы ў Арлоўскай вобласці. Уцякаць позна, схавацца няма куды. Прывезлі ў Гомель, у лагер ваеннапалонных, адтуль — у Бабруйск. Увесь час не пакідала думка аб уцёках. Такая магчымасць з'явілася толькі восенню 1942 г. Пасля доўгіх блуканняў па лясах я трапіў да партызан 125-га атрада, які дыслацыраваўся ў в. Заполле Капаткевіцкага раёна. Мяне накіравалі ў разведгрупу, якой камандаваў А. І. Трухановіч, затым я ўзначальваў дыверсійную групу. Першай буйной аперацыяй, у якой мне давялося ўдзельнічаць, быў узрыў чыгуначнага маста праз р. Бобрык паміж станцыямі Капцэвічы — Муляраўка, у выніку якога рух варожых цягнікоў быў спынены больш як на суткі. Шмат у чым нам дапамагалі мясцовыя жыхары — дзяліліся харчаваннем і вопраткай, перадавалі разведданыя. Надзейныя людзі былі амаль ва ўсіх вёсках раёна.

Калі ў ліпені 1943 г. была створана 130-я Петрыкаўская партызанская брыгада, камісарам якой прызначаны камандзір пашага атрада І. Н. Глушко, мяне зацвердзілі камандзірам 125-га атрада. Я быў таксама членам Петрыкаўскага падпольнага райкома КП(б)Б.

Атрад на працягу ўсяго часу існавання быў моцнай баяздольнай і арганізаванай баявой адзінкай. Не раз вызначыліся ў баях з ворагам пры правядзенні аперацый і дыверсій партызаны П. І. Арцюх, І. А. Мялешка, В. І. Чарнобылец, Р. І. Яновіч і многія іншыя. У лістападзе 1943 г. у нашым атрадзе на працягу трох дзён знаходзіўся сакратар абкома партыі М. І. Малінін. Ен гутарыў з байцамі, цікавіўся баявымі аперацыямі, умовамі жыцця і быту.

У пачатку 1944 г. гітлераўцы, рыхтуючыся да абароны, пачалі глыбокую блакаду партызанскай зоны на тэрыторыі Петрыкаўскага і Капаткевіцкага раёнаў. Мы адыходзілі ў напрамку Чорнага балота і востраваў Зыслаў Любанскага раёна. Карнікі насядалі, народныя мсціўцы мужна стрымлівалі націск добра ўзброенага, падрыхтаванага да наступлення ворага. У красавіку гітлераўцы буйнымі сіламі пры падтрымцы танкаў і артылерыі пачалі штурм нашых умацаванняў на астравах Чорнага балота. Сілы былі няроўнымі, баі ішлі вельмі цяжкія. З вялікімі стратамі партызанам удалося вырвацца з вогненнага кольца, бесперапынныя баі і сутычкі з ворагам не спыняліся да самага дня злучэння з часцямі Чырвонай Арміі. У час прарыву блакады без весткі прапаў І. В. Скалабан, які перад гэтым быў пераведзены ў штаб Палескага партызанскага злучэння, я быў прызначаны камандзірам 130-й брыгады.

Адгрымела вайна на тэрыторыі Петрыкаўскага раёна, усё далей на Захад пакаціўся яе вогненны вал. Каля ста былых партызан было пакінута ў тыле для ўзнаўлення разбуранай гаспадаркі. Мяне прызначылі старшынёй Петрыкаўскага райвыканкома, і работы, што дзённых, часта амаль невыканальных клопатаў было столькі, што тут, у тыле, пасля вызвалення было нікольк не лягчэй, чым у партызанах. Трэба было жыць, працаваць, дапамагаць каваць Перамогу...

Падпольныя райкомы КП(б)Б і ЛКСМБ, партызанскія брыгады і атрады, якія былі створаны і дзейнічалі на тэрыторыі раёна ў гады Вялікай Айчыннай вайны

ПЕТРЫКАЎСКІ ПАДПОЛЬНЫ РАЙКОМ КП(б)Б

18.8.1941 г. — 21.10.1941 г., 4.1943 — 6.7.1944 г.

Пасля акупацыі ворагам Петрыкаўскага раёна (18 жніўня 1941 г.) райком КП(б)Б застаўся ў тыле ворага ў складзе: першы сакратар Х. І. Варгаўцік, другі сакратар І. К. Талкачоў, а таксама члены райкома А. П. Жукаў і І. І. Альшэўскі. Разам з райкомам застаўся партызанскі атрад пад камандаваннем В. І. Гардзіенкі. У кастрычніку 1941 г. пачаліся цяжкія баі з карнымі часцямі акупантаў. 19 кастрычніка ў в. Турбінка загінуў першы сакратар райкома КП(б)Б Х. І. Варгаўцік.

На загаду партыйнага сходу партыйная арганізацыя атрада 21 кастрычніка і частка асабовага складу перайшла на нелегальнае становішча, астатнім было дазволена ісці праз лінію фронту.

Падпольны райком зноў быў утвораны Палескім абкомам партыі ў красавіку 1943 г. 4 жніўня 1943 г. падпольны абком павялічыў склад райкома да 5 чалавек. Сакратаром райкома быў зацверджаны І. В. Скалабан.

Райком базіраваўся ў партызанскай брыгадзе № 130 (камбрыг І. В. Скалабан, з сакавіка 1944 г. М. А. Волкаў; камісар І. Н. Глушко).

Склад падпольнага райкома КП(б)Б

Сакратары: Варгаўцік Х. І. (18.8—21.10.1941 г.), Талкачоў І. К. (18.8—21.10.1941 г.), Скалабан І. В. (4.1943—4.1944 г.);

члены райкома: Жукаў А. П. (18.8—21.10.1941 г.), Альшэўскі І. І. (18.8—21.10.1941 г.), Глушко І. Н. (4.8.1943—6.7.1944 г.), Курбатоўскі І. М. (4.8.1943—6.7.1944 г.), Волкаў М. А. (4.8.1943—6.7.1944 г.), Шабалтас А. І. (4.8.1943—6.7.1944 г.).

Друкаваны орган падпольнага райкома КП(б)Б — газета «Сталінская праўда». Рэдактар — Курапаценка А. К.

КАПАТКЕВІЦКІ ПАДПОЛЬНЫ РАЙКОМ КП(б)Б

(4.1943 — 29.6.1944 г.)

Утвораны Палескім падпольным абкомам КП(б)Б у красавіку 1943 г. Сакратаром райкома партыі зацверджаны А. Ц. Міхайлоўскі. Базіраваўся ў партызанскай брыгадзе № 125.

Склад падпольнага райкома КП(б)Б

Сакратар — Міхайлоўскі А. Ц. (4.1943—29.6.1944 г.);

члены райкома: Жыгар А. А. (4.1943—3.1944 г.), Кудравец Ф. Д. (4.1943—29.6.1944 г.), Горбач С. Р. (4.8.1943—29.6.1944 г.), Цалко А. І. (4.8.1943—2.1944 г.), Цагельнік А. Р. (19.6—29.6.1944 г.), Тарасевіч Р. Л. (19.6—29.6.1944 г.).

Друкаваны орган падпольнага райкома КП(б)Б — газета «Бальшавік». Рэдактары: Каплан Г. Л., Ганусевіч І. Р.

Падпольныя партыйныя органы Кампартыі Беларусі, 1975 г.

ПЕТРЫКАЎСКІ ПАДПОЛЬНЫ РАЙКОМ ЛКСМБ

(1.1.1943—6.7.1944 г.)

У кастрычніку 1942 г. сакратар ЦК ЛКСМБ К. Т. Мазураў накіраваў у Петрыкаўскі раён упаўнаважаным ЦК ЛКСМБ П. Г. Скачкова і яго памочнікам А. П. Кебеца. У канцы 1942 г. імі быў створаны падпольны райком камсамола, які пачаў працаваць 1 студзеня 1943 г. Яго асноўная база знаходзілася ў 130-й партызанскай брыгадзе ў Петрыкаўскім раёне.

Склад падпольнага райкома ЛКСМБ

Сакратары: Скачкоў П. Г. (1.1—30.11.1943 г.), Ключнік В. У. (30.11.1943—6.7.1944 г.), Кебец А. П. (па прапагандзе) (1.1—10.5.1943 г.);

члены райкома: Кобец А. П. (10.5.1943—5.2.1944 г.), Ключнік В. У. (1.1 — 30.11.1943 г.), Данілаў К. В. (1.1.1943—6.7.1944 г.).

КАПАТКЕВІЦКІ ПАДПОЛЬНЫ РАЙКОМ ЛКСМБ

(8.10.1942—29.6.1944 г.)

Да стварэння падпольнага райкома работу па арганізацыі камсамольска-маладзёжнага падполля ў раёне праводзілі Ф. Д. Кудравец, С. І. Боеў, Ф. А. Плавінскі, камсамольцы В. А. Парфільеў, І. І. Каліцька, Л. Л. Федаровіч і інш.

Падпольны райком пачаў працаваць 8 кастрычніка 1942 г. Яго асноўная база знаходзілася ў 125-й партызанскай брыгадзе ў Капаткевіцкім раёне.

Склад падпольнага райкома ЛКСМБ

Сакратары: Плавінскі Ф. А. (8.10.1942—29.6.1944 г.), Боеў С. І. (па прапагандзе) (8.10.1942—29.6.1944 г.);

члены райкома: Каліцька І. І. (8.10.1942—29.6.1944 г.), Кудравец Ф. Д. (8.10.1942—14.9.1943 г.), Парфільеў В. А. (14.9.1943—23.4.1944 г.), Федаровіч Л. Л. (14.9.1943—29.6.1944 г.).

Падпольныя камсамольскія органы Беларусі, 1976 г.

* * *

У вёсцы Камаровічы зімой і ў пачатку вясны 1943 г. размяшчаліся Палескі падпольны абком КП(б)Б і штаб партызанскага злучэння Палескай вобласці.

Падпольны абком (створаны 9.2.1943 г.) узначальваў першы сакратар Ф. М. Языковіч. Партызанскае злучэнне, якім камандаваў Ф. М. Языковіч, створана 15.3.1943 г. Яго аснову склалі партызанскія атрады, што дзейнічалі на поўначы Палескай вобласці.

У 1983 г. на месцы дыслакацыі Палескага падпольнага абкома КП(б)Б і штаба партызанскага злучэння Палескай вобласці ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

У падмурак перамогі

У в. Камень Асавецкага сельсавета, які да 1962 г. уваходзіў у склад Петрыкаўскага раёна, пахаваны першы сакратар райкома КП(б)Б Хаім Ізраілевіч Варгаўчык. Ён загінуў у няроўным баі з фашысцкімі акупантамі 21 кастрычніка 1941 г.

Х. І. Варгаўчык нарадзіўся ў 1902 г., у 16 гадоў пачаў сваю працоўную біяграфію. Кадры ў тыя неспакойныя гады раслі хутка, гэтак жа, як хутка і бясследна знікалі, і Хаім Ізраілевіч з 1932 г. займаў адказныя пасады на савецкай рабоце ў Мазырскім раёне, а ў сакавіку 1940 г. прызначаны першым сакратаром Петрыкаўскага райкома партыі. Грымнула вайна, Х. І. Варгаўчык застаўся ў раёне для арганізацыі партызанскай барацьбы з ворагам.

Х. І. Варгаўчык

Атрад, створаны ім, базіраваўся ў непраходных лясах каля в. Турбінка, на мяжы з Мазырскім раёнам. У атрадзе, якім камандаваў В. І. Гардзіенка, налічвалася каля 100 чалавек, гэта была сур'ёзная сіла. Ужо ў жніўні партызаны пачалі ваенныя дзеянні, знішчалі асобныя групы ворага, разганялі паліцэйскія ўправы, разбуралі масты, рабілі засады і дыверсіі, парушалі тэлефонную сувязь. На Прыпяці быў знішчаны параход са зброяй і палівам.

У верасні — кастрычніку 1941 г. нямецкія акупанты арганізавалі першую карную экспедыцыю супраць партызан, якія ўсё больш даваліся ў знакі за-

хопнікам. Пачаліся цяжкія, кровапралітныя баі дрэнна ўзброеных партызан з моцным, загартаваным праціўнікам. Частка іх пайшла праз лінію фронту на злучэнне з Чырвонай Арміяй. Тыя, што засталіся, стрымлівалі адну за другой атакі ворага каля в. Турбінка. 21 кастрычніка пасля мінамётнай падрыхтоўкі немцы зноў пайшлі на пазіцыі партызан. Варожая куля абарвала жыццё партызанскага важака, мужнага і адважнага чалавека Х. І. Варгаўціка.

Атрад вырваўся з акружэння, пекалькі дзён, адступаючы ўглыб лясоў, адбіваў напады ворагаў, пакуль не далучыўся да партызан Чарнігаўскай вобласці. А ў маі 1943 г. у гэтых месцах быў створаны новы партызанскі атрад 130-й Петрыкаўскай брыгады, які вёў баявыя дзеянні да апошняга дня акупацыі.

М. Л. Капач

125-я Капаткевіцкая брыгада

Створана ў студзені 1943 г. у адпаведнасці з загадам па партызанскаму злучэнню Мінскай і Палескай абласцей на базе асобных атрадаў Капаткевіцкага, І. Н. Глушко (Балотнікава), М. Ф. Бабкова, Г. І. Краўца, А. Г. Волкава (пазней 39-ы) і 2-га Капаткевіцкага. Да 15 сакавіка 1943 г. брыгада ўваходзіла ў састаў партызанскага злучэння Мінскай і Палескай абласцей, пасля яго рэарганізацыі — у састаў злучэння Палескай вобласці. У сакавіку 1943 г. атрад Р. І. Краўца выдзелены для стварэння 210-й брыгады; у чэрвені 1943 г. Капаткевіцкі атрад раздзелены на атрады Ф. Д. Кудраўца (пазней 17-ы) і В. А. Вялігіна (27-ы ім. Ленінскага камсамола); 2 і Капаткевіцкі атрад дзейнічаў у саставе брыгады да 5 чэрвеня 1943 г., затым выдзелены ў самастойны і вызначаны штабным. 27 ліпеня 1943 г. атрады Балотнікава і М. Ф. Бабкова перадыслацыраваны ў Петрыкаўскі раён для арганізацыі 130-й Петрыкаўскай брыгады. У маі — верасні 1943 г. у брыгадзе арганізаваны новыя атрады: А. С. Вырвіча (45-ы ім. І. І. Маставога), М. Х. Семка (пазней 55-ы), Р. Л. Такуева (78-ы), А. Д. Сарочыка; 7 снежня 1943 г. у яе састаў уключаны асобны 25-ы атрад. Да верасня 1943 г. атрады брыгады называліся па прозвішчах сваіх камандзіраў, затым ім прысвоены нумарныя абазначэнні. 4 снежня 1943 г. у адпаведнасці з загадам штаба партызанскага злучэння Палескай вобласці на базе атрадаў 17-га, 27-га ім. Ленінскага камсамола і 39-га арганізавана 150-я брыгада ім. Ф. М. Языковіча. Камандзірам 78-га атрада Р. А. Такуеву і дыверсійнай групы гэтага атрада Ф. А. Малышаву прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Брыгада дзейнічала ў Капаткевіцкім і Петрыкаўскім раёнах. Злучылася з часцямі Чырвонай Арміі 29 чэрвеня 1944 г. агульнай колькасцю 372 партызаны.

Камандзіры брыгады: Жыгар А. А. (студзень 1843 — сакавік 1944 г.), Куранаў М. Д. (сакавік — чэрвень 1944 г.).

Камісары: Скалабан І. В. (студзень — ліпень 1943 г.), Кудравец Ф. Д. (ліпень 1943 — чэрвень 1944 г.).

Начальнікі штаба: Карнейчык А. П. (студзень — лістапад 1943 г.), Вялігін В. А. (лістапад — снежань 1943 г.), Асокін А. А. (снежань 1943 — люты 1944 г.), Юрасаў І. П. (люты — чэрвень 1944 г.).

Капаткевіцкі атрад

Утвораны 17 жніўня 1941 г. у Церабаўскім сельсавеце Капаткевіцкага раёна з байцоў знішчальнага батальёна. Дзейнічаў да 23 кастрычніка 1941 г., затым раздзяліўся на групы. У студзені 1942 г. па ўказанні Мінскага падпольнага абкома КП(б)Б быў адноўлены на базе груп А. Ц. Міхайлоўскага, Я. Г. Кліменценкі, А. С. Вырвіча, А. А. Жыгара, Стральцова — І. П. Юрасава. Са студзеня па красавік 1942 г. уваходзіў у састаў «Гарнізона Ф. І. Паўлоўскага», затым дзейнічаў самастойна. 7 чэрвеня 1943 г. на яго аснове сфарміраваны атрады Ф. Д. Кудраўца і В. А. Вялігіна.

Камандзіры атрада: Гардзіенка М. І. (жнівень 1941 — кастрычнік 1941 г.), Міхайлоўскі А. Ц. (студзень 1942 г.), Жыгар А. А. (люты 1942 — студзень 1943 г.), Кудравец Ф. Д. (студзень — чэрвень 1943 г.).

Камісары: Жыгар А. А. (жнівень — кастрычнік 1941 г.), Кудравец Ф. Д. (кастрычнік 1942 — студзень 1943 г.), Горбач С. Р. (студзень — красавік 1943 г.), Курбатоўскі І. М. (красавік — чэрвень 1943 г.).

Начальнікі штаба: Карнейчык А. П. (студзень 1942 — студзень 1943 г.), Маставы І. І. (студзень — чэрвень 1943 г.).

хопнікам. Пачаліся цяжкія, крывапралітныя баі дрэнна ўзброеных партызан з моцным, загартаваным праціўнікам. Частка іх пайшла праз лінію фронту на злучэнне з Чырвонай Арміяй. Тыя, што засталіся, стрымлівалі адну за другой атакі ворага каля в. Турбінка. 21 кастрычніка пасля мінамётнай падрыхтоўкі немцы зноў пайшлі на пазіцыі партызан. Варожая куля абарвала жыццё партызанскага важака, мужнага і адважнага чалавека Х. І. Варгаўціка.

Атрад вырваўся з акружэння, некалькі дзён, адступаючы ўглыб лясоў, адбіваў напады ворагаў, пакуль не далучыўся да партызан Чарнігаўскай вобласці. А ў маі 1943 г. у гэтых месцах быў створаны новы партызанскі атрад 130-й Петрыкаўскай брыгады, які вёў баявыя дзеянні да апошняга дня акупацыі.

М. А. Капач

125-я Капаткевіцкая брыгада

Створана ў студзені 1943 г. у адпаведнасці з загадам па партызанскаму злучэнню Мінскай і Палескай абласцей на базе асобных атрадаў Капаткевіцкага, І. Н. Глушко (Балотнікава), М. Ф. Бабкова, Г. І. Краўца, А. Г. Волкава (пазней 39-ы) і 2-га Капаткевіцкага. Да 15 сакавіка 1943 г. брыгада ўваходзіла ў састаў партызанскага злучэння Мінскай і Палескай абласцей, пасля яго рэарганізацыі — у састаў злучэння Палескай вобласці. У сакавіку 1943 г. атрад Р. І. Краўца выдзелены для стварэння 210-й брыгады; у чэрвені 1943 г. Капаткевіцкі атрад раздзелены на атрады Ф. Д. Кудраўца (пазней 17-ы) і В. А. Вялігіна (27-ы ім. Ленінскага камсамола); 2-і Капаткевіцкі атрад дзейнічаў у саставе брыгады да 5 чэрвеня 1943 г., затым выдзелены ў самастойны і вызначаны штабным. 27 ліпеня 1943 г. атрады Балотнікава і М. Ф. Бабкова перадыслацыраваны ў Петрыкаўскі раён для арганізацыі 130-й Петрыкаўскай брыгады. У маі — верасні 1943 г. у брыгадзе арганізаваны новыя атрады: А. С. Вырвіча (45-ы ім. І. І. Маставога), М. Х. Семка (пазней 55-ы), Р. А. Такуева (78-ы), А. Д. Сарочыка; 7 снежня 1943 г. у яе састаў уключаны асобны 25-ы атрад. Да верасня 1943 г. атрады брыгады называліся па прозвішчах сваіх камандзіраў, затым ім прысвоены нумарныя абазначэнні. 4 снежня 1943 г. у адпаведнасці з загадам штаба партызанскага злучэння Палескай вобласці на базе атрадаў 17-га, 27-га ім. Ленінскага камсамола і 39-га арганізавана 150-я брыгада ім. Ф. М. Языковіча. Камандзірам 78-га атрада Р. А. Такуеву і дыверсійнай групы гэтага атрада Ф. А. Малышаву прысвоена званне Герояў Савецкага Саюза.

Брыгада дзейнічала ў Капаткевіцкім і Петрыкаўскім раёнах. Злучылася з часцямі Чырвонай Арміі 29 чэрвеня 1944 г. агульнай колькасцю 372 партызаны.

Камандзіры брыгады: Жыгар А. А. (студзень 1843 — сакавік 1944 г.), Куранаў М. Д. (сакавік — чэрвень 1944 г.).

Камісары: Скалабан І. В. (студзень — ліпень 1943 г.), Кудравец Ф. Д. (ліпень 1943 — чэрвень 1944 г.).

Начальнікі штаба: Карнейчык А. П. (студзень — лістапад 1943 г.), Вялігін В. А. (лістапад — снежань 1943 г.), Асокін А. А. (снежань 1943 — люты 1944 г.), Юрасаў І. П. (люты — чэрвень 1944 г.).

Капаткевіцкі атрад

Утвораны 17 жніўня 1941 г. у Церабаўскім сельсавеце Капаткевіцкага раёна з байцоў знішчальнага батальёна. Дзейнічаў да 23 кастрычніка 1941 г., затым раздзяліўся на групы. У студзені 1942 г. па ўказанні Мінскага падпольнага абкома КП(б)Б быў адноўлены на базе груп А. Ц. Міхайлоўскага, Я. Г. Клімянцянкі, А. С. Вырвіча, А. А. Жыгара, Стральцова — І. П. Юрасава. Са студзеня па красавік 1942 г. уваходзіў у састаў «Гарнізона Ф. І. Паўлоўскага», затым дзейнічаў самастойна. 7 чэрвеня 1943 г. на яго аснове сфарміраваны атрады Ф. Д. Кудраўца і В. А. Вялігіна.

Камандзіры атрада: Гардзіенка М. І. (жнівень 1941 — кастрычнік 1941 г.), Міхайлоўскі А. Ц. (студзень 1942 г.), Жыгар А. А. (люты 1942 — студзень 1943 г.), Кудравец Ф. Д. (студзень — чэрвень 1943 г.).

Камісары: Жыгар А. А. (жнівень — кастрычнік 1941 г.), Кудравец Ф. Д. (кастрычнік 1942 — студзень 1943 г.), Горбач С. Р. (студзень — красавік 1943 г.), Курбатоўскі І. М. (красавік — чэрвень 1943 г.).

Начальнікі штаба: Карнейчык А. П. (студзень 1942 — студзень 1943 г.), Маставы І. І. (студзень — чэрвень 1943 г.).

У. І. Кулак

І. Н. Глушко

В. А. Вялігін

А. А. Жытар

45-ы атрад імя І. І. Маставога

Сфарміраваны 1 мая 1943 г. на базе ініцыятыўнай групы А. С. Вырвіча, выдзеленай Капаткевіцкім атрадам у сакавіку 1943 г. 12 сакавіка 1944 г. названы імем камандзіра атрада І. І. Маставога, які загінуў 11 сакавіка 1944 г. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічвалася 117 партызан.

Камандзіры атрада: Вырвіч А. С. (май — снежань 1943 г.), Маставы І. І. (снежань 1943 — сакавік 1944 г.), Алексіевіч Т. А. (сакавік — чэрвень 1944 г.), Жыльскі М. Д. (чэрвень 1944 г.).

Камісары: Аўсіевіч В. Д. (май 1943 г.), Цалка А. І. (май 1943 — люты 1944 г.), Ходзька Я. А. (сакавік — чэрвень 1944 г.).

Начальнік штаба — Алексіевіч І. І. (жнівень 1943 — чэрвень 1944 г.).

78-ы дыверсійны атрад

Арганізаваны ў жніўні 1943 г. на падставе рашэння Палескага падпольнага абкома КП(б)Б з партызан, выдзеленых 125-й Капаткевіцкай і 225-й партызанскімі брыгадамі. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічвалася 135 партызан.

Камандзіры атрада: Герой Савецкага Саюза Такуеў Р. А. (жнівень 1943 — сакавік 1944 г.), Петухоў У. А. (сакавік — чэрвень 1944 г.).

Камісар — Цагельнік А. Ф. (жнівень 1943 — чэрвень 1944 г.).

Начальнікі штаба: Петухоў У. А. (жнівень 1943 — сакавік 1944 г.), Якаўлеў М. Ф. (сакавік 1944 — чэрвень 1944 г.).

55-ы атрад

Утвораны ў верасні 1943 г. на базе ініцыятыўнай групы М. Х. Семка — С. К. Дашкевіча, выдзеленай брыгадай у жніўні 1943 г. і з жыхароў вв. Іванкавічы, 1-я Слабодка, Гарадзішча, Церабаў Капаткевіцкага раёна. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі 22 лютага 1944 г. налічвалася 55 партызан.

Камандзір атрада — Семка М. Х. (верасень 1943 — люты 1944 г.).

Камісары: Дашкевіч С. К. (верасень — снежань 1943 г.), Герасіменка І. К. (снежань 1943 — люты 1944 г.).

Начальнік штаба — Гайчук Ц. М. (кастрычнік 1943 — люты 1944 г.).

25-ы атрад

Сфарміраваны ў верасні 1943 г. па распараджэнню Капаткевіцкага падпольнага райкома КП(б)Б на базе ініцыятыўнай групы, выдзеленай брыгадай. Да 7 снежня 1943 г. атрад дзейнічаў самастойна.

На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічвалася 84 партызаны.

Камандзіры атрада: Куранаў М. Д. (снежань 1943 — сакавік 1944 г.), Лук'янчыкаў Д. Е. (сакавік — чэрвень 1944 г.).

Камісары: Зелянко Б. К. (верасень 1943 — сакавік 1944 г.), Рыжанкоў П. В. (сакавік — чэрвень 1944 г.).

Начальнікі штаба: Гусараў А. Я. (верасень 1943 — студзень 1944 г.), Марцінюўскі Ф. Р. (студзень — чэрвень 1944 г.).

Атрад А. Д. Сарочыка

Арганізаваны ў кастрычніку 1943 г., у сакавіку 1944 г. расфарміраваны, яго асабовы састаў размеркаваны па іншых атрадах.

Камандзір атрада — Сарочык А. Д. (кастрычнік 1943 — сакавік 1944 г.).

Камісары: Пераходскі Т. Я. (кастрычнік — снежань 1943 г.), Тарасевіч Р. Л. (снежань 1943 — сакавік 1944 г.).

Начальнікі штаба: Алексіевіч Т. А. (кастрычнік 1943 — сакавік 1944 г.), Каліцька П. З. (сакавік 1944 г.).

Баявыя аперацыі партызаны праводзілі на чыгуначным участку Лунінец — Гомель, на шашэйных і грунтавых дарогах Мазыр — Петрыкаў, Капаткевічы — Пціч, Капаткевічы — Акцябрскі. У жніўні 1943 г. падарвалі больш за 1,7 тыс. рэек, у ноч на 21.6.1944 г. на ўчастку Старушкі — Бабруйск больш за 270 рэек. У сакавіку і чэрвені 1943 г. і першай палове 1944 г. правялі баі супраць карнікаў, абаранялі мясцовае насельніцтва ад зняволення і вывазу на катаржныя работы ў Германію.

130-я Петрыкаўская брыгада

Створана 27 ліпеня 1943 г. па загаду штаба партызанскага злучэння Палескай вобласці на базе атрадаў І. Н. Глушко (Балотнікава, пазней 125-ы), М. Ф. Бабкова (пазней 135-ы), выдзеленых 125-й Капаткевіцкай брыгадай, і атрада Р. І. Краўца (пазней 132-і), які дзейнічаў да ліпеня 1943 г. у саставе 210-й Капаткевіцкай брыгады.

Злучылася з часцямі Чырвонай Арміі: 136-ы і 138-ы атрады — у студзені 1944 г., 132, 125, 135 і 133-і — 6 ліпеня 1944 г. Агульная колькасць партызан — 1215.

Камандзіры брыгад: Скалабан І. В. (ліпень 1943 — сакавік 1944 г.), Волкаў М. А. (сакавік 1944 — ліпень 1944 г.).

Камісар — Глушко І. Н.

Начальнік штаба — Кулак У. І. (ліпень 1943 — ліпень 1944 г.).

132-і атрад

Арганізаваны ў верасні 1941 г. у в. Залужжа Старадарожскага раёна. Да студзеня 1943 г. дзейнічаў самастойна, затым перадыслацыраваўся ў Петрыкаўскі і Капаткевіцкі раёны, дзе ў студзені 1943 г. уключаны ў склад 125-й Капаткевіцкай брыгады. У сакавіку 1943 г. выдзелены для арганізацыі 210-й брыгады.

На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 192 партызаны.

Камандзіры атрада: Кравец Р. І. (жнівень 1942 — сакавік 1944 г.), Астапчук П. М. (сакавік — ліпень 1944 г.).

М. Д. Куранаў

Ф. Д. Кудравец

І. В. Дубік

М. І. Гардзіенка

Камісары: Ульяшоў Ц. Ц. (верасень 1941 — май 1942 г.), Тарасаў А. А. (май — лістапад 1942 г.), Рэва Рытар Якаўлевіч (лістапад 1942 — сакавік 1943 г.), Шыманец К. К. (сакавік — май 1943 г.), Макейчык А. М. (май — ліпень 1943 г.), Курбатоўскі І. М. (ліпень 1943 — чэрвень 1944 г.), Лапо М. І. (чэрвень — ліпень 1944 г.).

Начальнікі штаба: Ульяшоў Ц. Ц. (май — кастрычнік 1942 г.), Астапчук П. М. (кастрычнік 1942 — сакавік 1944), Старцаў П. Ф. (сакавік — ліпень 1944 г.).

125-ы атрад

Утвораны ў жніўні 1942 г. на базе ініцыятыўнай групы І. Н. Глушко (Балотніказа), выдзеленай у ліпені 1942 г. Капаткевіцкім атрадам. Да студзеня 1943 г. дзейнічаў самастойна, затым — у саставе 125-й Капаткевіцкай брыгады.

На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічвалася 160 партызан.

Камандзіры атрада: Глушко І. Н. (жнівень 1942 — ліпень 1943 г.), Волкаў М. А. (ліпень 1943 — сакавік 1944 г.), Мядзведзеў Ф. Е. (сакавік — ліпень 1944 г.).

Камісары: Курбатоўскі І. М. (кастрычнік 1942 — красавік 1943 г.), Волкаў М. А. (красавік — ліпень 1943 г.), Мядзведзеў Ф. Е. (ліпень 1943 — сакавік 1944 г.), Ільіч М. П. (сакавік — ліпень 1944 г.).

Начальнікі штаба: Багравец М. П. (жнівень 1942 г.), Кулак У. І. (верасень 1942 — ліпень 1943 г.), Мялешка І. А. (ліпень 1943 — ліпень 1944 г.).

135-ы атрад

Створаны ў кастрычніку 1942 г. на базе ініцыятыўнай групы М. Ф. Бабкова — І. В. Дубіка, выдзеленай у верасні атрадам М. П. Бумажкова 225-й партызанскай брыгады. Да студзеня 1943 г. дзейнічаў самастойна, затым — у саставе 125-й Капаткевіцкай брыгады.

На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічвалася 260 партызан.

Камандзіры атрада: Бабкоў М. Ф. (кастрычнік 1942 — лістапад 1943 г.), Глебаў М. Г. (лістапад 1943 — ліпень 1944 г.).

Камісары: Дубік І. В. (кастрычнік 1942 — жнівень 1943 г.), Мутерман М. Н. (жнівень 1943 — сакавік 1944 г.), Курапаценка А. К. (сакавік — ліпень 1944 г.).

Начальнікі штаба: Мутерман М. Н. (кастрычнік 1942 — студзень 1943 г.), Кабановіч А. П. (люты 1943 — ліпень 1943 г.), Яновіч Р. І. (ліпень 1943 — ліпень 1944 г.).

136-ы атрад

Арганізаваны 7 жніўня 1943 г. на базе ініцыятыўнай групы А. І. Трухановіча — А. І. Шабалтаса, выдзеленай у маі 1943 г. 125-м атрадам. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі 25 студзеня 1944 г. налічвалася 250 партызан.

Камандзір атрада — Трухановіч А. І.

Камісар — Шабалтас А. І.

Начальнік штаба — Палознік Ф. Д. (жнівень 1943 — студзень 1944 г.).

138-ы атрад

Утвораны 7 жніўня 1943 г. на базе ініцыятыўнай групы, выдзеленай у маі 1943 г. 135-м атрадам. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі 19 студзеня 1944 г. налічвалася 208 партызан.

Камандзір атрада — Дубік І. В.

Камісар — Амельчанка М. М.

Начальнік штаба — Кудзелін В. Р. (жнівень 1943 — студзень 1944 г.).

133-і атрад

Сфарміраваны 20 кастрычніка 1943 г. з асабовага саставу 3-й роты 125-га атрада. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічвалася 110 партызан.

Камандзір атрада — Арцюх П. І.

Камісар — Ярыга І. П.

Начальнік штаба — Данілаў К. В. (кастрычнік 1943 — ліпень 1944 г.).

Партызаны наносілі ўдары па камунікацыях ворага, знішчалі яго жывую сілу і тэхніку. У ліста-падзе — снежні 1942 г. удзельнічалі ў падрыве мастоў на р. Пціч і Бобрык. Вялі шматлікія баі, у тым ліку каля в. Міхедавічы (22.2.1943 г.), в. Бабунічы (26—27.5.1943 г.), Асавец (28.7 і 2.8.1943 г.) Петрыкаўскага раёна, на дарозе Конкавічы — Балажэвічы (24.8.1943 г.). У сакавіку 1943 г. замініравалі дарогу каля в. Кащэвічы, падарвалі некалькі машын з жывой сілай ворага. 21.8.1943 г. разграмілі гарнізон праціўніка, які ахоўваў чыгуначны ўчастак Муляраўка — Коржаўка. У жніўні — верасні 1943 г. у аперацыі «рэйкавая вайна» на чыгуначных участках Лунінец — Жыткавічы — Калінкавічы падарвалі звыш 2 тыс. рэек.

210-я Капаткевіцкая брыгада

Створана ў сакавіку 1943 г. на падставе загаду штаба партызанскага злучэння Палескай вобласці на базе асобных атрадаў П. Е. Ігуменава, І. С. Губіна, А. Ф. Сарафанава, І. А. Бабіча і атрада Р. І. Краўца, выдзеленага 125-й Капаткевіцкай брыгадай. 18 чэрвеня 1943 г. у саставе брыгады арганізаваны атрад Е. Г. Гулевіча. Брыгада ў канцы чэрвеня — пачатку ліпеня 1943 г. была расфарміравана. Атрад Р. І. Краўца перададзены 130-й Петрыкаўскай брыгадзе, атрад Е. Г. Гулевіча — 99-й Калінкавіцкай, атрады П. Е. Ігуменава, І. А. Бабіча, І. С. Губіна і А. Ф. Сарафанава выдзелены ў самастойныя.

Камандзір брыгады — Кулікоўскі І. М. (сакавік 1943 — ліпень 1943 г.).

Камісары: Пінчук К. Ф. (сакавік — красавік 1943 г.), Плыткевіч І. П. (красавік — ліпень 1943 г.).

Начальнік штаба — Васільеў В. М. (сакавік — ліпень 1943 г.).

Асобны петрыкаўскі атрад

Утвораны ў ліпені 1941 г. на падставе пастановы Палескага абкома КП(б)Б ад 23 ліпеня 1941 г. У кастрычніку 1941 г. атрад быў акружаны карнікамі. Па рашэнню партыйнага сходу атрад разбіўся на групы і выйшаў за лінію фронту.

Камандзір атрада — Гардзіенка В. І.

Камісар — Сакалоўскі С. І.

Начальнік штаба — Яворскі.

Ф. А. Бажок, Тараканаў, Ф. А. Плавінскі, А. Д. Сарочык

У. С. Лесюкоў, намеснік камандзіра 130-й партызанскай брыгады

І. І. Аршох, намеснік камандзіра 45-га партызанскага атрада

В. В. Цылько, намеснік камандзіра атрада

Ц. Ц. Ульяшоў

Асобны штабны атрад

Утвораны ў студзені 1943 г. на базе ініцыятыўнай групы, выдзеленай атрадам ім. А. В. Суворава 225-й брыгады. Да 5 чэрвеня 1943 г. атрад дзейнічаў у саставе 125-й Капаткевіцкай брыгады, затым — самастойна як штабны атрад.

Злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі 27 чэрвеня 1944 г. ў складзе 116 партызан.

Камандзір атрада — Бар'яш Р. І. (верасень 1943 — ліпень 1944 г.).

Камісары: Лапо М. І. (студзень 1943 — сакавік 1944 г.), Самбук Ф. І. (сакавік — чэрвень 1944 г.), Сабецкі І. С. (чэрвень 1944 г.).

Начальнікі штаба: Неўскі А. І. (студзень — май 1943 г., верасень 1943 — чэрвень 1944 г.), Фасоль А. І. (май — верасень 1943 г.), Волкаў А. Р. (чэрвень 1944 г.), Шумідуб А. Т. (чэрвень 1944 г.).

Атрад ім М. І. Калініна

Арганізаваны 1 студзеня 1943 г. на базе ініцыятыўнай групы, выдзеленай атрадам «За Савецкую Радзіму». З сакавіка па ліпень 1943 г. дзейнічаў у саставе 210-й Капаткевіцкай брыгады, затым — самастойна.

На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічвалася 89 партызан.

Камандзір атрада — Бабіч І. А. (студзень 1943 — чэрвень 1944 г.).

Камісары: Чарнушын П. Р. (май 1943 — люты 1944 г.), Макейчык А. Р. (люты — красавік 1944 г.), Рынейскі Б. В. (красавік — чэрвень 1944 г.).

Начальнік штаба — Паточын Я. Г. (студзень 1943 — чэрвень 1944 г.).

Атрад «За Савецкую Радзіму»

Арганізаваны ў студзені 1942 г. на базе партызанскай групы А. Г. Балахонава, якая дзейнічала з 1941 г. Да красавіка 1942 г. уваходзіў у састаў «Гарнізона Ф. І. Паўлоўскага», затым дзейнічаў самастойна. 8 студзеня 1943 г. уключаны ў 3-ю брыгаду Мінскай вобласці, у сакавіку 1943 г. перададзены 210-й Капаткевіцкай, у саставе якой знаходзіўся да ліпеня 1943 г. У сувязі з расфарміраваннем 210-й Капаткевіцкай брыгады атрад у ліпені 1943 г. вылучаны ў самастойную баявую адзінку.

На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваўся 141 партызан.

Камандзіры атрада: Балахонаў А. Г. (студзень — красавік 1942 г.), Праходскі М. Л. (красавік — верасень 1942 г.), Ігуменаў П. Я. (верасень 1942 — верасень 1943 г.), Бабіч В. П. (верасень — снежань 1943, чэрвень 1944 г.), Юневіч П. М. (снежань 1943 — чэрвень 1944 г.).

Камісары: Цыкоўскі З. М. (студзень — ліпень 1942 г.), Караблін В. П. (студзень — ліпень 1943 г.), Плыткевіч І. П. (ліпень — кастрычнік 1943 г.), Пінчук К. Ф. (кастрычнік 1943 — студзень 1944 г.), Захарынскі І. І. (студзень — чэрвень 1944 г.).

ХАНЧЭЎСКІ Пётр Сцяпанавіч, н. у 1886 г., рэпрэсіраваны, у час вайны вярнуўся дадому, партызан 125-й брыгады, загінуў у 1944 г. у в. Вялікае Поле.

ВЁСКА ЧЫРВОНАЯ ГОРКА

КРАЎЧАНКА Ігнат Ігнатавіч, н. у 1907 г., камандзір узвода 125-й брыгады, загінуў 20.5.1944 г.

РАДАМАН Вінцусь Іванавіч, н. у 1910 г., загінуў 5.2.1944 г. у Брэсцкай вобл.

РАДАМАН Фёдар Іванавіч, н. у 1922 г., загінуў у 1942 г. пад Мінскам.

Пад каваным ботам акупантаў

Фашысты з першых дзён акупацыі горада і раёна пачалі ўстанаўліваць свой «новы парадак». Забівалі мірных жыхароў, гвалтавалі жанчын, рабавалі... Схапілі паважанага чалавека, загадчыка аптэкі 70 гадовага Арона Файнштэйна, прывязалі вяроўкамі за ногі і цягалі канём па вуліцы, пакуль стары не памёр. Гітлераўскія вылюдкі спалілі пяцігадовую Фаню — дачку настаўніцы Клары Кустановіч. Яны патрабавалі ў маці расказаць, дзе знаходзяцца савецкія салдаты і афіцэры, якія выходзілі з акружэння. Патрыётка палічыла за лепшае смерць, чым здраду. Гітлераўцы расстралялі К. М. Кустановіч. Пасмяротна яна была ўзнагароджана медалём «За баявыя заслугі».

У адным з цэхаў цагельнага завода гітлераўцы знайшлі хворую дзяўчынку Іну Фацееву. Яе згвалтавалі, а потым расстралялі і кінулі з гары ў затоку... А праз некалькі дзён пад націскам падраздзяленняў Чырвонай Арміі фашысты вымушаны былі пакінуць горад. 2 жніўня Петрыкаў быў вызвалены, узноўлена савецкая ўлада. У горад зноў увайшлі чырвонаармейцы, партызаны атрада Варгаўціка. Сюды перабраўся падпольны райком. Прыступіў да выканання сваіх абавязкаў старшыня гарсавета Я. Зарэцкі. Начальнік аддзела НКУС маёр Жукаў і начальнік міліцыі Малчанаў арганізавалі ахову горада. Работнікі ваенкамата, ваенком лейтэнант Рошчын, начальнік 2-й часці Міхаіл Багінскі, афіцэры Васкевіч і Міхаіл Галёнка прыступілі да мабілізацыі насельніцтва ў рады Чырвонай Арміі. Разам з ваеннаабавязанымі добраахвотна ішлі ў ваенкамат камсамольцы непрызыўнога ўзросту. Выказалі жаданне пайсці ў дзеючую армію больш 50 юнакоў і дзяўчат. Сярод добраахвотнікаў былі Пётр Фурсікаў, Лідзія Занкевіч, Пётр Дрыга, Ірыней Дзечка і іншыя. Многія з іх прайшлі вогненнымі дарогамі ўсю вайну, атрымалі высокія ўрадавыя ўзнагароды. Пётр Фурсікаў, напрыклад, быў узнагароджаны одрэнам Аляксандра Неўскага. З 2 па 19 жніўня 1941 г. мабілізавана ў рады Чырвонай Арміі больш 300 чалавек.

5 жніўня па рашэнню райкома партыі насельніцтва ўбрала пераспеўшыя пасевы калгаснага жыта, абмалаціла яго і надзейна захавала. Такое рашэнне было прынята і наконт бульбы. 9 жніўня праведзена эвакуацыя насельніцтва ў тыл краіны. Райком партыі ў кароткі тэрмін здолеў арганізаваць рабочых суднаверфі, якія паднялі з затокі Бычок дзве затопленыя баржы. На іх у Мазыр вывезлі больш пяцідзесяці сямей.

11 жніўня ў другой палове дня прыляцеў самалёт, ён даставіў пошту, газеты і доўгачаканыя пісьмы. У газеце «Правда» быў змешчаны артыкул «Убитые, встаньте!», у якім расказвалася аб геройскім учынку і смерці савецкай патрыёткі Кустановіч з в. Галубіца.

Фашысцкія войскі пайшлі ў абход раёна ў напрамку да Мазыра. 19 жніўня райком партыі пакінуў Петрыкаў, пераправіўся праз Прыпяць у лес і зноў перайшоў на падпольную работу. Пачаліся нялёгкія, трывожныя партызанскія будні.

3 верасня група партызан з атрада Варгаўціка арганізавала засаду на р. Прыпяць, насупраць в. Бяланавічы. З кулямётаў і вінтовак яны абстралялі катэр з паліцаям і жывой сілай ворага. Полымя ахапіла палубу. Толькі двум гітлераўцам удалося дабрацца да берага.

Трывога не пакідала жыхароў. 14 верасня быў цёплы сонечны дзень. Людзі каналі бульбу на агародах. У 3 гадзіны дня па беразе Прыпяці, недалёка ад в. Макарычы, з бранякатэра і баржы высадзіўся карны атрад, больш 100 чалавек. Ворагі ўварваліся ў Петрыкаў. Яны рабавалі і гвалтавалі мірнае насельніцтва, чуліся стрэлы. Асабліва пакутавалі петрыкаўчане яўрэі. Ворагі

дамагаліся ў Блюмы Герцулінай, былой работніцы амбулаторыі, паказаць, дзе яна хавае каштоўнасці. Ніякіх каштоўнасцей у яе не было, жанчыну расстралялі. На вуліцы К. Лібкнехта быў забіты дзесяцікласнік Борух Герцулін. Дарослых і дзяцей па 30—40 чалавек гналі на прыстань да Прыпяці. На беразе затокі Бычок людзей прымушалі класціся тварам у гразь. На іх былі накіраваны кулямёты бранякатэра. Паверх галоў раз-пораз стралялі, ніхто не мог узняцца. На гэтым пякельным месцы ўсё большала людзей. Калі на беразе сабралася больш 400 чалавек, карнікі загадалі ўсім распрануцца, голых людзей пачалі заганяць у ваду. Яўрэі пад ударамі прыкладаў рухаліся на глыбіню, пярэднія ўжо танулі. Чуўся жудасны гул, крыкі, плач. Гітлераўцы паліваліі пакутнікаў свінцом. Забітыя і параненыя хаваліся пад вадой. Потым дабівалі параненых...

Сярод асуджаных на смерць яўрэяў была трыццаціпасцігадовая Гінда Гутман. Лёс даравaў ёй жыццё. Яна ўспамінае: «Мяне схапілі карнікі і павялі па вуліцы Карла Лібкнехта да цэнтра горада. Каля сквера паказалася група людзей, каля 30 чалавек. Мяне штурханулі да іх. З вуліцы Андрэева рухалася другая група яўрэяў, голых, акруваўленых. Сярод іх была Люба Янюк з чатырма дзецьмі, Яўсей Шпітальнік з пераламанай нагой, яго вялі пад рукі, Нахім Грэнадзёр і іншыя. Нас прыгналі да затокі Бычок. Там было сапраўднае пекла...

Апынуўшыся пад мёртвымі целамі, Гутман засталася жывой. Карнікі палічылі яе нежывой. Некалькі разоў жанчына траціла прытомнасць, зноў прыходзіла ў сябе, але не ўставала. Калі карнікі пайшлі, Гінда Навумаўна выбралася з-пад трупаў, папаўзла па беразе, дабралася да лесапільнага завода. Потым здолела дайсці да хаты Верашчакова ў Петрыкаве. У агародзе праляжала ўвесь наступны дзень. Галодная, распухшая, яна прабралася ў в. Бяланавічы, а затым за Прыпяць. Праз некалькі тыдняў жанчына аказалася ў в. Макараўка Кіеўскай вобласці, дзе жыло многа палякаў. Валодаючы польскай мовай, яна выдала сябе за палячку і пад прозвішчам Сцефаніды Бяняк пражыла там да мая 1942 г. Разам з мясцовымі жыхарамі гітлераўцы вывезлі яе на работу ў Германію.

Не абышлося без помсты гэтае зверства і для карнікаў. Партызан Рыгор Крупа, які да вайны працаваў начальнікам пажарнай каманды на цагельным заводзе, у той дзень пёс у горадзе варту вую службу і знаходзіўся на гарышчы аднаго з дамоў. Калі да берага прыстаў катэр з баржай, ён узяў на мушку вінтоўкі паліцая. Стрэл — і той паваліўся. За ім асунуўся на палубу яшчэ адзін фашыст, у якога трапіла другая куля Крупы.

Карнікі ў адказ таксама адкрылі агонь, потым падпаўзлі да дома і кінулі некалькі гранат. Крупа злез з гарышча і, адстрэльваючыся, кінуўся ў напрамку сада школы № 1. Адчуў рэзкі боль у назе, упаў. Да параненага падбеглі паліцаі і тут жа расстралялі.

15 верасня карнікі працягвалі звярствы ў горадзе. Забівалі людзей на вуліцах, падпальвалі дамы, у якіх гінулі дарослыя і дзеці. У гэты дзень было спалена 35 хат на вуліцы III Інтэрнацыянала і 17 — каля прыстані.

Жыхары Петрыкава і раёна не скарыліся ворагу. Павел Гарошка да вайны працаваў у бытавой майстэрні, а з прыходам гітлераўцаў — дома, каб пракарміць траіх дзяцей, жонку і маці. Да яго прыносілі ў рамонт простыя бытавыя рэчы не толькі мясцовыя жыхары, але і фашысты. Яны патрабавалі яшчэ і самагон.

Гарошка, частуючы ворагаў, дабываў патрэбныя звесткі аб намерах і планах карнікаў, становішчы на франтах. Расказваў аб пачутым савецкім людзям, настройваў іх на зрыў фашысцкіх задум, заклікаў да сабатажу. Але ў лістападзе 1941 г. П. С. Гарошка быў выданы правакатарам і расстраляны разам з сям'ёй.

У Петрыкаве — цэнтры гебітскамісарыята — быў асабліва жорсткі акупацыйны рэжым. Гітлераўцы прыдавалі гораду асаблівае значэнне. Блізасць чыгункі, водны шлях па Прыпяці і Дняпру адкрывалі прамы шлях на Украіну, каб вывозіць хлеб і іншае народнае дабро. Акупанты трымалі ў Петрыкаве гарнізон, у якім налічвалася больш за тысячу салдат і паліцаяў.

У будынку райкома партыі была размешчана жандармерыя, тут была турма. Свая турма мелася і ў памяшканні паліцыі. На вуліцы Валадарскага абаснавалася СД са следчым апаратам. У будынку былой аптэкі на вуліцы Андрэева звіў гняздо зондэрштаб «Р» пад шыльдай дапаможнага аддзела гебітскамісарыята. У в. Белка каля Петрыкава размясцілася армейская разведка «Абвер». На прыстані Прыпяці знаходзілася сапёрная часць, у распараджэнні якой былі дзве 46-міліметровыя гарматы і шэсць бранякатэраў для патрулявання на рацэ. У горадзе быў уведзены каменданцкі час. На многіх вуліцах і на ўскраінах пабудаваны доты і дзоты, з усходняга боку Петрыкава на беразе ракі віліся траншэі ў поўны рост, па якіх праходжваліся патрулі. Горад быў напоўнены фашысцкімі агентамі. Для жыхароў уведзены пропускі.

У адміністрацыйным дзяленні Петрыкаўскі, Жыткавіцкі і Тураўскі раёны Палескай вобласці ўваходзілі ў Петрыкаўскую акругу-гебіт, якія былі ў складзе Жытомірскай генеральнай акругі. Гебітскамісарам быў прызначаны генерал Рэдке, які размяшчаўся са сваім штабам у двухпавярховым памяшканні гасцініцы на вуліцы Камунальнай. Улетку 1942 г. былі выпушчаны ў абарот украінскія рэйхскарбованцы.

У падначаленні Петрыкаўскага гебітскамісарыята функцыяніраваў аддзел ландвертаў (афіцэраў — начальнікаў сельскіх раёнаў), які ўзначальваў гаўптман Коўкель. У памяшканні музычнай школы размяшчалася біржа працы, якой кіраваў лейтэнант Крайзер. Яна займалася ўлікам не толькі ўсяго дарослага насельніцтва, але і падлеткаў, якія наравне з дарослымі выкарыстоўваліся на цяжкіх работах — капанні траншэй, узвядзенні абаронных збудаванняў, нарыхтоўцы лесу. Тут адбіралі здаровых грамадзян, у асноўным юнакоў і дзяўчат, для адпраўкі на работу ў Германію, а дзяцей ад 8 да 14 гадоў — у спецыяльныя лагеры, дзе ў іх забіралі кроў для параненых салдат. Быў пашпартны стол, начальнікам якога з'яўляўся падслепаваты на левае вока Аляксандр Галін. Гэты душагуб пашпартызаваў пры наяўнасці савецкіх пашпартоў насельніцтва горада, выдаваў «аўсвайсы». У каго не аказвалася пашпарта, накіроўваўся на катаржныя работы. На вуліцы Камунальнай размяшчаўся лясгас з вялікім службовым апаратам. Узначальваў лясгас лесапрамысловец маёр Крамер.

Нізавыя грамадзянскія органы ўлады гарадскога ўпраўлення камплектаваліся з мясцовага насельніцтва, незадаволенага савецкай уладай, рознага роду крымінальных элементаў і поўнасцю падпарадкоўваліся гебітскамісарыяту. У вёсках ствараліся паліцэйскія ўчасткі і гарнізоны, прызначаліся старасты. Паліцэйскія гарнізоны былі ў Ляскавічах, Кащэвічах, Снядзіне, Бабунічах, Смятанічах і іншых населеных пунктах. У пачатку лістапада 1941 г. петрыкаўскія паліцаі, не падзяліўшы нарабаванае дабро, у сталоўцы напіліся і ўчынілі бойку. Адзін з паліцаяў застрэліў свайго шэфа — начальніка паліцыі Рыгора Канавальчука. Пахаванне яго гітлераўцы выкарысталі для правакацыі, прыпісаўшы смерць ката камуністам і яўрэям, якім абяцана была помста. Гэта былі не проста словы. Былі схоплены і расстраляны старшыні Ляскавіцкага і Смятаніцкага сельскіх саветаў Андрэй Палтаран і Мікалай Яворскі, старшыня калгаса в. Снядзін Мікалай Туравец і іншыя мірныя жыхары.

Зіма 1941—1942 гг. выдалася снежнай і халоднай, у снежні маразы даходзілі да 35 градусаў. У горадзе не было дроў і прадуктаў харчавання, людзі пакутавалі ад холаду і голаду, асабліва яўрэйскае насельніцтва, якога ў горадзе заставалася больш за 300 чалавек. Жылі яны ў гета, маглі выходзіць на вуліцу толькі ноччу. Фашысты канфіскавалі іх жыллё, сагналі ўсіх на вуліцу Дзяржынскага і размясцілі па 15—20 чалавек у двух дзесятках хат, у многіх з якіх не было вокнаў і дзвярэй. З абодвух канцоў вуліцы — агароджа з калючага дроту, стаялі пасты з кулямётамі. На вопратцы яўрэяў наперадзе і на спіне былі прышыты жоўтыя пасцікутныя зоркі. У шасць гадзін раніцы людзей выганялі з хат і пад канвоем вадзілі ў лес, дзе да 8 гадзін вечара яны нарыхтоўвалі драўніну, або на расчыстку вуліц. Знясіленыя ад голаду і холаду, людзі падалі ў снег, іх бязлітасна збівалі... Прадуктаў харчавання не было ніякіх, дзеці і старыя паміралі з голаду. Хаваць нябожчыкаў-яўрэяў на могілках забаранялася. Не дазвалялі хадзіць з хаты ў хату. Аднойчы стары Зайвель Пясчанскі хацеў прайсці да суседа, каб папрасіць які-небудзь харч. Вартавы заўважыў яго, прагучаў стрэл — на вачах насельнікаў гета Пясчанскі ўпаў на зямлю мёртвым. Удалося прабрацца ў свой дом на вуліцы К. Лібкнехта Бранцу, і тут ён знайшоў сваю смерць. Была забіта ў гета настаўніца Фаіна Раскіна і многія іншыя.

Днём 15 лютага 1942 г. па загаду Рэдке фашысты з мясцовымі паліцаямі ўварваліся ў гета. Яўрэі хаваліся хто дзе мог: у снезе, пад падлогай, у сене. Пашчаслівілася нямногім, выпадкі хаваліся ўсіх, каго сустракалі, гучалі стралы. У той дзень загінула каля 200 чалавек. А ў красавіку ва ўрочышчы Дварэц каля в. Белка расстралялі апошніх насельнікаў гета. Усяго ў Петрыкаве за гады акупацыі загінула 770 яўрэяў.

Знішчаліся цалыя вёскі з жыхарамі — Сялюцічы, Хвойня, Нівы. Акупанты забіралі ў насельніцтва хлеб, цёплае адзенне, абкладвалі непасільнымі падаткамі. Нават уладальнікі сабак плацілі падатак. Праводзіліся натуральныя паборы. З кожнай гаспадаркі бралася 80 кілаграмаў мяса, 600 літраў малака з каровы за год, па 25—30 яек ад кожнай курыцы, па 18—20 кілаграмаў воўны, а таксама зерне і бульба. Пачалі з'яўляцца і замоўнікі, звычайна здраднікі і паліцаі, якія атрымлівалі ад нямецкіх улад лепшыя надзелы зямлі.

На базе Петрыкаўскага калгаса «Чырвоны агароднік» акупанты арганізавалі абшчыну, сабралі сельскагаспадарчы інвентар, жывёлу. У абшчыне, якую імкнуліся зрабіць паказальнай, прымусовая работа была арганізавана па прынцыпу калектыўнай гаспадаркі, але вынікі былі мізэрныя. У горадзе адкрыты пункты і склады па прыёму сельскагаспадарчай прадукцыі. У царкве прымалі зерне, каля гарадскіх могілак — бульбу. Працавалі маслазавод, бойня і каўбасны цэх. Сельскае насельніцтва як магло сабатіравала здачу прадуктаў, не плаціла падаткаў.

Акупацыйны рэжым рабіўся ўсё больш жорсткім, гітлераўцы прымалі новыя захады для барацьбы з партызанамі. Каля горада на полі была пасадачная пляцоўка для самалётаў, будавалася дарога да прыстані па вуліцы Піянерскай, павялічыўся паліцэйскі гарнізон. За невыкананне загаду аб каменданцкім часе ўведзена пакаранне смерцю. У жандармерыі праводзілася рэгістрацыя камуністаў і савецкіх работнікаў. Тых, хто быў зарэгістраваны, як правіла, праз некаторы час расстрэльвалі.

Акупанты імкнуліся ўзнавіць мясцовую прамысловасць, былі пушчаны два лесапільныя заводы — стары і новы. Па рацэ Прыпяць арганізаваны сплаў драўніны. Прыкладваліся ўсе намаганні для таго, каб пусціць суднарамонтныя майстэрні, наладзіць транспарціроўку ваенных грузаў і нарабаванага дабра па Прыпяці. Дырэктарам суднарамонтных майстэрняў быў прызначаны немец з Гамбурга Гайдэман, інжынерам — Бавер. Фашысты развесілі загад за подпісам Рэдке, у якім пад пагрозай расстрэлу рабочым загадвалася выходзіць на работу. На суднаверфі ўведзена жорсткая праполная дысцыпліна, рабочы дзень працягваўся 10 гадзін. Зарплата — 5—6 акупацыйных марак у дзень, а пуд зерня каштаваў 2 тысячы марак. За спазненне ці нявыхад на работу рабочыя лесазавода, суднаверфі, цагельнага завода падвяргаліся пакаранню, некаторыя былі адпраўлены ў Германію. На цяжкіх работах выкарыстоўваліся не толькі дарослыя, але і непаўналетнія дзеці, рабочы дзень якіх працягваўся наравне з дарослымі. У каральскім цэху суднабудаўнічай верфі малатабойцамі працавалі малалетнія

Л. М. Чарнобылец каля гебітскамісарыята, які праз некаторы час быў ёю ўзарваны. 1942 г.

Вера Іванова, Дарафей Братка і іншыя.

Інжынер-механік лесапільных заводаў Мікалай Кацюбінскі дакладваў дырэктару завода Арэнсу, што абсталяванне для эксплуатацыі непрыгоднае. Арэнс загадаў інжынеру ехаць у Капцэвічы і агледзець на згарэўшым заводзе «Звязда» лакамабіль, знайсці спецыялістаў і даставіць яго ў горад. Кацюбінскі сустрэўся з Пятром Дзечка, які да вайны працаваў на заводзе, яны зняслі з машыны і схавалі найбольш каштоўныя дэталі. На васьмі парах валоў адцягнулі лакамабіль далей ад пасёлка, і Кацюбінскі далажыў начальству, што на заводзе яго няма. Але машыну знайшлі, Рэдке паслаў у Капцэвічы бургамістра Белакура. Лакамабіль пагрузілі на дзве вузкакалейныя платформы і даставілі ў Дарашэвічы на прыстань. Пакуль яго рыхтавалі для пагрузкі на баржу, Белакур пайшоў у адзін з дамоў распіць бутэльку самагонкі. Кіраваць пагрузкай ён пакінуў Кацюбінскага. Дзечка з Кацюбінскім паслабілі канаты ад прыпарамка, і калі прыступілі да пагрузкі, баржа адышла ад прыпарамка і лакамабіль апынуўся ў вадзе. П'яны бургамістр Белакур, прыехаўшы да месца пагрузкі, кінуўся з пісталетам да Кацюбінскага і Дзечкі. Іх арыштавалі, збілі ў жандармерыі.

Станкі на лесазаводах працавалі з перабоямі, працякалі трубы старога лакамабіля, ламаліся цыркулярныя пілы... Быў адменены абедзенны перапынак, рабочых збівалі за ўсякую правіннасць. Пацярпелі механік Васіль Бірка, рабочыя Лука Занкевіч, Сцяпан Міцкевіч, Цімафей Каленік і іншыя. І ўсё ж прадукцыі з кожным днём выпускалася ўсё менш. Фашысты вымушаны былі дадаткова стварыць каманду паліцыі для аховы заводаў і суднаверфі. Для работы прыцягвалі немцаў з сапёрнага батальёна.

...Замерлі, прыціхлі завулкі і вуліцы горада і вёсак. Жыхары стараліся менш выходзіць з дому. Амаль кожны дзень фашысты рабілі аблавы, арыштоўвалі людзей. Штодзень за горадам гучалі стрэлы, гітлераўцы расстрэльвалі мірных жыхароў. Петрыкаўчане не трывалі моўчкі здзекі, ішлі ў партызанскія атрады, арганізоўвалі падпольную барацьбу з акупантамі, рабілі ўсё магчымае, каб хутчэй развеяць чорныя хмары над краем, наблізіць радаснае свята Перамогі.

В. М. Чарнобылец

Жыццё ў няволі

...У спякотны ліпеньскі дзень 1941 г. удалечыні заклубіўся пыл. Нямецкая перадавая калона на матацыклах і веласіпедах пракацілася праз вёску, не спыняючыся, і падалася ў бок Капаткевіч. Так мы ўпершыню ўбачылі заваёўнікаў. А на другі дзень яны прыехалі як гаспадары, прызначылі старасту, аб'явілі парадак новага жыцця. Праз некалькі дзён у Старыну прыбеглі коні, на лузе ўдалечыні пасвіліся чужыя каровы. Гэта немцы, устанаўліваючы «новы парадак», спалілі суседнюю вёску Хвойню разам з людзьмі. Загінула каля 50 чалавек, жывёла разбеглася...

З гэтага часу ў вёсцы трывала пасяліла-ся трывога і страх. Ноччу з'яўляліся незнаёмыя — акружэнцы, партызаны, днём гаспадарылі акупанты.

Бацька звязаўся з партызанамі, перадаваў вопратку і ежу, расказваў аб перамяшчэннях ворагаў. А напрадвесні знік з дому старэйшы брат Іван. Бацька гаварыў, што ён паехаў у госці да бабулі Яўгеніі ў Парэчча, але мы хутка даведаліся, што Іван падаўся ў партызаны. Маці перажывала, плакала, хадзіла ў лес шукаць той атрад, але не знайшла, вярнулася ні з чым, набіўшы ногі. Потым мы даведаліся, што Іван быў ад'ютантам у камандзіра Палескага партызанскага злучэння І. Д. Ветрава.

Вайна вайною, але трэба было жыць і карміцца, не толькі самім, але і дзяліцца з партызанамі. Аралі зямлю сяк-так і сеялі збажыну, бульбу. Плошчы было даволі, толькі б сілы, каб апрацаваць, засеяць, убраць ураджай і захаваць яго, таму што ў любую хвіліну маглі наляцець, як гурганы, акупанты і забраць вырашчаны ўраджай... А сіл якраз і не было. Пакуль бацька быў дома, разам з намі, старэйшымі дочкамі, мы рабілі, што маглі, па гаспадарцы. Але яго часта выклікалі партызаны і ён хадзіў некуды з імі, часта ноччу, а то і некалькі сутак прападаў, вадзіў партызанскія групы на заданні, а толькі вернецца, стараста пасылае з возам у абоз... Так і жылі паміж двума агнямі. Маці прала і ткала палатно, шыла вопратку. Нават дзеці не заставаліся ўбаку. Аднойчы Ніна праводзіла ў Грабаў партызан. Расказвала, што ішлі туды з песнямі, а каля вёскі адбыўся вялікі бой, шмат партызан загінула, у тым ліку і іх камандзір, якога ўсе клікалі, Ніна запомніла, Васем...

Улетку мы пайшлі ў лес на ягады. Да нас падышоў незнаёмы, стомлены, у рванай вопратцы. Распытаў, адкуль мы, дзе немцы. Папрасіў, каб мы дапамаглі яму перайсці чыгунку. А як?.. У гэты час пайшоў дождж. Маці накрыла ўсіх нас, дзяцей, посцілкай, рашылася ўзяць з сабою і незнаёмага. Падыходзім да чыгункі. Вартавы наставіў зброю: «Хто, куды?» Маці тлумачыць: вось з мужам і дзецьмі хадзілі па ягады, застаў дождж і вяртаемся дахаты. Немец не верыць, не апускае зброю. Тады мама адна падышла з кошыкам да вартавога, высыпала амаль усе ягады, што мы назбіралі за дзень. Той змягчыўся, паказаў: праходзьце хутчэй...

У двары Кашэвіцкай царквы пакутавалі нашы палонныя салдаты. Жанчыны падыходзілі да агароджы, кідалі ім хлеб і бульбу. Немцы не перашкаджалі, таму што яны не кармілі палонных. Іншы раз дазвалялі жанчынам зайсці ў двор царквы. Маці першы раз зайшла туды, убачыла вельмі знямоглага чалавека, расплакалася і пачала тлумачыць немцам, што гэта яе муж, прасіць, каб адпусцілі яго... І тыя згадзіліся. Так маці яшчэ двойчы выратоўвала людзей, рабілі тое ж і іншыя жанчыны.

Неспакойна і трывожна было ў вёсцы. Немцы з кожным днём усё больш лютавалі. Не лепшым чынам паводзілі сябе і партызаны. Аднойчы нехта з вяскоўцаў сказаў ім, быццам Мітрафан, наш сусед, прыслугоўвае немцам. Партызаны — ці яны толькі так называліся, доўга не разбіраючыся, схапілі хлопца, як той ні прасіўся, вывелі на ўскраіну і расстралялі... У партызанах у гэты час знаходзіліся славакі, якія перайшлі на наш бок. Гэта былі добрыя, вясёлыя хлопцы. Тры чалавекі іх жылі неяк у нашай хаце. Ужо ўбралі збажыну і капалі раней часу бульбу, спяшаліся. З лесу прыйшлі партызаны па сваіх справах да нашых «кватарантаў» і між іншым сказалі бацьку: «Не варта і табе з сям'ёю заставацца ў вёсцы, прыйдуць немцы, яны не даруюць дружбу з намі»...

Бацька запрог каня, пагрузілі сякі-такі скарб, прывязалі карову да воза і падаліся ў лес, да партызан... Спыніліся за Арэсай, у гушчары, зрабілі будан з галін. На агні варылі ежу — парылі жыта, мёрзлую бульбу, спалі на

сене ў будане. Так і жылі... Больш за ўсё баяліся аблавы немцаў. Тады хаваліся ў гушчары, ворагі іншы раз праходзілі так блізка, што мы чулі размову і бачылі іх праз лісце хмызняку. Частымі гасцямі ў нашым будане былі партызаны. Маці частавала іх, чым магла, латала вопратку. Оля і Ніна вязалі рукавіцы з парашутнага шоўку, хадзілі ў вёску, малолі муку, з якой пяклі хлеб для партызан.

Да Івана ў злучэнні І. Д. Ветрава дайшлі чуткі, што сям'ю — усіх нас — расстралялі. Адпрасіўся ў камандзіра, прыбег... Выпадкова натрапіў на наш будан, увайшоў, чыркнуў запалку — мы ўсе перапалохаліся, думалі, немцы. Радаснай была сустрэча... Але Іван папярэдзіў: зараз жа збірайцеся і ўцякайце адсюль, заўтра немцы пачынаюць карную экспедыцыю. Падаліся мы за раку, на Чорнае балота. Гэта была сапраўдная багна, толькі ў адным месцы зроблена грэбля, і мы спадзяваліся, што немцы сюды не дабяруцца. І сапраўды, два месяцы пражылі спакойна. Але напрадвесні, на Вербную нядзелю, карнікі акружылі балота, ля граблі з'явіліся танкі. І вось гітлераўцы каля нашага будана. Адзін з карнікаў нагой перакуліў закопчаны чыгунок, у якім варыўся крупнік. Абстралялі будан, мы ў гэты час ляжалі на зямлі, кулі нікога не зачапілі. Заглянулі ў будан — дзеці, бачаць, ды маці старая. «Дзе партызаны?» «Не ведаем, даўно іх не бачылі». Пагналі нас у Слабаду, зачынілі разам з іншымі людзьмі ў хаце — яблыку няма дзе ўпасці. Прасядзелі так у цеснаце, каля печы і пад ёю, усю ноч. Думалі — тут нам і канец будзе. Але раніцай выгналі ўсіх і пачалі сартаваць: мужчын у адзін бок, дзяўчат і маладых жанчын — у другі, старых — асобна, сюды ж кідалі, сілаю аддзіраючы ад мацярок, дзяцей. Мужчын пагрузілі ў машыну і павезлі некуды, дзяўчат і жанчын — на другую машыну. Туды трапілі і Оля з Пінай. Крыкі і плач стаялі над вёскай. Карнікі не звярталі на гэта ніякай увагі.

Усе думалі, што тых, хто застаўся, расстраляюць ці спаляць жывымі, як гэта было ў іншых вёсках. Але нас накіравалі ў Ляскавічы, запіхнулі за калючы дрот, што быў нацягнуты вакол царквы. Там ужо знаходзіліся сотні людзей, многія з якіх былі падобны на здані. Пятро прасіць: «Піць». Маці падышла да вартавога, папрасіла пайсці па ваду. Немец паказвае: ідзі, але адна, без дзіцяці. Пятро ўчапіўся за спадніцу, не пускае. Вартавы схапіў штык і накіраваў яго ў жывот дзіцяці. Маці разам з Пятром кінуліся назад у натоўп людзей, так і не набраўшы вады. Людзі паспачувалі, далі хлопчыку вады, усе гаварылі — добра, што нагул жывымі засталіся... Маці доўга плакала, не магла супакоіцца. Так прайшла ноч у царкве. Раніцай адчыніліся вароты, людзей пачалі зноў дзяліць — маладых і старых з малымі паасобку. На гэты раз адбіралі ўсіх хлопчыкаў гадоў 6—7. Забралі і сямігадовага суседскага хлопчыка Славу. Мы не ведалі, што дзяцей адбіраюць, каб браць з іх кроў, але разумелі, што іх чакае нешта страшнае. Як выратаваць Славу? Маці скінула з сябе адну спадніцу, зняла хустку і сказала мне: прабярыся непрыкметна да групы хлопчыкаў, хай Слава пераапранецца, быццам ён дзяўчынка, і бяжыце сюды. Так і зрабілі, пабег Славы з групы асуджаных на смерць дзяцей удаўся.

Нас пагналі да калгасных будынкаў, першую частку людзей запіхнулі ў хлеў. Мы не трапілі ў тую групу. «Усё, — падумалася, — тут нас і спаляць жывымі»... Ужо і дым з'явіўся, будынак загарэўся. У ім у страшэнных пакутах загінулі тыя, каму лёсам было наканавана трапіць у пачатак калоны. А нас адпусцілі... Можа, выратавала ікона «Неапалімая купіна», якую маці несла з сабою і ўвесь час малілася за выратаванне?.. Гэтая ікона адна засталася ў нас з усяго даваеннага нажытку.

Наступіў Вялікдзень. На ўсю вёску пафарбавалі адно яйка і раздавалі па

маленькаму кавалачку. А ў лесе працягвалася карная экспедыцыя. Здалёку былі бачны клубы дыму над Чорным балотам. Партызаны вялі бой, недзе там і наш Іван...

Пятро захварэў на тыф. Маці ўзяла яго на плечы, і ўсе мы накіраваліся ў в. Харомцы. Там жыў брат маці, дзядзька Валодзя. Мы ішлі і баяліся — раптам яго няма, вакол жа лютавалі карнікі... Але калі пастукалі ў акно, нам адчыніла цётка Аляксандра, выглянуў і дзядзька Валодзя. Як мы ўзрадаваліся, і цётка з дзядзькам былі рады, што мы жывыя... Маці, Пятро і я засталіся ў іх жыць, але хутка захварэла тыфам і я. У маці сэрца аблівалася крывёю. Мы абодва хворыя, ледзь жывыя. А дзе Оля з Нінай, дзе бацька з Іванам?..

А хутка немцы выгналі ўсіх людзей з хат і падпалілі вёску. Засталіся цэлымі лічаныя будынкі і царква. У ёй гітлераўцы зрабілі шпіталь. Некалькі вясковых жанчын працавалі ў ім, прыносілі цётцы і маці лекі, бінты. Мы пакрыху папраўляліся.

Неяк пад вечар немцы вывелі на двор жанчыну, бежанку са Смаленска, яе звалі Фросяй, разам з дзіцём на руках, прыгатавалі зброю... Маці кінулася да іх: не страляйце! Тады немец адпусціў Фросю, замест яе паставіў маці. Я падбегла і ўчапілася за аўтамат, адводзячы яго ўбок. Маці крычыць: «Уцякай, Аня, і цябе паставяць да мяне!» А я трымаюся за зброю, якая ў любы момант можа пачаць выкідваць смерць. Немец ударыў са злосцю маці прыкладам, павярнуўся і пайшоў. Так блізка прайшла ад нас смерць!.. Пухліна ад удару не прайшла ў маці да самага яе скону.

Неўзабаве пасля гэтага, вясной 1944 г., нас знайшоў бацька. Паведаміў, што захварэў Іван. Забраць нас да сябе ў партызаны ён не мог, прасіў здабыць палатна для перавязкі параненых, лепш бінтоў з нямецкага шпіталю. Ён пайшоў назад у атрад, і больш бацьку мы не бачылі.

Прайшло шмат часу, калі мы даведаліся, што здарылася з бацькам. На лясной дарозе ён сустрэў немцаў. Бацька растлумачыў, што вязе ў мяшку насенне для сяўбы, якое раздабыў у суседняй вёсцы. Тыя паверылі, адпусцілі. Але нехта падказаў ім, што адпусцілі дарма, гэта партызан... Немцы вярнуліся, схапілі мех з медыкаментамі і ўспаролі яго. Знайшлі партызанскі пропуск, тытунь... Пачалі біць, прывязалі да воза і пацягнулі да вёскі. Потым некуды адправілі, людзі гаварылі, што бачылі яго перад вывазам у лагеры ў Бабруйску. Невядома, дзе ён загінуў...

Чырвоная Армія была ўжо блізка, чутны гарматныя стрэлы, ноччу на ўсходзе відны зарыва і водбліскі бою. Змучаныя гадамі няволі, людзі з дня на дзень чакалі вызвалення. У адзін з летніх дзён фашысты пагналі ўсіх нас, жанчын, старых, дзяцей, у поле. Спачатку мы не зразумелі, у чым справа, але калі тут і там пачалі рвацца міны, на іх узляталі ў паветра целы, здагадаліся, што пагналі нас на міннае поле, каб абяскшкодзіць яго. Лёс быў міласцівым для нас і на гэты раз. У другім баку ў гэты час узнялася страляніна, мы ўбачылі салдат — сваіх, родных, доўгачаканых... Гітлераўцы, якія хацелі прарвацца праз мінае поле, кінуліся ў другі бок, у Бунеўскае балота, многія знайшлі ў ім свой бясслаўны канец.

Прыйшло, нарэшце, вызваленне. Людзі абдымалі, цалавалі сваіх збавіцеляў, маці плакала — ад радасці і адначасовага гора. Пра лёс бацькі і старэйшых дзяцей па-ранейшаму нічога не было вядома. Мы тады атрымалі ад салдат найсалодзейшы гасцінец — па драбку цукру, смак якога даўно забылі.

Стала вядома, што вызвалена і Старына. Мы забралі свой сціплы скарб і пайшлі дамоў. Пераначавалі ў Парэчы. Ваду даводзілася браць з рэчкі, калодзежы былі забіты людскімі целамі. Тут нас сфатаграфаваў карэспандэнт каля спаленай хаты, ад якой доўгім пальцам тырчаў у неба толькі комін.

Маці адмаўлялася — у парванай вопратцы, брудныя, але карэспандэнт настойваў: так і трэба, партызанская сям'я вяртаецца да роднага папялішча...

Да гэтага часу памятаю тую дарогу: усюды сляды нядаўняга бою, зранены, пасечаны снарадамі лес, разбомблены мост праз рэчку, прабірацца вымушаны былі па палях. Трупы людзей і забітых коней навокал...

Дабраліся, нарэшце, да вёскі. Хата наша згарэла, адзін калодзеж застаўся насярэдзіне двара. Дзе жыць?.. Не ўсе хаты ў вёсцы былі знішчаны, людзей уцалела вельмі мала, былі і пустыя будынкі. Мы пасяліліся ў адным з іх, дзе былі голыя сцены, напалову гнілая падлога, але, галоўнае, быў дах над галавой. Праз некаторы час нашаткала вялікая радасць — вярнуліся з палону Оля з Нінай. Ім удалося збегчы з прымусовых работ, услед стралялі, вопратку некалькі разоў прашывалі кулі, але, на шчасце, дзяўчаты засталіся жывымі.

Прыйшоў дамоў і Іван, узнагароджаны некалькімі баявымі медалямі. У армію яго не ўзялі, пасля нядаўна перанесенага тыфу ён быў вельмі слабы, ледзь хадзіў. Худы, страшэнны, у парванай вопратцы, на якой блішчаць медалі...

Выпадкова знайшлі ў сховішчы закапаную мінулай восенню бульбу. Маці парэзала яе на маленькія скрылікі, па адным вочку на кожным, мы ўсе ўпраглі ся ў плуг, пасадзілі бульбу. Ужо была надзея не памерці з голаду ў будучую зіму. Праз некаторы час Івана прызначылі старшынёй калгаса. На ўсю гаспадарку быў адзін хворы конь, але і ён хутка здох. Уся цяглавая сіла — жанчыны і дзеці. І зноў вярнуўся тыф. Я захварэла, а таксама Пятро, галоўнае, злегла маці. Ляжым усе ў чужой хаце, на саломе, нават накрыцца няма чым. Оля, Ніна і Іван увесь час на калгаснай рабоце. Прыбягуць, дадуць вады, лыжку-другую заціркі, і зноў у поле. Аднойчы прыехалі з Капаткевіч санітары. Суседзі, якія баяліся заходзіць у хату, каб не заразіцца, сказалі ім, што там ляжаць хворыя жанчыны, напэўна, ужо нежывыя, толькі хлопчык, здаецца, варушыцца яшчэ. Як нас выносілі, ні я, ні маці не памяталі. А потым захварэлі і Оля з Нінай, а там і Іван... Яго забралі ў шпіталь у Бабруйск, і маці, сама пасля нядаўняй хваробы, пешшу хадзіла туды, каб праведаць сына. Вярнулася знямоглая, з апухшымі нагамі, не ела, увесь час толькі піла ваду.

А тут новая бяда: высяляюць з хаты, хоць яна і не наша, чужая — у ёй будзе дзіцячы дом. Пусціла жыць да сябе суседка, удава, якая засталася адна з дачкой. Оля паехала вучыцца ў школу ФЗН у Пінск. Ніна падалася разам з ёю ў Заходнюю Беларусь на заробкі. На адным з хутароў знайшлі работу ў гаспадара, у якога жонка была гультайка, — жаць жыта. Гаспадар не верыў, што гэтыя слабыя дзяўчынкі могуць жаць, але яны так завіхаліся, што з другіх хутароў прыходзілі паглядзець... Зарабілі жыта, Ніна вярнулася дамоў, запрагла карову і прывезла яго ў Старыну. У калгасе ў той год нічога не далі на працадні, а мы змаглі восенню пасеяць азімую збажыну...

Г. Р. Вільчанка

Была вёска...

Доўгія Нівы — звычайная палеская вёска сярод лясоў і палёў. У ёй налічвалася 36 двароў, насельніцтва — звыш 100 чалавек. Была ў вёсцы пачатковая школа, вясковая крама. У 1928 г. сяляне арганізавалі калгас «Доўгія Нівы» — адзін з першых у Капаткевіцкім раёне. Звычайная вёска, звычайныя людзі са сваімі радасцямі, горам, марамі і спадзяваннямі...

Бяда прыйшла 29 сакавіка 1942 г. Тады асабліва лютавалі ў раёне карныя атрады. За тое, што жыхары Доўгіх Ніў аказвалі дапамогу партызанам, што многія жыхары вёскі знаходзіліся ў партызанскіх атрадах, што тут у пачатку 1942 г. знаходзіўся штаб атрада А. Міхайлоўскага, за тое, што славя-

не, што жывуць, што дыхаюць... Светлым вясеннім днём карнікі датла спалілі вёску разам з жыхарамі. У той дзень палала шматнаселеная суседняя Хвойня і іншыя вёскі, якія ў пасляваенныя гады змаглі ўзняцца з папялішча намаганнямі некалькіх дзесяткаў уцалелых жыхароў.

А лёс Доўгіх Ніў быў трагічным — параслі хмызняком і лесам грады, папялішчы, вуліца... Вёска знікла з твару зямлі, як легендарная Хатынь. Толькі, у адрозненне ад Хатыні, Доўгія Нівы засталіся забытымі, і нават не ўсе прозвішчы тых больш як 60 пакутнікаў, прах якіх пакоіцца ў Хвойні, удалося ўстанавіць...

А. В. Бічан

Нельга забыць...

Доўгія, трывожныя дні фашысцкай акупацыі. З суседняга Канаткевіцкага раёна даходзілі чуткі аб дзеяннях партызан. Летам 1942 г. за сувязь з імі былі арыштаваны жыхары в. Таргашын Ананас Руцкі і яго сын Мікалай. Неўзабаве схапілі і павезлі ў Петрыкаў яго брата Яўтена. У Лобчы ў час пераправы праз Прыпяць ён кінуўся з парома ў раку і ўцёк. Ананаса Пятровіча Руцкага расстралялі, а Мікалая адпусцілі. У пачатку 1943 г. ён стаў партызанам атрада Бабіча.

Восенню яшчэ большая трывога і неспакой авалодалі жыхарамі сяла. Страшныя чуткі ішлі аб вёсках Людзвіноў, Беразнякі, Сялюцічы, якія фашысты спалілі разам з людзьмі. Жыхарам Снядзіна зімой у 1943 г. некалькі разоў давялося ўцякаць з сем'ямі ў лясы.

Летам 1942 г. жыхар Снядзіна Андрэй Хамлюк сустракаўся з партызанамі і згадзіўся стаць іх сувязным. Праз некаторы час немцы і паліцаі прыбылі ў Снядзін, каб расправіцца з ім — ворагам стала вядома пра дзейнасць патрыёта. Андрэй Максімавіч працаваў у гэты час у полі. Устрывожаны шумам у сяле, схаваў каня і накіраваўся дадому. Яго спыніў паліцай і спытаў прозвішча. Андрэй Максімавіч назваўся чужым імем. Паліцай запытаўся, дзе знайсці Андрэя Хамлюка. Той згадзіўся «паказаць» і пры зручным выпадку ўцёк...

На наступны дзень Канстанцін Хамлюк, яго браты Яўхім, Васіль, Піліп, Андрэй, а таксама Яўхім Масла з сынам Мікалаем, Міхаіл Цімашэня разам з сем'ямі накіраваліся ў партызанскі атрад Дамброўскага, потым вярнуліся ў свае мясціны і былі прыняты ў атрад Трухановіча 130-й Петрыкаўскай брыгады.

Праз некаторы час другая група ў складзе 12 чалавек пад старшынствам Аляксея Руцкага накіравалася да ўкраінскіх партызан генерала Фёдарава. Снядзін стаў зыходнай крокай партызанскага краю, адкуль партызаны адпраўляліся на баявыя заданні. Немцы не пакідалі вёску ў спакоі, падыходзілі на бранякатэрах па рацэ і абстрэльвалі. У час такога абстрэлу разграмілі і спалілі Снядзінскую царкву, некалькі іншых будынкаў. Людзі пакідалі хаты і ратаваліся ў лесе. У небе лятралі нямецкія самалёты.

Ноччу 30 чэрвеня я начаваў дома. На змярканні выйшаў на вуліцу. Насустрач ішлі двое партызан. Адзін з іх, Мікалай Масла, загадаў мне неадкладна ісці ў лес і сказаць усім, каго пабачу, каб ніхто заўтра не прыходзіў у вёску, бо немцы збіраюцца спаліць яе разам з людзьмі. Мы ў той час жылі на востраве на балоце Гала, кіламетры два ад вёскі. Паведамленню аб заўтрашняй расправе ніхто не паверыў, усе жылі надзеяй вярнуцца ў свае хаты.

Назаўтра я прачнуўся зацемна. Птушкі, вітаючы світанак, поўнілі лес галасамі. Раптам неба разарвалі мінамётныя выбухі, аўтаматная і кулямётная страляніна. Людзі мігам усхапіліся і накіраваліся ўглыб лесу. Зусім побач, з паўночнага боку, узнялася страляніна. Я падаўся ў балота. Там сустрэў бабку Мікалаіху. Яна галасіла: «Ой, унучак, я бачыла страшны суд. Немцы

забівалі і палілі людзей. Што яны, праклятыя людаеды, нарабілі...» Калі бабуля крыху супакоілася, я спытаў: «Што гэта так моцна гуло ў тым баку?» «Гэта, унучак, шумеў пажар, усё сяло згарэла... Я ўратавалася ў пограбе...»

На другі дзень снядзінцы хавалі ахвяр тэрору. Іх было многа. Апускалі забітых і спаленых, абвугленых людзей у ямы, закручваючы ў посцілкі. У садзе, раскінуўшы рукі, ляжаў Сцяпан Каржаноўскі, непадалёку ад яго васемнаццацігадовая суседская дзяўчына Валянціна Занкевіч. У пограбе знайшлі сям'ю Пятра Руцкага — яго жонку Надзею Пятроўну, сына Аліка. Паліцай гаварыў немцу: «Там яшчэ людзі ёсць, давай паглядзім у засеку». Схаваўшыся за бочкай, у пограбе сапраўды сядзеў Уладзімір Дамасевіч, але немец загадаў ісці далей. Забілі маці чатырох маленькіх дзяцей Лідзію Дамасевіч. Спалілі жывым дзеда Алеся — Аляксандра Навака, застрэлілі яго суседку Марту Ястрэмскую з пяцігадовым унучкам Валодзем. У лесе злавілі Пятра Траяноўскага, яго жонку Арыну Рыгораўну, суседку Арыну Траяноўскую і пятнаццацігадовага Косціка Дамасевіча, прывялі ў вёску і тут расстралялі. Забілі нават старэйшую жыхарку Снядзіна 105-гадовую Аксенню Траяноўскую.

Адначасова са Снядзінам фашысты знішчылі Белін і Мардзвін. Белінцы хаваліся ў зарасніках лазы непадалёку ад вёскі. Сяргей Ладзінскі чуў, як фашысты катавалі яго дзядзьку, Івана Фёдаравіча Ладзінскага, кідалі ў агонь, ён выскакваў, крычаў. Фашысты смяяліся. На другой вуліцы Белына чынілі зверскую расправу над сям'ёй Адама Корзуна. Фашысты расстралялі яго маці, старэйшую сястру Марфу з чатырма дзецьмі, 24-гадовую сястру Маню і пятнаццацігадовую Ніну. Былі забіты Рэма Гудульская з маленькай дачкой, Ганна Масла з дачкой і многія іншыя. З сям'і Корзунаў уратаваліся толькі васемнаццацігадовы Уладзімір, які быў у партызанскім атрадзе Мельніка на Украіне, і трынаццацігадовы Коля, якому пашанцавала ўцячы ў лес і схавацца.

Нечалавечай лютасцю і звярствам вызначыліся фашысты ў Мардзвіне. Пра тую страшную трагедыю расказвае Капырына Мікалаеўна Пінчук. «З грудным сынам і свякрухай мы былі дома. На досвітку я выйшла на ганак. Наш Снядзінам стаяла зарыва. Я сказала свякрусе: здаецца, гарыць Снядзін. Мы хацелі бегчы ў лес, але адкуль не вазьміся з'явіўся немец, пагнаў нас на вуліцу. Там стаяла запражаная павозка — Якаў Кліменка хацеў ехаць з сям'ёю ў лес, але не паспеў. Нас пасадзілі на воз, дзе сядзелі жонка Якава і іх двое маленькіх дзяцей. Лавілі ўсіх мардзвінцаў, малых саджалі на воз, астатніх гналі пешшу. Я сядзела з немаўляткам на руках, з вачэй цяклі слёзы. Раптам адзін з немцаў загадаў мне злезці з воза. Я падумала, што мяне першую расстраляюць, перадала дзіця свякрусе. Немец штурхнуў мяне за плот і загадаў свякрусе аддаць дзіця. Яна паімкнулася сама пералезці праз плот, але немец піхнуў яе зноў на воз. Я схавалася ў просе і сядзела там да позняга вечара, баялася галаву ўзняць...»

Людзей спынілі ў цэнтры вёскі каля калодзежа. Пачалі кідаць у яго і маленькіх, і дарослых. Падняўся страшэнны крык, па тых, хто спрабаваў уцякаць, стралялі. Якаў Кліменка супраціўляўся, чапляўся рукамі за сценкі калодзежа, фашысты прыкладамі перабілі яму рукі, пакуль небарака не ўпаў у ваду. Дачцэ Якава Кліменкі, Еве, нейкім цудам пашчасціла схавацца і ўратавацца. Там, ля калодзежа, забілі і свякруху Капырыны Пінчук. Ва ўрочышчы Кульцёб фашысты захапілі некалькі сямей — больш дваццаці чалавек, паставілі іх на калені і пачалі расстрэльваць. Удалося ўратавацца толькі адной дзяўчынцы, Еве Буракевіч, яна апынулася пад кучай забітых людзей. Куды б ні беглі людзі, усюды іх сустракалі кулямёты або даганялі кулі. Толькі адзін немец не чапаў і напраўляў іх да Прыпяці, дзе праход быў свабодны. Тады ў Мардзвіне расстралялі дзевяноста чалавек, у Снядзіне больш чым пяцьдзесят...

Тыя, хто ўцалеў пасля страшнага пабоішча, жылі ў лесе. Партызаны ўстаноўлівалі пасты ў месцах магчымага з'яўлення немцаў. Будавалі зямлянкі, цёплыя курані, а некаторыя і невялікія хаткі. Узнікалі цэлыя лясныя пасёлкі — Жырынкі, Любянец, Мокрае, Сялецкае, Казёл, Магільск, Баркі, Лясны Луг. На Барках жылі сяляне з вёскі Славінск.

У сярэдзіне лістапада пачалі з'яўляцца адступаючыя мадзьярскія часці. Партызаны атрадаў Трухановіча, Дубіка і тураўскага атрада Прасолава сустрэлі мадзьяр у снядзінскіх лясах. З'явіліся і немцы. Над лясамі гулі самалёты. Наступілі вельмі цяжкія дні. Увесь ураджай, які з такой цяжкасцю ўдалося сабраць, аказаўся ў ворага. Надзея была толькі на бульбу, на якую хадзілі ноччу, абыходзячы шматлікія нямецкія заставы. Фашысты зрабілі налёт на пасёлак Казёл і захапілі большую частку людзей. Потым тое ж здарылася ў белінскім лесе. Замініравалі лясны пасёлак Сялецкае, там падарваліся Ганна Масла і Піліп Марцынкевіч, быў пакалечаны Пятро Масла.

З пачатку 1944 г. немцы часта прачэсвалі лясы. Мы начавалі ля вогнішча ў лесе, на дзень ішлі ў балота. Кароў трымалі ў самых непраходных пушчах. Трывога людзей перадавалася і жывёле: ні адна, якой бы галоднай ні была, панат не падасць голасу, а калі прыходзілася ўцякаць, каровы беглі наперадзе людзей...

У час аднаго з налётаў карнікі забілі Засіму Хальчэню, астатнія, дарослыя і дзеці, паспелі схавацца ў балоце. Карпікі ні на дзень не спынялі вайну з мірнымі жыхарамі, паляванне на людзей...

19 студзеня 1944 г. наш лясны лагер правёў ноч на востраве Зарэцкі. Раптам з боку ўрочышча Ясовае пачуліся стрэлы, адтуль беглі людзі з крыкамі: «Немцы!» Лагер мігам падхапіўся, мы кінуліся ўглыб балота. Мокры снег, халодны дождж, усе прамоклі, замерзлі, а касцёр раскласці нельга, дым выдасць.

Доўга сядзелі ў балоце. Трываць больш было нельга, рашылі выйсці. Было ціха, стрэлаў не чуваць. Не прайшлі і паўкіламетра, як наперадзе паказалася група партызан. Спыталі нас пра немцаў. Мы нічога не ведалі, партызаны пабеглі далей. Хутка ў тым баку пачаўся бой, кароткі і жорсткі. Тады загінулі Уладзімір Занкевіч і самы малады партызан са Снядзіна 16-гадовы Рыгор Занкевіч.

На тым небяспечным і цяжкім шляху нямала загінула землякоў — мірных жыхароў. Неяк ноччу наляцелі немцы, забілі дзяўчат у в. Таргашын — Наталлю і Валянціну Дарынскіх, Ніну Дубчэўскую. Загінула ў агні і маленькае дзіця Івана Ястрэмскага...

В. К. Навак

МУЖНАСЦЬ

...Сярэдзіна ліпеня сорак першага года. Трывога адчуваецца ўсюды... Людзі насцярожаныя, прыціхлыя, асабліва калі з'яўляецца незнаёмы чалавек. Вечарамі, сабраўшыся групкамі, паціху гамоняць і пільна ўслухоўваюцца ў выбухі, што даносяцца ад Пцічы: там, каля Хвойні, як расказваюць бежанцы, ідуць баі.

Ужо некалькі разоў над Петрыкавам праляталі самалёты з чорнымі крыжамі. Праўда, пакуль не бамбілі, але нагнаялі страху аднастайным гулам. З трывогай углядалася ў неба, дзе кружылі чужыя самалёты, і Ліда Чарнобылец.

А праз два дні ў Петрыкаў уступілі нямецкія часці...

Захопнікі, заняўшы Петрыкаў, размясціліся як дома. З'явіліся ваенныя і грамадскія ведамствы і ўстановы. Аднекуль прыехаў лесапрамысловец обер-маёр Крамер, які арганізаваў работу суднаверфі, пусціў два лесапільныя камбінаты. У былой гасцініцы размясціўся гебітскамісарыят. Часта можна было бачыць, як адтуль выходзіў тоўсты гітлераверц у форме генерала. Гэта быў гебітскамісар Рэдке — начальнік Петрыкаўскай акругі.

...Беглі дні, падобныя і не падобныя адзін на адзін. Аднойчы ў сакавіку 1942 г. у двор да Чарнобыльцаў заехала падвода. На возе, на мяшку з бульбай, сядзеў пажылы мужчына ў паношаным кажушку і шапцы-аблавушцы. Доўгая густая барада спускалася на грудзі, толькі вочы іскрыліся молада і хітравата.

— А божа ж мой! — першай усклікнула Дар'я. Але мужчына прыклаў да рота палец, і яна змоўкла. І толькі ў хаце дала волю сваім пачуццям. — Фама, ты адкуль, якім чынам?! — абдымаючы мужа, пыталася яна.

Ф. В. Кляўцоў

Л. М. Чарнобылец (Данцова)

В. М. Чарнобылец

— Усяму свой час, Дар'я,— ціха адказаў ён.

Не мог ён, былы чэкіст Фама Кляўцоў, вось так проста і адразу сказаць нанач жонцы, адкуль і па якой справе з'явіўся тут, у Петрыкаве. Ён прабіваўся з Беластока, удзельнічаў у абароне Магілёва, а потым трапіў, як і іншыя акружэнцы, у партызанскі атрад. Зараз яго цікавіла, што робіцца ў Петрыкаве, якія намеры фашыстаў.

Сувязь з Петрыкавам была неабходна партызанам. Аб гэтым ішла размова і ў камісара 135-га партызанскага атрада Івана Дубіка. Тады і прапанаваў свой план Фама Кляўцоў. Родам ён быў з вёскі Сотнічы, дзе і цяпер жылі яго бацькі. Немалаважна было і тое, што старастам у Сотнічах быў свой чалавек, які мог забяспечыць неабходнымі дакументамі для паездкі ў горад.

— Заданне адказнае,— гаварыў на развітанне камісар,— і, сам ведаеш, небяспечнае. Таму будзь асцярожны.

Даведаўшыся, што Васіль часта бавіць час з шафёрамі лесапрамыслоўца, Кляўцоў заўважыў:

— Добра было б, Васіль, каб ты яшчэ больш пасябраваў з імі, завяваў іх давер.

У знак згоды той кіўнуў галавой.

— Добра, пастараюся.

Калі, здавалася, усё было перагаворана, Фама Васільевіч адвёў Ліду ўбок, пасадзіў насупраць сябе і сказаў:

— Табе, Ліда, асобае заданне: паспрабуй уладкавацца на работу ў гебітскамісарыят.

— Што вы, Фама Васільевіч, як жа можна? — выракалася ў дзяўчыны.

— Не толькі можна, а і патрэбна,— сказаў Кляўцоў.— Расцэньвай гэта, як адказнае даручанне...

Гэтак жа нечакана, як і з'явіўся, Кляўцоў пачаў збірацца ў дарогу.

... Аднаго разу, вяртаючыся з работы, Ліда прачытала аб'яву, што ў гебітскамісарыят патрабуюцца прыбіральшчыцы. А праз некалькі дзён разам з Верай Шпак і Палінай Карасёвай яна ўжо завіхалася ў кабінетах і калідорах былой гасцініцы. Працавала так, як вучыў Кляўцоў. Старанпасць яе і праца вітасць хутка заўважылі акупанты. Лідзе даручылі прыбіраць у кабінеце гебітскамісара генерала Рэдкс.

Лейтэнант Гільзе дакладваў шэфу жандармерыі обер-лейтэнанту Карлу Бетта:

— Зноў лістоўкі,— і ён паклаў перад шэфам паперкі.— Расклеены былі на рынку, а вось гэта вісела на гебітскамісарыяце.

— Глядзі ты, якая дасведчанасць аб падзеях на фронце... Дарэчы, вы праверылі, ці выкананы загад аб тым, каб усе радыёпрыёмнікі, якія маюцца ў насельніцтва, былі здадзены?

— Так точна!

— І ўсё ж сувязь з Масквой у іх існуе. Як спыніць яе — над гэтым зараз трэба думаць...

Падпольшчыкі сапраўды слухалі Маскву. Аднойчы Ліда Чарнобылец паведаміла сваім сябрам, што ў адной з баковаў гебітскамісарыята ляжаць звалены ў кучу радыёпрыёмнікі, адабраныя ў насельніцтва.

— Вось бы нам хоць адзін! — усклікнуў Уладзічанскі.— Слухалі б паведамленні з Масквы, запісвалі б іх і распаўсюджвалі...

Ліда расказала пра свой план. Кожны, хто працаваў у гебітскамісарыяце, атрымліваў так званы месячны паёк — шаснаццаць кілаграмаў мукі. А што, калі ў мяшок з мукой непрыкметна пакласці радыёпрыёмнік? Немцы-вартавыя ў дзень выдачы пайка звычайна не правяралі пакункі супрацоўнікаў гебітскамісарыята. Так і вырашылі зрабіць. Дамовіліся, што ў гэты дзень да камісарыята пад'едзе на машыне Грабяненка. Ён як механік гаража карыстаўся ў немцаў даверам.

У вызначаны дзень і час Ліда выйшла на вуліцу са сваім пакункам. Яна ўсміхнулася немцу-вартавому, што стаяў ля ўвахода. У гэты час побач спыніўся аўтамабіль, за рулём якога сядзеў Грабяненка.

— Сядай, падвязу дахаты! — расчыніўшы дзверцы, запрасіў ён Ліду.

Тая махнула рукой вартавому, машына рванула з месца.

Прыёмнік «РПК-9» аказаўся старым, трохлямпавым, але пад умелымі рукамі Грабяненкі ажыў. Знайшлі і месца, дзе яго ўстанавіць. Яшчэ да вайны каля Уваскрасенскай царквы, непадалёку ад гаража, быў прабіты артэзіянскі калодзеж. Вада па трубе падымалася да купала, дзе была ўстаноўлена вялізная бочка. Там і ўстанавілі прыёмнік, каб слухаць Маскву. А назаўтра лістоўкі-паведамленні аб апошніх падзеях на фронце можна было прачытаць на тэлефонных слупах, на платах, а то і на сценах памяшкання гебітскамісарыята.

Нябачнымі для ворага ніцямі былі звязаны падпольшчыкі з партызанамі, у асноўным праз сувязных, адным з якіх быў Васіль Чарнобылец. Яму, хлапчыску, лягчэй было пакінуць горад, дабрацца да вёскі Сотнічы, дзе жыў васьмідзесяцігадовы бацька Кляўцова, і перадаць усё неабходнае. Часта за патрэбнымі звесткамі даводзілася звяртацца да самога старасты на прозвішчы Канёк. Наведваўся час ад часу ў Петрыкаў і Фама Васільевіч. Дом нумар тры па вуліцы Гогаля стаў пастаяннай явачнай кватэрай.

Неяк жніўеньскай раніцай 1942 г. Сцяпан Грабяненка забег на кватэру да Чарнобыльцаў, адвёў Васіля ўбок і сказаў:

— Нам загадалі рыхтаваць назаўтра машыны. Ад шафёра гебітскамісара Навадскага я даведаўся, што рыхтуецца карная экспедыцыя ў Шастовічы. Карнікі збіраюцца з коранем вынішчыць партызанскае гняздо. Твая задача — неадкладна паведаміць аб гэтым каму трэба.

— Будзе зроблена, — запэўніў юнак.

Назаўтра каля вёскі Глінішча, на паўдарозе да Шастовіч, карнікі былі спынены агнём.

Не паспелі фашысты апамятацца ад гэтай няўдачы, як была спалена машына, якая везла ў гарнізон зброю.

Для патрулявання па Прыпяці ў Петрыкаў прыбылі бранякатэры.

— Такое суседства нам не пажадана, — перадалі з лесу. За адну ноч усе маторы на бранякатэрах былі размарожаны, хоць абслугоўвалі іх немцы.

Усе гэтыя і іншыя аперацыі не на жарт устрывожылі фашыстаў. Яны вырашылі пасяліць у лес да партызан сваіх людзей. Падрыхтоўку такіх людзей усклалі на зондэрштаб «Р». Гэта арганізацыя для адводу вачэй займалася выпадам бы нарыхтоўкай сельскагаспадарчых прадуктаў і сыравіны, а на справе рыхтавала шпіёнаў для засылкі ў лес.

Ліда Чарнобылец выпадкова пазнаёмілася з супрацоўніцай гэтай арганізацыі Марыяй Ласка. Тая паведаміла, што ў хуткім часе наладзяць цесную сувязь з партызанамі.

— Якім жа гэта чынам? — пацікавілася Ліда, хоць добра зразумела, аб чым ідзе гаворка.

— Праз сваіх людзей, — самазадаволена адказала Марыя.

З гэтага часу Ліда пачала больш увагі ўдзяляць сваёй новай «сяброўцы». А неўзабаве падпольшчыца даведалася, што ў атрад Бабкова засылаецца правакатар — нехта Міранавіч. І калі той прыбыў, там яго ўжо чакалі.

Хутка партызаны атрымалі з Петрыкава яшчэ адну важную вестку. Да гэтага ўсе меркавалі, што ў вёсцы Белка стаіць нямецкі гарнізон. Але, як высветлілі падпольшчыкі, гарнізон там быў не зусім звычайны — армейская разведка. Аб гэтым было паведамлена ў цэнтр.

Раніцай Ліда дастала з куфра святочную спадніцу і кофту. Затым узяла два лязы і паклала іх у манжэты кофты. Вырашыла: калі што — жывой не давацца. Апранула жакет, на галаву завязала чырвоную матчыну хустку...

Ішла на работу як звычайна. Перад уваходам у гебітскамісарыят ветліва павіталася з вартавым. Той, усміхнуўшыся, адказаў ёй: ён ведаў прыбіральшчыцу гебітскамісара. Але калі прынялася за працу, рабіла ўсё неяк машынальна.

— Чаго ты носішся як угарэлая? — здзівілася Паліна Карасёва.

КОЗІНЕЦ Рыгор Ларыёнавіч, н. у 1910 г., прапаў без вестак.

КОЗІНЕЦ Сцяпан Апанасавіч, н. у 1899 г., рад., загінуў 20.3.1944 г.

КОЗІНЕЦ Якаў Іванавіч, н. у 1920 г., рад., загінуў 22.10.1942 г. пад Сталінградам.

КОЎГАР Пётр Іосіфавіч, н. у 1910 г., рад., загінуў у лістападзе 1944 г.

КУБЕЦ Мікалай Уладзіміравіч, н. у 1922 г., лейтэнант, загінуў 6.5.1943 г.

МАЗАЙ Аляксандр Фёдаравіч, н. у 1920 г., прапаў без вестак.

МАЗАЙ Антон Арцімонавіч, н. у 1918 г., сяржант, загінуў у маі 1945 г. у Германіі.

МАЗАЙ Архіп Дзянісавіч, н. у 1907 г., загінуў у верасні 1944 г.

МАЗАЙ Валяр'ян Іванавіч, н. у 1905 г., ветурач, загінуў у 1944 г. пад Беластокам.

МАЗАЙ Іван Кузьміч, н. у 1914 г., прапаў без вестак.

МАЗАЙ Іосіф Фёдаравіч, н. у 1922 г., прапаў без вестак.

Н. А. Дарошка

У. Р. Дзенісевіч

Р. С. Каляда

Ц. М. Кароткі

В. І. Мазай

І. Д. Пінчук

МАЗАЙ Міхаіл Фёдаравіч, н. у 1923 г., прапаў без вестак.

МАЗАЙ Рыгор Андрэевіч, н. у 1903 г., рад., загінуў у красавіку 1944 г.

МАЗАЙ Уладзімір Сяргеевіч, н. у 1918 г., загінуў у красавіку 1944 г.

МАЗАЙ Якаў Цімафеевіч, н. у 1910 г., рад., загінуў у верасні 1944 г.

МАЗУРКЕВІЧ Васіль Емяльянавіч, н. у 1921 г., яфрэйтар, загінуў 7.3.1943 г.

МАЗУРКЕВІЧ Мікалай Арцёмавіч, н. у 1919 г., рад., прапаў без вестак.

МАЗУРКЕВІЧ Міхаіл Емяльянавіч, н. у 1920 г., рад., прапаў без вестак.

МАЗУРКЕВІЧ Сцяпан Емяльянавіч, н. у 1923 г., прапаў без вестак.

МАЗУРКЕВІЧ Фёдар Арцёмавіч, н. у 1919 г., загінуў у красавіку 1944 г.

ПАЛЯК Аляксей Герасімавіч, н. у 1919 г., прапаў без вестак.

ПАЛЯК Адам Герасімавіч, н. у 1907 г., рад., загінуў у красавіку 1944 г.

ПАЎЛЮЧОК Рыгор Яўціхіевіч, н. у 1919 г., прапаў без вестак.

ПЕРАХОЦКІ Акім Антонавіч, н. у 1905 г., загінуў у красавіку 1944 г.

ПЕРАХОЦКІ Іван Антонавіч, н. у 1919 г., загінуў у красавіку 1944 г.

ПЕРАХОЦКІ Рыгор Паўлавіч, н. у 1913 г., танкіст, загінуў 8.2.1945 г. каля Будапешта.

ПІНЧУК Ігнат Дзмітрыевіч, н. у 1905 г., брыгадзір калгаса, рад., загінуў у красавіку 1944 г.

ПІНЧУК Пётр Дзмітрыевіч, н. у 1912 г., лейтэнант, загінуў у 1939 г. на р. Халхін-Гол.

ПРАТАСЕВІЧ Іосіф Нічыпаравіч, н. у 1917 г., прапаў без вестак.

САКОВІЧ Сяргей Паўлавіч, н. у 1912 г., прапаў без вестак.

САКОВІЧ Уладзімір Паўлавіч, н. у 1920 г., загінуў 18.3.1944 г.

САРОКА Ананій Дарафеевіч, н. у 1903 г., рад., загінуў у красавіку 1944 г.

САРОЧЫК Васіль Іванавіч, н. у 1925 г., рад., загінуў 18.3.1945 г.

САРОЧЫК Дзмітрый Цярэнцьевіч, н. у 1907 г., ст. лейтэнант, загінуў 12.12.1943 г.

САРОЧЫК Іван Дзяніcавіч, н. у 1912 г., прапаў без вестак.

САРОЧЫК Іван Яўхімавіч, н. у 1898 г., прапаў без вестак.

САРОЧЫК Фёдар Іванавіч, н. у 1921 г., рад., загінуў 18.3.1945 г.

СЕМКА Антон Канстанцінавіч, н. у 1902 г., загінуў у красавіку 1944 г.

СЕМКА Ціхан Фёдаравіч, н. у 1904 г., прапаў без вестак.

СЯРГЕЕЎ Аляксандр Сяргеевіч, н. у 1913 г., загінуў у маі 1944 г.

ХАНЧЭЎСКІ Іван Аляксеевіч, н. у 1918 г., загінуў у верасні 1944 г.

ХАНЧЭЎСКІ Іван Навумавіч, н. у 1921 г., загінуў у красавіку 1944 г.

ХАНЧЭЎСКІ Іван Прохаравіч, н. у 1896 г., рад., загінуў 27.9.1943 г. у Сумскай обл.

ХАНЧЭЎСКІ Мікалай Іванавіч, н. у 1916 г., загінуў у лістападзе 1944 г.

ХАНЧЭЎСКІ Фядос Аляксеевіч, н. у 1912 г., прапаў без вестак.

ХАРЛАНЧУК Васіль Мітрафанавіч, н. у 1921 г., прапаў без вестак.

ХАРЛАНЧУК Канстанцін Іванавіч, н. у 1905 г., рад., загінуў у красавіку 1945 г.

ХАРЛАНЧУК Канстанцін Сцяпанавіч, н. у 1905 г., рад., загінуў 26.4.1945 г. у Германіі.

ХАРЛАНЧУК Павел Кірылавіч, н. у 1921 г., сяржант, прапаў без вестак.

ХАРЛАНЧУК Рыгор Кірылавіч, н. у 1922 г., лейтэнант, загінуў у 1943 г.

ЦЯРЭШЧАНКА Сяргей Рыгоравіч, н. у 1918 г., лейтэнант, загінуў у 1943 г.

ЦЯРЭШЧАНКА Уладзімір Рыгоравіч, н. у 1920 г., матрос, загінуў у красавіку 1944 г.

ЧАУС Іосіф Антонавіч, н. у 1921 г., загінуў у сакавіку 1944 г.

ШУРПАЧ Зіновій Серафімавіч, н. у 1912 г., прапаў без вестак.

ШЫРХОЎСКІ Данііла Іосіфавіч, н. у 1906 г., загінуў у красавіку 1944 г.

ЯСЬКОЎ Васіль Юр'евіч, н. у 1921 г., загінуў у красавіку 1944 г.

ЯСЬКОЎ Юрый Міхайлавіч, н. у 1895 г., прапаў без вестак.

ЯЦУК Антон Рыгоравіч, н. у 1903 г., работнік міліцыі, лейтэнант, загінуў у 1942 г.

ВЁСКА ЧЫРВОНАЯ ГОРКА

БРЫКАЛАЎ Фёдар Фёдаравіч, н. у 1918 г., рад., прапаў без вестак у 1944 г.

ВОЙЦІК Лявон Іосіфавіч, н. у 1903 г., прапаў без вестак.

ДРАБІК Канстанцін Станіслававіч, н. у 1909 г., шафёр, загінуў 1.8.1944 г. пад Варшавай.

ЖУКОЎСКІ Аксант Андрэевіч, н. у 1922 г., рад., загінуў 29.1.1945 г. на Усходняй Прусіі.

ЖУКОЎСКІ Аляксей Максімавіч, н. у 1917 г., мал. сяржант, загінуў 15.1.1945 г.

КАРАНЬКО Аляксандр Іванавіч, н. у 1912 г., рад., загінуў у красавіку 1944 г.

КАРАНЬКО Уладзімір Іванавіч, н. у 1907 г., загінуў у красавіку 1944 г.

МЛЫШКЕВІЧ Браніслаў Антонавіч, н. у 1916 г., рад., загінуў у лістападзе 1944 г.

МІХНАВЕЦ Іван Сцяпанавіч, н. у 1908 г., рад., загінуў у жніўні 1944 г.

МІХНЕВІЧ Мікалай Рыгоравіч, н. у 1924 г., загінуў у студзені 1944 г.

РАДАМАН Аляксандр Іванавіч, н. у 1914 г., загінуў у сакавіку 1945 г.

РАДАМАН Іван Іванавіч, н. у 1920 г., рад., загінуў у 1942 г.

ЯРМАК Мікалай Сазонавіч, н. у 1920 г., матрос, загінуў 12.2.1945 г. у Верхняй Сілезіі.

ЯСЬКОЎ Васіль Юр'евіч, н. у 1920 г., загінуў у красавіку 1944 г.

ЯСЬКОЎ Уладзімір Фаміч, н. у 1919 г., загінуў у 1943 г. пад Ленінградам.

* * *

Раённая і сельскія камісіі па падрыхтоўцы і выданню кнігі «Памяць», грамадскасць раёна правялі вялікую пошукавую работу па ўстанаўленню імён загінуўшых землякоў-воінаў і партызан, мірных жыхароў, тых, хто аддаў жыццё ў час ліхалецця пры акупацыі раёна і яго вызваленні. На жаль, нельга з упэўненасцю сказаць, што ўсе да аднаго загінуўшыя занесены ў жалобны спіс, усе прозвішчы ўстаноўлены. Работа па іх пошуку і ўвекавечанню працягваецца.

1945

ДА НАШЫХ ДЗЁН

НА ВЫЗВАЛЕНАЙ ЗЯМЛІ

У ліпені 1944 г. Петрыкаўскі і Капаткевіцкі раёны былі вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Вайна пагрукатала далёка на захад, яшчэ доўга было да жаданай перамогі, а на папялішчах трэба было ладзіць мірнае жыццё, залечваць нанесеныя ворагамі цяжкія раны. Петрыкаўшчына, дзе на Пцічы на паўгода (са студзеня 1944 г.) спыніўся фронт, вяліся бесперапынныя баявыя дзеянні, пацярпела асабліва моцна. У вёсках згарэла і было разбурана звыш шасці тысяч хат, поўнасцю спалены і разрабаваны гарадскі пасёлак Капаткевічы, часткова — Петрыкаў. Цяжкасці ўзнаўлення, як і на ўсёй Беларусі, былі неймаверныя — не было насення і цягла, асабліва востра стаяла праблема жылля для сялян, а галоўнае — не хапала рабочых рук. Мужчыны працягвалі кровапралітныя баі; несучы свабоду ў чужыя краіны, і многім з іх, вызваліўшым родны край, накананавана было назаўсёды застацца ў сырой зямлі чужбіны... Вайна яшчэ доўга давала знаць аб сабе і тут, у глыбокім тыле, наваколле не раз скаланалі выбухі — зямля на месцы былых баёў была густа засмечана смяротнымі атрыбутамі вайны, на мінах, пакінутых ворагамі, узрываліся мірныя жыхары, дзеці.

Восенню 1944 г. у раёнах працавала камісія па вызначэнні страт, нанесеных акупантамі на часова захопленай тэрыторыі. У актах расследаванняў злачынстваў, здзейсненых нямецка-фашысцкімі захопнікамі на тэрыторыі Петрыкаўскага і Капаткевіцкага раёнаў, прыводзяцца наступныя даныя: за час акупацыі, з жніўня 1941 г. да ліпеня 1944 г., у Петрыкаўскім раёне загінула 2570 ні ў чым не павінных людзей, у Капаткевіцкім 2836, а ўсяго на тэрыторыі сучаснага Петрыкаўскага раёна расстраляна, павешана, спалена 5406 мірных жыхароў, у тым ліку больш чым 300 дзяцей. Угнана ў рабства ў Германію 4132 чалавекі. Боль ад тых страт не згасла да сённяшняга дня...

Уся арганізацыйная і кіруючая работа па ўздыме разбуранай гаспадаркі з папялішчаў легла нялёгкім грузам на райком КП(б)Б і райвыканком, іх кіраўнікоў — першага сакратара Петрыкаўскага райкома партыі І. М. Глушко і старшыню РВК А. М. Волкава, Капаткевіцкага — Ф. Д. Кудраўца і Герасіменку, былых партызанскіх камандзіраў, будні якіх у мірны час былі ніколькі не лягчэйшымі, чым у гады барацьбы з ворагам. Першая і найбольш важная задача ў пасляваенныя гады — будаўніцтва жылля. Трэба было як мага хутчэй перасяліць людзей з зямлянак у хаты. 52 калгасы, найбольш пацярпеўшыя ў гады акупацыі, былі поўнасцю вызвалены ад працапавіннасці, каб усе сілы прыкласці на ўласнае будаўніцтва. У першы год пасля вызвалення раёна было пабудавана каля трох тысяч хат і будынкаў, прыгодных для часовага жыцця. У 1946 г. у сельскай мясцовасці пабудавана 580 дамоў, у 1947 г.— 720, у 1948 г.— 535. Для патрэб будаўніцтва ў першую чаргу трэба было аднавіць работу цагельнага завода. У маі 1945 г. ён пачаў даваць прадукцыю, да канца года было выпушчана каля 70 тыс. цаг-

лін. Ганчарны цэх вырабіў посуду дамашняга абіходу на 3150 літраў.

Узнаўленне калгасаў — не менш важная задача, якая стаяла ў парадку дня. Увосень 1944 г. з вялікімі цяжкасцямі была праведзена сяўба азімых. Дзяржава дапамагла насеннем. Пасяўная была праведзена ў тэрмін. Дапамагала ўся краіна. Дзяліліся апошнім людзі з Кобрынскага, Іванаўскага, Лунінецкага, Пінскага, Бярозаўскага раёнаў. Многія сяляне хадзілі ў заходнія раёны Беларусі, якія менш пацярпелі, выменьвалі прадукты харчавання на рэчы, якія захаваліся ад акупантаў, ці ўладкоўваліся на працу, зараблялі кавалак хлеба.

У шэрагу першачарговых задач была таксама арганізацыя работы школ, пуск прадпрыемстваў, сельгаспадатак... Катастрафічна не хапала настаўнікаў, у першы пасляваенны год адкрыта педагагічнае вучылішча ў Капцэвічах, потым яго перавялі ў Петрыкаў. У 1945 г. у Петрыкаўскім раёне працавала 53 школы, у якіх навучалася 3300 вучняў. Большасць іх мясцілася ў непрыстасаваных будынках і зямлянках. Сіротам і сем'ям ваеннаслужачых выплачвалася дапамога і пенсія. За год раённым аддзелам сацыяльнага забеспячэння было выплачана каля 2 мільёнаў рублёў, мнагадзетным маці — 160 тысяч рублёў. У ліпені 1945 г. у вёсках раёна працавала 120 радыёкропак, тэлефанізавана большасць арганізацый і сельскіх саветаў. Адноўлена 62 кіламетры дарог, пабудавана 17 і адрамантавана 38 мастоў. За вясенні сезон калектыў сплаўшчыкаў сплавіў 3 тысячы кубаметраў драўніны.

Адразу пасля вызвалення была ўзноўлена работа раённага аддзела аховы здароўя. Адкрыты 4 урачэбныя пункты — у Ляскавічах, Грабаве, Бабунічах і Смятанічах, бальніца ў Петрыкаве, 6 акушэрскіх пунктаў, 3 паліклінікі, 2 дзіцячых ясляў, малярыйны пункт, фельчарска-акушэрскія пункты ў Курыцічах, Конкавічах... У Капаткевіцкім раёне працавала раённая бальніца на 50 ложкаў. У вёсках раёна было адкрыта дзве бальніцы, амбулаторыя і 9 фельчарска-акушэрскіх пунктаў.

Пачаліся работы па ўзнаўленні буйнейшага прадпрыемства — суднабудаўнічага завода. Абсталяванне яго было вывезена ў Германію, большасць цэхаў разбурана. Заснаваны яшчэ ў XVIII ст., завод за гады свайго існавання выпусціў і адрамантаваў не адну сотню параходаў, баржаў, прадукцыю яго до-



Будынак бальніцы ў Капаткевічах

бра ведалі на ўсіх рэках ад Балтыйскага да Чорнага мораў, суднаверф неаднаразова з'яўлялася прызёрам ВДНГ краіны. Да канца 1945 г. па заказу ваеннага камандавання на ваду былі спушчаны пяць суднаў, а ў далейшым суднаверф поўнасцю перайшла на выпуск і рамонт катэраў і барж для мірных мэт.

У Петрыкаўскім райпрамкамбінаце працавалі сталярны цэх, які выраблял сталы, табурэткі, куфры, бочкі, а таксама фарбу; лесазавод — у 1946 г. на будоўлі паступіла 250 кубічных метраў піламатэрыялаў; млын, дзе ў 1945 г. перапрацавана 1000 ц мукі, у 1946 г. — 4000 ц, у 1948 г. — 3400 т, у 1949 г. — 5200 т.; у швейным цэху пашылі за год 125 сукенак, 50 мужчынскіх сарочак, а таксама жаночай і дзіцячай бялізны на суму звыш 25 000 рублёў. Цагельны завод № 18 выпускаў у год 132 000 штук цэглы, цагельна-чарапічны завод у Дарашэвічах — 120 000 штук цэглы і 55 000 чарапічных пліт, кузня, дзе выраблялася 15 т металічных вырабаў на 6000 рублёў. Леспрамгас нарыхтоўваў звыш 3000 кубічных метраў лесу для патрэб будоўлі, 7000 — дроў, а таксама вывозіў матэрыял і дровы, працаваў лясгас, быў лакамабіль для выпрацоўкі электраэнергіі.

У 1947 г. у Петрыкаўскім раёне налічвалася 67 калгасаў і рыбгас, у якіх было 6560 гаспадарак. З асабістых гаспадарак паступала дзяржаве большая частка падаткаў. У 1948 г. пастаўкі мяса калгасамі склалі 733 ц, калгаснікамі — 1680, рабочымі і служачымі — 60, аднаасобнікамі — 11 ц. У 1948 г. дзяржаве было пастаўлена мяса калгасамі 753 ц, індывідуальнымі гаспадаркамі — 1860, малака — 233 000 л (пры плане 308 000) і 520 000 л, яек — адпаведна 78 560 (план 53 000) і 214 000 шт., воўны — 1580 і 65 кг, скур свіных — 300 і 17 (план 540), бульбы — 17 305 ц калгасамі і 10 440 ц калгаснікамі. Ніводная лічба плана не была выканана. Прыкладна такія ж паказчыкі выканання планавых заданняў былі і ў наступныя гады, план пастаўкі мяса ўвесь час павялічваўся, а выкананне яго заставалася на адным узроўні, а малака і яек зніжаўся. Планавалася таксама вытворчасць брынзы, у калгасах яе выраблялася чвэрць задання, калгаснікамі не здадзена ні аднаго кілаграма. Да 1951 г. быў дасягнуты даваенны ўзровень вытворчасці ў жывёлагадоўлі, а ў штушкагадоўлі і свінаводстве паказчыкі былі вышэйшымі, чым у 1940 г.

З году ў год, пакуль не пачалася ў 60-х гадах вялікая меліярацыя, нязначна павялічваліся пасяўныя плошчы, ачышчаліся ад злавеснага смецця мінныя палі. У 1949 г. у Петрыкаўскім раёне было пасеяна 4570 га азімых, 2170 — бульбы, 45 — пшаніцы, 360 — ячменю, 1175 — аўса, 2505 — грэчкі, 560 — проса, 238 — ільну, 70 — канапель, 2240 — гародніны, 8 — фасолі, па 2 гектары гароху і цукровых бураковў. У Капаткевіцкім раёне пасеяна збожжавых 6320 га: 620 — пшаніцы, 1700 — аўса, 3100 — грэчкі, 500 — проса, 400 — ячменю, бульбы — 1670 га, тэхнічных культур — 1315 га. Меліярацыйныя работы толькі пачыналіся на землях асобных калгасаў. Ініцыятарамі іх выступілі земляробы калгаса «Бальшавік», дзе значная частка ўгоддзяў была забалочана. Уручную секлі хмызняк, ачышчалі балоты, адваёўвалі гектар за гектарам прыгодных для севу плошчаў. У краіне адчувалася вялікая патрэба ў натуральным каўчуку і гуме, у многіх гаспадарках пачалі культываваць новую для гэтых мясцін паўднёвую расліну кок-сагыз. Высокімі ўраджаямі яго на асушаных балотах славіліся земляробы калгаса «Бальшавік». Майстрам высокіх ураджаяў кок-сагызу І. В. Сітніцы, А. С. Рудакоўскаму, Г. І. Буднік, якія атрымлівалі да 60 ц з гектара гумавага кораня, было прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы, многія калгаснікі атрымалі высокія ўрадавыя ўзнагароды.

З дакладу старшыні Петрыкаўскага РВК «Аб рабоце райвыканкома за 1948—1950 гг.»: «У 1944 г. пасяўны клін у раёне складаў 2000 га — 18 пра-

Кірмаш у Капаткевічах

цэнтаў да даваеннага, у 1948 г. — 86,7, у 1949 г. — 94 працэнты, у 1950 г. асвоены ўсе плошчы. Ураджайнасць складала: збожжа ў 1945 г. — 3,5 ц, у 1946 г. — 4, у 1947 г. — 4,3, у 1948 г. — 5,7, у 1949 г. — 6, у 1950 г. — 7,5 ц з гектара, бульбы — адпаведна 35, 40, 42, 46, 47 і 85 ц, тэхнічнага валакна — 1,5, 1,7, 1,8, 2, 2,8 і 3 ц з гектара. Яшчэ меншая ўраджайнасць была ў гаспадарках Капаткевіцкага раёна: збожжавых у 1951 г. атрымана 4,2 ц з гектара, бульбы — 40, тэхнічных культур — 1,7, кок-сагызу — 8,5 ц... Мелася 980 коней, 1190 валоў. Кошт працадня: у 1948 г. — 0,73 кг збожжавых, у 1949 г. — 0,67, у 1950 г. мяркуецца выдаць на працадзень 1 кг збожжа і 3 — 4 кг бульбы. У галіне жывёлагадоўлі ў гаспадарках раёна налічвалася 926 галоў буйной рагатай жывёлы пры плане 820, авечак — 7268 пры плане 7900, свіней — 1835 пры плане 1900, птушкі — 7182 пры плане 15 000. Прычыны невыканання плана — недахоп сродкаў у гаспадарках на закупку жывёлы, адсутнасць пабудоў. У мэтах арганізацыйнага ўмацавання гаспадарак праведзена аб'яднанне калгасаў, з 57 створана 26, 12 гаспадарак засталіся ў сваіх ранейшых межах...»

Калгасныя землі апрацоўваліся тэхнікай Петрыкаўскай, Капаткевіцкай, Навасёлкаўскай МТС, у якіх налічвалася каля 200 трактароў, 21 камбайн, звыш 50 сеялак. Паступалі магутныя трактары С-80, бульдозеры і канавакапалкі.

У 1953 г. у Петрыкаўскім раёне налічвалася 22 калгасы: «1 Мая», «Ленінец», «Чырвоны маяк», імя Чкалава, імя Панамарэнкі, «Першамай», імя Сталіна, імя Жданава, «Іскра», «Бальшавік Палесся», «Камсамолец», «Мічурынец», імя Малянкова, імя Кірава, «Чырвоны будаўнік», «Чырвоны Кастрычнік», імя Калініна, імя Варашылава, імя Молатава, «Заветы Ільіча», «Пераможац», «Бальшавік»; у Капаткевіцкім раёне — 24 калгасы: імя Сталіна, імя Калініна, «2-я пяцігодка», імя Фрунзе, «Чырвоны маяк», імя Кагановіча, імя Варашылава, імя Леніна,

Петрыкаў. Вуліца Р. Люксембург

імя Кірава, імя Молатава, імя Шверніка, «Шлях Леніна», «Бальшавік», імя К. Маркса, «Ленінскі шлях», «Чырвоны Кастрычнік», «Чырвоная Армія», «Чырвоны партызан», «Савецкая Беларусь», «Чырвоны сцяг», «Чырвоная зорка», імя Жданава, «Камінтэрн», «Чырвоная вёска».

У 1955 г. на палі Петрыкаўшчыны прыйшла кукуруза. Яе ў Капаткевіцкім раёне было пасеяна 1300 га, прыкладна столькі ж займала культура ў Петрыкаўскім раёне. Вопыт вырошчвання гэтай перспектыўнай кармавой культуры даў добры плён, на асобных плошчах убіралі больш 200 ц зялёнай масы з гектара, у далейшыя гады ўраджайнасць была значна большай. Усё больш ужываліся мінеральныя ўгнаенні, торф, арганічныя ўгнаенні. У перадавых гаспадарках ужо атрымлівалі да 20 ц з гектара збожжавых, звыш 150 ц бульбы.

Жыццё на вёсцы ўваходзіла ў мірнае рэчышча, паступова залечваліся раны, нанесеныя вайной. 25 снежня 1962 г. быў ліквідаваны Капаткевіцкі раён, яго землі далучаны да Петрыкаўскага раёна. У 1965 г. была закончана поўная электрыфікацыя раёна. У в. Смятанічы, непадалёку ад Петрыкава, узведзе-

40-годдзе Вялікай Перамогі. Сустрэча партызан 130-й Петрыкаўскай брыгады

ны буйнейшы ў рэспубліцы тэлевізійны рэтранслятар. Вышыня мачты дасягае 352 м, з яе дапамогай прымаюцца і перадаюцца ўсе праграмы Маскоўскага і Мінскага тэлевізійных цэнтраў у радыусе звыш 100 км.

У 1968 г. у раёне пачалі культываваць мяту — важную сыравіну для кандытарскай вытворчасці. Гэтую культуру на плошчы каля 1000 га вырошчваюць у саўгасах «Петрыкаўскі», «Галубіцкі», «Ляскавічы», «Камаровічы» і «Заветы Ільіча». У гаспадарках адкрыты пункты па прыёму і перапрацоўцы сыравіны, з якой атрымліваюць за год 8—10 т масла.

...Не мінула тэрыторыю раёна чарнобыльская бяда. Дзевяць населеных пунктаў аказаліся ў зоне радыеактыўнага заражэння ад 1 да 5 кюры. Агульнымі намаганнямі ўдаецца ліквідаваць цяжкія наступствы нацыянальнай трагедыі. Жыццё працягваецца; як кветка, як кожны лісток, былінка вясной цягнецца да сонца, яно спрадвечна імкнецца да святла, да вечнасці, да разумнага і добрага...

Васіль Феранц

«СТАЛІНСКАЯ ПРАЎДА», 1944 г.

З верасня 1941 г. да ліпеня 1944 г. акупанты спалілі ў раёне 39 вёсак, 5936 будынкаў, 468 грамадскіх пабудоў... Спалілі і разбурылі 40 школьных памяшканняў, пашкодзілі 28, знішчылі 3 дзіцячыя дамы, 14 Дамоў культуры. У сувязі з гэтым выканком райсавета рашыў: аднавіць 2 сярэднія школы ў г. Петрыкаве, 5 няпоўных сярэдніх і 57 пачатковых школ у сельсаветах.

Выканком абавязаў старшынь сельсаветаў, дырэктараў і загадчыкаў школ адрамантаваць школьныя памяшканні сіламі вучнёўскіх, настаўніцкіх і бацькоўскіх брыгад да 1 верасня 1944 г.

Адкрыць 15 клубаў, гарадскую бібліятэку, спецдзетдом, дзіцячы сад, педкабінет... У Бабуніцкім, Грабаўскім, Асавецкім, Глініцкім, Снядзінскім сельсаветах часова адкрыць школы ў зямлянках, папярэдне абсталяваўшы іх.

14 жніўня

Жыццё ўзнаўляецца

...Зараз адноўлена 65 калгасаў, 12 жывёлагадоўчых ферм. Зноў распачалі працу 2 сярэднія школы, 5 няпоўна-сярэдніх і 40 пачатковых. Аднавілі працу 3 прамысловыя арцелі, цагельны завод, суднаверф, днямі будзе пушчаны райпрамкамбінат.

Адбудаваны корпус райпрамкамбіната. Устаноўлены лакамабіль, працуе паравая мельніца, крупадзёрка. Заканчваецца ўстаноўка цыркуляркі і лесапільнай рамы. У бліжэйшыя дні пачнецца будаўніцтва корпуса пад электрычную станцыю. Асабліва вызначаюцца ў працы мантажнікі Піліп Сокал, Фёдар Міцура, кузнец Сямён Сямёнаў, цясляр Канстанцін Петрушэнка, якія працуюць за дваіх. Дырэкцыя завода прэміравала стаханаўцаў.

Сяляне, нягледзячы на выключна вялікія цяжкасці, засеялі 2011 гектараў азімых. Здалі Радзіме сотні цэнтнераў збожжа. Яны жывуць толькі адным імкненнем: хутчэй адрадзіць грамадскую гаспадарку, вярнуць былую славу раёну...

6 верасня

53 школы, 2 дзіцячыя дамы паўсядзённа выхоўваюць маладое падрастаючае пакаленне нашага раёна... Працоўныя г. Петрыкава паглядзелі звыш 100 савецкіх кінафільмаў.

Райаддзелам сувязі атрымана па адрасах працоўных раёна каля 142 тысяч пісьмаў, звыш 320 тысяч газет і часопісаў, каля 4 тысяч тэлеграм, адпраўлена ў розныя канцы Савецкага Саюза звыш 130 тысяч пісьмаў, 62 тысячы газет, тысяча тэлеграм.

25 верасня

З пастановы Савета Народных Камісараў БССР аб мерах аказання дадатковай дапамогі Петрыкаўскаму раёну як асабліва пацярпеўшаму ад нямецкай акупацыі:

«Давесці трактарны парк Петрыкаўскай МТС да вясны 1945 г. да 30 адзінак. Выдзеліць 10 дыскавых барон, 10 культыватараў, 15 трактарных плугоў, грузавую машыну. Пусціць у эксплуатацыю мельніцу, крупарушку, піларраму і электрастанцыю.

Для аказання дапамогі дзецям-сіротам, дзецям воінаў і інвалідаў Айчыннай вайны выдзеліць Петрыкаўскаму раёну ў першым квартале 500 пар дзіцячага абутку, 500 камплектаў адзення, 200 метраў мануфактуры.

Стварыць у калгасах будаўнічыя брыгады і накіроўваць іх для будаўніцтва дамоў інвалідам вайны, многадзетным сем'ям воінаў Чырвонай Арміі...»

11 кастрычніка

«БАЛЬШАВІК ПАЛЕССЯ», 1944 г.

На ўборачным фронце

У калгасе «Бальшавік Палесся» створана маладзёжная брыгада ў саставе 18 дзяўчат. Усе яны працуюць старанна, з энтузіязмам, паказваюць узоры высокапрадукцыйнай працы на ўборцы ўраджаю.

У першы дзень пры норме 0,08 га яны зжалі па 0,21 га, на другі — па 0,25 га. Лепшымі людзьмі гэтай брыгады з'яўляюцца: брыгадзір Зданевіч Аляксандра, Марціновіч Ольга, Піскун Ольга, Зданевіч Анна, Васкевіч Праскоўя, Васкевіч Алена і іншыя.

11 жніўня

Моладзь на сяўбе азімых

У пачатку асенняй сяўбы ў Грабаўскім сельсавеце па рашэнню бюро РК ЛКСМБ адбыўся першы злёт камсамольскай і несаюзнай моладзі. Гэты сельсавет з'яўляецца адным з вельмі пацярпеўшых. У ім спалены літаральна ўсе будынкі. І вось у вельмі цяжкіх умовах моладзь рашыла паспяхова правесці асеннюю сяўбу. На гэтым злёце моладзь расказала аб сваім удзеле ва ўборцы і тут жа былі створаны 7 звенняў высокага ўраджаю, з ахопам 80 чалавек моладзі...

У калгасе «Перамога» арганізуючую ролю ў рабоце звенняў адыгрывае камсамольская арганізацыя (сакратар Ніна Сайдзель). Тут створана два звяны па апрацоўцы зямлі на чале з камсамолкамі. Члены звенняў Аўдоцця Касец, Анюта Голас, Анюта Кілбас, Маруся Голас і іншыя ўскопваюць па 0,06—0,07 га зямлі на глыбіню 12 см.

28 верасня

Плады нашай працы

З разгортваннем азімай сяўбы ў калгасе імя Варашылава Белкаўскага сельсавета было арганізавана звяно высокага ўраджаю. У яго ўвайшлі 10 чалавек. Яны ўручную ўскапалі 10 гектараў. Звеннявая Дуня Музыка з'яўляецца сапраўдным арганізатарам. Яна сваім асабістым працоўным прыкладам вядзе за сабой астатніх членаў звяна. Па 0,06—0,07 га яны ўскопвалі штодзённа. Цяпер камсамольска-маладзёжнае звяно так жа добра працуе на малацьбе і намалаціла ўжо 9 т жыта.

Камсамольская арганізацыя калгаса наладзіла збор падарункаў і сродкаў у фонд дапамогі дзецям-сіротам. У выніку праведзенай работы дзетдому пераданы кружкі, лыжкі, ручнікі, прадукты харчавання і інш.

19 лістапада

З руін і папялішчаў

Гітлераўскія вандалы за час свайго панавання ў Петрыкаўскім раёне зрабілі страшэнныя разбурэнні... Адступаючы пад магутнымі ўдарамі Чырвонай Арміі, нямецкія захопнікі пакінулі на тэрыторыі раёна каля 500 тысяч мін.

Многія калгасы і прадпрыемствы дабіліся канкрэтных поспехаў. Члены сельгасарцелі імя Чкалава Брынёўскага сельсавета, своечасова закончыўшы сяўбу, поўнасцю разлічыліся з дзяржавай па ўсіх відах абавязковых паставак. Яны выдзелілі ў фонд дапамогі сем'ям чырвонаармейцаў 500 кілаграмаў зярна...

60-гадовы калгаснік Пётр Фларыянавіч Мароз з калгаса «Чырвоны Сцяг» сказаў:

— Больш дзесяці год я працую ў калгасе, а з такой энергіяй, як зараз, я ніколі не працаваў. Хачу сваёй працай аддзякаваць Чырвоную Армію за вызваленне, дапамагчы сваім сынам Уладзіміру і Францу, якія на фронце б'юць нямецкую погань. Гэтай восенню я ўзараў і засеяў у калгасе 15 гектараў азімага жыта...

2 снежня

Выбухі за ваколіцай

Набліжаўся час вызвалення. Наша зона стала прыфрантавой. Цяжкія баі былі за в. Замошша, якую немцы ўсімі сіламі стараліся ўтрымаць. Тут у балотах палягло вельмі многа нашых салдат. У пачатку сакавіка 1944 г. нас выселілі на хутар Сабаў. Мы рады былі і таму, што там было многа елак, з лапак якіх добра будаваць курані. Але затрымаліся там нядоўга. Лагер снядзінцаў і таргашынцаў рушыў углыб Лельчыцкага раёна. Прыйшлі ў в. Лельчыцкая Буда, але тут месца знайшлося нямногім. Не лепшае становішча было ў в. Лельчыцкі Падворак. Ужо апоўначы нас прытулілі добрыя людзі, дзед і баба Шумікі ў в. Ліпляны. Другая частка нашай сям'і размясцілася ў іх сына Паўла. Мне бабка Шумічыха адвяла месца на лаве, з якой на наступны дзень я не падняўся — тыф. Гэтай хваробай перахварэла ўся сям'я, за выключэннем маці. Некаторыя снядзінцы тут памерлі. У Ліплянах, якія раскінуліся ля Убарці, жылі вельмі добрыя, спагадлівыя людзі. Сям'я Данілы Лося з шасці чалавек узяла да сябе ў невялікую хатку снядзінцаў Мікалая Ястрэмскага з двума хлопцамі, Карла Марцынкевіча з дачкой Анютай, Людмілу Руцкую, Марыну Ястрэмскую з дзіцём, Вольгу Літнер.

У сярэдзіне мая мы дачакаліся, нарэшце, вызвалення. Дамоў вярнуліся ў пачатку жніўня. Размясціліся вакол сяла на палях і ў лясах — вёска была густа замініравана. Першай ахвярай стаў бакеншчык Пятро Руцкі, які падарваўся на міне.

У вёску прыехаў старшы лейтэнант Зуйкевіч. Ён сабраў прызыўнікоў 1927—1928 гг. і пачаў вучыць міннай справе. У нашай мясцовасці былі ўстаноўлены чатыры віды мін: супрацьпяхотныя, асколачныя, супрацьтанкавыя і балотныя нацяжнога дзеяння, яны ставіліся ў балотах на палках. Адзіным інструментам, з дапамогай якога мы знаходзілі міны, — шчуп, кавалак тоўстага дроту, прымацаванага да доўгай палкі. Быў і мінашукальнік, але карыстацца ім немагчыма — усё зарасло высокім бур'яном.

У першую чаргу праверылі вуліцы. Рухаліся вельмі марудна. Міны знаходзілі ў самых нечаканых месцах. Усё ішло добра, але на трэці дзень апоўдні з боку ракі пачуўся выбух. Хтосьці крыкнуў: «Гэта на Вудамлі!» Мы пабеглі туды. На полі стаяў салдат, устрывожана выкрыкваў: «Шэін, Шэін!» Раптам падхапіўся той самы Шэін і ў бяспамяцтве стаў кідацца па полі. Мы з цяжкасцю ўтрымалі акрываўленага салдата. Фельчар, маладзенькая дзяўчына з в. Вышалаў Алена Дзярбень, зрабіла перавязку, рукі яе дрыжалі...

Мы размініравалі Пасялковую вуліцу. Раптам Віталь Хальчэня крыкнуў: «Міна!» — і наступіў на яе. Пачуўся глухі выбух, міна, узляцеўшы ў вышыню, упала на зямлю. Калі смертаносную «цацу» разабралі, аказалася, што ў ёй не было капсуля-дэтанатара. Мы былі ўдзячны невядомаму антыфашысту, які адвёў ад нас бяду.

Па паўднёва-заходняй ваколіцы Мардзвіна праходзіла лінія нямецкай абароны. Ворагі чакалі з таго боку прарыву нашых войск з в. Замошша і пабудавалі тры паласы з калючага дроту, мы прыступілі да іх размініравання. Заняўшы кожны па раду, абясшкоджвалі сотні мін, зносілі ў адно месца і падрывалі. Так мы працавалі больш за тыдзень.

Аднойчы Іван Марозька наступіў на супрацьпяхотную міну, прагучаў выбух. Марозька, прыціскаючы рукі да твару, захістаўся. Уладзімір Канавальчык падхапіў яго пад рукі і своечасова, бо Іван мог упасці на другую міну. З выпаленымі вачыма яго адвезлі ў Петрыкаў. Праз некалькі дзён памерла яго маці, Ева Марозька. Мірных жыхароў загінула тады нямала. Сярод іх — бежанцы з в. Хлупін Вольга Літнер з дачкой Надзяй, бакеншчык Яўхім Масла. Падарваліся на мінах Ева Руцкая, Аляксандра Чарняўская, Макар

Занкевіч, Андрэй Рубчэўскі, Анюта Занкевіч, падлеткі Іван Шалковіч, Ганна Клепік, пакалечаны Матруна Руцкая, Жора Домніч. Падарваўся, кідаючы гранату, прызыўнік Мікалай Траяноўскі. З белінцаў загінулі Ганна і Ермалай Шаруба, Мартын Пятровіч, Тодар Галеня, была пакалечана Надзя Ладзінская.

Здаецца, вельмі ўважліва правяралі вуліцы, аднак яшчэ ўлетку 1947 г. на Пасялковай вуліцы падарваўся на супрацьтанкавай міне леспрамгасаўскі грузавік, загінуў шафёр Зосім Занкевіч з в. Вышалаў.

У Судзібары падарваўся наш таварыш Віталь Хальчэня. Яўхім Ястрэмскі быў паранены. Праз некаторы час ён стаў знакамітым чалавекам, за асваенне цаліны быў узнагароджаны двума ордэнамі Леніна. Загінуў і Міхаіл Шайкевіч.

Цяжкая, небяспечная работа працягвалася ўсё лета і восень 1944 г. Да вясны 1945 г. двары, агароды і палі вакол вёскі былі ачышчаны ад мін.

А восенню 1944 г. узнавіўся наш калгас «Новае жыццё». У гаспадарцы было 18 коней. Адзін хутка падарваўся на міне, чатырох задралі ваўкі. Людзям часцей даводзілася цягнуць плуг на сабе, жанчыны капалі лапатамі калгаснае поле. Насілі насенне са станцыі Капцэвічы.

Жыццё паступова наладжвалася, толькі не сціхаў боль па загінуўшых...

В. К. Навак

Дзіцячыя слёзы

З успамінаў жыхаркі в. Старына Г. Р. Вільчанкі

У сярэдзіне 1944 г. прыйшло доўгачаканае вызваленне... Як доўга мы яго чакалі! Раны, нанесеныя вайной, залечвалі ўпартай, напружанай працай жанчын, падлеткаў, дзяцей. Пякельна цяжкае жыццё ў пасляваеннай вёсцы, шчодра палітае горкімі дзіцячымі слязьмі, зусім станавілася непасільным, у каго загінуў бацька, у каго не было, як у нас, сваёй хаты, а такіх сем'яў у нашай вёсцы Старына была большасць. Мы не маглі разлічваць і на дапамогу старэйшага брата. Іван, захварэўшы тыфам у партызанскім атрадзе, выйшаў са шпіталю ўжо пасля вызвалення раёна і быў накіраваны на работу ў Баранавіцкую вобласць старшынёй сельсавета. Відаць, нялёгка яму там жылося, неяк ужо зімой прыйшло пісьмо, што хварэе, што ў яго стралялі бандыты, якіх нямала было тады ў лясах Заходняй Беларусі. Маці ўстрывожылася, паслала Ніну, старэйшую сястру, каб яна дапамагла брату, можа, абараніла яго. Ніна, заўжды баявая і смелая, пасля нялёгкіх партызанскіх будняў стала такой рашучай і энергічнай, што ні ў чым не ўступала хлопцам. Нам было добра з ёю.

Ніна паехала і праз некаторы час прыслала пісьмо, яшчэ больш трывожнае. Маці не вытрымала і паехала да сваіх дзяцей сама. Нарыхтавала дроў, напякла нам хлеба і рушыла ў далёкую дарогу. Засталіся мы ў хаце адны з шасцігадовым Пятром... Хлеб яшчэ быў, бульбу мы маглі варыць самі. Нялёгка нам было запаліць печ, да прыпечка не дараслі. Я залажу на прыпечак, Пятро становіцца на калодку і падае мне палена адно, другое. Так мы ўкладваем дровы, я раздзьмухваю вугалькі, якія ашчадна захоўваюцца ў попеле, з'яўляецца дымок... Я бягу раніцай у школу, Пятро чакае мяне, прымасціўшыся каля акна, выйсці на вуліцу яму няма ў чым... Але хутка скончыліся дровы, а маці ўсё не вярталася. Пайшлі мы ў лес. Адкуль ні вазьміся, нізка праляцеў раптам самалёт. Мы памярцвелі: зноў вайна!.. І маці няма, ніякай радні. Што рабіць? Прасядзелі ў хмызняку да вечара, затым пайшлі ў вёску. Пытаемся у людзей, ці няма вайны. Нас супакоілі, растлумачылі, што вайна ёсць, але яна далёка і сюды больш не прыйдзе.

Вярнулася Ніна, усе нашы страхі забыліся. Маці не адважылася пакінуць Івана аднаго, у яго ўжо не раз

стралялі. Надышла вясна, трэба было сеяць. Насенне ў нас было, але цягла на ўсю вёску ніякага, ні адной жывёліны. Саджалі бульбу па чарзе, дзевяць ці дзесяць жанчын за плугам, прымацаваным за жэрдку, Ніна за аратага, а дзеці кідаюць бульбу ў баразну... Так адсеяліся ўсёй вёскай. І ў гэтыя ж дні прыйшла радасная доўгачаканая вестка: перамога, вайна скончылася!.. Першымі даведаліся аб гэтым ад паштальёна мы, дзеці, пабеглі ў поле, дзе садзілі бульбу і сеялі збажыну жанчыны. Што тут рабілася!.. Колькі радасці, колькі слёз і радасных, і горкіх... Жанчыны нібы памаладзелі, папрыгажэлі... Кінулі работу, у адной з хат сабраліся ў госці, кожная прынесла, што магла, знайшлася і бутэлька гарэлкі. Такога вяселля я ніколі больш не бачыла, такой радасці не перажывала. Жанчыны спявалі і танцавалі, смяяліся і плакалі, і супакойвалі адна другую, і зноў спявалі... Нехта іграў на нямецкім губным гармоніку, нехта пераапрануўся ў мужчынскую вопратку... Мы, дзеці, глядзелі на іх і весяліліся разам з усімі і з нецярпеннем чакалі, калі нас, нарэшце, паклічуць за стол. У вёсцы так было заведзена, што пакарміць і пачаставаць нас маглі толькі тады, калі закончыцца свята ў дарослых.

Я хадзіла ў тую вясну ў школу. Вучыла нас настаўніца, памятаю толькі яе імя і імя па бацьку — Ларыса Іванаўна. Якой яна здавалася нам, ціхмяным вясковым дзецям, прыгожай, дарослай і строгай — яна і сапраўды была такой, хоць было ёй не больш 20 гадоў. Сядзелі мы на падлозе ў хаце, якая цудам захавалася пасля ваеннага ліхалецця, усе разам — ад першага да чацвёртага класа. Было на ўсю школу два буквары — адзін для вучняў Старыны, другі — для філатаўскіх. Сшыткаў, алоўкаў не было зусім. Немцы, адступаючы, пакідалі папяровыя мяшкі з-пад сваіх рэчаў, мы збіралі іх, асабліва многа было мяшкоў у лесе, дзе стаяла варожая часць, акуратна наразалі іх на лісты і сшывалі. Знаходзілі грыфель, прывязвалі ніткамі да палачкі і пісалі. Чарніла рабілі з соку сталовага бурака, дабаўлялі ў яго сажу. На перапынках практыкаваліся пісаць дубчыкам на пяску ці на падмеценай дарожцы, бо рыхтаваць дома ўрокі не было калі, увесь вольны час займала хатняя работа, адвечныя сялянскія справы...

Школа на папялішчы

З успамінаў былога дырэктара Міхедавіцкай сямігадовай школы М. П. Шамрыла

У Петрыкаўскім раённым аддзеле народнай асветы мяне сустрэлі цёпла і шчыра. Інспектар райана, якая замяняла загадчыка, Ганна Іванаўна Сярапіна, павіншавала з вяртаннем з фронту, пажадала поспехаў у педагагічнай працы. Мяне прызначылі загадчыкам Міхедавіцкай пачатковай школы, якая хутка павінна стаць сямігадовай. Загадчык школы... На месцы, дзе яна будзе пабудавана, толькі кучы цаглянага і гліняна друзу ад разбураных печаў. Вецер развеяў за два гады попел былых школьных драўляных будынкаў. Уцалелую цэглу і палаўняк людзі павыбіралі для печаў, якія будавалі на сваіх агародах, часта пад адкрытым небам.

Яшчэ ў час акупацыі аднавясковец Сцяпан Кабак, без пілы, адной сякерай, зрабіў хатку у лесе памерам 3×4 метры. Пасля вызвалення перавёз яе на сабе і паставіў на сваім селішчы. Яна стала першым будынкам на месцы былой вуліцы. Замест дзвярэй — стары нямецкі шынель, прымацаваны цвікамі. Столь — колатае паленне, засланае мохам і прысыпанае пяском. Падлога гліняная, акно незашклёнае. Не вытрымаў стары Кабак голаду, забраў дзяцей, жонку і падаўся ў Заходнюю Беларусь, пакінуўшы недароблену хатку. Яна і стала нашай школай у першым паўгоддзі 1945/46 навучальнага года. Замест парт — калодкі, адрэзаныя ад тоўстага бервяна — адна вышэйшая, другая — ніжэйшая. У першых-другіх класах сядзелі разам васьмі- і дванац-

цацігадовыя дзеці. Большасць пераросткаў, але асабліва яны не выдзялялі-ся, хіба што выглядалі больш сур'ёзнымі. 180 вучняў — ад васьмі- да чатырнаццацігадовых — налічвалася ў вёсцы.

З настаўнікаў я адзін — мужчына, меў сярэднюю педагагічную адукацыю. Былі чатыры дзяўчыны-настаўніцы з сямігадовай адукацыяй. На педагагічную работу запрашалі ўсіх, хто хацеў стаць настаўнікам, меў жаданне вучыць дзяцей.

Кніг — ніякіх, іх замянялі газеты. На школу атрымлівалі дзесяць экземпляраў газеты «Піянер Беларусі». Старонку разразалі, кожны вучань пэўны час мог карыстацца часткай газеты, потым мяняў яе з суседам. Райана выдзеліў 5 кілаграмаў абгортачнай паперы і некалькі шпулек шпалераў. Чарніла і ручак не было, дзесяць алоўкаў на ўсю школу. Кожны разрэзвалі на чатыры часткі. Замест дошкі — ліст нямецкай бляхі. Усім класам па чарзе лупцавалі гэты ліст палкамі, раўнялі.

Кожнаму вучню я адмераваў па шклянцы пшанічнага зерня, якое выдзелілі школе для галадаючых дзяцей. Дзяліў пшаніцу разам з мацяркамі, якія варылі яе ў чыстай, без солі, вадзе. Атрымалі некалькі пасылак ад Міжнароднага Таварыства Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца з вопраткай і абуткам. Мала што падыходзіла для выкарыстання дзецьмі: камзол амерыканскага ці англійскага юнака, вузкія, даўганосыя, на высокім абцасе туфлі — худыя нашы дзеці набывалі ў такім убранні камічны выгляд.

Часта думаў: я ж ведаў бацькоў гэтых дзяцей-сірот, з многімі ваяваў разам. Я вось вярнуўся, а сябры мае засталіся там, на дымных пажарышчах вайны. Значыць, я павінен дапамагаць выхоўваць іх дзяцей, гэта мой свяшчэнны абавязак... У Аляксандра Глушко расце сын Коля, а сам ён застаўся на Шпрэе, пад Берлінам. Мікалай стаў ваеннаслужачым, падпалкоўнікам. Такіх прыкладаў можна прывесці шмат, і гэта толькі ў Міхедавічах...

Мы неаднаразова звярталіся ў аблана і райана, да старшыні райвыканкома, былога партызанскага камандзіра А. М. Міхайлоўскага, аб дапамозе ў будаўніцтве школы ў Міхедавічах. Ішоў час, нам нідзе не адмаўлялі, але пытанне не вырашалася.

— На дзяржбюджэт не разлічвайце. Сродкаў у нас няма.

Выхад адзін — будаваць школу талакой.

За работу ўзяліся бацькі дзяцей і настаўнікі, нядаўна дэмабілізаваныя Іван Беластоцкі, Іосіф Найдзён, Аляксандр Панцюк, Дзмітрый Ганцэвіч, Іван Лубко, Фёдар Палтаран і іншыя. Цэлая брыгада. Іосіф Найдзён, настаўнік матэматыкі, склаў план школы на 210 вучнёўскіх месц. У ёй прадугледжвалася 7 класных пакояў, 5 кабінетаў, настаўніцкая, зала, кватэра для дырэктара.

Акрамя школы, у вёсцы вялося будаўніцтва жылля, грамадскіх і калгасных памяшканняў. Набліжалася веснавая сяўба, задача будаўніцтва школы яшчэ больш ускладнялася. Час быў надзвычай цяжкі, не да школы. Вось выпіска з пастановы праўлення калгаса:

«Калгасніцы калгаса «Сейбіт» Шамрыла М. Я. Праўленне калгаса даводзіць план сельскагаспадарчых работ на ўласную карову для выканання веснавой сяўбы на перыяд з 11 па 15 красавіка 1947 г.:

1. вывезці гною 25 вазоў;
2. забаранаваць 5 га.

Работу выконваць:

вывазка гною — раніцай і вечарам;
баранаванне — днём.

За невыкананне гэтага нараду нясеце адказнасць па ўсёй суровасці Савецкага закона...»

Такія заданні на тыдзень атрымлівалі ўсе калгаснікі, і трэба было яшчэ знайсці час для будаўніцтва школы.

Райвыканком у 1948 г. выдзеліў для школы 500 кубаметраў драўніны ў лесе і дзве тоны цэменту. Дзялянка адводзі-

лася ў 5 кіламетрах ад вёскі. У адзін з сакавіцкіх выхадных аб'явілі нядзельнік па валцы і раскрыжоўцы лесу. Бацькі, настаўнікі і вучні дружна выйшлі на работу. Сярод іх пажылыя мужчыны і жанчыны, юнакі і дзяўчаты. За дзень нарыхтавалі каля сотні кубаметраў драўніны...

Банк распараджаўся грашыма вельмі ашчадна, эканомна. Усюды патрэбны былі грошы, а іх не хапала. Зарплату і іншыя выдаткі выплачвалі непасрэдна ў банку, а там не заўсёды атрымаеш. У непагадзь, увесь мокры, у парваным абутку, пад салдацкім вынашаным шынеліку штодзень пешшу мясіў гразь, дабіраючыся да Петрыкава, каб атрымаць у банку 300 рублёў са сродкаў самаабкладання для аплаты цесляру за аконныя рамы. 35 кіламетраў туды, столькі ж назад. Паспець трэба да адкрыцця банка. І толькі на сёмы раз атрымаў грошы.

Неймаверныя цяжкасці былі пераадолены агульнымі намаганнямі, і ў верасні 1949 г. школа прыняла вучняў...

«СТАЛІНСКАЯ ПРАЎДА», 1945 г.

Працуйце па-франтавому
(Пісьмо да землякоў вёскі Міхедавічы)

Таварышы калгаснікі! Вашы землякі не ганьбяць сваё імя ў баях з ненавісным ворагам. Мы помсцім яму за тыя злачынствы, якія ён прычыніў на нашай зямлі. Усе мы з'яўляемся кулямётчыкамі і ад нашых куль не адзін паршывы немец загнаны навечна ў зямлю.

Мы звяртаемся да вас, дарагія землякі, каб не адставалі ад нас на працоўным фронце. Надыходзіць веснавая сяўба. Старайцеся працаваць па-франтавому, не ўпускайце дарма ні аднаго дня, ні адной гадзіны. Засявайце ўсю зямлю, каб ні адзін кавалачак зямлі не пуставаў. Хлеба трэба для нашай Радзімы многа. Умацоўвайце свой калгас эканамічна.

М. Шамрыла, І. Беластоцкі — сяржанты,
А. Станкевіч — малодшы сяржант.
21 сакавіка

Таіса не адзін раз чытала ў газетах, часопісах аб маладзёжных звеннях высокага ўраджаю. Рашыла цвёрда: узяцца за арганізацыю камсамольска-маладзёжнага звяна высокага ўраджаю ў сваім калгасе «Ленінец». Зараз звяно працуе ў полі. У ім налічваецца 10 маладых дзяўчат. У выхадныя дні сабралі 6 ц попелу. Усяго дзяўчаты абавязаліся апрацаваць 10 гектараў глебы.

На апрацоўку глебы ўручную выйшлі ўсе. Нават цяжка назваць, хто з іх працуе лепш. Увогуле кажучы, кожная працуе за дваіх. Такія дзяўчаты, як Вольга Булава, Вольга Серада, Ніна Сухоцкая, Валянціна Шляга і Ганна Пінчук, выконваюць уручную па паўтары нормы.

4 мая

Ускапала 1 гектар і 20 сотак

Вялікім аўтарытэтам сярод калгаснікаў карыстаецца ў сельгасарцелі імя Калініна Макарыцкага сельсавета 15-гадовая камсамолка Вольга Марозька. Дабілася яна гэтага сваёй сумленнай, самаадданай працай.

Камсамолка за веснавы перыяд апрацавала лапатай 1,20 га зямлі...

27 мая

Нашы стаханаўцы

Па-ударнаму працуюць на палявых работах калгаснікі калгаса «Камунар». Пераважная большасць калгаснікаў сістэматычна перавыконваюць устаноўленыя ім дзённыя нормы выпрацоўкі.

Асабліва высокі вытворчы ўздым ахапіў калгаснікаў на копцы бульбы.

Лепшыя паказчыкі працы маюць калгаснікі Петравец Еўдакія, Жукавец Вольга, Серада Надзежда, Пінчук Васіль (брыгада № 2, брыгадзір Пашук Клаўдзія), Казакоўская Ганна, Яўлаш Мар'я, Пашук Ганна (брыгада № 3, брыгадзір Пашук Феафан); Царук Матруна, Міхалевіч Валянціна, Пашук Наталля (брыгада № 1,брыгадзір Пашук Ніна) і другія.

І. Ючко, старшыня Макарыцкага сельсавета
2 кастрычніка

У памяці народнай

У канцы 1943 года беларускі ўрад пераехаў з Масквы ў вызваленую ад фашысцкіх захопнікаў Навабеліцу, прыгарад Гомеля. Разам з усімі прыехаў сюды і дзед Талаш. П. К. Панамарэнка сардэчна развітаўся ў Навабеліцы з вядомым партызанам, падзякаваў за ўдзел у Вялікай Айчыннай вайне, за дапамогу партызанам, пажадаў здароўя. На развітанне аказаў яму грашовую дапамогу, прасіў прыязджаць у Мінск.

— Дзед вярнуўся ў вызваленыя Наваёлкі, калі зямля яшчэ не паспела астыць ад апошняга бою, — расказвае Клаўдзія Дзмітрыеўна, унучка Васіля Ісакавіча. — Сумна мне без Прыпяці, тлумачыў ён сваю непаседлівасць. А тут зямелька дыхае, лес гамоніць, рака спявае... Я заўсёды дзівілася, як у дзедавым сэрцы ўжываліся разам ваяўнічасць і пяшчота. Ён вельмі любіў і чуйна ўспрымаў прыроду роднага Палесся. Але, бадай, больш за ўсё ён любіў людзей, такіх, як і сам, простых працаўнікоў.

У вёсцы дзед з'явіўся нечакана для жыхароў. Ветліва і радасна сустрэлі яго аднавяскоўцы, многім хацелася паглядзець на земляка, якім ён стаў за час вайны. Дзверы Талашовай хаты не зачыняліся, прыходзілі ўбачыцца, пагутарыць, параіцца, як жыць далей. У сялян не было солі, хлеба, адзення. Адсутнічала цяглавая сіла, нечым было араць і сеяць.

Навасёлкаўцы рыхтаваліся да сваёй першай пасля вызвалення сяўбы. Яе чакалі як вялікага хлебаробскага свята. Аднак не хапала насення, яшчэ горшае становішча з цяглавай сілай. Васіль Ісакавіч знік на некалькі дзён з вёскі. Паехаў у Мінск па гаспадарчых справах. Там зайшоў да Панамарэнкі, расказах пра сваю бяду, пра становішча ў вёсцы, і той дапамог прыдбаць каня. Ехаў дзед з Мінска да Гомеля ў таварным вагоне, з Гомеля да Навасёлак дабіраўся на кані. У тую вясну дзякуючы дзедавым сувязям сяўбу ў калгасе закончылі як ніколі хутка.

Жыццё набірала сілу, залечваліся раны, нанесеныя лютай вайной. Адбудоўваліся паселішчы і вёскі, спаленыя гітлераўскімі акупантамі. Больш чым паўгода тут стаяў фронт, зямля перакопана акопамі, траншэямі. Многія пабудовы разбураны і спалены, набытак жыхароў раскрадзены, вывезены фа-



Аўтограф дзеда Талаша ў дзень 100-годдзя

шыстамі. І хоць вёска нейкім чынам уцалела ад пажару, яна мела страшэнны выгляд...

— Дзед пайшоў на Прыпяць, — успамінаюць землякі, — доўга ўглядаўся ў далечыню, пазнаючы знаёмыя краявіды, прыслухоўваўся да ціхага плёскату вады. Нагнуўся раз, другі, зачарпнуў у прыгаршчы, паднёс да вуснаў...

Трэба было, аднак, жыць. Зруб, які ўцалеў ад гітлераўцаў, прывялі да ладу. Паставілі аконныя рамы, зрабілі падлогу і столь. Навазілі з акопаў і бліндажоў дошак і бярвёнаў, неўзабаве справілі наваселле.

Васіль Ісакавіч быў вядомым чалавекам, карыстаўся вялікай славай. Сяляне, ды і не толькі яны — усе, хто ведаў дзеда, адносіліся да яго з павагай і пашанай.

— Калі стараешся дзеля людзей, то людзі цябе абавязкова ўспомняць, — гаварыў ён. — А памяць людская — найдаражэйшая рэч, у агні не гарыць, у вадзе не тоне, перад подыхам часу не пасуе...

— Дзед ніколі не скардзіўся на здароўе, — расказвае ўнучка. — Быў моцны, дужы, як той дуб лугавы. Ніколі не хварэў. Любіў свежае паветра, спаў звычайна ўсё лета на духмяным сене. Ды і ежай не грэбаваў, што паставяць на стол, то і добра.

Неяк Клава ішла з дзедам уздоўж ракі. Калі яны дабраліся да таго месца, дзе калісьці ўзвышаўся мост, ад якога засталіся адны пні, што сумна выглядалі над вірлівай вадой, Васіль Ісакавіч спыніўся і доўга глядзеў, як цякла, чаплялася хвалямі за рэшткі драўляных паляў вада, і расказваў пра сваіх сяброў. Потым яны зайшлі на петрыкаўскія могілкі. Дзед паказаў унучцы магілу з чыгуннай агароджай і яркай зорачкай, над якой Талаш доўга стаяў у задуменні. Тут пахаваны баявыя спадарожнікі старога партызана.

Талаш любіў людзей, працу. Ён ні мінуты не мог сядзець дома без справы, вазіў дровы, завіхаўся каля печы. Але і гэта не задавальняла яго, стары хацеў прастору, дзейнасці. Неўзабаве ён, нягледзячы на свае сто гадоў, становіцца лесніком Петрыкаўскага лясгаса. Дзед вельмі добрасумленна адносіўся да сваёй справы, любіў лес, выяўляў парушэнні і недахопы. За сумленную службу Талаш узнагароджаны знакам «За шматгадовую і бездакорную службу ў дзяржаўнай лесаахове СССР».

Дзед пачаў слабець, узрост браў сваё. Родныя занепакоіліся, пачаліся клопаты, потым адвезлі старога ў Петрыкаўскую раённую бальніцу, але спецыяліста там не аказалася. Пазванілі ў Мінск, у Петрыкаў выслалі самалёт, Васіля Ісакавіча даставілі ў адну з клінічных бальніц сталіцы. Тут ён 28 жніўня 1946 г. у час аперацыі памёр.

Працоўныя Петрыкаўскага раёна праводзілі ў апошні шлях свайго славутага земляка, старэйшага партызана Беларусі Васіля Ісакавіча Талаша. Труна з целам дзеда Талаша была ўстаноўлена ў памяшканні гарадскога Савета дэпутатаў працоўных. Ушанаваць памяць памёршага прыбылі член урадавай камісіі па арганізацыі пахавання дзеда Талаша Карпусенка, старшыня аблвыканкома Ледванёў, прыйшлі сакратар райкома партыі Рыгор Зярноў, старшыня райвыканкома Анатоль Міхайлоўскі, прадстаўнікі савецкіх, партыйных і грамадскіх арганізацый раёна, працоўныя горада.

* * *

На Беларусі ўшаноўваецца памяць палескага селяніна. Першым гэта зрабіў Якуб Колас, які напісаў аповесць «Дрыгва». Адразу пасля выхаду ў 1934 г. у свет кніга стала здабыткам мільёнаў чытачоў. У бібліятэках рэспублікі наладжваліся калектыўныя чытанні аповесці, праводзіліся канферэнцыі чытачоў. Кніга перакладзена на румынскую, кітайскую, нямецкую, польскую і іншыя мовы. Пісьменнік задумаў напісаць п'есу «У пушчах Палесся», матэрыялам для якой стала аповесць «Дрыгва». Імя дзеда Талаша набывае ўсё большую вядомасць. П'еса была напісана ў 1937 г. за два месяцы і стала значнай з'явай у беларускай драматургіі. У ёй найбольш шырока і поўна аўтар паказаў членаў сям'і палескага партызана. Бабку Насту, сыноў Максіма і Панаса, верных памочнікаў дзеда, якія пайшлі па бацькавай дарозе. Выканаўца ролі дзеда Талаша А. Ільінскі прыязджаў на радзіму Васіля Ісакаві-

Абеліск на магіле В. І. Талаша на могілках у Петрыкаве

ча. Разам вудзілі рыбу, хадзілі на паляванне. Там ён выбраў і вопратку для сваёй ролі. Дзед Талаш у выкананні артыста спадабаўся тысячам гледачоў, а таксама Якубу Коласу. Пісьменнік гаварыў, што вобраз славутага дзеда супадае з яго думкамі і ўяўленнямі аб гэтым няпростым, цікавым чалавеку.

Да вобраза дзеда Талаша звярталіся мастакі. У суровыя гады Вялікай Айчыннай вайны скульптар Заір Азгур ляпіў у Маскве з натуры народнага героя — удумлівы, мужны, твар умудроны вялікім жыццёвым вопытам, з няўлоўнай хітрынкай... Вобразам дзеда Талаша зацікавіўся і мастак Фёдар Мадораў. Ён зрабіў найбольш удалы і вядомы партрэт партызана. Палескі селянін паўстае з яго як абагульнены вобраз народнага мсціўцы. У дзеда ваяўнічы выгляд: у кароткім аўчынным кажушку, пераперазаны крыж-накрыж патроннымі стужкамі, з падвешанымі на поясе гранатамі.

Свае творы прысвяцілі герою і літаратары. Новікаў-Прыбой напісаў пра мужнасць палескага селяніна нарыс «Стогадовы партызан», беларускі паэт Міхась Машара ў 1941 г. — верш «Дзед Талаш»:

Партызаніў дзед калісьці,
вызваляў зямлю сваю,
бо чым быць рабом фашыстаў,
лепш загінуць у баю.

І Талаш са зброяй недзе —
крыўда ў сэрцы залягла.
З ім унукі і суседзі —
помста ў лес іх прывяла.

Сочаць пільна партызаны,
дзе варожы ляжа след.
І за родны край стаптаны
Плаціць смерцю злыдням дзед.

Мост на Пцічы ўзарвалі,
прыняла цягнік рака.
Мае сэрца дзед са сталі,
не прыжыць яго рука...

У цэнтры Петрыкава ў парку ёсць алея герояў і мемарыял загінуўшым воінам. Парк перасякаюць два глыбокія яры. У летні час тут можна пасядзець, адпачыць. Адгэтуль адкрываецца палескі далягляд на Прыпяць. З мармуровага пастамента глядзіць на раку дзед Талаш. У вачах сялянская хітрынка, лагодная і шчырая ўсмешка. Такім і быў гэты незгінальны палескі селянін. Помнік устаноўлены ў 1953 г. Пра гэта 14 ліпеня паведамляла газета «Звязда».

...12 гадзін дня. На трыбуну падымаюцца кіраўнікі партызанскіх і савецкіх органаў раёна, госці з Мазыра і Мінска, сыны дзеда Талаша — Даніла і Дзмітрый. Мітынг адкрыў сакратар Палескага абкома КПБ У. Е. Лабанок. Ад імя ўрада рэспублікі з прамовай, прысвечанай памяці легендарнага партызана, выступіў намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР П. А. Абрасімаў.

Пад гукі гімна ён здымае пакрывала. Перад прысутнымі прадстае помнік ра-

боты народнага мастака БССР З. Азгура. На бронзавай дошцы надпіс:

ПАРТЫЗАНУ В. І. ТАЛАШУ
(ДЗЕДУ ТАЛАШУ) 1844—1946

У цэнтры Мінска размясцілася плошча Якуба Коласа. На ёй уражлівы скульптурна-архітэктурны комплекс, адкрыты 3 лістапада 1972 г. Паэт сядзіць на велізарным камені-валуне, а побач — героі яго твора, якія ўвабралі народны розум і кемлівасць, дабрату і сардэчнасць, сілу і мужнасць. Дзед Талаш, сціскаючы вінтоўку, арліным поглядам углядаецца ўдалячынь. Побач Панас, які паказвае бацьку, дзе прытаіўся вораг...

М. Р. Жыгоцкі

...Прыгаворваецца да расстрэлу

Зміцер Шамрыла ў гады вайны змагаўся ў партызанскім атрадзе Балотнікава 130-й брыгады, быў камандзірам роты. Пасля вызвалення раёна яго па бранi пакінулі ў тыле, прызначылі старшынёй калгаса «Чырвонае Палессе» ў Міхедавічах. Калгас — адна толькі назва, папялішча, каля ста жанчын і дзяцей, некалькі інвалідаў...

Восенню 1944 г. сяк-так узаралі калгаснае поле, цягнучы плуг на сабе, засеялі азімыя. Старшыня сам хадзіў з сявенькай, ашчадна раскідваючы зерне ў палітую потам і слязьмі зямлю... Улетку наступнага года сабралі ўраджай — цэнтнераў 6—7 з гектара. Толькі на насенне ды калгаснікам раздаць па некалькі грамаў на працадні. А што здаваць дзяржаве?..

Ішоў час, на нарыхтоўчы пункт з «Чырвонага Палесся» не паступала ні кілаграма зерня. Упаўнаважаным па нарыхтоўках па Бабуніцкаму сельсавету быў прызначаны райкомам партыі раённы пракурор Цала, якога называлі «Белая шапка» — ён улетку насіў белую шапку, быў сапраўдным інквізітарам у адносінах да калгаснікаў. Не раз вызывалі Зміцера Шамрылу на пасяджэнне райкома, патрабавалі здачы збожжа.

— Няма зерня... Не ўрадзіла, на насенне толькі, — адказваў старшыня.

У калгас прыехаў Цала. Зайшлі ў калгасны склад — хлевушок, збіты з дошак. У кутку стаяла каля дзесяці мяхоў.

— Забраць усё! — скамандаваў упаўнаважаны. — Заўтра з раёна адпраўляецца чырвоны абоз.

— Не павязу. Чым сеяць?

— Павязеш! — Цала схапіўся за кабуру нагана на баку.

Бліжэй да вечара ён вярнуўся ў вёску.

— Сядай у машыну!

Зміцер моўчкі падпарадкаваўся.

Мінулі Бабунічы, за Смолаўкай у лесе спыніліся. За ўсю дарогу ніхто не прамовіў слова.

— Выходзь... Пяць крокаў уперад!

Зміцер адышоў. Цала дастаў наган.

— За сабатаж, за зрыў плана нарыхтоўкі збожжа дзяржаве... Іменем Саюза Савецкіх Сацыялістычных рэспублік... Прыгаворваецца да расстрэлу.

Прагучаў стрэл. Зміцер Шамрыла ўпаў, не ўсведамляючы — жывы ён ці мёртвы?

Праз некаторы час апрытомнеў. Жывы... Ціха ў начным лесе, Цала паехаў. Над Людзвіновам бліснула маланка, збіраўся дождж...

Назаўтра Зміцер Шамрыла пайшоў у райком партыі, паклаў на стол партыйны білет. На той час гэта быў сапраўдны подзвіг.

— У «Палессе» старшынёй больш не пайду.

Праз некаторы час Зміцер Шамрыла пасяліўся ў Муляраўцы, каля сарака гадоў працаваў кавалём. Колькі давялося перажыць у партызанах, у колькіх баявых аперацыях удзельнічаў, а такога страху і зневажання не давялося перажыць ніколі... Толькі дзесяцігоддзі пазней ён змог расказаць пра ганебны расстрэл у лесе.

М. П. Шамрыла

«СТАЛІНСКАЯ ПРАЎДА», 1946 г.

Рабочымі дарожнага аддзела і сіламі калгаснікаў поўнасцю адноўлена на грунтавых дарогах у раёне 13 мастоў даўжынёю на 185 пагонных метраў, пабудавана новых мастоў 37—290 пагонных метраў. Прыведзены ў належны парадак грунтавыя дарогі на 248 кіламетраў.

* * *

64 школы, 2 дзіцячыя дамы выхоўваюць маладое падрастаючае пакаленне нашага раёна. Школамі ахоплена 7535 дзяцей, у дзетдамах выхоўваецца 327 дзяцей.

У раёне функцыяніруюць бальніца, амбулаторыя, дзіцячая і жаночая кансультацыі, эпідэмічная станцыя, 4 урачэбныя, 7 фельчарска-акушэрскіх пунктаў, якія абслугоўваюць насельніцтва.

Аддзелам дзяржаўнага і сацыяльнага забеспячэння з часу вызвалення раёна выплачана сем'ям ваеннаслужачых, інвалідам працы і інвалідам Айчыннай вайны дапамогі і пенсіі на 6 мільёнаў 245 тысяч рублёў. Мнагадзетным і адзінокім маці выплачана дапамога за гэты год 499 тысяч рублёў.

* * *

Ва ўрачыстай абстаноўцы ўвечары 20 сакавіка ў прысутнасці ўсяго калектыву рабочых прамысловых прадпрыемстваў і арцеляў горада быў уручаны пераходны Чырвоны сцяг выканкома абласнога Савета дэпутатаў працоўных і абкома партыі і грашовая прэмія ў суме 3000 рублёў райпрамкамбінату — пераможцу ў абласным сацыялістычным спаборніцтве прадпрыемстваў мясцовай прамысловасці.

Пераходны сцяг уручыў начальнік аблмясцпрама Валчкоў. З адказным словам выступіў тав. Кулак.

* * *

Урачыста прайшоў сход рабочых, служачых і інжынерна-тэхнічных работнікаў Петрыкаўскіх суднабудаўнічай і суднарамонтнай майстэрань, прысвечаны ўручэнню пераходнага Чырвонага сцяга Дняпроўска-Дзвінскага басейнавага ўпраўлення шляху калектыву майстэрань, заваяваўшаму першынство ў сацыялістычным спаборніцтве за чэрвень месяц сярод рачнікоў Дняпроўска-Дзвінскага басейна. Па даручэнню начальніка ўпраўлення шляху Чырвоны сцяг быў уручаны сакратаром раённага камітэта партыі таварышам Петрушэвічам.

Уручаючы сцяг дырэктару майстэрань Сафронаву, Петрушэвіч горача павіншаваў рабочых, служачых і інжынерна-тэхнічных работнікаў з дасягнутай перамогай.

Жыццё набірае разгон

«Та-та-тах, та-та-тах, та-та-тах» — спяваюць сваю адвечную дарожную песню вагонныя колы. Пачуўшы гэты знаёмы напеў, маладыя бярозкі і хвойкі навыперадкі бягуць насустрач поезду. Падняўшыся на пальчыкі, яны на момант заглядваюць у вокны і гэтак жа хуценька адбягаюць назад. Старыя баравыя сосны хмурацца здалёк на гэтае дзіцячае блазенства. Потым, не вытрымаўшы сур'ёзнасці, яны паважна пераварочваюць свае кашлатыя галовы і доўга пазіраюць услед поезду ў маўклівай задуменнасці.

Густыя клубы паравознага дыму і пары шчыльнымі воблакамі плывуць ля акон вагона і паволі растаюць у паветры. Калі ж наляціць вецер і рассцеле такое воблака па чорных праталінах, тады здаецца, што гэта дыхае сваім цёплым дыханнем прыгрэтая першым вясновым сонцам зямля. За вокнамі праплываюць палескія краявіды, але тыя, хто едзе ў вагоне, не зважаюць на іх: мусіць, нагледзеліся за свой век, ездзячы па гэтай дарозе. Ім куды важней завесці гаворку са свежым чалавекам, падзяліцца сваімі думкамі, разведаць навіны.

У вагоне стаіць рознагалосы гоман. Цячэ павольная дарожная гаворка пра знаёмых, пра навіны, пра тутэйшыя мясціны.

— ...Дык, кажаце, у Конкавічы едзеце?.. Ведаю, а як жа... Гэта вам у Муляраўцы трэба будзе злезці, адтуль бліжэй, — гудзе над усімі галасамі старэчы хрыпаты басок. — Тут у нас на ўсёй Петрыкоўшчыне няма чалавека, які не ведаў бы гэтых Конкавіч. Колісь, за

царом яшчэ, ва ўсёй нашай воласці не было, мусіць, бяднейшай вёскі. І конкаўцы, як хто ўмеў, ратаваліся ад сваёй беднасці. Бывала, украдзе хто каня недзе аж у Сотнічах ці ў Грабаве, а сляды прывядуць у Конкавічы... Так і павялася за вёскаю нядобрая слава. Ідзе, бывала, конкавец па базару, а які-небудзь жартаўнік-петрыковец прывітае яго і пытаецца:

— Дзядзька, ты з Конкавіч?

— Сам ты злодзей! — адразу ж разгадвае тонкі намёк конкавец і кідаецца з кулакамі на петрыкоўца.

Ну, а цяпер Конкавічы — не тыя... Калгас там добры. І конкаўцы больш не саромяцца сказаць, адкуль яны родам. А за старшыню ў іх там петрыковец, па прозвішчу Кулак. Вось як памірыла жыццё людзей.

З рознагалосага людскога гоману зноў выбіваецца чыясьці гучная гаворка:

— Дык дзе ты цяпер робіш? Усё ў леспрамгасе?

— Ге-э-э, брат, я пасля таго леспрамгаса паўсвета аб'ездзіў. І на цаліне быў... А цяпер еду дадому. Маці пісала, што наш калгас на грашовую аплату пераходзіць.

— Во, і ў нас такія пералётныя дадому вяртаюцца. Ухопяць шылам патакі — і назад... Ды з арміі хлопцы прыходзяць. Прыбаўляецца рабочых рук у калгасе, — адзываецца знаёмы басок.

— Ста-анцыя Пці-іч — аб'яўляе кандуктар, праходзячы па вагоне. І ледзь толькі поезд спыняецца, ля дзвярэй вагона ўзнікне вясёлы гоман, смех, тупат.

— Сваток, пагасцілі б яшчэ дзянёчак, — упрошвае жаночы голас.

— Ды па мне можна, але ж во... Уплялася і цягне дадому.

— Гэй, вы там! Чаго пасталі! Падымайцеся ў вагон. Адпраўляецца ж...

— Заставайцеся здаровы!

— Едзьце здаровы!

Адчыняюцца дзверы і разам з натоўпам людзей у вагон урываецца песня:

Эх, туфелькі, пальчатачкі...
Добры вечар, дзяўчатачкі!

— От, брат, вяселле дык вяселле! Я такога і не помню...

— А панапякана, а панаварвана! Гэта ж яшчэ тры дні гуляць можна!

— Маладыя жэняцца, а мы старэем, — даносіцца аднекуль з сярэдзіны вагона задуменны жаночы голас. — Гэта ж во мая Ніна прыязджала на канікулы...

— Ну, а падключаць жа наш калгас да тае лініі, што з Васілевіч вядуць? — перабівае жаночую гаворку мужчынскі голас.

— Сказалі, падключаць...

— От добра!

Та-та-тах, та-та-тах, та-та-тах — бягуць у далеч палескіх прастораў імклівыя колы.

Плывуць людскія думкі цераз сённяшні ў заўтрашні дзень.

Поезд ідзе на Жыткавічы...

Вера Палтаран

Гонар і слава раёна

З людзьмі і для людзей

Буднік Ганна Іванаўна (н. у 1924 г. у в. Курыцічы) усё жыццё працавала паляводам у калгасе «Бальшавік». Звяно па вырошчванню кок-сагызу, якое яна ўзначальвала, з году ў год атрымлівала высокія ўраджаі гэтай нязвыклай да палескіх умоў культуры.

Узнагароджана ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга. У 1952 г. Г. І. Буднік удастоена звання Героя Сацыялістычнай Працы.

Калі пачалася вайна, Іван Буднік пайшоў на фронт. Трывожна было ў краі, партызаны не давалі спакою акупантам, вельмі лютавалі тады карнікі... Ганна — старэйшая ў сям'і, увесь клопат аб сёстрах і браце быў на ёй. Перабраліся да партызан, так і жылі да самага вызвалення раёна ў сямейным партызанскім лагеры.

працавітай сям'і. Пакуль былі сілы, ні дня не сядзела без работы, у любы момант гатова была прыйсці на дапамогу роднай гаспадарцы.

Такія былі людзі, такі іх характар, загартаваны працай, ваенным ліхалеццем, нялёгкімі сельскімі буднямі...

В. Р. Феранц

Г. І. Буднік

Почырк ветэрана

Горбач Піліп Сямёнавіч (н. у 1929 г.) працаваў машыністам экскаватара Капаткевіцкай механізаванай калоны № 67. Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР, быў намеснікам Старшыні Вярхоўнага Савета рэспублікі. У 1966 г. П. С. Горбачу прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы.

У Курыцічах узнавіўся калгас, Ганна пайшла працаваць у паляводчую брыгаду. Вельмі гаравалі тады калгаснікі на грамадскай рабоце, шчыравалі, як ніколі. І заўсёды Ганна была наперадзе — маладосць, няўрымслівасць бралі сваё, працавала, здаецца, без стомы. Удзень — у полі, а дома па гаспадарцы таксама работы неўправорот. На яе прыпадалі толькі золкія ранкі ды да позняй ночы кожны раз не тухла святло газавай лямпы ў хаце...

У 50-м у калгасе пачулі новае слова — кок-сагыз. Вельмі далікатная, капрызная культура. Старанную работніцу Ганну Буднік прызначылі звеннявой па яго вырошчванні.

— На ўсё жыццё запомню я той кок-сагыз, — гаворыць Ганна Іванаўна. — Тройчы праполваць за лета даводзілася. Насенне збіралі, сушылі па калівах. А позняй восенню ўбіралі карані — дробныя, тоненькія, нібы нітачкі. Капаем дзень, збіраем, зносім у хату, сушым... Дзень у дзень, да самага снегу.

Ужо ў першы год вырошчвання кок-сагызу ў звяне Ганны Іванаўны быў атрыманы самы высокі ўраджай — амаль па 70 цэнтнераў каранёў з гектара. Не адной яе гэта была заслуга — усяго звяна, у якім шчыравалі разам са звеннявой Лена Боўсун, Вольга Баярчук і іншыя калгасніцы. А ў маі 1952 г. у газеце прачыталі — Ганне Іванаўне прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы. Радасці было!..

Усё жыццё аддала нялёгкай справе земляроба Ганна Іванаўна Буднік. Траіх дзяцей выхавала ў сваёй дружнай, працавітай сям'і. Пакуль былі сілы, ні дня не сядзела без работы, у любы момант гатова была прыйсці на дапамогу роднай гаспадарцы.

Такія былі людзі, такі іх характар, загартаваны працай, ваенным ліхалеццем, нялёгкімі сельскімі буднямі...

В. Р. Феранц

У дванаццаць гадоў Піліп Горбач пазнаў ваеннае ліхалецце. Уся работа ў калгасе ў пасляваенныя гады лягла на плечы жанчын і падлеткаў. Менавіта тады хлопец атрымаў сваю першую ўзнагароду — медаль «За самаадданую працу ў гады Вялікай Айчыннай вайны». Але не дзеля ўзнагарод шчыраваў на калгасных палетках Піліп Горбач, такі ў яго быў характар — шчыры, няўрымслівы, неспакойны. Закончыў курсы механізатараў, а калі ў 1948 г. у раёне пачаліся меліярацыйныя работы, авалодаў спецыяльнасцю экскаватаршчыка. Працаваў памочнікам машыніста, хутка стаў машыністам. Тады асушвалі балоты, славутую дрыгву на Петрыкаўшчыне. Піліп Сямёнавіч вызначаўся стараннасцю, уменнем з максімальнымі магчымасцямі выкарыстоўваць тэхніку.

П. С. Горбач

Прыйшоў Піліп Горбач у Капаткевіцкае БМУ трэста «Калінкавічыводбуд», дзе працаваў больш двух дзесяткаў гадоў, ужо вопытным механізатарам. З першых дзён узяў высокія тэмпы ў рабоце, і хутка пра стараннага экскаватаршчыка, яго багаты вопыт у асушэнні балот са старонак газет стала вядома па ўсёй рэспубліцы. Да яго прыязджалі вучыцца і ён нікому не адказваў — па сабе ведаў, як важна своечасова атрымаць добрую параду, кансультацыю. Не толькі прафесійную, але і жыццёвую, проста чалавечы ўдзел, падтрымку... Многа ў яго было вучняў і ўсе ўспамінаюць яго добрым словам. Першым настаўнікам у авалоданні сакрэтамі прафесійнага майстэрства ён быў і свайму старэйшаму сыну Валянціну. А ўсіх іх у Піліпа Сямёнавіча трое — дастойная змена...

В. Ф. Грыгор'еў

Мірная доблесць салдата

Рудаўскі Аляксандр Сямёнавіч (н. у 1913 г. у в. Курыцічы) — удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, з 1930 г. — калгаснік толькі што створанага калгаса «Бальшавік». Працаваў трактарыстам, брыгадзірам трактарнай брыгады, вызначыўся высокімі ўраджаямі кок-сагызу.

Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі. У 1952 г. А. С. Рудаўскаму прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы.

Памёр 17.8.1989 г.

Зямля ў ваколіцах Курыціч не вельмі ўрадлівая — пяскі ды тарфянікі, яна ніколі не песціла земляробаў добрым ураджаем. Гнула сям'я Рудаўскіх спіну ад цямна да цямна, а ледзь перабіваліся з хлеба на квас. А была яна вялікая — сем братоў і сястра. Рудаўскія аднымі з першых уступілі ў калгас.

Ведалі, што горш не будзе. Хацелі здабыць у калгасе лепшую долю...

На калгасных палетках з'яўляліся першыя трактары і не дзіўна, што братоў цягнула да тэхнікі. Трафім, Герасім і Аляксандр паступілі ў Рудакоўскую школу механізацыі. Механізатар у тыя часы быў віднай фігурай на вёсцы. І ўжо 20-гадовы Саша Рудаўскі — Аляксандр Сямёнавіч. Да прызыву ў армію працаваў на сваім калёсным трактары, адслужыў — і зноў араў, сеяў, убіраў ураджай...

Усю вайну прайшоў А. С. Рудаўскі — з чэрвеня 1941 г. да пераможнага мая 1945 г., які сустрэў у Венгрыі. Усёй душой імкнуўся ён у родную вёску, да мірнай працы, па якой ён так сумаваў...

Радаснай і адначасова горкай была сустрэча салдата з аднавяскоўцамі. Бацькі засталіся жывымі, але вёска спалена датла, палі закінутыя, буяе пустазелле... Аляксандр успомніў, што пры эвакуацыі тэхнікі ў 1941 г. у Прыпяці патануў трактар. Выцягнулі, адраманцтавалі, за рычагі яго сеў Рудаўскі. Старшыня Андрэй Зубар, таксама франтавік, гаварыў:

— Калі б не ты, Аляксандр, не ведаю, як справіліся б з палявымі работамі...

Рабочых рук не хапала, трактар быў на вагу золата. Ад Муляраўскай МТС Аляксандр Рудаўскі пастаянна працаваў у «Бальшавіку». А з 1950 г. усе сілы былі кінуты на вырошчванне новай для Палесся культуры — кок-сагызу. У Курыцкай брыгадзе пад яго было адведзена 15 гектараў. Кок-сагыз даручылі самаму вопытнаму і стараннаму механізатару Рудаўскаму. Трактарам ён наразаў радкі, калгаснікі ўручную сеялі вельмі дробнае, як мак, насенне, і ўвесь догляд за пасевамі,

А. С. Рудаўскі

уборка ў верасні ўскладаліся на трактарыста... Цяжкая, карпатлівая і адказная работа,і Аляксандр Рудаўскі спраўляўся з ёю. У першы год за поспехі ў вырошчванні кок-сагызу яму быў уручаны ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга, праз год на грудзях зззяла залатая зорка Героя...

Е. І. Стаяноўскі

Не поле перайсці...

Сітніца Іван Васільевіч (н. у 1924 г. у в. Курыцічы) – удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, у пасляваенны час – брыгадзір паляводчай брыгады калгаса «Балышавік». Майстар высокіх ураджаяў кок-сагызу. Працаваў старшынёй калгаса «2-я пяцігодка» Капаткевіцкага р.

Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Айчыннай Вайны I і II ст., баявымі медалямі. У 1952 г. І. В. Сітніцы прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы.

Памёр у 1982 г.

Як імкнуўся дэмабілізаваны салдат Іван Сітніца дамоў, у родныя Курыцічы! Ён ведаў, што вёска разбурана, што ўсе жывуць вельмі цяжка, але тое, што ён убачыў, вельмі ўразіла, болем адгукнулася ў сэрцы... Адны папялішчы навокал, толькі чорны колер, нават дрэвы садоў, якімі раней славілася вёска, магутныя ліпы на вуліцы былі абвуглены. Усё трэба было пачынаць спачатку...

Івана са слязьмі сустрэла маці ў зямлянцы, дзе тулілася ў тыя часы сям'я.

— Не плач, — гаварыў сын, гладзячы худзенькія плечы маці. — Усё зробім, усё адновім. Галоўнае — вайна закончылася, мы жывыя...

Іван пачаў працаваць у калгасе. Рабочых рук не хапала — і на будоўлі шчыраваў, і на ферме, у гарачую пару — у паляводстве. Даводзілася ўпрагацца і цягнуць разам з іншымі калгаснікамі плуг...

Аднойчы, калі Сітніца быў у Петрыкаве, яго запрасілі ў райком камсамола.

— Ты чуў пра такую культуру — коксагыз? — спытаў камсамольскі сакратар.

— Чытаў у газеце... У нас ён не расце.

— Будзе расці. Вось ты і будзеш вырошчваць.

— Ды што вы! Не, гэтая справа не па мне... Не ўмею, не змагу. Тут патрэбны спецыяліст.

— Іван Васільевіч, — сакратар перайшоў на афіцыйны тон. — Гэта — камсамольскае заданне. Краіне вельмі патрэбны каўчук.

Іван вярнуўся дахаты засмучаны. Але яго падтрымаў бацька:

— Не бядуй!.. Справа сапраўды незнаёмая, цяжкая. Але здолеем...

Пачалі з вучобы. Доўгімі асеннімі, затым зімнімі начамі вывучалі агратэхніку новай культуры, асаблівасці яе вырошчвання, знаёміліся з вопытам тых, хто ўжо саджаў кок-сагыз. А культура гэтая сапраўды далікатная, капрызная, прыжывалася яна на Палессі з цяжкасцю і паддавалася толькі самым настойлівым, упартым.

І вось наступіла вясна, прыступілі да сяўбы. У тыя дні Іван зусім не бываў дома. Прыйдзе ўжо ноччу, стомлены, упадзе на ложак, а назаўтра з узыходам сонца зноў у полі. Нават бацька непакоіўся:

— Ты нібы конь цягнеш воз угару. Трэба берагчы сілы, на кок-сагызе і жыццё, і работа не заканчваюцца.

Асілілі-такі непадатлівы кок-сагыз! Самым памятным для Івана Сітніцы быў той дзень у пачатку лета, калі на сонцы ярка ўспыхнула плантацыя паўднёвай культуры, падобнай на звычайны

І. В. Сітніца

дзьмухавец, якая, дзякуючы працавітым рукам камсамольцаў брыгады, адчувала сябе на Палессі зусім нядрэнна. Тысячы тон каштоўнай сыравіны былі здадзены дзяржаве ў пачатку 50-х гадоў. Па працы — і ўзнагарода...

М. Л. Карзуноў

Па працы і гонар

Булава Валянціна Паўлаўна (н. у 1941 г. у Капаткевічах) — перадавая прадзільшчыца Баранавіцкага баваўнянага камбіната, ініцыятар, шматлікіх працоўных пачынаў, вопытны настаўнік моладзі.

У 1984 г. В. П. Булава ўдастоена звання Героя Сацыялістычнай Працы.

Сям'я была вялікай, бацька загінуў на вайне, і Валянціна з дзяцінства пазнала нялёгкую сялянскую працу. Неяк яна пачула, што ў Баранавічах адкрываецца баваўняны камбінат, для работы на ім набіраюцца дзяўчаты. Адразу загарэлася — паеду... Сустрэлі яе добра, накіравалі вучыцца ў г. Іванава. Са спецыяльнасцю прадзільшчыцы і вялікім жаданнем працаваць па-новаму, па-стаханаўску, яна вярнулася ў Баранавічы і заявіла: «Пяцігодку выканаю за два з паловай гады»... Не было ніякіх спецыяльных разлікаў, ніхто не ствараў асаблівых умоў, проста Валянціна падлічыла ўсё для сябе і вырашыла, што зможа адначасова працаваць на шасці прадзільных машынах. Тут трэба было эканоміць секунды, у бездакорным стане трымаць станкі. Усё гэта было па сілах маладой прадзільшчыцы, у якой хапала энергіі, сіл і няўрымслівасці... Інакш яна проста не магла жыць і працаваць.

За поспехі ў працы В. П. Булава была ўзнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Праз некаторы час ёй быў уручаны ордэн Леніна. І тады Валянціна Паўлаўна выступіла з пачынам абслугоўваць дзве з паловай тысячы верацён. Каля трох тысяч работніц падтрымалі пачын, Баранавіцкі баваўняны камбінат выйшаў у лік перадавых прадпрыемстваў краіны. Валянціна Паўлаўна была ўдастоена Дзяржаўнай прэміі СССР, ёй было прысвоена высокае званне Героя Сацыялістычнай Працы.

Ф. Р. Васілеўскі

Такі характар

Якубовіч Надзея Паўлаўна (н. у 1929 г. у Капаткевічах) — перадавік прамысловасці, рабочая цэха коўкага чыгуну Мінскага аўтамабільнага завода.

У 1960 г. Н. П. Якубовіч прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы.

У цяжкі пасляваенны час Надзя, якой толькі што споўнілася 17 гадоў, па камсамольскай пуцёўцы паехала на будаўніцтва Мінскага аўтамабільнага завода. Не ведала яна тады, што едзе насустрач свайму шчасцю, і менавіта тут, на аўтазаводзе, пройдзе ўсё яе жыццё, знойдзе яе слава і прызванне. Галоўнае — Надзя не баялася працы, яна прызвычаілася да яе з дзяцінства ў цяжкія гады акупацыі.

На месцы будучага аўтазавода была вялікая будаўнічая пляцоўка, дзе круглыя суткі не заціхаў напружаны працоўны рытм. Працавалі некаторыя цэхі, і хутка Надзя з рыштаванняў, дзе была падсобнай рабочай, перайшла ў лiцейны цэх. Яна была вельмі маладой, бадай, самай маладой у калектыве, але стараннасць у рабоце, добразычлівасць, адкрыты, шчыры характар прынеслі ёй заслужаную павагу і аўтарытэт. Яе выбіраюць брыгадзірам, хутка яна становіцца майстрам у цэху. А потым і вяселле згулялі.

Не дзеля славы і заробкаў шчыравала Надзея Паўлаўна. Такі ў яе характар, інакш яна не можа жыць... Сама выбрала сваю дарогу, ішла па ёй упэўнена і прама. І калі ў газетах быў апублікаваны Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, навіна ўскалыхнула не толькі вялікі калектыў Мінскага аўтазавода, адгукнулася яна і ў Капаткевічах, дзе ўсе, хто ведаў Надзею, прынялі гэта як заканамернасць — інакш і не магло быць...

А. В. Бічан

ЗАСЛУЖАНЫЯ РАБОТНІКІ РЭСПУБЛІКІ

Медыцыны

Клябанаў Ізя Міхайлавіч (н. 11.10.1929 г.) пасля заканчэння ў 1956 г. Віцебскага ветэрынарнага інстытута бесперапынна працаваў галоўным ветурачом саўгаса «Капаткевічы». Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны».

Памёр 14.10.1976 г.

Лапета Марыя Пятроўна (н. у 1923 г. у г. Петрыкаў) у 1949 г. закончыла Мінскі медыцынскі інстытут, на працягу амаль трох дзесяцігоддзяў працавала ўрачом-тэрапеўтам у Петрыкаўскай раённай бальніцы. Заўсёды вызначалася глыбокімі прафесійнымі ведамі, за чуласць і дабрыню душы яе паважалі хворыя і сябры па рабоце.

Некрашэвіч Вольга Аляксандраўна (н. у 1925 г.) пасля заканчэння ў 1950 г. Мінскага медыцынскага інстытута атрымала накіраванне ў Петрыкаўскі раён, дзе працавала да апошніх дзён жыцця — загадчыцай Смятаніцкага, затым Грабаўскага ўрачэбных участкаў.

Памерла ў 1972 г.

Несцер Глафіра Трафімаўна (н. у 1921 г. у г. Петрыкаў) перад вайной паступіла ў Мінскі медыцынскі інстытут. Заканчвала вучобу ў г. Харкаў і адначасова працавала медыцынскай сястрой у школе ФЗН, затым хірургічнага аддзялення Пермскага шпіталю. Пасля вайны — галоўны ўрач Петрыкаўскай раённай бальніцы, загадчык раённага аддзела аховы здароўя. Узнагароджана медалём «За працоўную адзнаку».

Народнай адукацыі

Велічкевіч Фелікс Іванавіч (н. у 1915 г.) — удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, да 1943 г. служыў у радах Чырвонай Арміі, затым — у Польскай арміі. За баявыя заслугі ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай Вайны II ст., медалямі, мае замежныя ўзнагароды — польскія ордэны «Срэбраны баявы крыж» і «Бронзавы баявы крыж». Пасля дэмабілізацыі ў 1946 г. — на педагагічнай рабоце, настаўнік, затым дырэктар сярэдняй школы № 2 у Петрыкаве. Узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Ганчар Рыгор Фёдаравіч (н. у 1923 г. у в. Дарашэвічы), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, адзначаны баявымі ўзнагародамі. З 1946 г. — на педагагічнай рабоце. Працаваў настаўнікам, завучам, звыш 30 гадоў — дырэктарам Брынёўскай сярэдняй школы.

Грыб Ядвіга Пятроўна (н. 18.3.1932 г. у в. Найда Жыткавіцкага р.) пасля заканчэння Петрыкаўскага педагагічнага вучылішча на працягу трох з паловай дзесяткаў гадоў працавала ў школе № 1 г. Петрыкава, умела сумяшчаючы працэс навучання і выхавання дзяцей.

Дусь Яўгенія Піліпаўна (н. у 1912 г. у в. Аголіцкая Рудня) усё свядомае жыццё аддала педагогіцы, працавала на розных пасадах у Капцэвіцкім дзіцячым доме, у Брынёве, у Петрыкаўскай школе-інтэрнаце.

Памерла ў 1985 г.

Краўчанка Міхаіл Іларыёнавіч (н. у 1932 г.) з 1952 г. працаваў у школах раёна настаўнікам, завучам. Звыш 25 гадоў узначальваў райана. Узнагароджаны медалямі, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Крукоўскі Анатоль Дзяменцьевіч (н. у 1918 г. у в. Церабень) да вайны працаваў настаўнікам у школе, завочна вучыўся ў Белдзяржуніверсітэце. Усю вайну — на фронце, старшы лейтэнант, камандзір батарэі супрацьтанкавых гармат. Узнагароджаны двума ордэнамі Айчыннай Вайны, Чырвонай Зоркі. Пасля дэмабілізацыі ў 1946 г. Анатоль Дзяменцьевіч вярнуўся ў родны раён,

працаваў завучам Капцэвіцкага педагагічнага вучылішча, затым дырэктарам, настаўнікам сярэдняй школы.

Лосева Яфімія Піліпаўна (н. у 1900 г. у в. Капцэвічы) пачала педагагічную работу ў 1919 г. настаўніцай Капцэвіцкай школы, аддаўшы 45 гадоў жыцця выхаванню дзяцей у роднай вёсцы. Узнагароджана ордэнам Леніна.

Памерла ў 1984 г.

Макарэвіч Рыма Макараўна (н. у 1922 г. у Капаткевічах) на працягу больш трох дзесяткаў гадоў, пачынаючы адразу пасля вызвалення раёна, працавала настаўніцай рускай літаратуры ў Капаткевіцкай сярэдняй школе.

З успамінаў Р. М. Макарэвіч

Улетку 1944 г. мы вярнуліся з лесу, дзе жылі ў час нямецкай акупацыі, і ў жніўні я была прызначана Капаткевіцкім райана, які знаходзіўся тады ў в. Дуброва, дырэктарам Капаткевіцкай сямігадовай школы. Пасёлак акупанты спалілі дашчэнту, людзі, якія засталіся жывымі, жылі ў зямлянках, у нямецкіх бункерах, што патаналі ў бур'яне, парослым на папялішчы... Нярэдка было нават цяжка адшукаць месца знаходжання жыхароў, каб узяць на ўлік тых, хто павінен быў наведваць школу. Дарослыя і дзеці, знясіленыя ад голаду, хварэлі на малярыю.

Школа размяшчалася ў бункеры. Вучні, у асноўным пераросткі, заняткі наведвалі дрэнна. Галодным і бяздомным, многім з іх было не да вучобы... Чарнілa рабілі з альховых шышак, сшыткі з нямецкіх папяровых мяшкоў, па якія хадзілі ў лес, у бункеры, нярэдка рызыкуючы жыццём, таму што, здаралася, падрываліся на мінах. Але нягледзячы на цяжкасці, вучыліся добра, надзвычай добрасумленна.

...Вясной 1945 г., калі растаў снег, вада сабралася ў лагчыне, якая знаходзілася непадалёку ад школы. Аднойчы яна прарвала земляны насып, зроблены намі, і рынулася ў зямлянку. Ішоў урок рускай мовы ў сёмым класе, пісалі сачыненне. Стаяла цішыня. Раптам пачуўся шум вады, яна націснула на дзверы, і вялізны паток хлынуў у зямлянку... Усе апынуліся па пояс у халоднай вадзе. Мы маглі захлынуцца, пачалася паніка. Сямікласнікі, усе пераросткі, падхапіўшы малодшых на рукі, пачалі выбірацца з зямлянкі. На шчасце, ніхто не пацярпеў.

Наверсе мы, мокрыя і перапалоханыя, стаялі і глядзелі, як вада запаўняе нашу школу. Там засталіся сталы, лаўкі, сшыткі з запісамі... Трэба было шукаць новае месца для вучобы.

Марцынкевіч Марыя Мікалаеўна (н. у 1908 г. у г. Петрыкаў) — старэйшы педагог раёна, вучыла дзяцей у Ляскавіцкай школе з 1931 г., пасля заканчэння Мазырскага педтэхнікума. Доўгі час працавала ў розных школах Петрыкава.

Серапін Самуіл Фёдаравіч (н. у 1916 г. у г. Петрыкаў) — удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, узнагароджаны ордэнамі Айчыннай Вайны II ст., Чырвонай Зоркі. Звыш 45 гадоў свае сілы, багаты педагагічны вопыт аддаваў справе навучання і выхавання падрастаючага пакалення. Пасля вайны ўвесь час працаваў у Старынскай пачатковай школе, дзе ім разам з вучнямі пасаджана і вырашчана звыш ста гатункаў дрэў і кустарнікаў. Старынская школа была ўзнагароджана сярэбраным медалём ВДНГ СССР.

Памёр 16.3.1991 г.

Скеп'ян Фёкла Спірыдонаўна (н. у 1908 г. у г. Петрыкаў) працоўную дзейнасць пачала ў 1935 г. настаўніцай у пачатковай школе. У гады Вялікай Айчыннай вайны эвакуіравана ў тыл. Пасля вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў вярнулася ў Петрыкаў і да апошніх дзён працавала настаўніцай пачатковых класаў. Узнагароджана медалём «За працоўную доблесць».

Памерла ў 1957 г.

Тарасевіч Віталій Адамавіч (н. у 1925 г. у в. Філатаўка) працаваў настаўнікам, завучам Чалюшчавіцкай, дырэктарам Залескай, Мышанскай школ. Прымаў актыўны ўдзел у грамадскім жыцці, выбіраўся дэпутатам раённага і сельскіх саветаў народных дэпутатаў.

Памёр у 1986 г.

Тышкевіч Пётр Рыгоравіч (н. 5.10.1897 г. у в. Барычаў) — удзельнік першай сусветнай вайны і Кастрычніцкай рэвалюцыі. У 1920 г. накіраваны на педагагічную работу. Завочна закончыў Мінскі педагагічны інстытут імя Горкага. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны П. Р. Тышкевіч на фронце. Быў тройчы паранены, кантужаны. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай Вайны II ст., медалямі. Пасля вайны працаваў настаўнікам у Пціцкай сярэдняй школе. За шматгадовую педагагічную дзейнасць узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Памёр у 1986 г.

Фалкіна Берта Давыдаўна (н. у 1916 г.) звыш трыццаці гадоў аддала справе выхавання дзяцей, нязменна працавала настаўніцай рускай мовы і літаратуры ў школе № 2 г. Петрыкава.

Памерла ў 1989 г.

Цалка Адам Іосіфавіч (н. у 1912 г. у в. Сякерычы) у перадваенныя гады працаваў настаўнікам, затым дырэктарам Івашкавіцкай школы. Пасля акупацыі раёна — у партызанскім атрадзе, намеснік камандзіра ўзвода, палітрук роты. З мая 1943 г. — камісар 45-га атрада. Удзельнічаў ва ўсіх асноўных аперацыях атрада, у тым ліку ў разгроме Сякерыцкага гарнізона, узрыве маста праз р. Пціч. Быў двойчы паранены. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай Вайны I і II ст., Чырвонага Сцяга, медалямі. Пасля вайны А. І. Цалка працаваў сакратаром Капаткевіцкага райкома КПБ, дырэктарам школы, загадчыкам райана.

Целюкова Ксенія Фёдараўна (н. у 1921 г.) да Вялікай Айчыннай вайны працавала ў Смятаніцкай школе настаўніцай біялогіі, затым — у Петрыкаве. Вызначалася самаадданасцю ў рабоце, імкненнем да выхавання ў дзяцей пачуцця глыбокай любві да Радзімы, прымала актыўны ўдзел у грамадскім жыцці.

Чаўнавік Фёдар Нічыпаравіч (н. 12.9.1886 г. у м. Капаткевічы) — удзельнік першай сусветнай вайны, чатыры гады быў у нямецкім палоне. Працоўную дзейнасць пачаў настаўнікам у Віленскай губерні. У савецкі час працаваў настаўнікам і дырэктарам Велікасельскай пачатковай школы, затым — настаўнікам матэматыкі, дырэктарам Капаткевіцкай сярэдняй школы.

Памёр 31.6.1973 г.

Лясной гаспадаркі

Прыхно Іван Іванавіч (н. у 1924 г.) — удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, за баявыя заслугі ўзнагароджаны ордэнамі Айчыннай Вайны I ст., Чырвонай Зоркі, медалямі. Пасля заканчэння лесатэхнічнага інстытута працаваў галоўным ляснічым, з 1961 г. на працягу чвэрці стагоддзя — дырэктарам Петрыкаўскага лясгаса. Мірная праца ветэрана адзначана ордэнам «Знак Пашаны», медалямі.

Гандлю

Васілеўская Ніна Андрэеўна (н. у 1938 г.) з 1958 г. працавала ў аб'яднанні грамадскага харчавання г. Петрыкава — шэф-поварам, брыгадзірам, з 1980 г. — загадчыцай цэха паўфабрыкатаў. Узнагароджана ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі і «Знак Пашаны».

Юстыцыі

Сямёнаў Васіль Піліпавіч (н. у 1936 г.) закончыў юрыдычны факультэт Белдзяржуніверсітэта, у 1976г. выбраны народным суддзёй Петрыкаўскага раённага суда, працаваў на гэтай пасадзе звыш дзесяці гадоў.

З ордэнам Леніна

Буднік Сцяпан Сафронавіч (н. у 1908 г. у в. Ляскавічы) у 1930 г. быў прызваны ў Чырвоную Армію. Закончыў ваенна-палітычную школу і быў накіраваны намеснікам камандзіра па палітычнай частцы асобага батальёна. Вайну С. С. Буднік сустрэў у Літве на граніцы. Першыя атакі ворага былі паспяхова адбіты, палітрук у гэтых баях праявіў выключную рашучасць і адвагу. Адным з першых франтавікоў у вайну ён у жніўні 1941 г. быў прадстаўлены да высокай урадавай узнагароды. Быў адзначаны таксама двума ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай Вайны II ст., двума Чырвонай Зоркі, баявымі медалямі.

Дэмабілізаваўся палкоўнік С. С. Буднік у 1954 г. Памёр у 1986 г.

Губчык Рыгор Цімафеевіч (н. у 1924 г. у в. Лучыцы) — удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, быў тройчы паранены. Прымаў удзел у баях на Курскай дузе, у Яска-Кішынёўскай аперацыі, узяцці Будапешта, фарсіраванні р. Одэр. Пасля трэцяга ранення ў лютым 1945 г. яму ампутавалі нагу.

За мужнасць і гераізм, праяўленыя пры фарсіраванні р. Одэр і ўзяцці п. Мерцдорф, Р. Ц. Губчык узнагароджаны ордэнам Леніна, многімі іншымі баявымі ўзнагародамі.

Памёр у 1985 г.

Дармель Аляксандр Дзмітрыевіч (н. у 1922 г. у в. Івашкавічы) перад вайной працаваў сакратаром Капаткевіцкага сельскага савета, у гады акупацыі — партызан 125-й брыгады, затым — на фронце. Баявы шлях яго адзначаны многімі баявымі медалямі. На радзіме пасля дэмабілізацыі яго выбіраюць сакратаром Капаткевіцкага райвыканкома, у 1950 г. — старшынёй калгаса ў в. Церабаў, затым — у Галоўчыцах. Калі калгас быў ператвораны ў аддзяленне саўгаса «Навасёлкі», ім на працягу многіх гадоў кіраваў А. Дз. Дармель. Амаль да апошніх дзён жыцця ён працаваў старшынёй Навасёлкаўскага сельскага савета, меў шэраг іншых урадавых узнагарод.

Памёр у 1986 г.

Дубіна Аляксандра Канстанцінаўна (н. у 1932 г. у в. Навасёлкі) пачала сваю працоўную біяграфію ў паляводчай брыгадзе мясцовага калгаса «Чырвоны Кастрычнік» падлеткам у цяжкія пасляваенныя гады. Звыш 30 гадоў шчыравала даяркай. З году ў год раслі надоі ў яе групе кароў, павышалася майстэрства.

Узнагароджана таксама ордэнамі Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны».

Памерла ў 1988 г.

Гаўрук Максім Яўхімавіч (н. у 1903 г. у г. Петрыкаў) назаўсёды звязаў свой лёс з ваенна-марской авіяцыяй, прайшоўшы шлях ад радавога салдата да капітана трэцяга рангу. У гады Вялікай Айчыннай вайны — начальнік штаба батальёна, прымаў удзел у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў і японскіх мілітарыстаў.

Узнагароджаны таксама ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай Вайны I ст., Чырвонай Зоркі, медалямі.

Кабановіч Надзея Антонаўна (н. у 1924 г. у в. Галубіца) працавала ў паляводчай брыгадзе, была звеннявой, майстрам высокіх ураджаяў кок-сагызу. Інвалід першай групы.

Зізюк Уладзімір Рыгоравіч палкоўнік, займаў адказныя пасады ў Міністэрстве абароны СССР. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, узнагароджаны пяццю баявымі ордэнамі і шматлікімі медалямі. Закончыў ваеннае вучылішча, затым ваенна-педагагічны інстытут у Ленінградзе. Удастоены шасці залатых медалёў ВДНГ СССР за кіраўніцтва вайсковымі часцямі на ўборцы ўраджаю.

Памёр 13.5.1995 г.

Касцееў Серафім Мікалаевіч у далёкіх 20-х гадах быў першым старшынёй

калгаса «Новы Бобрык», затым старшынёй Бобрыкаўскага сельскага савета. У кастрычніку 1930 г. прызваны ў Чырвоную Армію. Пісьменнага, кемлівага байца накіроўваюць у Палтаўскае ваенна-палітычнае вучылішча ім. Фрунзе.

З чэрвеня 1941 г. Серафім Касцееў — на фронце. На пасадзе камісара палка абараняў Маскву. На Арлоўска-Курскай дузе камандаваў артылерыяй 26-й брыгады, на Украіне — камандзір супрацьтанкавага ўмацаванага раёна, у Крыме — намеснік камандзіра дывізіі...

С. М. Касцееў узнагароджаны таксама ордэнамі Айчыннай Вайны I і II ст., трыма ордэнамі Чырвонага Сцяга, Суворава III ст., Чырвонай Зоркі, баявымі медалямі.

Каленік Рыгор Юркавіч (н. у 1901 г. у в. Навасёлкі) пачаў баявую дзейнасць добраахвотнікам па ахове маста праз Прыпяць вясной 1919 г. Восенню паступіў матросам на бронепараход «Трахтаміраў», удзельнік баёў з белапалякамі. У сувязі з зімоўкай караблёў каля Барбарова быў эвакуіраваны з камандай у Гомель, уступіў у Чырвоную Армію, удзельнічаў у грамадзянскай вайне. У 1923 г. дэмабілізаваўся, працаваў бакеншчыкам на Прыпяці, затым быў старшынёй калгаса ў в. Белка і Навасёлкі. З пачатку вайны на фронце, загінуў у сакавіку 1942 г.

Кніга Міхаіл Фёдаравіч (н. у 1923 г.) — удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, майстар вырошчвання коксагызу. Механізаванае звяно, якое ён узначальваў, з году ў год дабівалася высокіх ураджаяў гэтай новай на Палессі культуры.

Памёр у 1982 г.

Кудравец Аркадзій Купрыянавіч (н. у 1928 г. у в. Ванюжычы) пачаў працоўную дзейнасць адразу пасля вызвалення раёна ў родным калгасе «2-я пяцігодка». Быў брыгадзірам, затым кіраўніком Ванюжыцкага аддзялення саўгаса «Навасёлкі». У аддзяленні заўсёды атрымлівалі добрыя ўраджаі збожжа і бульбы, А. К. Кудравец удастойваўся сярэбранага і бронзавага медалёў ВДНГ СССР.

Узнагароджаны таксама ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі.

Ланька Антон Якаўлевіч (н. у 1895 г. у г. Петрыкаў) з 15 гадоў працаваў на суднабудаўнічай верфі. У імперыялістычную вайну служыў на Балтыйскім флоце, з адабрэннем сустрэў вестку аб рэвалюцыі. З 1921 г. працаваў на розных пасадах у Верхнедняпроўскім рачным параходстве.

Памёр у 1982 г.

Марцінкоўскі Фёдар Рыгоравіч (н. у 1896 г. у г. Петрыкаў) падлеткам пачаў сваю працоўную біяграфію сплаўшчыкам на Прыпяці, дзе шчыраваў усё свядомае жыццё. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

Узнагароджаны таксама ордэнам Айчыннай Вайны II ст., медалямі.

Памёр у 1989 г.

Матвіеўскі Яфім Рыгоравіч (н. у 1888 г.) — удзельнік партызанскага руху на акупіраванай кайзераўскімі захопнікамі, затым польскімі легіянерамі тэрыторыі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Уся мірная праца звязана з чыгункай, дзе на ст. Пціч ён працаваў майстрам дыстанцыі шляху.

Памёр у 1985 г.

Мейлах Лявонцій Іванавіч (н. 1.7.1899 г. у Петрыкаве) — палкоўнік медыцынскай службы. У 1915 г. добраахвотна ўступіў у Чырвоную Армію. Закончыў курсы чырвоных камандзіраў, Ленінградскую ваенна-медыцынскую акадэмію. Прымаў удзел у баях супраць японскіх мілітарыстаў у 1939г., у савецка-фінляндскай вайне. З першых дзён Айчыннай вайны — на фронце, начальнік эвакапункта паляводга шпіталю.

Узнагароджаны таксама ордэнамі

Чырвонага Сцяга, Працоўнага Чырвонага Сцяга, двойчы — Чырвонай Зоркі, баявымі медалямі.

Памёр 3.8.1969 г.

Міцкевіч Іван Міхайлавіч (н. у 1905 г. у г. Петрыкаў) усё жыццё працаваў сплаўшчыкам Петрыкаўскага сплаўучастка — рабочым, майстрам, начальнікам сплаўучастка. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

Памёр у 1982 г.

Пілецкі Максім Апанасавіч (н. у 1922 г. у в. Снядзін) з чэрвеня 1941 г. выконваў заданне камандавання ў тыле праціўніка. Асабліва вызначыўся пры вызваленні Украіны, выконваючы заданні разведвальнага аддзела штаба 1-га Украінскага фронту. Неаднаразова паказваў у баях прыклады мужнасці і гераізму.

10 красавіка 1945 г. радавы М. А. Пілецкі быў прадстаўлены да ордэна Леніна. Але атрымаць яго не давялося, праз некалькі дзён адважны разведчык загінуў у адным з баёў.

Рачкевіч Фёдар Аўдзеевіч (н. у 1923 г. у в. Івашкавічы) — ветэран-франтавік, у баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі быў тройчы паранены. Пасля дэмабілізацыі на працягу многіх дзесяцігоддзяў працаваў механізатарам у родным калгасе. За ратныя подзвігі ўзнагароджаны ордэнамі Айчыннай Вайны II ст., Чырвонай Зоркі, баявымі медалямі, многімі ўрадавымі ўзнагародамі за мірную працу.

Рудаўскі Ілья Аляксеевіч (н. у 1922 г. у в. Востраў) на калгасную працу выйшаў у 12 гадоў, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

У 1950 г. прызначаны брыгадзірам па вырошчванні кок-сагызу. Па 400 і больш цэнтнераў каранёў з гектара ўбіралі ў яго брыгадзе. Узнагароджаны таксама ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Сітніца Іван Максімавіч (н. у 1913 г. у в. Востраў) у перадваенныя гады працаваў трактарыстам Мулярайскай МТС. Бацька яго загінуў у гады сталінскіх рэпрэсій. З пачатку вайны І. М. Сітніца — на фронце, прайшоў вогненнымі дарогамі вайны да самага дня перамогі. Затым працаваў у родным калгасе «Балышавік», дабіваўся высокіх ураджаяў кок-сагызу. Удастоены ордэнаў Леніна і Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Памёр у ліпені 1979 г.

Скорынава Анастасія Фёдараўна (н. у 1920 г.) перад вайной паступіла ў Мінскі медыцынскі інстытут, закончыла яго ў 1947 г. Працавала ўрачом у Ляскавіцкай амбулаторыі тэрапеўтам, рэнтгенолагам і галоўным урачом раённага туберкулёзнага дыспансера.

Туравец Пётр Іванавіч (н. у 1934 г. у в. Філіпавічы) у 1953 г. закончыў курсы трактарыстаў пры Навасёлкаўскай МТС і да сённяшняга дня працуе механізатарам у мясцовым саўгасе «Навасёлкі». Неаднаразова быў удзельнікам ВДНГ СССР.

Шутаў Фёдар Іванавіч (н. у 1912 г. у в. Навасёлкі) закончыў сельскагаспадарчы тэхнікум, працаваў галоўным аграномам райземаддзела. У гады вайны змагаўся ў 130-й Петрыкаўскай партызанскай брыгадзе. Пасля вызвалення раёна Ф. І. Шутаў — аграном Капаткевіцкай МТС, быў выбраны старшынёй калгаса «Новы шлях», затым — кіраўніком аддзялення саўгаса «Навасёлкі».

Кабановіч Андрэй Іванавіч — удзельнік першай імперыялістычнай і грамадзянскай войнаў. У канцы 1918 г. вярнуўся ў родную вёску Вышалаў і пачаў актыўна арганізоўваць савецкую ўладу ў воласці. Яго выбралі старшынёй Ляскавіцкага рэўкома, затым працаваў на розных адміністрацыйных і гаспадарчых пасадах у раёнах вобласці. З 1938 г. А. І. Кабановіч з'яўляўся

намеснікам Народнага камісара саўгасаў БССР, у пасляваенны час — першым намеснікам міністра саўгасаў рэспублікі, начальнікам Упраўлення саўгасаў Міністэрства сельскай гаспадаркі.
Памёр 10.7.1969 г.

Ястрэмскі Яўхім Сцяпанавіч (н. у 1928 г. у в. Снядзін) пасля вызвалення вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў летам 1944 г. прымаў удзел у размініраванні вёсак і тэрыторыі Снядзінскага сельсавета, атрымаў раненне ў абедзьве нагі. Працаваў у Снядзінскім участку леспрамгаса, затым з сям'ёй выехаў у Казахстан. На працягу амаль 30 гадоў быў механізатарам у цалінным саўгасе, з году ў год атрымліваў высокія ўраджаі збожжа.
Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, Кастрычніцкай Рэвалюцыі.

* * *

Бамбіза Іван Міхайлавіч (н. 8.10.1952 г. у в. Ляскавічы) закончыў Беларускі інстытут механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі, працаваў на розных пасадах у гаспадарках Гомельскага і Петрыкаўскага раёнаў. У 1985 г. назначаны начальнікам управлення сельскай гаспадаркі Петрыкаўскага райвыканкома, затым працаваў старшынёй выканкома Рэчыцкага раённага савета народных дэпутатаў. Дэпутат Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дванаццатага склікання. З лютага 1994 г.— намеснік Старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. З кастрычніка 1995 г.— міністр па справах СНД.

Кілбас Аляксандр Антонавіч (н. 23.7. 1921 г. у в. Грабаў) працаваў настаўнікаў у в. Брынёў, у пачатку вайны быў пакінуты для арганізацыі партызанскай барацьбы ў тыле ворага. З снежня 1941 г. у 132-м партызанскім атрадзе, намеснік камісара. У пасляваенны час на камсамольскай і партыйнай рабоце, сакратар гаркома, райкома ў Ка-

А. А. Кілбас

марыне, Любані, Барысаве, Мінску. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР, на працягу дзесяці гадоў да выхаду на пенсію ў 1982 г.— першы намеснік старшыні Мінскага аблвыканкома. У апошні час — старшыня Мінскага абласнога савета Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў.
А. А. Кілбас узнагароджаны ордэнамі Леніна, Айчыннай Вайны II ст., трыма ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, баявымі медалямі, у тым ліку іншаземнымі.

Марыніч Міхаіл Афанасьевіч (н. 13.1. 1940 г. у в. Новыя Галоўчыцы) пасля заканчэння ў 1964 г. Беларускага політэхнічнага інстытута працаваў майстрам, прарабам, галоўным інжынерам у трэсце «Цэнтратранстэхмантаж». З 1979 г. на савецкай рабоце — у Маскоўскім раённым Савеце народных дэпутатаў, затым намеснік і старшыня выканкома Мінскага гарсавета. Быў паслом Рэспублікі Беларусь у Чэхіі, Славакіі і Венгрыі, першым намеснікам старшыні Дзяржаўнага камітэта па знешніх эканамічных сувязях. Дэпутат Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дванаццатага склікання. З кастрычніка 1994 г.— міністр знешніх эканамічных сувязей.

Мазай Ніна Мікалаеўна (н. у 1950 г. у в. Чалюшчавічы) пасля заканчэння ў 1972 г. гістарычнага факультэта Белдзяржуніверсітэта працавала выкладчыкам гісторыі ў сельскай школе на Брэстчыне. Доўгі час была на камса-

мольскай рабоце, з 1978 г. — першы сакратар Брэсцкага абкома ЛКСМБ. Да 1985 г. з'яўлялася першым сакратаром ЦК ЛКСМБ, затым працавала намеснікам Старшыні Савета Міністраў БССР. З 1991 г. — пасол Беларусі ў Францыі.

Серада Мікалай Міхайлавіч (н. у 1947 г. у в. Ляскавічы) — генерал-маёр міліцыі, член канстытуцыйнага суда Рэспублікі Беларусь. Закончыў Валгаградскую вышэйшую школу следчых, Акадэмію МУС у Маскве. Працаваў рабочым у лясгасе, участковым інспектарам, следчым у Жыткавіцкім РАУС, начальнікам УУС Гомельскага аблвыканкома, намеснікам міністра ўнутраных спраў рэспублікі. Выбіраўся народным дэпутатам Рэспублікі Беларусь дванаццатага склікання.

Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Пуцяводная зорка

Чаус Пётр Рыгоравіч (н. 7.1.1939 г. у в. Старына) — генерал-палкоўнік, закончыў Мінскае суворaўскае вучылішча, Ваенна-палітычную акадэмію імя Леніна, Ваенную акадэмію Генштаба. Служыў у Паўночна-Каўказскай, Беларускай, Сярэднеазіяцкай, Прыбалтыйскай ваенных акругах, у Афганістане, у Маскве і Мінску, у Чэхаславакіі, прайшоўшы службовы шлях ад лейтэнанта — камандзіра ўзвода — да міністра па справах абароны Рэспублікі Беларусь.

Узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, ордэнам «За службу ў радах узброеных сіл СССР» III ступені, ордэнамі іншаземных дзяржаў.

У кожнага чалавека — свая пуцяводная зорка, а Пётр Рыгоравіч Чаус нарадзіўся ў той студзёны дзень 1939 г., відаць, пад зоркаю Марса. І назвалі яго, пятае дзіця ў вялікай, беднай сям'і старынскіх сялян-гаротнікаў, проста і ёмка, між тым Пётр у перакладзе з грэчаскай мовы азначае «камень, скала»... Такім ён і вырас — моцным і па-сялянску простым, надзейным і сціплым.

Зорка тая вяла Пятра Чауса па крутых вайсковых прыступках упэўнена і прама. Сын партызанскага сувязнога, загінуўшага перад самым вызваленнем, ён быў сярод першых навучэнцаў суворaўскага вучылішча, якое адкрылася ў Мінску ў 1953 г. З усіх выпускнікоў вучылішча за больш як чатыры дзесяцігоддзі толькі ён даслужыўся да такога высокага звання.

...Ззаду — Ташкенцкае агульнавайсковае вучылішча, на плячах — пагоны лейтэнанта. Пацягнуліся чарадой вайсковыя будні — Сярэдняя Азія і Украіна, Беларусь і Расія... І што за лёс выдаўся будучаму палкаводцу! Усюды там, дзе патыхае агнём, дзе ў так званы мірны час пахне порахам, вырашаецца лёс краіны, якім бы ні быў ён супярэчлівым з сённяшняга пункту гледжання, там у першых радах афіцэр Пётр Чаус.

Новачаркаск, 1962 год. Вядомыя сённяшнія падзеі, якія доўгі час скрываліся ад народа. У тых трагічных падзеях, у гушчыні якіх апынуўся Пятро Чаус, ён атрымаў сур'ёзны экзамен на сталасць і мужнасць, на палітычную свядомасць.

Наступіў жнівень 1968 г., фарсіраваны марш праз Украіну, Карпаты — наперадзе была Чэхаславакія. У першых радах акупацыйных войск, як цяпер гавораць, — намеснік камандзіра танкавага батальёна Пётр Чаус. Між тым, тады, чвэрць стагоддзя назад, быў зусім іншы погляд на падзеі, і тыя, хто ў іх удзельнічаў, ганарыліся сваёй місіяй...

П. Р. Чаус

Асобная старонка ў жыцці Пятра Чауса — Афганістан, які, як стала сёння зразумела, стаў папярэднікам разва-

лу вялікага Савецкага Саюза... Як ставіцца да той несправядлівай, непатрэбнай вайны?.. У Афганістане генерал Пётр Чаус быў ваенным саветнікам самых высокіх рангаў, планаваў і сам удзельнічаў у многіх баявых аперацыях, зрабіў нямала для таго, каб прадухіліць ці знізіць страты нашых войск. Пётр Чаус і ў Афганістане, як і ўсюды, дзе ён служыў, выконваў свае нялёгкія абавязкі добрасумленна, з поўнай выкладкай, не перакладваючы яе на плечы другіх.

В. Р. Феранц

Высокае неба

Анатоль Лявонцьевіч Рудзеня нарадзіўся ў 1937 г. у Капаткевічах. У дзяцінстве страціў бацькоў. Ён адразу нібы пасталеў і памужнеў і, магчыма, яшчэ тады вырашыў стаць вайскоўцам. Ад дзеда, які яго выхоўваў, Анатоль цвёрда засвоіў, што для гэтага трэба добра вучыцца, многа ведаць. Па ўсіх прадметах у яго былі добрыя і выдатныя адзнакі.

Хутка праляцелі гады вучобы ў школе. Анатоль Рудзеня паступіў у лётнае вучылішча. Збылася мара!.. Вучылішча ён закончыў з адзнакай. Вось яно — неба, высокае, блакітнае, неабсяжнае...

Класнага лётчыка Анатоля Рудзеню камандаванне накіроўвае ў акадэмію імя Ю. А. Гагарына. І тут ён — адзін з лепшых, закончыў акадэмію з' адзнакай. Дзе б ні служыў майстар вышэйшага пілатажу, ён усюды карыстаўся заслужаным аўтарытэтам. Радкі з газеты «Савецкі патрыёт» за 1974 г.: «Практычныя вучэнні ў разгары... Усё разлічана да секунды, змерана да метра. Маёр Рудзеня далажыў кіраўніку палётаў аб гатоўнасці. «Запуск»,— адказалі з КП. Афіцэр нажаў на кнопку запуску. За хвастом знішчальніка-бамбардзіроўшчыка задрыжалі кароткія языкі полымя. Услед ажылі турбіны яшчэ некалькіх ракетаносцаў. Ваенны лётчык І класа, паветраны ас узначаліў групу баявых машын, упэўнена павёў да месца, дзе быў выяўлены разведчыкамі аэрадром «праціўніка». Выкідванне. З першага заходу цэль знішчана»...

Генерал-маёр авіяцыі Анатоль Лявонцьевіч Рудзеня ніколі не спыняўся на дасягнутым, ён засвоіў шэсць тыпаў сучасных баявых машын, падрыхтаваў шмат класных лётчыкаў. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, «За службу Радзіме ва Узброеных Сілах» III ст., дзевяццю медалямі. І ніколі не забываў, што стартавая пляцоўка яго ўзлёту — тут, на роднай палескай зямлі...

В. Ц. Талецкі

* * *

Рудзько Іван Харытонавіч (н. 18.5. 1901 г. у г. Петрыкаў) — удзельнік грамадзянскай вайны, прымаў удзел у барацьбе з бандамі Булак-Балаховіча ў раёне Мазыра — Рэчыцы. У гады Вялікай Айчыннай вайны — у Камітэце абароны і Дзяржплане СССР, кантраляваў забеспячэнне Узброеных Сіл спецыяльнай тэхнікай і ўзбраеннем. У 1938 г. закончыў Ваенную акадэмію механізацыі і матарызацыі Чырвонай Арміі, генерал-маёр інжынерна-тэхнічнай службы. Дэмабілізаваны з арміі ў 1960 г.

Узнагароджаны сямю ордэнамі, у тым ліку ордэнам Леніна, медалямі.

Памёр І. Х. Рудзько ў 1969 г.

На зямлі палескай

Палтаран Вера Сямёнаўна (н. 28.3. 1919 г. у в. Бабунічы) — беларуская пісьменніца. Вучылася ў Мінскім педагагічным інстытуце, пасля

В. С. Палтаран

вайны закончыла БДУ. Працавала ў газетах «Чырвоная змена», «Літаратура і мастацтва», у часопісе «Маладосць», затым — загадчык аддзела ў выдавецтве «Мастацкая літаратура». Выдала кнігі «Ключы ад Сезама» і «Дзівасіл», за якія ўдастоена Дзяржаўнай прэміі БССР імя П. Лепяшынскага. Асноўная тэма нарысаў Веры Палтаран — роднае Палессе, жыццё сучаснай вёскі, душа чалавека-працаўніка.

Памерла В. С. Палтаран 28.3.1989 г.

...І вось яны, гэтыя сцежкі, — ужо не ў думках, а перад вачамі. Петрыкаў... Стаіць ён на высокім беразе Прыпяці, у вянку сасновых бароў. Паглядзіш адсюль на шырокую спакойную раку, на жоўтыя прырэчныя плёсы, на засмужаныя зарэчныя далі, прыслухаешся, як перагукваюцца на вадзе параходы і баржы, і табе раптам здаецца, што ты стаіш дзе-нібудзь на Уладзімірскай горцы ў Кіеве...

Нас, чатырох пасажыраў райкомаўскага «газіка», сабрала разам адна дарога: дабіраемся ў калгас «Бальшавік»... Трымціць, лапоча над галавою старэнькі, палінялы брызент, натужна вые матор, машына, выпаўзшы з аднае калюжыны, тут жа нырае ў другую. Эх, дарогі! Колькі вы ўкарацілі веку машынам!.. Гэта ж каб сабраць усе тыя грошы, якія трацяцца з году ў год на рамонт разбітых па гэтых дарогах легкавушак і грузавікоў, то можна было б не тое што пазасыпаць дарогі гравіем, а пазаліваць гудронам.

Што, ці не Людзвіноў ужо? Так і ёсць — Людзвіноў. Хутка і Курыцічы — цэнтр калгаса «Бальшавік», Людзвіноў — адна з яго васьмі брыгад.

Курыцічы... Некалі гэта была самая бедная вёска на Петрыкаўшчыне. Зямлі мала, ды і якая тая зямля — адны пяскі! А кругом, як вокам акінуць, ляжалі непраходныя балоты. Чаго-чаго, а лазы на лапці хапала. Ідзе, бывала, курыкавец у госці ў Бабунічы ці Міхедавічы, за плячамі ў яго торба і нешта ладнае ў ёй целяпаецца. Што ж, мо чалавек гасцінец які нясе сваякам... А-яй, ліха яго мела, таго гасцінца — лапці там ляжаць, новыя, лазовыя.

Пазней Курыцічы славіліся сваімі музыкамі. Жылі тут на ўсю Петрыкаўшчыну славутыя Пятры — адзін граў на скрыпцы, другі — на кларнеце, а трэці на бубне падбіваў. Раскошная была па тым часе музыка!

Не вярнуўся з вайны ніводзін Пятро. І ніхто не ведае, дзе яны палеглі і якія вятры напяваюць ім свае вечныя песні... Ну, скажы ты, якія чэпкія гэтыя ўспаміны! Успыхне ў памяці адно, за ім пацягнецца другое...

...Цётка Насця падпаліла ў печы, унесла ў хату кош бульбы і высыпала ў таз з вадой. Вось дык бульба! Чатыры-пяць бульбін — і поўны чыгун. Цётка Насця рэжа бульбу на кавалкі, каб больш улезла ў чыгун, і расказвае:

— Ето яшчэ малая... Лето мокрае было... А як парасце каторы год — і кош не трэба: кладзі на руку, як паленне, і нясі.

У печы ўгараюцца дровы, у комін шугае вясёлае барвовае полымя. Пахне дымком, палітаю на цэглу вадою, кіслым цестам. Цётка Насця падсоўвае да прыпечка ўслончык з дзежкаю і ставіць у печ, на гарачае вуголле, скавараду.

— А яшчэ жыто ў нас расце моцно дабрэннае, — упраўляючыся ля печы, расказвае яна. — Спячэш хлеб, дык як булка.

Цётка Насця адстаўляе ад агню гаршкі, адцягвае скавараду і, абапёршыся на вілачнік, доўга стаіць моўчкі.

— Жытка мая була нялёгкая, — сумна ўздыхае яна. — Расла ў такой беднасці, што і спомніць страшно. Замуж пайшла маладая, ды не пайшло мне на дабро тое замужжа. Буў у нас тут адзін чалавек. Багато жыў! Мы, маладыя, усё да яго ў заработкі хадзілі. Ну, прыгледзеўся ён, што я да работы такая падкая, ды і прысылае сватоў: за сына сватаць. Падумала я, паразважала сваім дурным розумам, ды і рашыла — пайду, можа хоць кавалку хлеба жадна не буду...

І года я не пражыла замужам, як пачалося раскулачванне. От тут я і агледзелася, куды завяла мяне ліхая доля, загаласіла: «А якое ж ліхо несла мяне ў етую хату? Што ж я буду рабіць — у мяне ж скора малое будзе...»

Пашкадавалі мяне добрыя людзі, не выслалі з тою сям'ёй. Аддалі бацьку з маткай, пакуль дзіця родзіцца...

Стала я зноў жыць у бацькавай хаце — ні дзеўка, ні ўдава. Бувало, дзе ні іду, што ні раблю, а ў душы адзін страх, адна трывога: от скажуць — збірайся... От скажуць... І тое дзіця маё то мне нямілае робіцца, то аж заходжуся ад жалю да яго...

Ну, радзілася дзіця... Месяц праходзіць — ніхто мне нічога не кажа. Паўгода... Так і мінулася тое ліхо.

Дзіця не доўга пажыло на свеце, памерло, засталася я адна. Было мне тады семнаццаць — васемнаццаты год, людзі казалі, харошая була... Пачалі мне трапляцца і хлопцы, і мужчыны, але хто раз апёкся...

Неяк перад самай ужо вайною сустрэла харошага чалавека. Пажаніліся, ды пажылі нядоўга. Пачалася вайна, яго забралі ў армію, і я зноў засталася адна.

А самае большае гора пабачыла, калі прыйшлі немцы... Спалілі нашы хаты, людзей многа пабілі. Бачым мы — бяда, і давай у лес уцякаць. Пакапалі там сабе зямлянкі і сядзім, як тыя краты. А тут —

аблава за аблаваю... І да таго, бувало, заганяюць етых бедных людзей, што ўпадзеш дзе ля купіны і сілы няма падняцца. Але ж як стрэляць блізка, то адкуль тая і сіла бярэцца — падхопішся і ляціш без душы, як заяц...

От так загналі нас у страшно гразкае балото. Сядзім мы, хто аберуч абшчапіў паваленае дрэва, хто за куст учапіўся. А каля нас усё нешта шлёп-шлёп у ваду, шлёп-шлёп... Прыгледзеліся, аж ето курыныя галовы ў твань ляцяць — немцы на беразе курэй на абед рэжуць... А мы перамерзлі ў вадзе, дрыжым. Ды і дрыжаць баімся — бераг жа блізка... Пайшлі. Мы падаждалі яшчэ трохі — ціхо... Вылезлі мы з балота ды і кінуліся да сваіх зямлянак, там у нас трохі круп було: ён жа, голад, бувае, і за смерць страшнейшы. Тут, ля зямлянак, нас і абкружылі... Тых, хто ўцякаў, перастралялі, а астатніх на станцыю ды ў вагоны... Не магу я пра ето...

Цётка Насця адварочваецца да печы і доўга б'е чапялою па галавешках. Потым бярэ з паліцы талерку, нож і моўчкі выходзіць з хаты.

Ціха патрэскваюць галавешкі ў печы, сіпіць каля гаршкоў гарачае вуголле, мерна, адна за другою, падаюць важкія кроплі вады. Цішыня. Спакой... І нішто не напамінае аб тым, што ў гэтай цішыні і спакоі жыве вялікі чалавечы боль.

Цётка Насця вяртаецца ў хату, несучы на талерцы кавалак сала і яйкі.

— Загаварылася і пра снеданне забула, — вінавата ўсміхаецца яна. — Здаецца, даўно тое було, а от не забуваецца... Вярнуліся мы, хто — з лесу, хто — з арміі, хто з Германіі, глядзім, няма нашага сяла, адзін бур'ян калышацца. Пабедавалі мы, паплакалі ды — за сякеры, за лапаты... Ой і рабілі ж людзі! Адкуль у іх столькі сілы бралася? Галодныя, халодныя, а не було ім ні дня, ні ночы. Палажылі сілы на етае балота, але ж затое што ні пасееш, што ні пасадзіш — расце, як на дражджах. Ето ж ці не траім чалавекам з нашага калгаса Героя далі?.. Рудаўскаму, Сітніцы і Буднік... Траім!

Цётка Насця хвіліну памаўчала, а потым неяк сарамліва і збянтэжана ўсміхнулася і сказала:

— То і ў мяне ж нешта е... От я вам пакажу...

Старанна выцерпы ручніком рукі, яна пайшла на чыстую палавіну, прынесла адтуль нешта загорнутае ў белую хусцінку і пачала асцярожна разгортваць. На твары ў яе свяцілася нясмелая, сарамлівая ўсмешка.

— От, — працягнула яна маленькую тоненькую кніжачку, зверху якой ярка бліснуў чырванню і срэбрам ордэн.

«...Грэська Анастасія Іванаўна... ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. 31 мая 1952 года.»

Цётка Насця збянтэжана бліснула затуманеным слязою позіркам, пачырванела і пачала загортваць свой скарб у хусцінку...

Дзень хіліцца да вечара. У акно свеціць сонца, і ў яго мяккім святле адчуваецца халадок і блізкія прыцемкі.

Цётка Насця сядзіць ля акна і спяшаецца нешта завідна дашыць. Паўз акно мільгае постаць. Цётка Насця, хутка сцелючы шывок за шыўком, заклапочана гаворыць:

— Не паспела... Ідзе ўжо мая Куліна...

Чуюцца прыглушаныя крокі ў сенцах, гулчэйшыя — у кухні, і праз адчыненыя дзверы ў пакой заглядвае ладная, з малажавым ружовым тварам і густымі сівымі валасамі жанчына.

— Заходзь, чаго стала ў парозе? — цётка Насця адсоўваецца на край услончыка, даючы месца госці.

Цётка Куліна скідае ватоўку, хустку, вешае ля парога і абводзіць нас вясёлымі сінімі вачамі.

— У цябе ето, Насця, мо госці? — пытаецца яна, прысаджваючыся на ўслончык. — Здалёк?..

— З Мінска.

— Добра, што Мінску да Курыпіч клопат е. Толькі дзе ж вы былі, нашы дарагія госцейкі, як у етых Курыпічах усё на грамы мералі. От тады трэба было паглядзець, а то цяпер... Чаго ты, Насця, на мяне пазіраеш?..

— А хто табе што кажа?.. От на, прыкінь, ці добра я рукавы ўставіла.

Цётка Куліна надзявае чырвоную квяцістую кофту, абцягвае і абгладжвае яе на сабе і, памаладзелая, прыгожая, бліскае белазубаю ўсмешкай:

— Мо, які дзед і зірне...

— О-ой, божухна-бацюхна, якія ўжо дзяды на ўме. На табе тваю кохту і дай мне з чалавекам пагаварыць... От вы пытаецеся, як жывём. Паваявалі мы са сваім балотам — ето ж яшчэ да вайны пачалі яго асушваць. Канавы трэба было капаць у шырыню паўтара метра, ды ў глыбіню метр трыццаць. Дык, паверце, па дваццаць метраў за дзень выганялі. Ідзём, бувало, увечары дадому, мокрыя па пояс, флаг чырвоны перад сабою нясём, а рукі аж гудуць ад стомы і ногі, настуджаныя за дзень у вадзе, служыць не хочуць... А назаўтра прыйдзем, дый зноў за лапаты. І асілілі-такі, не былі б то палешукі... У тыя гады мы многа паспелі зрабіць, ужо абжывацца трохі сталі, як пачалася вайна... Дзе толькі не насіла мяне гора ў тыя страшныя гады!..

Помню, палавілі нас немцы ў лесе, запёрлі ў таварныя вагоны і павезлі ў Германею. Суткі едзем, другія... За чэцвера сутак у мяне макавай расінкі ў роце не было. Ну, а ў Германеі рабіла ў памешчыка, па-іхняму баўера. У яго было многа парабкоў: хто са скацінаю ўпраўляўся, хто на кухні прыслужваў, а я на поле рабіць хадзіла. Прыйду, бувало, на тое поле, нягожая, галодная, абадраная, зірну ў той бок, дзе сонца ўзыходзіць, ды як загалашу...

Аслабанілі нас з таго лагера амерыканскія салдаты. Прыехала я ў Брэст, ды як глянула, што ето ж

ужо наша зямля, і людзі кругом нашы, і гаворка наша... Назаўтра глянулі на мяне жанкі, з якімі я да Брэста разам ехала, і рукамі ўсплясnулі: «Ой, што ж ето з табой зрабілася... Ты ж сівая ўся!»

Прыехала ў Курыцічы... Ні аднае хаты, ні аднаго двара, толькі вецер з канца ў канец сяла па бур'яне гуляе. Пайшла я па етаму бур'яну на сваё селішча. Стала, гляджу... І ні слёз у мяне, ні голасу, толькі чую, як усю мяне з галавы да ног холадам праймае.

Не ведаю, колькі я так прастаяла, як раптам нешта з бур'яну — шусь мне пад ногі. Гляджу — кот, што да вайны ў нас жыў. «Коцічак мой, коцічак...» — нагнулася, каб яго пагладзіць, а ён як фыркне да — у бур'ян. Глядзіць адтуль, па ўсім відно — пазнаў, але страх мацней за етую памяць. Так ён больш ніколі і не пайшоў у хату, як мы яго не звалі...

Каб расказаць, як мы тут, на етых папялішчах, жыць пасля вайны пачыналі, то не хапіла б усяе ночы. Не было ж у нас ні каня, ні вала — усяе тае і скаціны на ўсё сяло, што мой кот. То, бывало, упражэцца баб дванаццаць у плуг, а я іду за плугам, на хаду адваленую скібу нагой прытоптваю ды яшчэ і пагукваю: «Но-о, жаначкі, но-о! Весялей, мае конікі, варушыцеся!» А тыя «конікі», галодныя, цягнуць-цягнуць, выб'юцца з сілы, падаюць у баразну ды як загалосяць! О-ой, божахна-бацюхна...

Ну, з часам перабылося, перажылося і етае гора. І калгас мы адстроілі, і хат панастаўлялі. Толькі б і жыць цяпер, дык здароўя няма. Бачыце, якая ў мяне рука? То цяпер яшчэ нічога, а то ж распухне — як калода. Ето ж што ў мяне за праява була з етаю рукою... Іду я неяк з работы, бачу, у адным двары людзей многа сабралася.

— Што тут такое робіцца?

— Карова здыхае. Санешнікам падавілася.

— Дак чаго ж вы стаіцё, разявы?

Закасала я рукаў, усадзіла карове руку ў горла, намацала кавалак санешніку, змяла яго ў жмені, а тут карова хапіла паветра ды як сцісне сківіцы...

Карову то я выратавала, а сама от папанасілася з етаю рукою, от папаенчыла. Правая ж, карміцелька. Пайду, бывало, палоць, параблю трохі і чую — анямела мая рука, пальцам паварушыць не магу. Тады пачынаю біць яе левай рукой ды прыгаворваць: «Рабі, гультайка, рабі! Нам з табою ніхто не наробіць!» Налущую етак, трохі ажыве мая рука, і я зноў — за поліва ці за капаніцу.

От якая яна ў мяне выйшла, мая жытка. Пражыла я яе і не малую, а не агледзелася, калі ето яна прамільгнула. Паверыце, другі раз і душа баліць, і рука баліць, а як гляну на белы свет, то цераз еты мой боль ён мне яшчэ мілейшы робіцца. І так хочацца, каб усё було спакойна і ціха, што, здаецца, кінула б, рынула ўсё чысценька і, як стаю, босая і праставолосая, усю землю аббегла б ды аглядзела: ці не гарыць дзе, ці не тлее дзе якая іскра...

1963 г.

З кнігі «Дзівасіл»

З глыбіні стагоддзяў

Пасля грамадзянскай вайны дзед Талаш з малодшым сынам Змітром жыў у Навасёлках. Бабка Пелагея памерла, Васіль Ісакавіч другі раз не ажаніўся. У сялянскай гаспадарцы цяжка абысціся без жаночых рук. Старэйшы сын Даніла жыў асобна. Неяк дзед сказаў Змітру:

«Нехта з нас павінен ажаніцца. Ці ты, ці я...» Зміцер адказаў: «Лепш я ажанюся». Так у хаце Талашоў з'явілася маладая гаспадыня, жонка Змітра. Жылі дружна, працавалі многа, старанна, у хаце быў дастатак. Змітра пасля выхаду кнігі Я. Коласа «Дрыгва» ўсё часцей пачалі звать Панасам — такое імя даў сыну дзеда Талаша пісьменнік у кнізе. Ён стварaў аповесць, не будучы асабіста знаёмым з Талашом, і Васілю Ісакавічу даў другое імя — Рыгор, не дзіўна, што па-другому назваў і дзедавых сыноў.

Дзед Талаш ахвотна ўспамінаў пра сваё гераічнае мінулае ў гады грамадзянскай вайны. Ездзіў у Мінск, сустракаўся з Я. Коласам. У Навасёлкі нярэдка прыязджалі экскурсанты, усе хацелі ўбачыць легендарнага дзеда... Гасцей нярэдка сустракаў Зміцер, ён ахвотна расказваў пра сябе, пра бацьку. У маладой сям' з'явіліся дзеці — сыны Уладзімір і Міхаіл, дочкі Клава, Ніна, Валя і Люба. Дзмітрый Васільевіч у канцы 1977 г. прымаў удзел у перадачы, прысвечанай Я. Коласу, дыктар павіншаваў яго з 75-годдзем. А праз некалькі тыдняў сын легендарнага Талаша памёр...

Старэйшы сын Васіля Ісакавіча Даніла выведзены Я. Коласам у «Дрыгве» пад іменем Максіма. Даніла быў больш падобны на бацьку — такі ж каржакава-

ты, нос з гарбінкай, хітраваты позірк дасціпных маленькіх вачэй, толькі больш стрыманы, негаваркі. Такім выведзены Максім і ў «Дрыгве». Усё жыццё ён пражыў у Навасёлках, дзе на ўскраіне вёскі і сёння стаіць яго хата. Пражыў Даніла Васільевіч 86 гадоў, у яго было дзесяць дзяцей. Сямёра памерлі ў малым узросце, а сыны Пятро, Якаў і Павел пражылі вялікае, цікавае жыццё. Пятро Данілавіч, падпалкоўнік Савецкай Арміі, бачыў дзеда апошні раз перад самай вайной. Ён расказваў, што дзед вельмі любіў дзяцей, а тыя — старога, заўсёды круціліся каля яго.

Старэйшы ўнук Васіля Ісакавіча Якаў працаваў да вайны старшынёй мясцовага калгаса «Чырвоны партызан». У час гітлераўскай акупацыі ён з бацькам пайшоў у партызаны, ваяваў у атрадзе А. І. Трухановіча, які ўваходзіў у 130-ю Петрыкаўскую брыгаду. Даніла Васільевіч займаўся гаспадаркай атрада, а Якаў Данілавіч быў камандзірам узвода, ваяваў мужна і смела, як і дзед. У адной з дыверсій на магістралі быў цяжка паранены і памёр як сапраўдны воін-патрыёт.

Такі ж лёс напаткаў і сярэдняга Данілавага сына Паўла — ён загінуў на фронце. Засталіся два яго сыны — Леанід і Аляксандр.

Дочкі Васіля Ісакавіча Ганна і Настасся рана пакінулі родную вёску, выйшлі замуж у Аціркі. У сярэдняй, Ганны (па мужу Кнігі), было дванаццаць дзяцей. Сямёра з іх памерлі, засталіся пяць сыноў: Даніла, Васіль, Пётр, Сцяпан, Міхась жывуць у Аціркach, астатнія ў Мазурах і Петразаводску. Ганна Васільеўна ўсё жыццё працавала ў калгасе — рвала лён, грабла сена, палола... Любіла прасці і ткаць. Пражыла яна семдзесят гадоў.

Вельмі падобнай на сваю сястру была малодшая, Настасся. Яна тройчы выходзіла замуж, жаночае шчасце ёй чамусьці ніяк не давалася. У гэтых шлюбах яна нарадзіла трох дачок — Антаніну, Любу, Ліду і сына Фёдара. Выхоўвала яшчэ дзвюх дзяўчынак Кацю і Маню — дачок аднаго з мужоў. Двое з дзяцей жывуць у Ацірках. Настасся Васільеўна шмат гадоў працавала даяркай, пражыла семдзесят восем гадоў.

Старэйшай дачцэ Талаша, Наталлі, быў наканаваны кароткі век. Замуж выйшла ў вёску Курыщічы, нарадзіла дачушку Вольгу і памерла, калі ёй было 25 гадоў. Дзед Талаш узяў паўтарагадовую ўнучку на выхаванне. Вольга Савельеўна часта ўспамінае дзеда, яго дабрыню і клопат. Маці сваю яна не памятае, але пра цётак можа расказваць доўга. Васіль Ісакавіч часта прыходзіў у Аціркі да дачок і нярэдка браў маленькую Волю з сабою.

— Калі я прыходзіла з дзедам да цётак, — расказвае Вольга Грэська, — мне ў кожнай з іх бачылася мама. Цёткі былі яшчэ маладыя, яны не шкадавалі для мяне ласкі і цяпла. Не скажу, каб гэта былі пачуцці «да сіраціпкі», шкаданне... Гэта былі ласка і цеплыня вельмі родных людзей.

Цёткі не былі вядомыя, як іх браты. Пра іх у Коласавым творы нават не ўпамінаецца. Гэта былі звычайныя працаўніцы, на плечы якіх лёг увесь цяжар сялянскай працы — уручную жалі, малацілі, гадавалі дзяцей... Бацькавай славай не карысталіся, не прасілі дапамогі як дочкі славутага Талаша.

Многа ўнукаў, яшчэ больш праўнукаў і прапраўнукаў у дзеда Талаша. Многія з іх маюць сярэднюю і вышэйшую адукацыю. Жывуць у розных кутках нашай Бацькаўшчыны, блізкага і далёкага замежжа, працуюць у розных галінах народнай гаспадаркі.

— Любіла я дзеда, і ён мяне, — зазначае ўнучка дзеда Клаўдзія Талаш, што жыве ў Светлагорску. — Каб не ён, хіба я вывучылася б на ўрача? Не было за што з Петрыкава выехаць. Цяжкія гады былі...

Памяць дзеда Талаша — у глыбокіх каранях, якія ён пакінуў у роднай зямлі, у яго нашчадках, унуках і праўнуках, і яшчэ ў многіх пра-пра...

М. Р. Жыгоцкі

Воін, вучоны, настаўнік

З дзіцячых гадоў Неафіт Рагозін працаваў у памешчыка, змог закончыць толькі два класы царкоўна-прыходскай школы. Не сядзеў склаўшы рукі у час нямецкай акупацыі, бела-польскай інтэрвенцыі краю. У 1919 г., калі Неафіту было 17 гадоў, ён стаў байцом 58-га пяхотнага палка, які трымаў абарону на Прыпяці і Убарці, і хутка быў прызначаны намеснікам камісара батальёна.

У баях з інтэрвентамі Неафіт Рагозін паказаў сябе рашучым і мужным воінам. Праз некаторы час ён узначаліў дыверсійную групу, якая здзейсніла шэраг дзёрзскіх аперацый у тыле бела-палякаў. Быў ажыццёўлены рэйд па тылах праціўніка ажно да Сарнаў. Узарваны два чыгуначныя масты, знішчана шмат жывой сілы і тэхнікі ворага. Потым быў Крым, фарсіраванне Сіваша, удзел у ліквідацыі банд басмачоў у Сярэдняй Азіі. І яшчэ адзін фронт — барацьбы з тыфам, голадам...

Дэмабілізаваўся Неафіт Рагозін толькі ў 1927 г. Закончыў універсітэт імя Я. Свярдлова ў Маскве, інстытут чырвонай прафесуры. Ён прагна цягнуўся да ведаў, шмат працаваў у галіне эканомікі, і ў 1934 г. быў прызначаны дырэктарам планава-эканамічнага інстытута пры Дзяржплане СССР. У перадваенныя гады Неафіт Ермалаевіч — загадчык кафедры Новасібірскага педінстытута, затым — дырэктар яго. У час ваеннага ліхалецця ён быў камісарам шпіталю.

З 1947 г. Неафіт Ермалаевіч Рагозін працаваў у Мінку прарэктарам, загадчыкам кафедры эканамічнай геаграфіі Белдзяржуніверсітэта, затым — у Мінскім педінстытуце імя М. Горкага. Прафесар, доктар эканамічных навук.

Узнагароджаны двума ордэнамі, многімі баявымі і працоўнымі медалямі, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Памёр Н. Е. Рагозін 11.12.1971 г.

З крыніц гісторыі

Раманоўскі Васіль Піліпавіч — гісторык Вялікай Айчыннай вайны, доктар гістарычных навук, аўтар шматлікіх манаграфій і навуковых артыкулаў па гісторыі Беларусі ў гады вайны. Нарадзіўся ён у лютым 1918 г. у Кашэвічах. Вучыўся ў Кашэвіцкай школе, затым — на рабфаку ў Капаткевічах. У пачатку 30-х гадоў працаваў старшым піянерважатым у роднай школе. У 1941 г. закончыў гістарычны факультэт Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя М. Горкага. З пачаткам вайны жыў у Ратамцы, паблізу Мінска, працаваў у сельскай гаспадарцы, на чыгунцы, трымаў сувязь з партызанамі і хутка далучыўся да іх. Перадаў партызанам карту фашысцкіх умацаванняў. У атрадзе ўзначаліў дыверсійную групу, удзельнічаў у многіх аперацыях. Незадоўга да злучэння з Чырвонай Арміяй быў прызначаны намеснікам камісара атрада.

Шмат энергіі аддаў аднаўленню разбуранай гаспадаркі рэспублікі. Васіль Піліпавіч працаваў намеснікам старшыні райвыканкома, загадчыкам аддзела райкома партыі ў Клецкім і ў Гарадоцкім раёнах.

Увесь час у Васіля Раманоўскага была няўтольная прага да ведаў, навуковых даследаванняў, асабліва ў галіне гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. У 1951 г. ён паступіў у аспірантуру Інстытута гісторыі АН Беларусі. Закончыў вучобу, абараніў кандыдацкую

В. П. Раманоўскі

дысертацыю. Быў сакратаром парткома, яго прызначаюць вучоным сакратаром Інстытута гісторыі, пазней — намеснікам галоўнага вучонага сакратара Прэзідыума Акадэміі навук. Да 1971 г. працаваў загадчыкам сектара гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Інстытута гісторыі, затым узначаліў сектар аддзела навуковай інфармацыі АН Беларусі. Шмат увагі ўдзяляў падрыхтоўцы навуковых кадраў, пад яго кіраўніцтвам абаранілі дысертацыі многія гісторыкі.

Васіль Піліпавіч карыстаўся вялікім аўтарытэтам і павагай грамадскасці. Ён падрыхтаваў і выдаў шэраг кніг, сотні артыкулаў па гісторыі Айчыннай вайны. Сярод іх найбольш вядомыя «Саўдзельнікі ў злачынствах» (1964), «Нацысцкі тэрор і беззаконне ў Беларускай ССР», «Супраць фальсіфікацыі гісторыі партызанскага руху» (1962), «Нельга дараваць» (1967), «Супраць фальсіфікацыі гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны» (1975, у сааўтарстве) і інш. Прымаў непасрэдны ўдзел у стварэнні трохтомніка «Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны», «Нямецка-фашысцкі генацыд на Беларусі (1941—1944 гг.)», кнігі «Аб партыйным падполлі ў Мінску ў гады Вялікай Айчыннай вайны», якая была падрыхтавана Інстытутам гісторыі АН Беларусі і Інстытутам гісторыі партыі ў 1961 г. У ёй упершыню раскрыты гераічныя і трагічныя старонкі мінскага падполля.

Памёр В. П. Раманоўскі 26.1.1992 г.

Прага да жыцця

...Чакаў Валерыя Сераду зусім іншы, страшны лёс у Азарыцкім лагеры смерці. Колькі людзей сталага ўзросту, падлеткаў і дзяцей — аднагодкаў Валерыя назаўсёды засталося там!.. Шлях у Азарычы быў доўгім і пакутлівым. Многія месяцы цяжкага жыцця ў сямейным лагеры ў лесе, дзе кожны дзень чакалі аблавы карнікаў, абстрэлу, дзе звычайнымі спадарожнікамі былі трывога, страх, холад і голад. У пачатку 1944 г. з'явілася надзея выйсці насустрач Чырвонай Арміі праз «вароты», што былі створаны партызанамі Паўднёва-Прыпяцкага злучэння для выхаду мірнага насельніцтва і эвакуацыі параненых у Акцябрскім раёне. Ішлі, потым беглі, трапіўшы пад артылерыйскі агонь фашыстаў, і не паспелі прайсці некалькі кіламетраў, не хапіла лічаных гадзін, каб праскочыць. Іх чакалі Азарычы...

Доўга і цяжка расказваць пра пакуты і здзекі, якія давялося вытрымаць у Азарыцкім лагеры смерці. Як начавалі на голай мёрзлай зямлі напрадвесні, як кідаліся пад кулямётныя чэргі да эрзац-хлеба, які на пацеху сабе кідалі каты праз калючы дрот, як уздымаліся ўгару чорныя клубы дыму ад узрыву мін, якія пакінулі фашысты пасля свайго бегства пад ударамі Чырвонай Арміі... Але і радасць вызвалення аказалася заўчаснай, вылюдкі прывілі людзям страшныя хваробы з тым подлым разлікам, каб заразіць імі вызваліцеляў. Сапраўды, прыдумаць такое маглі толькі нелюдзі, варвары 20-га стагоддзя...

Валерыю Серадзе ўдалося выжыць, перамагчы смерць, хоць доўга лячылі яго ваенныя ўрачы ў шпіталі ў Гомелі. Хто б мог падумаць, што ў 8-гадовым хлапчуку, напалову жывым, не па гадах маленькім, худым, як шкілет, тоіцца столькі талентаў... Дзе б ні жыў, ні

В. С. Серада

працаваў Валерый Серада, усюды яму спадарожнічалі поспех, чакалі ўзнагароды. Так было і ў Пціцкай сярэдняй школе, і ў Гомельскім інстытуце чыгуначнага транспарту, якія Валерый закончыў з адзнакай. Заняўся спортам — дасягнуў паказчыкаў у лёгкай атлетыцы майстра спорту СССР. Працаваў на Брэсцкім чыгуначным вузле, потым — другім сакратаром гаркома камсамола прыгранічнага горада, за ўзорную арганізацыю палітычнай работы на граніцы адзначаны баявым медалём. Узнагароджаны Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР. Заняўся навукай — і кожны год, пачынаючы з 1983 г., вызначаўся чарговай прыступкай на крутым і нялёгкім шляху: кандыдат эканамічных навук, дацэнт, доктар навук, прафесар... Валерый Сцяпанавіч вядзе навуковую і педагагічную работу, узначальвае кафедру эканомікі і сацыялогіі ў Беларускім педагагічным універсітэце. Выдаў сем кніг і манаграфій. Не быў у баку і ад грамадскай работы, ён член каардынацыйнай групы Руху беларускіх інтэлектуальных рэсурсаў. Адкуль столькі энергіі, прагі да жыцця?.. Магчыма, жыве, творыць, працуе за сябе і за тых, каму не суджана было вырвацца з учэпістых лап смерці ў Азарыцкім лагеры. Яны назаўсёды засталіся там, у мёрзлай сакавіцкай зямлі 1944 г., а маглі б вырасці такімі ж адукаванымі, таленавітымі, прыносіць карысць сваёй радзіме, якая без іх працавітых рук апынулася ў незайздросным становішчы — колькі страціла шматпакутная Беларусь!...

В. Р. Феранц

Вузлаватыя карані

Сям'ю Азёмшаў тут ведаюць усе — бацьку, амаль 90-гадовага Кірыла Дзмітрыевіча, яго сыноў, учэпістых і моцных не столькі целам, колькі духам, светлым розумам... Патрыярх вёскі Старына да глыбокай старасці вызначаўся цвёрдасцю і непахіснасцю характару. Такімі выхаваў ён і сыноў. А лёс яму выдаўся нялёгкі. Калектывізацыя, масавыя рэпрэсіі, у якіх краўцу-саматужніку цудам удалося ўцалець, а тут войны, адна за другой — паход Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь, савецка-фінляндская вайна, Вялікай Айчынная... Як яму, партызанскаму сувязному, удалося выратавацца ў час аблавы карнікаў, схаваўшыся за нямецкімі шынялямі, і сёння не верыцца... Фронт, баявыя будні радавога-сувязнога, пераможныя салюты ў вясенняй Празе... Медаль «За адвагу» — сціплая адзнака яго вогненнага шляху на вайне, але галоўная ўзнагарода — застаўся жывым, і вось яны — сыны...

Сыны падрасталі, рана даводзілася станавіцца на ногі, адпраўляцца ў самастойнае жыццё. Пакінуў бацькоўскую хату Якаў. Вучыўся ў Пінску, прайшоў прыступкі службовай лесвіцы ад камсамольскага важака Капаткевіцкага раёна, старшыні Рэчыцкага райвыканкома да начальніка ўпраўлення юстыцыі Гомельскага аблвыканкома. Якаў Кірылавіч Азёмша — член калегіі Міністэрства юстыцыі, заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь, узнагароджаны двума ордэнамі «Знак Пашаны».

Своеасаблівую памяць у рэспубліцы пакінуў Леанід Кірылавіч Азёмша. Многія раённыя цэнтры ўпрыгожваюць лепшыя будынкі — былыя памяшканні райкомаў партыі. Яны служаць сёння іншым мэтам, а дапамог іх узвесці Леанід Азёмша, калі працаваў у фінаддзеле ЦК КПСС і фактычна распараджаўся сродкамі для будаўніцтва партыйных офісаў. Да гэтага ён быў галоўным бухгалтарам ЦК ЛКСМБ і ў час шматлікіх праверак фінансавых спраў камсамольскіх дзеячаў сам М. А. Суслаў аднойчы здзівіўся: «Як можна застацца чыстым у моры бруду?..» І забраў Л. К. Азёмшу ў Маскву.

Цяпер Леанід Азёмша — намеснік вядомага расійскага дзеяча, старшыні савета дырэктароў навукова-прамысловага саюза Расіі А. Вольскага.

Мікалай Азёмша... Памёр у 14-гадо-

вым узросце ў гады акупацыі. А ў 1948 г. у Кірыла Азёмшы нарадзіўся яшчэ адзін сын, якога назвалі ў памяць памёршага. Нялёгкі шлях выпаў Мікалаю Азёмшы, а пачынаўся ён, як і ў старэйшых братоў, з камсамола, з пасады сакратара камітэта ЛКСМБ на асваенні нафтапромыслаў Беларусі. Завочная вучоба, сямейныя клопаты, пераезды, кіраўніцтва прамысловым аддзелам Гомельскага аблвыканкома... Усюды праяўляў Мікалай Азёмша «на знос», добрасумленна, не шкадуючы сіл і здароўя. Цяпер ён — упраўляючы аддзялення «Белзнешэканомбанка».

...Такая адна толькі сям'я з вёскі, якая знікае з твару зямлі. Памяць аб ёй — у такіх людзях, як моцная, учэпістая сям'я Азёмшаў, генерал-палкоўнік П. Р. Чаус, заслужаны настаўнік рэспублікі С. Ф. Серапін і многіх іншых вяскоўцах.

В. Р. Феранц

З глыбокіх вытокаў

Фядосік Анатоль Сямёнавіч (н. 7.2.1926 г. у в. Кашэвічы) — доктар філалагічных навук, прафесар, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР, заслужаны дзеяч навукі. У верасні 1942 г. стаў байцом партызанскага атрада. У складзе дыверсійнай групы, якую ўзначальваў У. Круковіч, удзельнічаў у многіх баявых аперацыях. У маі — чэрвені 1944 г. уваходзіў у разведгрупу І. Арцюха партызанскага атрада імя І. Маставога. З ліпеня 1944 г. па красавік 1945 г. ваяваў на фронце.

З мая 1946-га па жнівень 1949 г. працаваў у Кашэвіцкай сярэдняй школе, у 1953 г. закончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт. З кастрычніка 1958 г. — у Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі, намеснік дырэктара па навуковай рабоце. Аўтар 27 кніг і брашур, звыш 300 навуковых артыкулаў. Пад яго кіраўніцтвам і пры непасрэдным удзеле выдадзены 42-томны звод беларускай народнай творчасці.

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай Вайны II ст., медалямі «За адвагу», «Партызану Айчыннай Вайны» I ст. і адзінаццацю іншымі.

Фальклор Петрыкаўшчыны

Вусная паэтычная творчасць Петрыкаўскага раёна, як і ўсяго ўсходняга Палесся, на працягу стагоддзяў з'яўлялася важнай часткай духоўнай культуры народа. У некаторых вёсках яна захавалася і сёння. На Петрыкаўшчыне бытавалі ўсе жанры і віды каляндарна-абрадавай паэзіі. Яшчэ з зімы селянін клапаціўся пра будучы ўраджай, і абрады павінны былі магічна садзейнічаць земляробчаму плёну. Яскрава праяўлялася такая ўтылітарна-магічная накіраванасць каляндарных абрадаў у калядных песнях. Да каляд сяляне рыхтаваліся яшчэ з піліпаўскага посту. Да вечара ў гэты дзень нельга было есці вараных страў. Памятаю, як бабуля і маці рыхтавалі крута звараную ячную кашу з алеем — куццю, квас з грыбамі, рыбай, аўсяны кісель, бліны з макам, рыбныя і іншыя посныя стравы. На стале павінна быць не менш 12 страў, і кожны ўдзельнік вячэры абавязаны быў паспрабаваць іх. Мы нецярпліва чакалі вечара. Дзед прыносіў у хату салому, рассцілаў яе па падлозе, а на стол пад куццю клаў сена, садзіўся як гаспадар на кут пад абразы, запрашаў усіх за стол. У некаторых вёсках слалі на стол сена, накрывалі белым абрусам, гаспадар ставіў пляшку гарэлкі, потым браў гаршчок з куццёй, тройчы абыходзіў хату, стукаў у акно. Жонка пыталася: «Хто там стукае?» «Сам Бог стукае з цёплай, мокрай вясною, з гарачым небурлівым летам, з сухой і багатай восенню». Жонка запрашала ў хату. Гаспадар наліваў чарку гарэлкі і гава-

А. С. Фядосік

рыў: «Дай жа, Божа, за год даждаць Каляд у добрай радасці і карысці...» Спачатку елі хлеб з сытой, квас і іншыя стравы, а апошнюю — куццю. Прымаўкі, якія суправаджалі пачатак ежы, мелі ўтылітарна-магічную мэту: садзейнічаць будучаму ўраджаю. Гаспадар чэрпаў лыжку куцці і клікаў мароз: «Мароз, мароз, хадзі куццю есці! Каб ты не марозіў ячменю, пшаніцы, гароху, сачавіцы, проса і грэчкі і ўсяго, што мне трэба пасеяць». Жонка падыходзіла з лыжкай куцці да акна, якое знаходзілася насупраць печы, стукала і гаварыла: «Мароз, мароз, хадзі куццю есці, каб не марозіў расады агуркоў, гарбузоў, буракоў і ўсяго, што трэба пасадзіць і пасеяць»[1].

Другая куцця адзначалася напярэдадні Новага года і называлася багатай, да яе рыхтаваліся мясныя стравы, каўбасы. Але куцця таксама была галоўнай стравай, толькі не посная, а скаромная. Замест сена на стол клалі салому і накрывалі абрусам. Калі куцця стаяла на стале, гаспадар адчыняў акно і тройчы клікаў мароз:

— Мароз, мароз, ідзі куццю есці! Улетку не бывай, а ў зіму прыбывай, бо будзем цябе біці жалезнымі пугамі!

І сену, і саломе, якія выкарыстоўваліся на куццю, надавалася магічнае значэнне. Сена аддавалі жывёле, каб была здаровая і прадукцыйная. Салому малацілі кулакамі на стале, выцягвалі саломінкі і па іх даўжыні вызначалі будучы лён, адшуканыя зярняты змешвалі з насеннем, каб быў лепшы ўраджай. Саломай абвязвалі дрэвы, каб плады былі саладзейшыя і непашкоджаныя.

На багатую куццю хлопцы і дзяўчаты хадзілі шчадраваць, вадзілі «казу», «жураўля», «каня». Даводзілася назіраць у пачатку 30-х гадоў ваджэнне «каня» ў в. Кашэвічы. Ролю «каня» іграў Пугач Арсень. Каркас «каня» абцягвалі белым палатном, вельмі падобнай да сапраўднай была галава, вочы рабіліся з маністаў, грыва з конскіх валасоў. Калі «конь» скакаў, разам з ім танцавалі хлопцы і дзяўчаты пад ігру гармоніка і спявалі:

Ой, добры вечар, пане гаспадару,
Святы вечар!
Ці спіш, ці ляжыш, ці паціху сядзіш?
Святы вечар!
Устань з пасцелі, адчыні дзверы,
Святы вечар!
Адчыні дзверы, зажыгай свечы,
Святы вечар!..

Хадзілі ў вёсках Петрыкаўскага раёна і з «казой», якой апраналі аднаго з удзельнікаў гурту. Вядомы фалькларыст П. Бяссонаў у 1871 г. адзначаў, што ў некаторых месцах «каза» ўбіраецца вельмі прыгожа (ёю апранаецца хлопец): з мордай, рожкамі, у шэрсці, у лентах, з бразготкамі. Абрадавыя дзействы з «казой» мелі ярка выражаны ўтылітарна-магічны характар. У яе вобразе ўвасабляліся пладавітасць, здольнасць паўплываць на ўраджайнасць і стан дамашніх жывёл. Функцыянальнасць абрадаў з цягам часу змянялася: дамінантная ўтылітарна-магічная функцыя ўступала месца цырыманіяльнай і пацешлівай, мастацкай. Аб практычнай накіраванасці абрадавых дзействаў пры хаджэнні з «казой» сведчаць песні:

Дзе каза ходзе,
Там жыта родзе,
Дзе не бывае,
Там вылягае,
Дзе каза рогам,
Там жыта стогам,
Дзе каза нагой,
Там жыта капой.
Дзе каза хвастом,
Там жыта кустом.

На калядныя святы вялікім поспехам у гледачоў карыстаўся народны лялькавы тэатр — батлейка. Гэта была скрынка ў выглядзе хаткі з дахам, пярэдняя сцяна ў якой была палатнянай і падымалася як заслона ў тэатры ў час прадстаўлення. У задняй сценцы існавала два прарэзы ў выглядзе дзверак, у прамежку знаходзіліся дзве лялькі — Божай Маці і Іосіфа, а перад імі ў люльцы маленькага Ісуса Хрыста. На дне скрынкі замацоўваўся дрот, па якім рухаліся лялькі. Сцены скрынкі абклейваліся малюнкамі духоўнага зместу.

Прадстаўленні батлейкі пачыналіся з новазапаветнага сюжэта — аб нараджэнні Хрыста. На верхнім ярусе скрынкі з'яўляліся дзве лялькі віфлеемскіх пастухоў, яны кланяліся нованароджанаму

[1] Земляробчы каляндар: Абрады і звычаі / Уклад. А. І. Гурскі. Мн., 1990.

дзіцяці і паведамлялі публіцы пра з'яўленне анёла, які казаў аб нараджэнні «цара славы». Прыходзілі з дарамі волхвы, цары персідскія і кланяліся Ісусу. У ніжнім ярусе ішло прадстаўленне пра цара Ірада, забойства ўсіх нованароджаных хлопчыкаў.

Камічна падаваліся вобразы мужыка Мацея і доктара. Доктар лячыў Мацея, які аб'еўся куцці і не мог «ні сапці, ні дыхці, ні дамоў... дайсці», вельмі дзіўна: браў яго за каўнер, біў аб сцяну і прыгаворваў: «Мацей — пацей, Мацей — пацей!» Ён загадваў «з патыліцы кроў пусціць, на пупе банкі паставіць..., узяць моху, чартапалоху, мушыных вантробак, камарынага шмэльцу і яшчэ нечага троху». На пацеху публікі разлічана паведамленне Мацея, што ён змяшаў усё гэта, глынуў, але не палягчэла.

Шырокае распаўсюджанне мелі на Петрыкаўшчыне абрады і паэзія веснавога цыкла земляробчага календара. Моладзь гукала вясну, спявала вяснянікі, сярод якіх асабліва папулярнымі былі песні «Вол бушуе, вясну чуе», «Прыйдзі, прыйдзі, вясна», «Вясна, вясна красна, што нам прынясла»... Асаблівую цікавасць у гэтым цыкле ўяўляюць валачобныя абрады і песні, якія складаюць нацыянальную спецыфіку абрадавай паэзіі беларусаў, таму што лепш захаваліся, чым у іншых народаў. Валачобныя песні нагадвалі калядкі як па функцыянальнасці, так і па зместу і мастацкай форме. У гурт валачобнікаў уваходзілі запявала, падхопнікі, «асвістыя» (тыя, што падсвісталі), музыка і інш. Валачобнікі хадзілі ад хаты да хаты, велічалі гаспадароў у песнях, славілі гаспадарку, у якой, як спяваў гурт, мяркуецца багаты ўраджай, прыплод жывёлы і дабрабыт у хаце. У многіх песнях на полі працуюць святыя і сам Бог. Валачобнікі зычылі здароўя, шчасця і дабрабыту гаспадарам і ўсёй сям'і, прасілі падарункі.

У в. Кашэвічы ў пасляваенны час запісана песня «Валачобнікі — людзі добрыя», у якой яскрава выяўляецца ўтылітарна-магічная функцыя абраду — садзейнічаць ураджайнасці на полі і прыплоду ў хляве. Валачобнікі не прасілі, а патрабавалі падарункаў:

А дай яечак на плод авечак,
І дайце саланіны на плод свініны.
А не дасце яйца — здохнець аўца,
Паедзеш на поле — саху паламаеш...

У валачобных песнях спачатку валачобнікі паведамляюць пра сустрэчу з Богам «на першы дзень Вялікадня», дапытваюцца патрэбнай ім вёскі і пэўнага гаспадара. Гэта своеасаблівы зачын, пасля якога гаспадар велічаецца, усхваляецца ён і яго адзенне. У такім убранні ідзе ён у царкву і просіць «частай долі да тры радасці»... Славяцца яго дзеці, коні вараныя, валы палавыя, жыта ядранае, багаты двор, на якім жалезны тын, медзяныя вароты, дашчаныя замёты.

У найбольш поўных варыянтах эпічна апавядаецца пра божых угоднікаў, якія дапамагаюць селяніну ў полі і ў гаспадарцы. Напрыклад, Мікола так тлумачыць, чаму ён «прызабавіўся» і са спазненнем прыйшоў да гаспадара:

— А па полю хадзіў да расу расіў,
Я па межах хадзіў, жыта радзіў,
А па бару хадзіў да раі садзіў!

Такую ж работу ў іншых песнях выконвае Ілля, Юрый і іншыя святыя. Хораша паэтызуецца жыта:

Гаманіла ў полі ядрано жыта.
Ядрано жыта гаспадара кліча:
«Да ты, гаспадару, адведай мяне,
Адведай мяне ў скарадзе,
Адведай мяне ў усыпанне,
Адведай мяне ў красаванне,
Адведай мяне ў палаванне,
Як пойдзеш жанцоў нанімаць»...

Прызначэнне абраду і песень тут відавочна: садзейнічаць ураджайнасці на полі. Падобныя ж клопаты адлюстроўваюцца ў розных варыянтах і аб жывёле. Ахоўнікам кароў часцей выступае Юрый: ён кароў пасе, дамоў прыгане, у хлеў загоніць і слаўцо «згаворыць»:

Гэтаму статку не будзіць упадку
Ні ад мядзведзя, ні ад нарову,
Ні ад гада бягучага,
Ні ад змея лятучага.

Як Юрый кароў, Мікола ахоўвае коней. У многіх валачобных песнях апавядаецца пра дзіўныя праявы, якія адбыліся ў двары, хаце, гаспадарцы: чатыры кароўкі ацяліліся, чатыры кабылкі ажарабіліся, жонка абрадзілася...

Абрады суправаджалі і выган жывёлы ў поле. У Камаровічах, як і ў іншых месцах, адбывалася гэта на Юр'еў дзень перад усходам сонца. Кароў выганялі на засеянае жытам поле (выгнаць на расу), каб засцерагчы ад шкоднай травы і каб у іх прыбывала малако.

Цікава святкавалася Тройца, або Сёмуха, абраднасць якіх адлюстроўвала культ расліннасці, характэрны для нашых продкаў. Галінкамі бярозы, клёна і іншых дрэў з маладымі зялёнымі лісточкамі, аерам упрыгожвалі хату, двор. Падмяталі сцежкі, пасыпалі іх пяском. Дзяўчаты вілі з кветак вянкі, спявалі песні, якія адлюстроўвалі абрадавыя дзеянні...

Вынікі цяжкай земляробчай працы ярка адлюстраваны ў жніўнай паэзіі. Асабліва цікавымі былі абрады зажынак і дажынак. У розных народаў пачатак жніва суправаджаўся спецыяльнымі абрадавымі дзеяннямі як важнейшая падзея ў жыцці земляроба. «У Капаткевіцкай воласці жнейка, зажаўшы жыта ў тры прыёмы, зрэзвае левай рукой адно сцябло і затыкае яго сабе пад пояс для таго, каб не балела спіна, а гнулася б так, як сцябло. Астатнія сцёблы яна кладзе крыжападобна, чым выказвае ўдзячнасць Богу і веру ў засцерагальную сілу крыжа супраць выкрадання злымі людзьмі», — пісаў П. В. Шэйн. Цікавы абрад «завіванне барады» і шматлікія песні, якія спявaліся пры гэтым. «Завіванне барады» — гэта значыць пука каласоў, звязвалася з персаніфікацыяй казла як увасаблення пладавітасці і росту. У в. Кашэвічы на «завіванне барады» звычайна пакідалі тры сцяблінкі жыта, пад якія клалі хлеб і соль, палівалі сцябліны вадой і прыгаворвалі або спявалі:

Радзі, Божа, жыто
На новае лето.
Нашы млодкі малы,
Штоб стоячы жалі
Да ў снапочкі вязалі
І ў копачкі клалі...

Петрыкаўшчына багатая цікавымі радзіннымі абрадамі. У палешукоў наогул існавала шмат павер'яў і забабонаў, якія павінны былі ўлічвацца цяжарнай жанчынай. Ёй не дазвалялася доўга глядзецца ў люстра або ў ваду, каб дзіця не стала касавокім; наступаць на дугу, абручы, палазы і іншыя крывыя прадметы, таму што дзіця будзе гарбатым; красці і карыстацца чужымі рэчамі, інакш нованароджаны вырасце злодзеем. Цяжарная жанчына імкнулася пазбегнуць сурокаў. Каб аблегчыць роды, адчынялі дзверы, развязвалі ўсе вузлы, а часам і царскую браму ў царкве і г. д.

Для хрышчэння дзіцяці запрашалі кума і куму — хрышчоных бацькоў нованароджанага. Калі ў сям'і паміралі дзеці, бралі за кума першага сустрэчнага. Бабка-павітуха давала хрышчонай маці вузельчык, у якім былі сабраны хлебныя зярняты, соль і гліна з печы. Вузельчык выкідваўся на скрыжаваннях дарог, каб пазбегнуць ліхой сустрэчы, сурокаў[1]. Дз. Пашын у 1880 г. у «Минских епархиальных ведомостях» пісаў пра звычаі ў м. Петрыкаве: «Калі прыносяць хрысціць дзіця, то пры ім павінен быць загорнуты ў пялёнках маленькі вузельчык з кавалачкамі хлеба, солі і вугалю, каб дзіця, калі вырасце, мела хлеб, соль і агонь»...

Пасля хрышчэння наладжвалася застольная бяседа — хрэсьбіны. Да гэтай урачыстасці бабкай-павітухай абавязкова рыхтавалася каша. У песнях, якія спяваліся ў час застольнай бяседы, услаўлялася перш за ўсё бабка, яе чуласць і шчырая спагадлівасць. Нібы працягам гэтай песні быў паказ сустрэчы ўнучкі з бабуляй, якой яна абяцала: мерачку проса за тое, што прыйшла боса, каробку мукі, каб «прылажыла» да яе рукі, сіню наметачку, каб прылажыла рукі к жываточку. Асабліва шмат песень прысвячалася куме і куму, пераважна жартоўных. Нямала песень пра куму і кума насіла эратычны характар, адлюстроўвала іх сапраўдныя ўзаемаадносіны, што часам бывала ў рэчаіснасці.

Хрэсьбіны звычайна заканчваліся разбіваннем гаршка з кашай. На Петрыкаўшчыне ў многіх вёсках яшчэ і зараз існуе звычай, паводле якога разбівае гаршчок той, хто пакладзе больш грошай. Адбываецца своеасаблівае спаборніцтва за гонар разбіць яго. Крута звараную прасяную кашу рэжуць на кавалкі. Кум, які часцей за ўсё дзеліць кашу, дасціпна прапануе аднаму за другім удзельнікам застолля кавалкі, за што тыя даюць падарункі і трапна прамаўляюць зычэнні нованароджанаму і сям'і. Разбіваючы гаршчок з кашай, гавораць:

— Гадуй, Божа, малое, каб на той год другое.

Кладучы падарунак (або грошы) і падымаючы чарку з гарэлкай, зычаць:

— Няхай Бог гадуе і долю гатуе.

Або:

— Дай, Божа, прыждаць ды вяселле згуляць.

---

[1] *Шейн П. В.* Материалы... Т. 3.

Вялікай разнастайнасцю абрадаў і паэтычных твораў вылучаецца вяселле. У 1914 г. апісанне вясельнага абраду ў в. Дарашэвічы зрабіў выдатны польскі этнограф-фалькларыст К. Машынскі. Спачатку былі запоіны, а пасля за тыдзень — два да вяселля наладжваліся заручыны, у час якіх жаніх і нявеста абменьваліся пярсцёнкамі, падарункамі. Рыхтуючыся да шлюбу, старшая дружка ўпрыгожвала рознакаляровымі каснікамі збрую каня жаніха. Маладая брала з сабою сушаныя грушы і кідала іх на дарогу, каб не было сурокаў. У картэжах маладой і маладога ехала па 15—30 чалавек, жаніха і нявесту звалі князем і княгіняй.

У маладога апрача караваю пяклі так званы месяц (у форме сярпа), у маладой — рагаля (называўся шышкай). Шышку маладая трымала за пазухай, калі ехала да свёкра і абходзіла гаспадарчыя будынкі. Якое значэнне надавалі караваю відаць з таго, што пакуль каравай у маладой (княгіні) не спячэцца і яго не вынесуць у клець (а гэта бывала вельмі позна), світу жаніха не пускалі ў двор, «хоць бы трэба было чакаць усю ноч».

Вяселле пачыналася пасля таго, як у маладога спякуць каравай. Бацька жаніха склікаў бяседу, запрашаў словамі: «Прашу Бога і вас на вяселле!» Калі збіраліся ў хаце «князя», старшы дружка прасіў бацькоў дазволіць падпераразацца. Дружкі бяруць у гэты час свае плеценыя чэрвяцовыя паясы, гэта значыць пафарбаваныя кашанільнай чырванню, перавязваюцца і тройчы абягаюць вакол стала. Потым зноў звяртаюцца да бацькоў: «Благаславіце, ацец, маці, маршаўкам гукаці!» Атрымаўшы патрэбны адказ, працягваюць гукаць, а свахі ў гэты час пачынаюць спяваць:

Зыграўся рой па шчырому бару;
Хоча он паляцеці ў шчырыя бары,
На жоўтыя цвяты да на салодкія мяды і г. д.

Калі позна ўвечары дружына маладога прыязджала ў вёску маладой, жаніх ішоў да яе і абменьваўся падарункамі: даваў грошы, булкі, абаранкі, яна яму — арэхі і гарбузікі разам з хусткай, у якую іх насыпала. Падарункі даваў «князь» і матцы нявесты: чобаты або чаравікі, віно ці гарэлку, а яна яму насыпала ў тую ж бутэльку жыта, давала таксама намітку. Жыта ў вясельных абрадах адыгрывала вялікую ролю, сімвалізавала шчасце і дастатак.

Рэшткі старажытнай формы шлюбу — умыкання — захаваліся ў абрадзе, які імітаваў захоп двара і хаты нявесты. Дружына жаніха («князя») прыпынялася перад зачыненымі варотамі маладой, яны адчыняліся толькі тады, калі выносілі ў клець каравай. Калі дружына ўваходзіла на падворак, дзверы ў хату таксама аказваліся зачыненымі: родныя нявесты білі сякераю аб сякеру, таўклі ў ступе ваду, а дружкі маладой спявалі:

Не наступай, Літва!
Бо будзе з намі бітва.
Сікцьмо! да рубацемо!
Да Манечкі не давацемо!

Адным з важнейшых вясельных абрадаў быў пасад нявесты. Яе брат рабіў выгляд, што хоча адрэзаць валасы, але, атрымаўшы плату, пакідаў іх. Калі маладая сядзела на пасадзе, хросная маці або братавая, адзетая ў кажух, вывернуты воўнай наверх, і ў шапцы, падыходзіла да яе, намазвала валасы маслам і абсыпала самасейным макам, каб ніхто не прыставаў, не сурочыў. Тройчы абводзіла галовы маладых свечкамі, падпальвала разам узятыя іх валасы, аддавала патушаныя свечкі так званай свяцельніцы, а валасы нявесты збірала і накрывала чапцом, звязвала маладых поясам і накрывала наміткай.

Расставанне маладой з бацькамі адбывалася таксама з цырыманіяльнымі дзеяннямі. Яна адвязвалася ад жаніха, падыходзіла да покуці, адбівала паклоны і цалавала абразы. Следам за ёю ішоў малады і паўтараў дзеянні нявесты. Маладая падала ў ногі бацьку і прасіла благаславення, жаніх схіляў галаву. «У агульнай цішыні, якая перарываецца плачам дзяўчыны, гучаць сло-

вы благаслаўленне: «Няхай табе Бог дасць шчасце і долю і век доўгі». Праз хвіліну гэта самае паўтарае матка, пасля чаго маладая ўстае, кланяецца ўсім родным, урэшце, усёй бяседзе і прымае ад іх благаслаўленне»...

Развітваючыся з бацькамі, дзяўчына моцна галасіла. Бацька перахрышчваў перад возам дарогу. Маладыя сядзелі, звязаныя поясам, на першым упрыгожаным возе, кіраваў коньмі старшы дружка. Нявеста трымала за пазухай шышку, грэбень, талерку і лыжку, а ў кішэні — авёс і жыта, у маладога была толькі хустка за поясам. Усю дарогу спявалі, іграла музыка, дружкі пакрыквалі. Матка маладога сустракала вяселле ў такім жа кажуху, вывернутым воўнай наверх, і ў шапцы, як і маці дзяўчыны, несла за пазухай палатно, хустку або падушку і вітала маладую, якая дарыла што-небудзь свекрыві. Маці сыпала праз галовы маладых хмель, жыта, авёс, каб дзеці добра гадаваліся. У хаце маці «князя» падносіла да вуснаў маладых лыжачку мёду, каб любіліся і «салодка жылі».

Вяселле працягвалася ў доме маладога. Пад непрыстойныя песенькі старшы дружка праводзіў жаніха і нявесту ў клець, дзе іх укладвалі на разасланую пасцель. Дружкі і бацькі маладой прыязджалі раніцай да хаты жаніха. Сустракаючы іх, выносілі стол. Старшы дружка выводзіў маладых з клеці. Маладая звычайна плакала. Каб маладая сям'я была багатай, віталіся не голай рукою: жаніх — праз палу, нявеста — праз хустку, дружкі — праз адзенне.

Амаль для ўсяго рэгіёна характэрны былі агледзіны. Пад гэтым тэрмінам разумелі знаёмства з гаспадаркай, якое адбывалася перад вяселлем, і агляд кашулі маладой. Калі выяўлялася, што нявестка не цнатлівая, у некаторых вёсках свету маладой аблівалі вадой і выганялі з двара, у іншых — бацькам надзявалі на шыю хамут.

Завяршалася вяселле таксама самабытнымі, адметнымі абрадамі. Прыданкі прыносілі ў печ дровы, каб «маладая гладкая була». К. Машынскі заўважаў, што ў в. Снядзін у хату ўносілі вулей з пчоламі, уводзілі каня або вала, каб «худоба вялася». У апісанні К. Машынскага расказваецца пра цікавы звычай пераапранання на трэці дзень вяселля: «госці пераапранаюцца бабамі, адзін з іх дзедам. Гэтаму апошняму яны робяць бараду з ільняной кудзелі або з саломы і, ходзячы па вёсцы, строяць розныя жарты (дураць)». Цікавая яшчэ адна дэталь: гарэлку на вяселлі вылівалі ў міскі і чэрпалі.

Вясельныя цырымоніі заканчваліся адведзінамі: бацька дзяўчыны збіраў прыданак і ў першую нядзелю пасля вяселля ехаў з ім да маладых у госці, а ў наступную нядзелю бацькі жаніха адведвалі яго цесця.

Калі мясілі каравай, спявалі шмат жартоўных песень, у якіх каравай паэтызаваўся, персаніфікаваліся ўсе рэчы, звязаныя з яго выпечкай:

Наша печка рагоча,
Караваю яна хоча,
А прыпечак заліваецца,
Караваю спадзяваецца...

Персаніфікаваўся і сам каравай: ён «уджаліўся... у печы, да й абпёк сабе плечы». Да караваю звярталіся ў песнях як да чалавека, славілі яго: «Караваю, мой раю, я да цябе йграю...»

А. Аўрамец успамінала, што ў 1973 г. яна назірала вяселле, якое ехала з Замошша ў Петрыкаў на дзесяці вазах. На адным возе сядзеў сівы дзед, які аддаваў замуж унучку (заплаціў у саўгасе за падводы 100 рублёў). Коні былі ўпрыгожаны каснікамі. Ігралі скрыпка, гармошка, білі ў турэцкі барабан. Вяселле было незвычайным, яно выклікала вялікую цікавасць у Петрыкаве.

На Петрыкаўшчыне, як і ва ўсёй Беларусі, існавалі пахавальныя абрады, у якія ўваходзілі хаўтурныя галашэнні — імправізаваныя творы з шырокім выкарыстаннем мастацкіх прыёмаў і сродкаў народнай паэтыкі. Народныя традыцыі ў пахавальным рытуале палешукоў захаваліся ў большай або меншай ступені ў многіх вёсках і зараз. Звесткі аб асаблівасцях пахавальнага абраду ў Петрыкаве,

зафіксаваных у 1859 г. свяшчэннікам Дз. Пашыным, дайшлі ў публікацыі ў «Минских Епархиальных ведомостях» (1880) і ў «Матэрыялах для вывучэння быту і мовы рускага насельніцтва Паўночна-Заходняга краю» П. В. Шэйна. Сярод іх, напрыклад, такія: ніхто не павінен пераступаць крышку труны, каб нябожчык іх не турбаваў ноччу. Пасля таго як вынясуць з хаты нябожчыка, падлогу і лавы пасыпалі жытам, каб былі жывыя ўсе, хто застаўся ў доме. На месцы, дзе ляжаў нябожчык да таго, як яго пакладуць у труну, старшы ў хаце павінен пасядзець, каб на тым месцы маглі сядзець або ляжаць жывыя. Існаваў таксама звычай адкупляць зямлю для нябожчыка: пры апусканні труны ў магілу кідалі капейку або дзве (у в. Кашэвічы гэты звычай захаваўся да апошняга часу, але «адкупляюць» зямлю, калі на месцы магілы калісьці быў пахаваны нябожчык). У труну клалі рэчы, якія любіў памёршы. Дз. Пашын пісаў, што аднаму нябожчыку хацелі пакласці скрынку, а калі не дазволілі, сваякі яго папрасілі пакласці хоць струны. Ім растлумачылі, што тады трэба класці саху, касу, сякеру і іншыя інструменты. Аднак нябожчыку струны ўсё ж тайна паклалі. Не забіралі з могілак вяроўкі, з дапамогай якіх апускалі труну. Іх вешалі на дрэва або на крыж, «...дрэвы і крыжы ўвешаны стлеўшымі або яшчэ даволі трывалымі вяроўкамі, якіх аднак ніхто не адважыцца ўзяць для выкарыстання»[1].

Пахавальны абрад быў насычаны галашэннямі, якім надавалася важнае значэнне, абумоўленае верай, што пасля плачу нябожчыку адпускаюцца грахі. У галашэннях адлюстраваліся ўяўленні людзей аб замагільным жыцці, быт і праца, сямейныя ўзаемаадносіны. Вядомы беларускі фалькларыст М. Я. Нікіфароўскі адзначаў, што галашэнне — гэта імправізацыя, якая нялёгка паддаецца абагульненню. «Як хто ведаець, так той па своёму бацьку й плачыць», — прыводзіў ён народную прымаўку. Сярод галашэнняў нямала высокапаэтычных твораў. Памяншальна-ласкальныя суфіксы ў зваротах да нябожчыка эмацыянальна ярка раскрываюць стаўленне да памёршага: «А мой гаспадарочак, а мой яварочак!»; «А спадарочак, мой шчымялёчак»; «Дружочак жа мой галубочак». Душэўны боль асабліва выразна адчуваецца ў хаўтурных галашэннях па дзецях: «Яблычка маё недаспелае, ягадка мая недазрэлая»; «Дачушка мая, зязюлечка мая»; «Лісточак мой зялёненькі, цвяточак мой чырвоненькі»... У Капаткевічах даводзілася назіраць, як плакала па памёршаму яго сваячка: прыпала да труны і са слязамі загаласіла, чаму ён рана пакінуў гэты свет, нагадала яго дабрыню, працавітасць, потым адышла і амаль спакойна загаварыла пра жыцейскія справы з адной з прысутных жанчын.

Не менш папулярнай, чым абрадавая паэзія, на Петрыкаўшчыне была пазаабрадавая лірыка. Лепшыя традыцыйныя лірычныя песні спяваюцца і зараз. Змест і мастацкая форма гэтых твораў адпавядаюць густам чалавека не толькі мінулых эпох, але і нашага часу. Глыбіня і шчырасць пачуццяў дзяўчыны і хлопца раскрываюцца ў песнях пра каханне. У запісанай у в. Кашэвічы песні «Ой, пайду ў садочак» мары дзяўчыны аб шчасці з любімым разбіваюцца, калі мілы прызнаецца, што ў яго ёсць жонка, старая маці і двое дзетачак. Пачуцці дзяўчыны выразна адлюстроўваюцца ў мілагучным выказванні пяшчоты да каханага:

Ой, пайду ў садочак
Да сарву лісточак
Да й накрыю свайму
Міламу слядочак.
Штоб раса не пала,
Пташкі не хадзілі,
Штоб майго мілога
Другія не любілі.[1]

З сацыяльна-бытавых песень найбольшае пашырэнне мелі рэкруцкія, салдацкія і казацкія, асабліва на матыў гібелі салдата або казака. У песні «У чыстым полі сняжок пыліць» салдат, які «ўбіт ляжыць на купінцы галоўкаю», пасылае да маткі каня, каб паведаміў ёй, што ён не ўбіты. Падобны сюжэт мае песня «За гарою трава шуміць». У ёй паказваецца смерць казака, які таксама пасылае каня да маці.

Папулярнымі былі таксама балады, некаторыя з якіх дайшлі ў памяці народа або ў бытаванні да нашага часу. Адну з такіх балад упамінала Э. Дмахоўская сярод іншых, якія спявалі жанчыны ў Камаровічах за кроснамі. На яе думку, песня «з'яўляецца цікавым помнікам тых часоў, калі татары кожную вясну нападалі на нашу зямлю, і можа нават даходзілі калісьці да гэтых ваколіц — адну з іх забілі, другую ўзялі ў палон, а трэцяя ўцякае дадому». У 1948 г. у в. Кашэвічы запісана балада на гэты сюжэт:

У канцы сяла жыла там удава,
І было ў тае ўдавы тры дачкі:

[1] *Шейн П. В.* Материалы... Т. 3.

[2] Песні пра каханне / І. К. Цішчанка, С. Г. Нісневіч. Мн., 1978.

Пайшлі яны ў ягадкі,
Ідуць да ідуць пад цёмны лес.
А ў цёмным лесе да шуміць да гудзе,
Сама больша кажа: «Рака раве».
Серадольша кажа: «Звяры гудуць»,
Сама менша кажа: «Татары ідуць».
Сама большая й утапілася,
Серадольшу звяры з'елі.
Саму меншу татары ўзялі,
Узялі, узялі да ў свой край павялі.
Дачулася старэнькая маці,
Стала па іх сільненька плакаці:
— Не так жаль мне тое, што ўтапілася,
Не жаль мне тое, што звяры з'елі,
А жаль мне тое, што татары ўзялі.
А скінуся я зязюлькаю,
А палячу я ў татарскі сад.
І закую, і закую,
Штоб майму дзіцяці жалка не было.
Маё дзіцятка па садочку ходзіць,
Татаранятка за ручку водзіць...[1]

Гэтая песня — помнік духоўнай культуры народа, у якім адлюстроўваецца гістарычнае мінулае, глыбокія перажыванні гераіні — маці, дачка якой трапіла ў татарскі палон.

...Народ заўсёды любіў жарты, смех, захапляўся сатырыка-гумарыстычнымі песнямі. Смяяліся з гультайства, неахайнасці, няўмельства, ашуканства, п'янства, прагнасці, хцівасці і іншых заган. Сатыра і гумар былі сродкамі барацьбы за маральныя ідэалы, сацыяльную справядлівасць. Іранічна пацяшаўся народ з нядбайнай гаспадыні ў песні «Чаму ж мне не пець»; з лі-хой свякроўкі, якая звалілася з тыну ў крапіву («Скінь свякроўку ў крапіву»); з мужыка, што гультайку-мяшчаначку ўзяў («Захацеў мужычок мяшчаначку ўзяці»); з бабулі, якая мела намер разбагацець за кошт куранят («Захацела бабуленька»)... Усе гэтыя і многі іншыя жартоўныя песні былі папулярнымі ў Петрыкаўскім раёне, нярэдка выконваюцца і сёння. Часам спяваюць таксама песні-небыліцы, дзеючымі асобамі ў якіх выступаюць персаніфікаваныя жывёлы, насякомыя, расліны. Найбольш пашыраны песні пра камара і муху — іх вяселле, смерць камара і яго пахаванне, мыццё ў лазні, смерць мухі і т. д. За жартоўным зместам песні ўгадваюцца паводзіны людзей, іх узаемаадносіны. У іншаказальнай форме высмейваюцца амаральнасць, жорсткасць, несправядлівасць як важнейшыя негатыўныя з'явы ў грамадстве.

* * *

На Петрыкаўшчыне запісана нямала празаічных народных твораў — казак, легенд, паданняў, апавяданняў, анекдотаў, жартаў. 27 празаічных твораў занатавала ў канцы XIX ст. у в. Камаровічы памешчыца Э. Яленская, 33 казкі, легенды і апавяданні запісаў ад казачніка Івана Азёмшы ў в. Лучыцы А. Сержпутоўскі.

Рэшткі татэмізму і антрапамарфізму захаваліся ў казках і легендах, у якіх бяруць шлюб мядзведзь і дзяўчына або бусел і жанчына. У адной з казак бусел бярэ за жонку жанчыну, у якой былі свае дзеці, за тры гады сумеснага жыцця паявіліся ў іх і бусляняткі. У гэтых казках бусел персаніфікуецца: гаворыць па-чалавечы і паводзіць сябе, як чалавек. У шэрагу твораў, запісаных у Камаровічах, дзейнічаюць пярэварацені — людзі, якія ператвараюцца ў мядзведзя, ваўка (ваўкалака), свінню. У ваўкалака ператвараецца чалавек, здольны да чараўніцтва (казка «Чараўнік»). Арыгінальна інтэрпрэтуецца біблейскі міф пра стварэнне свету і кару божую за грахі. У легендзе «Народ і паны» расказваецца: «Колісь не было сьвета, толькі была патопа, што ўсе пазьміралі. Дай Господзь сьвет нарадзіў. І нарадзіла Марыя сынка, Ісуса Хрыста. Тым урэмем, згадавала ана сынка, даў Бог дзевачку. Із таго сестра з братом мелі грэх — і пайшоў сьвет з іх. І даў Господзь сьвет. Сталі жыць, і худоба ўзяласе, і даў Господзь, што стаў народ і паны. Із паноў взяла пані дзьве дзеўкі і паслала ў недзельку, у воскрэсный дзень, траву жаць для целят». Бог карае за такі грэх пані: два вужы ссалі яе грудзі і ўвесь час жылі ў яе... Асноўны сэнс легенды ў павучэнні Бога: нічога не рабіць у нядзелю — «васкрэсны дзень».

Этыялагічныя легенды, у якіх тлумачыцца паходжанне розных жывых істот ад Бога, зафіксаваны ў канцы XIX ст. у в. Лучыцы. Іван Азёмша расказаў легенду, адкуль узніклі буслы. Бог даручыў селяніну ўкінуць у мора завязаны гаршчочак, але цікаўная жонка так хацела паглядзець, што ў гаршчочку — «аж з шкуры праглася», прымусіла гаспадара застацца начаваць, а як заснуў, развязала гаршчочак, з якога выскачылі гадзюкі, яшчаркі, жабы. Спалохалася баба, нарабіла крыку, ад якога

[1] Балады / Л. М. Салавей, Т. А. Дубкова. Мн., 1977.

прахаліўся і гаспадар, і «босы, у белай сарочцэ, толькі накінуўшы на плечы чорную світу, давай збіраць тую нечысць. Збіраў, збіраў — нічога не зробіць.

І абярнуў Бог тых людзей у буськоў. Ходзяць з тае пары па балоце босыя, з чырвонымі нагамі, у белых сарочках і чорных світах буські і збіраюць усякую нечысць.»[1]

З легенд, расказаных Іванам Азёмшай, эмацыянальна-гумарыстычнай насычанасцю, паэтычнай дасканаласцю, яркасцю вобразаў вылучаецца рэлігійная легенда «Ілья і Пятро». Вобразы галоўных святых у ёй малююцца з такімі ж заганамі, якія сустракаюцца і ў людзей. «Даўно тое было, як яшчэ сам Бог па зямлі хадзіў. Аддаў Бог увесь свет Ілы й Пятру. Але, ведамо, дзе два паны, там ніколі ладу няма. Адзін пасылае дождж, а другі — пагоду. Плачуць хмары, не ведаюць, што рабіць, каго слухаць. Пятро непрыязна ставіцца да Ілы, ваюе з ім. «Ілья заўсёды наробіць гнілья», — гаворыць ён. Прызаве Бог Ілью, насварытца на яго, а той кажэ, што только развелосо нечысці — чарцей, што трээ іх громом пабіць, бо ўвесь свет запаганяць. Прызаве Бог Пятра й кажэ, што няхай Ілья трохі папалюе чарцей»...

З чарадзейных казак, запісаных у в. Лучыцы, прыцягваюць асаблівую ўвагу творы, у якіх робіцца спроба вытлумачыць з пункту гледжання народнай філасофіі пэўныя прыродныя і грамадскія з'явы. Па словах А. К. Сержпутоўскага, Івана Азёмшу «заклапочвалі пытанні пра стварэнне свету і чалавека, пра Бога, пра душу і замагільнае жыццё і да т. п.» У казцы «Чалавечае вока», напрыклад, мудры цар не мог зразумець, чаму людзі былі незадаволены ім, «наракалі на цара». На беразе мора ён убачыў дзяцей, якія ўзважвалі на адной шальцы цэлую кучу камянёў, на другой — людское вока, якое перацягвала нават камяні. Толькі тады шалька з камянямі перацягнула другую, калі чалавечае вока засыпалі пяском. «Дагадаўся мудры цар, што тагды чалавек будзе даволен, як яму пяском прысыплюць вочы...» У казцы «Мудры Салімон» абгрунтоўваецца разумнасць дзеянняў Бога, які стварыў сярод іншых і такія «непатрэбныя» істоты, як павук, гад і блыха (скочка). Аднак здарылася так, што дзякуючы ім і выратаваўся цар Салімон ад гібелі.

Адзін з самых даўнейшых запісаў чарадзейных казак, зробленых у Петрыкаўскай воласці, апублікаваны П. В. Шэйнам у 1893 г. Гэта «Казка пра змея», варыянты яе і перапрацоўкі ўжо не раз друкаваліся пад рознымі назвамі. Вопытны казачнік звычайна пачынаў апавядаць з пэўнага зачыну, які ўводзіў слухача ў свет казачных вобразаў, суадносіў з рэчаіснасцю, часам з шырокім выкарыстаннем народных прыказак, прыгаворак. Тут казачнік нібы просіць прабачэння, што адразу пачынаў баяць: «Ото, паночку, почну казаць тобе гету казку, бэз прыказок, бо нема часу»... У аснове сюжэта казкі гвалтоўны захоп дачкі гаспадара Палаг'і. Браты спрабавалі вызваліць сястру з палону, але змей іх павешаў на варотах. Толькі Гарошак, малодшы брат, які нарадзіўся ад з'едзенага гарошку пасля гібелі братоў, стаў асілкам і перамог змея, вызваліў сястру, ажывіў братоў.

Асаблівай змястоўнасцю і паэтычнай дасканаласцю вылучаюцца сацыяльна-бытавыя казкі, запісаныя на Петрыкаўшчыне. Сацыяльнай вастрынёй характарызуецца запісаная ад Івана Азёмшы казка «Жаласлівая пані», у якой адлюстроўваецца жыццё прыгонных сялян і паноў-прыгоннікаў. Казка мае гістарычнае значэнне, у самім загалоўку эпітэт «жаласлівая» мае іранічнае значэнне, якое выразна раскрываецца ў змесце твора. «Гэта было яшчэ за панькшчыну, вы ўжэ не памятаеце, бо неўне тагды яшчэ не радзіліса на свет. Да й які то быў свет. Хіба то свет, што дзісятак або другі паноў да багатых людзей панавало, а наш брат, гарапашнік, так мучыўса, што не рад быў і жыццю. І на што толькі Бог так даў на свеце, што той, хто жыве праўдаю да гаруе — мучытца, а хто ліхам да крыцельствам — пануе. Але мабыць тагды Бог адступіўся ат людзей і атдаў іх у рукі чартоў ды паноў. І чаго только паны не вычваралі, як яны не мучылі людзей, як не здзекуваліса над імі»... А. К. Сержпутоўскі апублікаваў гэту казку ў 1911 г. не без рызыкі, таму што і ў той час памешчыкі, дваране не лічылі сябе роўнымі з іншымі людзьмі, магчыма, не так, як пра гэта гаворыцца ў казцы: «...паны былі такіе ж людзі, як і мы з вамі, былі жаласлівые мо больш нас і такіе добрые да лагодные, бы анёлы, але гэто толькі к свайму брату, к вольнаму, а не к музыку...» Яркія малюнкі прыгоннай рэчаіснасці надзвычай выразна раскрываюць тагачаснае жыццё сялян і адносіны да іх прыгоннікаў.

Тэматыка казак, легенд, жартаў, анекдотаў Петрыкаўшчыны надзвычай разнастайная. Яны сведчаць аб шматгранасці інтарэсаў палешукоў, высакароднай велічы іх духоўных патрэб, тонкім

[1] *Сержпутовский А. К.* Сказки и рассказы белоруссов-полешуков. СПб, 1911.

разуменні прыгожага ў жыцці, непрымірымасці да заган, імкненні абараніць ідэалы дабра і справядлівасці.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі на Петрыкаўшчыне, як і на ўсёй Беларусі, распаўсюджанне мелі ўсе жанры вуснапаэтычнай творчасці, але паступова працэс развіцця фальклорнай традыцыі затухаў. І ўсё ж да самай Вялікай Айчыннай вайны ў вёсках ў вясенне-летні перыяд да поўначы гучалі спевы дзяўчат, якія з захапленнем спявалі перш за ўсё традыцыйныя народныя песні пра каханне, сямейна-бытавыя, балады, рамансы, прыпеўкі, а ўзімку былі свае спевы і абрады.

З НАРЫСА «ВЁСКА КАМАРОВІЧЫ»

...Свята Божага нараджэння, Ражство, або Каляды, святкуюць з вялікай урачыстасцю. На калядную куццю да вечара нельга есці вараных страў. Гаспадыня занята ўборкай хаты, мые лаўкі, сталы, вокны і нават сцены, калі яны не пабелены, вымятае хату і сенцы, усяму стараецца прыдаць святочны выгляд. Пад вечар збіраецца і ідзе да ксяндза, якому нясе ў падарунак гарнец ячменнай кашы і булку хлеба, а ўзамен атрымлівае малітву, — бутэльку свянцонай вады, якую ўсе ў хаце павінны пакаштаваць, як сядуць вячэраць. Калі на небе засвецяць першыя зоркі, на стол кладуць каласы, па аднаму з кожнага стога, вылушчваюць зярняты, лічаць і адгадваюць: колькі зярнят, столькі будзе ў наступным годзе стагоў. Каласы звязваюць, вешаюць пад абразамі і ўвосень засяваюць імі першы загон. Рассцілаюць сена на стале, кладуць яго пад абрус, а на покуці ў корабе з сенам ставяць міску з куццёю — ячменнай кашай з алеем. Пасля вячэры сена са стала кладуць у той жа кораб, дзе яно ляжыць усе тры святыя дні, потым частку аддаюць жывёле, рэшту — курам, каб добра неслiся. Перад вячэраю гаспадар выходзіць на хату і гаворыць: «Мароз, мароз, хадзі з намі куццяваць! Да нашай грэчкі не памарозь! Да нашага проса не памарозь!» На вячэру падаюць звычайна некалькі гатаванняў: боршч бураковы з грыбамі або з рыбай, аладкі грачаныя з алеем, булачкі з пшанічнай мукі або з грачанай (пампушкі) з малаком, крупнік пшонны і, нарэшце, куццю. П'юць многа гарэлкі. Калі пачынаюць есці куццю, дзяўчаты крышку выкрадаюць, хаваюць у хустку і потым перад сном кладуць пад галаву. Хто ў гэту ноч дзяўчыне прысніцца, той будзе яе мужам. Глядзяць яшчэ на зоркі. Калі ясна свецяць, ураджай будзе добры. Калі чарнее дарога, а снегу мала, што на выезджаным месцы відаць зямля — авёс і ярына будуць добрыя. Дзяўчаты варожаць і гэтак: кідаюць у дзяжу некалькі зярнят, кожная сваё памячае і трасуць дзяжу: чыё зярнятка выпадзе, тая хутка выйдзе замуж.

Пасля вячэры дзяўчаты збіраюцца ў гурты (хлопцы таксама, але асобна) і ідуць калядаваць па вёсцы. Калядніцкі падходзяць пад акно хаты і пачынаюць такімі словамі: «Добры вечар, пане гаспадару, ці спіш, ці ляжыш, ці ўсё добра чуеш, ці заспяваці?» З хаты адказваюць, каб спявалі. Песні гэтыя не заўсёды набожнага зместу. Гаворыцца ў іх і пра нараджэнне Хрыста, і пра дзяўчыну, якая сваёй прыгажосцю трох хлопцаў ачаравала, і пра варанога каня з незвычайнымі здольнасцямі. Пасля кожнай страфы паўтараецца: «Святый вечар!» Мелодыя манатонная і аднолькавая ва ўсіх песнях. Калі закончаць спяваць, з хаты выносяць невялікі дар: кавалак сала, пару яечак, часам даюць па некалькі капеек. Дары гэтыя (а іх становіцца многа, бо спяваюць на працягу ўсяго свята і збіраюць шмат) прадаюць у карчме, грошы аддаюць у царкву. Калі гаспадар не спяшаецца, за вакном напамінаюць: «Кароткія світкі, памерзлі лыткі, кароткія кажушкі, памерзлі душкі». Закончыўшы спяваць, гавораць: «От, гэтым словам, жывіце з богам, — святый вечар! І з суседкамі, — святый вечар! З сваімі дзеткамі...»

На першы дзень свята ўся вёска ў святочным адзенні, у чыстых кашулях ідзе ў царкву на набажэнства. Потым пачынаецца абед, на які падаюць не менш трох страў: боршч або капуснік з мясам, часам крупнік з малаком, каўбасы, мяса свіное або каша пшонная з салам, часам аладкі з тварагом і заўсёды — гарэлка. Увесь дзень потым адпачываюць, спяць. А вечарам калядніцы зноў спяваюць песні.

Навагоднюю куццю (Васілле) спраўляюць, як і калядную. У гэты дзень вячэраюць з «куццёю». Называецца яна «другая куцця». Дзяўчаты таксама выкрадаюць куццю, кожная па кавалачку, і кідаюць у міску з вадою. Калі выплыве наверх, выйдзе дзяўчына замуж, калі на дно пойдзе, будзе сядзець дома. Вечарам хлопцы ходзяць па вёсцы з казою — «шчадруюць». Звычай патрабуе хадзіць з казою, але для забавы можна паказваць і іншых жывёл — каня, вала. Адзін адзяецца дзедам, другі цыганам або жанчынай. Пераўвасабленне заключалася ў фарбаванні твараў сажаю, нарошчванні барод, парыкоў, гарбоў. «Казу», апранутую ў вывернуты кажух, вядзе на шнурку дзед з вялікім кіем. Суправаджаюць музыкі — барабаншчык, скрыпач. Каза скача, танцуе, ківае галавою, дзед б'е яе кіем, асабліва калі спяваюцца адпаведныя вясёлыя песні. Нарэшце дзед гаворыць: «Пакланіся, козанька, пану гаспадару дай гаспадыні». Каза пачынае перад кожным рабіць паклоны. З казою прыходзяць звычайна найперш у двор, дзе атрымліваюць пачастунак і некалькі злотых, потым ідуць на кухню, у фальварак і ўсюды атрымліваюць узнагароду. Жарты, усялякія падвохі працягваюцца, дзеду падпальваюць бараду, цыган курэй крадзе і г. д. Цыган прапаноўвае варажыць на картах панам і паненкам, але заўсёды атрымліваецца аднолькава: кожнаму жыць сто гадоў, мець прыгожую жонку або прыгожага мужа і «багата

грошай». У вёсцы казу таксама шчодра ўзнагароджваюць. Натоўпам ходзяць ад хаты да хаты, скачуць, танцуюць да позняй ночы, а калі не абыдуць усе хаты, ходзяць на наступны дзень. Дзень Васілля нічым не адрозніваецца ад іншых свят. Муж і жонка ў гэты дзень узаемна жадаюць адзін аднаму: «Дай нам, Божа, штоб мы і на наступны год дачакалі гэтага свята: у шчасці, у здароўі»...

Вялікае свята — Трох каралёў, хрышчэнне. У гэты дзень у праваслаўнай царкве з вялікай урачыстасцю праходзіць асвячэнне вады. У Камаровічах няма паблізу вялікай вады, таму вымушаны асвячаць ваду ў студні на двары ў фальварку. Святар з духоўнымі асобамі ідзе да студні і па ўсіх правілах асвячае ваду, адразу ж, услед за гэтым у натоўпе пачынаецца мітусня, кожны спрабуе як найхутчэй набраць вады і пабольш занесці дадому. Такая свянцоная вада трэба, каб заўсёды была ў хаце, ёю абмываюць нованароджаных, акрапляюць цялят пасля ацёлу.

Самы вясёлы час настае пасля Трох каралёў і працягваецца да Папяльцовага свята. Гаспадарчыя работы ў гэты час не надта вялікія, прыпасы ў гаспадарцы яшчэ не вычарпаны, марознае свежае паветра, доўгія вечары... Менавіта ў гэты час адбываецца шмат вяселляў. Лёгкая санная дарога дазваляе людзям, якія жывуць у далёкіх вёсках, наведваць сваіх родных і блізкіх. Такія адведкі збіраюць у адну хату кумоў і суседзяў, іграе музыка — кожны хоча пачаставаць сваіх сяброў. Уся вёска поўніцца танцавальнымі гукамі музыкі. Гасціннасць у палескай хаце вялікая, частуюць заўсёды як след, з душою. На стале, засланым чыстым абрусам, — місы з ядою, каля іх ляжаць драўляныя лыжкі. Калі не хапае месца за сталом, садзяцца па чарзе. Пакуль першыя частуюцца, другія, чакаючы сваёй чаргі, танцуюць. Падаюць на стол боршч альбо крупнік з салам, потым у адной місе тварог з растопленым салам, аладкі з грачанай мукі. Кожны бярэ ў пальцы аладку і ёю крышку тварагу. Яечню з яечак лічаць вялікім далікатэсам. Часам, калі шмат гасцей, гаспадыня траціць на яе каля двух коп яечак. Вараць таксама сушаныя чарніцы з мёдам або свайго вырабу макарону з малаком, потым падаюць пшонную кашу з салам або з мёдам. Як паядуць кашу, гавораць: «По кашы то юж не будзе пашы». Гарэлкі п'юць як найбольш. Гаспадары павінны запрашаць гасцей па некалькі разоў, каб елі і пілі, тады толькі будуць пачцівымі. Інакш госці будуць гаварыць: «Усяго было, толькі прынукі не было».

Запусты — мясаед, бываюць вельмі вясёлыя. Цэлы тыдзень перад вялікім постам забавы і гулянкі не спыняюцца. Ядуць таксама як найсмачней, быццам робяць запас сіл і весялосці наперад, на доўгі пост.

У Папяльцовую сераду забавы спыняюцца, музыка не іграе. Набожнага посту ў гэты дзень яшчэ не трымаюцца. Пасля смачнага запуснага ядзення ўсе ідуць у карчму — «зубы паласкаць», а пад вечар усе п'яныя. Маладыя жанчыны, у якіх у гэтым годзе нарадзілася дзіцё, купляюць кватэрку гарэлкі і нясуць да сваіх бабак, каб разам выпіць і ў аднолькавы час пост распачаць. У вёсцы настае цішыня, хутка пачынаюцца палявыя работы ў полі. Адгадваюць, які будзе ўраджай. Калі першы вясенні месячык «маладзік» мае апушчаныя ражкі, жыта будзе «ядранае», як і калі жураўлі цягнуцца не разам, у стадзе, а па аднаму. Першага хрушча вясною трэба злавіць: калі пад ім паміж ножкамі многа малых шарыкаў, быццам яечак — уродзяць грэчка, лён і гародніна.

Жанчыны маюць менавіта ў гэты час шмат працы каля кросен. Лён, спрадзены да Каляд, знаходзіцца на станку, і ў кожнай хаце амаль увесь дзень чоўнік бегае паміж шэрых нітак. Ткуць на розныя ўзоры чырвоныя «паяскі», прывязаныя да цвіка ў сцяне. Пафарбаваная воўна сохне над дзвярамі, прыцягвае вока яркім колерам. За кроснамі жанчыны спяваюць: старэйшыя — набожныя песні, «святыя», пра Хрыста, яго жыццё і мукі, пра розных святых і благаславёных, маладзейшыя — звычайныя песні пра казацкае каханне, пра нявернасць каханкаў, пра цяжкі лёс «малодкі» ў мужавай хаце пры злой свякроўцы. Дзяўчаты пачынаюць заводзіць веснавыя песні, «вяснянкі», у якіх гаворыцца пра каханне, працу на кроснах і ў якіх ужо гучыць радасць набліжэння вясны.

У час посту адбываецца першы выган жывёлы на пашу. Тут заўсёды спяшаюцца, бо вясной пачынае не хапаць корму, асабліва калі зіма зацягваецца і жывёла часам з голаду здыхае. І хоць лугі яшчэ шэрыя, лясы ледзь першыя пупышкі пачынаюць пускаць, вясковая жывёла выходзіць з аборы. Адбываецца гэта з асаблівай урачыстасцю. Гаспадар акрапляе статак крашчэнскаю свянцонаю вадою і выганяе свянцонай вярбой: «каб звер не падходзіў». Каля варот ляжыць замкнуты замок і сырое яйка, жывёла павінна перайсці праз іх. Пастухам даюць у кожным двары крыху сала і пару яечак, яны гатуюць сабе ў лесе яечню.

З радасцю сустракаюць Велікоднае свята. Перад Вербнаю нядзеляю нехта ад царквы едзе ў лес і прывозіць цэлы воз вярбовых коцікаў. Трэба ў кожнага каб была такая галінка, каля воза — натоўп. Царкоўны служка прадае іх па 2 капейкі, грошы гэтыя ідуць «на цэркаў». Дзяўчаты ўпрыгожваюць сваю вярбу каляровымі стужкамі. Назаўтра ўсе ідуць да царквы, а пасля службы жартуючы б'юць адзін аднаго вярбою і гавораць: «Не я б'ю, вярба б'е, за тыдзень Вялікдзень. Будзь здароў, як вада, будзь багат, як зямля». У гэты дзень абед хоць і посны, даюць аўсяны кісель з мёдам і яшчэ не менш як дзве стравы.

У Вялікі чацвер («Чысты чацвер») вечарам падаюць вячэру на ўспамін Божай вячэры. Называюць гэту вячэру «тайная». Ядуць толькі поснае, але абавязкова павінна быць рыба. Споведзь велікодная працягваецца ўвесь пост. Звычайна спавядаюцца пасля полудня, а да прычашчэння ідуць назаўтра рана. Споведзь — адна з лепшых хвілін, на яе ідуць звычайна ўсе гуртам. Дзяўчаты, прыгожа апранутыя, чакаючы сваёй чаргі, прагульваюцца каля царквы. Дзяцей спавядае ксёндз па некалькі разам. За споведзь плоцяць 5 капеек. Вялікая пятніца і субота прысвячаюцца падрыхтоўцы і гатаванню свянцонага.

У суботу вечарам фарбуюць яечкі. Яечкі спачатку вараць да поўнай гатоўнасці, потым апускаюць на некалькі хвілін у гарачую пафарбаваную ваду. Фарбу купляюць у яўрэяў — анілінавы чырвоны парашок, часам скарыстоўваюць лушпайкі цыбулі. Фарбуюць яечак многа, не менш як па 10 на чалавека. У заможных гаспадарках дзецям часта даюць па тры дзесяткі. Называюць гэту суботу «краснай». У гэты ж дзень усе ідуць у царкву на вячэрнюю малітву — «усюночную». Назаўтра, на Вялікдзень, усё мае святочны выгляд. У кожнай хаце запальваюцца свечкі.

Пасля набажэнства, падчас якога ксёндз асвяціў падрыхтаваныя ў кашолках прадукты, вяртаюцца дамоў і пачынаюць святочны сняданак. Спачатку ядуць яечка, жадаючы сабе: «Дай нам, Божа, за год даждаць краснага яйца ў шчасці, у здароўі!» Сярод святочных гатункаў павінны быць парася пячонае, сала, нарэзанае кавалачкамі, пшанічныя пірагі і сыр. У багацейшых падаюць на стол свіную каўбасу-крывянку, масла, свініну. Ядуць многа, запіваюць гарэлкай. У гэты дзень у вёсцы поўная цішыня, кожны сядзіць у сваёй хаце цэлы дзень, цешыцца адпачынкам. Гаспадыня, змучаная святочнымі прыгатаваннямі, спіць. Пад вечар, калі спрыяе надвор'е, выходзяць, садзяцца на прызбы, заводзяць гамонку.

Назаўтра пачынаюцца адведкі — з хаты ў хату. Дзеці нясуць сваім бабкам свяцонае яечка з пажаданнем і віншаваннем. Моладзь гуляе ў яечкі: адзін трымае ў руцэ яечка, другі б'е сваім зверху: чыё разаб'ецца, той аддае. Пры гэтым гавораць: «Хрыстос васкрэс!» Або двое становяцца адзін супроць аднаго, робяць паміж сабою дарожку і коцяць яечка. Чыё не дакоціцца, той прайграе. На гульні расходуецца шмат яечак, маладыя вымушаны ісці на хітрыкі, выкрадаюць у бацькоў увесь запас. У гэты дзень ужо вараць абед, на стол падаюць каўбасу, боршч з мясам. Вечарам пачынаюцца танцы і гульні, якія працягваюцца некалькі дзён. У Праводную нядзелю — Радаўніцу спраўляюць веснавыя дзяды. Зноў фарбуюць яечкі, каб было што занесці на магілу дзядам. У дзень св. Юр'я (21 красавіка) перад усходам сонца выганяюць у поле жывёлу на зялёнае жыта — «выгнаць на расу».

Зялёныя святкі святкуюць так, як усе іншыя святкі, з тою розніцай, што ўсюды затыкаюць зялёныя галінкі і дрэўкі. Найлепш служаць для гэтай мэты маладыя клёны. На варотах і дзвярах, каля плоту, студні — усюды зелянеюць свежыя галінкі, абразы, печ, столь таксама ўпрыгожаны зялёным. Дрэўкі і галінкі застаюцца да св. Яна. У гэты дзень пачынаюцца гульні: паленне кастроў, песні, танцы. Звычай святкавання Купалы як перажытак язычніцтва праследуецца паліцыяй і духавенствам, таму ў вёсках, дзе жыве хто-небудзь з улад, Купалля не святкуюць. У Камаровічах, пад бокам у духавенства, не надта асмельваюцца раскладваць вогнішча, затое ў Заполлі Купалле святкуюць, як сапраўдныя язычнікі. Пад вечар звозяць з вёскі зелень, што засталася ад Зялёных святак, а таксама старыя жэрдкі, колле, зношаныя лапці, непатрэбныя рэчы і ўрачыста вязуць куды-небудзь, на адкрытае месца, дзе звальваюць у кучу. Кожны кідае туды сваё палена і выказвае пры гэтым пажаданне: «Каб маё проса так высока вырасла», «Штоб мой лён такі высокі быў!» Спачатку раскладваюць адзін касцёр, потым іх узнікае ўсё больш, агонь пераносіцца з месца на месца ўсё далей, кастры палаюць усюды навокал. Хлопцы спачатку пераскакваюць праз агонь, дзяўчаты, узяўшыся за рукі, танцуюць вакол кастроў, падаюць голас барабан і скрыпка... Дзяўчаты ў вянках з палявых кветак заігрываюць з хлопцамі і потым уцякаюць у поле, на луг, тыя бягуць за імі. Хлопец стараецца схапіць у дзяўчыны вянок і кінуць у агонь. Гулянне працягваецца да позняй ночы, і наогул ніхто ў гэту ноч не спіць. Ноч незвычайная, таямнічая, поўная ўсялякіх чараў. Папараць выстрэльвае цудоўнай кветкаю, а хто яе знойдзе, можа стаць уладальнікам усіх скарбаў на зямлі... Ведзьмы ў гэту ноч маюць вялікую сілу, і трэба вельмі асцерагацца, каб не зрабілі шкоды дзецям і не адабралі ў кароў малака. Дзеля гэтага гаспадыня не спіць усю ноч. А ведзьма раскладае сабе агонь у цёмным лесе пад старым дубам і скача праз агонь. Ад гэтага ў яе прыбывае сілы і ўмення адбіраць малако ў кароў. На Купалле збіраюць лекавыя зёлкі, але толькі да ўсходу сонца, бо толькі такія дапамагаюць. Раненька, пакуль узыйдзе сонца, трэба пасціскаць рукамі капусныя галоўкі, тады яны будуць добра расці і чэрві не завядуцца.

На дзесятай нядзелі пасля Вялікадня непадалёку ад Камаровіч у невялікай каплічцы адбываецца ўрачыстае набажэнства, затым кірмаш. З некалькіх парафій з'язджаецца духавенства, яўрэі ў змайстраваных перад капліцаю латках вядуць бойкую таргоўлю, з Петрыкава прыбываюць ганчары з міскамі і іншым гліняным посудам, з-пад Турава прывозяць сіты і рашоты, гоняць на продаж коней, цялят, бычкоў. Тут можна купіць серп, касу, шапку і боты, каляровую хустку, вышываны фартух, соль, алей. З навакольных вёсак натоўпы сялян ідуць «на дзесятуху», на кірмашы шум і гоман. Пад вечар натоўпы жанчын па ўсіх дарогах ідуць дамоў, можна ўбачыць на дарозе і моцна падпітага чалавека, які ахрыплым голасам спявае песні і часта не даходзіць, начуе ў канаве.

Перад святым Пятром зноў пост, чатырохтыднёвы — Пятроўка. Вельмі незадаволены гэтым постам мужчыны, бо менавіта ў гэты час косяць, а касіць пры поснай страве цяжка, таму гавораць, што жанчыны прыдумалі гэты пост, каб можна было сабраць сыр і масла.

6 верасня на святы Спас у Камаровіцкай царкве ўрачыстае набажэнства, на якое з'язджаецца шмат навакольных людзей. У гэты дзень асвячаюць збожжа, прызначанае на насенне, садавіну. Хто не мае свайго саду, спяшаецца ў панскі двор. Там ля варот стаіць поўны воз з яблыкамі, прадае іх стары дзед. Потым усе ідуць у царкву. Старэйшыя набожныя жанчыны перад Спасам ходзяць на споведзь. Восенню мясцовыя жыхары адзначаюць некалькі вялікіх свят: Прачысту 15 жніўня, Уздвіжанне, або ўздыманне крыжа — 14 верасня, Пакровы — 1 кастрычніка, дзень св. Піліпа — 14 лістапада, перад якім працягваўся двухтыднёвы пост пад назваю Піліпаўка. Свята гэтае адзначалася весела, а ў царкву, дзе

ў гэты дзень адпускаліся грахі, народ валам валіў. Удзел у гэтым святе — адно з найбольш прыемных мерапрыемстваў у жыцці сялян. Калі засяваюць жыта, у кожнай хаце таксама сваё свята. Ў добрае надвор'е гаспадар бярэ ў каробку зярно, асвечанае на Спаса, дабаўляе зярняты з каласоў ад каляднай куцці, адразае акрайчык ад свежай булкі, кладзе «праскурку», купленую ў царкве, і свянцоную соль, абхінае палатном і ідзе ў поле. Вярнуўшыся дадому, дае суседзям і ўсім у сваёй сям'і па кавалачку гэтага хлеба і «праскуркі», усе ядуць пачастунак з вялікай удзячнасцю.

На Андрэеву куццю таксама бывае весела. Па хатах збіраюцца дзяўчаты на варажбу, якія ўвесь дзень перад гэтым старанна посцяць. Вечарам кладуць на падлогу маленькія булачкі, кожная з іх умоўна азначае прысутную дзяўчыну. Тая, якую схопіць сабака, пасля Новага года выйдзе замуж. Набіраюць таксама вязку дроў, калі іх лічба да пары — будзе вяселле. Бяруць яшчэ жменю канапель і, ідучы па вуліцы, сеюць за сабою са словамі: «Андрэй, Андрэй, я на цябе пашчу, я канапелькі сею, скажы мне праўду, з кім я буду на шлюбе стаяць». І хто ўночы прысніцца, той будзе мужам. Нават калі ўжо снег выпадзе, кожная дзяўчына засявае на агародзе крыху льну і канапель, калі вясною своечасова і добра пасеянае ўзыходзіць, то ў замужжы будзе шчаслівая, калі не, то наадварот.

Восень — пара хатняй працы, якая збірае ўсю сям'ю. Вечарамі ў кожным вакне весела свеціцца агеньчык на камінку або ад прымайстраванага да столі лучніка. Жанчыны з прасніцамі сядзяць на лаўках, спяваюць песні, матка падтрымлівае агонь на камінку і адначасова прыглядвае за калыскай, закалыхвае ўнука. Мужчыны плятуць лапці, робяць лыжкі, кошыкі або нарыхтоўваюць вупраж. Восенню галоўная праца для жанчын — прадзенне воўны і льну. Ткаць пачынаюць пасля Каляд. За гэтай працай прахозяць усе вечары. У гэты час дзяўчаты збіраюцца ў нанятую за агульны кошт хату на «вечарніцы» і прадуць. Замужнія жанчыны рэдка бываюць на гэтых зборах, бо мужыкі раўнівыя і часта забараняюць ім туды хадзіць. На вечарніцах час праходзіць хутка і весела, часта затрымліваюцца там да позняй ночы...

На Палессі людзі жывуць дружна, грамадою, не любяць і не ведаюць адзіноты. Ёсць шмат калектыўных сяброўскіх гульняў, якімі захапляецца моладзь. Адна, у персцень, заснавана на тым, што ўдзельнікі садзяцца ў рад каля сцяны, а дзяўчына, трымаючы пярсцёнак пад фартухом, ідзе, дакранаючыся да іх, і гаворыць: «З кута іду, золата нясу, гадайце, баяры, дзе палажу». І робіць выгляд, што аддае персцень адной дзяўчыне, а на самай справе перадае непрыкметна другой. Тая, што сядзіць у канцы, павінна адгадаць. Калі не адгадае, ідзе ў круг. А дзяўчына, якая «нясла золата», садзіцца на яе месца. У сляпую бабульку іграюць гэтак. Аднаму завязваюць вочы, і ён, калі схопіць каго, пытае: «А гдзе быў?» — «Пад лаўкаю». — «А гдзе тая лаўка?» — «Мышы паелі». — «А гдзе тыя мышы?» — «Каток схапіў!» Тады здымаюць павязку з вачэй... Гуляюць яшчэ ў гускі. Адзін — воўк, другі — старшая гуска, астатнія яе дзеткі, а яна бароніць іх. Воўк выскаквае з-за хаты. Матка крычыць: «Гускі, лебядзі, уцякайце! Воўк ідзе!» Дзеці адказваюць: «Мы воўка не баімся, да з воўкам пажэнімся». Воўк іх хватае па аднаму, пакуль не застанецца адна матка. Тады на яе кідаецца.

...Селянін наогул не можа наракаць на сваё цяжкае жыццё. Больш працуючы і маючы крыху лепшую асвету, мог бы стаць яшчэ багацейшым, але і таго нават, што сёння мае, яму дастаткова для задавальнення сваіх невялікіх патрэб. Жыццё ціхае, аднастайнае, без вялікіх уражанняў і моцных патрасенняў, выпрацоўвае ў ім цягу да весялосці і дружалюбных чалавечых кантактаў. Углядваючыся ў гэтую непасрэдную весялосць, у іх шчырую, ледзь не дзіцячую наіўнасць, ахоплівае нешта нібы адчування зайздрасці, што яны ў сто разоў шчаслівейшыя за нас, адукаваных і цывілізаваных...

Эма Дмахоўская-Яленская
1911 г.

* * *

Петрыкаўскі і Капаткевіцкі раёны, створаныя паводле Указа Прэзідыума ЦВК БССР 17 ліпеня 1924 г., уваходзілі ў склад Мазырскай акругі. Да Петрыкаўскага раёна адышла тэрыторыя Петрыкаўскай, Ляскавіцкай, Грабаўскай і большай часткі Камаровіцкай валасцей, да Капаткевіцкага — Капаткевіцкай і Лучыцкай. 23 ліпеня 1930 г. была прынята пастанова аб ліквідацыі акруг і ўмацаванні раёнаў «як асноўнага звяна сацыялістычнага будаўніцтва ў вёсцы», Мазырская акруга скасавана. У 1931 г. ліквідаваны Капаткевіцкі раён, тэрыторыя яго ўвайшла ў склад Петрыкаўскага.

25 чэрвеня 1935 г. ЦВК і СНК БССР з мэтай паляпшэння гаспадарчай і культурнай работы ў раёнах прыгранічнай зоны аднавіў Мазырскую акругу, у якую ўвайшло 9 раёнаў. З саставу Петрыкаўскага раёна зноў быў выдзелены Капаткевіцкі.

20 лютага 1938 г. акругі былі ліквідаваны і ўведзены абласны падзел. Петрыкаўскі і Капаткевіцкі раёны ўвайшлі ў склад Палескай вобласці з цэнтрам у г. Мазыр. 27 верасня 1938 г. Пет-

рыкаву нададзены статус горада, Капаткевічам — гарадскога пасёлка. 8 студзеня 1954 г. Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР скасаваў Палескую вобласць, яе тэрыторыя ўвайшла ў склад Гомельскай вобласці. 25 снежня 1962 г. у выніку ўзбуйнення раёнаў Капаткевіцкі раён быў ліквідаваны, яго землі далучаны да Петрыкаўскага.

Адраджэнне духоўнай спадчыны

... Восень 1944 года. У раёне налічвалася 17 хат-чытальняў. Тут збіраліся людзі, разліваўся гармонік, спяваліся частушкі. Па ініцыятыве мясцовай інтэлігенцыі рыхтаваліся сцэнкі спектакляў. Шмат намаганняў для ўздыму культуры ў раёне прыклаў першы пасляваенны загадчык аддзела культуры М. М. Папоў, загадчык хаты-чытальні П. Ф. Шарамет з Ляскавіч. У 1948 г. у прыстасаваным раённым Доме культуры быў арганізаваны хор. Яго ўзначаліў Іван Каленік — чалавек шырокай душы, выдатны арганізатар. За кароткі час хор вырас амаль да паўсотні чалавек. У ім былі людзі розных прафесій — настаўнікі, служачыя, рабочыя, сакратары райкома камсамола Віталій Кавалёў і Нэлі Кавалёва, інструктар Паліна Боўсун, настаўнікі Уладзімір Нілаў, Уладзімір Курдо, Уладзімір Петухоў.

Першыя выступленні прынеслі хору шырокую вядомасць. Пачынаючы з 1962 г. хор амаль штогод выступаў на дэкадах самадзейнага мастацтва ў Мінску. У 1964 г. ансамбль песні і танца, якім кіраваў І. Ф. Каленік, танцавальнай групай — І. П. Ляўковіч, духавым аркестрам — Р. І. Мамраў, выступіў на ВДНГ у Маскве. Ніводнае значнае мерапрыемства ў раёне не праводзілася без выступленняў спевакоў і танцораў. Ансамбль прымаў удзел ва ўсіх фестывалях і аглядах, займаў прызавыя месцы.

Паступова пачалі складацца калектывы ляскавіцкага Дома культуры, дзе быў дырэктарам Пётр Шарамет, конкавіцкага — Іван Козел, лучыцкага Дома культуры — Васіль Азёмша. Ужо ў той час закладваліся асновы сённяшніх фальклорных ансамбляў, уваскрашалася народная песня. Нельга не ўспомніць загадчыкаў аддзела, якія многае зрабілі для развіцця культуры раёна. Гэта П. А. Грабко, К. М. Чыжык, В. Я. Каюкала, Г. Д. Будовіч, Б. Т. Мельнік, Г. Д. Кебец.

У апошні час асаблівая ўвага надаецца вывучэнню фальклору роднага краю. Такія песні сталі асновай рэпертуараў многіх мясцовых аматарскіх калектываў.

Значны рост майстэрства на аглядах самадзейнасці за апошнія гады паказалі петрыкаўскі Дом культуры (дырэктар Н. П. Жыгала), церабаўскі (В. А. Дашкевіч), залескі (В. С. Голуб), бяланавіцкі (К. Д. Стральчэня, мастацкі кіраўнік М. М. Язерскі), міхедавіцкі (В. М. Ганцэвіч, мастацкі кіраўнік В. Г. Харланава), курыцкага (Т. М. Хаменя).

Многія кіраўнікі гаспадарак і прадпрыемстваў раёна з разуменнем адносяцца да патрэб устаноў. Заўсёды стараецца дапамагчы вырашыць праблемы клубных работнікаў дырэктар саўгаса «Галубіцкі» Г. В. Пількевіч. Неаднаразова дапамагаў самадзейным артыстам дырэктар саўгаса «Ляскавічы» В. М. Канановіч. З вялікай спагадай адносіцца да ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці вялікі аматар песні старшыня калгаса «Бальшавік» В. К. Каляда. Заўсёды імкнецца ўнікнуць у клопаты работнікаў Дома культуры дырэктар саўгаса «Навасёлкі» Б. С. Руноў.

Аддзел культуры дапамагае праводзіць працоўныя святы ярка, песенна.

Сапраўды народнымі святамі сталі «Купалле» ў Петрыкаве і многіх вёсках раёна. Званчэй, чым у іншыя гады, заліваюцца са сцэн сельскіх Дамоў культуры гармонікі... У вёсках раёна запісваюцца народныя песні ў тым выглядзе, у якім яны захаваліся ў памяці людзей — ад бацькоў, дзядоў, прадзедаў.

Яны ўражваюць сваёй паэтычнасцю і вобразнасцю. Вобразы зязюлі-маці, якая ляціць да абяздоленай дачкі, дзівосная метафара: салдат у сне імкнецца да роднага дому...

Кашэвічы — песенны край. Першая сустрэча з Надзеяй Міхайлаўнай Курач. Жанчына поўная добрага настрою працаваць і спяваць. Прыгожым, мяккім голасам Надзея Міхайлаўна напявае мелодыі купальных і вясельных песень. Новая сустрэча з 77-гадовай Праскоўяй Іванаўнай Сакавец. У песнях старой жанчыны ажывае гісторыя. Праскоўя Іванаўна апавядала, што ўсе свае песні пераняла ад маці, а тая ад сваёй. І гэтак з пакалення ў пакаленне да нашых дзён дайшла песня пра лёс дзяўчынкі, якая трапіла ў татарскі палон... Можна толькі дзівіцца, якая глыбокая памяць у народа. Песні-балады ўваскрашаюць гісторыю роднага краю, паэтычнымі вобразамі паказваюць боль і надзею народа.

Вельмі цікавыя песні запісаны ў Бяланавічах ад Праскоўі Лявонаўны Музыка. Яна памятае, што яе бацька спяваў песні пра салдата, які плача-скардзіцца, бо забіраюць яго на чужую зямлю, на Далёкі Усход. Ён развітваецца з бацькам, маці і роднымі палямі і лясамі, з любай дзяўчынай, якую ўжо, мусіць, ніколі не ўбачыць...

Багацейшыя песенныя скарбы ўдалося раскрыць у Баклані. Песенніца Валянціна Іванаўна Карась спявае песні пра гаротную працу наймічкі, якая не ведала ні свята, ні адпачынку, хадзіла па людзях, каб зарабіць тры грошы і купіць кудзелечку. Фальклорная спявачка з вёскі Першая Слабодка Фядора Дарафееўна Коўгар спявала песні, якія нідзе ў іншых вёсках не сустракаюцца. Тут і любоўныя, і бытавыя, і жартоўныя напевы.

Захавальніцамі народных песень у Славінску з'яўляюцца Ганна Мікалаеўна Ястрэмская і Раіса Фёдараўна Лігорская. Разам з песнямі яны нагаварылі шмат замоў, заклінанняў, якімі карысталіся сяляне пры розных жыццёвых праявах. Дзівосныя па прыгажосці песні запісаны ад Лідзіі Андрэеўны Грыб з вёскі Грабаў.

А. І. Слесарэвіч

Петрыкаўскі народны хор

У песні — душа народа

У хору петрыкаўскага раённага Дома культуры даўнія і багатыя мастацкія традыцыі. Яшчэ ў 1974 г. яму было прысвоена званне народнага. Тады здольным калектывам мастацкай самадзейнасці кіраваў І. Ф. Каленік. З цягам часу былая слава хору стала заціхаць, пакуль да кіраўніцтва яго не прыйшла выдатны спецыяліст, прафесіянал мастацкай самадзейнасці Алена Буднік. Яе любоў і павага да фальклорнай народнай песні бязмежныя... У рэпертуары хору такія выдатныя песні, як «Зямля палеская», «А я ў печы не паліла», «Ой за гаем, гаем», «Як служыла я ў папа» і многія іншыя. Яны не проста спяваюцца, а паказваюцца, як сцэнкі. Асаблівым майстэрствам у іх выкананні вызначаецца старэйшы ўдзельнік хору І. П. Ляўковіч. Нельга застацца абыякавым пад уражаннем майстэрства спявачак Ганны Несцярчук і Галіны Шляга. Дзякуючы ім і ўсім астатнім удзельнікам хор раённага Дома культуры пацвердзіў званне народнага.

Радасць сустрэчы з музыкай

Дзесяць гадоў назад пры петрыкаўскім раённым Доме культуры арганізаваны аркестр народных інструментаў. Ужо праз чатыры гады за высокае прафесійнае майстэрства, якое пастаянна расце і ўдасканальваецца, яму было прысвоена званне народнага.

У праграме аркестра — беларуская народная музыка, творы замежных, рускіх і беларускіх кампазітараў, сатыра і гумар, сольнае выкананне на народных інструментах.

Шмат намаганняў для росту прафесійных вартасцей аркестра народных інструментаў прыкладае яго кіраўнік М. К. Будзюхін — дырэктар Петрыкаўскай дзіцячай музычнай школы. Высокім майстэрствам вызначаюцца Г. Кебец, І. Моліна, Л. Вінічэнка — зрэшты, усе 30 удзельнікаў аркестра.

Збылася надзея ў «Надзеі»

У народнага жаночага ансамбля калгаса «Бальшавік» свая непаўторная і незабыўная манера выканання песень — лірычная, задушэўная. Пад кіраўніцтвам А. Д. Рудзько па-новаму гучаць вядомыя песні «Там, каля млына», «Ой, аралі хлопцы ніву», «А калі той вечар» і многія іншыя. Стрымана, вытанчана гучаць галасы ўдзельніц ансамбля настаўніцы Валянціны Каляды, бухгалтара Людмілы Шэлег, выхавацельніц Валянціны Кавальчук і Праскоўі Ярыгі, касіра Ніны Буднік, загадчыцы клуба Тамары Хамені і яго работніцы Таццяны Ерамейчык, агранома Ніны Хамені. Вялікую ўвагу ансамблю надае старшыня калгаса В. К. Каляда.

— Людзі з песняй працуюць лепш, ім лягчэй пераадольваць цяжкасці жыцця, — гаворыць ён.

З глыбінь народных

Звыш 30 гадоў таму створаны фальклорны ансамбль «Спадчына» курыцкага сельскага Дома культуры — актыўны прапагандыст беларускай народнай песні. Не пералічыць канцэртаў, дадзеных ім у вёсках раёна і далёка за яго межамі. Яго ўдзельнікі — паляводы і механізатары, жывёлаводы і спецыялісты сельскай гаспадаркі — людзі, па-сапраўднаму ўлюблёныя ў народную песню, якія чэрпаюць сваё натхненне ў глыбінях фальклорнага багацця Палесся.

У 1992 г. фальклорнаму ансамблю «Спадчына» прысвоена званне народнага.

Гаючая народная песня

У глыбокую даўніну ідуць карані песень, якія гучаць у Церабаве. Змест іх ранейшы — вясёлая, гарэзлівая беларуская народная песня, вершы і байкі, сцэнкі і рэпрызы, агністыя танцы... Моцны і зладжаны калектыў аднадумцаў змагла сцэментаваць кіраўнік

фальклорнага ансамбля Наталля Фаміна. Ён неаднаразова з'яўляўся пераможцам раённага і абласнога аглядаў-конкурсаў. Многія ўдзельнікі ансамбля — Аляксандр Дашкевіч, Вера Грамовіч, Нэля Позур, Кацярына Агейчык, Ніна Мачук, Любоў Панфіленка і іншыя — не ўяўляюць свайго жыцця без народнай песні.

Дарыць людзям прыгажосць

Дваццаць гадоў споўнілася дзіцячаму ўзорнаму танцавальнаму ансамблю танца «Верасок» капаткевіцкага Дома культуры. Практычна ўвесь яго рэпертуар створаны на народным, мясцовым матэрыяле, не забыты таксама традыцыйныя беларускія танцы — «Лявоніха», «Таўкачыкі», «Кабылка» і іншыя. Мясцовы кампазітар Г. Д. Кебец стварыў танец «Капаткевіцкая полька». Кіраўнік ансамбля Я. І. Суботка пастаянна знаходзіцца ў творчым пошуку, не спыняецца на дасягнутым і пастаянна працуе над павышэннем прафесійнага ўзроўню ўдзельнікаў ансамбля.

